ARCHE Зьмест № 3'04

1. Зьмест / Уводзіны
2. Полацку трэба прадавацца. ARCHE 3 (32) 2004.
3. Дуб імя Ластоўскага. ARCHE 3 (32) 2004.
4. Калхоз імя Пацёмкіна, дзярэўня Беларусь. Даніла Жукоўскі. ARCHE 3 (32) 2004.
5. Доўгае вяртаньне ў Полацак. Алег Латышонак. ARCHE 3 (32) 2004.
6. «Ленін ня раз бываў у Полацку…». Гутарка з Уладзімерам Арловым. ARCHE 3 (32) 2004.
7. Полацак у фармаваньні беларускага нацыянальнага сьветагляду. Вітаўт Кіпель. ARCHE 3 (32) 2004.
8. Крыўскі кішэнны слоўнік Пятра Васючэнкі. ARCHE 3 (32) 2004.
9. Зьбіраньне Полацку. Сяргей Шыдлоўскі. ARCHE 3 (32) 2004.
10. Чатыры сустрэчы з Сафіяй. Янка Брыль. ARCHE 3 (32) 2004.
11. Катакомбная Беларусь. Герман Кірылаў. ARCHE 3 (32) 2004.
12. На сыходзе зімы - перад новымі зімамі… Алена Ніякоўская. ARCHE 3 (32) 2004.
13. Два галоўныя скандалісты 20-х. Віктар Жыбуль. ARCHE 3 (32) 2004.
14. Усяслаў Брачыславіч, князь Полацкі. Генадзь Семянчук. ARCHE 3 (32) 2004.
15. Пагоня за духамі ды ідэямі. Пётр Рудкоўскі ОП. ARCHE 3 (32) 2004.
16. Паліталёгія ў пераходным грамадстве. ARCHE 3 (32) 2004.
17. ЗША і Еўропа, ад 1945 году да сёння. Іммануіл Валерстайн. ARCHE 3 (32) 2004.
18. Секс і эротыка ў беларускай традыцыйнай культуры. Уладзімер Лобач.ARCHE 3 (32) 2004.
19. Жэнэўская канвэнцыя для вайны культураў. Юры Дракахруст. ARCHE 3 (32) 2004.
20. Полацак і палачане ў беларускай паэзіі XX стагодзьдзя.

ARCHE 3 (32) 2004.
21. Зямля абяцаная. Мэры Энцін. ARCHE 3 (32) 2004.
22. Тры гады пад нямецкай акупацыяй у Беларусі. П. Ільінскі ARCHE 3 (32) 2004.
23. Постмадэрнізм, калыска мая. Юрась Пацюпа. ARCHE 3 (32) 2004.
24. Полацак антырасейскі. Лена Глагоўская. ARCHE 3 (32) 2004.
25. Павал Абрамовіч. Дом з закрытымі/адкрытымі аканіцамі

З ь м е с т

ПРАДМОВА

ЯН МАКСІМЮК Полацку трэба прадавацца
АЛЕСЬ АРКУШ Дуб імя Ластоўскага

КРЫТЫКА

ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ Калхоз імя Пацёмкіна, дзярэўня Беларусь

ЭСЭІСТЫКА

АЛЕГ ЛАТЫШОНАК Доўгае вяртаньне ў Полацак
«Ленін ня раз бываў у Полацку…» Гутарка з **УЛАДЗІМЕРАМ АРЛОВЫМ**
ВІТАЎТ КІПЕЛЬ Полацак у фармаваньні беларускага нацыянальнага сьветагляду
Крыўскі кішэнны слоўнік **ПЯТРА ВАСЮЧЭНКІ**
СЯРГЕЙ ШЫДЛОЎСКІ Зьбіраньне Полацку
ЯНКА БРЫЛЬ Чатыры сустрэчы з Сафіяй
ГЕРМАН КІРЫЛАЎ Катакомбная Беларусь
АЛЕНА НІЯКОЎСКАЯ На сыходзе зімы - перад новымі зімамі…
АЛЕСЬ АРКУШ Паэт і выбары
ВІКТАР ЖЫБУЛЬ Два галоўныя скандалісты 20-х
ГЕНАДЗЬ СЕМЯНЧУК Усяслаў Брачыславіч, князь Полацкі

АНАЛІТЫКА

ПЁТРА РУДКОЎСКІ ОП Пагоня за духамі ды ідэямі
Паліталёгія ў пераходным грамадстве. Круглы стол
ІМАНУІЛ ВАЛЕРСТАЙН ЗША і Эўропа, ад 1945 году да сёньня
УЛАДЗІМЕР ЛОБАЧ Сэкс і эротыка ў беларускай традыцыйнай культуры

ПАЛЕМІКА

ЮРЫ ДРАКАХРУСТ Жэнэўская канвэнцыя для вайны культураў

ЛІТАРАТУРА

Полацак і палачане ў беларускай паэзіі XX стагодзьдзя
МЭРЫ ЭНЦІН Зямля абяцаная
П. ІЛЫНСКІ Тры гады пад нямецкай акупацыяй у Беларусі
ЮРАСЬ ПАЦЮПА Постмадэрнізм, калыска мая

КАРОТКІЯ РЭЦЭНЗІІ

ЛЕНА ГЛАГОЎСКАЯ Полацак антырасейскі
ПАВАЛ АБРАМОВІЧ Дом з закрытымі/адкрытымі аканіцамі

[image]
[image]

№ 3 (32) - 2004
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне [mk], Абнаўленьне [czyk]
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/5
[image]

Полацку трэба прадавацца

Сяргей Шыдлоўскі, аўтар эсэ «Зьбіраньне Полацку» ў гэтым нумары ARCHE, кажа, што гістарычна-духоўная спадчына Полацку бачыцца яму зручным месцам для дасягненьня нацыянальнага ідэалягічнага кампрамісу ў Беларусі. Я, на жаль, не падзяляю гэтага сьветлага аптымізму, не ў апошнюю чаргу таму, што ніяк не магу ўзгадаць, калі ж гэта было такое, каб у Беларусі дасягнулі - безь пісталета - хоць якога-колечы ідэалягічнага кампрамісу ў нацыянальным маштабе. Затое я без засьцярогаў пагаджаюся з аўтарам, калі ён цьвердзіць, што гістарычны аспэкт сёньняшняга Полацку можа паслужыць добрым фундамэнтам для збудаваньня турыстычнага бізнэсу.

Рэч тут ня толькі ў тым, што газ няўмольна даражэе або што грошай патрабуюць усе, а з ідэалёгіі няма ніякага наедку. Хутчэй за ўсё рэч у тым, што *pecunia non olet* - калі можна зарабіць на полацкай гісторыі, то хто будзе глядзець на тое, што гэтая гісторыя ня надта ўкладваецца ў рамкі нейкай ідэалёгіі, хай сабе й дзяржаўнай. Інакш кажучы, тое, што напісалі У. Арлоў і Г. Сагановіч пра полацкі пэрыяд дзесяцівяковай беларускай мінуўшчыны, можа яшчэ доўга чакаць афіцыйнага *imprimatur* , каб увайсьці ў школьную праграму, але пры спрыяльнай каньюнктуры - то бок пры яшчэ большай эканамічнай бязвыхаднасьці краіны - яно можа зусім

хутка і беспраблемна апынуцца ў турыстычных буклетах і даведніках. Рэкляма - рухавік бізнэсу.

Лёс турыстычнага Полацку, праўда, залежыць ад лёсу турыстычнага Менску. Замежнікі прыедуць у Полацак пакінуць там свае грошы толькі тады, калі ім будзе рупіць прыехаць у Менск. Ну, але правінцыі нельга іначай: яна заўсёды залежыць ад сталіцы. Пакуль што Менск пасьпяхова праводзіць сваю прамоцыю як манумэнтальнага і - у эўрапейскім маштабе - унікальнага музэю рэальнага сацыялізму. Значыць, ёсьць шанец, што міжнародная цікавасьць да яго не аслабне, а зь цягам часу будзе нават узрастаць. Што да турыстычнай прамоцыі Полацку, дык яе б належала пачаць неадкладна. У Полацку няма, як у Менску, выразнага гандлёвага брэнду. Магчыма, у Полацку няма і больш элемэнтарных рэчаў - перш за ўсё рэстаранаў, гатэляў і турыстычных бюро, то бок турыстычнай інфраструктуры.

Я ніколі ў Полацку ня быў, а таму даволі моцна зьдзівіўся, калі Алесь Аркуш запрапанаваў мне напісаць нешта накшталт уводзінаў у «полацкі нумар» ARCHE. (Ну, але яму там відней. Мабыць, яму быў патрэбны погляд патэнцыйнага турыста, нават калі і не зусім 100-працэнтна замежнага.) Я марна спрабаваў знайсьці ў Інтэрнэце адрасы нейкіх гатэляў і рэстаранаў у Полацку, дзе я мог бы затрымацца й паесьці, калі б прыехаў туды пагаманіць з Аркушам, Шыдлоўскім ці Мудровым пра беларускую літаратуру й правінцыю. Я ведаю, што хлопцы знайшлі б мне начлег і далі б паесьці. Але рэч у тым, што гэта не вырашае агульнай праблемы - дзе затрымацца ў Полацку магчымаму натоўпу замежнікаў, які можа туды прыперціся, заваблены ўсімі тымі крывава-сур'ёзнымі гісторыямі Арлова-Сагановіча.

Сорамна прызнацца, але ў Інтэрнэце мне таксама не ўдалося знайсьці, колькі прыблізна людзей жыве ў сёньняшнім Полацку. Затое, калі я запускаў Google на пошук «Полац(а)к насельніцтва», я даставаў адрасы старонак, зь якіх мог падрабязна даведацца, як лік полацкага насельніцтва зьмяняўся пад узьдзеяньнем усіх тых сечаў і напасьцяў у X-XVIII стагодзьдзях. Дзеля параўнаньня, я ўпісаў у Google

«Gniezno» - так палякі называюць свой «Полацак», адкуль пайшла іхная дзяржаўнасьць - і адразу ж дазнаўся як пра колькасьць сёньняшніх жыхароў гэтага гораду, гэтак і пра яго гатэлі ды рэстараны, што паказвае ня столькі на розьніцу ў эканамічным разьвіцьці гэтых двух гарадоў, колькі на розьніцу ў разьвіцьці нацыянальных мэнталітэтаў. Адзін народ усё яшчэ намагаецца палавіць лятучыя фантомы свае мінуўшчыны, а другі даўно ўжо намёртва папрышпільваў свае ў школьных падручніках і жыве з дывідэндаў ад сваіх нябожчыкаў.

У далейшай пэрспэктыве, усё ж, Полацку павінна пашанцаваць з рэальным жыцьцём. Ён павінен добра прадавацца. Я мяркую з чэскай правінцыі, куды заглядаю пару разоў на год. Хоць Празе і перападае несумненная бальшыня дывідэндаў ад чэскіх нацыянальных могільнікаў, але і правінцыя не крыўдуе. Дастаткова паехаць у любую пару году ў Кутну Гору, Чэскі Крумлаў або Карлштайн, каб пераканацца, што й там можна няблага жыць з продажу свае гістарычнае апрычонасьці. Прычым чэскія правінцыйныя гарадкі ня могуць пахваліцца й трацінай такіх жахаў і дзівосаў, якія можна закінуць у даведнік пра Полацак.

сакавік 2004, Прага

Ян Максімюк

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 3 (32) - 2004
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/5
[image]

Дуб імя Ластоўскага

Ёсьць дзьве кнігі, да якіх я вяртаюся зноў і зноў. З насалодаю зацятага курца, які доўга не ўдыхаў паху духмянага тытуню, паволі перачытваю «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданьнях» Яна Баршчэўскага і «Лябірынты» Вацлава Ластоўскага. Асобныя радкі ведаю на памяць: «Мінаю пушчы і вось на шырокай раўніне бачу горад Полацак. Званы сьв. Стафана, на замкавай гары - царква сьв. Сафіі, якія, стоячы ў тумане, здаецца, імкнуцца да воблакаў; іх постаці-веліканы пануюць над горадам і над усёй ваколіцай». У гэтых творах кожная літара - пра любоў да старажытнага гораду, пра веру ў яго, пра таямніцы, якія чакаюць свайго раскрыцьця.

Рабіць-укладаць Полацкі нумар «ARCHE» было гэтак жа няпроста, як у грыбны год зьмясьціць у кошыку знойдзеныя баравікі. І ўзяць усё немагчыма, і пакідаць у лесе шкада. Шмат цікавых тэмаў і сюжэтаў засталося па-за часопісам.

Спадзяюся, наперадзе будуць новыя полацкія нумары.

Хачу выказаць падзяку за дапамогу ў працы над гэтым нумарам Уладзімеру Арлову, Лене Глагоўскай і Віктару Жыбулю.

* * *

У Полацку шмат таямніцаў. Неяк мне прыйшла ідэя ўшанаваць імя Вацлава Ластоўскага, надаўшы аднаму з дубоў, што растуць у цэнтры Полацку, імя Власта. Грамадою зладзілі імпрэзу, а ўвечары таго ж дня я разгарнуў «Лябірынты» і прачытаў: «Кон-Прова-Тур ня меў стодаў: яму пасьвячаліся сьвятыя дубы і гаі».

Каб Правечны Кон паспрыяў беларускай справе - прыедзь у Полацак і павяжы на дубе Власта бел-чырвона-белую стужачку.

Алесь Аркуш

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 3 (32) - 2004
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/5
[image]

ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ
гарадзенскі гутнік, крытык літаратуры. Сталы аўтар «ARCHE»

Даніла Жукоўскі Калхоз імя Пацёмкіна, дзярэўня Беларусь

Мы - беларусы. Дакументальна-мастацкае выданне. Укладальнік Т. Бондар, мастак А. Варанішча

. - Менск: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Літаратура і мастацтва», 2003.

Кіраванне мудрага чалавека робіць сэрцы народу пустымі, а трыбух - поўным. Яно аслабляе волю народу, але мацуе косці. Яно імкнецца да таго, каб у народу не было ані ведаў, ані памкненняў, а тыя, хто маюць веду, не асмельваліся на дзеянні.

...Калі няма змагання, не будзе незадаволенасці.

Дао Дэ Цзін

Кожнаму іншы раз цікава, якім яго бачыць начальства. У беларусаў надарыўся асаблівы шанец пабачыць партрэт саміх сябе ў гэтакім ракурсе.

Здавалася б, загаловак кнігі звяртаецца да чытача ад першае асобы. Але «Мы - беларусы» не пра Т. Бондар і А. Варанішчу. Гэтае *Мы* мае наўвеце беларусаў увогуле; апошнія сумненні ў гэтым праганяе ўступнае слова кіраўніка дзяржавы. Можа, «мы - беларусы» - гэта знакамітае «We, the People», чарговая маніфестацыя непазбыўнага нацыянальнага жадання людзьмі звацца? Не, задума выразна іншая. Кніга знакавая ў сваёй непрыхаванай сервільнасці: задуманая як своеасаблівы *парадны партрэт* беларускага грамадства, яна паказвае нас такімі, якімі народ хацела б бачыць улада. Ці амаль такімі, бо жаданні кіраўніцтва ўвасабляюць у жыццё няўрымслівыя людзі з творчай жылкай, пра што ніжэй.

Угледзімся ў дэталі. Выглядае на тое, што ўлада марыць, каб беларус быў стрымана патрыятычны, паслухмяны, паслужлівы і працавіты, непатрабавальны да дабротаў матэрыяльных і неперабарлівы - у духоўных. Але... Патрыятызм не павінен мець рысаў свабадалюбства, геніяльнасць - неакілзанасці незалежнага духу, «складаны» і «разнастайны» духоўны свет ды пачуцце асабістае і нацыянальнае годнасці не павінны надаваць чалавеку духоўную незалежнасць ад рэжыму. Гэтаксама й праца людзей ацэньваецца ці не выключна з прыкметы сваёй адпаведнасці мэтам уладаў. Усім праявам чалавечае асобы загадзя вызначаны дакладныя межы, якія нельга пераступаць. Усё, што ў гэтыя рамкі не змяшчаецца, пакідаецца па-за рамкамі, нават калі ад персанажа застаецца толькі рука ці нага без галавы і тулава. Нават калі гэты персанаж - Васіль Быкаў.

Натуральна, у кнізе такога тыпу няма месца згадванню памылак ды іншых прыкрасцяў. Але складальнікі пайшлі далей, нашмат далей за палітычна матываванае рэтушаванне. Паслядоўна выдаленыя ўсялякая бунтоўнасць, матывы актыўнага змагання людзей за сваю пазіцыю, за *сваю* праўду. Перамога ў баі, перамога на працоўным месцы ў шэрагах роднага калектыву - але не ў спрэчцы. Не праз канфлікт. Праслаўляюцца не задзірлівасць і прынцыповасць, а ўмелае і

стараннае выкананне, не адстойванне сваёй, а правядзенне ў жыццё зададзенай лініі. Выняткі кшталту нататкі пра Масея Сяднёва толькі падкрэсліваюць асноўную думку, што адарваны ад Радзімы чалавек не здольны самарэалізавацца на адпаведным узроўні.

Ніякіх спрэчак - барані Божа, - адно цудоўнае выкананне рашэнняў. Улічваючы сціплую колькасць асобаў сусветнага маштабу - што ў кнізе, што ў жыцці, адсутнасць, скажам, беларусаў - лаўрэатаў Нобелеўскай прэміі, хатні (збольшага) фармат паказаных дасягненняў, хочацца зрабіць падагульненне: беларусы працуюць не выдатна, а хутчэй добра, але беларусы спакойныя і задаволеныя. Несумненна, гэта народ, *якім выдатна кіруюць.*

Пасіўны стан тут невыпадковы. У кнізе вельмі сціпла паказаныя не толькі палітыкі, але й кіраўнікі. З найвышэйшага звяна гэта практычна толькі П. М. Машэраў. Прысутнасць дзейнага кіраўніка краіны абмежаваная стрыманым уступным словам і некалькімі фатаздымкамі, асобнай старонкі пра яго няма. І ўсё?

Не тое каб мне карцела пабачыць галерэю старшынь рай- і гарвыканкамаў, міністраў, дыпламатаў, дырэктараў прамгігантаў. Але іхняя амаль поўная непрысутнасць насцярожвае. Улада апынаецца нябачнаю - не толькі па-за крытыкай, але й нават па-за пахвалою. *Ne sutor supra crepidam?*

Для колькасці шмат старонак пра мастакоў - вось каму ў альбоме пашанцавала. Пра мастакоўскае шанцаванне лепш, аднак, было б напісаць з двукоссем, бо адказнасць за непазбыўны пакост правінцыйнасці кладзецца пароўну на тэксты з красамоўнымі падзагалоўкамі кшталту «Складаны ўнутраны свет», «Глыбокія нацыянальныя карані», «Споведзь дарог», «Мера чалавечага жыцця», «Акцёрская і чалавечая самабытнасць» ды на мастацкае афармленне з кідкімі, часам сусальнымі фотакалажамі. І калі тэксты, сціпла пазначаныя як дасланыя «для публікацыі ў беларускім друку», належаць розным аўтарам і неаднародныя нават жанрава (параўнаем «Дзядзьку Майсея» Святланы Явар і «Краіну здароўя» А. Грачова, змешчаныя на адным развароце: еднасці няма нават у

напісанні імёнаў аўтараў: адно пададзена цалкам, іншае схавана за ініцыялам), то ў афармленні кнігі ўвасобілася ўяўленне аўтарскага калектыву пра начальскую задуму параднага партрэту беларускага грамадства. Рысы плакату і прымітыўнага лубка ў паводле азначэння велічна-стрыманым парадным партрэце відавочна з'явіліся з ініцыятывы стваральнікаў выдання, і цяжар гэтай памылкі наўрад ці ўдасца перакласці на плечы ініцыятараў.

Пазбегшы неадназначнага, неардынарнага ў персаналіях, закругліўшы ўсе вострыя вуглы, аўтары лагічна адшукалі гэткую ж, стрымана кажучы, незабруджаную вальнадумствам графічную абалонку, якая злосна насмяялася з самога жанру параднага партрэту. Набор слоўных штампаў і беззмястоўных клішэ менш рэжа вока, чымся штампаванасць і прымітывізм графічных рашэнняў, якія сустракаюць ужо на вокладцы дзяржаўным сцягам на фоне каласоў і ўсмешкай кабеты, якая прыціскае да сябе дзяўчынку і замілавана глядзіць у аб'ектыў. Хочаш ці не хочаш, як спяваюць у нейкай песні, а згадаеш славуты раяль у кустах.

Уражваюць партрэты мастакоў у самым, па-расейску кажучы, «затрапезным» выглядзе, напрыклад дырэктар Мастацкага музею са звышмастацкай чупрынай, чые падкрэсленыя ракурсам і фонам пасмы неўпрыкмет ператвараюць дырэктарскую багемную інтэлігентнасць у экстравагантнасць (дый у дадатак сфатаграфаваны ён на фоне экспазіцыі, якая супярэчыць зместу нататкі). Цяжкавата зразумець, якое дачыненне мае генерал Герчык да планеты Нептун, выява якой упрыгожвае калаж на ягонай старонцы. Калі б існавала прэмія за неарыгінальнасць, на яе безумоўна маглі б прэтэндаваць старонкі пра ваенныя падзеі і асабліва пра П. М. Машэрава. Парадны партрэт небяспечна прыпадабняецца да наіўна-крывадушных алегорый савецкага плакату - сялянкі з сярпом, рабочага з кувалдай, інжынера са штангелем, партыйца на кумачовай трыбуне.

Большая частка ілюстрацыйнага матэрыялу здзіўляе, аднак, не недарэчнасцю ці неадпаведнасцю, а безаблічнасцю і неабавязковасцю, не маючы ўласнага гучання і нічога не

дадаючы да зместу. Выключна банальна выглядаюць старонкі, прысвечаныя Купалу, Дамейку, Сыракомлю, Багдановічу, не нясуць аніякае сэнсавае нагрузкі фотамантажы пра Быкава і Макаёнка.

Сервілізм стаў для стваральнікаў альбому цэментам, якім мантаваліся разнаякасныя тэксты, каб атрымалася замоўленае, а няўклюдна-пампезны стыль афармлення - сродкам самавыяўлення і самарэалізацыі, прасторай адноснай свабоды. Яны скарысталіся свабодай напоўніцу і не разлічылі, што выйдзе.

Мала што задума паказаць *народу,* якім яго бачыць у сваіх марах улада, досыць рызыкоўная (для ўлады, бо цяжка ўсцерагчыся, каб не нагаварыць лішняга). Ёсць яшчэ дадатковая небяспека, што служкі-выканаўцы выкарыстаюць уласныя ўяўленні пра тое, як іхняя ўлада бачыць іхні народ, і *падвыправяць* эскізы кіраўнікоў, каб зрабіць *яшчэ лепш,* - што непазбежна прынясе супрацьлеглы вынік.

На глянцавых старонках выдання на задумы моцных гэтага свету тлустым мазком накладаюцца плебейскія густы. Мара бачыць свой народ сціплым і працавітым спараджае нізку дагматычна-павучальных гісторый на матывы розных прафесій. Цалкам зразумелае імкненне кіраўніцтва ўшанаваць народныя таленты стварае нагоду прадэманстраваць неразуменне выканаўцамі праекту таго месца, якое мае прапанаваць мастаку эліта сучаснага грамадства (у выніку выйшла цэлая галерэя дзядзькоў у найдзіўнейшых апранахах), а крыху прыхаванае жаданне бачыць свой народ задаволеным увасабляецца ў нястрымным карагодзе адданых усмешак, скіраваных у аб'ектыў, - пачынаючы проста з вокладкі.

Уявім далёкае ...нацатае стагоддзе, княскі палац і трупу артыстаў-самавукаў. На загад гаспадара разыгрываецца перад мясцовай публікай п'еса «з жыцця сялян». Аўтарка п'есы, княгіня, грунтавалася на антычных, як ёй здавалася, узорах, а сялян сваіх аглядала пераважна праз акно палацу ці карэты. Артысты і мастакі яшчэ пазаўчора рабілі ў полі ці на кухні і свае меркаванні пра княскія густы вынеслі з народных гушчаў. Сярод гледачоў - купка суседзяў-шляхцюкоў, але з-за кулісаў

ды з напаўпрычыненых дзвярэй глядзяць усе, хто можа, бо дзе ж пабачыш такое дзіва, каб нашы Саўка ды Грышка павамі па сцэне перад панамі хадзілі ды словы розныя незразумелыя прамаўлялі. І не тое важна, што крывіцца і хавае ўсмешку пан Францішак N, які тры гады пражыў у Варшаве, а як рэагуе ўвесь народ. Бо хто ж там глядзіць?

Мы... Беларусы.

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/5
[image]

АЛЕГ ЛАТЫШОНАК
гісторык. Выкладае ў Беластоцкім унівэрсытэце. Апошняя публікацыя ў «Архэ аналіз «Гантынітан, праверaны часам».

Алег Латышонак
Доўгае вяртаньне ў Полацак

Я - палачанін з нараджэньня, хаця нарадзіцца давялося мне ў Эльблёнгу, над Вісьляным залівам у Польшчы. Месца майго нараджэньня даволі выпадковае, і расказваць пра яго я ня буду. Проста там пасялілася мая сям'я - дзед Кліменці, баба Ядзя і бацька Юрка - у выніку вялікага перасяленьня народаў, выкліканага другой сусьветнай вайною. Вярталіся яны зь нямецкага лягеру для прымусовых работнікаў на бацькаўшчыну, але ў Варшаве польскія чыгуначнікі сталі пытаць майго дзеда, куды ён з жонкай і сынам цягнецца. «На бацькаўшчыну». - «А дзе ваша бацькаўшчына?» - «У Беларусі, мы беларусы». - «А астатняя ваша сям'я дык дзе?» - «Ды ў Сібіры». - «І вам туды трэба?» Дзед Кліменці падзяліўся гэтымі думкамі з блізкімі, і яны перадумалі. Замест каб вяртацца на бацькаўшчыну, селі ў цягнік, які ехаў кудысьці на поўнач Польшчы, на новаздабытыя ад немцаў (тады афіцыйна называлася - вернутыя) землі. Гэты цягнік быў менавіта ў Эльблёнг.

Жыцьцё ў Эльблёнгу заўсёды ўспрымалася як нешта часовае. Бясконца ўсе гаварылі-расказвалі пра нашу бацькаўшчыну - Дубавое (дакладна: Райпаль-Дубавое), што пад Шаркаўшчынай у цяперашняй Віцебскай вобласьці (тады гаварылася - на

Віленшчыне). Дубавое не было спадчынным маёнткам Латышонкаў. Мой прадзед перасяліўся туды з Багоў, а паходзім мы з-пад Мёраў, магчыма, зь вёскі Латышонкі, што там знаходзіцца. Расказы пра Дубавое ў дзяцінстве амаль замянялі мне байкі: вялікі дом стаяў на ўзгорку над рэчкай Янкай, прытокам Дзісенкі, на панадворку расьлі сорак дубоў такой таўшчыні, што трэба было трох мужчынаў, каб абняць такі дуб. Усяго там было ўдосталь: зямлі і лесу, коней, кароў і авечак, і нават кніжак, бо разам з маёнткам купілі бібліятэку, якая памяшчалася ў вялікім куфры.

Расказы пра Дубавое тычыліся нашай бацькаўшчыны з малой літары. Нашай Бацькаўшчынай зь вялікай літары была Беларусь. Латышонкі былі пераканаными беларусамі, да такой ступені, што ўсё імі ўспрымалася па-нацыянальнаму. Мой дзед прыбег калісьці зь лесу (там, пад Эльблёнгам) і ўсхвалявана падзяліўся з маім бацькам навіной: «Сынку, мусіць, нашы ў лесе партызаняць!» А проста пабачыў на валуне намаляваную фарбай бел-чырвона-белую стужку, якой абазначаюць турыстычны шлях…

Пераканаными беларусамі Латышонкі сталі недзе ў час першай сусьветнай. Найбольш гэтая беларускасьць хвалявала наймалодшага зь дзедавых братоў, Косьціка. Баба Ядзя расказвала мне калісьці, што Косьцік быў ад гэтай сваёй новонабытай беларускасьці нейкі шалёны (сёньня кажам - у шокавым стане): «Заходзіць на забаву, кашулю на грудзі рвець і крычыць: «Я беларус!» Дадому вяртаецца, кашулю на грудзі рвець і крычыць: «Я беларус!» А прадзед пытаецца яго: «А навошта табе, сынку, гэтая Беларусь?»

Косьцік першым не вярнуўся на бацькаўшчыну. У 1920 годзе загінуў у перастрэлцы з бальшавікамі. Разам зь некалькімі сябрамі-землякамі дэзэртавалі з арміі Тухачэўскага і недзе ў Белавескай пушчы нарэзаліся на бальшавіцкі атрад. Бабуля вучыла нас, што калі будзем у Белавескай пушчы, маем памаліцца над невядомай валатоўкай, бо гэта можа быць Косьцікава магіла. Такім чынам я вывучыў дзіўнае слова «валатоўка». Пасьля не вярнуўся на бацькаўшчыну другі дзедаў брат, Іван, расстраляны, мусіць, у 1925 годзе ў Віньніцы ўва

Ўкраіне за «связь с Западом», бо напісаў ліст сям'і ў Польшчы; а тады трэці, Юзік, якога ў 1941-м запёрлі ў Беразьвеч. Ці загінуў тады, ці крыху пазьней, над Улай, дзе саветы вынішчылі ўсіх, каго гналі зь Беразьвечы, невядома. Дзядзька Віцька, які быў у Беразьвечы пасьля адступленьня саветаў, расказваў, што ў кельлі са зьняволенымі саветы ўкінулі гранаты, і ён блукаў па косткі ў крыві, але трупа дзеда Юзіка не знайшоў.

Мой бацька першы раз вяртаўся з Польшчы на бацькаўшчыну ў 1957 годзе. Сталін памёр, настала адліга, і бацька падумаў: пара дадому. Паехаў у савецкае консульства ў Гданьску прасіць дазволу на вяртаньне. Прыняў яго консул-грузін, які, пачуўшы, з чым бацька прыйшоў да яго, усклікнуў: «Молодой человек! Что вы, с ума сошли?!» Добры быў чалавек гэты грузін. Сказаў майму бацьку, што дасьць яму савецкую візу, пабачыць ён сваю бацькаўшчыну - і перадумае.

Такім чынам мой бацька і мая маці Вера змаглі наведаць родныя мясьціны. Мяне пакінулі ўдома пад апекай дзядоў, бо было мне тады ўсяго некалькі месяцаў. Пабачыўшы бацькаўшчыну, мой бацька сапраўды перадумаў, бо жыцьцё там было ў той час вельмі цяжкое. Нават расказаў пра гэтую паездку я ў памяці не захаваў.

Другі раз бацька стаў вяртацца на бацькаўшчыну зь Беластоку, куды пераехалі мы ў 1965 годзе «да сваіх». З аднаго боку, было тут добра, бо хоць зямля была свая. Так, прынамсі, казаў дзед Кліменці, маючы на ўвазе тое, што ўжо можа спакойна памерці, упэўнены, што будзе ляжаць у сваёй, беларускай зямлі. З другога боку, свой, беларус, данёс на майго бацьку як на нацыяналіста. Быў 1968 год, у Польшчы змагаліся зь «сіяністамі», а паколькі ў Беластоку жыдоў не хапала, узяліся за тутэйшых нацменаў. Бацьку пацягнулі на допыты ажно ў Службу бясьпекі (так называлася тады палітычная паліцыя), да таго ж у яго забралі мабілізацыйную карту. Бацька быў афіцэрам рэзэрву, і такі недавер да ягонай асобы вельмі яго абурыў.

Тады ён ізноў вырашыў вяртацца на бацькаўшчыну. У савецкім пасольстве ў Варшаве абвесьцілі яму наступнае: ягоная Бацькаўшчына - у Савецкім Саюзе. Хоча вяртацца - сьпярша

павінен адпрацаваць некалькі гадоў у Сібіры, а пасьля нейк з дапамогай сям'і перабярэцца ў сваю Беларусь. І гэткую савецкую прапанову разглядалі мы ўсур'ёз. Помню сямейную нараду і нешта накшталт галасаваньня: едзем ці ня едзем. Я быў за тое, каб ехаць - начытаўся кніжак пра рамантыку вялікіх пабудоваў камунізму і «асваеньне» Сібіры, ці як гэта там называлася. Усё-такі мяне перагаласавалі, і засталіся мы ў Беластоку.

Першы раз я пабачыў бацькаўшчыну ў 1974 годзе. Тады ў Шаркаўшчыне сабралася ўся наша сям'я. Прыехаў нават дзядзька Віцька, пасьля сібірскай ссылкі прыгавораны на пажыцьцёвае пасяленьне з таго боку Ўралу. З Дубавога засталося няшмат: адна хата і тры дубы. Рэчка Янка амаль высахла. Усё так зьмянілася, што мой бацька ня мог знайсьці дарогі дадому. Стаялі мы на ростані пад нейкім апаленым дубам, а ў бацькі ў вачах былі сьлёзы. Пасьля гэтага яму ня надта хацелася вяртацца на такую бацькаўшчыну, але менавіта тады ён зьдзейсьніў сваю жыцьцёвую мару і пабываў у Полацку. Рухацца такім, як мы, чужынцам дазволена было толькі ў межах раёну. Бацька быў чалавекам вельмі законапаслухмяным і проста баяўся савецкай улады. Дарэчы, з гэтымі незаконнымі паездкамі сапраўды не былі жарты. Вярталіся мы ў Польшчу разам зь сям'ёй, падобнай да нашай, якая таксама рызыкнула падчас побыту на бацькаўшчыне выехаць па-за межы раёну, і яе выдварылі з Савецкага Саюзу.

Бацька з маці селі ў маршрутны аўтобус і заехалі ў Полацак. У Полацку бацька дакрануўся далоньню да муроў Сьвятой Сафіі (у сярэдзіну не пускалі) і абмыў ногі ў Палаце. Гэты жэст паломніка ля жывой вады быў для яго вельмі важны, бо расказваў ён мне пра гэта нейк падкрэсьлена. Маці, як то жанчына, дамагалася, каб купіць ёй залаты пярсьцёнак, і дзеля гэтага бацькі заехалі яшчэ ў Наваполацак. Там у нейкай краме маці купіла сабе пярсьцёнак з камянямі (захавала яго па сёньняшні дзень).

Бацька, які, перасякаючы рэальныя межы, заўсёды быў нейкі ўспалоханы, у летуценьнях за нішто меў межы дзяржаваў, ваяводзтваў, губэрняў і абласьцей. Выхаваны быў СБМ-ам у

духу беларуска-крывіцкім і лічыў сябе палачанінам. Дарэчы, такіх беларусаў, як пакаленьне майго бацькі, дасьпелае ў час другой сусьветнай вайны, цяпер ня стрэнеш. Усім нам замінае пэўная доля выбару. Мой бацька быў беларусам безаглядным, а ягоны крывіцкі патрыятызм - амаль бязьмежным.

Калісьці, калі ехалі мы ў Маскву, наш цягнік прыпыніўся ў Смаленску, і выйшлі мы з бацькам з вагона паглядзець на горад. Туманна ўспамінаю панараму Смаленску, узгоркі, купалы цэркваў, але вельмі добра памятаю, як бацька, бачачы ўсё гэта, кінуў мне коратка: «Не, сынку! Не даруем!» Нашым крывіцкім горадам ён лічыў таксама Пскоў і прыдбаў некалькі альбомаў пра гэты горад. Гартаў я гэтыя альбомы зь вялікім замілаваньнем. І ўсё-такі крывіцкі патрыятызм бацькі меў істотнае абмежаваньне: ён дараваў Вільню літоўцам. Помню, як у 1974 годзе, калі мы ехалі на бацькаўшчыну менавіта празь Вільню, бацька сказаў мне, што Вільня павінна належаць літоўцам і што ў Беластоку больш беларушчыны, чымся ў гэтай Вільні.

Як прадмет студыяў я, натуральна, выбраў гісторыю. Дзед запомніўся мне з кніжкай у руцэ. Помню нават кніжку - «Роб Рой» Уолтара Скота. Дзед чытаў па-польску, хаця гаварыў выключна па-беларуску, нават з палякамі. Бацька хацеў быць гісторыкам, але практычна вырашыў, што на чужой зямлі лепей стаць інжынэрам-будаўніком - прынамсі хлеб з гэтага будзе. Тым ня менш, начытаны быў у беларускай гісторыі неймаверна. Зь беларускіх гістарычных пэрсанажаў двох трактаваў як сваіх асабістых ворагаў: Ягайлу і Язафата Кунцэвіча. Затое полацкіх князёў любіў як родных. Маю сястру хацеў назваць Рагнедай, але маці, хаця беларуска ня менш цьвёрдая за бацьку, на такую фанабэрыю не згадзілася, і ахрысьцілі сястру Тамарай, ды яшчэ на другое назвалі Аленай, бо гэтага другога імя дамаглася бабуля-каталічка. Калі сястра падрасла, вельмі шкадавала, што не назвалі яе ўсё-такі Рагнедай.

Падчас застольляў мы зь сястрою мусілі чытаць з памяці патрыятычныя вершы. Наагул, гэтых дэклямацыяў мы не любілі. Седзячы ў дзіцячым пакоі і чуючы, што з чарговымі

перакуленымі чаркамі ўсе пераходзяць на беларускую мову, мы беспамылкова здагадваліся, што надыходзіць момант, калі бацька нас пакліча, каб пахваліцца нашым чытаньнем з памяці па-беларуску.

Але Багдановіча палюбілі мы без прымусу. Ён стаў маім першым кніжным настаўнікам гісторыі Беларусі. Бацька цягнуў у хату кожную кніжку пра гісторыю Беларусі, якая папала яму ў рукі, і я ўсё гэта чытаў. Маім улюбёным героем стаў Усяслаў Чарадзей. Я вельмі шкадаваў, што так мала крыніцаў засталося з нашай гісторыі і марыў, што гэта я адшукаю Полацкі летапіс. Раз нават, калі ўжо быў студэнтам, прысьнілася мне, што я знайшоў нарэшце Полацкі летапіс у нейкім склепе.

Калі я зьбіраўся ў Кракаў, каб там вывучаць гісторыю, бацька сказаў мне: «Сынку, хлеба з гісторыі мець ня будзеш, але прынамсі ты напішаш сапраўдную гісторыю Беларусі». Праўду кажучы, я думаў пра гісторыю Беларусі як пра гісторыю нейкага памерлага народу: напішу гэтую гісторыю, каб сьлед нейкі застаўся. І не скажу, каб я занадта да гэтай працы тады прыкладаўся, але ж кніжкі чытаў, а чытаць у Кракаве было што. І хутка зразумеў адно: бацька меў рацыю, калі гаварыў, што нас, беларусаў, проста абакралі з нашай гісторыяй. Абурэньне на зладзеяў не пакідала мяне доўга; яшчэ й цяпер тое абурэньне недзе ўва мне тлее.

Дзякуй Богу, чуткі пра сьмерць Бацькаўшчыны неўзабаве выявіліся перабольшанымі.

Наступным разам пабываў я на бацькаўшчыне сам, у 1991-м. З Дубавога не засталося ўжо анічога. Правялі нівэліроўку, і на месцы Дубавога валяліся толькі некалькі кавалкаў цэглы. Краявід мясьціны быў як быццам расейскі: «степь да степь кругом». Але якраз тады ў Менску народ выйшаў на вуліцу, і папёр я ў беларускую сталіцу, каб стаць на плошчы пад бел-чырвона-белыя сьцягі. Гэтага дня ніколі не забуду, бо ён для мяне назаўсёды надзеяй, як таму пацуку з экспэрымэнту. Кінулі дваіх пацукоў у акварыюм з высокімі сьценамі. Першы плаваў гадзіну-другую - і, зьнямоглы й зьняверaны, пайшоў на дно. Другому, калі стаў слабець, падсунулі кладачку. Ледзь ачухаўся, скінулі яго зноў у ваду й забралі кладачку. Плаваў

яшчэ два дні. Так і са мною. Калі зьняверуся, успамінаю, што цуды здараюцца, як у той дзень пад сьцягамі, і ўсё плыву надалей.

Бацьку ніколі не пакідала вера ў незалежнасьць і вяртаньне на бацькаўшчыну. Дачакаў ён тае незалежнасьці, але ўжо сьмяротна хворым. Пра нашае вяртаньне на бацькаўшчыну вялі мы рытуальныя размовы да ягонай канчыны ў 1993 годзе. Калі ў Менску скінулі з Дому Ўраду наш сьцяг, адна са старых знаёмых пазваніла маёй маці і з выбачэньнямі, каб быць правільна зразуметай, сказала, што мо й добра для Юркі, што пасьпеў памерці, калі бел-чырвона-белы сьцяг яшчэ лунаў над Бацькаўшчынай.

Калі выбухла тая незалежнасьць, усё пайшло ня так. Замест каб у Полацак, незалежнікі сталі вяртацца ў Вільню. Паслухалі б лепей майго бацькі. Што ж, як вучыў вялікі польскі гісторык Юзаф Шуйскі, «фальшывая гісторыя - настаўніца фальшывай палітыкі». Гісторыю сапраўды ў нас скралі, але дарма вінаваціць за гэта палякаў і расейцаў, бо зрабілі гэта яшчэ на пачатку XVI стагодзьдзя літоўцы; і ня Вільню яны ў нас скралі, а Полацак. Паляк на літоўскіх паслугах Мацей Стрыйкоўскі толькі распаўсюдзіў літоўскую ману, а маскоўцы ўсё паўтаралі за ім. Стрыйкоўскі сымбалічна «саслаў» Рагвалода й Рагнеду з Полацку ў Пскоў, як быццам у Полацку такіх і не было. Замест Рагвалодавічаў у Полацку на два зь лішкам стагодзьдзі расьселіся нейкія Мінгайлы ды Гінвілы. А ў часы фэадалізму пазбаўленьне народу дынастычнай традыцыі абазначала пазбаўленьне дзяржаўнасьці: няма дынастыі - няма дзяржавы. Лёгка далося гэта Стрыйкоўскаму, бо й Полацку тады не было - растаптаў яго Іван, тыран маскоўскі. Сэрца Беларусі спынілася, пачаўся доўгі летаргічны сон.

Полацкі летапіс даўно мне ня сьніцца. Цяпер разумею, што не шукаць яго трэба, а наноў пісаць, бо пісаць наноў сваю гісторыю - заданьне кожнага пакаленьня. І сапраўднай гісторыі Беларусі я ўжо пісаць не зьбіраюся - досыць зь мяне будзе, калі напішу сапраўды сваю. А пісаць гісторыю Беларусі вельмі цяжка, асабліва пра Полацак: няма пісьмовых крыніцаў. Нядаўна дайшоў я да ручкі - засумняваўся ў тым, ці існавалі

Рагвалод і Рагнеда. Вось табе сапраўдная гісторыя Беларусі, быццам бы я Стрыйкоўскі, а не Латышонак. Як ні глядзі, Рагвалод і Рагнеда - постаці негістарычныя. З другога боку, яны самыя сапраўдныя, бо гэта за Рагнеду паспрачаліся мае бацькі. Так ці інакш пачну сваю гісторыю Беларусі з Полацку, бо, аглядаючыся на беларускі шлях, на яго пачатку за туманам стагодзьдзяў бачу горад на Палаце.

У Полацку я быў толькі ў 1994 годзе. Заехалі мы туды з маім сябрам, археолягам Генадзем Семенчуком, проста з раскопак на востраве на Богінскім возеры. Полацак, прызнаюся шчыра, ня надта мне спадабаўся. Сакрат Яновіч аднойчы пажартаваў сумна зь Менску, што выглядае гэты Менск пад бел-чырвона-белымі сьцягамі, як горад пад беларускай акупацыяй. Дык вось Полацак у маім адчуваньні нашмат больш заслугоўваў падобнага акрэсьленьня. Да таго ўсё здавалася мне нейкім малым і сьціплым.

З часам я зразумеў, што вяртаньне ў Полацак нагадвае вяртаньне да месца нараджэньня. Кожнага наведніка месца свайго нараджэньня непазьбежна чакае расчараваньне. Усё быццам ня тое: горы выяўляюцца ўзгоркамі, рэкі - рачулкамі, зрэзаныя пракаветныя дубы. Усё ж такі ў памяці месца нараджэньня застаецца такім, якім яно было тады, у дзяцінстве; і кожнага чалавека нейкая непераможная сіла туды цягне. Таму кожнаму беларусу трэба дакрануцца далоньню да муроў Сьвятой Сафіі і змыць пыл чужых дарог у сьвятой рацэ Палаце.

Налета ў Полацак!

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2004/11/5
[image]

Гутарка з Уладзімерам Арловым «Ленін ня раз бываў у Полацку…»

- Ці не здаецца табе, што створаны, у тым ліку й табой, міт Полацку вельмі штучны? Шмат хто падчас першага візыту ў крыўскую сталіцу ня быў уражаны пабачаным.

- У мяне ёсьць знаёмы, які сьвядома ня езьдзіць у Полацак, каб не разбурыць вобразу гораду, які збудаваў ува ўяўленьні. Але, я думаю, якраз стваральнік вобразу і ня быў бы расчараваны.

Каб уразіцца, трэба быць гатовым да гэтага, знаходзіцца на адпаведнай хвалі.

Японец можа выправіцца за сотні кілямэтраў, каб палюбавацца нават ня сымбалем сваёй краіны - Фудзіямай, а проста поўняю ў нейкім адметным месцы.

Параўноўваць вандроўку ў сталіцу нашай першай дзяржавы з падарожжам да поўні ў якой-небудзь горнай цясьніне на Хакайда, вядома, некарэктна. Для Беларусі Полацак (як для палякаў Гнезна або для гішпанцаў Таледа) мае, па сутнасьці, сакральнае значэньне. Таму, каб убачыць і адчуць тое, што

неабходна там адчуць і ўбачыць, ты мусіш быць крыху вернікам і мець гістарычную памяць.

Кажуць, у прарокаў і ў самога Ісуса дрэнна пахла з чаравікаў, дый сёньня ў Сьвятой Зямлі сустракаюцца (нават без уліку палестынскіх тэрарыстаў) мясьціны, ня самыя бясьпечныя з гледзішча санітарыі, але ж гэта не спыняе паломнікаў…

- Часам можна пачуць скептычнае пытаньне: хіба Полацкае княства магло быць першай беларускай дзяржавай, калі яго тэрыторыя не займала й паловы сёньняшняй Беларусі?

- Па-першае, пытаньне «скептыкаў» проста недарэчнае. Сам па сабе памер тэрыторыі не зьяўляецца прыкметай, тым больш адзінай, існаваньня або неіснаваньня дзяржавы.

Па-другое, у «найлепшыя часы», за князем Усяславам Брачыславічам Чарадзеем, Полацкае княства займала абшар, большы за палову сучаснай Беларусі, і было сваёй тэрыторыяй прыкладна роўнае такім тагачасным эўрапейскім краінам, як герцагства Баварскае або каралеўства Партугальскае. Апрача сталіцы крыўская дзяржава налічвала ў XI-XII стагодзьдзях яшчэ паўтара дзясятка гарадоў: Віцебск, Браслаў, Заслаўе, Усьвят, Копысь, Менск, Ворша, Лукомль, Лагойск, Барысаў… На землях продкаў сучасных латышоў стаялі гарады Герсіка і Кукенойс, дзе кіравалі полацкія васалы. Улада Рагвалодавічаў пашыралася на ніжняе Падзьвіньне з выхадам да Балтыйскага мора. Полацак разам з Кіевам і Ноўгарадам быў адным з трох найбуйнейшых палітычных, культурных і народаўтваральных цэнтраў Усходняй Эўропы, што сымбалізаваў узьведзены над Дзьвіной Сафійскі сабор. (Сапраўднай трагедыяй для ўсходніх славянаў сталася зьяўленьне празь некалькі стагодзьдзяў новага цэнтру - Масквы, якая падмяла пад сябе наўгародзкі этнас зь ягонымі дэмакратычнымі традыцыямі, а затым заявіла пра свае прэтэнзіі на беларускія і ўкраінскія землі.)

Любая спроба Кіева пасадзіць у крывіцкай сталіцы сваіх стаўленікаў нязьменна канчалася правалам. Камусьці можа здавацца, што тут усё адно былі «задворкі Эўропы», але, напрыклад, бізантыйскія базылеўсы з славутага дому Камнінаў чамусьці вырашылі парадніцца з Рагвалодавічамі, і Ўсяслава

дачка стала жонкаю канстантынопальскага імпэратара Аляксея.

Асобнае месца незалежнай Полацкай зямлі ўва ўсходнеэўрапейскай геапалітыцы сталася невырашальнай праблемаю, «галаўным болем» для ўсіх «клясычных» расейскіх гісторыкаў пачынаючы ад Васіля Таціщава, і застаецца такім дагэтуль. Наша першая дзяржава ня клалася ў схему «адзінай старажытнай Русі», таму й сёньня ў Расеі - і ў падручніках, і ў манаграфіях - Полацкае княства прыгадваецца ўскосна, а часам і наагул не ўспамінаецца. Памятаю, калі ў 1980-х шырока адзначалася 800-годзьдзе «Слова пра паход Ігаравы» (Усяслаў Чарадзей там, як вядома, адзін з галоўных герояў, прыклад дзяржаўнага дзеяча, якога так не хапала пры канцы XII стагодзьдзя), акадэмік Дзьмітры Ліхачоў вырашыў у юбілейнай тэлеперадачы выказаць наконт гэтага сваю думку. Выявілася, што «вместо того, чтобы радеть о единстве Русской земли, Всеслав провел свою жизнь в беспутных походах». Калі імпэрскі стэрэатып мысьленьня, паводле якога незалежнасьць Полацку - абсалютнае зло, падзялялі вучоныя такога рангу, дык чаго патрабаваць ад гісторыкаў меншага калібру? Пагатоў ад аўтараў «скептычнага пытаньня»?

Заўважым пры гэтым, што жыхары Полацкага княства ня мелі і, натуральна, не маглі мець беларускай нацыянальнай сьвядомасьці ў сучасным разуменьні, як ня мелі ў тыя часы нямецкай сьвядомасьці баварцы або італьянскай - генуэзцы. Працэс фармаваньня эўрапейскіх нацыяў адбываўся ў XIX стагодзьдзі, а для нас ня скончыўся й сёньня.

- Прапаную ад старажытных герояў перайсьці да пэрсанажаў тваіх «Полацкіх апавяданьняў». Ці адгукаліся іх прататыпы?

- «Полацкія апавяданьні» пішуцца ад першай асобы, таму нярэдка прататыпам героя зьяўляецца сам аўтар, хоць толькі надзвычай наіўны чытач можа паставіць паміж імі знак роўнасьці. Напрыклад, калі спартыўная «зорка» школы Аня з апавяданьня «Малекула» аддаецца ўкрай разгубленаму «мне», гэта зусім ня значыць, што на месцы «мяне» быў менавіта я (або што я быў такі ўжо разгублены).

Я-прататып адгукаюся на тэксты згаданага цыклу наступным чынам: мне не надакучыла быць прататыпам.

Што да іншых… Часам з сумам думаю, што добрая палова маіх герояў-правобразаў ужо ніяк ня могуць адгукнуцца на новыя публікацыі, бо чакаюць мяне ў лепшым сьвеце. (Спадзяюся, расстаньне нашае зацягнецца.) Дзесьці там, у нябесным Полацку, нядаўна сустракалі Юрку Весялова, жыцьцё якога ў гэтай рэальнасьці, адрозна ад літаратурнай, склалася больш шчасьліва, чым у ягонага аднайменьніка з «Рэквіему для бэнзапілы», расьпілаванага на кавалкі аўганскімі маджахедамі.

А самы ўдзячны чытач «Полацкіх апавяданьняў» - мой сябар дзяцінства і ўжо даўні грамадзянін Ізраілю Вова Цымэрман. (Дарэчы, у ягоным пашпарце імя запісанае якраз так, як нас некалі клікалі мамы, - Vova.) Ён асабліва любіць перачытваць мае тэксты, калі там, у іхнай краіне, дзе-небудзь паблізу кінуць бомбу. Тады Вову агортвае туга, і ён ідзе ў краму ў стылі «настальжы», каб узяць пляшку «белай» і паўкілі каўбасы «Любительская» (цэны ў шэкелях такія самыя, як былі калісьці ў савецкіх рублях). Вова выпівае сваю пляшку і згадвае нашую ціхую ўтравелую полацкую вуліцу, на якой можна было адгуляць два таймы ў футбол, перш чым ня тое што выбухне бомба, а проста праедзе аўтамабіль. Потым Вова набірае мой тэлефон, і, слухаючы яго, я думаю, што ў цяперашнім Полацку мне не хапае габрэяў і ідышу, на якім гаварыла бальшыня нашых суседзяў.

Зрэшты, значна больш не стае мне беларускай мовы, на якой сёньня вучаць усяго ў адной гарадзкой школе. Аднак усё пазнаецца ў параўнаньні: у маім маленстве на ўвесь Полацак, як памятаецца, была ўсяго адна беларускамоўная шыльда - «Лазьня». Менавіта так, з дарэформавым мяккім знакам, бо насамрэч гэтае доўгі час загадкавае для мяне слова было не напісанае, а выкладзенае з цэглы (безумоўна, яшчэ да 1933 году) над уваходам у «баню».

Ну, а самы дзіўны водгук на «Полацкія апавяданьні» данёсься да мяне ад аднаго паэта, што прыйшоў на сьвет у той самай радзільні, дзе і я, і Вінцэсь Мудроў, і Лявон Баршчэўскі, і Пятро Васючэнка, і Іна Снарская… (Праўда, калі котка прывяла

кацянатаў у печцы, гэта яшчэ не азначае, што ўсе яны - піражкі.) Дык вось, той паэт публічна заявіў, што нічога, падобнага напісанаму Арловым у полацкіх апавяданьнях, насамрэч не было.

Я чамусьці ўявіў якога-небудзь артадаксальнага ерусалімскага рабіна і ня менш артадаксальнага дзеяча ад літаратуры савецкага рэалізму, што, пазнаёміўшыся з «Майстрам і Маргарытай», абурана абвясьцілі: нічога такога ні ў Ерусаліме, ні, тым больш, у Маскве ніколі не адбывалася.

- Апавяданьне «Вова Цымэрман» ты канчаеш апісаньнем сну: табе прысьніўся Полацак, які «дужа выдаваў на Нью-Ёрк зь вядомага фільму «Аднойчы ў Амэрыцы». Ты можаш уявіць Полацак ультра-ўрбаністычным - з хмарачосамі, стракатымі вітрынамі, мнагалюдным і вірліва-мітусьлівым?

- Здаецца, у тым сьне мы былі гангстэрамі й кагосьці гвалцілі й мачылі. Хочацца спадзявацца, што дзеяньне сапраўды адбывалася ў Нью-Ёрку.

А калі сур'ёзна, дык Полацак з ультрасучаснымі вітрынамі, з размаітымі кавярнямі і рэстаранчыкамі на кожным кроку, шматмоўны, шматлюдна-вірлівы ад турыстаў (але не мітусьлівы: тут іншая атмасфэра) уяўляю бязь цяжкасьці. Такім ён у XXI стагодзьдзі і будзе.

Толькі ніякіх хмарачосаў у старадаўняй частцы гораду! Хопіць вусьцішнага «дому з вушамі», што зьнявечыў гістарычны сылюэт Полацку, паўстаўшы на месцы ўзарванага ў 1964-м сабору Сьвятога Стафана. Савецкі дысыдэнт генэрал Грыгарэнка ў мэмуарах пісаў, што на гэтым храме, велічным помніку віленскага барока, адпрацоўвалася новая, «прагрэсіўная» мэтодыка руйнаваньня «культавых будынкаў». У пэрспэктыве добра было б нейкую падобную мэтодыку выпрабаваць на самім «доме з вушамі». Я чуў, што праект аднаўленьня сабору ўжо існуе.

А хмарачосы няхай цягнуцца ў неба ў Наваполацку.

- Ці ты падтрымліваеш ідэю аб'яднаньня Полацку й Наваполацку? А таксама стварэньне Полацкай вобласьці?

- Для мяне Полацак і Наваполацак ужо сёньня адзіны 200-тысячны горад. Даехаць ад наваполацкага пляцу Будаўнікоў да пляцу Скарыны ў Полацку можна за пятнаццаць хвілінаў, а цяперашні нью-ёрскі жыхар Сяржук Сокалаў-Воюш калісьці давёз мяне за дзесяць. Аднак рэч ня столькі ў адлегласьцях і сучасных транспартных камунікацыях, як у тым, што аб'яднаньня вымагае і гістарычна-культурная, і эканамічная, і адміністрацыйная, і якая заўгодна іншая лёгіка, апроч лёгікі чынавенства, частцы якога давядзецца разьвітацца з пасадамі.

Полацкая вобласьць ужо існавала і ў сярэдзіне 40-х гадоў мінулага стагодзьдзя ледзьве не была «прырэзаная» да Расейскай Фэдэрацыі (уяўляеш - полацкі, браслаўскі і глыбоцкі спэцназ у Чачэніі?).

Ніякага сэнсу ў аднаўленьні Полацкай вобласьці, шчыра кажучы, ня бачу. Іншая рэч - перанос у Полацак сталіцы краіны, што колькі гадоў таму прадказаў астроляг Павал Глоба, грунтуючыся, дарэчы, на праройтве свайго сярэднявечнага полацкага калегі, славутага «зьвяздара» Васіля Нямчына. У сьвятле ўзьніклай у ХХ стагодзьдзі ўсясьветнай тэндэнцыі зьмены сталіцаў прадбачаньне не выглядае такім ужо фантастычным.

- Ян Максімюк лічыць, што Полацак мусіць навучыцца прадавацца.

- Вядома. Дзесяць гадоў таму я сустракаў у нас на Верхнім замку і нямецкіх, і французскіх, і італьянскіх турыстаў, у храме Спаса гаварыў з паломнікамі з Грэцыі. Пасьля перамены палітычнай сытуацыі хутка надышоў «мёртвы сэзон».

Але прыцягненьне полацкай аўры, полацкага міту бярэ сваё. Апошнім часам каля Сафійкі можна за дзень убачыць ня толькі дзясяткі аўтобусаў зь беларускімі турыстамі, але й ізноў пачуць эўрапейскія мовы, спаткаць групы японцаў і карэйцаў.

Ты ж ня будзеш спрачацца - на пачатку новага стагодзьдзя

горад зь яго Нацыянальным гістарычна-культурным запаведнікам, Сафійскім саборам, Спаса-Эўфрасіньнеўскім манастыром, дзясяткам музэяў, цудоўнай карціннай галерэяй, унівэрсытэтам няўхільна «набірае пункты». Практычна кожны год адчыняецца новы музэй або помнік. Полацак ператвараецца ў першы паводле значнасьці турыстычны цэнтар Беларусі, у адну з культурных і духоўных сталіцаў краіны.

- Якія помнікі мусяць зьявіцца на вуліцах крыўскай сталіцы?

- «Ад Полацку пачаўся сьвет», - напісаў аднойчы Рыгор Барадулін. Калі мець на ўвазе сьвет беларускай гісторыі і культуры, у гэтых радках няма ніякага перабольшваньня.

У краіне ня знойдзецца іншага гораду, які даў бы Беларусі і сьвету столькі выдатных асобаў. Але ня будзем стамляць чытача пералікам імёнаў, ужо вернутых у нацыянальную сьвядомасьць. Вернутых у тым ліку і дзякуючы помнікам, што зьявіліся нядаўна ў Полацку, - Эўфрасіньні, Сімяону… Бронзаваму Скарыну ўжо не самотна.

Я рады, што гарадзкімі кіраўнікамі на чале з мэрам Уладзімерам Тачылам (ты ведаеш, што мэр, натхняючыся гісторыяй, піша вершы?) авалодала ідэя стварэньня коннага помніка Ўсяславу Чарадзею. На маю думку, ён мусіць знайсьці сабе месца недзе паблізу Сафійскага сабору, збудаванага на загад гэтага князя.

Трэба падумаць, як тамсама, на Верхнім замку, увекавечыць памяць Усяслававых папярэднікаў - Рагвалода й Рагнеды, нашага першага асьветніка князя Ізяслава, ягонага сына - ваяра Брачыслава, што аднавіў незалежнасьць Полацкага княства ад Кіева. А магчыма, Рагвалод і Рагнеда пачуваліся б больш утульна на беразе Палаты, там, дзе стаяў іхны, найстаражытнейшы Полацак і дзе цяпер турысты не заўсёды й заўважаюць сьціпленькую стэлу з надпісам «Гарадзішча».

У Спаса-Эўфрасіньнеўскім манастыры або на шляху да яго мусяць зьявіцца помнікі дойліду Іаану і ягонаму сучасьніку, а верагодна, і блізкаму знаёмаму майстру-ювэліру Богшу, аўтару

нашай нацыянальнай рэліквіі - крыжа сьвятой Эўфрасіньні. Мне ўяўляецца, што яны, Іаан і Богша, маглі б вярнуцца да нас у камені або бронзе разам, склаўшы супольную скульптурную кампазыцыю. Гэтаксама, як паплечніцы і спадкаеміцы Эўфрасіньні Полацкай - яе сёстры Гардзіслава і Зьвеніслава, у манастве Эўдакія і Эўпраксія.

Каля карпусоў былой Полацкай акадэміі, куды сёлета, спадзяюся, пераедуць гуманітарныя факультэты Полацкага ўнівэрсытэту (які, заўважым, пакуль застаецца без імя), - самае месца выбітным выкладчыкам і выхаванцам колішніх калегіюму й акадэміі. Ува ўнівэрсытэцкім двары хочацца бачыць, умоўна кажучы, «галерэю гонару» зь бюстамі філёзафа й паэта Мацея Казімера Сарбеўскага, «хрысьціянскага Гарацыя», чые кнігі ілюстраваў Рубэнс; славутага астранома, рэктара Віленскай акадэміі Марціна Пачобута-Адляніцкага; жывапісца Валентыя Ваньковіча, аўтара знакамітых партрэтаў Міцкевіча, Напалеона, Пушкіна; гісторыка, археоляга й этнографа Канстанціна Тышкевіча… Мару пра помнік вучонаму-энцыкляпэдысту Габрыелю Грубэру (гэта яму належала ідэя пераўтварэньня Полацкага калегіюму ў вышэйшую школу) і помнік выхаванцу Акадэміі Яну Баршчэўскаму. (А недзе ў зацішным кутку няхай прысядзе на лавачку ягоны неўміручы шляхціц Завальня.)

Гораду не стае мэмарыяльных дошак, дзе б згадваліся імёны вартых гэтага асобаў, што нарадзіліся або жылі тут. Ці не адзіны вынятак - дошка на доме, у якім спыняўся цар Пётар I, але ў дадзеным выпадку мы маем справу хутчэй з праяваю посткаляніяльнай сьвядомасьці, бо для Полацку расейскі цар - найперш злачынца, забойца ўніяцкіх сьвятароў у Сафійскім саборы. Сам храм на загад Пятра быў пасьля ператвораны ў вайсковае сховішча і ўрэшце зруйнаваны (паводле «дзіўнай выпадковасьці» якраз у дзень адыходу з гораду «саюзных» на той час расейскіх войскаў і выбухнулі іхныя парахавыя прыпасы ў саборных сутарэньнях).

Ушанаваньня мэмарыяльнымі дошкамі заслугоўваюць многія. Я згадаю толькі два імя: заснавальнік беларускага кінэматографу Юры Тарыч і таксама народжаная ў Полацку амэрыканская

пісьменьніца Мэры Энцін, якая ў 13-гадовым веку пераехала разам з бацькамі ў ЗША. Яе аб'ёмістая, на 400 старонак, кніга «Зямля абяцаная» (The Promised Land. Boston-New York, 1912) - аўтабіяграфічная. Нядаўна зь велізарнай цікавасьцю пазнаёміўся з рукапісам беларускага перакладу «полацкіх» разьдзелаў. Даўно не чытаў нічога больш натхнёнага за апісаньне сырнага пірага, што пяклі прыдзьвінскія габрэі…

Калі трактаваць паняцьце «помнік» шырока, нельга не сказаць пра гарадзкую тапанімію. Сытуацыю зь ёю цяжка назваць іначай як ганебнай. Дзякуй Богу, што вуліца, якая вядзе ад Сафіі да Спасаўскага манастыра, нарэшце зьмяніла назву і цяпер мае імя не таварыша Фрунзэ, а сьвятой Эўфрасіньні. На жаль, гэта ледзь не адзіны прыклад. Багаяўленскі сабор, Музэй беларускага кнігадрукаваньня й некалькі іншых музэяў знаходзяцца на вуліцы Леніна (былая Ніжнепакроўская), помнік Сімяону Полацкаму - на праспэкце Карла Маркса, які, як вядома, разам з Уладзімерам Ільлічом ня раз бываў у Полацку ў суправаджэньні Дзяржынскага, Сьвярдлова, Войкава, Сака й Ванцэці ды іншых таварышаў, імёнамі якіх названыя вуліцы ў гістарычным сэрцы гораду.

- Ты ніколі не пісаў пра Полацак 20-х гадоў мінулага стагодзьдзя - пары беларусізацыі. Адмоўна ставішся да нацыянал-камунізму?

- Нацыянал-камуністы, як сьведчыць прыклад Літвы, некаторых рэспублік былой Югаславіі або, у нейкай ступені, Украіны, здольныя ў пэрыяд пераходу да дэмакратыі адыграць надзвычай важную ролю. У Літоўскай ССР, як слушна заўважыў сучасны амэрыканскі гісторык Тыматы Снайдэр, нацыяналістычная ідэалёгія на афіцыйным узроўні мірна суіснавала з камуністычнай. Беларусі пры канцы 80-х - пачатку 90-х гадоў мінулага стагодзьдзя востра бракавала асобаў кшталту Альгірдаса Бразаўскаса. У сваёй «Найноўшай гісторыі Беларусі» беларускі гісторык з Польшчы Яўген Мірановіч піша, што «сярод прадстаўнікоў кіраўнічых колаў КПБ знайшлося нямала людзей, сапраўды зацікаўленых беларусізацыяй партыйных і дзяржаўных структураў», а ў якасьці прыкладу называе Пётру Краўчанку. Іншых Мірановіч, відаць, ня ведае з

той простай прычыны, што іх не існавала ў прыродзе. Апрача сакратара Віцебскага абкаму КПБ Іосіфа Навумчыка, які нават прыяжджаў на паседжаньне нашага літаб'яднаньня «Крыніца» і ўжо тады, у савецкія часы, пакінуў уражаньне зусім не партыйнага цэрбэра, а чалавека амаль нашага.

Калі вярнуцца ў 1920-я, то становішча выглядала несумненна лепей. Былі Чарвякоў, Жылуновіч, наркамы кшталту Антона Баліцкага ці Ўсевалада Ігнатоўскага…

У маіх «Таямніцах полацкай гісторыі», якія храналягічна завяршаюцца першай усясьветнай вайной, можна сустрэць экскурсы як у 20-я гады зь іх беларусізацыяй, так і ў 30-я, калі яе развой ужо стаў гісторыяй, а сябар «Маладняку» палачанін Макар Шалай знайшоў у сабе мужнасьць, седзячы ў менскай «амэрыканцы», даваць сьледчаму зьдзеклівыя паказаньні, нібыта разам зь сябрамі-пісьменьнікамі меў на мэце адарваць БССР ад Савецкага Саюзу й далучыць да Індыі…

Ня выключана, што калі-небудзь мае эпізадычныя вылазкі ў той час ператворацца ў доўгатэрміновую экспэдыцыю.

- Ці ёсьць такія полацкія гісторыі, якія просяцца на паперу?

- Полацкая даўніна прапануе сотні сюжэтаў. Мяне вабіць загадкавая асоба і поўнае прыгод і таямніцаў жыцьцё ўжо згаданага намі Габрыеля Грубэра - прафэсара Полацкага калегіюму, выдатнага вучонага, генэрала Ордэну езуітаў…

Кліё было заўгодна, каб ад 1772 да 1814 году Полацак быў сталіцаю Таварыства Ісуса, забароненага ў каталіцкім сьвеце булай папы рымскага Клімэнта XIV. Айцы-езуіты, што захавалі Ордэну вернасьць, рушылі на дзьвінскія берагі з блізкіх і далёкіх краінаў. Гэта былі не цемрашалы, як іх характарызавала савецкая гістарыяграфія, а высокаадукаваныя, дзейныя асобы, стваральнікі самай перадавой для свайго часу сыстэмы асьветы. У Полацак кіраваліся й знаходзілі тут прытулак і працу прафэсары Сарбоны, італьянскіх і нямецкіх унівэрсытэтаў. На полацкіх пляцах і вуліцах, у калідорах і аўдыторыях калегіюму гаварылі тады на добрым дзясятку эўрапейскіх моваў. На нейкі час горад зрабіўся адной з

інтэлектуальных сталіцаў Эўропы.

Народжаны ў Вене славенец Грубэр займае ў гэтым сузор'і талентаў выключнае месца. Здаецца, нельга знайсьці галіны навукі ці мастацтва, у якіх Бог не надзяліў бы прафэсара ўнікальнымі здольнасьцямі. Матэматык, гісторык, хімік, мэдык, мовазнаўца, канструктар… Якраз Грубэр кіраваў тагачаснымі полацкімі мэханікамі, якія ў XVIII стагодзьдзі стваралі робатаў, што маглі ўразіць непадрыхтаванага наведніка калегіюму амаль да сьмерці. Вяршыняю іх творчасьці была славутая мэханічная галава (пра яе падрабязна гаворыцца ў III томе «Живописной России»), якая адказвала на любыя пытаньні на любой мове і натхніла Яна Баршчэўскага на фантастычную аповесьць «Драўляны дзядок і кабета Інсэкта».

Полацкі езуіт зрабіўся даверанай асобаю расейскага імпэратара Паўла I, з айцом Грубэрам меў таемнае ліставаньне Напалеон…

У 1805 годзе пецярбурская рэзыдэнцыя Таварыства Ісуса раптам загарэлася, і езуіцкі генэрал Грубэр ня здолеў выбавіцца з глыбіні сваіх пакояў. Такім чынам, налета споўніцца 200 гадоў, як завяршыўся зямны шлях айца Габрыеля, што пакінуў выразны сьлед у культуры некалькіх народаў, але найперш - нашага. З нагоды набліжэньня гэтае даты папскі нунцый у Беларусі славенец Іван Юркавіч днямі запрасіў мяне на аўдыенцыю. Было прыемна даведацца, што, «дзякуючы» Грубэру, маё эсэ «Alma mater Polocensis» перакладзенае на славенскую, а яшчэ прыемней, што ў Любляне (там ёсьць, дарэчы, канал імя Грубэра) 200-годзьдзе сьмерці выдатнага энцыкляпэдыста будзе адзначанае навуковымі імпрэзамі і выхадам манаграфіі. Зь яе аўтарам, доктарам Станіславам Юзьнічам, я цяпер актыўна лістуюся. Славенскіх калегаў - біёграфаў айца Габрыеля цікавіць, што ў 2005-м будзе адбывацца й выдавацца ў Полацку і Менску.

Увесну тэлежурналісты з кампаніі «Лад» запісалі са мной у полацкіх музэях і храмавых сутарэньнях інтэрвію на крыху нечаканую тэму: якія падзеі й героі нашай гісторыі маглі б стаць асновай для беларускіх фільмаў жахаў, што прысутнічаюць у кожным разьвітым кінэматографе? У якасьці

адной з кандыдатураў я прапанаваў Габрыеля Грубэра. Малады рэжысэр быў уражаны партрэтным апісаньнем знакамітага полацкага езуіта, якое пакінуў ягоны сучасьнік: «У гэтай прыгорбленай постаці зь вялізнай, зусім непрапарцыйнай малому целу і завостранай уверсе галавой зьмяшчаўся розум і талент дэмана і найзьлейшае сэрца; у заўсёды апушчаных долу вачах блішчэла нейкае злавеснае сьвятло; сьціплая і як быццам нясьмелая хада хавала самыя ганарлівыя й дзёрзкія пляны душы». Ну чым не герой, скажам, для нашага будучага Рамана Паланскага? Мэтра сучаснага кіно я згадаў невыпадкова: ён зьняў шыкоўны містычны трылер «Дзявятая брама» паводле раману гішпанца Артура Пэрэса Рэвэртэ «Клюб Дзюма, або Цень Рышэльё». У згаданых рамане й фільме дзейнічаюць героі, якім было б пра што пагаварыць з полацкімі езуітамі ды іхным генэралам.

Калі я вазьмуся пісаць пра Грубэра, то, найхутчэй, народзіцца не аповесьць ці апавяданьне, а эсэ. Мне ўжо ня раз даводзілася дзяліцца назіраньнем, што чытач, прынамсі той, якога цікавіць нацыянальная гісторыя, з большай нецярплівасьцю чакае цяпер ня чыста мастацкіх твораў, а добра ўдакумэнтаваных эсэ. Ён цалкам лягічна хоча ўпэўніцца, што ўсё, што ўжо прачытана ў бэлетрыстаў - ня плён іхнай фантазіі, а гістарычная рэальнасьць, пацьверджаная кронікамі, граматамі, прывілеямі etc.etc. Ні на адзін з сваіх зборнікаў гістарычнае прозы ад сярэдзіны 1990-х я не атрымліваў столькі водгукаў, колькі прыйшло на «Таямніцы…», што вытрымалі ўжо чатыры выданьні.

Чытач - і гэта вельмі здаровая зьява - імкнецца пераканацца, што ў нас сапраўды эўрапейскае мінулае, бо яно служыць своеасаблівым пропускам у эўрапейскую будучыню.

Але ў бліжэйшы час мне, прызнаюся, прагнецца засяродзіцца на тым, чаго не напіша ніхто іншы, - на працягу «Полацкіх апавяданьняў». Тут - мой асабісты досьвед, погляд, сьвет, і сваім багацьцем трэба пасьпець распарадзіцца.

Хочацца пісаць і падарожныя эсэ, а дзеля гэтага - вандраваць. Бо падарожжа, як заўважыў нехта з калегаў, адносіцца да прасторы, як тэкст да паперы, - запаўняе пустэчу. Апрача таго,

перасоўваючыся па сьвеце, ты як бы пацьвярджаеш свой рух па жыцьці.

Вось летась перачытваў Борхеса - ягоныя аргентынскія навэлы, кожную зь якіх можна разгарнуць у раман: «Поўдзень», «Мужчына з Ружовай кавярні», «Хуан Муранья»… Перачытаў - і заманулася пабачыць Буэнас-Айрэс. Так, далекавата. Але ў той час, калі я адкрываў для сябе Борхеса, і сталіца Аргентыны, і Лёндан, і Парыж, і Амстэрдам, і дзівосная Барсэлёна, і Нью-Ёрк, і іншыя ўжо «мае» гарады былі ад Полацку на аднолькавай адлегласьці - абсалютна недасяжныя.

Упершыню я прачытаў славутага аргентынца ў 1978-м, мне тады было дваццаць пяць. Другі раз грунтоўна чытаў у пяцьдзясят. (Дагэтуль зьдзіўляюся, што пераадолеў гэтую дату.) Добра было б перачытваць Борхеса кожныя 25 гадоў.

- Ці будуць з часам адшуканыя і Крыж Эўфрасіньні, і Полацкі летапіс?

- Вяртаньне Крыжа выглядае, бясспрэчна, больш верагодным. Хоць бы таму, што ён зьнік не ў XVIII стагодзьдзі, як Полацкі летапіс, а ў 1941 годзе - паводле гістарычных меркаў, ледзьве ня ўчора. Цяпер ужо дакладна вядома, што шэдэўр майстра Богшы быў ня выкрадзены нямецкімі захопнікамі з пакою-сэйфу ў будынку Магілёўскага абкаму партыі, як нас доўга пераконвалі, а вывезены на ўсход. У 1990-х пошукамі Крыжа сьвятой Эўфрасіньні не бяз посьпеху займаліся супрацоўнікі КДБ Беларусі. Па старонках дзяржаўнай прэсы пракацілася цэлая хваля публікацыяў, дзе называліся даволі канкрэтныя адрасы знаходжаньня нацыянальнай сьвятыні - фонды Эрмітажу або музэйныя сховішчы Ўфы й Самары, у якіх знайшлі ў час вайны прыстанак магілёўскія архівы й гістарычныя каштоўнасьці. Потым - як адрэзала, поўнае маўчаньне. Напэўна, сапраўды была адпаведная «просьба маскоўскіх таварышаў» не каламуціць вады.

У 1997 годзе, якраз у той час, калі Дзяржаўная дума Расеі абмяркоўвала прыняты пазьней Закон аб рэстытуцыі (паводле яго ўсе культурныя скарбы, якія цяпер знаходзяцца на тэрыторыі нашай усходняй «саюзьніцы», зьяўляюцца яе

ўласнасьцю й вяртаньню іншым краінам не падлягаюць) у Менску пад эгідаю ЮНЭСКА адбывалася міжнародная канфэрэнцыя ў праблемах рэстытуцыі. На ёй беларускія навукоўцы агучылі вусьцішны факт: сёньня нашая краіна валодае прыблізна адным (!) працэнтам сваіх культурных і гістарычных каштоўнасьцяў, большая частка якіх у розны час была вывезеная ўва ўсходнім кірунку. У ліку гэтых стратаў і бібліятэка Полацкай акадэміі на 40 тысяч тамоў, і ўнікальныя зборы акадэмічнага музэю й карціннай галерэі, што ганарылася жывапіснымі творамі Рубэнса, выдатнай калекцыяй скульптуры, дзьвюма тысячамі гравюраў.

Наіўна чакаць у бліжэйшай будучыні перадачы Эўфрасіньнеўскага крыжа, калі гэтаму пярэчыць расейскае заканадаўства. Разьлічваць на акт добрай волі таксама не выпадае. Дзяржаўная бібліятэка РФ у Маскве, да прыкладу, мае 82 скарынаўскія выданьні, а роднай і братняй Беларусі, нягледзячы на шматлікія просьбы, у тым ліку і ад Музэю кнігадрукаваньня ў Полацку, не перадала ніводнага.

Можна, праўда, казаць пра сымбалічнае вяртаньне Крыжа, што адбылося дзякуючы сучаснаму майстру-ювэліру Міколу Кузьмічу. На падставе фатаздымкаў, малюнкаў і апісаньняў аўтэнтыка з тых самых матэрыялаў ён стварыў вобраз рэліквіі, аднавіўшы ў тэхнічных парамэтрах тэхніку перагародкавай эмалі, якой за часамі Эўфрасіньні карыстаўся Богша. (Заўважу, што гэта не мая дылетанцкая думка, а навуковае меркаваньне найбуйнейшай знаўцы бізантыйскіх эмаляў у СНД доктара гістарычных навук Тацяны Макаравай.)

Відаць, варта, найперш для вернікаў, зазначыць, што праца над вобразам Крыжа адбывалася з багаславеньня і з дапамогаю Царквы, у выніку чаго твор М. Кузьміча мае тыя самыя хрысьціянскія рэліквіі, што і Богшаў арыгінал. Іншымі словамі, апрача мастацкіх характарыстык новы Крыж зьяўляецца й сакральнай рэччу.

Адноўлены Крыж сьвятой Эўфрасіньні, які захоўваецца ў Спасаўскім манастыры, таксама прываблівае ў сёньняшні Полацак паломнікаў і турыстаў і, трэба спадзявацца, «прыцягвае» свой старажытны правобраз, спрыяючы яго

вяртаньню на радзіму.

Што да Полацкага летапісу, якім яшчэ пасьпеў пакарыстацца В. Таціщчаў, дык, я мяркую, ён быў зьнішчаны пасьля інкарпарацыі Беларусі ў склад Расейскай імпэрыі. Зьнішчаны як сьведчаньне былой дзяржаўнай незалежнасьці нашых земляў, што ў расейскіх сталіцах цягам стагодзьдзяў менаваліся не іначай як «искони русскими». Але так верыцца ў цуд: раптам адзін са сьпісаў летапісу ацалеў і, як лічыў Вацлаў Ластоўскі, знойдзецца проста ў нас пад нагамі, у полацкіх падземных лябірынтах, якія сапраўды існуюць і могуць падараваць нам у XXI стагодзьдзі сэнсацыйныя адкрыцьці.

- Калі б табе трэба было выставіць адну ўласную (культавую) рэч у экспазыцыі полацкага Музэю беларускага кнігадрукаваньня - што б ты прапанаваў?

- Свой каваны срэбны пярсьцёнак з рачной пэрлінай і каменем-хрызапразам. У ім пры пэўнай долі ўяўленьня нескладана ўбачыць завяршэньне полацкай Спасаўскай царквы. Да гэтага падарунку Міколы Кузьміча (каб выкаваць яго, спатрэбілася, як сьцьвярджае аўтар, прыкладна 5000 удараў) ніякіх пярсьцёнкаў я ніколі не насіў. Ну, калі не лічыць тых, якія мы ў дзяцінстве куплялі ў газэтным шапіку за 80 капеек, каб выкінуць фарбаваны кавалачак шкла і, з адагнутымі вострымі лапкамі, надзець на палец перад бойкай з задзьвінскім непрыяцелем.

Пярсьцёнкі неяк не стасаваліся з маёй істотаю, ейнай энэргетычнай сыстэмаю. Таму да падарунку я паставіўся насьцярожана, але - вось дзіва! - ён вельмі хутка стаўся быццам бы часьцінкаю мяне самога. Гэта мой абярэг, безь якога я часам магу пачуцца безабаронным, як аднойчы, калі ў міжнародным цягніку яго спрабаваў украсьці расейскі праваднік (аднак пярсьцёнак паслаў мне зь ягонай кішэні сыгнал: я - тут).

На сустрэчах з чытачамі я часта атрымліваю пытаньні пра свой абярэг. Звычайна адказваю, што ён мае магічнае ўзьдзеяньне на жанчын (сапраўды), аднак дыяпазон яго «здольнасьцяў» значна шырэйшы.

А яшчэ адна юная чытачка нядаўна прэзэнтавала мне

маленькую цацачную котку, якая ўжо пасьпела заваяваць маю прыхільнасьць. Відаць, з тае прычыны, што я наагул люблю котак. Каб не яны, гэтага інтэрвію, як і ўсяго іншага, проста не было б. У раньнім маленстве старая й мудрая бабуліна котка (яе так і звалі - Котка) уратавала мне жыцьцё, калі я, пакладзены спаць на печы, пачаў шукаць сабе месца ў халадку на краі.

- Ты сапраўды лічыш, што існуе адметны полацкі мэнталітэт?

- Іначай я й не прапанаваў бы калісьці ўвесьці гэты панятак.

Палачане маюць большую за іншых беларусаў схільнасьць да гумару, іроніі й самаіроніі, якія дзіўным чынам спалучаюцца ў іх з балцкай стрыманасьцю. У літаратуры гэтыя якасьці найбольш выяўляюцца ў творчасьці Вінцэся Мудрова і Пятра Васючэнкі. Спадзяюся, што мае тэксты таксама пазначаныя «пячаткаю» нашага мэнталітэту.

Яшчэ адна яго адметнасьць - тое, што душа жыхароў Прыдзьвіньня здавён і да сёньня шырока адкрытая, я сказаў бы, прагная да дзівосаў, што цудоўна даказаў сваім «Шляхціцам Завальнем» Ян Баршчэўскі.

Невыпадкова й тое, што ў блізкіх і далёкіх ваколіцах Полацку, як засьведчылі навуковыя экспэдыцыі, жыве нямала людзей, што валодаюць таямнічай энэргіяй і незвычайнымі здольнасьцямі. Гэты фэномэн дасьледуе малады гісторык-палачанін Уладзімер Лобач, працы якога ўжо прыцягнулі ўвагу замежных вучоных.

Скажы, ты не задумваўся аб тым, што калі ў Полацку зьявіцца помнік Усяславу Чарадзею, гэта будзе помнік ня толькі валадару й абаронцу крыўскай дзяржавы, але й чараўніку, найвядомейшаму зь беларускіх ваўкалакаў?

- Дык што для цябе Полацак? Малая радзіма? Скарбонка гістарычных сюжэтаў? Месца для паломніцтва?

- Мае альфа і амэга. Радзіма маёй душы. Будучы апошні

прыстанак грэшнага цела.

- Вітаўт Кіпель назваў Спасаўскую царкву ў Полацку беларускім Араратам, а ты ў адным з апавяданьняў параўноўваеш родны горад над Дзьвіной зь Ерусалімам. Наколькі гэта асэнсавана?

- Ну вось мы й вярнуліся да таго, з чаго пачыналі гаворку. Калі не памыляюся, гэта ў эсэ «За што Авін забіў Кавэля» я цытую сучаснага ізраільскага пісьменьніка Амоса Оза, які гаворыць пра сваю любоў да Ерусаліму прыблізна так: тут можаш мыць шкарпэткі, смажыць яечню і ў той самы час адчуваць сябе на мяжы духоўнага аргазму. Гэты сутык, прызнаецца ерусалімскі калега, і зрабіў яго пісьменьнікам. Нешта падобнае я магу сказаць пра сябе і пра Полацак.

- У цябе ёсьць верш, у якім ты пішаш, што будзеш пахаваны (цьфу, цьфу, цьфу - жыві ня менш за сто гадоў) на полацкіх Ксавэр'еўскіх могілках. Гэта запавет?

- Так, запавет. Праўдзівей, толькі адна яго частка. А другая палягае ў тым, што пераведваць мяне ў той ціхай мясьцінцы трэба будзе абавязкова з пляшкай добрага чырвонага віна. Можна аргентынскага - з прысмакам прозы Борхеса й Картасара. Зрэшты, першы быў і цікавым паэтам, чые вершы, на жаль, на беларускую мову, здаецца, не перакладаліся. Калі не лічыць некалькіх строфаў, якія я спрабаваў перакласьці сам:

І брамка ў сад
адчыніцца сама,
як соньнік
на старонцы зачытанай…

Гутарыў Алесь Аркуш

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 3 (32) - 2004

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/5
[image]

Вітаўт Кіпель Полацак у фармаваньні беларускага нацыянальнага сьветагляду

ВІТАЎТ КІПЕЛЬ
дырэктар Беларускага інстытуту навукі й мастацтва ў Нью-Ёрку. Летась выдаў у суаўтарстве з жонкай манаграфію «Беларускі й беларусаведны друк на Захадзе».

Спадар Алесь Аркуш на параду Ўладзімера Арлова, зь якім мы сябруем і шмат падарожнічалі па Беларусі, зьвярнуўся з просьбай, ці не падзяліўся б я ўспамінамі-ўражаньнямі пра Полацак. Пытаньне прыйшло якраз у той час, калі я закончыў чытаць дзёньнікі в. пам. Зоры, мае сяброўкі-спадарожніцы жыцьцёвых шляхоў. Чытаючы-перажываючы Зорыны дзёньнікі, я і сам пачаў накідваць нататкі-ўспаміны, бо, на мой пагляд, некаторыя падзеі з нашага жыцьцёвага рэчышча варта было б занатаваць. Разам з тым, чытаючы дзёньнікі, я спасьцярог, што яны дакладней дакумэнтуюць бег часу, чым звычайныя ўспаміны. Ува ўспамінах дэталі часта скрадаюцца, забываюцца. Але ў такой канкрэтнай тэме - Полацак - дэталі адлюструюцца, таму, каб нечага не прапусьціць, паспрабую вылавіць з памяці некаторыя эпізоды аб Полацку, якія ўплывалі на маё нацыянальнае ўсьведамленьне.

* * *

Здарылася ж гэтак, што пра Полацак я даведаўся, ці, дакладней, Полацак увайшоў у маю сьвядомасьць у горадзе Смаленску, калі мне было гадоў 10-11, у годзе 1937-1938. Не абысьціся тут безь невялікага экскурсу ў сямейную гісторыю. Савецкая ўлада выслала нашую сям'ю зь Беларусі ў Расею (бацька быў арыштаваны як нацдэм у 1930 годзе). Спачатку была высылка ў Вяцкі край, гарады Вятка, Налінск, а пазьней, ад году 1935-га, для нас з маці - мусовае пасяленьне ў горадзе Арле, а бацьку - дадатковых пяць гадоў Байкала-Амурскіх лягераў каля гораду «Свободный». Праўда, маці мая магла раз у год даяжджаць у Беларусь, у Менск, да ейнага бацькі, майго дзеда. У Беларусь мы езьдзілі звычайна праз Смаленск, хоць часам ехалі і праз Гомель. Расклады цягнікоў складаліся такім парадкам, што і ў Смаленску, і ў Гомелі заўсёды трэба было рабіць перасядкі і доўга чакаць: бывалі гады, што мы праседжвалі на станцыях амаль цэлыя суткі. Мама скарыстоўвала гэты час тым, што вадзіла мяне па горадзе, дык у дзяцінстве я няблага ведаў гэтыя два месты. Часьцей, як я сказаў, мы праяжджалі праз Смаленск. Горад мне вельмі падабаўся: прыгожыя магутныя будынкі, старажытнасьці, маляўнічасьць Дняпра ў дзіцячай сьвядомасьці стваралі рамантызм, заглыбленьне ў даўніну. А аднаго разу, памятаю, мама мне сказала, што некалі ў Смаленску бываў і тата, і ў мяне гэта выклікала нейкую аўтарытэтнасьць, зьвязала горад зь беларускасьцю.

І вось аднойчы ў Смаленску на вакзале, седзячы ў пачакальні адзін, бо мама выйшла штосьці купіць, я пачуў беларускую гаворку групы людзей, асобаў чатырох-пяці, ды пачуў, што яны ўспаміналі горад Полацак. Прабылі тыя людзі ў пачакальні нядоўга. Яны хутка выйшлі ды зьніклі з поля майго зроку. Калі ж вярнулася маці, я ёй сказаў, што чуў, як нейкія людзі голасна размаўлялі па-беларуску ды называлі горад Полацак. У мамы я адразу спытаў, што гэта за горад (новы для мяне) і чаму мы празь яго ніколі не праяжджалі. На маё пытаньне маці адказала прыблізна так: «Полацак - гэта стары беларускі горад, так як і Смаленск, а ты, Віта, добра ведаеш, што нам езьдзіць ня ўсюды можна. Але ты, сынок, не сумуй, калі вырасьцеш, напэўна пабудзеш у Полацку». Вось так падала мне вестку пра Полацак, злучыўшы яго ў маёй сьвядомасьці з Смаленскам, мая мама,

добрая беларуская настаўніца!

Падарожжы нашыя ў Менск адбываліся далей. Яны былі для мяне з мамай вельмі радаснай і шчасьлівай падзеяй. Мама адведвала, прыпушчаю, паў-Менску сваіх сяброваk, дзьвюх зь іх я добра ведаў: Жэня Перская і Ядзя Бяганская, а я меў поўную волю «лазіць» па Менску ад Вайсковых могілкаў і аж да Парку Чалюскінцаў з аднаго боку і да Віленскага вакзалу з другога. Нездарма перад вайной апошняе наша падарожжа ў Менск было ўзімку, каб забраць хворага, спаралізаванага дзеда ў Арол, дажываць век з намі разам у пакойчыку 10 кв. мэтраў, бо ў дзеда адабралі хату як у цесьця ворага народу. Затым прыйшла вайна. Нейкім цудам-шчасьцем ацалеў і вярнуўся бацька, і мы ў часе атрыманьня пры немцах новых дакумэнтаў у Арле сказалі, што мы бежанцы, а такім немцы давалі дазвол на вяртаньне ў свае мясцовасьці, для нас гэта азначала - у Беларусь.

У Менск мы вярнуліся ў чэрвені 1942 году. (Дзед памёр у Арле ў сакавіку 1942-га.) Увосень таго ж году я паступіў у 7-ю клясу народнай школы (здаецца, № 29, але я ня пэўны), якая месьцілася там, дзе цяпер Музэй Прыроды ў Траецкім прадмесьці. Дырэктарам школы быў Пётра Сямёнавіч Кісель, знаны ў Менску настаўнік беларускай мовы, аўтар падручнікаў, знаўца беларушчыны, патрыёт і… добры псыхоляг-пэдагог. (Лёг ён на алтар незьлічоных беларускіх ахвяраў: у 1943 годзе яго расстралялі немцы.) Ён хутка зразумеў, што хоць я і добра гаварыў па-беларуску (бо беларуская мова была заўсёды мовай сям'і, размоўнай), ведаў, патрэбных для вучня 7-е клясы беларускай школы, у мяне не было. Я ж да гэтага часу жыў у Расеі і вучыўся ў школе расейскай. Сп. Кісель ведаў, што мяне трэба было «падагнаць» для беларускай школы: прайсьці граматыку, літаратуру, наагул праграму беларускай школы. Дырэктар парадзіў бацькам, каб мне нанялі рэпэтытара. Бацькі мае на гэта пагадзіліся безь ніякага ваганьня, а я, хоць і безь вялікага энтузіязму, зразумеў, што так трэба! Бацька мой адразу знайшоў мне рэпэтытара, ён яго ведаў з дваццатых гадоў. Маім рэпэтытарам, я сказаў бы, маім першым беларускім настаўнікам стаўся Антон Лёсік. Ад кастрычніка 1942 і да лета 1943 году я двойчы на тыдзень хадзіў да Антона

Лёсіка на заняткі. Жыў Лёсік у тым часе на рагу вуліцаў Рэвалюцыйнай і Камсамольскай на другім паверсе стараватага дому. Насупраць дому, памятаю, быў «зальдатэнгайм», а цяпер там, здаецца, кіно. У кватэры зь Лёсікам жыла яшчэ жанчына, відаць, жонка, і дзяўчына маіх гадоў, напэўна, дачка. Але іх я бачыў усяго пару разоў. Антон Лёсік прайшоў са мной беларускую граматыку, літаратуру ды найболей часу адвёў ён гісторыі, геаграфіі і грамадазнаўству. Лекцыі працягваліся пару гадзінаў, зімой крыху карацей, каб я пасьпеў дацямна на Берасьцянскую дахаты, а вясной лекцыі працягваліся даўгавата. Ды мне было цікава зь ім. Я яго называў толькі «спадар настаўнік». У яго была добрая бібліятэка, там я пабачыў упершыню і Сямёнава-Цян-Шанскага, і зборнік Полацка-Віцебскай старыны, шмат кніг «маладнякоўцаў», ды наагул азнаёміўся зь беларусаведнай калекцыяй. Настаўнік Антон Лёсік даў мне веды пра пачаткі беларускай дзяржаўнасьці, пра Полацак і значэньне гэтага гораду для Беларусі - канцэпт, устаўлены ў маю сьведамасьць вучня, застаўся са мной на ўсё жыцьцё: беларуская дзяржаўнасьць пачалася з Полацку.

Мае заняткі з Антонам Лёсікам скончыліся летам 1943 году, калі я зайшоў да яго ды паказаў свае чацьвяртныя і канчальныя школьныя адзнакі - адзнакі былі добрыя. Спадар Лёсік пахлопаў мяне па плячы ды сказаў: «Ну, працуй далей, хлапчына». Больш я Антона Лёсіка не сустракаў, але добры-добры ўспамін пра яго захоўваю і да цяпер.

Усплыло ў маёй памяці і іншае здарэньне зь Менску, якое таксама зьвязанае з Полацкам. Справа была такая. Па сканчэньні сямігодкі я паступіў вучыцца ў настаўніцкую сэмінарыю на вул. Цнянскай, дзе, дарэчы, я ўпершыню сустрэўся ды пераКінуўся парай словаў з Зорай! У сэмінарыі я доўга не прабыў, перайшоў у прагімназію на Нямізе. У прагімназіі выкладалася лацінская мова, якое я да таго часу і ня нюхаў. Бацькі мае (хочучы, відаць, каб я вывучыўся!) і гэтым разам нанялі мне рэпэтытара, знанага ў Менску настаўніка лаціны сп. Чарняўскага (на жаль, ня памятаю ні імя, ні імя па бацьку). Сп. Чарняўскі жыў далекавата - за чыгуначным пераездам, каля нямецкіх могілак. Даючы мне асновы лаціны ды карыстаючыся нейкімі сапраўды старымі падручнікамі (былі

ў падручніках «яці» і яшчэ нейкія, для мяне «дапатопныя», літары), сп. Чарняўскі аднойчы выказаўся так: «Трэба будзе пісаць беларускія падручнікі з лаціны і трэба будзе пераглядзець, як падавалася лаціна ў Полацку». Я перапытаў настаўніка, а што было ў Полацку, што там з лацінай? На што Чарняўскі досыць ляканічна (ён наагул быў негаваркі і часта бубнеў) сказаў: «Былі школы, былі настаўнікі, выкладалася лаціна», - гутарка з Чарняўскім далей не пайшла, але пра Полацак я нешта даведаўся, нешта запала.

Зь Менскам давялося разьвітацца на досыць даўгаваты адрэзак часу: ваенная завіруха - жыцьцё далёка ад Беларусі. Але веды пра Полацак паступова прыходзілі.

Найбольш сыстэматычныя й паглыбленыя веды пра Беларусь, улучна з Полацкам, я й мае сучасьнікі атрымалі на эміграцыі, калі вучыліся ў Беларускай гімназіі імя Янкі Купалы ў Нямеччыне, у горадзе Рэгенсбургу, пазьней Каме-Міхельсдорфе. Відавочна, што неабходна ў пары словаў прыпомніць аб тых часох і мясьцінах.

Сярэдзіна 1945 году. Толькі што закончылася другая сусьветная вайна. У Заходняй Нямеччыне мільёны ўцекачоў - перамешчаных асобаў: адных немцы прывезьлі на працы ў Нямеччыне, іншыя ўцяклі ад Саветаў, шмат былых вайскоўцаў-палонных. У зонах заходніх саюзьнікаў пачынаюць арганізоўвацца ўцекачы, якія не зьбіраюцца варочацца «на радзіму ў савецкі рай». Асяродкам беларускім робіцца горад Рэгенсбург, былы паўночны фарпост Рымскай імпэрыі на Дунаі. Горад не вялікі, 50-70 тысячаў жыхароў, але з блізу дзьвюхтысячагадовай гісторыяй, добра захаваны, вельмі старасьвецкі, зь дзясяткам касьцёлаў, кляштараў, старых будынкаў, рэшткамі замкаў, мноствам кнігарняў, антыкварыятаў. Летам 1945 году ў Рэгенсбургу паўстаў Беларускі Нацыянальны Камітэт, пачалі вакол яго гуртавацца беларусы, прыяжджаючы з блізкіх і далёкіх мясцовасьцяў. Даешся дзіву: як распаўсюджваецца навіна і бяз пошты, без электронікі! У адзін з раньневерасьнёўскіх дзён у Рэгенсбургу зьявілася, ацалелая па вайне, яшчэ адна пара беларускіх юнакоў - Вітаўт Кіпель і Зора Савёнак. Першы дабіраўся з

поўдня Нямеччыны, а Зора зьявілася з паўночна-заходняй часткі разьбітае краіны. Відавочна, нашаму зьдзіўленьню не было межаў: перажыць вайну, нічога адно пра другога ня ведаць ад сярэдзіны 1944 году і зьявіцца ў Рэгенсбург у той самы дзень было нейкім знакам. Прынамсі, нам так здалося і, магчыма, тады перадвызначылася, што праз жыцьцё далей будзем ісьці разам. Ды мы нечым былі й падобныя: хутчэй за ўсё блізкім лёсам і любоўю да Беларусі.

Але вернемся да грамадзкіх успамінаў! На нас і падобных колькі дзясятках і пачалася гімназія пад канец 1945 году. Няма словаў, нам, той моладзі, дужа пашанцавала. Нашымі настаўнікамі былі выдатныя пэдагогі, адданыя беларускія патрыёты. Маторам гімназіі, дырэктарам і настаўнікам геаграфіі быў д-р Аляксандар Орса. Літаратуру выкладаў сп. Антон Адамовіч (ён, дарэчы, быў маім настаўнікам і ў прагімназіі ў Менску і ведаў мяне зь Вяткі), сп. Аўген Каханоўскі выкладаў старую беларускую літаратуру, сп. Гіпаліт Паланевіч - сучасную гісторыю, а д-р Янка Станкевіч - старую гісторыю: беларускія княствы, Полацак, Полаччына. Сп. Станкевіч гаварыў пра Полацак бясконца: сувязі Полацку з Псковам, мова полацкіх дакумэнтаў і г. д. Сп. Каханоўскі засяроджваўся на значэньні раньняй беларускай літаратуры і прыпушчаў, што ў Полацку былі добрыя бібліятэкі. Памятаю, што пад уплывам тых школьных ведаў мы па-вучнёўску хадзілі па Рэгенсбургу, думаючы знайсьці нешта й пра Полацак і Скарыну. Калі ж мы пазнаёміліся, паводле школьнае праграмы, зь беларускамоўнымі вытрымкамі з кнігі Гайдэнштайна «Пад Полацкам дажджы», дык мы лазілі па кнігарнях Рэгенсбургу, думаючы знайсьці Гайдэнштайнавы «Запіскі пра Маскоўскую вайну» - азнаямленьне з гэтай кнігай зрабіла на нас моцнае ўражаньне. Мы, вучні старэйшых клясаў, бачылі нейкія паралелі паміж Полацкам і Рэгенсбургам.

Параўнаньне паміж Рэгенсбургам і Полацкам у нас знайшло большую падтрымку, калі на пачатку 1946 году ў Рэгенсбургу была пабудаваная царква Сьв. Эўфрасіньні. Пару словаў аб пабудове тае царквы. Напрыканцы 1945 году ў Рэгенсбургу пачаліся праваслаўныя багаслужбы ў памяшканьні Беларускага Нацыянальнага Камітэту. Іх пачаў адпраўляць настаўнік рэлігіі

гімназіі айцец Мікалай Лапіцкі. Айцец Лапіцкі быў заўзятым паклоньнікам Сьв. Эўфрасіньні і даўгія лекцыі нам чытаў пра гэтую Сьвятую. Нейкае дачыненьне да тых багаслужбаў меў і я, бо хадзіў з айцом Лапіцкім да бліжэйшага нямецкага «пфарэра» (сьвятара) у нейкай адміністрацыйнай справе як перакладчык! На адной з багаслужбаў (хорам кіраваў сп. Мікола Равенскі) айцец Лапіцкі паведаміў, што ў Рэгенсбургу пачынаецца пабудова праваслаўнай царквы імя Сьвятое Эўфрасіньні і ён заклікае грамадзтва дапамагаць у пабудове. Гэтая вестка як бы электрызавала беларускую калёнію: дапамагалі хто чым мог - маркамі, якіх амаль не было, працай, хто мог - матэрыяламі праз знаёмствы зь немцамі… Царква была збудаваная ў тры месяцы! Урачыстасьць у беларусаў была вялізарная: бясспрэчна, дух Сьвятой Эўфрасіньні дапамагаў! У часе высьвячэньня царквы Ўладыкам Апанасам скаўтам быў уручаны сьцяг з надпісамі: з аднаго боку «Беларусь», з другога боку «Крыўя» - як бы злучаючы гістарычную Полаччыну-Крывіччыну з сучаснай Беларусьсю. Пад уплывам тагачаснага настрою я напісаў адно школьнае ўкладаньне «Сьлядамі Францішка Скарыны», дзе па-вучнёўску пісаў: «Яшчэ ў пачатку XVI ст. праз Рэгенсбург праходзіў пехатой у Італію Францішак Скарына… Будзем гордыя сьведамасьці, што на чужыне вучыліся служыць свайму народу й Беларусі», - а настаўнік Каханоўскі ўзяў маё ўкладаньне за перадавіцу ў вучнёўскі часопіс «У выраі».

Бясспрэчна, жывучы ў Рэгенсбургу, мы адчувалі сябе нібы ў Полацку.

Этап жыцьця ў Нямеччыне скончыўся ў 1949 годзе. Бальшыня нашых людзей выехала за акіян, а я, Зора ды колькі тузінаў маладых энтузіястаў засталіся ў Эўропе вучыцца, думаючы самі сабе, што хутка ўсё ж вернемся на Беларусь, дык з Эўропы бліжэй!

Наступны напамінальны пра Полацак эпізод я перажыў у Бэльгіі, дзе я жыў і вучыўся ад сярэдзіны 1949 году і да самага канца году 1955-га. Было гэта так. Улетку 1950-га мне давялося жыць пару месяцаў у езуіцкім кляштары на поўначы Бэльгіі, каля гораду Гасэльту, у мястэчку Алькен. Рэч у тым,

што я, як і сотні (а мо і шмат сотняў) студэнтаў Лювэнскага каталіцкага ўнівэрсытэту, калі не здавалі экзамэнаў, правальвалі іх у веснавой сэсіі, маглі пераздаваць экзамэны восеньню. Розьніца была такая: увесну (май-чэрвень) экзамэнацыйная сэсія працягвалася тры-чатыры тыдні, а ў верасьні экзамэны трэба было здаць за два-тры дні. Прычым у Лювэне сыстэма была своеасаблівая - пераздаваць у другой сэсіі трэба было ўсе дысцыпліны. Паўтараю: усе дысцыпліны! А здаць 10-12 прадметаў за два-тры дні ня так проста. Больш за тое! Пра зьмену сыстэмы экзамэнаў ніхто і гаварыць не гаварыў, бо ўнівэрсытэт існуе ад 1425 году! І так было, як гаворыцца, «спакон вякоў». Для нас здацьцё ці нездацьцё экзамэнаў азначала быцьцё ці небыцьцё ўва ўнівэрсытэце: стыпэндыі прызначаліся толькі тым, хто экзамэны здаваў. Бэльгійскія студэнты, каб рыхтавацца да другое сэсіі, на лета «зашываліся» па сваіх хатах - ехалі да бацькоў - і там «зубрылі», а нам, чужынцам, выбар быў адзін - ехаць у кляштар і там за пару гадзінаў працы (сымбалічная аплата за харчы) рыхтавацца да экзамэнаў. Праўда, беларускія студэнты такім станам рэчаў былі задаволеныя, бо жыцьцё два месяцы ў кляштары азначала інтэнсіўнае вучэньне, «зуброжку» без адрыву для грамадзкае працы, якая сярод году ў Лювэне была вельмі вялікая. У кляштары кантактаў з манахамі ці сьвятарамі амаль ніякіх не было, апрача пасьлявячэрніх пары хвілінаў, калі ўсе зьбіраліся ў чытальнях. Атмасфэра для навукі была выдатная, і мы да экзамэнаў падрыхтоўваліся. Вось там, у Алькене, празь дзень-другі майго побыту ў кляштары, у сваім пакойчыку я «адкрыў» на сьцянной іконцы (іконкі - стандартная зьява ў кляшторных пакойчыках) надпіс лацінкай «Полацак - Альба Рутэнія». Сумневу не магло быць: іконка паходзіла зь Беларусі. Аб гэтым я спытаў на вячэры ў аднаго зь сьвятароў, якога звалі «пэр Артц», айцец Артц. Пэр Артц нядрэнна гаварыў па-расейску, ведаў гісторыю Ўсходняй Эўропы. Майму пытаньню, як іконка зь Беларусі трапіла ў Алькен, пэр Артц не зьдзівіўся, а сказаў, што ў кляштары могуць быць і іншыя рэчы з Полацку, бо некалі бэльгійскія езуіты бывалі ў Полацку! Для мяне гэтая вестка была вялікай навіной. На жаль, пагутарыць з пэрам Артцам мне болей не давялося, яго іхныя ўлады паслалі на місіянэрскую працу ў Аўстралію. Ды, зрэшты, тады ў галаве было не да гісторыі, трэба было рыхтавацца да экзамэнаў, якія я восеньню

здаваў. Скончыўшы навуку ў Бэльгіі, вяртацца ў Беларусь не давялося, паступова ўсе студэнты, ці амаль усе, накіраваліся ў ЗША: у пачатку сьнежня 1955 году ў Амэрыку паехала Зора Савёнак, а напрыканцы сьнежня таго ж году ў неагравaным самалёце разам з Алесем Міцкевічам прыляцеў і я.

У дасьледчай працы ў Злучаных Штатах з Полацкам, Полаччынай даводзілася сустракацца часта, бывалі пэрыяды, калі Полацак быў уваччу, як жывы. А аспэкты працы гэткія: дапамога д-ру Вітаўту Тумашу ў зьбіраньні Скарыніяны і дасьледаваньне пасяленьня беларусаў у ЗША, асабліва раньні пэрыяд.

Некалькі дзясяткаў гадоў мы сябравалі з д-рам Вітаўтам Тумашам. Кажу мы - гэта значыць Зора, Вітаўт К. і д-р Тумаш. Дзесяцігодзьдзі ён прыходзіў у бібліятэку, працаваў даўгія гадзіны, у выніку чаго зьявілася шмат працаў. Асноўным зацікаўленьнем д-ра Тумаша была Скарыніяна. Мы яму дапамагалі й шмат-шмат новага пазнавалі. Д-р Тумаш, сам будучы віленчуком (Вільня была ягоным улюбёным горадам), аддаваў пашану, а ў нейкім аспэкце і прыярытэт, Полацку, адкуль, як д-р Тумаш заўсёды казаў, «паходзіць Вялікі Палачанін» Францішак Скарына. Д-р Тумаш уважаў, што канчаткова высьветліцца біяграфія Скарыны толькі пасьля таго, як дасьледуюцца архівы Полацку, калі яны дзе захаваліся. Да Скарыніяны ў д-ра Тумаша была інтуіцыя: на пачатку 50-х гадоў ён парадзіў д-ру Янку Садоўскаму праехаць у Падую, дзе быў «адкрыты» для беларусікі партрэт Скарыны ў залі сарака. Д-р Тумаш фарсаваў думку вывучэньня дзейнасьці Скарыны як батаніка, выказваў патрэбу дасьледаваньня, ці былі ў Скарыны сувязі з Усходам, а ў Заходняй Эўропе, уважаў Тумаш, Скарына мог пабываць у шэрагу гарадоў. Вельмі часта ў нававыяўленых дакумэнтах Скарыніяны былі зьвесткі й пра Полацак. Часта з д-рам Тумашам мы жартавалі: за Скарыніянай прыйдзе бібліяграфія «Полацак і Полаччына часоў Скарыны». Але зрабілася тое, што было магчымае: праз Скарыніяну мы ўсе вельмі наблізіліся да Полацку.

Іншы аспэкт, дзе мне асабіста давялося мець дачыненьне з Полацкам, - гэта вывучэньне пасяленьня беларусаў у ЗША.

У пасяленьні беларусаў у Злучаных Штатах, як вядома, можна выдзеліць некалькі хваляў, як прыкладам: паасобныя эмігранты, невялікія групы ў першай палове і сярэдзіне XIX стагодзьдзя, масавая эміграцыя напрыканцы XIX - пачатку XX стагодзьдзяў, эміграцыя па першай сусьветнай вайне, міжваенная эміграцыя ды хваля па другой сусьветнай вайне і, нарэшце, эміграцыя сучасная. Што б там ні пісалася ў айчынным друку пра Амэрыку - а пра яе часта пішацца ў непрыязных фарбах-тонах, - факт застаецца фактам: беларусы ў Амэрыку едуць і едуць. Мы, беларусы, - бясспрэчна, нацыя-пастаўшчык працоўнае сілы і для ЗША, і для іншых краінаў.

Але ў разгляданай намі тэме - Полацак ува ўспамінах - у дачыненьні да Амэрыкі выдзяляецца асабліва адзін пэрыяд, калі Полацак даў Злучаным Штатам вельмі шмат эмігрантаў, пры гэтым эмігрантаў інтэлектуальнага кшталту. Гэта пэрыяд пачатку XIX стагодзьдзя. У першай чвэрці XIX стагодзьдзя, праз тое што ў кіраўніцтве Каталіцкай царквы адбываліся перааранізацыі (канфлікт Папы зь езуітамі), езуіты, якія дзеялі ў Полацку, пачалі масава выяжджаць у Амэрыку. Тагачасная езуіцкая правінцыя Злучаных Штатаў пераназвалася ў «Беларускую Правінцыю» і фармальна падначальвалася Полацку. Кіраўніцтва Каталіцкае царквы ЗША пачало запрашаць езуітаў зь Беларусі ў ЗША. Прыехала вельмі шмат выдатных інтэлектуальных сілаў, а сярод іх айцец Францішак Дзеружынскі. Полацкія езуіты прарабілі ў ЗША вялікую працу ў галіне арганізацыі школьніцтва. На іх рахунку заснаваньне колькіх вядучых унівэрсытэтаў, сярэдніх вучэльняў ды школаў. Калі я спасьціг гэткую карціну, мы з Зорай пачалі езьдзіць у розныя цэнтры шукаць архівы. І архівы былі знойдзеныя ў Балтыморы, штаце Агаё, Нью-Ёрку. Асноўнае ў архівах, якія, бясспрэчна, будуць вывучацца, - перапіска амэрыканска-беларускіх езуітаў з Полацкам, Магілёвам, зь Беларусьсю. Я ўпэўнены, што ў будучыні дасьледнікі беларуска-амэрыканскіх дачыненьняў знойдуць шмат цікавага й новага пра Полацак, бо архівы былых полацкіх езуітаў у ЗША яшчэ не дасьледаваныя.

Перабіраючы ў памяці дэталі-здарэньні, спалучаныя з Полацкам, мы з Зорай часта прыпаміналі адзін выпадак, які Зора не пасьпела накінуць на паперу, хоць яна й выдрукавала

артыкул «Аб кульце Эўфрасіньні на эміграцыі» - такі сапраўды быў! А выпадак такі.

Жыла каля Нью-Ёрку адна беларуска, якая нарадзілася ў Полацку ды ў гадох 1915-1925 была там у сірочым доме. Была яна вельмі шчырая, ахвярная беларуска, вельмі набожная, праваслаўнага веравызнаньня. На жаль, жыцьцё ейнае склалася так, што яна мела толькі пачатковую асьвету. Прозьвішча яе з дому было Антаніна Сільвановіч, а самым вызначальным у ейным жыцьці была адданасьць-любоў да Эўфрасіньні Полацкай. Антаніна заўсёды казала: «Нашая Эўфрасіньня-заступніца будзе маліцца, абароніць нас». Каб маліцца ў царкве Эўфрасіньні, Антаніна Сільвановіч замовіла ў аднаго зь вядучых мастакоў-іканапісцаў у ЗША выяву Сьвятой. Мастак ікону намаляваў, а Антаніна панесла тую ікону ў праваслаўную царкву для высьвячэньня, каб падараваць яе той царкве. Царква належала да Расейскай Праваслаўнай зарубежнай юрысдыкцыі. І сталася, што Антаніна ледзь не самлела: праваслаўны «бацюшка», настаяцель прыходу, адмовіўся ікону высьвеціць, ня тое каб прыняць падарунак! Ён Антаніне заявіў: гэта ня нашая Сьвятая, я высьвячаць яе ня буду. Цяжка перажывала такую адмову палачанка Антаніна, але затое з расейскай царквой ейныя дачыненьні былі скончаныя.

Прыкінуўшы ў памяці эпізоды-здарэньні-разважаньні, зьвязаныя з Полацкам, набытыя ў часе жыцьцёвага шляху па-за Беларусьсю, неабходна падзяліцца ўражаньнямі-прыпамінамі аб нашых сустрэчах-перажываньнях у горадзе над Дзьвіной!

У пачатку 90-х гадоў мінулага стагодзьдзя развалілася (хоць і не канчальна) нядрэнна скаваная імпэрыя, тады званая СССР. Эмігранты, улучна зь беларусамі, атрымалі магчымасьць адведаць радзіму, дзе-нідзе быў дадзены дазвол і на зваротнае перасяленьне. Мы на Бацькаўшчыну пачалі езьдзіць рэгулярна. І прыйшоў той час, пра які мне некалі ў Смаленску сказала маці: «Ты, Віта, пабудзеш у Полацку!» Незабыўны быў гэта час: пабыць у Полацку мы шчыра жадалі. Ехаць у Полацак турыстамі не хацелася, занадта глыбокія нацыянальныя пачуцьці-пагляды былі на гэты горад, а быць у такім важным месьце агледачом-разявакам ня ўкладвалася ў нашыя з Зорай

жаданьні. Але ўсё ж давялося зьведаць Полацак, будучы турыстам, для дасьведчаньня, як кажуць землякі, «для вопыту» і гэткае патрэбна. Без сумневу можна сьцьвярджаць, што ў тым рэгіёне Полацак сёньня адзін з самых прывабных для турызму гарадоў. Па-над тысячагадовая гісторыя Полацку, бадай, ці не наймацнейшы магніт (улюбёнае слоўца амэрыканскае турыстыкі) для Прыбалтыкі, сталіцаў Скандынавіі, Санкт-Пецярбургу, якому ўсяго толькі трыста гадоў! Няма словаў, у беларускай дзяржаве і турыстычны Полацак будзе аднаўляць і прадстаўляць тысячагадовую гісторыю Беларусі.

Зьведаць Полацак найбольш хацелася як нашчадку грамадзяніна, якому Полацак стварыў дзяржаву. Зьведаць беларускі, дзяржаўніцкі Полацак мы змаглі з Зорай, дзякуючы Ўладзімеру Арлову. Пачуцьці-перажыванні ад наведаньня беларускага Полацку былі шматгранныя, і я імі падзялюся-прыпомню. (Пачаў ужываць я займеньне «мы», бо наведваньні былі яшчэ гэткія нядаўнія і заўсёды былі разам з Зорай.)

Мы зьведвалі, разглядалі й перажывалі Полацак гістарычны. Больш дэталёвага экскурсу ў мінулае наўрад ці можна мець, бо нашым гідам быў Уладзімер Арлоў, пісьменьнік, гісторык, які як ніхто іншы падае гістарычнасьць Полацку сёньняшнім беларусам, імкнецца раскатурхаць апатычнае, маласьвядомае грамадзтва. Часамі археалягічную-гістарычную мінуўшчыну Полацку даваў і Генадзь Сагановіч.

Полацак культурна-мастацкі мы аглядалі ў музэях, кнігарнях, былі ў захапленьні ад мадэрнага, заходнеэўрапейскага стандарту Музэю кнігадруку зь вельмі аўтарытэтным гідам, знаўцам Скарыны і беларускага друку сп-няй Галінай Ладзісавай.

Полацак грамадзкі, дзейны, адраджэнска-беларускі мы спазналі ў шматлікіх сустрэчах, гутарках у бібліятэках, універсытэце, літаратурна-мастацкіх вечарах, дзе сп-ня Ірына Жарнасек і мастакі надарылі кніжак на цэлую бібліятэку.

Полацак сёньняшні, нялёгкі да пражыцьця, але цікавы і энэргічны, мы перажывалі, калі спыняліся-затрымліваліся ў Тані, сястры Ўладзімера.

І канечне, пакідаў сьлед Полацак духоўны. Мы перажывалі ўзьнёслыя, малітоўныя пачуцьці ў неаднойчы наведанай катэдры Сьвятой Сафіі, захапляліся яе ведамасьцю, дамінуючай магутнасьцю, ганаровым выглядам. У Сьвята-Эўфрасіньнеўскім храме мы кленчылі перад нацыянальным алтаром, аддаваліся малітвам, умысловаму перагляду свайго нацыянальнага шляху, адзінага, толькі табе ўласнага; была гэта свайго роду нацыянальная споведзь ды просьба мець энэргіі на прышласьць. У Полацку, на наш пагляд, гэтае месца і ёсьць нашым нацыянальным Араратам. Я ніколі не забуду моманту, калі першы раз мы выходзілі зь Сьвята-Эўфрасіньнеўскае царквы. Зора, асоба загартаваная ў грамадзкім жыцьці, змахвала пачуцьцёвую сьлязу і цьвёрда мне сказала: «Ведаеш, Віт, працаваць нам трэба і далей, пакуль над Эўфрасіньнеўскім Храмам ня будзе ўзносіцца ў вышыню Эўфрасіньнеўскі, наш беларускі крыж». Я з Зорай цалкам згадзіўся.

І маё заключнае разважаньне аб Полацку. Полацак - гэта пачатак беларускае дзяржавы, дзяржаўнасьці. Мы, Вітаўт і Зора Кіпелі, - дзяржаўнікі, а гэта значыць, мы і Палачане.

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/5
[image]

Крыўскі кішэнны слоўнік Пятра Васючэнкі

АРКУШ Алесь (н. 1960) - крыўскі пісьменнік, чалец «Таварыства вольных літаратараў», таемны сябра *«Брацтва з'едзенага цмока»* . Таемнасць як рыса крыўскага менталітэту яму наогул уласцівая. Чаму мілагучнае беларускае прозвішча Козік памяняў на халоднае *Аркуш*? Нарадзіўся, як і ягоны зямляк крывіч Уладзімір Сіўчыкаў, у Жодзіне і, маючы маральнае права казаць «Жодзіна - мая родзіна», падаўся на Поўнач, на халодныя берагі *Дзвіны*. *Дзвіна* абмывае строму, на якой высіцца Аркушаў маёнтак у суседстве з Полацкай Сафіяй, і калі яна - белы карабель (Уладзімір Караткевіч), дык Аркушава гаспода - белы човен над хвалямі вялікай ракі. Таямніцаю прывязанасць А.-паэта да арніталагічных вобразаў. Ягоны лірычны герой - чыжык, які пабачыў вежы Нотр-Даму, але вярнуўся пад родныя полацкія стрэхі. Птушыныя якасці - вольнасць і адчуванне палёту - дапамагалі крылатым істотам ратаваць або губіць гарады, і хто ведае, ці не верне сабе *Полацак* адвечны статус еўрапейскай культурнай сталіцы дзякуючы А.?

АРЛОЎ Уладзімір (н. 1953) - крыўскі пісьменнік, рэаніматар айчыннае гісторыі, нястомны шукальнік Полацкага *Лабірынту*. Ён і знайшоў яго - праз лабірынт уласнае творчае гісторыі. Ад андэрграўнду (згуртаванне «Блакітны ліхтар») прайшоўся

лёхамі да Менскае Серабранкі, праклаў тунэль у Новы і Стары свет, у Афрыку, а таксама ў крыўскую даўніну. Шмат'ярусны свет, які выбудаваў вакол свайго «Я» А., не зрабіў яго другім Караткевічам, як некаторым хацелася б, але гэта не наш шлях - мадэляваць копіі і гукаць «другіх». Караткевіч ішоў у беларускую рэчаіснасць пры дзённым святле, яму свяціла крыўскае сонца, а А. - «блакітны ліхтар» назіральнасці, іроніі і панурасці, якія прачытваюцца ва ўсмешцы, схаванай у бараду Бармалея.

АСТАШЫ - загадкавае племя людзей прышлых, ліхіх, звязаных з чарнакніжніцтвам ды чарадзействам. *Ян Баршчэўскі* атаясамлівае А. з рыбакамі з расейскага гораду Асташкава, але ў фантасмагарычнай атмасферы твору А. ўтвараюць вобраз зборны, абагульнены, увасабленне марнатраўства і гвалту. А. «пасылаюць пад лёд злога духа, і той заганяе рыбу ў нерат; дык яны спустошылі ў нас усе азёры, навучылі нашу моладзь бязбожным учынкам, чарам, бессаромным песням». Такім чынам, А. яшчэ - экалагічныя злачынцы. Намаляваны антрапалагічны партрэт асташа: «барада шырокая, твар круглы, вялікі скураны фартух». Як і *Белая Сарока*, *Чарнакніжнік*, А. ўяўляюцца вялікай небяспекай для *Крыўі*: «Даўней і пра тых асташоў нікому і не снілася, а цяпер хутка забяруць у нас зямлю і ваду, так што і нам трэба будзе ўжо ўцякаць куды далей».

БАРАДУЛІН Рыгор (н. 1935) - народны паэт *Крыўі*. Чарадзей-версіфікатар, які са словам можа рабіць усё: слова ў ягоных руках - што бясформенны камяк гліны на крузе ганчара, ён з яго злепіць што заўгодна. Ягоны «Матылёк» - твор-выраб, адвечны шэдэўр версіфікацыі, верш вершаў. Адна з асноўных тэмаў барадулінскіх фрывольных прыпевак - любошчы старых, бабы і дзеда. Дзед спакушае бабу: «А дзед бабу разуваў, разуваў...» Баба ладзіць любоўнае паляванне на старога («Цярэшка»). У аўтарскім слове да «Здубавецьця» Б. піша пра тое, як нашыя прашчуры імкнуліся скаромнымі спевамі разварушыць халодны паўночны юр. Вядома, старым гэта зрабіць цяжэй. Прыгадваю дасціпны адказ Б. на «Карамболі». Развязны малады вядучы ставіць каверзнае пытанне - наконт адносінаў да дзяўчат у шэсцьдзесят гадоў. Заўжды дасціпны

дзядзька Рыгор «гойкае» ў адказ: «У шэсцьдзесят тое ж самае стаўленне да дзяўчат, што і ў дваццаць. Толькі магчымасці не тыя». І зала рагоча. «Ёсць полацкі менталітэт...» - адно з творчых азарэнняў крыўскага паэта.

БАРШЧЭЎСКІ Лявон (н. 1958) - крыўскі літаратар, перакладчык, палітык. Спадкаемца крывіча *Францішка Скарыны*, паліглота, бо ведае бадай усе еўрапейскія мовы, за выключэннем хіба што баскай, колькі ўсходніх ды іншых. Генетычнай сувязі з *Янам Баршчэўскім*не пацвярджае, але і не адмаўляе. Больш за тое, падчас літаратурна-этнаграфічнай экспедыцыі па мясцінах *Яна Баршчэўскага*, пры высадцы на бераг возера *Нешчарда* блізу былога фальварку Мурагі, быў заўважаны за выкрыкваннем феадальнага слогану «Дзе мае халопы?». Пры гэтых прыгонніцкіх поглядах Б. ачольвае згуртаванне «Беларускі ПЭН-Цэнтр», з'яўляецца заснавальнікам і захавальнікам таямніцаў Беларускага гуманітарнага ліцэю. Таемны сябра *«Брацтва з'едзенага цмока»*.

БАРШЧЭЎСКІ Ян (1794? - 1851) - адзін з пачынальнікаў новай беларускай (крыўскай) літаратуры, пісьменнік-рамантык, надзелены фенаменальнай фантазіяй, творчай інтуіцыяй і талентам прадбачання, узбагаціў нашу літаратуру адным з самых загадкавых і займальных твораў - кнігай «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях». Быў бясконца закаханы ў сціплы, суровы крыўскі краявід, нават у Санкт-Пецярбургу, куды яго закінуў лёс, Фінская затока мроілася яму падабенствам аграмаднага возера *Нешчарда*, на берагах якога прайшло ягонае дзяцінства. Уражанні, якія атрымаў Янка, студэнт Полацкай езуіцкай калегіі, калі на калядныя вакацыі гасцяваў у свайго дзядзькі ў фальварку Мурагі, пераплавіліся ў крыўскую Адысею. Б. - не «беларускі Гогаль», не «беларускі Гофман» і не «беларускі Стывен Кінг», ён адметны і першасны як у апісаннях крыўскага палтэргейсту, так і ў змрочных прадказаннях, якія датычацца лёсу цывілізацыі. Ён папярэджваў, калі апісваў чарнакніжніцтва, каб не торкалі носа за заслону, апушчаную Панам Богам, але дзе ж хто паслухаецца? Вось і маем усе прыемнасці XXI стагоддзя.

БЕЛАРУСКАЯ МОВА (КРЫЎСКАЯ МОВА) - яна звініць, крычыць,

спявае і гамоніць, як тыя валасы, што ажылі і заварушыліся на галаве ў небаракі Генрыка з кнігі *Я. Баршчэўскага* «Шляхціц Завальня...». Пераклад гэтага твору Міколам Хаўстовічам - гэта хутчэй не пераклад з польскай на беларускую, а вяртанне да той векавечнай прамовы, на якой быў створаны не сам тэкст, а яго падтэкст. Уласна ж Б. М., вылучаная ў перакладзе курсівам, складае цэлы тэкст унутры тэксту; тут фальклорны матэрыял (песні, прыказкі, выслоўі), простая мова персанажаў, нават гутаркі. Б. М. з'яўляецца тады, калі тэкст даводзіць сваю антыкніжную, аўтэнтычную прыроду. Два моўныя пласты адлюстроўваюць адметнасць *крыўскай мовы*, феномену, увасобленага *Вацлавам Ластоўскім* у ягоным «Расійска-крыўскім (беларускім) слоўніку». Словы кшталту *навец, жамяра,* пэўна, з'явіліся ў тэксце дзякуючы моўнаму досведу *В. Ластоўскага*.

БЕЛАРУСЬ - часовая назва краіны, поўнае найменне якой пры іншых абставінах магло б быць *Крыўя*, альбо Зямля Беларуская, Крыўская, Дрыгавіцкая, Радзіміцкая, Яцвяжская, Гіпербарэйская, Драўлянская, Палянская, Северская, Падляшская, Смаленская, Бранская, Бельская, Беластоцкая, Ліцвінская, Русінская, Ляская, Жамойцкая, Пруская, Краслаўская, Дзвінская, Пскоўская, Себежская, Вяліжская, Чарнігаўская, Забайкальская, Кліўлендская ды ўсялякая іншая, іншая, іншая... Парадоксы гісторыі, якая гуляе ў свае гульні з Б., не вычарпаліся, і не выключаецца, што зямля паўстане ў пазначаных вышэй межах, а ў сярэдзіне яе, бы зерне ў арэху, застанецца *Крыўя*.

БЕЛАЯ САРОКА - дэманічная істота, жанчына-птушка, якая прыносіць з сабой бязладдзе і заняпад. Разам з *асташамі, Чарнакніжнікам* уваходзіць у дэманічны пантэон ворагаў *Крыўя*. М. Хаўстовіч бачыць у вобразе гаспадыні Паўночнае краіны «выдатны алегарычны вобраз Кацярыны II». Пэўна, нейкія палітычныя алюзіі гэты вобраз у сабе змяшчае. Але ён у абагульненай форме персаніфікуе ў сабе і метафізічнае ліха, скіраванае супраць *Люду беларускага*. Белай Сароцы проціпастаўлены вобраз *Плачкі*.

БРАЦТВА З'ЕДЗЕНАГА ЦМОКА - утварылася ўлетку 1994 году,

калі ад раз'ятраных промняў жнівеньскага сонца вада возера *Нешчарда* закіпела і ператварылася ў юшку. Юшку спажывалі ў цемры, пры дрогкім святле ад вогнішча, і ўсе былі пераканаыя, што ядуць рыбу, хаця я ведаў, якое няшчодрае на рыбу гэтае возера і якія істоты ў ім водзяцца, але маўчаў. Назаўтра сведчаннем містычнае вячэры былі яе парэшткі ў выглядзе кіпцюрастых і скрыдластых шкілецікаў. Такім чынам утварылася Б. З. Ц., у якое правадзейнымі сябрамі ўвайшлі *Алесь Аркуш*, *Лявон Баршчэўскі*, *Пятро Васючэнка*, *Навум Гальпяровіч*, *Ірына Дарафейчук* і яшчэ некалькі асобаў.

БРОЎКА Пятрусь (1905 - 1986) - народны паэт *Крыўі*. Вызначыўся як аўтар, у якім душэўнае змагалася з афіцыйным і нарэшце перамагло. Народ склаў пра яго эпіграму: «Пятрусь Броўка піша лоўка...» З першай часткай можна пагадзіцца, а другая, дзе «даўно» рыфмуецца з чымсь, выклікана адвечнай народнай непрыяззю да ўсялякага афіцыёзу. Няйнакш, меліся на ўвазе творы накшталт цыклу вершаў «Думы пра Маскву», зборніка паэзіі «Заўжды з Леніным», зборніка прозы «Разам з камісарам». «Пахне чабор» - адзін з культавых вершаў Б., дарма што напісаны ў юнацтве, пераважвае і шматтомны Збор твораў, і Ленінскую прэмію. Пах чабору звязваецца з успамінам юнацтва той самай сувяззю, якой у Марселя Пруста звязаны смак мігдалавага пірожнага з пацалункам маці наноч. Адметна, што чабор - расліна са сціплымі краскамі і няўлоўным пахам. Закаханыя героі маглі ўчуць яго хіба што ўпаўшы долу. За вобразам паўстае яскравая эратычная праява ў духу крыўскага барока.

БЫКАЎ Васіль (1924 - 2003) - народны пісьменнік *Крыўі*. Носьбіт крыўскага і вушацкага менталітэтаў, звязаных са стрыманасцю, строгасцю, суворасцю, нардычным тэмпераментам. У юнацтве спрычыніўся да аўры «віцебскай школы», вучыўся на мастака. Падчас другой сусветнай вайны перажыў экзістэнцыйна значны эпізод, калі загінуў для ўсіх, быў пахаваны і адзначаны на абеліску, але фізічна выжыў і працягваў свой шлях. Пасля вайны вырашаў яшчэ адну праблему выбару - паміж вайсковай і пісьменніцкай кар'ерай - і вырашыў на карысць пісьменніцкай. Як мастак, Б. істы крывіч - негаваркі, сквапны на фарбы, эмоцыі і гумар, графік паводле

каляровай гамы твораў. Б. дэбютаваў у гумарыстычным жанры, і на гэтым ягоны смех спыніўся. Быкаўскі рамантызм скончыўся аповесцю «Альпійская балада», дзе апроч вайны - каханне на альпійскім мурагу, пасярод красуючых макаў. Першаадкрывальнік у галіне еўрапейскага экзістэнцыялізму; ён давёў, насуперак выкладкам А. Камю і Ж.-П. Сартра, што выбар мае сэнс і маральнае абгрунтаванне. «Апошні рэаліст Еўропы», як пісала пра яго шведская газета, давёў да максімуму мастацкія магчывасці метаду, не спыніўся на ім і пранік у сферы парабалы і іншых прыёмаў сучаснага пісьма. Зачыняць усё праз безнадзейнасць і фаталізм - уласцівасць быкаўскай манеры і мыслення. Усе расейскія «ваенныя празаікі» - хто яўна, хто ўпотай - уважалі яго за настаўніка. Майстэрства не лгаць і казаць што думаеш пасля смерці Б. канчаткова страчанае. Рытарычнае пытанне «Калі Васіль Быкаў атрымае свайго Нобеля?» знялося смерцю аўтара і не на карысць шведскіх акадэмікаў. Атрымліваць Нобеля пасля Б. - сорам, які трэба нейк перажыць.

ВАЛЕРА, двайнік *У. Арлова*. Нехта пусціў пагалоску, што В. удараецца вобзем і скідаецца *Арловым*, бы *ваўкалак*.

ВАРГІН - дэманічны чорны кот з аповесці *Яна Баршчэўскага* «Шляхціц Завальня...», які сваім ваблівым варкатаннем плодзіць у чалавечых галовах вос, матылёў ды іншую *жамяру*. Такімі дэманічнымі катамі шчыльна населеная сусветная літаратура, калі згадаць ката Мура з аповесці Э. Т. А. Гофмана або ката Бегемота з «Майстра і Маргарыты» М. Булгакава. Аўтэнтычная свядомасць здаўна не давярала катам, падазраючы іх у зносінах з нячыстай сілай. Пісьменнікі-фантасты і сёння сцвярджаюць, што каты і сабакі маюць доступ да шостага ці сёмага вымярэння, у якім засталіся нашыя колішнія спадарожнікі - дамавікі, лесуны, русалкі. Але на чорных катоў, як гэта водзіцца, намаўляюць і шмат дарэмшчыны. Прынамсі, ахвяры ката В. мусяць вінаваціць у сваіх нягодах перадусім сябе. Кацінае варкатанне вызваляе ў іх істотах несвядомыя сублімаваныя жаданні, прыхаваныя ў глыбокіх сховах душы. Гэтыя комплексы матэрыялізуюцца ў абліччы *жамяры*. У галаве ў звяглівай Антосі заводзяцца восы, у раздуранай і легкадумнай паненкі Зосі - рознакаляровыя

матылі. А з галавы пыхлівага і зайздрослівага пана суддзі Дадэмухі «выляталі пухіры накшталт мыльных бурбалак і, лопаючыся пад столлю, перамяняліся ў жахлівых пачвараў - тут і крылатыя гадзюкі, *цмокі* ды іншая брыдота, падобная да спарахнелых шкілетаў».

ВАСЮЧЭНКА Пятро (н. 1959) - крыўскі пісьменнік і навуковец. У дзяцінстве спрычыніўся да пошуку Полацкага *Лабірынту*. У літаратурнай творчасці (зборнік аповедаў «Белы мурашнік», фэнтэзі «Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі») назіраюцца прыкметы крыўскага барока. Абмаляваў тып маргінальнага крывіча ў зборніку навелаў «Прыгоды аднаго губашлёпа», напісаным у суаўтарстве з напаўлегендарным *Антоніем Вырвічам*. Змясціў у «Кішэнны крыўскі слоўнік…» сваю персаналію з той самай прастадушнасцю, з якой зямляк *Ф. Скарына* маляваў на старонках Бібліі ўласны партрэт.

ВАЎКАЛАКІ - як бачым, вяліся не толькі ў Трансільваніі, але і ў *Беларусі*. У былічках, нават дакументальных крыніцах апісваюцца шматлікія выпадкі, звязаныя з ваўкалакамі. Адзін з такіх выпадкаў узноўлены і ў *Я. Баршчэўскага*. Існавалі рэцэпты ператварэння чалавека ў ваўкалака і наадварот. Сцвярджаецца, што гэтай ведаю валодаў і славуты крывіч Усяслаў Чарадзей. У нашыя дні здарэнняў з В. паменшала, але яны працягваюць фіксавацца. Некалькі год таму ваўкалак блукаў па вуліцах Санкт-Пецярбургу. На ўсялякі выпадак, вось адзін рэцэпт адчаравання ваўкалака, апісаны М. Нікіфароўскім: «Трэба перакінуць цераз Ваўкалака суконны пояс, часам граблі, часам вілы так, каб кінуты прадмет закрануў яго толькі заднім канцом і пераляцеў ад галавы да хваста».

ВОРША - крыўскае мройнае места, у якім памерла беларушчына, а крыўскасць засталася. На сёння ў В. аніводнай беларускай школы, аніводнага беларускага класу, а ў свой час места дало свету У. Караткевіча, які самарэалізаваўся як беларускі, але не крыўскі пісьменнік. Беларускасць В. пачалася і скончылася на ім. Крыўскасць В. - яе неадменная рыса. Жыццёвы сімвал В. - яе неабсяжны і страшны крымінагенны вакзал, вузел чыгунак, не апеты аніводным крыўскім або беларускім класікам.

ВУШАЦКІ ФЕНОМЕН - таямніца куточка крыўскае зямлі, які спарадзіў некалькі народных - не званнем, а сутнасцю - творцаў: *П. Броўку, В. Быкава, Р. Барадуліна*. Людзі тут, як сведчыць дзядзька Рыгор, тэмпераментам прахалодныя, але цешаць свой юр хвацкім і гарачым на эрас словам. Недзе тут размешчаны адзін з выхадаў Полацкага *Лабірынту*, які выпускае творцаў невядома з якіх нетраў крыўскае пракаветнасці.

ВЫРВІЧ Антоні (н. 1955) - легендарны крыўскі літаратар, суаўтар твору-містыфікацыі «Прыгоды аднаго губашлёпа», напісанага разам з *Пятром Васючэнкам*. Хаця апошні настойвае на факце суаўтарства, бальшыня крыўскіх літаратуразнаўцаў адмаўляецца верыць у існаванне гэтай асобы. Адзін толькі *Навум Гальпяровіч* пацвярджае, што аднойчы сустрэўся з В., але і сам паэт мае рэпутацыю дасведчанага містыфікатара. Паводле легенды, В. нарадзіўся на Пастаўшчыне ў сялянскай сям'і, вывучыўся на журналіста, але працаваў падпалкоўнікам міліцыі. Кажуць, што яго дагэтуль можна напаткаць у Менску, па якім ён пахаджвае ў міліцэйскай форме і з прышпіленай да паса кабурой, дзе змяшчаецца неадменны салёны гурок.

ГАЛЬПЯРОВІЧ Навум (н. 1948) - крыўскі паэт, радыёжурналіст. *Рыгор Барадулін* калісь назваў яго полацкім пеўнем, бо будзіў праз радыё ўсю *Беларусь*. Славянская душа ў габрэйскай абалонцы - так некалі выказаўся Г. сам пра сябе. У грудзёх у яго б'ецца праўдзівае крыўскае сэрца, якое мірыць у ім усе бінарныя апазіцыі. Сябра *«Брацтва з'едзенага цмока»*.

ГАФМАНІЗМ - закладзеная Э. Т. А.Гофманам традыцыя спалучэння рэальнага і фантасмагарычнага планаў. Скарыстоўвалася, у прыватнасці, М. Гогалем і М. Булгакавым. Не зусім слушна, аднак, называць крывіча *Я. Баршчэўскага* «беларускім Гогалем» або «беларускім Гофманам» за скарыстанне названага прыёму. Сваю «антытрадыцыйнасць», «антыкніжнасць» ён даводзіць у выглядзе творчай дэкларацыі: «Я не пераймаю формаў, якія любілі пісьменнікі англійскія або французскія; лічу, што чужаземнае не будзе пасаваць негаваркому жыхару Беларусі. Узяў я форму з самое прыроды». Такім чынам, Г. *Баршчэўскага* вырастае з міфалагічнай

аўтэнтыкі, беларускае (крыўскае) глебы. Ён менавіта выгадоўваецца, а не выбудоўваецца як кніжная мадэль. Рэальнасць і фантасмагорыя не ўзаеманакладваюцца, а зрошчваюцца. Кожны з апавядальнікаў прысягае, што гаворыць не казку, а шчырую праўду.

ДАРАФЕЙЧУК Ірына - паэтка; таксама як і Жэня Янішчыц, «Палесся мілае дзіця», але ўзгадаваная *Крыўяй*. «Ой, аралі хлопцы ніву, паламалі ярмо...» - хочацца заспяваць, калі бачыш яе, і дзеля яе варта паламаць мноства ёрмаў. Таемная сяброўка *«Брацтва з'едзенага цмока»*.

ДЗВІНА - вялікая крыўская рака. Літаратары не раз параўноўвалі беларускія рэкі з могілкамі. «Баркулабаўская хроніка» даносіць згадку пра тое, як у 1580 годзе магілёўцы загналі варожае войска ў Дняпро, рака перапоўнілася трупамі, «іж колка нядзель дняпровае рыбы не ядалі і вады не півалі для вялікага гнюсу...». «Магілаю ворагу цеснай не раз твае хвалі былі...» - кажа пра бацьку беларускіх рэк паэт Анатоль Астрэйка. Халодная крыўская красуня Дзвіна сталася могільнікам для Барысавых камянёў, паганскіх ідалаў і помніка Іосіфу Сталіну, які ўначы невядомыя абвязалі вяроўкамі і скінулі з берагу, узняўшы дзвінскае цунамі.

ЕЎФРАСІННЯ ПОЛАЦКАЯ (1110? - 1173) - першая святая зямлі Крыўскай і Беларускай. Заступніца не толькі за ўсю зямлю Беларускую, Крыўскую, Дрыгавіцкую, Радзіміцкую, Яцвяжскую, Падляшскую, Смаленскую, Бранскую, Бельскую, Беластоцкую, Ліцвінскую, Русінскую ды ўсялякія іншыя, але і за пісьменнікаў, як патлумачыла мне матушка з Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра. У свае 12 гадоў - надзвычай прыгожая, разумная і добрая. Такое здараецца раз на тысячагоддзе. «Бог няроўна дзеле», - уздыхае народная прыказка. Адной адмерае болей хараства, затое ад розуму адшчыкне; іншая - абліччам някідкая, ды сэрца залатое... Але калі няма анічога з трох, гэта ўжо не дзяўчына, а пачвара. «Шчаснае ж тое дзяўчо», як піша пра Еўфрасінню біёграф, было надзелена ў поўнай ступені ўсім - розумам, дабрынёй, хараством. Яна адчула неацэннасць гэтага дару і знайшла спосаб, каб не змарнаваць яго, а надзяліць ім усіх беларусаў -

тых, што былі, ёсць і будуць.

ЖАБЕР-ТРАВА - згаданая ў аповесці *Яна Баршчэўскага* «Шляхціц Завальня...» цудадзейная расліна, з дапамогай якой чалавек выпраўляецца ў трансцэндэнтальнае падарожжа - скажам, у будучыню. Магчыма, лісце жабер-травы змяшчае моцны галюцынаген. Маем паралель з раманнай серыяй Карласа Кастанеды, у якім персанажы здзяйснялі містычныя вандроўкі пры дапамозе галюцынагенавых грыбоў або кактусаў. Цікава, што цыган Базыль так і не скончыў свайго аповеду пра пана Адольфа, якога лісце Ж.-Т. прывяло ў нейкі паралельны свет, адкуль не знайшлося зваротнага шляху. Так незваротна сышоў і кастанедаўскі Дон Хуан, а за ім следам, зусім нядаўна, - і сам Карлас Кастанеда.

ЖАМЯРА (ЖАМЯРЫЦА, у *Ластоўскага* - ГМЫЗУРА) - дробныя, агідныя, нячыстыя жывёліны. Няварта атаясамліваць слова толькі з насякомымі. У гісторыі пра ката *Варгіна*, складзенай *Я. Баршчэўскім*, Ж. называюцца восы, матылі, жабы, мышы, нават крылатыя гадзюкі і невялікія *цмокі*.

ЗАВАЛЬНЯ - так зваўся гэты спагадлівы пан, які выстаўляў у зімовую ноч, калі завіруха і кудаса, свечку на падваконне ў сваёй хаце. Выспа пасярод *Нешчарды*, дзе месціўся дамок пана З., ёсць і дасюль, а самога дамка няма. Гадоў дваццаць пяць таму, калі я ўпершыню наведаў берагі Нешчарды, тутэйшыя жыхары ані не ведалі ні пра З., ні пра *Яна Баршчэўскага*. Але ўжо ў 1990-я яны прызвычаіліся да набегаў філолагаў, этнографаў, гісторыкаў і сустракаюць іх пытаннем: «То мо зноў ад *Баршчэўскага* будзеце распытваць?» Новае, забранзавелае быццё *Баршчэўскага*, што пачалося пасля ўзвядзення яму помніка, дало пачатак і новай міфатворчасці. Якая-небудзь дзевяностагадовая бабулька, цягнучы вас за крысо пінжака, будзе пытацца: «А ці ведаеце, чаму таго дзядзьку клікалі Завальнем? Таму, што ён адно ляжаў на печы, анічога не рабіў, толькі казкі слухаў. То пра яго і казалі: ляжыць як завала». У гэтай міфалагеме - усе адносіны нашага народу да дзеячаў тыпу Абломава. Вядома, літаратурны З. - не абібок і не марны летуценнік, а гаспадар з жывым практычным розумам, разважлівы, пабожны, жывы, так бы мовіць, рэзанёр, але са

сваім «прыбабахам» - наконт жахлівых гісторыяў. Ды хто іх не любіць? Ліса ў вядомай беларускай казцы прымушала дразда спачатку яе накарміць, напаіць, насмяшыць, а потым - напалохаць. *Ян Баршчэўскі* выдатна адчуў гэтае патаемнае жаданне кожнай істоты і здаволіў яго. У той час, калі шляхціц З. слухаў байкі сялян ды рыбакоў, у Расеі дваранства млела ад гатычных раманаў Радкліф. Толькі чыталі іх па-французску ў перакладзе з ангельскай. Шляхціц З. быў прыхільнікам нацыянальнае аўтэнтыкі.

КАЛЯНДАР - адзіная кніга, пасля Бібліі, якую прызнае і чытае шляхціц *Завальня*. У Бібліі ён, як і крывіч *Скарына*, знаходзіць амаль усё, што патрэбна для душы і для розуму. Усю астатнюю мудрасць - гаспадарчыя парады, назіранні за прыродай і колькі займальных гісторый - змяшчае ў сабе К. Гэта - той мінімум тэксту, што патрэбен чалавеку аўтэнтычнаму, які жыве ў згодзе з Богам, прыродай і людскімі законамі. Прыгадаем, што К. быў у ліку першых і, значыцца, самых памятных кніг Янкі Купалы. К. падкрэслівае розніцу паміж кніжнай схаластыкай і жывой ведай - антытэзу, на якой палягае мастацкая канцэпцыя «Шляхціца Завальні…». Архетып К. адпавядае цыклічнай формуле жыцця; коладзён - улюбёная кампазіцыйная схема беларускага эпасу, ад «Пана Тадэвуша» да «Адвечнай песні», «Новай зямлі», «Палескай хронікі». Дарэчы, К. дапамагае ідэнтыфікаваць рэальны час твору: справа дзеецца ў 1817 годзе. У гэты год шляхціцу *Завальню* пераказалі шэптам нейкую нядобрую навіну, пачутую ад пана пракуратара, і яна значна сапсавала яму настрой. Што тое была за навіна - пра гэта варта запытацца ў гісторыкаў.

«КНІГА ТЫСЯЧА І АДНАЕ НОЧЫ» - з ёю найчасцей параўноўваюць твор *Яна Баршчэўскага*. Але мы ведаем стаўленне аўтара да літаратурнага пераймання (гл. арт. *Гафманізм*). Рэальна два эпасы - беларускі і арабскі - лучаць фальклорна-этнаграфічны аўтэнтызм, прысутнасць слухача і апавядальніка і *скрынкавая кампазіцыя*.

КРЫВІЧЫ (ЛЮД БЕЛАРУСКІ) - насельнікі *Крыўі*, якіх *Ян Баршчэўскі* найчасцей называе *Людам, Людам Беларускім*. Аўтар падкрэслівае адбітак, што накладае на народны характар

тутэйшая прырода, суворы клімат. «У бедных вёсках у святочныя і будзённыя дні заўсёды пануе нейкая панурая цішыня; рэдка адгукнецца песня жняца або ратая, і па гэтым спеве можна лёгка зразумець яго заклапочаныя думкі, бо няўрод часта ашуквае тут надзеі працавітага земляроба...» Аўтар адзначае меланхолію як дамінанту тутэйшага песеннага фальклору: «Нават вясельныя песні, дзе маладым зычаць шчаслівага супольнага жыцця, маюць у сабе нейкае пачуццё смутку, як быццам яны не давяраюць будучаму лёсу ў гэтай юдолі плачу...» Някідкі й антрапалагічны партрэт крывіча, што праглядаецца праз аблічча рыбака Родзькі: «Росту ён быў малога, твар бледны і сухі, жарыя вільготныя валасы неахайна падалі на плечы...» Адчуваецца той жа прыём - прыбядненне, з якім беларускія аўтары распавядаюць пра тутэйшае. Разам з тым, з прытоеным гонарам Баршчэўскі апісвае вясельны абрад выкупу нявесты, які параўноўвае з рыцарскім. Ягоныя прасталюдзіны - хаця негаваркія ды сціплыя - без выключэння надзелены годнасцю і самавітасцю. Як мала гэта нагадвае постаць крывіча-выраджэнца, выведзеную *В. Ластоўскім* у навеле «Прывід»! Аднак жа прыбядняцца К. аніяк не варта, бо яны былі заснавальнікамі, як засведчыў археолаг Алег Трусаў, некалькіх магутных еўрапейскіх дзяржаваў: Полацкага княства, ВКЛ, Пскоўскага княства, Смаленскага княства, Цвярскога княства, БНР, БССР, Рэспублікі Беларусь.

КРЫЎСКАЯ ІДЭЯ - яна створана не дзеля раскідвання, а дзеля збірання беларускіх земляў. Яе нерва - унітарызм, а не рэгіяналізм. У падмурку яе - збіранне беларускіх земляў у імперыю або новую супольнасць, дзе *Крыўя* будзе як ядро ў арэху.

КРЫЎЯ (КРЫВІЯ) - назва, легітымізаваная *В. Ластоўскім*, заснавальнікам крыўскае канцэпцыі *Беларусі*. Вядома, трэба быць ураджэнцам Паўночнае Беларусі, каб прыйсці да *крыўскае ідэі*. Ластоўскі рэдагаваў часопіс «Крывіч», ствараў «Расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік» і мроіў пра бязмерна старажытную крыўскую цывілізацыю, лёс якой увасобіў у «Лябірынтах». У *Яна Баршчэўскага* слова «К.» не прамаўляецца аніводнага разу. Але вымярэнні К. - яе глыбокая старасветчына, крыўскі менталітэт - адчуваюцца паўсюль. Нарэшце, геапрастора: *Ян*

Баршчэўскі памяшчае апісаны ім край у трохкутнік паміж *Полацкам*, Себежам і Невелем, у басейнах Палаты, Дрысы і рачулкі з песеннай назваю Лаваць. «Неўраджайная і ўбогая краіна», - раз-пораз прамільгне ў апісанні К. *Баршчэўскім*, і гэта ўспрымаецца як традыцыйнае беларускае прыбядненне. «Невясёлая старонка / Наша Беларусь./ Людзі - Янка ды Сымонка, / Птушкі - дрозд ды гусь», - абзавецца ў тон яму Янка Купала. Наўмыснае прыбядненне спрадвек ратавала беларусаў ад назойлівай цікавасці чужынцаў. Прырода К., напраўду не надта шчодрая, усё ж абумовіла ментальнасць *крывічоў*. Трэба, аднак, памятаць, што ў аб'ёмным гісторыка-культурным кантэксце К. - не сінонім Беларусі і не яе рэгіён, а адна з яе іпастасяў, накшталт Літвы. «К.» - вядома, не ад «крывога», а ад крэўнага. Крэўнае - кроў - Крыўя. Гэта значыць, што К. (Радзіма) даецца праз пралітую за яе кроў.

ЛАБІРЫНТ - адвечны міф і праўда *Полацку*. Хто з нас не шукаў у дзяцінстве Полацкага Л.? Няможна нарадзіцца ў Полацку, хадзіць ягоным асфальтам, брукам і глінай, не адчуўшы пад нагамі таямніцы. Сублімаванае з падсвядомасці ў літаратуру, гэтае пачуццё спараджае лабірынтавую свядомасць, мысленне лабірынтамі. У перакладзе з мовы старажытнага Крыту «Л.» азначае «сякера, вострая з абодвух бакоў», яна - герб выспы яшчэ ад мікенскае эпохі. Крыт - гістарычная радзіма Л., а герб востраваў - сімвал смерці, якая тоіцца ў сутарэннях. *В. Ластоўскі*, стварыўшы аповесць «Лябірынты», пасяліў у іх, а таксама ў сваім жыцці смерць. У сутарэннях гіне ад рытуальнага ўдару Падземны чалавек. Смерць, што пасялілася ў Л., абрынулася і на аўтара: *Ластоўскага* расстрэльваюць 23 студзеня 1938 году ў Сарататве. *Ластоўскі*, як і ягоны Падземны чалавек, не памірае: ён саступае месца іншым у гэтым вымярэнні, а сам сыходзіць у немаведама якія лабірынты быцця. Такім чынам, лабірынтавая форма існавання нашае культуры, з выхадамі на паверхню і блуканнямі ў нетрах, небяспечная.

ЛАСТОЎСКІ Вацлаў (1883 - 1938) - крыўскі пісьменнік, культуролаг, лінгвіст. Заснавальнік *крыўскай ідэі*, балазе суворы паўночны край, апісаны *Баршчэўскім*, быў і ягонай радзімай. Аўтар «Гісторыі беларускай (крыўскай) кнігі»,

«Расійска-крыўскага (беларускага) слоўніка», аповесці «Лябірынты», шэрагу мастацкіх і публіцыстычных твораў, у якіх крыўская тэорыя набывае рысы завершанасці і вычарпальнасці. Пераемнасць у дачыненні да спадчыны *Баршчэўскага* выглядае як творчае сумоўе, дыялог, які адбываецца па-за часавымі межамі. Абодва аўтары апісваюць *Крыўю*, *Полацак*, тутэйшыя таямніцы і рарытэты, паглыбляюцца ў міфатворчасць. Пра гэта сведчыць пераказанае абодвума паданне пра Гаўраў і Стаўраў. У лексіконе Л. і перакладным тэксце «Шляхціца Завальні…» ўжываюцца крыўскія словы кшталту *жамяра*, *навец* ды інш.

МОРА - у Беларусі яно некалі было, пра што сведчаць выкапні Палескае катлавіны, але потым... «акупанты змяшалі яго з гразёй, дык засталося толькі Пінскае балота» (Я. Купала, «Тутэйшыя»). *Крывічы* калісь мелі фарпосты на Варажскім моры. Не маючы выйсця да М., беларусы пакутуюць адвечнай нэндзай па ім, ад чаго й нараджаюцца мроі пра ўласнае М. Яны прысвячаюць яму вершы, у якіх навальнічнае М. выглядае як разгайданае палескае балота (гл. «Мора» Цёткі). *Ян Баршчэўскі* ў Пецярбургу, меланхалічна сузіраючы Фінскую затоку, узгадвае пра *Нешчарду*, якая ўяўлялася яму сапраўдным М.: «Дзень быў нейкі хмарны. Хвалі біліся аб бераг...»

МУДРОЎ Вінцэсь - крыўскі празаік. Адзін з пачынальнікаў крыўскай іранічнай прозы, якую прадстаўляюць таксама *Ўладзімір Арлоў*, *Пятро Васючэнка*. Традыцыя іраністыкі не звязана з лініяй смехавой культуры, бо гумар М. і *Арлова* - з іншае плоскасці, чымся смех Мрыя або Крапівы. Смех - эмацыйны стан, іронія - разумовы. Смех запаўняе ўсе атожылкі мастацкага свету, перайначвае, дэфармуе, перакульвае. Іронія - спосаб пошуку адэкватнасці. М. не прыдумляе гумарыстычныя тыпы, а насяляе прастору сваіх навелаў «полацкімі мальцамі» - Адамам Марштрупам, Жэрарам, Галабурдам ды іншымі. Ён не рэстраўруе эпохі Брэжнева ды рэальнага сацыялізму, а спрабуе разблытаць карункі іранічнага жыцця.

НАВЕЦ - нябожчык. «Наўцом называюць сьвежа памершага нябошчыка, а также нябошчыка які ходзіць па сьмерці і высысае ў жывых кроў (рас. *вурдалак*, польск. *upior*). Навец процістаўляецца мярсьню, памершаму, які рассыпаўся і нямае

ўжо цела, а паказуецца толькі як дух...» (*В. Ластоўскі*, «Расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік»). Слова сустракаецца ў беларускім перакладзе «Шляхціца Завальні…», прыкладам у раздзеле «Стогадовы стары і чорны госць», што сведчыць пра пераемнасць творчасці *Баршчэўскага* і *Ластоўскага*. У 1067 годзе наўцы ўзнялі паўстанне ў *Полацку*, мабыць, помсцячы Ўсяславу за здраду старой веры: «У Полацку зусім благое прычынілася. Уначы на гарадскіх вуліцах чуліся як быццам енкі людскія, тупат ды конскае гігатанне. Гэта гойсала па горадзе д'яблава сіла. Хоць ніхто з палачанаў на ўласныя вочы не бачыў, што там чыніцца, але хто выйдзе з хароміны ці проста вакно прачыніць, той жутка паміраў ад нябачнае раны, якую яму сваім уколам д'ябал зрабіў. Калі ж пакінулі палачане ўначы выходзіць з харомінаў, д'яблава сіла пачала ўдзень лютаваць. Сярод стогну, плачу і тупату каналі людзі ў Полацку і ў воласці. Нібыта цэлае войска д'яблава скакала па зямлі на конях сваіх, нябачнае вачам людскім, пакідаючы за сабою толькі сляды капытоў. Тады і пачалі казаць у народзе: «Як мерцвякі б'юць палачанаў». (З аповеду «Аб страхах і марах д'яблавых у Полацку за князем Усяславам».)

НЕШЧАРДА - адно з самых вялікіх азёраў у Беларусі, дзесьці як Нарач, Дрысвяты, Асвея, Снуды. І адно з самых халодных, няветлых, адкуль мо й паходжанне назвы - ад «няшчодра». Калі ў непагадзь яно пахмурнее, збіраецца ў маршчакі, дык выглядае рыхтык *мора*. Але яно спагадлівае і пяшчотнае да шчырых і чыстых людзей, такіх, як шляхціц *Завальня* - па сутнасці, гаспадар возера. Мне давялося некалькі разоў быць на яго берагах, бачыць апісаныя *Баршчэўскім* прыбярэжныя пясчаныя горы, лазняк, паплавы, белых крачак над хвалямі. У рачулцы, што выцякае з Н., я ўлавіў двух печкуроў. Але не паказаліся мне *цмокі*, апісаныя *Баршчэўскім*, не выставіў над вадой свае рогі шатан. Але я памятаю і іншую Н. - у раз'ятраны, гарачы жнівень 1994 году, калі возера нагрэлася, як саган з юшкай, і праз усю рабінавую ноч у ім нешта булькацела, пялёскалася, уздыхала ды цмокала. А ўранні на хвалях пакалыхвалася пустая змяіная скура - ці то рэшткі ад здохлага цмока, ці то скінутая вопратка маладой вужачкі... Пра містычныя падрабязнасці начной юшкі на возеры Н. глядзі ў артыкуле *«Брацтва з'едзенага цмока»*.

ПАЛАЧАНЕ - адгалінаванне *крывічоў*. Іх часам блытаюць з полаўцамі. Прыкметы нацыянальнай ментальнасці П.: стрыманасць, інтравертнасць, нечаканая змена рашэнняў, унутраная трансцэндэнцыя. Алагічныя рашэнні П. занатаваныя ў летапісах і хроніках. П. яшчэ ад часоў полацкага веча любілі скідваць уласных князёў і запрашаць чужынцаў, каб потым выкінуць другіх і паклікаць першых. Полацкае веча як зборны персанаж летапісаў размаўляе і выносіць рашэнні, як жывы чалавек. Можна ўявіць, як гэты зборны палачанін чухае патыліцу і калупаецца ў носе, перш чым кагосьці ў чарговы раз здаць. Незразумела, чаму ў 1168 годзе П. прылашчылі чужынцаў - наўгародцаў ды смаленцаў, а пазней адмовіліся прыняць Скіргайлу, Ягайлавага брата, пасля чаго закіпела барацьба ў ВКЛ. Ёсць звесткі пра праніклівага палачаніна Пракопа, які раскрыў таемныя планы Таўцівіла (Беларускія летапісы і хронікі. Мінск. 1997. С. 42).

ПАЛЁНКА - адмысловы трунак з паленай гарэлкі, журавінаў і мёду; крыўскі пунш. Патрэбны, каб грэць душу й цела падмерзлага крывіча. Жыхары Паўночнае Беларусі маюць патрэбу ў сугрэве, гэтаксама як і скандынавы. На гэтую акалічнасць фрывольна намякнуў крывіч з Вушаччыны *Рыгор Барадулін* у «Здубавецьці», разважаючы над скаромнымі крывіцкімі прыпеўкамі: «Насельнікі халаднаватай часьціны плянэты грэлі свой юр, ятрылі сябе словам моцным, як пяршак. Каб род ня зьвёўся». П. - культавы аб'ект мясцовага патрыятызму. Вось што кажа пан Сівоха, персанаж кнігі *Яна Баршчэўскага*: «Як неразумна... прывозіць з Рыгі аракі і замежнае віно, у якое, як я чуў, дзеля смаку немцы дадаюць не вельмі добрыя для здароўя прыправы, і яшчэ дорага за яго плаціць. Лепей выкарыстаць грошы на што іншае. У нас ёсць свае, выдатныя на смак і не шкодныя для здароўя, напоі. Напрыклад, гэтая палёнка! Хвораму чалавеку можна выпіць шкляначку - не пашкодзіць, а дапаможа; ад ліхаманкі, ад прастуды - адзіныя лекі!»

ПАЛТЭРГЕЙСТ - анамальная з'ява, імпартовае вызначэнне якой вынайшлася ў нашым стагоддзі. *Ян Баршчэўскі* не ведаў такога кручанага слова, але з'яву апісаў з выключнай дакладнасцю: «Ля печы стаялі гаршкі. Адзін з іх падлятае ўгору, падае на

падлогу і рассыпаецца на дробныя чарапкі. Збан з квасам, які стаяў на лаве, ускоквае на стол, а са стала кідаецца на зямлю і разлятаецца на друзачкі. Кот перапалохаўся, заіскрыліся вочы, і ён, пырхаючы, схаваўся пад лаваю. Рознае хатняе начынне пачало лятаць з куту ў кут».

ПЛАЧКА - увасабленне слыннай жаночай пасіянарнасці, гэтак пашыранай на беларускай ды крыўскай землях. М. Хаўстовіч дасціпна выводзіць генеалогію вобразу ад «Трэнасу» Мялеція Сматрыцкага. Плач жанчыны мусіць суцешыцца мужчынскай суворай сілай. Найбольш радыкальныя нашыя пасіянеркі, кшталту Эміліі Плятэр, не чакалі, пакуль выспеюць гронкі гневу, самі сядалі ў сядло і бралі зброю. У творы *Яна Баршчэўскага* суцяшальнікам П. выступае Сын Буры. Агну Вецер суцяшае яе сын Васіль, «Марыську чарнаброву» - Кастусь Каліноўскі.

ПОЛАЦАК - першая сталіца Беларускае дзяржавы, адвечны цэнтр *Крыўі*. Паводле *В.Ластоўскага* - цэнтр найстаражытнейшай цывілізацыі, сувымяральнай паводле ўзросту з егіпецкай або шумерскай. *Ян Баршчэўскі* не заглядаў гэтак далёка ў гістарычную мінуўшчыну, але ягоная міфалагічная даўніна сягае яшчэ глыбей. Згадваюцца незвычайныя людзі-асілкі, што жылі даўней, у касмічна аддаленым часе. У вачах шляхціца *Завальні* П. - цэнтр асветы, асяродак кніжнае навукі; ён жа - і крыніца заразы, ад якой пашыраецца *чарнакніжніцтва*. Пан *Твардоўскі*, дарэчы, таксама атабарыўся ў П. Таму *Завальня* з павагай і адначасна з насцярогаю ставіцца да вялікага ў ягоных вачах места і засцерагае пляменніка і сыноў ад гарадскіх спакусаў.

РАГНЕДА - самая гаротная жанчына Беларусі, сталася шчаслівай пасля свае смерці: ёй пашэнціла быць гераіняй літаратурных твораў. Асабліва ў драматургіі - у шэрагу п'ес беларускае «Рагнедзіяны» («Русь Кіеўская» Алеся Петрашкевіча, «Звон - не малітва» Івана Чыгрынава, «Палачанка» Аляксея Дударава). Гэта - свайго кшталту кампенсацыя за гаротную долю.

СВЕЧКА - сталы літаратурны артэфакт, адзін з сімвалаў светлай веды, у якой мажлівая гармонія паміж верай, розумам і

магіяй. Шляхціц *Завальня* запальвае С. і ставіць яе на падваконне свайго дамка, каб уратаваць падарожных ад сцюжы і голаду, а заадно і паслухаць іхнія займальныя гісторыі. Архетып С. быў актыўна ўжываны пазнейшымі беларускімі літаратарамі, асабліва М. Багдановічам, Ядвігіным Ш., *В. Ластоўскім*.

СІМЯОН ПОЛАЦКІ (1629 - 1680) - першы вершаскладальнік-прафесіянал, і не толькі зямлі крыўскай. Ад нараджэння меў імя Самуіл Пятроўскі-Сітніяновіч. Як дзеяч барока злучаў у сабе мноства бінарных апазіцыяў. Маючы еўрапейскую адукацыю, быў адэптам праваслаўя маскоўскага ўзору. Манах і аскет, пісаў гуллівыя, дасціпныя і вынаходлівыя вершы. Упарты дыдактык, імкнуўся спалучыць прыемнае з карысным і сваім паэтычным зборнікам надаваў гастранамічныя назвы: «Абед душэўны», «Вячэра душэўная». У плане душэўнасці назіраем нечаканае падабенства з паэзіяй *Петруся Броўкі*. Прышчапіў расейскаму пісьменству першы літаратурны стыль - барока. Першы беларускі культуртрэгер у Масковіі. Першы постмадэрніст. Пісаў графічныя вершы - у выглядзе крыжа, сонца, кола, сэрца, каляднай зоркі. Пісаў рэха-вершы, паліндромы, вершы-загадкі, вершаваныя трактаты, мініяцюры-двухрадкоўі і паэтычныя «Метры» памерам у кіламетры. Сярод ягоных сучасных паслядоўнікаў - «бумбамлітаўцы» Сяржук Мінскевіч, Віктар Жыбуль, а з больш сталых - магістр версіфікацыі *Рыгор Барадулін*. Яны наследавалі не толькі эксперыменталізм, але і кансерватызм С. П. Актыўны кнігадрукар, С. П. свае вершы пісаў ад рукі, і ягоныя паліхромныя тэксты захавалі цеплыню паэтавага почырку. «Бумбамлітаўцы» з ягонае лёгкае рукі вынайшлі жанр друкапісу. Навучаў маскоўскага цара, Аляксея Міхайлавіча, цывілізаванасці ды талерантнасці, хай сабе і марна. Да выхавання Пятра Аляксеевіча спрычыніўся толькі ўскосна, бо быў настаўнікам ягонага брата, убогага розумам і целам царэвіча Івана. З Івана цара не атрымалася, ды ўсё адно С. П. - яшчэ і першы педагог-дэфектолаг.

СКАРЫНА Францішак (1490? - 1551?) - вялікі крыўскі вучоны, асветнік, пісьменнік, першадрукар. Волат еўрапейскага Адраджэння. Паліглот: ведаў прынамсі адзінаццаць жывых і

мёртвых моваў (царкоўнаславянскую, лаціну, старажытнагрэцкую, іўрыт, маскоўскую, польскую, дацкую, італьянскую, чэшскую, нямецкую, родную старабеларускую). Верыў у веды, за якую б свецкую або царкоўную навуку ні браўся. Марыў паяднаць веру з ведай і тым пакласці канец адвечнай спрэчцы паміж навукай і рэлігіяй, і дамогся б мэты, калі б не ворагі. Захаваў вернасць *крыўскай ідэі*, *Полацку*, заставаўся полацкім мальцам, якую б кнігу Бібліі ні перакладаў. У прадмове да «Кнігі Юдзіф-удавіцы» выснаваў ідэю беларускага (крыўскага) Дому, які жыхары пільнуюць так, як рыбы - свае віры, пчолы - свае вуллі, звяры - свае норы, а птушкі - свае гнёзды.

СКРЫНКАВАЯ КАМПАЗІЦЫЯ - ланцуг апавяданняў, пры якім адбываецца змена апавядальнікаў: новы казачнік памяшчаецца ўнутр папярэдняй гісторыі. Апавяданні ўкладваюцца адно ў адно, нібы расейскія матрункі. Прыём актыўна скарыстоўваўся ў *«Кнізе тысяча і аднае начы»* і ў «Шляхціцы Завальні...».

СЛОЎНІК - у кантэксце постмадэрновага мастацтва не толькі збор словаў, але і літаратурны жанр, вынаходніцтва якога прыпісваецца сербскаму літаратару Міларадy Павічу. У *Крыўі* гэты жанр значна раней заснаваў *В. Ластоўскі*, чый «Расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік» (Коўна, 1924) стаўся ўзорам літаратурна-лінгвістычнай эўрыстыкі. «Кішэнны крыўскі слоўнік Пятра Васючэнкі» мае тэндэнцыю ператварацца з мікратэксту ў гіпертэкст, бо пачынаўся як «Крыўскі слоўнік Яна Баршчэўскага», а скончыцца невядома чым, бо ён у руху, а імёны і артэфакты, што маюць увайсці ў яго, множацца, бы дразафілы. Вычарпанасць праекту можа абумовіцца яго паўторамі, і тады тэкст ператворыцца ў суцэльны курсіў.

ТВАРДОЎСКІ - жыццялюбца і геданіст, беларускі Фаўст, які хаўрусаваўся з Мефістофелем не за «Імгненне, спыніся!», а дзеля зямных уцехаў. Затое ў хвіліну страшнай расплаты ён не шукаў жаночага заступніцтва, а ратаваўся, як мог, праз сваю кемлівасць і дасціпнасць. Герой балады Адама Міцкевіча, рамана Юзафа Крашэўскага. У кнізе *Яна Баршчэўскага* з'яўляецца ва ўстаўной навеле «Твардоўскі і вучань».

ЦМОКІ - жылі ў азёрах, рэках і багнах Беларусі. У. Караткевіч

апісаў лепельскіх Ц. як найбольш крыважэрны і небяспечны для чалавека від. Лепельскія Ц. перакульвалі чаўны з «грамадзянамі Вялікага княства Літоўскага», як піша *У. Арлоў*, і жывіліся названымі. Ц. з возера *Нешчарда* адрозніваліся меншымі памерамі, не раз набіваліся ў рыбацкія невады і палохалі тутэйшых рыбакоў. Цмок, які вылупіўся з яйка, знесенага чорным пеўнем, верагодна, належыць да найстаражытнейшай пароды, ён нашчадак тых агнядышных пачвараў, перамогамі над якімі ганарыліся сярэднявечныя рыцары. Хведар Еўлашоўскі бачыў летаўца (гл. «Дыярыуш» Х. Еўлашоўскага), лятучую і агнядышную разнавіднасць цмока, які залятаў у акно да адной кабеціны. Летаўцы маюць здольнасць скідвацца людзьмі, пераважна каханкамі. Мадэль летаўца - паветраны змей. Пасля сустрэчы з летаўцом Еўлашоўскі моцна захварэў на нервовыя прыпадкі, ледзьве ачомаўся праз некалькі гадоў. Выгляд беларускіх Ц. можна ідэнтыфікаваць паводле абразоў, выпісаных веткаўскімі іканапісцамі, на сюжэт змагання св. Юр'я з пачварай. Агідныя і даволі мізэрныя істоты нагадваюць крылатых жабаў або вужакаў. Апошняга жывога цмока вылавілі, як кажуць, у Свіслачы на пачатку гэтага стагоддзя і нараклі «балотным яшчарам». Ёсць меркаванне, што ў пінскіх балотах або глухіх азёрах *Крыўі* Ц. працягваюць жыць да цяперашняга часу, як і ў знакамітым шатландскім возеры Лох-Нэс. У наш час стыхійна ўтварылася *Брацтва з'едзенага цмока*, калі на беразе *Нешчарды* ўначы балявала група літаратараў, удзельнікаў літаратурна-этнаграфічнай экспедыцыі, што даследавала сляды Яна Баршчэўскага, і ўпоцемках спажыла ў юшцы вадзянога Ц. *Уладзімір Арлоў* цвердзіць пра эзатэрычную прыроду Ц. І кажа, што частка майго артыкулу пра Полацкі *Лабірынт*, што датычылася Ц., нават на ксэраксе не хацела адбівацца.

ЧАРНАКНІЖНІК - гэтая злавесная постаць з'явіцца на першых старонках кнігі *Яна Баршчэўскага*, адступіць у цень, але будзе вяртацца ў аповедах пра Чорнага госця, ката Варгіна, валасы, што спяваюць на чалавечай галаве. Ч. - носьбіт метафізічнага ліха, згубіцель *Крыўі*, гэтаксама як *асташы* і *Белая Сарока*. Гэтае ліха, чарнакніжніцтва, - з'ява цывілізацыйная, а не міфалагічная. Ч. знаходзіцца ў свеце людзей, а не дэманаў, такіх, як шатан, цмокі або лесуны, хаця ён і карыстаецца

паслугамі духаў. Чарнакніжніцтва - спараджэнне схаластыкі, алхіміі, скрайняга рацыяналізму. *Баршчэўскі* са скрухаю зазначае, што шляхта спазналася з Чарнакніжнікамі, а веру і звычаі *люду беларускага* трымае за цемрашальства і забабоны. Дарэчы, у гэтую ерась упаў і бацька нацыянальнага генія Адам Багдановіч, калі традыцыі і завядзёнкі беларусаў трымаў за шкодныя «пережитки». Самаўпэўненая шляхта са смехам выслухоўвае «байкі» пра жывыя валасы, пра ката *Варгіна*, а пасля мусіць расплачвацца за свой недавер. У выніку перамагаюць праклямаваныя *Баршчэўскім* аўтэнтызм, пракаветнасць, старасвецкасць, інакш кажучы - беларускі фундаменталізм.

[image]

[image]

№ 3 (32) - 2004

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/5

[image]

СЯРГЕЙ ШЫДЛОЎСКІ
выпускнік гістфаку БДУ. Выкладаў гісторыю культуры ў полацкім унівэрсытэце, цяпер робіць тэхнолягам на адным хімічным прадпрыемстве Наваполацку. Стваральнік рэсурсаў www.siver.net і www.epolotsk.com.

Сяргей Шыдлоўскі Зьбіраньне Полацку

1

Ілюстрацыі з полацкімі бажніцамі прыдадуцца ў гістарычным падручніку любой ідэалягічнай фармацыі, яны прысутнічалі нават у кніжцы Абэцэдарскага. Полацкая тэма будзе захоўваць актуальнасьць, пакуль існуе патрэба глёрыфікацыі ўлады, незалежна ад яе цывілізацыйных арыентацыяў. Таму спадчына Полацку бачыцца спрыяльным полем для агульнабеларускага ідэалягічнага кампрамісу.

Полацак - Рэймс-на-Дзьвіне, цырыманіяльная заля ўсходнеэўрапейскай гісторыі. Адсюль - сьмяротныя закляцьці на крыжы Эўфрасіньні, урачыстыя клятвы Батуры… Авансцэна гісторыі вымагае высокага стылю. Адсюль - пышныя полацкія трыюмфаваньні маскоўскіх цароў, ілюмінацыі для імпэратрыцы, адсюль Сімяон… Жарсьць Полацку - каранаваць.

Каму належыць крывіцкая спадчына? Сучасныя палачане на вуліцах роднага гораду могуць падацца статыстамі: дзея скончылася, галоўныя героі сышлі пад воплескі са сцэны. Магчыма, гэтак жа пачуваюцца цяперашнія качканосыя жыхары Грэцыі, якія змушаны з годнасьцю несьці ўласныя комплексы ў атачэньні мармурова-бездакорных Вэнэр ды Апалёнаў.

Крывіцкая, як і старагрэцкая, Антычнасьць належыць агульнаэўрапейскай цывілізацыі, што ёсьць і гонарам, і адказнасьцю, і смуткам цяперашніх кватарантаў гэтых легендарных руінаў. У дзяржаўніцкіх дэкарацыях Полацку, на яго музэйных вуліцах па меры таго, як прасякаешся іх мэсыджамі, робіцца няўтульна. Нават любоўныя полацкія гісторыі, хрэстаматыйныя лёсы палачанак пераплецены з жарсьцю валадараньня ці служэньня вышэйшым рацыям. У крэпасьці, крамлі, манастыры вяршыцца дзея… У Полацку адраджэнскіх ілюстраваных кніжак нельга жыць. Гэтым Полацкам можна гандляваць, гэтаму Полацку можна служыць, трымаць тут аблогу.

У сучасных палачанаў, мяркую, няма настальгіі па Бельчыцах - зруйнаванай княскай рэзыдэнцыі, ім бракуе кавярняў. Але руіны, страты, прывіды, цені, двайнікі - абавязковая частка гульні, тыя 2/3 айсбэргу, под, на якім будуецца патас міталёгіі й пэрспэктывы турыстычнага бізнэсу. Ці засталося ў жыхароў сучаснага Полацку энэргіі, каб пазьбегнуць існаваньня ў засені легенды, манаролі музэйшчыкаў-гідаў і абжыць руіны наноў?

У Полацку нешматлікая інтэлігенцыя. Зароблена нафтахімічнымі монстрамі не асядае дывідэндамі ў кішэнях гараджанаў. Тут няма ўплывовых штаб-кватэраў, салёнаў, клюбаў - інфраструктуры лабіяваньня й фармаваньня рэгіянальнай рацыі. Адсутнічае адпрацаваны канвэер вырабу інтэлектуалаў ды палітыкаў. Але палачане, вымкнуўшы за муры роднага гораду, не губляюцца ў часе й чужых інтарэсах. Уласна, толькі за мурамі гораду яны і робяцца палачанамі - вандроўнікамі, піянерамі-варагамі, пакліканымі на княжаньне.

Полацкі герб - караблік. Яго гушкалі хвалі сусьветных цывілізацыйных плыняў. Гэты горад ня быў канцавым пунктам на шляху, якім калісьці выправіліся крывічы. Полацак - нацягненая цеціва, адпраўны пункт калянізацыі. На поўнач - для Бізантыі, на поўдзень - для скандынаваў. Маяк, сьвечка на акне хаты шляхціца Завальні ў завею. Полацак вядзе. На Поўнач, на Захад, на Ўсход… Усё залежыць ад таго, зь якога пункту вы заўважылі яго праблескі.

Раскручваюцца ў Полацку, прадаюцца ў Менску. Як зоркам

належна нараджацца на небе, так беларускае мастацтва ды гісторыя ствараюцца ў Полацку. Так было стагодзьдзямі, і цяпер спрацоўвае эфэкт самай даўгой у гісторыі гэтага народу рэклямнай кампаніі - імя Полацку на слыху ўжо тысячу год з каптуром у колькі стагодзьдзяў.

Полацак ня мае індустрыі штампаваньня пасьпяховасьці, гэта не канвэер, а хутчэй банк - масіў сымбалічнага капіталу, што назапашваўся пакаленьнямі. Ад яго нам усім нешта авансам і перападае.

Брэнд кшталтуецца стагодзьдзямі. У Полацку няма брэндаў піўных ці кілбасных. Піва ды кілбасу тут па-людзку так і не навучыліся рабіць дасюль. У гэтым горадзе прызвычаіліся ствараць нематэрыяльнае - краіць пурпур, а не кажухі. Полацкае імя маркіруе духовае - лёсы, а не кар'еры.

Значную частку сучаснага насельніцтва Полацку складаюць нашчадкі савецкіх вайскоўцаў. Але сын савецкага пракурора Ўладзімер Арлоў ды носьбіт ня менш «чужынскага» прозьвішча Вінцэсь Мудроў робяцца выказьнікамі тутэйшай рацыі. А каму прыйдзе да галавы аспрэчваць полацкасьць ураджэнца Жодзіна Алеся Аркуша? Празь дзяцей расейцаў, украінцаў, габрэяў прамаўляе полацкае. Як спрацоўвае мэханізм гістарычнай пераемнасьці? Хіба ў пакрывеленым штыкетніку - візуальная выява крывіцкай велічы? Ці цяперашні раённы статус гораду - зарука непарыўнасьці дзяржаўных традыцыяў палачанаў?

Полацкія архетыпы старэйшыя за нацыянальную ды сацыяльную каньюнктуру, народжаную XIX стагодзьдзем. Яны апэлююць да старажытных, падставовых інстынктаў, спрадвечнай жарсьці - волі да ўлады, славы, непарыўнасьці роду. Іх прымаюць без пасярэдніцтва граматычных ці канфэсійных упадабаньняў. Рагнеда, Рагвалод, Усяслаў, Эўфрасіньня таго ж веку, што і Фаўст, Трышчан, Іжота, Сьвяты Францішак ды кароль Артур. Яны - складнікі наднацыянальнай эўрапейскай ідэнтычнасьці. Таму праваднікамі полацкіх рацыяў так лёгка робяцца людзі рознай крыві ды розных канфэсіяў.

Спробы зьвесьці Полацак да рэзэрвацыі язычніцкага сьветапачуваньня ці прэзэнтаваць яго як апірышча нейкай

адной хрысьціянскай канфэсіі азначае рэдукцыю яго месца ў гісторыі. Амбівалентнасьць Сьвятога гораду-ваўкалака зацеміў яшчэ Власт. Пад Полацкам - мэтафізычныя Лябірынты, падпольле, двайное дно, ён мае выхады-лёхі ўва ўсе бакі - да езуітаў, у Бізантыю ды ў пракаветныя паганскія лясы. Дзедам сьвятой Эўфрасіньні быў ваўкалак Усяслаў, што зьняў званы з наўгародзкай Сафійкі; Скарына вучыўся ў каталіцкіх унівэрсытэтах; Цяпінскі быў антытрынітарам; Сімяон Полацкі кім толькі ня быў. І ўсё гэта Сьвяты Полацак - горад-воўк, які - колькі яго ні прыкармлівай - пільнуе свой лес. Гэта купецкае прагматычнае места, і галоўная крыніца экспарту тут - легітымнасьць, міты, цырыманіял, прэстыж, генэалёгіі.

Полацак - культуралягічная, гістарычная, ідэалягічная велічыня, якая ня ставіцца пад пытаньне. Іншая рэч палачане. Уладзімера Арлова бачылі многія, але і Еці бачылі… Ёсьць полацкія архетыпы, іконы, героі, але што сабой уяўляюць сучасныя палачане? Ці можна адрозьніць палачаніна паводле спэцыфічнага маўленьня, стылю паводзінаў, поглядаў? Наўрад ці. А між тым палачане існуюць. Мусяць існаваць як канстанта беларускай рэчаіснасьці. Як мусяць быць магілеўцы, менчукі, гарадзенцы… У адваротным выпадку этнонімы ды палітычныя рэаліі гэтай краіны будуць мяняцца, як колеры хамэлеона.

2

Ёсьць недарэчнасьць у тым, што тэкст, годны мітаў, прывідаў, канцэнтраванага літаратурнага паветра Полацку дасюль не прад'яўлены. Гэтага тэксту ня можа ня быць. Магчыма, ім зьяўляюцца Полацкія летапісы, несфальшаваная рэдакцыя «Слова пра паход Ігаравы», чарнавік «Крывічоў» Зарэцкага, дзёньнікі Арлова або раскіданыя па інтэрнэцкіх форумах Аркушавы пасты. Ідзецца не пра тое, каб напісаць тэкст, а толькі выявіць яго. Патрэбна дасьледаваньне, выхад у поле, экспэдыцыя за Полацкім раманам… Дзея ў стылі рэал-шоў, з той розьніцай, што «бягучым па лязе» будзе сам рэжысэр такога пачынаньня.

Складаньні полацкіх літаратурных анталёгіяў, задумы гарадзкой энцыкляпэдыі могуць быць адным з магчымых шляхоў выяўленьня падобнага тэксту. Але тут мы ўжо маем пэўны нэгатыўны досьвед - хто б ні зьяўляўся складальнікам беларускіх хрэстаматыяў, якімі б правільнымі ідэалягемамі ён ні кіраваўся, усё адно гэтыя тэксты пакуль так і ня склаліся ў Вялікую беларускую літаратуру. Лірыка Крапівы замененая байкамі Геніюш (ці наадварот?), сіла на красу, краса на сілу, але выходзіць усё тая ж бел-літ, прылада для пазакляснага катаваньня вечных, калі можна так трохі мадэрнізаваць тэрмін Акудовіча, ліцэістаў тваіх, Беларусь…

А Раман пра Полацак ужо існуе, мы даведваемся пра гэта апошнімі, бо самі ёсьць яго пэрсанажамі.

3

Зямля Полацку на мэтры ўглыб угноена касьцямі князёў, манахаў і паэтаў. Княскага праху будзе замала, каб істотна палепшыць сельскагаспадарчую вартасьць тутэйшых суглінак, але міты на іх родзяць добра.

Наведваньне васьмі сотак лецішча пад Полацкам можа спарадзіць дэпрэсіўныя думкі. Ад жоўценькага прыдзьвінскага пясочку павявае хранічным недародам, голадам, безнадзеяй. Як патрапілі продкі збудаваць і падтрымліваць у балоцістай нізіне гэты горад, легенду, культуру, калі нават цяпер, з усімі калійнымі солямі, пэстыцыдамі, тэхнікай і парнікамі, змаганьне за ўраджай у тутэйшым краі выглядае мазахізмам?

Адказ просты. Продкі сучасных палачанаў не завіхаліся на палетках. У вёсках жылі аўтахтоны-балты, якія празь некалькі стагодзьдзяў, ужо асымільваныя славянамі, былі абуджаны пад назовам «беларусы» да дзяржаўнага жыцьця ліраю Коласа ды Купалы. А крывічы бавіліся спрадвек вайной, гандлем, дойлідзтвам і малітвай.

Крывічы сеялі слова, а ня жыта. Ураблялі розум, а не суглінку.

Пралівалі кроў, а ня пот.

Гэтая вузкая спэцыялізацыя вымагала строгай арганізацыі - наяўнасьці дзяржавы. Полацак і быў дзяржавай у чыстым выглядзе, квінтэсэнцыяй дзяржаўнасьці. І нават калі яго падпарадкавалі больш драпежныя суседзі, палачане й надалей працягвалі займацца тым, што лепш за ўсё ведалі - вырабам дзяржавы. Гэтае рамяство было заўжды запатрабаваным. Яно прыдалося ВКЛ і маскоўскім царам. Яно ня можа не спатрэбіцца і незалежнай Беларусі.

4

Полацак не аднаўлялі пасьля вайны 1941-1945-га піцерскія архітэктары. Пэўныя куткі гораду прымушаюць думаць, што іх не аднаўлялі ані пасьля вайны 1654-1667-га. Лёс памежнага краю. Мы здавалі ворагу гарады, крывіцкага лесу не здавалі. Дзеці паўднёвых стэпаў заклікалі да сумленнага бою ў чыстым полі. Але больш пачэсна для нас было рваць іх у ельніку, дзе змрачней.

Базар, Вакзал, Прамзона, штыкетнік выцьвілы… А Полацак дзе? «Падманулі, як падманвалі варагаў з грэкамі пятнаццаць стагодзьдзяў, прад'явіце Полацак зараз».

А горад пачатку XXI стагодзьдзя хаваецца за танаваным шклом патасных аўто, зачыняецца на кодавыя замкі… На самым вялікім беларускім сьметніку, які археолягі называюць культурным слоем Полацку, 2004-ы маглі б маркіраваць сінія пачкі «LM», калі б толькі папера не парахнела… Горад пераходзіць на лёгкія цыгарэты, завязвае з кавай, п'е зялёную гарбату, вяртае студэнтаў у езуіцкія муры.

І праўда, што такое Полацак? Міт, залатая легенда, «так было»?

Так будзе. Гэта open source, футурыстычны праект, створаны дзядамі, а праекцыя іх мараў і трызьненьня - намі. Гэта Полацак, наша…

Абяцаньне. Пазнаваньне-ўгадваньне сябе. Твой і мой імгненны адбітак на стужцы Дзьвіны. Такое кіно. Цягам паўтара тысячагодзьдзя.

Яно толькі пачынаецца. За павароткай гэтай вясны. Ёсьць ты і я, а Полацак будзе. Дзе сустрэнемся - будзе Полацак. Назавуць Полацкам месца нашай сустрэчы.

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/5
[image]

Янка Брыль
Чатыры сустрэчы з Сафіяй

Наваградак і Мір з руінамі іх замкаў я па-зямляцку ведаю зь дзён школьнага маленства. А ў Полацак зь яго Сафіяй упершыню прыехаў напрадвесьні 1965-га. Калі ў Наваградку мне і спачатку, і потым парэшткі руінаў здаваліся нават сьцішнаватымі ад сваёй старадаўнасьці, а ў Міры недаразбуранасьць замку даволі выразна захоўвала адзнакі сваёй велічы, то сымбаль Полацку красуня Сафія растаравана, ўбачылася заплямлена недагледжанай звонку і проста страшнай усярэдзіне…

Прыехаў я не адзін - у групе сяброў-пісьменьнікаў, па дзелавой прычыне. Ад віцебскага начальства ў ЦК партыі паступіў заклапочаны сыгнал пра тое, што ў вобласьці вельмі дрэнна разыходзяцца беларускія кнігі. І Саюз пісьменьнікаў, праз сваё бюро прапаганды мастацкай літаратуры, паслаў нас на сустрэчы з чытачамі. І трэба ж было так здарыцца, што перад тымі сустрэчамі гасьцінныя гаспадары паказалі нам гістарычную сьвятыню, ператвораную ў кніжны склад. Дах гэтага кашчуннага складу працякаў на грувасткія кубамэтры твораў марксізму-ленінізму, рускай і замежнай клясыкі, штосьці прыпадала й на кнігі беларускія, што моклі ды плесьнявелі не кубамэтрамі, а сьціплейшай колькасьцю, можа,

ЯНКА БРЫЛЬ старэйшы беларускі пісьменьнік. Жыве й працуе ў Менску. Ягоная апошняя кніга «Блакітны зьніч: Ірпычнае » (Pro Christo, 2004).

толькі бярэмямі, а ўсё ж, калі верыць сыгналам зьверху, былі найбольш вінаватымі ў сваёй незапатрабаванасьці…

Праўда, кнігі меліся і ў кнігарні ды кіёсках, і яны даволі пасьпяхова раскупляліся чытачамі на нашых сустрэчах, пераважна моладзьдзю, і вельмі ўцешна было нам ад чэргаў па аўтографы.

Найвыразьней запомніліся дзьве сустрэчы. Адна - з навучэнцамі каапэратыўнага тэхнікуму, на якую нас запрасіла і хораша вяла яе маладая выкладчыца і паэтка Алена Ніякоўская. А другая сустрэча помніцца мне тым, што яна прыкра не адбылася. У беларускую школу ў Задзьвіньні мы не змаглі дабрацца з-за раптоўнага ледаходу, які, нібы й нечакана, абрынуўся на Дзьвіну: пераход па лёдзе ліквідаваўся, а на мост, у аб'езд - ня памятаю ўжо чаму - транспарту не знайшлося ні на адным, ні на другім беразе ўзьнятай паводкай ракі.

Паважаны дырэктар шырока вядомай кнігарні «Сьветач» Рыгор Аронавіч Міхаловіч, які забясьпечваў нашы сустрэчы кнігамі, суцяшаў нас пасьля такой няўдачы, што надарылася да таго ж у апошні, заключны дзень. Нават падкрэсьліў: «Калі я хачу прадаць кнігу - я яе прадам!..»

З той нашай пісьменьніцкай групы мне найжывей помніцца таварыскі Янка Скрыган, мой сусед па кватэры, намнога старэйшы сябар, які мне і дома, і ў дарозе, і там у Полацку нямала цікавага нагаварыў пра гэты блаславёны горад яго літаратурнай, дагулагаўскай маладосьці…

А калі я другі раз, ды неўзабаве, у маі таго ж 1965-га, зноў апынуўся там, дык гэта ўжо зь сябрамі маладзейшымі - Караткевічам і Барадуліным. Спыніліся мы ў Полацку праездам з Рагачова ў Вушачу. Была ў нас такая творчая задума: наведаць радзіму кожнага разам, а напісаць пра гэта паасобку і прапанаваць нашы нататкі ў часопіс ці на радыё. Усмак пагасьцяваўшы ў Валодзевага дзядзькі ў Рагачове і яго маляўнічых ваколіцах, мы накіраваліся да Рыгоравай мамы ў Вушачу. Да Полацку дабраліся мы на машыне, вядома ж, дажджлівым вечарам. А раніца ўставала сонечная. Аднак Сафія, да якое мы адразу пайшлі, ад гэтага ня стала

прыгажэйшай… Заглянуць у яе кніжны могільнік не ўдалося. Пасумаваўшы, паабураўшыся, мы зайшлі ў «Светач». Рыгор Аронавіч, ветліва павітаўшыся, спытаўся ў мяне зь пераможнай усьмешкай: «Ну, пашукайце ў мяне вашы кнігі цяпер! Іх няма». І паўтарыў сваё ранейшае: «Калі я хачу прадаць кнігу - я яе прадам!..» Не скажу, што іменна тады - хутчэй ужо цяпер мне падумалася: во каго трэба было б перавесьці загадам на тыя адсырэлыя кніжныя кубамэтры! Толькі пры ўмове, каб па-сапраўднаму захацець іх прадаваць, - і яму захацець, і ўсім тым, што клапоцяцца ў кабінэтах - зьверху ды здалёк…

Трэці раз, улетку 1972-га, я быў у Полацку зноў жа не адзін - з Адамовічам і Калесьнікам, суаўтарамі па кнізе «Я з вогненнай вёскі…». Такія вёскі былі, вядома, і на Полаччыне. Ад змроку і болю новых сустрэчаў, спыніўшыся ў Полацку, мы адпачылі душамі ў назіраньні залітай сонцам усё яшчэ не адроджанай сьвятыні, седзячы то ў маўчаньні, то ў ціхай гутарцы. Толькі Калесьніку не сядзелася - рупіла як найлепш захапіць з сабой на фатастужцы паднебна ўрачысты, па-херувімску сьветлы вобраз непараўнальнага помніка нашай спрадвечнасьці…

Яшчэ раз я пабываў у Полацку ў верасьні 1988-га, заездам з Наваполацку. Літаратурнае аб'яднаньне «Крыніца» запрасіла мяне выступіць у іхным вячэрнім унівэрсытэце «Роднае слова». Прыемна помніцца й той вечар, і іншыя вечары, знаёмствы з новымі сябрамі… Была й паездка ў Полацак, у мілай кампаніі з Ірынай Жарнасек і Навумам Гальпяровічам, дарэчы, у ягонай машыне. Сафія была ўжо іншая, і звонку і ўсярэдзіне, абноўлена чыстая ў сваёй непераможнай сьвятасьці.

Хацелася б, старому ды нямогламу, пабываць там хоць бы яшчэ адзін раз!..

25.02.04

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

№ 3 (32) - 2004
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне [mk], Абнаўленьне [czyk]
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/5
[image]

Герман Кірылаў Катакомбная Беларусь

Сёньня з подзівам згадваецца такое: правучыўся дзесяць гадоў у школе, пяць гадоў у Белдзяржунівэрсытэце - і такіх нават прадметаў не вывучаў, як гісторыя або геаграфія Беларусі. Не было іх наогул у навучальных праграмах. У першую клясу пайшоў у 1944 годзе, праз паўгоду зь нечым была Перамога, неўзабаве Беларусь разам зь іншымі краінамі заснавала Арганізацыю Аб'яднаных Нацыяў.

Хаця, праўду кажучы, яшчэ да школы мне ўжо выпала пачуць, што ў нас была свая адметная гісторыя, былі свой сьцяг, герб. Наша школа ў вёсцы Шкунцікі, гэта ў Шаркаўшчынскім раёне Віцебскай вобласьці (у 2002 годзе адзначалася 140-годзьдзе нашай школы), працягвала працаваць і пасьля акупацыі Беларусі немцамі. І мае старэйшыя за мяне сёстры вывучалі ня толькі мову, літаратуру, але й гісторыю ды геаграфію Беларусі. Бывала, седзячы на печы пры курадымцы, яны завучвалі на памяць вершы, сьпявалі песьні, а мне цікава было слухаць, і ў маёй памяці адкладвалася сёе-тое з «Тараса на Парнасе», зь вершаў Максіма Багдановіча, Купалы. Запомніў і колькі беларускіх песьняў.

На ўсё жыцьцё застаўся ў памяці сонечны, цёплы дзень раньняй вясны 1944-га году. Мы, малеча, не маглі нацешыцца, што

ГЕРМАН КІРЫЛАЎ
Кірылаў нарадзіўся 15 сьнежня 1937 году. Скончыў журфак БДУ. У 1997 годзе за працу над кнігай успамінаў «Гарт. Саюз беларускіх патрыётаў» атрымаў прэмію імя Алеся Адамовіча Беларускага ПЭН-Цэнтру. Жыве ў Полацку.

нарэшце выйшлі на вуліцу пасьля доўгага, праз усю зіму, сядзеньня ў хаце, бо не было чаго ні абуць, ні апрануць. Раптам дазнаёмся, што аднаму з нас выпала такая ўдача: настаўнік нашай школы падараваў яму прыгожы, бліскучы, новенькі аловак, і за што - за тое толькі, што, падвучаны старэйшымі, павітаўся воклічам «Жыве Беларусь!». Загарэлася і ў нас жаданьне атрымаць такі ж спакусны дарунак. Падпільнавалі, калі настаўнік паказаўся на вуліцы, выбеглі напярэймы і наперабой адпалілі «Жыве Беларусь!», ускідваючы правую руку. Помніцца - малады, прыгожы настаўнік цёпла ўсьміхнуўся, пахваліў нас, кожнага пагладзіў па галаве, сказаў нешта прачулае. Напэўна ж, нешта пра нашу Радзіму-Беларусь. Але калі ён павярнуўся і пайшоў, мы былі расчараваныя: пра алоўкі забыўся. Яшчэ раз падпільнавалі, павіталіся, нехта з нас, сьмялейшы, нагадаў пра алоўкі, настаўнік вінавата разьвёў рукамі: ня меў болей такіх дарункаў. І зноў гаварыў штосьці ласкавае, павучальнае.

Калі ўлетку таго ж 1944-га году вайна была далёка ад нас і аднавілася савецкая ўлада, мы, малыя, бавячыся на вуліцы, прыдумалі гульню: віталіся адзін з адным воклічам «Жыве Беларусь!». Да нас падбег нехта з дарослых і, прыцішваючы голас, стаў сварыцца: «Што вы, жабнюкі, гарлаеце! Няможна так! Пачуюць - арыштуюць і вас, і вашых бацькоў! Гульні вам няма інакшай? Забудзьцеся гэта!»

Мы змоўклі. І цяпер яшчэ, вітаючыся ці разьвітваючыся зь сябрам гэтым традыцыйным клічам, міжволі паглядзіш па бакох. Можна злавіць косы зірк, а пад выпадак і злы вокрык пачуць. Здаралася, білі за такое дубінкай.

Першага верасьня 1944 году і я стаў вучнем нашай вясковай школы. Не было ў нас алоўкаў - настаўніца прыносіла з дому нейкія агрызкі і давала імі кожнаму папісаць. Яна ж недзе адшукала і акраўкі паперы. Не было кніг. Адзіны буквар выдалі настаўніцы ў раённым аддзеле народнай асьветы. Але пад канец першай клясы мы ўсе даволі прыстойна маглі чытаць, пісаць, рашаць задачкі.

Чытаць мне хацелася вельмі, а чытаць не было чаго. Ці дзіва, што, калі аднойчы хтосьці з маіх сясьцёр прынёс у хату кнігу,

узятую ў аднаклясьніка, я зараз жа завалодаў ёю. Запомніў назву - «Крыўя-Беларусь у мінуласьці». Канечне, першым чынам пагартаў, разгледзеў малюнкі. Ваяры зь дзідамі, у шапках стажком, твары як на абразох. А адзін малюнак асабліва затрымаў увагу, уразіўшы як знак нечага страшнага: вялізная брыла, выламак мураванай сьцяны на доўгай, высокай насьпе і подпіс: «Руіны Наваградка». Так і адбілася ў памяці: «Наваградка», а не Навагрудка, як патрапіла чытаць гэтую назву пасьля і як чытаю і сёньня. Толькі прылажыўся чытаць (хаця адразу адчуў, што тэкст для майго веку не зусім адпаведны), як ужо сястра хапілася, дзе кніжка, якую ёй далі. На мяне яна насварылася з ужо чутым пострахам: «Няможна чытаць такіх кніжак».

А неўзабаве і другая такая ж забароненая кніжка апынулася ў нашай хаце. Пасьпеў толькі пагартаць: такія былі цікавыя малюнкі - рэкі, лясы, азёры, сітнягі, як на нашым стаўку, лясы, гарады, купы люду на вуліцы… Амаль праз паўвеку, набыўшы перавыданьне «Геаграфіі Беларусі» Аркадзя Смоліча, пагартаўшы, пазнаў - гэта была тая самая кніга. Чытаў яе - і шчымела сэрца: каго і што ад нас, беларусаў, хавалі ў спэцсховы, каго стараліся выкрасьліць з нашай памяці!

Калі затым у старэйшых клясах даводзілася вывучаць гісторыю старажытнай Русі, зь цікавасьцю вылучаў усё, што датычыла Полацку, Полацкага княства. Пра Полацак чуў з маленства. Да гэтага гораду ад нас было крыху больш за сто вёрстаў, многім з нашай вёскі даводзілася бываць у ім на кірмашы або па якіх іншых справах. Пэўны час наша мясцовасьць належала да Полацкай вобласьці.

Ужо недзе ў дзясятай клясе мне трапіла ў рукі кніга Львова і Садковіча «Георгий Скорина». Зь яе мала цікавага даведаўся. Наагул сумна было чытаць доўгія, нудныя апісаньні перавозу ў Полацку, другарадных падзеяў у горадзе. Сам галоўны герой нічым асаблівым і не запаў у памяць.

Згадваю, як ужо студэнтам БДУ разам са сваім курсам пабываў у Маскве на экскурсіі. Рэктарат даў грошы для нашай паездкі ў савецкую сталіцу падчас зімовых канікулаў. Канечне ж, нас звадзілі ў Крэмль, у маўзалей Леніна і Сталіна. Былі мы ў

рэдакцыі газэты «Правда». Але найбольшае ўражаньне засталося ад наведваньня Трацякоўскай галерэі і Пушкінскага музэю. А мы з аднакурсьнікам Васілём Зуёнкам вырашылі пабываць ля помніка першадрукару Івану Фёдараву. Ну як жа - не аддаць даніны павагі слыннаму на ўвесь Саюз выдаўцу першай друкаванай кнігі ў славян. Кусьлівым марозам, на рэзкім ветры гадзіны дзьве блукалі па цэнтры Масквы, пакуль знайшлі помнік, каб сфатаграфавацца.

А на апошнім, пятым курсе пачуў на адным вучоным дыспуце як бы што крамольнае: першую кнігу ўва ўсходніх славянаў надрукаваў ня Фёдараў, а наш чалавек, палачанін Скарына. І яшчэ невядома, ці ня быў беларусам Іван Фёдараў, якога прозьвішча ў некаторых крыніцах пісалася Федаровіч, на беларускі манер. Ну, а наконт паплечніка гэтага друкара Пятра Мсьціслаўца і сумневу не магло быць - ён паходзіў з нашага старажытнага гораду Мсьціслава.

Не, ува мне не паменела пачуцьця павагі да Івана Фёдарава. Але неяк скрабанула ў душы - чаму ж нас, беларусаў, нібы стараюцца адпіхнуць у цень, як якіх нявартых.

Да нас даходзілі весткі, што на гістарычным факультэце БДУ вывучаецца гісторыя Беларусі. Галоўны спэцыяліст па ёй прафэсар Абэцэдарскі. Нават даводзілася трымаць у руках падручнік, рэдактарам і галоўным аўтарам якога ён быў. Усё дакастрычніцкае мінулае ў тым падручніку зьмяшчалася на лічаных старонках. Расказвалася, у якой галечы, забітасьці і цемрыве жыў працоўны беларускі люд. Для большай нагляднасьці былі зьмешчаны ілюстрацыі - згадваецца наступная: убогая майстэрня, у ёй завіхаюцца над нечым дэгенэратыўнага выгляду, брудныя пралетарыі. Галоўная ж гісторыя пачыналася ад Вялікага Кастрычніка. Салдаты-чырвонагвардзейцы, шчасьлівыя твары ўдарнікаў працы…

Засталося ў памяці, як урачыста адзначалася ў Менску 40-годзьдзе БССР: чакалі прыезду на сьвята самога генсека партыі Хрушчова для ўручэньня Беларусі другога ордэна Леніна. Яшчэ трывала «адліга», якая для нас пачалася з таго, што нам, выкладчыкам і студэнтам БДУ, як, відаць, і для некаторых іншых катэгорый насельніцтва, пачыталі даклад Хрушчова аб

кульце асобы Сталіна з ХХ зьезду партыі. Гэта адбывалася пры зачыненых дзьвярах у самай вялікай аўдыторыі хімічнага корпусу, з папярэдняй строгай перасьцярогай - нікому ні слова пра пачутае. Выходзілі з тае аўдыторыі мы і прыціхлыя, і разам з тым акрыленыя - ну ўсё, з культам будзе пакончана назаўжды.

М. Хрушчоў выступіў з прамовай на ўрачыстым паседжаньні ў Менску, уручыў ордэн Леніна. А празь нейкі час па сталіцы папаўзьлі чуткі, нібыта генсек выказаў незадавальненьне тым, што лідэр кампартыі Беларусі Кірыла Мазураў зрабіў даклад да 40-годзьдзя БССР па-беларуску. Пераказваліся ягоныя словы: «Ни черта не понять было… Чем быстрее мы все заговорим по-русски, тем быстрее придем к коммунизму». Пра гэтыя пажаданьні памятаў, напэўна, і Машэраў.

Ужо недзе перад дзяржаўнымі іспытамі надарылася трымаць у руках толькі што выдадзены новы падручнік з гісторыі Беларусі Абэцэдарскага. Што ўразіла на гэты раз - на пяць-шэсьць старонак была цытата зь нядаўняй прамовы Хрушчова ў Менску. Ну як жа! Кожнае рашэньне партыі, кожнае слова правадыра абавязкова былі гістарычнымі, ня йначай! Хаця Гісторыя - такая дама, што не адгадаеш наперад, каго яна прызнае, а каго адпрэчыць.

Трэба аддаць належнае: да 450-годзьдзя беларускага кнігадрукаваньня ў нас рыхтаваліся як да вялікай падзеі. На той час школьнікі малодшых клясаў ужо маглі расказаць, хто такі Скарына і за што яго мы ўсхваляем. Імя Скарыны часта згадвалася ў газэтах, гучала на радыё. Бадай, ніколі раней не было такой увагі і пашаны нашаму першадрукару.

На тым гістарычным тле ўсяго толькі дробным, непрыкметным эпізодам сталася наданьне імя Скарыны адной вуліцы ў мястэчку Шаркаўшчына. Можна было б і ня згадваць пра тое, калі б праблема тапанімікі нашых гарадоў і мястэчак згубіла сваю актуальнасьць.

Ня толькі ў маёй сям'і, але і ў некаторых іншых жыхароў нашай вуліцы Лысенкі выклікаў раздражненьне яе назоў: здаецца ж, ужо на ўвесь Саюз разышлася слава пра гэтага «народнага

акадэміка», пагромшчыка генэтыкі. А нашу сям'ю гэтае імя перасьледавала як нейкі знак бяды: зьехалі зь вёскі Шкунцікі, з утворанага там гвалтам калгасу імя Лысенкі, а ў мястэчку атрымалі пляцоўку для будаўніцтва на новай вуліцы імя Лысенкі.

Неяк, спаткаўшыся на вуліцы з добрым знаёмым, работнікам мясцовай мэтэастанцыі Аляксандрам Баговічам, які быў старшынём пасялковага савету і на той час увасабляў самую блізкую мясцовую ўладу, загаварыў зь ім наконт перайменаваньня нашай вуліцы. Якраз прайшла чарговая хрушчоўская рэарганізацыя, наш раён быў ліквідаваны, у Мёры, у райвыканкам, было далекавата. А тым болей - не ісьці ж было ў міжраённы парткам, які да часу разьмясьціўся ў нашым мястэчку. Аляксандар Баговіч горача разьдзяліў маю заклапочанасьць: ён вучыўся завочна на агранома і ведаў пра «ўклад» Лысенкі ў навуку. Неўзабаве ён паведаміў мне, каб напісаў адпаведную заяву. Мы разам зь ім дамовіліся, што было б добра назваць нашу вуліцу імем Скарыны, якое ў той час было на слыху. Так усё і рашылася.

А праз дваццаць зь лішкам гадоў, чытаючы энцыкляпэдычны даведнік «Скарына і яго час», знаходжу невялікую нататку - «Скарынаўскія найменьні». Выявілася, па Беларусі вельмі ж няшмат такіх найменьняў. Вуліцы яго імя - у Полацку (яшчэ й плошча, на якой стаіць помнік першадрукару), у Менску, вуліцы ў Віцебску, Воршы, Нясьвіжы, Слуцку і… у г. п. Шаркаўшчына. З той пары найменьняў мала дадалося. Хіба што ў Менску галоўны праспэкт быў названы імем Скарыны.

Пасьля я атрымаў накіраваньне на працу ў Полацак, у мясцовую газэту. Тут і асеў. Тут я стаў сьведкам, а часам і ўдзельнікам падзеяў, зь якіх складалася яго найноўшая гісторыя.

Памятаю тую ўзьнёслую атмасфэру, калі ў Полацку рыхтаваліся нарэшце паставіць помнік Скарыну! У гарадзкім музэі былі выстаўлены на суд гараджан дзьве гіпсавыя выявы першадрукара, аўтарам якіх быў скульптар Аляксей Глебаў. Многія палачане палічылі за гонар і за свой грамадзянскі абавязак узяць удзел у гэтым абмеркаваньні. Урэшце

кампэтэнтнай камісіяй быў прыняты той узор, за які выказалася большасьць. І неўзабаве ў сонечны летні дзень пры вялікім наплыве палачан і шматлікіх гасьцей і зь Беларусі, і з замежжа помнік быў адкрыты. Бронзавы Скарына цяпер узвышаецца на пастамэнце на самай прыгожай плошчы свайго роднага гораду.

А празь дзесяць зь лішнім гадоў - ужо завяршалася «перабудова» - у Полацак прыйшло яшчэ адно вялікае сьвята, прысьвечанае першадрукару. Адзначалася пяцьсот гадоў з дня яго народзінаў. Хаця дакладных зьвестак, калі менавіта нарадзіўся ў сям'і полацкага месьціча Лукаша Скарыны першы сын, не дайшло да нас, была ўзята адна зь дзьвюх імаверных датаў. І зноў у Полацак зьехалася шмат гасьцей. Можна было бачыць на адной з плошчаў шчыты з гербамі Кракава, Прагі, Падуі, Вільні, Калінінграду (Каралеўца-Кёнігсбэргу), дзе давялося жыць, працаваць, проста бываць слыннаму палачаніну.

Быў на сьвяце і пра-пра-…праўнук Францішка Скарыны. З тым рослым, ладным зь сябе, ужо ў гадох чалавекам, Стэнлі Скарынам, пазнаёміў мяне Алег Лойка. Нашчадак першадрукара па прафэсіі доктар, прыехаў у Полацак з Канады. Спадар Скарына зьбіраў зьвесткі пра свой славуты род.

Мне часта трапляе бачыцца ў Полацку, гаварыць па тэлефоне з маімі добрымі сябрамі Марыяй і Лявом Бялевічамі. Ім ужо за семдзесят. Жывуць на вуліцы Скарыны ў цэнтры Полацку. Зь імі ў сярэдзіне дзевяностых мы пачалі працу над кнігай успамінаў пра Саюз беларускіх патрыётаў - нелегальную моладзевую суполку, якая існавала ў Глыбоцкай і Пастаўскай пэдвучэльнях у 1945-1947 гадах і была разгромлена МДБ. Успаміны былі надрукаваныя ў 1997 годзе ў часопісе «Полымя», які тады рэдагаваў Сяргей Законьнікаў, а літаральна празь месяц выйшлі асобнай кнігай пад назвай «Гарт» у кніжнай сэрыі «Архіў найноўшай гісторыі». Дазволю коратка нагадаць пра гэтую публікацыю, рэдактарам якой давялося быць мне асабіста.

Група навучэнцаў пэдвучэльняў у Глыбокім і Паставах (яны адчыніліся тут у верасьні 1944 году) аб'ядналіся ў нелегальную

суполку, каб, насуперак гвалтоўнай русіфікацыі навучаньня, замоўчваньню і наўмыснаму скажэньню нашай гісторыі, трымацца сваёй беларускасьці. Ніякай іншай мэты, тым больш тэрарыстычнай, як пасьля ім прыпішуць сьледчыя МДБ, суполка ня ставіла. Яна, па сутнасьці, і не праводзіла нейкай актыўнай дзейнасьці. Не пасьпела. Зімой 1947 году СБП быў выкрыты, усе ўдзельнікі арыштаваныя і асуджаныя. Чатыром пагражала сьмяротная кара, якая, дзякуючы таму, што падчас суду ўжо дзейнічаў указ аб яе адмене, была замененая на 25 гадоў няволі. Астатнія атрымалі ад 10 да 15 гадоў лягераў, толькі некалькім быў тэрмін 5-6 гадоў.

Пасьля сьмерці Сталіна тэрміны ўсім былі перагледжаны. А зь цягам часу ўсім, хто дамагаўся, была дадзена поўная рэабілітацыя «за отсутствием состава преступления».

Мае добрыя сябры Бялевічы пасьля працы на шахтах Інты вярнуліся ў Беларусь.

Марыя Рыгораўна так казала:

Нам, як запалярнікам, была льгота - пасьля выхаду на пэнсію маглі сяліцца ў любой кропцы Саюзу. Я засталася бяздомнай пасьля няволі. Бацька загінуў падчас вайны, маці была асуджаная за мяне і за сына, майго брата, які таксама быў сябрам СБП, сядзеў, яго ўжо няма на гэтым сьвеце, хату нашу забралі. Не было куды вяртацца і майму мужу Лёву. Мы доўга не выбіралі, куды падамося на радзіме, дзе паселімся… У Полацку, толькі тут. Што такое Полацак для беларуса - лішне даводзіць. Пабудавалі тут каапэратыўную кватэру. Прыжыліся, горад стаў для нас родным.

У Полацку на кватэры Бялевічаў па вуліцы Скарыны праходзілі нашы сустрэчы зь сябрамі СБП, якія змаглі ўдзельнічаць у рабоце над кнігай успамінаў. І цяпер сюды час ад часу завітвае таксама палачанін Васіль Мядзелец, колішні кіраўнік глыбоцкай філіі СБП, яму толькі прыехаць аўтобусам з-за Дзьвіны, дзе ён жыве разам з жонкай. Часьцяком наведваюцца з Паставаў былыя сябры СПБ Алеся і Антось Фурсы, бывалі тут

Мікола Конан і Станіслаў Савік зь мястэчка Лужкі Шаркаўшчынскага раёну. С. Савіка ўжо няма на сьвеце. Лідзія Мельнік (Несьцяровіч) прыяжджала ажно з Караганды. Праўда, апошнім часам сустрэч такіх усё меней. Гады бяруць сваё.

Але застаецца Полацак, застаецца вуліца Скарыны, застаецца памяць.

студзень 2004, Полацак

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/5
[image]

Алена Ніякоўская
На сыходзе зімы - перад новымі зімамі…

І запах
Ніколі не расьцьвіўшай кветкі
Насіць я буду.

Надзея Артымовіч

Я не пішу літаратурных успамінаў ці якіх-небудзь яшчэ. Не зьбіраюся нічога ўсур'ёз дасьледаваць ці аналізаваць. І не таму, што ня здолею. Слова гонару, я ведаю, што такое час канцэптуальны і пэрцэптуальны, матывацыя й мадэлінасьць у дачыненьні да творчых працэсаў, «остранение» і г. д. Ведаю, між іншым, і багатае слова «хранатоп»… Але пагадзіцеся, што недакладнасьць часам дае больш, бо стварае сьвет уражаньняў. Я не хачу ўпіхваць у загадзя вызначаныя формы тое, што было з намі, каля нас, для нас, праз нас… Мэтадалягічная «апалубка» перашкаджае ўбачыць адбітак жывога сьледу. Ані часопісаў, ані газэтных падшывак я не гартала, не назаляла нікому, змушаючы да ўспамінаў, не зьбірала ніякіх зьвестак, нічога не рабіла, каб аднавіць у памяці імёны, даты, месцы

АЛЕНА НІЯКОЎСКАЯ нарадзілася ў 1936 годзе ў Менску. Скончыла Ленінградзкі дзяржаўны ўнівэрсытэт. Кандыдат філязофскіх навук, дацэнт, выкладчыца Полацкага дзяржаўнага ўнівэрсытэту. У другой палове 1960-х актыўна ліставалася з Уладзімерам Караткевічам. Жыве ў Полацку.

падзеяў. Калі трэба - няхай гэта зробіць хто іншы. Тэма, дарэчы, неблагая. Ня горшая за гісторыю полацкай міліцыі ці пажарнай каманды. І таксама, як гаворыцца, чакае свайго дасьледчыка…

…Мы стаялі на аўтобусным прыпынку. Мы - гэта паэт, даволі маладая кабета, выкладчыца нямецкай мовы, філязофіі, этыкі, эстэтыкі, рэлігіязнаўства і чагосьці там яшчэ, лекар-нарколяг (хобі - антычная гісторыя й культура), прадстаўнік міліцыі па праблемах выхаваньня, некалькі настаўнікаў. Мы толькі што правялі антыалькагольнае мерапрыемства ў адным з рабочых інтэрнатаў і вярталіся дадому. Было вельмі халодна. Зіма. Завея.

«Храждане! Рускім языком хавару: алтобус ідзёт у хараш. Не панімаіті?» Абдаўшы нас смуродам выхлапных газаў, «алтобус» мільгнуў бельмамі вокнаў з прадыханымі зрэнкамі і зьнік у завеі. «И шофер, чтоб ему икалось, добивает старый «Икарус», - прамармытаў паэт. Выкладчыца чагосьці там удзячна ўсьміхнулася: радкі належалі ёй. А чаканьне доўжылася - цярплівае, маўклівае, смутнае. Побач з намі быў, аднак, чалавек, які пачуваў сябе цалкам хораша. Куфайка, гумовыя боты, аблавухая шапка. Ён клясычна абдымаў ліхтарню і сьпяваў на мове продкаў: «Мая хата дахам крыта…» Далей не цытую, бо гэтая лексыка тады яшчэ была ненарматыўнай. «Знал бы он, какая у него аудитория…» - зноў пачуўся голас паэта. Ці ня гэтая зіма пасялілася потым на востраве паэтычнай душы? А тады паэт працаваў і цярпліва набываў вядомасьць. Яго прыемным, трохі шурпатым барытонам часам гаварыла радыё…

Сьпявак тым часам адляпіўся ад ліхтарні, перасёк мяжу анэмічнага сьвятла. «Хто ні едзе, хто ні йдзе - па капеечцы кладзе…» - данеслася ўжо здалёк.

Мы засталіся стаяць на нашым чарговым прыпынку, зімой семдзесят нейкага году. У хісткім сьвятле выныраў раз-пораз балькон з нанізанымі на ім згіпсаванымі сподніками, завісаў над намі. Завея адсланяла плоскія цені праходняў, аптэчныя шафы дамоў. «Я земля… сыновей и дочерей… долетайте до

самого солнца…» - сьпявала фортка недзе на апошнім паверсе.

А што было раней? Хто мы былі? Дзе? Пачатак 1960-х гадоў. Пахаваньне беларускага паэта Янкі Журбы. «На похороны пойдут две группы учащихся нашего техникума. Остальные занимаются по расписанию. Таково указание». Сёньня ведаю: трэба было бегчы, убачыць, запомніць, засмуціцца, замерці ў жалі…

Літаратура ў Полацку, між тым, існавала. Вершы, прынамсі, пісалі. Пісалі шмат. Здавалася, тыркні пальцам у паветра - пасыпяцца, паліюцца, палезуць вершы. Літаратурны гурток існаваў амаль у кожнай школе, вучэльні, тэхнікуме. Было й літаб'яднаньне «Наддзьвіньне». Я сёньня зь нейкім складаным пачуцьцём мінаю вялізны гмах у цэнтры гораду. Там мы сядзелі калісь амаль на гарышчы*, сярод званенай па кутох старой канцылярскай мэблі і адслужылых стэндаў «наглядной агитации». Мы вялі дыскусіі пра паэзію, чыталі вершы - чужыя й свае - і марылі трапіць на літаратурную старонку газэты «Сцяг камунізму». Дзіўна, але мы, здаецца, зусім не зайздросьцілі адно аднаму і хвалілі, хвалілі саміх сябе. «У поэтов есть такой обычай: в круг сойдясь, нахваливать друг друга», - часта паўтараў адзін з нас, перафразуючы смутную сэнтэнцыю вядомага савецкага вершатворца.

Мы даверліва, шчыра адкрывалі душу сьвету, былі ў сваіх вершах чулымі, эмацыйнымі. Але зноў дзіўна: нас зусім не цікавілі «вонкавыя факты» жыцьця нашых аднадумнікаў. Не, не аднадумнікаў - бо ня думкі нас аб'ядноўвалі, ня ідэі, адно пачуцьці. У імя пачуцьцёвай еднасьці мы не былі таварышкамі, гарышчы, асобамі прыватнымі. Мы хавалі нашы будзённыя справы (ах, якімі рознымі яны былі!), несьлі разьбітае сэрца, зьбянтэжаныя думкі на наша гарышча, каб там знайсьці неспакой іншы, больш высокі за нашу мітусьню. Потым прачытаю шмат кніжак, разумнейшых за мяне, даведаюся супярэчлівыя адносіны чалавечай існасьці і існаванкі.

А тады мы кахалі адно аднаго, чакалі злучэньня чалавецтва, імкнуліся да духоўнасьці больш універсальнай… Ну вось, зьбіваюся на аналіз… Не, бяз гэтага, як бачу, не абысьціся.

Маецца на ўвазе бадай, ідэі, адно
гарышчы, асобамі прыватнымі. Мы хавалі нашы будзённыя
справы (ах, якімі рознымі яны былі!), несьлі разьбітае сэрца,
зьбянтэжаныя думкі на наша гарышча, каб там знайсьці
неспакой іншы, больш высокі за нашу мітусьню. Потым
прачытаю шмат кніжак, разумнейшых за мяне, даведаюся
супярэчлівыя адносіны чалавечай існасьці і існаванкі.
А тады мы кахалі адно аднаго, чакалі злучэньня чалавецтва,
імкнуліся да духоўнасьці больш універсальнай… Ну вось,
зьбіваюся на аналіз… Не, бяз гэтага, як бачу, не абысьціся.

Там
зьбіралася
полацкае

Не давяраючы абстракцыям, мы пазнавалі сьвет у іншы спосаб. Занадта доўга мы «харчаваліся» азначэньнямі й прыкладамі з артыкулаў і кніг розных папулярызатараў. І раптам адчулі пустку пад нагамі. Ці не адсюль падсьвядомае жаданьне аджагнацца ад бездані, пачуцьцёва над ёю ўзьняцца да вяршынь агульна- і звышчалавечых? Але неба наша яшчэ не было і не магло быць высокім.

Мы жылі з адчуваньнем недахопу нечага самага важнага. Пад полацкім асфальтам - спарахнелае, але цалкам не загінулае мінулае. Полацак, дарэчы, - своеасаблівы горад. Дзіўна, але прывіды ажываюць тут сярод белага дня - прывіды храмаў, дамоў, помнікаў, людзей… Кожны дзень наш горад выглядае інакш, яго вобраз ніколі не паўтараецца. Таму я больш люблю хадзіць ноччу, калі добра відаць толькі неба…

Калі дасьледаваць гэты кавалак нашага часу, не пазьбегнуць словаў «недастатковасьць», «абмежаванасьць», «мастацкая недасканаласьць», «апавядальнасьць», «паэзія факту». Але ў нашых вершах была айчына, быў родны кут, каханьне, родны дом. Была адказнасьць за дадзенае нам Слова. І прыгнятала пачуцьцё страты, «няпоўнай прысутнасьці» сябе ў прасторы жыцьця. Пачалі страчваць ня мы. Мы прыйшлі на страчанае. Таму нам давялося ісьці праз асваеньне іншай, перш за ўсё расейскай культуры. Аграмадную расейскую культуру мы наноў пазнавалі, выдзяляючы ў ёй мікракосм «чалавечай адзінкі». Каб адкрыць наша страчанае і адчуць гэта як пакуты ўласнай душы, мы йшлі гэтым шляхам, ствараючы свой уласны сьвет. І адтуль убачылі сваё, роднае, сябе. Убачылі наноў. Дай Божа, каб назаўжды!

Але ня тым нам, з гарышча, будзе дадзена. Наша «кружляньне» па ўласнай душы было, хутчэй, пачуцьцёвай падрыхтоўкай будучай, ня нашай ужо, творчасьці.

Толькі праз гады ў Полацку будуць напісаныя радкі:

…Сусьвет глядзіць вачмі камэт
на квадры жыта.

Ляканічная мастацкая «формула» нацыянальнай ідэі. Тады, у 1960-х, аўтарка гэтых радкоў яшчэ носіць у партфэліку звычайныя савецкія падручнікі і марыць пра вялізную скрыню з моднымі кружэлкамі.

Тады, у 1960-х, яснавокая кучаравая дзяўчынка яшчэ вырашае, ці быць ёй мэдыкам. Праз гады яна напіша:

…Паэты сядзяць на прыступках Сусьвету
Ў сьцюдзёныя зімы, сьпякотныя леты…

А згаданы на пачатку «паэт на прыпынку» будзе працягваць дыялёг з самім сабой, надаючы яму, гэтаму дыялёгу, трагічнае агульначалавечае гучаньне:

Вы б бачылі, як курчыцца душа
Апошняю агоніяй пакуты!

Але ўсё гэта - потым. У 1960-х ён прыйшоў на гарышча. Было яму 17 гадоў.

…Ня ведаю, ці стаіць цяпер у Полацку на задах мэблевай фабрыкі старая камянічка. Шчарбатая чырвоная цэгла звонку, унутры - пераходы зь негабляваных дошак, нейкія лесьвічкі-драбінкі паміж пакоямі. Вільготна было й халодна, нібы ў лёху. Там, у 1960-х, «атраячвалася» вечарамі працоўная моладзь.

…Амаль невідушчая лямпачка пад стольлю настаўніцкага пакою зьвінела, як зьнясіленая муха. Па дыяганалі голых, цёмных вокнаў скамечанымі пэдрадаўскімі пратаколамі ляцелі ашмёткі сьнегу. А яна сядзела, прыціснутая сталом да сьцяны. Твар нібы абсыпаны мукой… Каўнерык моцна сьціскаў шыю. Рукі, далоні напаўзгорнутыя ў кулакі, ляжалі на абшарпаным стале. «Звонок был?» - пачуўся нечы голас. Рукі яе варухнуліся.

Яна адарвала грудзі ад стала, павольна паднялася і бокам выйшла са свайго схрону. Я ніколі ня бачыла яе вачэй. Сёньня ведаю: трэба было ў іх зазірнуць… «А знаете, как её зовут на самом деле? - Біятрыча!» Ах, шчасьлівы бацька Ўладзімер! Бэатрычэ*… Адвечная жаноцкасьць, неўміручае каханьне й харство… Ці не суглінак уржумскі перабіралі яе рукі на ліпучым стале?

Яна задужа ні зь кім не размаўляла. Сябравала з Соняй, выкладчыцай фізыкі, - інтэлігентнай, трохі адасобленай, густоўна апранутай. Памерла Соня на чарнаморскім узбярэжжы, дарваўшыся да цяпла, да сонца…

*Маецца на ўвазе дачка Ўладзімера Жылкі, якая тады жыла ў Полацку.

…Ня ведаю, ці стаіць гэтая камянічка. Я не была там ня менш як трыццаць гадоў. Полацкія прывіды, здані. «Лябірынты»…

Прывіднасьць (ці толькі полацкая?) у дзіўны спосаб раздвойвала і ўсё навокал, і, перш за ўсё, нас саміх. («Эх, ребята, всё не так! Всё не так, ребята!»)

Мы спадзяваліся, тым ня менш, што сьвету наканаваны маральны прагрэс. Гэты настрой дыктаваў нам чаканьне й цярплівасьць. Мы хацелі быць карыснымі й патрэбнымі тагачаснаму грамадзтву, шмат працавалі, але адначасова не жадалі цалкам атаясамліваццца з «працэсам». Не скажу, што мы былі атручаныя скептыцызмам, аднак наша біяграфія ўжо губляла стабільнасьць, выразную пэрспэктыву й агульнасьць. Сёньня ведаю: мы імкнуліся да шматзначнасьці, да «адкрытасьці» сябе й сваіх, часам няўклюдных, твораў. Але нас саміх неяк непакоіла адсутнасьць звычайнай лёгікі ў тым, што мы пісалі. Аднак - мы ўжо не маглі інакш. Шмат хто ставіўся да нас іранічна. Некаторыя - падазрона. Кола наша між тым шырылася. Мы пачалі зьбірацца ня толькі на гарышчы, але й па кватэрах. Завітвалі да нас часам мастакі, аматары музыкі - знаёмыя й незнаёмыя людзі.

…Кніжны бум 1960-х. Такое, бадай, ужо ніколі не паўторыцца! І дырэктар кнігарні - мудры, добразычлівы, шчодры. Наш сябар і часты госьць. Ён вельмі адпавядаў сапраўднаму духу Полацку. І горад яго памятае. Кнігарню «дзядзькі Грышы» добра ведалі беларускія пісьменьнікі - Янка Брыль, Уладзімер Караткевіч,

Рыгор Барадулін, Сяргей Грахоўскі… Прыяжджалі, выступалі перад моладзьдзю, намагаючыся спакусіць, ашаламіць, зачараваць родным словам. Ведайце, што былі яны часам першымі чытачамі нашых вершаў і давалі ім дарогу ў сьвет.

Сонца кідае на зямлю жмені праменьня. Жоўтыя цёплыя плямы на шэрых плітах. Варушацца цені дрэваў на траўніку. Працяты сонцам струмень ляціць угару зь дзюбы мармуровага лебедзя. Плююцца вадой сьпіжовыя жабкі. Вядомы ўсім беларускі пісьменьнік і мой сынок, яшчэ малы і шчасьлівы, ловяць у далоні вітражова-вясёлкавыя пырскі вады. Потым мы селі на лаўку і доўга глядзелі, як ліецца вада. І мне падалося: не струмень падае ўніз - лебедзь п'е вясёлку! Нашы птушкі… Нашы гнёзды…

А вось - іншы кавалак жыцьця. Малы стосік - лісты Ўладзімера Караткевіча. Роўныя чорныя радкі. Малюначкі на палёх. Не перачытваю. А раптам усплыве там нешта новае, не заўважанае раней? І што мне тады рабіць? Памятаю: «… праца мая… - малпаваньне з Пана Бога». Іронія - і цалкам сур'ёзная ацэнка свайго прызначэньня: мастак - суаўтар Творцы. Лісты гэтыя - больш за маю душу…

…Чынавенства ад культуры добра ведала адно: мастацтва павінна лёгка перакладацца на мову будзённасьці. Тое, што ў астачы, - залішняе, бо выклікае шматзначны роздум. Таму нас намагаліся выкарыстоўваць амаль выключна ў дыдактычна-пэдагагічных мэтах: выступы ў школах, вайсковых частках, нават у перапынках паміж танцамі ў Доме культуры. Для нас былі сьвятам літаратурныя старонкі ў газэтах, зрэдку - публікацыі ў «тоўстых» часопісах і выступы на абласным тэлебачаньні, сэмінары творчай інтэлігенцыі. Гэта радасна хвалявала. Нас заўважалі, клапаціліся, дзяржава рабіла немалыя выдаткі на літаратуру й мастацтва. Няхай у зададзеных межах (некаторым і да гэтых межаў было далёка), мы мелі мажлівасьць разьвівацца. Гэта нас прыцягвала, аб'ядноўвала. Чуйнае кіраўніцтва прадбачыла, аднак, такое, пра што мы самі здагадваліся, але ня ведалі дакладна. Так, нам давалі мажлівасьць ісьці, але дакладна вызначалі напрамак і

«правілы дарожнага руху». Зубры белавескія думаюць, мабыць, што жывуць у лесе. Насамрэч - у вялікім вальеры. Карацей, зьбірацца па-за згаданым пакойчыкам літаб'яднаньня нам, мякка кажучы, ня раілі. Зь некаторымі пагутарылі асобна. Пра гэта мне панура расказаў адзін з «гарышчанцаў», далікатна страсаючы сьнег з маіх плячэй (выскачыла з клясы на ганак як была).

І мне адхацелася хадзіць на наша гарышча. Незамыленым вокам я ўбачыла: абшарпаны пакоік, завалены агітпропаўскім лам'ём…

…А тады, у семдзесят нейкім годзе, у завейную ноч, мы ўсё ж дачакаліся аўтобуса, дабраліся да дому. І раніцою выкладчыца чагосьці там яшчэ ў 43-й аўдыторыі Наваполацкага політэхнічнага голасна пыталася: «Ну что это вы там читаете? Всё читаете и читаете…» Хударлявы кудлаты хлапец у цёмных акулярах хуценька паклаў кніжкі ў торбу. Мільгнулі вокладкі: «…как воля и представление», «…рил Заратустра»… Гэты хлапец напіша «Гісторыю аднаго злачынства». І «Зімовыя сны» напіша. Але ўсё гэта - праз гады.

…Зімовыя сны…

2004, Полацак

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/5
[image]

Віктар Жыбуль
Два галоўныя скандалісты 20-х

ВІКТАР ЖЫБУЛЬ (нар. у 1978 г. у Менску) - паэт, літаратуразнавец. У 2000 годзе скончыў філфак БДУ. Дасьледуе беларускую літаратуру 20-х гадоў XX ст. Аўтар чатырох кніг паэзіі, напісаў некалькі паэмаў-паліндромаў.

ЮБІЛЯРЫ

Сярод сёлетніх стогадовых юбіляраў ёсьць і два паэты, якія адыгралі не апошнюю ролю ў літаратурным жыцьці Полаччыны 20-х гадоў мінулага стагодзьдзя. Гэта рэпрэсаваныя камуністычнымі ўладамі Алесь Дудар і Паўлюк Шукайла - постаці для свайго часу вельмі адметныя. Аднаму скандальную вядомасьць прынесьлі «контррэвалюцыйныя» вершы, другому - няўрымсьлівы характар і эпатажныя паводзіны.

Творчая спадчына Дудара больш-менш вядомая чытачу. Двойчы - у 1959 і 1984 гадох - выходзілі кнігі ягоных твораў. Потым чарга дайшла і да забароненых у свой час вершаў, якія пры жыцьці паэта не друкаваліся, але хадзілі сярод беларускай інтэлігенцыі. Яны абнародаваныя, напрыклад, у кнізе Ўладзімера Міхнюка «Арыштаваць у высылцы» (Менск, 1996), аснову якой склалі недаступныя раней матэрыялы з архіваў КДБ. Найбольш знакаміты з адкрытых наноў вершаў - «Пасеклі наш край папалам…», за які паэт быў высланы на тры гады ў Смаленск. Сапраўды, радкі кшталту *«Ня сьмеем нават гаварыць / і думаць без крамлёўскай візы…»* выглядалі тады гэткім жа

выклікам існай уладзе, як і радкі зь вершаў нашага сучасьніка Славаміра Адамовіча «Убей президента!», за якія іх аўтару таксама давялося зьведаць няволі.

Вяртаецца да чытача і імя Паўлюка Шукайлы. Падкрэсьліваю, менавіта імя, а ня творы. Можа, гэта і да лепшага, бо вельмі нешматлікія дасьледчыкі творчасьці паэта сыходзяцца на тым, што ён «больш адметны як асоба, а не як творца». Дый чытач хутчэй за ўсё расчаруецца, бо за амбітнымі, шматабяцальнымі авангарднымі маніфэстамі *(«вызваленьне чалавецтва / ад прытухлых, заскарузлых / конанаў, / традыцый / архіўных / вякоў»)* хаваюцца каструбаватыя, не заўсёды ўдалыя спробы паламаць народна-песенны рытм і сынтаксыс.

І якіх толькі азначэньняў не давалі Шукайлу сучасьнікі: «літаратурны клоун» (М. Лужанін), «галасісты, крыкун, нахабны, бесцырымонны» (С. Грахоўскі), «тыповы авантурыст і гістэрык» (Б. Мікуліч)… І разам з тым - «здатны паэт, добры беларус, неблагі арганізатар і ўвогуле вельмі цікавы чалавек» (Ю. Віцьбіч). Адны ставіліся да яго з пагардай, іншыя - з захапленьнем. Ягонае зьяўленьне на літаратурных вечарах, сходах, дыспутах успрымалася прыкладна гэтаксама, як у наш час успрымаецца «прышэсьце» Анатоля Сыса.

І хаця абодва паэты-юбіляры публічна выказвалі сымпатыю да савецкіх уладаў (асабліва Шукайла, які нацярпеўся перасьледу ў Заходняй Беларусі), яны былі гэтымі ж савецкімі ўладамі й зьнішчаны. Бо як неардынарныя творчыя асобы, яны ніяк не ўкладаліся ў пракруставы ложак сталінізму. Думаецца, яны доўга яшчэ будуць прыцягваць увагу. Іх памятае Полацкая зямля, памятаюць пажоўклыя старонкі старых выданьняў, архіўныя дакумэнты - яны й дапамогуць нам бліжэй пазнаёміцца зь неўтаймаванымі творчымі натурамі Дудара і Шукайлы, аднавіць некаторыя яркія эпізоды літаратурнага жыцьця 20-х, у тым ліку зьвязаныя з Полаччынай.

ПРЫЙШОЎ «МАЛАДНЯК» І НА ПОЛАЧЧЫНУ

Полацкая філія «Маладняку» была створана 17 сакавіка 1925 году на базе студыі пры Полацкім пэдтэхнікуме. Ініцыятарам стварэньня й першым кіраўніком філіі быў Алесь Дудар. Акрамя іншых абавязкаў, у ягоную працу ўваходзіў пошук патэнцыйных сяброў «Маладняку». Сам Дудар у той час адчуваў сябе змагаром з ранейшай літаратурнай традыцыяй і імкнуўся скіраваць на гэты шлях усю створаную ім філію. Адпаведна, прыхільнасьць да спадчыны паэтаў-«адраджэнцаў» ён лічыў за дрэнны густ і насьледаваньне ёй рабіў адмоўным крытэрам пры ацэнцы творчасьці маладнякоўцаў-навічкоў. Пра гэта сьведчаць, напрыклад, характарыстыкі сяброў Полацкае філіі «Маладняку», дасланыя яе кіраўніком разам з справаздачай аб праведзенай працы ў Цэнтральнае бюро гэтай літаратурнай арганізацыі:

Крывіцкі - настаўнік, хлопец малады, энэргічны, добры беларус. Прабаваў пісаць у газэту, але на другім артыкуле сьпёкся - нічога ня выйшла. Занадта шануе Коласаў усякіх.

Паскробка - слухач лестэхнікуму, камсамолец. Карэспандэнт менскіх беларускіх газэт. Адносіцца да маладняцкай працы шчыра, але занадта сымпатызуе тым самым Коласам[1].

[1] Гэтыя характарыстыкі знаходзяцца ў ЦДАМЛіМ, ф. 1, воп. 1, спр. 225, арк. 3 адв., 4, 5, 6 адв., 7, 8 адв., 9, 10, 11, 12, 13 адв., 14, 15, 16 адв., 17, 18, 19, 20, 21, 22, 23, 24, 25, 26, 27, 28, 29, 30, 31, 32, 33, 34, 35, 36, 37, 38, 39, 40, 41, 42, 43, 44, 45, 46, 47, 48, 49, 50, 51, 52, 53, 54, 55, 56, 57, 58, 59, 60, 61, 62, 63, 64, 65, 66, 67, 68, 69, 70, 71, 72, 73, 74, 75 адв., 76, 77, 78, 79, 80, 81, 82, 83, 84, 85, 86, 87, 88, 89, 90, 91, 92, 93, 94, 95, 96, 97, 98, 99, 100, 101, 102, 103, 104, 105, 106, 107, 108, 109, 110, 111, 112, 113, 114, 115,

«Маладняком». Тыя адзінкі, якіх «Маладняк» будзе мець у Полаччыне, знойдзены лічна мною, а ня філіяй. Я настайваю на тым, каб філія альбо была распушчана, альбо на маё месца быў прысланы які-небудзь Пушча, які, не паказаўшы нічым сваёй працы, кідае папрокі мне. Лічу, што трэба зрабіць першае. Вядома, што ад другога не адмоўлюся.

(Зь ліста ад 31 траўня 1925 году)

У жніўні Дудар пераехаў з Полацку ў Менск, перадаўшы кіраўніцтва занядбанай філіяй аднаму са старэйшых і найбольш адказных яе сяброў Вал. Сянкевічу. Неўзабаве яго зьмяніў Сымон Хурсік, а затым - Алесь Звонак, якому даручылі працу адказнага сакратара ў газэце «Чырвоная Полаччына». Рэанімаваная Полацкая філія папоўнілася новымі творчымі сіламі: на старонках газэт і альманахаў пачалі зьяўляцца такія імёны, як Пятрусь Броўка, Рыгор Хвойка, Язэп Козік, Тарас Хадкевіч, Кастусь Пчалкоў, Станіслаў Мілевіч, Мікола Сямашка і інш.

ПРЫЯЦЕЛЬ МАРКСА

Вось менавіта ў гэты час і зьявіўся на Полаччыне другі вядомы скандаліст - Паўлюк Шукайла. У лютым 1926 году ён прыехаў у Расоны, куды яго перавялі на пасаду сакратара райкаму - пасьля таго, як зачынілася слуцкая акруговая газэта «Вясковы будаўнік», дзе Шукайла працаваў рэдактарам. Новае месца працы Шукайла аздобіў даволі кідка. У яго кабінэце віселі два партрэты: Маркса і Шукайлы, г. зн. яго самога, прыгадваюць відавочцы. У іншых падобных афіцыйных установах побач з Марксам звычайна вісеў Ленін, так што трэба аддаць належнае гэтаму сьмеламу ўчынку. Каб ня надта сумаваць на новым месцы, Шукайла запрасіў у Расоны свайго сябра і паплечніка па Слуцкай філіі «Маладняку» - Янку Скрыгана (апошні тады пісаў яшчэ пераважна вершы і быў больш вядомы як Пірат і Янка Відук), для якога знайшлася праца загадчыка нардому.

Былыя «слуцкія песьняры» жылі ў Расонах, але часта бывалі ў Полацку. Менавіта тут Шукайла напісаў і апублікаваў у альманаху «Наддзьвіньне» ці не найвядомейшыя свае вершы - «На Беларусі» і «Марыльцы». Радкі першага зь іх *(«На Беларусі / вада з крыві, / палеткі / з курганоў і крыжоў»)* Міхась Зарэцкі хацеў паставіць эпіграфам да свайго раману «Крывічы». А вось крытыкі гэты верш, відавочна, не ўпадабалі. Адны папракалі паэта за «нацыянальна-дэмакратычны» ўхіл (ёсьць у вершы выпады супраць *«русацяпаў»*!), іншыя не зразумелі вобразаў кшталту *«і мёртвыя ўсталі на барыкады»*. Янка Скрыган (пад псэўданімам Крушына) надрукаваў сяброўскі шарж-пародыю, у якой зьлёгку пакпіў з найбольш характэрных рысаў Шукайлавай паэзіі:

На БеларусіКосьціШмат хто
цёмнай ноччу
Але
не заплямімПа-заячаму ў капусьце

вада з крыві.

ляжаць на пуцявінах…

яе ў карак біў,

рыхтаваў грабавіну.

мы галовы не апусьцім,

бэзам

душы.

жыцьцю ня здрадзім,

як Чан-Кай-Шы.

Шукайла браў чынны ўдзел у працы Полацкае філіі «Маладняку». Напрыклад, 15 студзеня 1927 году на сходзе

філіі ў памяшканьні Полацкага пэдтэхнікуму ён прачытаў даклад на тэму «Літаратура і рэвалюцыя», у якім, мабыць, выклаў творчыя прынцыпы, сугучныя лефаўскім. А яшчэ ўвосень 1926 году «Чырвоная Полаччына» анансавала: *«Маладнякоўцы П. Шукайла і Відук падрыхтавалі да друку зборнікі ўласных вершаў»*. Аднак гэтыя зборнікі так і ня выйшлі. Чым усё скончылася, можна меркаваць з успамінаў Янкі Скрыгана-Відука:

З Расонаў паслаў сшытак вершаў у «Маладняк». Неўзабаве мне іх вярнулі. Алесь Дудар пісаў, што слабыя. Я іх спаліў, а Дудару напісаў паштоўку, не зусім згаджаючыся зь яго ацэнкай «новай плыні». Напісаў і задумаўся. Няўжо мае вершы такія благія? І, можа, папраўдзе было лепш, калі я пісаў пад Янку Купалу і Байрана? Але ж не, рэвалюцыйная паэзія павінна адкрываць нешта новае! Не заўважыў, як у такіх разважаньнях скрэмзаў усю паштоўку рознымі завітушкамі, жаночымі галоўкамі, чорцікамі. Але перапісваць ня стаў. І вельмі скора прыйшло паведамленьне, што за хуліганства з «Маладняка» я выключаны.

Неўзабаве, пратэстуючы супраць неразуменьня «Маладняком» «новай плыні», арганізацыю пакінуў і Шукайла. Сябры так і не стварылі маладнякоўскага гуртка ў Расонах, хаця на іх ускладаліся ўсе спадзяваньні. Затое зьявілася нагода падумаць пра стварэньне новай, незалежнай ад «Маладняку» футурыстычнай суполкі - мара, якая даўно блукала ў гарачай галаве Шукайлы.

Шукайла і Відук правялі на Полаччыне каля паўтара году. Тут яны пазнаёміліся з паэтам Петрусём Броўкам, крытыкам Макарам Шалаём і адказным сакратаром Акруговага краязнаўчага таварыства Сяргеем Мялешкам, якія пазьней увайшлі ў склад «Беларускай літаратурна-мастацкай камуны». Потым, калі ўсе будучыя «літкамунары» пераедуць у Менск, Мялешка застанецца ў Полацку - каб кіраваць *Літаратурным гуртком прыхільнікаў «Беларускае літаратурна-мастацкае камуны» пры Полацкім пэдтэхнікуме*.

«Камуна» зарэгістравалася ў верасьні 1927 году, але ў газэце

«Зьвязда» ўжо за 28 жніўня 1927 году чытаем:

Ужо напалову афіцыйна існуе «Літаратурная камуна». Так і ёсьць: сабралася яна ўлетку і, магчыма, яшчэ на Полаччыне. Як піша Я. Скрыган, «Камуну» арганізавалі «ў асноўным полацкім літаратурным зямляцтвам» «на так званай мясцовай футурыстычнай плятформе».

Але ў новую арганізацыю ўвайшлі і аршанец Уладзімер Прыбыткоўскі, і Юрка Лявонны з Магілёўшчыны, і случчакі Апанас Атава (Канановіч), Язэп Сукала, Рыгор Казак і Ўладзімер Варава. Паўгоду існаваньня Камуны, само зьяўленьне якой прымусіла тады загаварыць пра так і няспраўджаны беларускі футурызм, - тэма асобнай гутаркі і асобнага дасьледаваньня. Вернемся ж да нашых юбіляраў.

НА ЛІТАРАТУРНЫХ БАРЫКАДАХ

Напэўна, камусьці будзе цікава: а як жа склаліся асабістыя ўзаемаадносіны паміж дзьвюма такімі неардынарнымі асобамі, як Алесь Дудар і Паўлюк Шукайла? Ёсьць усе падставы казаць, што паэты не былі сябрамі і заўсёды шукалі нагоды пусьціць вострую кпінку ў бок адно аднаго. А на літаратурных сходах у іх рэдка калі атрымлівалася абысьціся бяз лаянкі. Вось некалькі прыкладаў.

Зь ліста Максіма Лужаніна Паўлюку Трусу (ад 18 кастрычніка 1927 году):

На суботніку (літаратурным. - **Аўт.**) *Шукайла - тяжёлый атлет лёгкого веса - так кройнуў па «Маладняку», што Дудар нават моргаць перастаў. Перад усімі крычыць:*

- Вы знаеце, хто такі Глыбоцкі? Гэта Дудар!

Вядома ж, апошняму не было даспадобы такое выкрыцьцё - пэўна, не хацелася, каб усе ведалі, што пранікнёны лірык Алесь

Дудар і задзірысты крытык Тодар Глыбоцкі - адна й тая ж асоба.

Яшчэ больш красамоўнае, вобразнае апісаньне гэтага літаратурнага суботніку знаходзім у газэце «Зьвязда». Бачна, што аўтар, Міхаіл Гольдбэрг, пішучы артыкул-справаздачу, атрымаў вялікае задавальненьне:

Гулка пранеслася рэха грымотаў - выступіў т. Сянкевіч, бліснула маланкай «сногсшибательное» выступленьне Паўлюка Шукайлы і ўсё пакрылася роўным шумам слоўнага дажджу М. Зарэцкага. І зноў маланка - Дудар, чырвоны, усхвалёваны, адказвае Шукайлу, па залі гуляе палемічны вецер, зрываючы лісты рэплік; зноў гром - Гародня выступіў у абарону Шукайлы, настойліва стукае алоўкам па графіне старшыня, заклікаючы да парадку прамоўцаў і, урэшце, калі пакрыху сьціхаюць пылкія «паэтычныя тэмпэрамэнты», рукі перастаюць нэрвова скакаць па лісткох блёкнотаў і ў паветры сірацеюць адзінокія заўвагі, тады тоненькім сонечным праменьнем прарываецца заключнае слова дакладчыка - т. Бабарэкі.

<...>

Самым «пампэзным» было выступленьне прадстаўніка «левага фронту» (Беларуская Літаратурная Камуна) Паўлюка Шукайлы. Устрахнуўшы грывай, ён кінуў сьмелы погляд у прыціхшую залю.

- Літаратура - вытворчасьць клясы. Паэта - рабочы.

Падмацаваўшы гэта бясспрэчнае палажэньне прыкладамі, Шукайла перайшоў у наступленьне:

- На першых парах маладая літаратура замест трухлявага звону (!) старой літаратуры запела баявую песьню. Але хутка… (тут голас Шукайлы загучэў сумна) хутка зьявіліся людзі, якія сваё «я» пачалі ставіць вышэй усяго. Большая частка маладых пісьменьнікаў адарвалася ад мас, ад гэтай жывой крыніцы - і ў іх перасохла ў горле. І песьні атрымаліся хрыплыя.

Затым Шукайла перайшоў да «перамываньня костачак». Папала

многім. І Трусу за тое, што «згвалціў Шаўчэнку», і Дудару за «журбу» і «ўчарашняе», якое «за горла нас душыць» («і задушыць, тав. Дудар!» - зларадна падхоплівае Шукайла), і Вішнеўскай, і Бандары?не (націск шукайлаўскі), і «рыкаючаму» Пушчы, і «гітарыстаму» Кляшторнаму, і Маракову, і нашым крытыкам, якія хварэюць «гурткоўшчынай», - адным словам, нікому не было зьлітаваньня…

Тры разы старшыня напамінаў Шукайлу, што час ужо скончыць, і тры разы аўдыторыя дазваляла прамоўцы працягваць сваю «крытыку». Гэта «крытыка» штохвіліну выклікала рогат. Праўда, многія адчувалі, што ў шукайлаўскіх довадах ёсьць шмат павярхоўнага, негрунтоўнага, але побач з гэтым прамоўца даваў і крупінкі вернага аналізу, а галоўнае - «запахла скандалам».

Аднак скандалу так і ня выйшла. Вельмі спакойна і, тым ня менш, даволі едка адказалі Шукайлу Зарэцкі і Дудар. <…>

Зарэцкі: <…> Толькі праз выяўленьне ўсёй глыбіні жыцьця. Ідэалёгія ж - гэта агульнае мэтаімкненьне, агульны напрамак, а не шукайлаўскія лёзунгі…

Дудар: Аб таварышу Шукайлу як пісьменьніку я наогул не магу гаварыць, бо, на вялікі жаль, да гэтага часу не чытаў яго твораў ані ў воднай часопісі (у залі рогат, у Шукайлы раптоўна зрастаюцца бровы).

Што ж, напэўна, творчасьць Шукайлы сапраўды не была шырока вядомай у літаратурных колах. І тады «выправіць сытуацыю» вырашыў паэт Сяргей Дарожны, які, напэўна, меў свае рахункі з Шукайлам. Як гэта адбылося і што з гэтага атрымалася - даведваемся з слоў самога Шукайлы:

ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

Ужо вось два месяцы, як грамадзянін Сяргей Дарожны (Серада), які зьяўляецца сябрам літаратурнага згуртаваньня «Ўзвышша», носіць па рэдакцыях газэт і зачытвае пісьменьнікам, студэнтам

і знаёмым рукапісы вершаў, якія, нібыта, напісаны мною і дадзены для распаўсюджваньня такім спосабам.

Я б катэгарычна адмовіўся ад прыналежнасьці гэтых вершаў мне, каб не адно здарэньне, якое мела мейсца ў рэдакцыі газэты «Беларуская вёска», дзе таварышы, якія бачылі два вершы, прынесеныя С. Дарожным, сьцьвярджалі мне, што гэта ўласныя мае рукапісы.

Ніякіх вершаў С. Дарожнаму, ды наогул нікому, для распаўсюджваньня я не даваў. Твораў, у якіх было-б такое месца (бяру са словаў сябра «Зьвеньняў» Зелянеўскае):

…Выйду я на сенажаць
ды з нагана ў жабу - бац…

- я ніколі не пісаў і пісаць не зьбіраюся. Той, хто распаўсюджвае іх, такім чынам, робіць справу агіднага правакатара. Налічча ж у яго маіх рукапісаў гаворыць за тое, што тут, апроч правакатарства, мы маем справу і са зладзействам.

Пратэстуючы перад савецкім грамадзянствам супроць такіх дзеяньняў грамадзяніна, які прэтэндуе на званьне «пісьменьніка», у той жа час справу перадаю ў суд і іншыя належныя ўстановы.

З прывітаньнем і пашанаю

Паўлюк Шукайла

Наколькі нам вядома, ніякага суду над С. Дарожным з гэтае нагоды не адбылося. А калі б нават і адбыўся, то гэта наўрад ці што зьмяніла б. Справа была зроблена, і з Шукайлы рагаталі ўжо ўсе, хто меў якое-кольвечы дачыненьне да літаратуры, а некаторыя нават шчыра паверылі, што вершык пра наган і жабу сапраўды належыць Шукайлу. «Беларускаму футурысту» даводзілася рабіць вялікія высілкі, каб давесьці, што гэтыя радкі не ягоныя. Асабліва ўпадабаў маленькую пародыю-эпіграму Глыбоцкі-Дудар. Крытыкуючы ў адным з артыкулаў

наватарскую паэтыку Ўладзімера Дубоўкі, ён правёў паралелі з творчасьцю *«другога паэта непрызнанага»*, які *«за сваё літаратурнае жыцьцё найбольш удалымі зрабіў… наступныя радкі: Выйду я на сенажаць / Ды з нагана ў жабу - бац!»*

Аднак і Шукайла не прымушаў сябе доўга чакаць і ў артыкуле «Літаратурнае сёньня» таксама адмяцеліў Дудара, адзначыўшы яго ў ліку *«гандляроў душой і целам, песьняроў пахмельля і віна».*

…па завулках ганяў сабак,
шыбы каменьнямі біў! -

цытуе Шукайла верш Дудара і тут жа робіць выснову:

Добрыя забавы, няма чаго сказаць… Любоў таксама… Бі вокны, ганяй сабак! - міліцыі работа патрэбна, дык чаму ж ня множыць хуліганства?!

Тут Дудар скінуў маску і паказаў свой «літаратурны» твар, які ён ёсьць.

Нягледзячы на падобныя абвінавачаньні, Дудар заставаўся ў літаратурных колах аўтарытэтам. Яго маглі крытыкаваць за «ўпадніцтва», але не за адсутнасьць мастацкіх вартасьцяў у творах. Шукайла ж на беларускім Парнасе зрабіўся чымсьці кшталту літаратурнага пудзіла, а ягоныя творы - узорам таго, як ня трэба пісаць, бо ўся творчая энэргія вылівалася ў скандалы, арганізацыйную мітусьню і публічныя выступы. Ён меў артыстычныя здольнасьці, як, дарэчы, і Дудар - былы ўдзельнік Першай беларускай тэатральнай групы пад кіраўніцтвам Уладзіслава Галубка.

АКРЫВАЎЛЕНАЯ ЗЯМЛЯ[2]
Невядома, колькі б яшчэ скандалаў адбылося паміж Шукайлам

[2] Ў Менску

і Дударом, але неўзабаве лёс закінуў абодвух за межы Беларусі.

У красавіку 1928 году «Літаратурная камуна» распалася, але вяртацца, як ягоныя паплечнікі, у «Маладняк», Шукайла не захацеў. *«Пасьля гэтага Паўлюк Шукайла некаторы час быў незалежным, ці, як казалі тады, «дзікім» паэтам, не далучаўся да якіх-небудзь груповак»*, - прыгадваў Шукайлаў сябар, вядомы паэт-эмігрант Рыгор Крушына. Увосені Шукайла паехаў у Маскву на вучобу ў Камуністычную акадэмію, спадзеючыся зьвязаць далейнае жыцьцё з кінэматографам.

Да Алеся Дудара лёс (які ў тыя часы часьцяком выраўнаўся камуністычнымі ўладамі) выявіўся менш літасьцівым. Калі дагэтуль яго абвінавачвалі толькі пераважна ўва «ўпадніцтве» і «чыстым эратызьме», то цяпер на яго начапілі цэтлік «нацдэма». Гэтаму спрыяў цэлы шэраг «небясьпечных» учынкаў паэта: спачатку ён надрукаваў пад псэўданімам Т. Глыбоцкі артыкулы «Даволі анэкдотаў» і «Таптаньне на месцы: («Бронецягнік» - БДТ-1)», у якіх выступіў за нацыянальную самабытнасьць беларускага тэатру. Потым разам з Андрэем Александровічам і Міхасём Зарэцкім апублікаваў у газэце «Савецкая Беларусь» адкрыты ліст аб сваім выхадзе зь ліку студэнтаў БДУ ў знак пратэсту супраць абвінавачаньняў у «групаўшчыне» і «беларускім шавінізьме». І як апатэоз - верш «Пасеклі наш край папалам…». На допыце 20 сакавіка 1929 году паэт сказаў, што пісаў яго ў нецьвярозым стане - верш, які сёньня ўспрымаецца як знакавы твор беларускай паэзіі. Пазьней, у 30-я гады, зьявілася цэлае літаратурнае аб'яднаньне, замаскаванае пад суполку алькаголікаў, - Таварыства аматараў выпіць і закусіць (ТАВІЗ). На сходах ТАВІЗу, у коле сяброў, употай ад афіцыйнага пісьменьніцкага кіраўніцтва, чыталіся творы, не прызначаныя да друку. Уваходзіў у гэтае кола і Алесь Дудар.

Пісаць і друкаваць ува ўмовах сталіншчыны нешта вартаснае было небясьпечна. Вярнуўшыся з высылкі, Дудар большую ўвагу скіраваў на пераклады. Шукайла, жывучы ў Маскве і Ленінградзе, заняўся кінакрытыкай і выкладчыцкай дзейнасьцю. У студэнтаў такі эксцэнтрычны выкладчык (да таго ж - прафэсар!) карыстаўся вялікай папулярнасьцю… Жыцьцё абодвух паэтаў-юбіляраў скончылася трагічна. Ізноў

Паўлюк Шукайла выдаў кнігу пад назовам «Акрываўленая зямля». «Пэта быў зборнік патрыятычных вершаў, пераважна аб Заходняй Беларусі. Аднак гэты агульны назоў абымаў вершы і аб савецкай краіне. І ў гэтым хавалася глыбокае прадбачаньне. У трыццатых гадох савецкая Беларусь сапраўды сталася акрываўленай зямлёй». (К. Рамановіч. Паўлюк Шукайла // Бацькаўшчына. 1961, 10 сьнежня).

Дудара арыштавалі ў 1936 годзе, Шукайлу - у 1938. Гэтым разам прысуды «нацдэмам» былі сьмяротныя…

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/5
[image]

Генадзь Семянчук Усяслаў Брачыславіч, князь Полацкі (штрыхі да гістарычнага партрэту)*

ГЕНАДЗЬ СЕМЯНЧУК (нар. у 1963 г. у Ваўкавыску) - археолаг, гісторык. Распрацоўвае праблемы гісторыі сярэднявечнай Беларусі. Дацэнт катэдры археалогіі і этналогіі Гарадзенскага дзяржаўнага універсытэту імя Янкі Купалы.

«В лето 6609. Преставися Всеславъ, полоцкий князь, месяца апреля въ 14 день, въ 9 часъ дне, въ среду». Трохі больш за тысячу год таму, 14 красавіка 1101 г., кіеўскі летапісец аўтар «Аповесці мінулых гадоў», вельмі дакладна зафіксаваў смерць незвычайнай і ўнікальнай асобы сярэднявечнай гісторыі Усходняй Еўропы - полацкага князя Усяслава Брачыславіча. За ўвесь час ад смерці Яраслава Ўладзіміравіча ў 1054 г. да мангольскай навалы ў 30-40-я гады XIII ст. ён быў адзіным князем, які кантраляваў [illegible] Полацкай зямлі, [illegible] Усяслава Брачыславіча [illegible] Полацкай зямлі [illegible] Полацкага княства [illegible] Полацкага княства [illegible] Полацкага княства

тэрытарыяльны, паспалітыкі і інтэлектуальны рэнтгенаўлаў да Беларусі. Шэраг момантаў падкарэктаваны і дапоўнены.

Адразу пасля смерці Ўсяслава ў 1101 г., а магчыма, нават пры ягоным жыцці, феномен полацкага князя патрабаваў вытлумачэння ў асяроддзі тагачасных палітыкаў і інтэлектуалаў. Гісторыя Ўсяслава, гэтаксама як забойства Барыса і Глеба, вельмі хутка на тэрыторыі Ўсходняй Еўропы атрымала характар хрэстаматыйнага прыкладу адхіленняў ад прынятых нормаў у тагачаснай палітыцы. Праўда, гісторыю полацкага князя адразу пачалі трактаваць дыяметральна супрацьлеглым чынам. Нядзіўна, што вобраз Усяслава Брачыславіча набыў дзве зусім розныя рэпутацыі і інтэрпрэтацыі.

З аднаго боку, для аўтара «Аповесці мінулых гадоў», які апісаў падзеі 1067-1069 гг., полацкі князь быў увасабленнем зняважанай набожнасці і маралі таго часу. Для кіеўскага летапісца Ўсяслаў - паганец ад нараджэння, які з часам робіцца ўзорным хрысціянінам. Ён - ахвяра, бо паверыў у ахоўную сілу крыжа, які цалавалі Яраславічы на знак замірэння, але, вераломна парушыўшы клятву, схапілі яго і пасадзілі ў Кіеве ў поруб. Седзячы ў вязніцы, ён шчыра звяртаўся да Божай сілы: *«О кресте честный! Понеже в тобе веровах, избави мя от рва сего».* Актам жа вызвалення полацкага князя *«Богъ же показа силу крестную на показанье земле Русьстей, да не преступають честнаго креста, целовавше его; аще ли преступить кто, то и зде приметь казнь и на придущемъ веце казнь вечную».*

Адначасова распаўсюдзіўся зусім супрацьлеглы погляд на Ўсяслава Брачыславіча. Для наўгародскіх летапісцаў ён зацяты паганец - і сваім нараджэннем, і нехрысціянскімі ўчынкамі, прадстаўнік паўпаганскіх, паўдэманічных сілаў зла. Менавіта з ім звязвалі першапрычыну ўсіх бедаў дынастыі Яраславічаў у другой палове XI ст. Адсюль правакацыйныя плёткі пра незвычайныя абставіны нараджэння Ўсяслава: быццам бы ён з'явіўся на свет Божы *«от вълхововaнья», з адзнакай на галаве, пасля чаго «Рекоша бо волсви матери его: «Се язвено навяжи на нь, да носить е до живота своего», «еже носить Всеславъ и до сего дне на собе; сего ради немилостивъ есть на кровьпролитье».*

Загадкавасць асобы Ўсяслава для тагачаснага насельніцтва Кіева, Ноўгараду, Чарнігава спрыяла таму, што ён зрабіўся цэнтральным персанажам эпічных пародый, народных былін і казак, у вобразе Вольхі (ці Волка) Усяслаўевіча альбо Ўсяслава-Пярэваратня, прадстаўніка цёмных сілаў прыроды.

На фармаванне негатыўнага вобразу полацкага князя Ўсяслава ў большай ступені паўплывалі адносіны да яго і ягонай дзяржавы суседзяў-канкурэнтаў. 20 лютага 1054 г. памёр кіеўскі князь Яраслаў Уладзіміравіч, празваны Мудрым. Згодна з ягоным тастамантам, Руская зямля была падзелена ў канонах любові паміж ягонымі сынамі. Настаў доўгі міралюбівы перыяд паміж нашчадкамі Ўладзіміра і Яраслава. Усе, хто выступаў супраць Кіева і трох старэйшых сыноў Яраслава, ужо сучаснікамі (летапісцамі і палітычнымі ідэолагамі) залічваліся ў ворагі. Падобную тэндэнцыю падтрымалі і развіваюць большасць гісторыкаў на працягу ўжо некалькіх стагоддзяў. Кіевацэнтрызм і «імперскасць» - характэрныя рысы пераважнай большасці гістарычных даследаванняў, прысвечаных мінуламу Ўсходняй Еўропы X - сярэдзіны XIII ст. На думку англійскіх гісторыкаў Саймана Франкліна і Джанатана Шэпарда,

пашыранай памылкай з'яўляецца ўяўленне пра тое, што на Русі існавала пэўная палітычная «сістэма», ад якой некаторыя беспрынцыповыя князі часам альбо заўсёды імкнуліся адхіліцца. Палітычнай культуры, якая была б дастасаваная да разгалінаванай, моцна ўсталяванай дынастыі, за часоў Яраслава і ягоных папярэднікаў не існавала. Таму нашчадкам Яраслава даводзілася імправізаваць, прыстасоўваць звычаі, прэцэдэнты і ўсталяваныя ўяўленні да непрадбачаных сітуацый. Гэтак з'яўляліся дамоўленасці, выкліканыя бягучай неабходнасцю, няўдалыя пачынанні, кампрамісы і пагадненні, хітрыкі, пры дапамозе якіх навацыі выдаваліся за традыцыі.

Усё гэта як найлепей адносіцца да нашай гісторыі.

Шматлікія аспекты, звязаныя з жыццём і дзейнасцю Ўсяслава Брачыславіча, неаднойчы разглядаліся ў навуковай і навукова-папулярнай літаратуры. Аднак новыя методыкі аналізу і

інтэрпрэтацыі вядомых гістарычных крыніц, выкарыстанне звестак сумежных навук (археалогіі, гістарычнай геаграфіі, храналогіі, анамастыкі) дазваляюць пашырыць нашыя веды пра гэтую асобу і яго эпоху, пазбавіцца навуковых стэрэатыпаў і палітычных комплексаў.

Па-за «кампрамітуючай» інфармацыяй аб нараджэнні Ўсяслава летапісцы не падаюць нам больш ніякіх канкрэтных звестак пра пачатковы перыяд ягонага жыцця. У выніку арыгінальных разлікаў Сяргей Тарасаў прыйшоў да высновы, што полацкі князь нарадзіўся зімою 1028/1029 г. Ягоны бацька Брачыслаў, дзякуючы мудрай палітыцы, значна ўзмацніў сваё княства і эканамічна, і палітычна. У выніку ваенных дзеянняў і палітычных перамоваў у 1021 г. да Полацку далучаны Віцебск і Ўсвяты, важныя пункты на волаках гандлёвага шляху «з вараг у грэкі». Больш за тое, пэўны час (1021-1026 гг.) Брачыслаў быў разам з Яраславам суправіцелем у Кіеве. Будучы саюзнікам кіеўскага князя Яраслава, ён удзельнічаў у сумесных паходах на літоўскія плямёны ў 1038 і 1040 гг., у выніку якіх за Полацкам замацаваліся паўночна-заходнія тэрыторыі сучаснай Беларусі, дзе паўсталі памежныя крэпасці Дрысвяты і Браслаў. Не выключана, што полацкі князь са сваёй дружынай у якасці саюзніка ўдзельнічаў у вайсковай выправе Яраслава Ўладзіміравіча супраць мазавецкага князя Мецлава ў 1041 г. Менавіта дзякуючы дапамозе рускіх дружынаў новы польскі князь Казімір Аднавіцель змог зламаць сепаратызм мазаўшанаў.

Усяслаў Брачыславіч *«седе на стол»* свайго бацькі ў 1044 г., маючы 15-16 год. Цягам першых 16 год ягонага кіравання крыніцы нічога не паведамляюць пра Полаччыну і дзейнасць маладога полацкага князя. Найпраўдападобней, гэта тлумачыцца тым, што дзейнасць Усяслава не выходзіла за межы Полацкай зямлі, а Яраславічы былі занятыя сваімі ўласнымі справамі. Што ж да летапісаў суседніх дзяржаваў, яны звычайна ўзгадвалі Полацак толькі тады, калі ён сваімі дзеяннямі закранаў інтарэсы Кіева, Ноўгараду альбо падпарадкаваных ім земляў. Такім чынам, Усяслаў у гэтыя «нямыя» гады займаўся ўнутраным уладкаваннем сваёй дзяржавы. А праблемаў было шмат.

Археалагічныя даследаванні апошніх 10-15 год, праведзеныя С. Тарасавым у Полацку, пераканаўча сведчаць, што менавіта пры Ўсяславу ў сярэдзіне XI ст. заканчваецца працэс пераносу адміністрацыйнага цэнтру Полацку з «гарадзішча Рагвалода» на Верхні замак. Тут, на Верхнім замку, Усяслаў Брачыславіч пабудаваў велічны Сафійскі сабор (трэці ва Ўсходняй Еўропе пасля кіеўскага і наўгародскага), які зрабіўся не толькі духоўным сімвалам, але таксама цэнтрам засяроджання палітычнай і адміністрацыйнай улады Полацку і Полацкай зямлі. Час пабудовы Сафійскага сабору большасць даследчыкаў адносіць да сярэдзіны XI ст. (50-я - пачатак 60-х гг.).

Падчас свайго нязвыкла доўгага княжання Ўсяслаў Брачыславіч актыўна займаўся ўмацаваннем вонкавых межаў Полацкага княства і пашырэннем яго тэрыторыі. Полацкая зямля на гэты час ахоплівала плошчу каля 100 тыс. км2 і межавала на поўдні з Тураўскім княствам, якое знаходзілася пад уплывамі Кіева, на поўначы і паўночным усходзе - з Наўгародскай зямлёй, на ўсходзе - са Смаленскім княствам, на захадзе і паўночным захадзе - з літоўскімі і латышскімі народамі. Упарадкоўваліся старыя гарады і памежныя крэпасці, а таксама будаваліся новыя: Менск на Нямізе, Лагойск, Лоск, Герцыке і Кукенойс. Неабходна ўлічваць, што падпарадкаванне суседніх народаў і тэрыторый магло адбывацца толькі ў той час, калі дзяржаўныя сілы не адцягваліся на барацьбу з больш моцнымі супернікамі - Кіевам, Ноўгарадам, Чарнігавам і Смаленскам. Спакойных перыядаў для Полацкага княства ў другой палове XI ст. можна налічыць тры: з 1044 па 1065 г., з 1071 па 1077 г. і з 1085 па 1101 г.

Найбольш паспяхова дзяржаўная ўлада князя Ўсяслава Брачыславіча пашыралася на тэрыторыі, населеныя балцкімі і прыбалтыйска-фінскімі народамі, - на захад, паўночны і паўднёвы захад ад Полаччыны, уздоўж галоўнай жыццёвай артэрыі Полацку - Дзвіны. Таму ён імкнуўся кантраляваць раку ад вытокаў да вусця. Пры Брачыславу, з далучэннем у 1021 г. Віцебску і Ўсвятаў, улада Полацку пашырылася на Верхняе Падзвінне. Першачарговай задачай для Ўсяслава было авалоданне Ніжнім Падзвіннем, што ён паспяхова і выканаў. Лівы, якія жылі на Балтыйскім узбярэжжы, і суседнія з імі

народы - земгалы і куршы - былі падначаленыя Полацкаму княству як даннікі і вайсковыя саюзнікі. Адносна бліжэйшых суседзяў Полацку - латгалаў і селаў, якія не ўзгадваюцца ў «Аповесці мінулых гадоў» як даннікі Полацку, можна гаварыць, што іх тэрыторыі ў другой палове XI ст. непасрэдна ўвайшлі ў склад Полацкага княства. Менавіта тут узніклі два полацкія гарады-фарпосты Герцыке і Кукенойс.

Актыўнасць Усяслава ў Ніжнім Падзвінні мела яшчэ адзін вынік - Полацак і яго князь зрабіліся актыўнымі ўдзельнікамі гандлёвага і палітычнага жыцця ў Балтыйскім рэгіёне. На думку польскага гісторыка Яна Паверскага, дзейнасць полацкага князя Ўсяслава была адным з магчымых чыннікаў палітычнай дэстабілізацыі на берагах Балтыкі ў 60-х гадах XI ст. Паганскія рэакцыі ў землях абадрытаў у 1066 г. і ў Швецыі ў 1067 г. былі нейкім чынам звязаныя з тагачаснай вайной Усяслава з Яраславічамі. Не выключана, што полацкі князь адыграў натхняльную ролю ў падзеях на ўзбярэжжы Балтыйскага мора. Больш за тое, ён лічыўся патэнцыйным саюзнікам паганскага руху ў Швецыі, а магчыма, і ў абадрытаў. У яго інтарэсах было ізаляваць Яраславічаў ад скандынаўскай дапамогі, якой вельмі шырока карыстаўся іх бацька. Барацьба з паўстанцамі адцягвала сілы магчымых саюзнікаў Яраславічаў - скандынаўскіх дынастый Гаральда Гардрадэ нарвежскага, Свена Естрыдсэна дацкага і нашчадкаў шведскага караля Стэнкіла, а таксама марграфа Паўночнай Маркіі Ўдона II. У любым выпадку дакладна тое, што Ўсяслаў выкарыстаў паганскія рэакцыі ў Балтыйскім рэгіёне ў сваёй вайне з Яраславічамі.

Актыўнасць Усяслава на Балтыцы дазваляе нам таксама сцвярджаць пра статус Полацкага княства як марской дзяржавы і наяўнасць у яе флоту. Раней на гэта не звярталася ўвагі і традыцыйна Полацкая зямля ўяўлялася прымітыўнай сухаземнай краінай, перыферыяй Кіева. Ужо прадзед Усяслава, нарвежскі конунг Рагвалод, прыплыў на караблях *«бе бо Рогволодъ пришёл и заморья, имяше власть свою в Полотьске».* Натуральна, што камунікацыя паміж Полацкам і бліжэйшымі сваімі гарадамі па Дзвіне - Віцебскам на ўсходзе, Герцыке і Кукенойсам на поўначы - для хуткасці адбывалася водным

шляхам. І ўжо напэўна, полацкія купцы накіроўваліся «па заморскія рэчы і стравы» ў Кіеў і Канстанцінопаль альбо Готланд і Памор'е на сваіх ладдзях з ветразямі.

У 1060 г. Ізяслаў, Святаслаў і Ўсевалад Яраславічы разам з Усяславам полацкім *«совокупиша вои бещислены и поидоша на конихъ и в лодьяхъ, бещислены множьство, на торки».* Паход у стэп быў удалым для саюзнікаў, торкаў перамаглі. За ўдзел у паходзе на торкаў полацкі князь атрымаў тэрыторыі на правым беразе Дняпра ў раёне Оршы і Копыся. Прыгадваецца сітуацыя 1021 году, калі Яраслаў аддаў полацкаму князю Брачыславу Віцебск і Ўсвяты ўзамен за саюзніцкія адносіны. Саюзніцкія адносіны паміж Полацкам і Кіевам цягнуліся да сярэдзіны 60-х гадоў XI ст., калі Ўсяслаў Брачыславіч быў вымушаны іх парушыць і ўступіць у 20-гадовую канфрантацыю з сынамі і ўнукамі Яраслава. Захаваная ў летапісах інфармацыя не высвятляе нам прычыны шматгадовага канфлікту паміж полацкім князем і сынамі Яраслава. Летапісныя паведамленні накшталт *«В се же лето Всеславъ рать почалъ»* альбо *«Заратися Всеславъ сынъ Брячиславль, Полочьске, и зая Новъгородъ»* для большасці даследчыкаў сталі падставай бачыць у асобе полацкага князя галоўнага парушальніка ўсталяваных нормаў і пачынальніка міжусобных войнаў 2-й паловы XI ст. на Русі. Прычыны, галоўным чынам, называюцца дзве - дынастычная (жаданне Ўсяслава панаваць у Кіеве) і дзяржаўная (жаданне Полацку ўзмацніць свае ўплывы на Ноўгарад і гандлёвую камунікацыю ў Сярэднім Падняпроўі). Аднак больш грунтоўны аналіз унутранай палітыкі сыноў Яраслава пасля ягонай смерці дазваляе зрабіць іншыя назіранні і высновы.

Пасля смерці ў 1054 г. кіеўскага князя Яраслава вядучай палітычнай сілай на Русі стаў саюз трох ягоных старэйшых сыноў - Ізяслава, Святаслава і Ўсевалада. Згодна з запаветам свайго бацькі, першы атрымаў Кіеў, што рабіла яго фармальна вядучай асобай у гэтым саюзе. Святаславу дастаўся Чарнігаў, а Ўсеваладу - Пераяслаўль. Два малодшыя сыны атрымалі ад Яраслава ва ўладанні Ўладзімір Валынскі (Ігар) і Смаленск (Вячаслаў). Як бачым, Полацак не быў часткай «імперыі» Яраслава Ўладзіміравіча. У 1044 г., пасля смерці Брачыслава Ізяславіча, Полацкае княства не было праглынутае ўладаннямі

Яраслава, а перайшло як спадчыннае сыну Ўсяславу. Таму Полацак не ўзгадваецца ў тастаманце Яраслава і не ўваходзіць у лік тэрыторыяў, якімі валодалі альбо на якія прэтэндавалі Яраславічы.

Галоўнай мэтай унутранай палітыкі трыумвірату старэйшых сыноў Яраслава было ўмацаванне і пашырэнне кіеўскай улады на землях Усходняй Еўропы. Іх палітыка была падобна да той, якую праводзілі іхныя дзед Уладзімір і бацька ў канцы X - першай палове XI ст. Калі ў 1057 г. памёр смаленскі князь Вячаслаў, то браты сваёй воляй, у парушэнне лесвічнага прынцыпу ўлады, *«посадиша Игоря Смолиньске, изъ Володимеря выведше».* Пры гэтым Валынь нікому не перадавалася, а, відавочна, засталася пад кіраваннем трыумвірату старэйшых Яраславічаў. Дадзенае меркаванне пацвярджаецца падзеямі, якія надышлі пасля смерці Ігара ў 1060 г. Ані Смаленск, ані які-небудзь іншы горад не дасталіся сыну апошняга Давіду, а *«разделиша Смоленскъ собе на три части».* У сярэдзіне 60-х гадоў XI ст. назіраецца барацьба за Цьмутаракань паміж Расціславам Уладзіміравічам, унукам Яраслава, і Святаславам Чарнігаўскім, прадстаўніком трыумвірату. У 1066 г. Расціслаў памірае, атручаны грэкамі. Пад уладай Кіева ў той час знаходзілася тэрыторыя Галіцкай зямлі, непасрэдна Кіеву падпарадкоўваўся і Ноўгарад, у якім больш за сто гадоў сядзелі альбо самі кіеўскія князі, альбо іх дзеці. Ноўгарад не ўзгадваецца ў тастаманце Яраслава, што сведчыць аб аўтаматычным уключэнні яго ва ўладанні Ізяслава Кіеўскага, у ім княжыў ягоны сын Мсціслаў.

Натуральна, што ў такой палітычнай сітуацыі раней альбо пазней Яраславічы мусілі звярнуць сваю ўвагу на Полацкае княства. Існаванне незалежнага і даволі багатага Полацку было сталай пагрозай ідэалогіі кіевацэнтрызму, якую актыўна ўсталёўвалі на поўдні Яраславічы. Больш за тое, полацкі князь Усяслаў Брачыславіч для Яраславічаў быў чужынцам з пункту гледжання ўнутрыкняскіх адносінаў. Так, ён належаў да ліку сваякоў, аднак не быў нашчадкам Яраслава. Таму Ўсяслаў не ўкладаўся ў схему сваяцкіх адносінаў, выпрацаваную паўднёварускімі князямі і прапагандыстамі іх імперскай ідэалогіі.

Ужо пасля сумеснага паходу старэйшых Яраславічаў з Усяславам у 1060 г. на торкаў кіеўскі князь Ізяслаў разам з наўгародцамі выправіўся на сасолаў - народ, які пражываў у паўднёва-заходняй Эстоніі, - і абклаў іх данінай. Сасолы былі найбліжэйшымі суседзямі ліваў, даннікаў Полацку. Пашырэнне кіеўска-наўгародскай улады на гэты прыбалтыйска-фінскі народ было ўспрынята ў Полацку як пагроза яго кантролю над дзвінскай гандлёвай камунікацыяй і падпарадкаванымі яму тэрыторыямі ліваў, куронаў, земгалаў. У той жа час Яраславічы ўзмацнілі свае пазіцыі на шляху «з вараг у грэкі», усталяваўшы кандамініум у Смаленскай зямлі. А гэта стварала небяспеку ўсходнім межам Полацкага княства.

Менавіта жаданне перашкодзіць памкненням стварэння адзінай дзяржавы і ўзмацнення пазіцый Яраславічаў у раёне паўночных і ўсходніх межаў Полацкага княства, а таксама ў Ніжнім Падзвінні - у раёне дзвінскай камунікацыі, якая ад пачатку існавання знаходзілася пад кантролем Полацку, - з'явілася галоўнай прычынай канфрантацыі Ўсяслава з кланам Яраславічаў. Гэтая барацьба полацкага князя з Яраславічамі падзяляецца на два этапы: першы - 1065-1071 гг. і другі - 1077-1085 гг. На першым актыўнейшы быў Усяслаў Брачыславіч. У 1065 г. ён напаў на Пскоў: *«Всеслав рать почал», а зімою 1066-1067 гг. - на Ноўгарад: «Приде Всеславъ и възя Новъгородъ, съ женами и съ детми; и колоколы съима у святыя Софие. О, велика бяше беда въ час тыи; и понекадила съима».* Як бачым, Усяслаў прайшоўся агнём і мячом па горадзе і абрабаваў святыню - Сафійскі сабор. Дадзены ўчынак полацкага князя сведчыць пра тое, што ён наважыўся на сур'ёзны канфлікт з Яраславічамі. Гэта быў ужо больш чым дробны лакальны міжкняскі канфлікт. На думку англійскіх гісторыкаў С. Франкліна і Дж. Шэпарда, у дзеяннях Усяслава заўважаецца спроба нейтралізацыі Ноўгараду, яго падпарадкавання Полацку, што дазваляла ўзмацніць кантроль над Балтыйскім узбярэжжам. Больш за тое, наўгародскі паход Усяслава распачаў цэлы ланцуг падзей, якія скончыліся найбуйнейшым за паўстагоддзя палітычным крызісам на Русі. Перыпетыі гэтай барацьбы вартыя асобнага даследавання. Адзначым толькі, што Ўсяславу супрацьстаялі аб'яднаныя сілы большасці Яраславічаў, а ён выкарыстоўваў толькі свае

палачанскія магчымасці, а таксама суседнія балцкія і прыбалтыйска-фінскія народы.

Адказ Яраславічаў быў хуткім і жорсткім. Браты, аб'яднаўшы свае войскі, вырушылі ў кірунку паўднёва-заходніх межаў Полацкай зямлі. *«И придоша ко Меньску, и меняне затворишася в граде. Си же братья взяша Менескъ, и исекоша муже, а жены и дети вдаша на щиты, и поидоша к Немизе, и Всеславъ поиде противу. И совокупишася обои на Немизе, месяца марта въ 3 день; и бяше снегъ великъ, и поидоша противу собе. И бысть сеча зля, и мнози падоша, и одолеша Изяславъ, Святославъ, Всеволодъ, Всеславъ же бежа».* Непасрэдна бітва на Нямізе скончылася перамогай паўднёварускіх князёў, аднак пагроза з боку Ўсяслава не была ліквідавана. Праз чатыры месяцы, 10 ліпеня 1067 г., Яраславічы запрасілі полацкага князя на перамовы з мэтай заключыць перамір'е, пры гэтым *«целовавше крестъ честный къ Всеславу, рекше ему: «Приди к намъ, яко не сотворимъ ти зла». Он же надеявъся целованью креста, перееха в лодьи чересъ Днепръ. Изяславу же в шатеръ предъидущю, и тако яшя Всеслава на Рши у Смолиньска, преступивше крестъ. Изяславъ же приведе Всеслава Кыеву, всади и в порубъ съ двема сынома».*

Пад наступным, 1068 годам, у «Аповесці мінулых гадоў» паведамляецца пра напад на Рускую зямлю полаўцаў. Трое Яраславічаў спаткалі іх над ракой Альтай, у Пераяслаўскай зямлі Ўсевалада. Аднак, прайграўшы, адышлі: Ізяслаў з Усеваладам - у Кіеў, а Святаслаў - у Чарнігаў. Кіяўляне пажадалі ад князёў і ваяводы Каснячкі зброі і коней, каб выступіць супраць полаўцаў. Адмова іхнім жаданням спрычынілася да таго, што кіеўскія людзі (хутчэй за ўсё з намовы купцоў з полацкага двара ў Кіеве) вызвалілі з порубу Ўсяслава і абвясцілі яго сваім князем. Ізяслаў уцёк з Кіева ў Польшчу па дапамогу. Летапісец пракаментаваў гэта ўсё як «божую кару» за здраду Яраславічаў, дадаючы пры гэтым, што Ўсяслаў сядзеў на кіеўскім пасадзе сем месяцаў. Як бачым, кіеўскі перыяд жыцця Ўсяслава быў кароткім і не адлюстраваны ў летапісах. Толькі ці так безнадзейныя нашыя веды пра дзейнасць полацкага князя ў Кіеве? Ці не сутыкнуліся мы з сітуацыяй, калі кіеўскі летапісец свядома змаўчаў пра яе?

Бо цяжка сабе ўявіць, каб такая актыўная асоба, як Усяслаў, сем месяцаў бяздзейнічаў. А ён, як можна здагадацца з падтэксту ці «маўчання» летапісу, выглядае хутчэй пакорлівым новаахрышчаным паганцам, які вельмі заняты пошукамі глыбіняў хрысціянскай духоўнасці.

На самай справе Ўсяслаў Брачыславіч, будучы кіеўскім князем, эфектыўна праводзіў сваю палітыку, накіраваную на перашкоджанне Яраславічам пабудаваць цэнтралізаваную сярэднявечную імперыю. Яму ўдалося зацікавіць Святаслава і, магчыма, Усевалада. Паміж Усяславам і астатнімі Яраславічамі была заключана выгадная для абодвух бакоў дамова за кошт інтарэсаў збеглага ў Польшчу Ізяслава. За сабою Ўсяслаў пакінуў Кіеў, натуральна, Полацак і дадаў Смаленск. Чарнігаўскаму князю Святаславу адышоў Ноўгарад, бо бачым там ягонага сына Глеба, а пераяслаўскаму князю Ўсеваладу дасталася Валынь, дзе сустракаем ягонага сына Ўладзіміра, будучага Манамаха. Такі падыход дазваляе па-іншаму паглядзець на шматлікія падзеі канца 60-х - пачатку 70-х гг. XI ст., звязаныя з Усяславам, якія вельмі фрагментарна зафіксаваныя на старонках летапісаў.

Наступныя падзеі паказалі, што кіеўскі княскі пасад быў навязаны Ўсяславу не ўласным жаданнем, а сілай абставінаў, якія ён максімальна выкарыстаў. У яго не было імкнення княжыць у Кіеве. Таму Ўсяслаў не надта жадаў абараняць горад у 1068 г. ад польска-рускага войска на чале з Ізяславам і Баляславам Харобрым. Уначы полацкі князь пакінуў кіеўскае войска і вярнуўся дадому на Полаччыну. Летапісец ніякім чынам не каментуе ўчынку Ўсяслава, не гаворыць і пра матывы ўцёкаў. Аднак іх няцяжка ўявіць, ведаючы ягоны характар і мэты ягонай новай палітыкі. Дакладнае прачытанне і цытаванне летапіснага паведамлення пра супрацьстаянне Ўсяслава і Ізяслава пад Белгарадам у 1068 г. зрабіла полацкага князя на старонках навуковых працаў пераважнай большасці гісторыкаў баязліўцам. Толькі ці так гэта? Усяслаў не пажадаў уцягвацца ў вайну за кіеўскі княскі пасад. Мэтай ягонай палітыкі было не авалоданне гэтым пасадам, а супрацьстаянне аб'яднальнай палітыцы Яраславічаў. Уцякаючы ў родны Полацак, ён ведаў, што за час свайго побыту ў Кіеве ён зрабіў

усё, што яму патрэбна: пасварыў Яраславічаў, аслабіў іх і тым самым узмацніў сябе і сваё княства. Аддаючы кіеўскі пасад Ізяславу, Усяслаў спадзяваўся, што той, атрымаўшы зноў уладу, пажадае пазней вярнуць сабе і сваім сынам належнае ім паводле старшынства - менавіта ягоныя землі, атрыманыя Святаславам і Ўсеваладам ад Усяслава. Далейшыя падзеі пацвердзілі разлікі Ўсяслава.

У 1069 г. Ізяслаў Яраславіч, з дапамогай польскіх войскаў, выгнаў Усяслава з Полацку, і на беларускіх землях усталявалася акупацыйная ўлада сыноў Ізяслава Яраславіча і польскай князёўны Гертруды - дачкі Мешкі II, цёткі Баляслава II Харобрага. *«В лето 6577 (1069 г.). ...и седе Изяславъ на столе своемъ, месяца мая въ 2 день. И распуща ляхы на покормъ, и избиваху ляхы отай; и възвратися в ляхы Болеславъ, в землю свою. Изяславъ же... прогна Всеслава ис Полотьска, посади сына своего Мъстислава Полотеске; он же вскоре умре ту. И посади в него место брата его Святополка, Всеславу же бежавшю».* Але з Ізяславам мы не бачым ягоных родных братоў Святаслава і Ўсевалада. Яны хутчэй за ўсё выбралі тактыку чакання, дадзеных ім Усяславам земляў яны старэйшаму брату не вярталі і сваіх войскаў у дапамогу не пасылалі.

Полацкі князь не меў дастаткова сілаў, каб пазмагацца за родны горад, і ён быў вымушаны падацца на эміграцыю, да прыбалтыйскіх народаў. Ужо ўвосень 1069 г. Усяслаў Брачыславіч апынуўся пад сценамі Ноўгараду на чале фінскага племені водзь. Пра гэта ўзгадвае Наўгародскі летапіс старэйшага і малодшага зводу: *«Въ то же лето, осень, месяця октября въ 23, на святого Якова брата господня, въ пятничи, въ чяс 6 дни, опять приде Всеслав къ Новугороду; новгородци же поставиша пълъкъ противу ихъ, у Звериця на Къземли; и пособи богъ Глебу князю съ новгородци. О, велика бяше сеця Вожиномъ и паде ихъ бещисленое число; а самого князя отпустиша бога деля».* Паход быў няўдалы. Горш падрыхтаванае і ўзброенае войска водзі атрымала паразу, а князь Усяслаў трапіў у палон. Летапіснае паведамленне ставіць перад даследчыкамі шэраг пытанняў. Чаму Ўсяслаў апынуўся на чале войска паганскага племені водзь? Чаму наўгародцы адпусцілі полацкага князя з Богам, а не адпомсцілі за жорсткі напад у 1066 г.? Відаць,

энергічная натура полацкага князя не магла бяздзейнічаць. Выгнанне з Полацку супала з супрацьстаяннем фіна-вугорскіх народаў каланізацыйнай палітыцы Ноўгараду. І Ўсяслаў Брачыславіч, як спрактыкаваны ваяр, не адмовіўся ад кіравання сабраным войскам водзі. Складаней адказаць на другое пытанне.

Другі раз Усяслаў трапіў у палон да сваіх ворагаў, аднак наўгародскі князь Глеб, сын Святаслава Яраславіча, не перадаў яго ў рукі свайго дзядзькі Ізяслава, кіеўскага князя. Са шматлікіх версіяў найбольш пераканаўчай бачыцца думка А. Касарукава, што, вызваляючы Ўсяслава з палону, Глеб ведаў, што той абавязкова кінецца ў змаганне за свой Полацак. Гэтую мэту і пераследаваў наўгародскі князь, будучы зацікаўленым у аслабленні абодвух князёў-супернікаў. Не выключана, што была таксама заключана дамова паміж Ноўгарадам Вялікім, а канкрэтней - наўгародскім вечам, і полацкім князем Усяславам, аб ненападзе апошняга на Наўгародскую зямлю. І праўда, да сярэдзіны XII ст. летапісы не паведамляюць нам аб полацкіх выправах на паўночна-ўсходняга суседа.

Пасля перамогі над полацкім князем Яраславічы спрабуюць узмацніць уладу Кіева. Акупаваны Полацак знаходзіўся ў руках сыноў Ізяслава. У гэты час Ізяслаў Яраславіч перадаў свайму трэцяму сыну Яраполку Валынь, да якой былі далучаны Тураўская зямля і полацкі Менск. Амаль адначасова з паразай і выгнаннем Усяслава з Полацку пад уладу Яраславічаў вяртаецца Смаленск, які мог быць захоплены полацкім князем. Пра гэта сведчыць другі паход Уладзіміра Манамаха на гэты горад разам з кіеўскім баярынам Стаўкам Гардзяцічам, зафіксаваны ў яго *itinerarium*. З дадзенага моманту Смаленшчына трапіла пад апеку Ўсевалада, наймалодшага з братоў Яраславічаў. Ноўгарад быў замацаваны, са згоды кіеўскага князя, за Глебам Святаславічам, сынам сярэдняга з братоў Яраславічаў. Таксама Святаслаў атрымаў Растоў разам з Белавозерам, інфармацыя аб чым паходзіць з трохі пазнейшых паведамленняў летапісу.

Прыгожым жэстам адзінства і братэрскай любові сярод сыноў Яраслава была кананізацыя «першых рускіх святых» Барыса і

Глеба ў траўні 1072 г., культ якіх павінен быў «асвяціць» уладу Яраславічаў і абараніць яе ад прэтэнзій іншых князёў. Праўда, ужо праз дзесяць месяцаў, у сакавіку 1073 г., Ізяслаў быў чарговы раз выгнаны з Кіева і не нейкім чужынцам, а сваімі роднымі братамі: *«В лето 6582 (1073). Въздвиже дьяволъ котору въ братьи сей Ярославичихъ. Бывши распри межи ими, быста съ собе Святославъ со Всеволодамъ на Изяслава. Изиде Изяславъ ис Кыева, Святослав же и Всеволодъ внидоста в Кыевъ, месяца марта 22, и седоста на столе на Берестовомъ, преступивша заповедь отню».* А далей летапісец папросту абвінавачвае ў гэтым Святаслава Чарнігаўскага, быцам ён *«бе начало выгнанью братню, желая большее власти»*, таму падгаварыў нявіннага Ўсевалада, застрашыўшы таемным саюзам Ізяслава з Усяславам Полацкім супраць іх. Менавіта адназначная ацэнка і абвінавачанне Святаслава з боку летапісца і выклікае сумненні ў верагоднасці паведамлення.

Беларускі даследчык Юры Заяц звярнуў увагу на тое, што праціўнікі Ўсяслава, Яраславічы, на старонках летапісаў выступалі адзіным фронтам супраць полацкага князя, аднак пачуццё варожасці да яго было розным. Не без падстаў Ю. Заяц вылучае асобу Ўсевалада на месца «галоўнага ворага» Ўсяслава, трапна адзначаючы, што «скрозь вобраз сціплага, праўдалюбнага і трохі слабахарактарнага Ўсевалада, створанага і адрэдагаванага ягонымі нашчадкамі, праступаюць рысы падступнага ўладалюба, які імкнецца на вялікакняскі пасад, жадаючы замацаваць яго толькі за сваёй сямейнай галіной». Гэтае назіранне выразна падмацоўваецца паводзінамі Ўсевалада і далейшымі падзеямі. З ягонага асяроддзя выходзіць фальсіфікат «Запавет Яраслава», у якім ён як адзіны ўлюбёны сын атрымаў права быць пахаваным каля бацькі. Пазней рэдактар «Аповесці мінулых часоў» ігумен Выдубіцкага манастыра Св. Міхаіла, закладзенага Ўсеваладам як родавы, Сільвестр, свядома пакінуў у летапісе паведамленне, што Ўсевалад разам з Святаславам занялі кіеўскі пасад у 1073 г. У 1076 г. Усевалад загадаў пахаваць Святаслава ў Чарнігаве, а не ў Кіеве, падкрэсліўшы пэўную незаконнасць заняцця кіеўскага пасаду апошнім. Дарэчы, ён не спяшаўся вярнуць Кіеў свайму старэйшаму брату Ізяславу, нават выступіў супраць яго з войскам. Аднак, у рэшце рэшт саступіўшы, здабыў для сябе

Чарнігаў, пазбавіўшы сыноў Святаслава бацькоўскага ўдзелу.

На два гады, з 1069 па 1071, Усяслаў знікае са старонак летапісаў. Недзе сярод прыбалтыйскіх народаў, адносна недалёка ад радзімы, ён назапашваў вайсковыя сілы, каб вярнуцца ў родны Полацак. Гэты шчаслівы момант настаў у 1071 годзе. *«В се же лето выгна Всеславъ Святополка ис Полотьска».* Першым захадам Усяслава пасля вяртання ў Полацак была спроба вярнуць паўднёвыя тэрыторыі свайго княства з цэнтрам у Менску, аднавіць і ўзмацніць полацка-кіеўскую мяжу. Гэта падштурхнула Ўсяслава ў 1071 г. выступіць супраць Яраполка. Праўда, паход быў няўдалы. Пад Галацічаскам (на паўднёвы ўсход ад Менску) полацкі князь быў пераможаны Яраполкам. Пасля гэтага для Полацкай зямлі настаў сямігадовы спакой.

Пасля асталявання ў Полацку Ўсяслаў Брачыславіч далей працягваў палітыку раз'яднання Яраславічаў, каб не даць ім чарговай магчымасці ўзмацніцца. Ад адкрытага ваеннага змагання ён перайшоў да дыпламатычных сродкаў. Усяслаў спрабаваў наладзіць адпаведныя кантакты з кіеўскім князем Ізяславам Яраславічам. На гэта ўскосна паказваюць словы, прыпісаныя летапісцам Святаславу Яраславічу пад 1073 годам. *«Святослав же бе начало выгнанью братню, желая болшее власти; Всеволода бо прелсти, глаголя, яко «Изяславъ сватится со Всеславомъ, мысля на наю; да аще его не вариве, имать на прогнати».* Полацка-кіеўскі саюз скончыўся няўдала перш за ўсё для Ізяслава. У тым жа 1073 г. браты выгналі яго з Кіева, і вялікім князем зрабіўся Святаслаў Яраславіч Чарнігаўскі. Не выключана, што саюз Усяслава з Ізяславам быў звяном вялікай гульні, з мэтай авалодання кіеўскім пасадам Святаславам і мірнага існавання Ўсяслава ў Полацку. Дзеля бяскроўнага адхілення старэйшага брата ад улады той звярнуўся да Ўсяслава. Полацкі князь прапанаваў дамову Ізяславу, пра якую паведаміў Святаславу. Выяўленне патаемнага паразумення з «галоўным ворагам» Яраславічаў стала прычынай змены ўлады ў Кіеве і чарговай значнай стратэгічнай перамогай Усяслава. І зноў на чатыры гады Полацкае княства знікае са старонак кіеўскага і наўгародскага летапісання. Гэта яскравае сведчанне таго, што ў гады княжання Святаслава не адбывалася ваенных

канфліктаў паміж Полацкам і Кіевам, а ён не меў прэтэнзій да Ўсяслава.

Сітуацыя кардынальна змянілася на другім этапе (1077-1085 гг.) супрацьстаяння Полацкай зямлі на чале з Усяславам Кіеву. Пасля смерці ў 1076 г. Святаслава Яраславіча на першы план выйшаў ягоны малодшы брат Усевалад, які быў вялікім кіеўскім князем у 1077 і 1078-1093 гг. Нават кароткатэрміновая ўмова са старэйшым братам Ізяславам хутчэй пацвярджае дадзенае назіранне. Бо хто як не Ізяслаў столькі разоў нацярпеўся ад Усяслава. Менавіта Ўсевалад і ягоны сын Уладзімір Манамах былі ініцыятарамі новага абвастрэння адносінаў з Полацкам. Падпарадкаваць апошні Кіеву, за кошт яго пашыряць свае тэрыторыі, а калі не, дык сплюндраваць і аслабіць Полацкую зямлю і ейнага князя - вось мэты іхнае імперскае палітыкі. Кідаецца ў вочы, што вайсковыя выправы паўднёварускіх князёў на Полацкую зямлю вылучаліся лютасцю на фоне звычайных тагачасных ваенных кампаній. Улетку 1077 г. Усевалад разам з Уладзімірам Манамахам здзейснілі паход на Полацак; зімою 1077-1078 гг. - новы паход Манамаха разам з наўгародскім князем Святаполкам Ізяславічам на Полацкую зямлю: *«Ожьгъше Полтескъ; онъ иде Новугороду, а я с половци на Одрьск, воюя».* Гэтым разам Яраславічы ўпершыню выкарысталі ў міжусобнай барацьбе агульнаславянскіх ворагаў - полаўцаў. У 1078 г. адбыўся напад Усяслава на Смаленск і адказ Кіева, падчас якога былі знішчаны гарады Полаччыны ад Лукомлю да Лагойску і ад Лагойску да Друцку: *«Пожегъ землю и повоевавъ до Лукамля и до Логожьска. Та на Дрьютьскъ воюя».* Нарэшце, 1085 г. - поўнае знішчэнне Ўладзімірам Манамахам Менску: *«И на ту осень идохом с черниговцы, и с половцы, с четеевичи к Менску; изъехахом город не оставихом у него ни челядина, ни скотины».*

А што Ўсяслаў? Па магчымасці ён бараніў сваю зямлю, часам атакаваў суседнія варожыя тэрыторыі, як у 1078 г. Смаленск ці трэці раз Ноўгарад. Але больш увагі полацкі князь надаваў унутранай палітыцы: адбудоўванню знішчаных гарадоў, умацаванню ўлады над падпарадкаванымі суседнімі балцкімі і фінскімі народамі ды вонкавых межаў сваёй дзяржавы. Шмат увагі Ўсяслаў надаваў выхаванню сваіх сыноў, а было іх у яго

шасцёра: Давыд, Барыс-Рагвалод, Глеб, Раман, Расціслаў і Святаслаў-Георгі. Нягледзячы на вялікія намаганні Ўсевалада, падпарадкавання Полацкага княства Кіеву не адбылося. Перашкодай сталі ўнутрыдынастычная барацьба сярод нашчадкаў Яраславічаў у Рускай зямлі, у першую чаргу паміж Усеваладам і пляменнікамі - дзецьмі Святаслава Алегам ды Раманам і сынам Ізяслава Яраполкам. Не трэба скідваць з рахункаў ваенны і гаспадарчы патэнцыял самога Полацкага княства. Вось жа, пасля менскага паходу 1085 г. інфармацыя пра Полацкае княства і ягонага князя зноў на доўгія гады знікае са старонак летапісаў.

Смерць Усевалада Яраславіча 13 красавіка 1093 г. азначала на тэрыторыі Русі змену генерацый у асяроддзі кіроўнага клану. Наперад выходзяць унукі Яраслава - Святаполк Ізяславіч, трое Святаславічаў - Давыд, Алег і Яраслаў, а таксама Ўладзімір Манамах. І зноў няма спакою на Русі. Нягледзячы на тое, што Ўладзімір Манамах свядома саступіў Кіеў пасля смерці свайго бацькі Святаполку Ізяславічу, паміж унукамі Яраслава пачалася вайна. Асабліва вострымі былі сутычкі Алега Святаславіча з Уладзімірам Манамахам і ягонымі сынамі спачатку за Чарнігаў, а пазней за Растоў, Суздаль і Мурам. Менавіта дадзены канфлікт паслужыў галоўнай прычынай склікання Любецкага з'езду ў 1097 годзе.

У ранейшай гістарыяграфіі, зыходзячы з пазіцый адзінай старажытнарускай дзяржавы і кіевацэнтрызму, дадзены з'езд разглядаўся як падзея, што юрыдычна замацавала падзел Русі на вотчыны паміж трыма галінамі Яраславічаў, змяніла папярэднюю сістэму родавага сюзэрэнітэту на васальна-бенефіцыяльную і паклала пачатак памяншэнню палітычнай ролі Кіева як сталіцы адзінай дзяржавы. На думку С. Франкліна і Дж. Шэпарда, Любецкае пагадненне, як і «Запавет Яраслава», было хутчэй дакументам, разлічаным на свой час, чым генеральным рашэннем. Яно ўяўляла сабою простую дамову, а не палітычны трактат. Больш за тое, Любецкі з'езд з'явіўся рэакцыяй на крывавае сутыкненне інтарэсаў і прэтэнзій унутры клану, а не руціннай ратыфікацыяй стандартных правілаў пераходу ў спадчыну пасаду. І яшчэ. Рашэнні Любецкага з'езду пашыраліся на тэрыторыі, ахопленыя ўладай нашчадкаў

Яраслава Ўладзіміравіча, і не датычыліся толькі аднаго княства - Полацкага.

Полацкі князь Усяслаў Брачыславіч не пажадаў удзельнічаць у Любецкім княскім з'ездзе Яраславічаў. Па-першае, Полацкаму князю, у адрозненне ад іншых, не было неабходнасці што-небудзь дзяліць альбо з кім-небудзь дзяліцца, даўно будучы суверэнным у дачыненні да Кіева. Па-другое, Усяслаў не меў ніякіх дынастычных альбо палітычных прэтэнзій на кіеўскі пасад. Па-трэцяе, размова на Любецкім з'ездзе датычылася ўладальніцкіх праблемаў значна маладзейшых за Ўсяслава прадстаўнікоў «дынастыі Яраславічаў». Агучаны і замацаваны ў Любечы прынцып уладарання *«каждо да держить отчину свою»* быў навацыяй для нашчадкаў Яраслава Ўладзіміравіча. Бо традыцыя перадачы княскага пасаду ад бацькі сыну ў Полацкім княстве існавала ўжо ад 1001 г. - амаль сто гадоў. І гэта быў галоўны вынік шматгадовай і цяжкой палітычнай і ваеннай барацьбы Полацку супраць Дняпроўскай Русі з цэнтрам у Кіеве, якая на старонках летапісаў персаніфікавалася ў вайну паміж Усяславам Брачыславічам, з аднаго боку, і сынамі ды ўнукамі Яраслава Ўладзіміравіча - з другога.

Смерць Усяслава Брачыславіча ў 1101 г. прынесла палёгку варожым Полацку сілам - нашчадкам Яраслава, якія панавалі ў суседніх з ім княствах і Ноўгарадзе. Полацкая зямля, падзеленая паміж сынамі Ўсяслава на ўдзелы, уяўляла ўжо меншую пагрозу для Кіева і Ноўгараду. А канчаткова полацкая пагроза знікла ў перыяд ад захопу Ўладзімірам Манамахам Глеба Ўсяславіча Менскага і ягонай смерці ў 1119 г. да высылкі часткі полацкіх князёў у 1129 г. у Візантыю Мсціславам Уладзіміравічам.

Ліквідаваўшы Полацак як канкурэнта на палітычнай мапе Ўсходняй Еўропы, нашчадкі Яраслава не змаглі вынішчыць вобразу Ўсяслава Брачыславіча з памяці кіяўлянаў і наўгародцаў. Яшчэ ў 1147 г. падчас бунту ў Кіеве супраць князя Ўсевалада Алегавіча Чарнігаўскага *«кияне же рекоша рад оже ны Богъ тебе избавилъ от великия льсти братю нашю идемъ по тобе и с детми акоже хощеши. И реч единъ человекъ по князи своемъ: рад идемъ, но первое о семъ промыслимы акоже и преж*

створиша при Изяславе Ярославличе высекше Всеслава ис пороуба злии они и поставили князя собе и много зла быс про то градоу нашему». У 1178 г. летапісец тлумачыць паход Мсціслава Расціславіча з наўгародцамі на Полацкага князя Ўсяслава тым, што *«ходилъ бо бяше дедъ его на Новъгородъ и взялъ ерусалимъ церковныи и сосоуды слоужебные и погостъ одинъ завелъ».*

Адзначаная намі на пачатку тэксту супярэчлівасць ацэнак учынкаў і дзейнасці полацкага князя Ўсяслава сярод сучаснікаў, зафіксаваная ў крыніцах, захавалася і нават замацавалася ў сучаснай гістарыяграфіі. З пункту гледжання існавання адзінай «Старажытнай Русі» альбо «ўсходнеславянскага братэрства», Усяслаў - сепаратыст, які імкнуўся зламаць усталяваную сацыяльна-палітычную і гаспадарчую сістэму гэтай дзяржавы і пашырыць свае тэрыторыі коштам захопу новых земляў у суседзяў. Такімі ж сепаратыстамі ў 2-й палове XI ст. выглядаюць Расціслаў Уладзіміравіч, унук Яраслава Мудрага, наўгародскі, а пазней цьмутараканскі князь; пасля смерці кіеўскага князя Святаслава Яраславіча ў 1076 г. - ягоныя дзеці Раман і Алег; смаленскі князь Барыс, сын Вячаслава Яраславіча; сын Ізяслава Яраполк, валынскі князь; Расціславічы - Васілька і Валадар. Аднак з пазіцый палачанаў, насельніцтва Полацкай зямлі, Усяслаў Брачыславіч быў адзіным гарантам іх самастойнасці і абаронцам ад ворагаў - як пазней, у XII ст., былі Святаславічы для чарнігаўцаў, Юры Даўгарукі і ягоныя нашчадкі - для ўладзімірцаў і суздальцаў, а Расціслаў Мсціславіч - для Смаленскага княства.

За Ўсяслава Брачыславіча Полацкая зямля канчаткова ператварылася ў самастойную раннесярэднявечную дзяржаву, якая характарызавалася наяўнасцю ўсіх неабходных атрыбутаў і палітычных інструментаў: стабільнай тэрыторыі, найвышэйшай улады ў асобе князя, уласнай дынастычнай лініі, апаратаў прымусу і ідэалогіі, рэлігійнай арганізацыі і ўзброеных сіл. Гэта ўсё дазваляла Полацкаму князю праводзіць незалежную ад якога-небудзь цэнтру вонкавую і ўнутраную палітыку. Частыя і зацятыя ваенныя сутыкненні з суседзямі сведчылі пра магутны эканамічны і ваенны патэнцыял гэтай

дзяржавы. І, мусіць, мелі рацыю тыя, хто пісаў, што галоўнай мэтай жыцця Ўсяслава было аб'яднанне вакол Полацку ўсіх крывічоў, якія пазней часткова трапілі пад уладу Ноўгараду (Пскоў) і Смаленску. На стварэнне крывіцкай дзяржавы былі накіраваны талент, энергія і жыццёвае прызначэнне Полацкага князя Ўсяслава Брачыславіча.

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/5
[image]

Пётр Рудкоўскі ОП Пагоня за духамі ды ідэямі Рэфлексія над некаторымі тэндэнцыямі ў беларускай грамадскай філасофіі

ПЁТР РУДКОЎСКІ ОП
(нар. у 1978, мястэчка Канвэлішкі, Гарадзеншчына) - студэнт 5 курсу тэалёгіі (Філязофска-тэалягічны калегіюм дамініканцаў у Кракаве) і, паралельна, 4-га курсу філязофіі (Ягеленскі ўнівэрсытэт). У 2000 г. уступіў у дамініканскі ордэн. Тэма магістарскай дысэртацыі па тэалёгіі - «Ідэя адкрытага грамадзтва з

Лацінскае слова *re-flexio* дакладна значыць ад-хіленне, ад-гіб. Мая рэфлексія сапраўды будзе ў нейкім сэнсе адхіленнем. Але - насуперак этымалогіі - будзе таксама «вы-хіленнем», высоўваннем (=правакацыяй), бо паасобныя дыскурсы ідыёмы я буду трактаваць неаднолькава.

* * *

Дадзеная ў гэтым артыкуле экземпліфікацыя павінна быць дастатковай, каб паказаць наяўнасць у беларускай наасферы двух тыпаў філасофіяў. Першы тып называю *энергічнымі філасофіямі.* Яны характарызуюцца ідэйнасцю, абстрактнасцю, візіянерствам, насычаны маральнымі ўказаннямі, у іх пераважае эматыўна-апелятыўная мова. Станоўчае значэнне гэтага тыпу філасофіяў палягае ў *экзістэнцыяльнай* функцыі, бо

ў іх адбываецца выражэнне навонкі ўнутранага пратэсту адносна дадзенай рэчаіснасці, а таксама ў *правакацыйнай* функцыі, бо гэтыя філасофіі з'яўляюцца выклікам для палітыкаў і інтэлектуалаў, стымулююць перагляд дэструктыўных прынцыпаў (або адсутнасці прынцыпаў) грамадска-палітычнага жыцця. Аднак непакоіць у гэткіх філасофіях наяўнасць «тэрапеўтычнага« праекту, які вельмі часта прадыктаваны візіяй, што не сканфрантавана з эмпірыяй і ігнаруе сацыяльных канцэпцыі палітычнай інжынерыі.

Процілегласцю энергічных філасофіяў з'яўляецца *крытычная філасофія.* Яна характарызуецца большай метадалагічнай свядомасцю, больш засяроджана на аналізе фактаў і сацыяльных з'яваў, у ёй пераважае апісальна-аргументацыйная мова. Гэтая філасофія больш асцярожная ў фармуляванні ўказанняў і рысаванні праектаў будучыні, яна ўсведамляе схільнасць чалавека памыляцца нават на этапе апісання, таму прызнае неабходнасць крытыцызму і публічных дэбатаў, адкідвае *тэзіс аб наканаванні* грамадства ці нацыі.

Я не выпадкова гавару аб энергічных філасофіях у множным ліку, а аб крытычнай - у адзіночным. Хочучы акрэсліць іншымі словамі энергічныя філасофіі, можна было б назваць іх *прыватнымі філасофіямі.* Прыватнымі не таму, што іх уздзеянне заканчваецца на прыватнай асобе - наадварот, праз свой радыкалізм і сугестыўнасць яны лягчэй і хутчэй могуць захапіць сэрцы шырокіх грамадскіх колаў і стаць выдатным ідэалагічным інструментам аўтарытарнай дзяржавы. Яны маюць прыватны характар з пункту гледжання *спосабу* філасафавання: яны не разлічаны на крытычнага адрасата. У энергічных філасофіях на першы план высоўваецца загад неадкладнага ажыццяўлення заключанага ў іх цэльнага праекту, яны не дапускаюць магчымасці крытычнай рэфлексіі над іх тэзісамі і спасылкамі.

Калі я назваў энергічныя філасофіі прыватнымі, то цяпер крытычную філасофію трэба было б назваць... *агульнай* філасофіяй!? Не, гэта не зусім трапнае акрэсленне. Тут, бадай, я згаджаюся з Ліятаравай крытыкай грамадскіх метанарацыяў і непрыхільна стаўлюся да перспектывы стварэння чарговых

"Meritatis aplaudere" - прыналежнасць да Ордэну праведнікаў.

метафізічных сінтэзаў, нават калі гэта мелі б быць «неабавязковыя« сінтэзы, якія дапускаюць гетэрадоксію. Не ў гэтым палягае крытычная філасофія. Замест «агульная« выкарыстаю іншае, на першы погляд сінанімічнае слова - *сумесная.* Слова «су-мес-ны« ўказвае на наяўнасць супольнага месца, на якім можам спаткацца. Крытычная філасофія ёсць філасофія сумесная, бо ў ёй прысутнічае даволі ясная метадалагічная структура: крытычны філосаф усведамляе, што ягонае пазнанне *аспектнае*, таму сам дбае пра тое, каб у сваёй рэфлексіі «зрабіць месца« для іншага, адрознага гледзішча і іншае ацэнкі дадзенай з'явы, не дапускае ігнаравання эмпірыі і прынцыпаў логікі, не церпіць таксама сафізмату індукцыі (маніі абагульнення). Эмпірыя, інтэлектуальная дысцыпліна ды крытыцызм - гэта «супольныя месцы«, якія абумоўліваюць сумесную філасофію.

Частка першая

НАРАСТАННЕ ЭНЕРГІЧНЫХ ФІЛАСОФІЯЎ

Нарастанне гэтага тыпу філасофіяў не ёсць адмысловасцю беларускае наасферы. Сацыяльна-палітычныя змены, паскораны тэмп глабалізацыі, тэрарызм - усё гэта спрычыняецца да паўстання феномену, акрэсленага Тофлерам як «шок будучыні«, і спрыяе паўстанню і нарастанню энергічных філасофіяў у розных краінах і на розных кантынентах. Бадай што, рэнесанс славянафільства з'яўляецца тут найбольш яскравым прыкладам.

Заўважу толькі, што неспакойныя славяне не адны, хто прадукуе энергічныя філасофіі. Талерантная ды плюралістычная Паўночная Амерыка таксама мае сваіх прадстаўнікоў. Прывяду фрагмент палітычнай філасофіі *Новай хрысціянскай правіцы* (евангельскія хрысціяне) Пэта Робэртсана і Джона Эшкрафта:

Дзеля таго каб Хрыстос ізноў сышоў на зямлю, Ізраільская

дзяржава павінна справакаваць вайну, якая давядзе да знішчэння Ізраілю, а гэта прывядзе да апакаліпсісу і ўрэшце - да збаўлення ўсяго чалавечага роду.

Падобныя цытаты можна множыць. Філасофіі гэтага тыпу можна знайсці і ў правых, і ў левых, у вернікаў розных канфесіяў і няверуючых, у філосафаў-публіцыстаў ды ў філосафаў-навукоўцаў.

ПРЫВІД НАЦЫЯНАЛІЗМУ (ДЫСКУСІЯ З Л. ЛЫЧОМ)

Нацыяналізм у Беларусі называю *прывідам*, бо ён не такі кідкі й выразны і не мае столькі прыхільнікаў, як у Літве, Украіне ці Польшчы. Нацыяналізм у Беларусі таксама менш агрэсіўны, а варожасць беларускіх нацыяналістаў да суседніх народаў непараўнальна меншая, чым варожасць да прарасейскай і русіфікатарскай дзяржаўнай улады. Тым не менш, гэты прывід то тут, то там з'яўляецца, гэтую здань не так лёгка распазнаць і адрозніць ад шляхетнай любві да свайго народу, гэта таксама відзьмо, з якім не так лёгка змагацца. Справа ў тым, што ў дадзенай сітуацыі, калі сімвалы беларускага народу забаронены, беларуская мова раз-пораз дыскрымінуецца, а над Рэспублікай Беларусь пастаянна вісіць пагроза ганебнай (бо «добраахвотнай«) анексіі Расеяй, лічу, што неабходна вылучыць спецыфічную абаронную паставу, якую можна назваць *сітуацыйным нацыяналізмам.* Палягае ён у павышанай нацыянальнай адчувальнасці, якую не толькі можна зразумець у псіхалагічным плане, але якая мае таксама свой маральны сэнс. Нацыяналізм сітуацыйны не абапіраецца на нацыянальны містыцызм і пагарду да *іншых*, ён ёсць прапарцыянальнай рэакцыяй на пагрозу рэальным каштоўнасцям, такім, як суверэнітэт, свабода, мова, культура і беларускі этас.

Валер Булгакаў кажа пра Беларусь як пра *незакончаны нацыянальны праект*. Шуканне сімвалаў і нарацыяў, якія дапамаглі б адбудаваць беларускую супольнасць, г. зн.

свойскае асяроддзе самастойнай рэалізацыі агульначалавечых ідэалаў, надалей з'яўляецца сур'ёзным выклікам і заданнем.

Можна і трэба згадзіцца з Булгакавым наконт патрэбы працягваць рэалізацыю беларускага нацыянальнага праекту (у другой частцы маю намер прывесці агляд аднае версіі такога праекту), але ўсё ж трэба заўважыць, што існуюць ідэалогіі, якія, *па-першае*, выступаюць з праектам нацыяналістычным, па-другое, гэты праект спрабуюць падаць як гістарычнае наканаванне. Назаву гэта *нацыяналізмам прынцыповым* і цяпер хачу прывесці ды прааналізаваць адну з яго версій.

Прафесар Леанід Лыч, гісторык і культуролаг, апублікаваў колісь у тыднёвіку «Літаратура і мастацтва« (14 і 21 лістапада 1997 году) даволі ёмісты артыкул пад назовам «Нацыяналізм«. Тэкст, скіраваны на абарону і падмацаванне беларускага нацыяналізму, пачынаецца заўвагай «І тут у нас, як не ў людзей« (гэта загаловак першага пункту артыкулу). Маецца на ўвазе, вядома ж, адсутнасць у беларускай гісторыі яскравага, культываванага дзяржавай нацыяналізму. Лыч указвае на сучасны ўзровень грамадска-культурнага жыцця беларускага народу і называе рэальныя і, без сумневу, балючыя факты: вынікі травеньскага рэферэндуму 1995 году, адсутнасць сярэдняй прафесійнай і вышэйшай навучальнай установы, у якой вялося б выкладанне выключна на беларускай мове, нацыянальную абыякавасць беларусаў і г. д. Лыч фармулюе філасофскі, а дакладней, гістарыясофскі тэзіс, які з'яўляецца ніццю, што цягнецца праз увесь артыкул:

І ўсё гэта ад таго, што ён [беларускі народ], не ў прыклад абсалютнай большасці еўрапейскіх народаў, не прайшоў сапраўднай школы нацыяналізму... Адсюль усе нашыя сённяшнія беды, адсюль наша дашчэнту здэфармаванае нацыянальна-культурнае жыццё. (…) Беларусы адносяцца да той жменькі еўрапейскіх народаў, якім па самых розных прычынах не ўдалося да канца прайсці стадыю нацыяналізму.

Спадар Лыч піша, што «беларускі народ не прайшоў *сапраўднай* школы нацыяналізму«, які неабходны для развіцця. Гэта

значыць, аўтар не сцвярджае, што магчымасць развіцця ўвогуле страчана, яна толькі занядбана. На яго думку, яшчэ ўсё можна выправіць, і менавіта таму ўзнікае прапанова стварыць тэарэтычны падмурак для нацыяналізму, бо Лыч верыць, што нават калі *гэтае* пакаленне не зрэалізуе праграмы нацыяналізму, то, несумненна, будучыя пакаленні, як больш асвечаныя і адказныя, пачнуць дбаць, каб у беларускай дзяржаве панавала нацыяналістычная дактрына і палітыка. Паколькі рэфлексія Лыча змяшчае вельмі практычны заклік, то трэба з асаблівай ўвагай і сур'ёзна прааналізаваць змест гэтага закліку.

Аказваецца, не трэба нічога выдумляць ці адкрываць: «Прыклад паказвалі суседзі«, - кажа спадар Лыч, і гэтыя словы адначасна ўтвараюць загаловак другога пункту нацыяналістычнага дыскурсу. Цікава, *што гэта за прыклад*.

Прыкладам для Лыча ёсць расейскі тэарэтык нацыяналізму, дзекабрыст Павел Песцель. Тое, на што Лыч звяртае асаблівую ўвагу, - гэта рашучая воля дзекабрыста знішчыць у расейскай дзяржаве ўсялякія нацыянальныя рысы нерасейскіх этнічных групаў. Лыч цытуе Песцеля:

А таму лепш і карысней будзе для іх саміх, калі яны злучацца духам і грамадствам з вялікай дзяржавай і зусім з'яднаюць сваю народнасць з народнасцю пануючага народу, складаючы з ім толькі адзін народ і спыняючыся дарэмна марыць пра справу немагчымую і неажыццяўляльную.

Песцель - падкрэслівае прафесар Лыч - *«прапаноўваў знішчыць мовы, а нават імёны народаў і плямёнаў Расіі«*, каб яна не нагадвала поліэтнічнай краіны. Крыху далей, быццам захоплены зацятасцю і паслядоўнасцю блізкага яму ідэйна расейца, Лыч піша:

Цывілізаванаму чалавеку не проста зразумець такой сквапнасці на інтарэсы чужых народаў, жаданне сцерці іх з этнічнай карты зямлі, за што выступаў П. Песцель.

З перакананнем у слушнасці - як гэта вынікае з кантэксту - Лыч цытуе іншага расейскага ідэолага нацыяналізму, П. Кавалеўскага:

Лепш невуцтва, сагрэтае любоўю да радзімы, чым адукацыя, звязаная з пагардай і непавагай да нацыі.

«Разумеецца, да нацыі сваёй«, - на ўсякі выпадак удакладняе Лыч. Крыху далей ён скіроўвае маральную заўвагу ў бок палітыкаў:

Зусім не шкодзіла б сучасным беларускім палітыкам і блізкім да іх ідэолагам азнаёміцца з тым, як расійскія нацыяналісты разумелі ролю самой дзяржавы ва ўсталяванні нацыяналізму ў грамадстве.

З кім канкрэтна Лыч раіць пазнаёміцца? А вось, з Пятром Струвэ: *«...дзяржава і нацыя павінны арганічна зліцца«,* а таксама з цытаваным ужо Кавалеўскім: *«Усялякая дзяржава жывая і дзеючая павінна быць поўнай нацыяналізмам. Гэта яе душа. Гэта яе сутнасць. Гэта яе жыццё. Касмапалітычная дзяржава - аморфная, бясформная маса«.*

Артыкул Лыча, хоць на першы погляд робіць уражанне філасофскае рэфлексіі, - тэкст павярхоўны і некагерэнтны. Адносна дзекабрыста Песцеля, якога Лыч падае нам за прыклад, з'яўляецца раз зусім маргінальная, выражаная ў пабочным сказе, заўвага, што *«яго нацыяналізм не заўсёды быў разумным нацыяналізмам«.* Гэтае паняцце «нацыяналізм разумны« (або часам: «здаровы«) узнікае ў Лыча некалькі разоў, але ніяк нельга сцеміць, што значыць у яго гэтае паняцце. Ці рэпрэсіўная праграма Песцеля адносна нерасейскіх этнічных групаў з'яўляецца - паводле Лыча - праявай разумнага нацыяналізму? Мабыць, так, бо ж прафесар зрабіў агляд гэтай праграмы зусім не для таго, каб яе пакрытыкаваць, а толькі каб паказаць цёмным беларусам, з каго тыя павінны браць прыклад.

Іншы прызнак недахопу паслядоўнасці - гэта незразумелая функцыя цытаты з Міхаіла Бакуніна:

Я патрабую толькі аднаго, каб усякаму народу, Літве, Курляндыі, Ліфляндыі, Беларусі з Смаленскам, Украіне з Кіевам былі цалкам дадзены магчымасць і права дзейнічаць па волі.

Гэты шляхетны пастулат Лыч пакідае без каментару (калі не лічыць за каментар сказ *«Бакунін інакш глядзеў на мінулае і сучаснае Беларусі«*), цяжка зразумець, якую функцыю ён выконвае ў дыскурсе прафесара. Падаецца, што тут маем справу з рэлятывізмам Лыча: пастулат Бакуніна тым добры, што сфармуляваны на карысць Беларусі, але таксама невыгодны, бо парушае раўнавагу ў нацыяналістычным дыскурсе. На падставе шырэйшага кантэксту можна зрабіць выснову, што лібералізм Бакуніна - гэта не тое, што Лыч мог бы пахваліць, бо крыху раней сцвярджае з непрыхаваным задавальненнем, што, нягледзячы на жорсткую расправу царызму над дзекабрыстамі, іхнія нацыяналістычныя ідэі «сталі магістральным напрамкам у правядзенні нацыянальнай палітыкі«. Нельга не заўважыць намёку на *плоднае пакутніцтва*, да якога можа прывесці спавяданне нацыяналістычных ідэалаў. Нацыяналізм такім чынам набывае ўжо рэлігійныя рысы.

У 4-м пункце аўтар цытуе аднаго расейца, які публікаваўся пад псеўданімам «Вл. С.« (гэта хутчэй за ўсё Ўладзімір Салаўёў) і вельмі крытычна ставіўся да нацыяналізму. Вл. С. лічыць:

*Паслядоўнага тэарэтычнага апраўдання нацыяналізм, як і ўсе адцягненыя пачаткі, не дапускае. Практычнае значэнне ён часткова мае як адзнака дурных народных (цэлага народу?! - **Л. Л.**) схільнасцяў, асабліва ў краінах са стракатым шматнародным насельніцтвам. Асновай некаторай папулярнасці, якой яшчэ карыстаецца нацыяналізм, ёсць памылковае яго змяшэнне з патрыятызмам.*

Што наконт гэтага Лыч? Відаць, што ягоная ўстаўка «цэлага народу?!« з'яўляецца выразам абурэння выказваннем расейскага крытыка нацыяналізму. Але ён знаходзіць тут выхад: інтэрпрэтуючы ўсіх расейскіх крытыкаў нацыяналізму ў стылі, характэрным для большасці філосафаў-прарокаў, якія прэтэндуюць на веданне таго, што схавана, спадар Лыч піша, што частка расейскай інтэлігенцыі, *«баючыся распаўсюджання гэтай з'явы* (нацыяналізму. - **П. Р.**) *сярод нерасійскіх народаў, не толькі не ўсхваляла, а, наадварот, усяляк прыніжала яе«.* Гэтак прафесар Лыч расправіўся з антынацыяналістычным выклікам Вл. С. (і, апасродкавана, Бакуніна) - няма чаго непакоіцца аргументамі супраць нацыяналізму, бо насамрэч гэта таксама схаваны нацыяналізм: частка расейскай інтэлігенцыі хоча папросту выбіць зброю з рук нерасейскіх народаў і толькі таму асуджае нацыяналізм!

У дадзеным артыкуле прадугледжаны нават пункт пад загалоўкам «Удакладняюцца фармулёўкі«. Для крытычнага чытача гэта даволі пажаданы фрагмент дыскурсу, бо да гэтага пункту тэкст змяшчаў толькі адзін больш-менш выразны тэзіс: нацыяналізм - гэта развіццё, а недахоп нацыяналізму - гэта не-развіццё. Акрамя таго, мы мелі некалькі эклектычна падабраных, не да канца павязаных між сабою цытатаў, якія павінны былі зрабіць відавочным развіццёвае значэнне нацыяналізму. І сапраўды, у гэтым пункце змешчана цытата Сяргея Вітэ (таксама расейца), якая, на першы погляд, з'яўляецца рэфлексійнай увагай для адрознення двух тыпаў нацыяналізму. Але насамрэч гэтая цытата нічога не ўдакладняе, бо дыстынктыўныя прыметы, пададзеныя Вітэ, настолькі няясныя і размытыя, што хутчэй робяць немагчымым паразуменне, чымся ўводзяць якую-кольвечы яснасць. Паводле Вітэ, *«ёсць нацыяналізм здаровы, перакананы, моцны, а таму не пужлівы...«* Што нам кажуць гэтыя «ўдакладненні«? «Здаровы« - гэта метафара, якая патрабуе далейшай інтэрпрэтацыі, а астатнія тры прызнакі (перакананы, моцны, не пужлівы) указваюць хіба што на пэўны эмацыянальны стан спавядальнікаў нацыяналістычнай веры. А можа, удакладненнем будзе ўказанне на мэту «здаровага нацыяналізму«: *«імкнецца да аховы плёну гістарычнага жыцця дзяржавы, здабытага крывёю і потам народу, і дасягае гэтай*

мэты« - але ж гэта не дыстынктыўная прымета, бо і «хворы нацыяналізм«, як кажа Вітэ, - да таго ж самага імкнецца, з тым адрозненнем, што гэты другі больш *«падпарадкоўваецца моцным пачуццям, чым розуму«* [1] .

Гэтай цытатай, без каментару і ніякіх увагаў, Лыч закрывае параграф, прысвечаны «ўдакладненням«. Як і дагэтуль, ніякіх яснасці, у чым палягае «здаровы (або разумны) нацыяналізм«, таму нічога дзіўнага, што гэткае нядбайнае «ўдакладненне« - ні да чога не абавязвае Лыча, і ў канцавым пункце, азагалоўленым «Час мяняць акцэнты«, прафесар зноў у настойліва прасоўвае «добры прыклад« расейскіх нацыяналістаў:

Найперш трэба, хоць і з вялікім спазненнем, выйсці на тую стадыю нацыяналізму, якую так гераічна і стойка адолеў расійскі народ, асабліва яго інтэлігенцыя, у канцы XIX - пачатку XX ст.

А далейшыя павучэнні-папярэджанні прафесара аж б'юць энергетызмам:

Будзе злачынствам... калі наша дзяржава, грамадскасць, найперш яго інтэлектуальныя сілы, не выкарыстаюць расійскі вопыт абароны і развіцця сваёй культуры і мовы.

Згаджаюся з тым, што трэба бараніць і развіваць сваю культуру і мову, але штосьці не даспадобы мне ўказаны Лычом «расейскі вопыт«, а менавіта праграма хабітуальнай дыскрымінацыі Песцеля, цемрашальства («сагрэтае любоўю да народу«) Кавалеўскага і містычны арганіцызм Струве, у чым я, гэтак як і Попэр, схільны бачыць таталітарныя імплікацыі.

А вось які пір хоча мець прафесар:

Час скеміць, што ва ўсіх сферах нашага культурна-моўнага жыцця расійскі, украінскі, польскі элементы - гэта не больш як дэсерт, а ежа ў ім павінна быць толькі беларуская.

[1] Крыху далей Вітэ дадаткова ўказвае на яшчэ адну рэку «хворага нацыяналізму«, якую можна палічыць тамсама дыстынктыўнай (але недастатковай): *«ён з'яўляецца праявай пачуццяў, апантаных прагай помсты і азартам«.*

Далей праз некалькі радкоў з'яўляецца вымова на адрас сённяшняй інтэлігенцыі і палітыкаў, бо яны *«імкнуцца весці беларускі народ у Еўропу не іх уласным, а нейкім чужым шляхам«.* Гэты падзел на «ўласны« і «не-ўласны« шлях, часта і ў розных кантэкстах стасаваны, з'яўляецца незразумелым падзелам, а ў выпадку Лыча ён і зусім не на месцы, бо на працягу ўсяго артыкулу ён нічога не рабіў, як толькі капіяваў ідэалогію расейскіх (часам нязначна таксама польскіх і французскіх) нацыяналістаў і спрабаваў захапіць ёю беларускую інтэлігенцыю і палітыкаў.

Каб аддаць даніну справядлівасці, трэба тут зрабіць пару заўвагаў. Па-першае, артыкул Лыча быў надрукаваны ў той час, калі паслядоўная лукашэнкаўская інтэграцыя Беларусі з Расеяй даводзіла да роспачы многіх прыхільнікаў свабоды і незалежнасці. Па-другое, прафесар Лыч у сваім артыкуле спрабуе таксама нагадаць пра беларусізацыю 20-х гадоў мінулага стагоддзя, якая ёсць, безумоўна, гістарычным выклікам для сучаснасці, спрабуе таксама павысіць адчувальнасць грамадскасці да ўспрыняцця ахвяраў сталінскіх рэпрэсій. Ніяк не адмаўляю наяўнасці ў прафесара шляхетных намераў, не сумняваюся таксама ў ягонай кампетэнтнасці ў галіне гісторыі культуры, але лічу, што маральнае змесціва аналізаванага артыкулу - *прынцыповы, праграмны нацыяналізм* - з'яўляецца безадказным і нявартым навукоўца крокам, а тэарэтычнае падмацаванне нацыяналізму амаль цалкам пазбаўлена - неадназначнасць і неакрэсленасць асноўных паняткаў, некагерэнтнасць і нацягненыя інтэрпрэтацыі - сутнаснае вартасці. Нават балючая свядомасць прыніжэння і прафанацыі беларускае спадчыны не можа быць апраўданнем для бескрытычнасці і негрунтоўнасці ў разважаннях.

Прывід нацыяналізму вісіць у паветры. Хоць цяпер ён не мае вялікае сілы і нам не падабаецца, бо ў любы момант гатовы запаланіць нават шляхетныя і светлыя розумы. Вось, напрыклад, спадар Юры Хадыка, чалавек высакародны і мужны, спрабуе апраўдаць нацыяналізм на базе Святога Пісання. Нацыяналізм, ён кажа, - *«гэта праява хрысціянскага светапогляду«,* бо *«Новы запавет не касуе і не асуджае*

культурнай, этнічнай і расавай разнастайнасці«. Апошняя заўвага цалкам слушная, але ад сцвярджэння згаданай разнастайнасці да нацыяналізму дарога вельмі доўгая. Калі ж мы дакладна прааналізуем «разнастайнасць« і «нацыяналізм«, давядзецца сцвердзіць, што ўвогуле няма паміж імі дарогі, якая іх злучае. (Вядома ж, трэба мець на ўвазе наяўнасць некалькіх адрозных разуменняў панятку «нацыяналізм«, і прынамсі адно адрозненне я запрапанаваў у гэтым артыкуле. Гаворачы пра нацыяналізм, часта прыходзіцца «сінкрэтычна« карыстацца гэтым тэрмінам. Я змагаюся з такім нацыяналізмам, у якім заўважаю наяўнасць *устойлівай дыскрымінацыі* ўсяго, што не распазнана як «сваё«, «нашае«, «нацыянальнае«.)

Упэўнены, што магчымы *нацыянальны ненацыяналістычны дыскурс.* А дыскусія з нацыяналістычным дыскурсам ускладняецца тым, што той, дыстанцуючыся ад рацыяналізму, свае пастулаты фармулюе безрэфлексійна. Адзін з нацыяналістаў пасунуўся аж да такога пастулату:

Галоўнае - не зрабіцца падобнымі да расейцаў, захаваць тыя нацыянальныя рысы, якія адрозніваюць нас ад іх, і найперш працавітасць, жаданне працаваць ад ранку да ночы [2] .

Калі я прачытаў гэтыя словы, не мог стрымацца ад наступнага такой глосы: «Паколькі я не ўпэўнены ў тым, ці сапраўды працавітасць будзе заўжды і ўсюды сцерагчы нас ад упадабнення да расейцаў, то мне падаецца, што найбольш эфектыўны спосаб не быць падобным да расейца - гэта ператварыцца ў малпу, сабаку або ў шчура. Бо калі сустрэнемся людзьмі, то нам пастаянна будзе пагражаць няшчасная выпадковасць - быць у нечым падобнымі да расейцаў, а пэўне, заўсёды знойдзецца такі расеец, каторы - хай яго ліха! - будзе мець нашы, тыповыя нашы нацыянальныя рысы!..«

2 Айсен Нікалаеў. Кадук-шка. Беларусафобія // ARCHE. 1999. № 1. С. 197.

АМБІВАЛЕНТНЫ ДУХ АБСАЛЮТНЫ (ДЫСКУСІЯ З М. КРУКОЎСКІМ)

Цяпер маю намер коратка паказаць пазіцыю і прааналізаваць змест філасофіі філосафа *ex professione* прафесара Міколы Крукоўскага. Буду абапірацца на два ягоныя тэксты: «Запаліць святло ў душах« [3] і «Беларускае адраджэнне і філасофія Гегеля« [4].

Намер прафесара Крукоўскага можна без іроніі назваць прарочым намерам. Як самі загалоўкі гавораць, мова ідзе пра тое, каб *запаліць святло* і *адрадзіць*. У якасці эпіграфу да першага артыкулу фігуруе цытата з пралогу да Дабравесці ад Яна (1:5): «А святло ў цемры свеціць, і цемра не агарнула яго».

Вельмі цешуся і выражаю салідарнасць з намерам спадара Крукоўскага (дарэчы, ягоны дыягназ духоўнага стану Беларусі сугучны з дыягназам Яна Паўла II датычна посткамуністычных краінаў: пасля падзення камунізму *«ўзнік духоўны вакуум, спаражнілася прастора»*). Пытанне ў тым, ці пагаджаемся мы з прапанаванай ім мастацкай, перакладчыцкай, літаратуразнаўчай, рэлігійнай, культурнай ды гаспадарча-палітычнай сітуацыяй ў Беларусі.

[3] Запаліць святло ў душах. Нёман, 1997, № 7, с. 3-13.

[4] Беларускае адраджэнне і філасофія Гегеля. Studia Philosophica. Warszawa, 1998.

Пачнем з таго, што ў Беларусі, пачынаючы з 1990-х гг., пераважае непаразуменне паўстае тады, калі сп. Крукоўскі пачынае прапаноўваць пэўны (ужо аднекуль вядомы) *метад разумення* сённяшняй драматычнай духоўна-культурнай ды гаспадарча-палітычнай сітуацыі ў Беларусі:

Лінія гістарычнага прагрэсу ідзе згодна са спіраллю, ці, калі спраектаваць спіраль на плоскасць, з нейкім падабенствам сінусоіды [5] .

Карл Попэр, напэўна, у гэты момант высунуў бы шэраг аргументаў, якія паказваюць «марнасць« *гістарыцызму*. Я таксама стаўлюся скептычна да гэтага перакананння, але гатовы ўсё ж прызнаць яго пэўную эўрыстычную вартасць. Часам можна - але толькі ў якасці эксперыменту - глянуць на паслядоўнасць *некаторых* падзеяў у аспекце спіральнага прагрэсу. Тым не менш матэматычнае распісванне ходу гісторыі ды яшчэ перакананне ў найвышэйшай праўдзівасці гэтага «адкрыцця« з'яўляецца заняткам падазроным з навуковага гледзішча. Тым часам прафесар працягвае:

[5] Запаліць… С. 3.

Гэтая апошняя канцэпцыя ўжо ў чыста лагічным аспекце найбольш адпавядае ісціне, бо ўяўляе сабою дыялектычнае адзінства, гегелеўскі сінтэз дзвюх папярэдніх канцэпцый, што выступаюць тут як тэзіс і антытэзіс, як крайнія пункты погляду [6].

«Дзве папярэднія канцэпцыі« - гэта тэзіс аб цыклічнасці ходу [6] Там жа.
гісторыі і «яго антытэзіс« - канцэпцыя паслядоўнага лінейнага прагрэсу. Але што значыць «чыста лагічны аспект«, і чаму, калі канцэпцыя 'х' «уяўляе сабою гегелеўскі сінтэз«, то яна «найбольш адпавядае ісціне«? Усе гэтыя чароўныя звароты патрабуюць нейкага тлумачэння і падмацавання, а пераконванне, што канцэпцыя, якая ўяўляе сабою гегелеўскі сінтэз, «найбольш адпавядае ісціне«, з'яўляецца папросту блюзнерскай эксплуатацыяй слова «ісціна« (варта ўзяць пад увагу тое, што «ісціна« мае вельмі моцнае, амаль рэлігійнае значэнне, ісціна - гэта фундамент і першапачатак духу чалавека, змест ісціны мае для сумлення абавязальнае значэнне).

Але прыняўшы - дзеля забавы - правілы гегелеўскае логікі, успрыму вышэй сфармуляванае Крукоўскім як *тэзіс* і сфармулюю свой *антытэзіс*: канцэпцыя цыклічнага ходу гісторыі - гэта забабон № 1, канцэпцыя лінейнага ходу - гэта забабон № 2, а сінтэз гэтых двух забабонаў утварае Адзін Вялікі Забабон. А паколькі змест майго антытэзісу таксама ўнутрана рэпрэзентуе гегелеўскі сінтэз, то дадам, што ён найбольш адпавядае ісціне...

Варта, аднак, зацеміць, да чаго прыходзіць у сваіх разважаннях філосаф. Вось жа, набліжаецца ён да... рэлігіі:

...яна адна толькі можа аб'яднаць абездухоўленае, амаль што збыдлелае насельніцтва, згуртаваўшы яго ў незалежны, моцны духам народ, як мы бачым тое, напрыклад, у Чачні, непарушна змацаваны ісламам.

Я таксама належу да беларускага насельнітва, але не лічу сябе збыдлелым і абездухоўленым, не лічу такім таксама спадара

Крукоўскага і многіх маіх знаёмых суайчыннікаў і нават не ўяўляю каго-кольвечы, каго назваў бы збыдлелым. У вышэй прыведзеным выказванні маем характэрную для многіх энергічных філасофіяў тэндэнцыю абапірацца на эмацыянальнае ўспрыманне рэчаіснасці і паэтычнае (метафарычнае) яе апісанне. Гэтая тэндэнцыя ў дадзены момант спалучаецца з яшчэ адной заганай, якая называецца *метадалагічным калектывізмам* - перакананнем, што можна фармуляваць цверджанні, якія за адным разам праўдзіва і адэкватна акрэсляць усю супольнасць людзей. Тым часам *рэальна* існуюць толькі паасобныя індывідуумы, а цверджанні адносна ўсёй супольнасці людзей могуць функцыянаваць або толькі як індукцыя, або як гіпатэтычнае цверджанне (якое чакае праверкі). Што датычыць чачэнскага народу, то салідарызуюся з ім і спачуваю яму, але ўсведамляю і тое, што яго *непарушная змацаванасць ісламам* часта азначае таксама - на жаль - фанатызм і тэрарызм. Не заўсёды чачэнцы перажываюць сваю рэлігію ў яе аўтэнтычным, *аб'яўленым* стане, г. зн. як вертыкальную рэлігію, часта іх рэлігія становіцца *гарызантальнай*, губляе сваё першапачатковае тэафанічнае вымярэнне і тады папросту кансалідуе людзей у адно моцнае і агрэсіўнае племя, якое моцнае тым, што рэлігія блакуе крытыцызм адносна супольных *табу* і замацоўвае магічнае ўспрыманне пануючага парадку. Таму трэба заўважыць, што часам рэлігія, стаўшы гарызантальнай і пазбаўленай адкрытасці на Нябачнага Бога, можа давесці хутчэй і эфектыўней да «збыдлення«. Тут будзе да месца афарызм: *Corruptio optimi pessime* - «Псаванне таго, што найлепшае, - рэч найгоршая«.

Таму амбівалентна ўспрымаю наступнае выказванне Крукоўскага:

Толькі рэлігія ў стане аднавіць у народзе цвёрдую веру ў чалавека і дабро, веру, якая, падобна безумоўнаму рэфлексу ў біялагічным індывідзе, змацоўвае сабою і стабілізуе сацыяльны арганізм...

Не пагаджаюся з разуменнем веры па аналогіі з *безумоўным рэфлексам*, гэта азначала б вяртанне да прымітыўнай,

племянной свядомасці, калі калектыўнае *табу* ўспрымаецца як закон прыроды, які нельга ані парушыць, ані змяніць. Якая-кольвечы вера павінна быць *не рэфлексам*, а *рэфлексіяй* (у гэтай гульні слоў відаць этымалагічная аманімія слова reflexio), а таксама *не безумоўнай*, а якраз *абумоўленай* такімі каштоўнасцямі, як праўда і дабро, што павінны безупынна пазнавацца і паглыбляцца.

Крукоўскі ў роздуме «Беларускае адраджэнне...« выражае шкадаванне з прычыны таго, што беларускія філосафы, адыходзячы ад марксізму, адышлі таксама ад філасофіі вялікага Гегеля, а тым часам

яго дыялектычнае мысленне, што б нам ні казалі цяперашнія філосафы-постмадэрністы або англічанін Карл Попэр, аказалася найвялікшым дасягненнем філасофіі ўсіх часоў і народаў.

Попэрава крытыка Гегеля, вядома ж, не догма, і ніхто не мае абавязку з ёю згаджацца, але мяне цікавіць, ці сп. Крукоўскі сапраўды пазнаёміўся з аргументамі Попэра і ці сапраўды іх асіліў. Нешта сумняваюся ў гэтым, бо Крукоўскі даволі бескрытычна і без спробы якога-небудзь падмацавання карыстаецца такімі катэгорыямі, як «дыялектыка«, «ідэальнае-рэальнае«, «верхні экстрэмум«. Акрамя таго, Попэр быў такім жа англічанінам, як і новазеландцам, бо і ў Англіі, і ў Новай Зеландыі жыў у розныя перыяды жыцця, а насамрэч ён быў аўстрыйцам.

Цікава гучыць абвінавачанне на адрас савецкіх марксістаў: яны захацелі, кажа Крукоўскі, затрымаць развіццё грамадства на этапе перавагі *«ідэальнага над рэальным, калектыўнага над асабовым* і *грамадства над асобаю«*. Філосаф цяпер папярэджвае нас пра магчымасць патрапіць у іншую крайнасць[7]. Гэтая заўвага ў нечым трапная, але, на маю думку, яе вартасць сапсавана: па-першае, ператварэннем гэтай заўвагі ў штыўную, «жалезную« формулу, выражаную на няясным і прэтэнцыёзным жаргоне Гегеля; па-другое, падаваннем гэтага як гістарычнага закону: гармонія ідэальнага і рэальнага (ды іншых «полюсаў«) - гэта быццам бы гістарычная наканаванасць.

Само пастуляванне згаданай гармоніі можа мець свой сэнс і грамадскую значнасць, але ў дадзеным выпадку даводзіцца ўспрымаць гэтую «гармонію« падазрона, бо Крукоўскі - і гэта па-трэцяе - у імя яе і ў імя «адухоўленай« філасофіі Гегеля забараняе іншыя філасофскія дыскурсы. Шчыра кажучы, я не даведваюся ад Крукоўскага, у чым заключаецца раўнавага (гармонія) ідэальнага і рэальнага, але даведваюся пра тое, што ў імя гэтай загадкавай гармоніі многія філасофскія плыні абвяшчаюцца «дэкадэнцкімі«, а значыць, шкоднымі для беларускага народу.

Менавіта новая, нацыянальная беларуская філасофія, а не прастытуіраваны марксісцка-ленінскі гістмат і не гнёзаруска салжаніцынскім выразе, жыжа заходняга дэструктыўна-абсурдысцкага постмадэрнізму, які з лёгкай рукі некаторых выхаванцаў філасофскага факультэту БДУ актыўна распаўсюджваецца цяпер у Беларусі, - менавіта беларуская нацыянальная філасофія павінна выпрацаваць і сістэматызаваць іерархічную сукупнасць ідэалаў, пачынаючы ад Бога і канчаючы законамі эканамічнага жыцця [8].

Крыху палохаюць гэтыя «новасць« і «нацыянальнасць« запаліць… прапанаванай Крукоўскім філасофіі. Марксісцка-ленінскі гістмат бадай што сапраўды не можа ўнесці нічога інтэлектуальна якаснага ў грамадскую філасофію, але не столькі з прычыны свайго зместу, колькі з таго, што мае даволі штыўны здагматызаваны характар і адсюль - мізэрную пазнавальна-выясняльную вартасць. Але марксізм-ленінізм - гэта адно, а марксізм-не-ленінізм - гэта другое, а сацыяльная філасофія самога Маркса - гэта зноў жа нешта іншае. Ці ўсё гэта мае быць так цалкам, татальна адкінута? Філасофіяў, названых «постмадэрнісцкімі«, таксама шмат, і яны вельмі разнастайныя - ці ўсе яны маюць, адным махам, «без суду і следства«, быць выключаны з публічных дэбатаў пра беларускае грамадска-палітычнае жыццё? У іншым месцы Крукоўскі падтрымлівае шпэнглераўскі дыягназ Захаду як *Untergang des Abendlandes* (што можна перакласці як «захад вячэрняе краіны« або/і «заняпад вячэрняе краіны«). «Захад« для абодвух (Крукоўскага і Шпэнглера) асацыюецца з заняпадам, і на грунце гэтай асацыяцыі (бо інакш невядома, на якой

7. Беларускае… С. 621.

8. 3 С. 14.

падставе) паўстае прароцтва: сучасная заходняя культура - гэта *«заканамерны вынік сыходнай фазы развіцця з яе характэрнымі для гэтай фазы рысамі паступовага нарастання бездухоўнасці і прагматычна-спажывецкага індывідуалізму«*[9]. А філасофія, як частка гэтай культуры, таксама характарызуецца бездухоўнасцю. З тэксту «Беларускае адраджэнне...« вынікае, што не толькі згаданыя гістмат і постмадэрнізм пагражаюць беларускаму адраджэнню, але і экзістэнцыялізм, і эмпірыцысцкія ўхілы трэба прызнаць упадніцкімі, таму, напэўна, усе варыянты неапазітывізму, крытычнага рацыяналізму і аналітычнай філасофіі, не кажучы ўжо пра прагматызм, павінны быць пазбаўлены права прысутнасці ў Беларусі.

Крукоўскі хоча абаперці палітыку ды эканоміку на Бога. Ізноў маю крайне змешаныя пачуцці. Паколькі веру ў Бога, для мяне вельмі важна шанаванне пэўных прынцыпаў, якімі варта кіравацца, гаворачы пра Бога. У дадзеным выпадку паўстае некалькі пытанняў: па-першае, ці Крукоўскі сапраўды мае на ўвазе Бога ці толькі пэўную акрэсленую *ідэю Бога*, г. зн. рэлігійна-палітычную формулу, да спавядання якой павінны быць абавязаны ўсе чальцы дадзенай супольнасці? Па-другое, ці гутарка тут ідзе пра Бога-Стваральніка, Айца ўсіх людзей, ці пра племяннога Бога, пра *божышча* беларускага народу? На практыцы гэта азначала б стварэнне ідэалогіі нацыянал-каталіцызму або нацыянал-праваслаўя: народ атаясамліваецца з Царквою, а дзяржава - з народам (г. зн. нацыянальная ідэалогія мае рэлігійны характар, дзяржава пільнуе артадоксіі і запрагае Царкву да гэтага). Па-трэцяе (гэта дапаўненне першага), ці гутарка ідзе пра трансцэндэнтнага Бога, якога *ніхто ніколі не бачыў* (Дабравесце св. Яна 1:18), ці пра Бога, выдуманага палацавымі філосафамі моцнай нацыянальнай дзяржавы? У гэтым другім выпадку «Бог« становіцца інструментам, пры дапамозе якога можна трымаць у поўным падпарадкаванні падданых, бо хто ж асмеліцца крытыкаваць лад і парадак, абаперты на Бога!

Пастулат стварэння «беларускай нацыянальнай філасофіі«, канцэпцыя гарызантальнай (чытай палітычнай) рэлігіі і адмова дыскутаваць з многімі філасофскімі плынямі ўказваюць на тое,

[9] Беларускае... С. 616.

што Бог Крукоўскага - гэта не што іншае, як хітры і амбівалентны Дух Абсалютны Гегеля.

Паслухаем жа словы самога Гегеля, на якім Крукоўскі хоча абаперці «беларускую нацыянальную філасофію«:

Дзяржава - гэта боская ідэя на зямлі.

Дзяржава - гэта рэальнасць маральнай ідэі.

Дзяржава - гэта здзяйсненне рацыянальнай свабоды

10.

І не патрэбны тут Попэр, каб заўважыць таталітарны ўхіл крыптагнастыцкае сістэмы Гегеля.

10. Tatarkiewicz Władysław, Historia filozofii. T. II. Warszawa, 1993. S. 215.

АПАКАЛІПТЫЧНЫЯ ГАЛЮЦЫНАЦЫІ - ПАГРОЗА НЕ ТОЛЬКІ ФІЛАСОФСКАЯ (ДЫСКУСІЯ З Ч. КІРВЕЛЕМ)

«Галюцынацыі« - гэта, безумоўна ж, метафара, не прыпісваю нікому псіхічнай хваробы. Ёсць, аднак, такія крайнія сітуацыі, калі трэба кідаць філосафам вельмі востры выклік, і ў такую крайнюю сітуацыю ставіць мяне філасофія Часлава Кірвеля, прафесара філасофіі ўніверсітэту імя Янкі Купалы ў Горадні. Маю намер засяродзіцца на ягоным расейскамоўным артыкуле «Движение к духовно-экологической цивилизации как способ исторической самореализации восточнославянских народов«, апублікаваным у 2001 годзе[11] . Цытаты буду даваць у сваім перакладзе.

«Чалавецтва не можа працягваць свайго развіцця па пуцявінах, закладзеных у культурных матрыцах тэхнагеннай цывілізацыі, - гэтым дыягназам гарадзенскі філосаф распачынае свой роздум. Метадалагічная загана, якую я папярэдне зрабіў Крукоўскаму (*метадалагічны калектывізм*), тут асабліва кідаецца ў вочы: сп. Кірвель выказваецца ўжо не адносна акрэсленай супольнасці людзей, а адносна ўсяго *ўніверсуму.*

11. Весніх Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэту імя Я. Купалы. *Серыя 1.*

людзей. З прыведзенага вышэй цверджання вынікае, што:

2001. № 2(7).

а) чалавецтва дагэтуль развівалася па акрэсленых пуцявінах,

а') існуе тэхнагенная цывілізацыя і існуюць культурныя матрыцы гэтай цывілізацыі,

а") пуцявіны, па якіх яна развівалася дагэтуль, закладзены ў згаданых матрыцах,

б) чалавецтва ўжо (?) не можа (?) развівацца па гэтых пуцявінах.

Гэта чатыры тэзісы, якія імпліцытна прысутнічаюць у цытаваным цверджанні. Тэзіс а) нефальсіфікавальны, таму не можа брацца ўсур'ёз, тэзісы а') і а") - гэта, бадай, праява эзатэрызму, а тэзіс б) з'яўляецца ці то сцверджаннем «факту«, ці то асабістым пратэстам, ці то загадам, ці то прарочым прадказаннем. Хоць усе яны не бясспрэчныя, яны ўсё ж функцыянуюць у тэксце як догмы. Цытую далей:

На дадзены момант найважнейшае - гэта выпрацаваць і прышчапіць масавай свядомасці эфектыўную экалагічную ідэалогію. Ідэалогія гэтая павінна стацца ідэалогіяй жыцця. Ідэалогія гэтая будзе паклікана, каб замацаваць першынство маралі перад усякага роду эканамічным і палітычным прагматызмам, першынство супольнае вольнае працы перад рознымі формамі эксплуатацыі ды гвалту, саборнасці і калектывізму перад усялякага роду крайнімі праявамі індывідуалізму і эгацэнтрызму...

Ці можна бяспечна дыскутаваць і крытыкаваць кагосьці, хто прагне замацоўваць *першынство маралі* і змагаецца з эканамічнай ды палітычнай эксплуатацыяй? Ідэалогія Кірвеля мае шмат гэткіх страховак. Яна змяшчае таксама шэраг трапных назіранняў, хоць гэтыя трапныя назіранні непамерна абагульнены і насычаны эматыўна-апелятыўнай фразеалогіяй.

На фоне гэтай маралізатарскай ідэалогіі можна заўважыць дрэмлючага Гегеля: Кірвель абвяшчае (спасылаючыся, праўда,

на А. Панарына) гістарычны закон:

в) *«постіндустрыяльнае грамадства… узнікне згодна з законам **адмаўленне адмаўлення**, надыдзе пад знакам «вяртання« да некаторых «спрадвечных«, традыцыйных пачаткаў чалавечага жыцця«.*

Але не ведаем яшчэ ўсіх прарочых здольнасцяў гэтага прафесара. Ён не толькі можа ў адным сказе выставіць дыягназ духоўна-культурнага стану ўсяму чалавецтву, не толькі можа прадказаць, *якая* будзе постідустрыяльная эпоха, ён ведае таксама падрабязны сцэнар далейшага развіцця гісторыі і ведае імёны галоўных акцёраў. Прачытаем жа аб'яўленне філосафа-прарока:

У навуковай літаратуры ўжо даўно заўважана, што ролю лідэраў у духоўна-экалагічным прарыве будуць адыгрываць тыя краіны і рэгіёны, якія валодаюць наймацнейшым біясферным патэнцыялам, этнакультурнай разнастайнасцю і духоўнымі каштоўнасцямі, што адпавядаюць выклікам надыходзячай эпохі.

Што ж, калі папярэдняя цытата магла захапіць шляхетным этычным зместам Кірвелевай ідэалогіі, гэтая цытата захапляе дакладнасцю *навуковага* прадказання. Можна падрабязна прааналізаваць «навуковасць« прыведзенага выказвання, але, пэўна, няма ў гэтым неабходнасці, тым болей што яшчэ не раз будзе магчымасць пазнаёміцца з недасяжным навуковым узроўнем гэтага артыкулу.

Ці можам даведацца імёны лідэраў і імя лідэра лідэраў, якія абраны ўзначаліць уваход чалавецтва ў надыходзячую эпоху? Так, безумоўна, філосаф не затрымлівае пазнанай таямніцы толькі для сябе, гаворыць *expressis verbis:*

Тут, як гэта падкрэсліваюць расейскія даследчыкі А. Іваноў, І. Фоціева, М. Шышын - аказваецца, што Расея паводле сукупнасці згаданых параметраў папросту не мае вартых сябе канкурэнтаў.

Выдзелім цяпер чарговыя пункты ў дыскурсе сп. Кірвеля:

г) моцная сугестыя, што свету пагражае духоўная і экалагічная катастрофа;

д) *аўтэнтычны* інтарэс чалавецтва - прадухіленне гэтай катастрофы;

е) Расея (а пад яе крыламі - усходнеславянскія народы) з'яўляецца адзіным бясспрэчным (прынамсі ў гэтым фрагменце тэксту) лідэрам у справе прадухілення катастрофы, якая пагражае.

Тысячы і дзесяткі тысяч разоў самыя розныя ідэалогіі выкарыстоўвалі факт грэшнасці і слабасці чалавека. Чалавечая грэшнасць - гэта з'ява настолькі паўсюдная, што, нават не спасылаючыся на Кнігу Быцця, можна адно толькі на базе індукцыі гаварыць пра «факт« *паўсюднай* грэшнасці. Адсюль усякае «апакаліптычнае« прадказанне, якое змяшчае катастрафічную рыторыку, мае вельмі падатны грунт, асабліва калі адрасат не хоча альбо не мае метадалагічных прыладаў, каб крытычна ацаніць прадказанні катастрафістаў. Названая Кірвелем спажывецкая культура - з'ява частая і, магчыма, нарастаючая. Тым самым выклікам для філосафаў, тэолагаў і сацыёлагаў з'яўляецца тое, каб па меры магчымасці грунтоўна *распазнаць* і *ацаніць* яе. Але ў большасці прамыслова развітых краінаў прымаюцца меры, каб прадухіліць экалагічныя праблемы, а што да спажывецтва, то - не навязваючы ўсім аднолькавае аскезы - прымаюцца меры, каб кансумпцыянізм прынамсі не набываў дэструктыўнага для супольнага дабра выгляду.

Тым часам паводле любога з гэтых параметраў Расея не можа быць маральным лідэрам. Супраць экалагічнага лідэрства гавораць факты ірацыянальнае эксплуатацыі і разбурэння прыроднага асяроддзя, што найбольш жахліва праявілася ў дапушчэнні атамнага выбуху ў Чарнобылі і пазнейшым блакаванні інфармацыі пра яго. Не ёсць Расея антытэзісам спажывецкасці: факт паўстання ў Расеі фінансавай алігархіі зусім не сведчыць пра наяўнасць нейкага імунітэту супраць багацця і капіталізму. Акрамя таго, п'янства, наркаманія ды

распуста маюцца там не горш, чымся на «ўпадніцкім« Захадзе, абортаў таксама даволі, а замест індывідуальнай эўтаназіі, якую на Захадзе называюць злачынствам, маем у Расеі часам калектыўную эўтаназію (напрыклад, генацыд у Чачэніі, які мае доўгую - двухсотгадовую - гісторыю, і інш.).

Тым часам прэтэнцыёзны філосаф пасоўваецца нават да такога пастулату: Расея з'яўляецца сусветным біясферным донарам... і ўжо нават з гэтай прычыны мае поўнае права адмовіцца ад выплачвання ўсіх сваіх запазычанасцяў еўрапейскім краінам і ЗША.

Што ж, капрызная гэтая Расея і капрызныя яе дзеці.

Далейшая частка аналізаванага артыкулу ў асноўным засяроджваецца на ідэйным узбагачэнні катастрафічнага ўгледжання. Вось духоўна-экалагічнае адраджэнне павязана з ідэяй *касмізму, агульначалавечага аб'яднання*, маецца таксама адкрыццё сапраўднае прыроды расейца: ён з прыроды не прыватнік, схільны натхняцца высокімі ідэямі, якія могуць перамяніць свет, яго заўсёды мучаюць і турбуюць спрадвечныя пытанні духоўнага характару. Варта цяпер дапасаваць гэта да рэчаіснасці: садызм і апрычніна Івана Жахлівага, генацыд насельніцтва Беларусі ў сярэдзіне XVII стагоддзя, здзек з праваслаўя і насілле над ім у часы Пятра Вялікага, народазнішчальніцкі імперыялізм XVIII-XIX стагоддзяў, нарэшце, бальшавіцкі камунізм з мільёнамі нявінных ахвяраў і спрычыненне глабальнай пагрозы - усё гэта хіба вынік натхнення «высокімі ідэямі« ды доказ апантанасці «спрадвечнымі пытаннямі«?

Ад ірацыянальнай ваяўнічасці ніякі народ не свабодны: ні беларускі, ні расейскі, ні польскі, ні нямецкі і ні амерыканскі, як гэта было відаць на прыкладзе ідэалогіі згаданых вышэй Эшкрафта і Робэртсана. Тым не менш, захоплены шляхетнасцю расейскай душы, Кірвель падкрэслівае:

Спецыфікай нацыянальнага характару расейцаў з'яўляецца, як гэта даведзена мноствам найбольш выдатных даследаванняў, вера ў магчымасць гарантавання паўсюднага шчасця для ўсіх

людзей; перакананне, што Расея адчыніць для ўсяго чалавецтва шлях да ісціны і справядлівасці (месіянізм) і гатоўнасць узяцца за выкананне найбольш цяжкіх заданняў, каб дасягнуць гэтага ў найкарацейшы прамежак часу (самаахвярнасць і максімалізм).

Сатэрыялагічны месіянізм і максімалізм нясуць рэальную пагрозу, якой ёсць таталітарызм. Але не патрэбны тут нават спекуляцыі, бо сам прафесар пацвярджае наяўнасць таталітарнага праекту ў ягонай ідэалогіі, указваючы на яе аналогію з камунізмам і бальшавіцкім фанатызмам:

Нас не павінна непакоіць тое, што на сённяшні дзень Беларусь, Расея і Ўкраіна не валодаюць моцным экалагічным рухам… Ці ж мог хто-небудзь нават падумаць пры канцы XIX стагоддзя, што Расея на працягу амаль усяго XX стагоддзя будзе фанатычна змагацца за пабудову камунізму ў сусветным маштабе? Але гэта наступіла.

Пальецца кроў. У імя экалагічна-аскетычнае ісціны, за здзяйсненне якой не сёння дык заўтра возьмецца Расея. Прафесар-прарок спасціг будучыню і ведае, што гэта непазбежна. Хай жа працягвае сваё прароцтва:

Хутка наступіць чарговы выкід энергіі Расеі… Расея зможа прадэманстраваць усяму свету беспрэцэдэнтны эксперымент, прарыў да духоўна-экалагічнай цывілізацыі.

З'яўляюцца ў гэтым дыскурсе і моўныя дзівосы, напрыклад калі філосаф гаворыць пра *адраджэнне многіх элементаў сялянскай космабіясферацэнтрычнай цывілізацыі*. Але якой будзе гэтая новая, экалагічная і космабіясферацэнтрычная цывілізацыя?.. Няма тут падрабязнага праекту, але які-ніякі нарыс ёсць.

Найперш трэба будзе зрэфармаваць эканоміку: *«Прамысловасць павінна быць абсалютна безадходнай«,* трэба будзе адмовіцца *«ад усякіх штучных і празмерных патрэбаў - «псеўдапатрэбаў«, пачынаючы ад прадметаў раскошы і канчаючы безліччу ўсякай*

магчымай драбязы«. Згодна з нашым маралістам, трэба будзе перайсці на *«рацыянальнае харчаванне і адмовіцца ад усякіх прыхамацяў«.* Паколькі Кірвель *ведае,* што ручная праца прыносіць *сапраўднае* задавальненне, у надыходзячай, паскоранай Расеяй эпосе ручная праца будзе пераважаць. Што тычыцца адзення, прафесар прадказвае *«паступовы пераход да сціплай гігіенічнай (не абавязкова аднолькавай) вопраткі, адмаўляючыся адначасова ад модных збыткаў«.* (Дзякуй, што прынамсі не будзе абавязку насіць *аднолькавай* вопраткі!) *«Трэба будзе ўзяць курс на дэзурбанізацыю«* (прафесар Кірвель, трэба чакаць, першы пераселіцца з Горадні ў сяло ў рамках дэзурбанізацыі і перастане выкладаць ва ўніверсітэце).

У экалагічнай краіне будучыні *«трэба будзе зменшыць вытворчасць транспарту«,* можна будзе ўсё ж ездзіць на роварах (мабыць, самаробных, бо невядома, ці фабрыкі па вытворчасці роваряў будуць «абсалютна безадходныя«). Гаспадарка светлае будучыні будзе заснавана на... найноўшых інтэлектуальных (!) дасягненнях! Нават інтэлектуальная дзейнасць будзе дазволена! Ну, можа, не для ўсіх, бо прадугледжана *«поўная забарона шэрагу кірункаў даследчыцкай і тэхнічнай дзейнасці«* - пакуль невядома, якія напрамкі будуць забаронены, але вядома тое, што вайсковая прамысловасць і палігоны будуць захаваны.

Кірвелева візія настолькі неспасцігальная для звычайнага смяротнага, што - як у маім выпадку - дух займае і калоціцца сэрца. Аскезіс, умеранасць, гігіена, прырода, шчасце... Але найважней тое, што ніхто звонку не будзе нас да гэтага прымушаць - усе самі будуць гэтага хацець. Усе пазнаюць, што маюць адну душу і ўтвараюць адзін арганізм - *містычнае цела святарнай Расеі.*

Паколькі чыталі мы дагэтуль збаўленчыя павучэнні і непахібныя прадказанні ўсходнеславянскага прарока, удумаемся ж у апошнюю, вельмі важную перасцярогу:

Відавочна, чалавецтва павінна будзе прайсці свайго роду «школу« - непазбежны этап навучання праз шырокамаштабныя катастрофы ды катаклізмы. Калі пагроза знікнення чалавецтва

як віду будзе бясспрэчнай для ўсіх і для кожнага, тады, трэба меркаваць, пачне дзейнічаць эфект «смажанага пеўня - птушкі мудрасці«. Ды не толькі. Разам з гэтым на сцэну грамадскага жыцця зноў павыходзяць прарокі (Месіі), здольныя высунуць і абгрунтаваць новыя грамадскія каштоўнасці і надаць экалагізму рэлігійны характар, ператварыць яго ў новую рэлігію.

Новая вера! Новая рэлігія! Якім правам я, неасвечаны смяротнік, спрабую аналізаваць тэкст Кірвеля з навуковага гледзішча і асмельваюся пытаць пра лагічна-эмпірычнае абгрунтаванне? Гэта ж рэлігія! Альбо веру і далучаюся да адухоўленых экалагістаў-касмістаў, альбо не веру і тады я страчаны! Загіну ў багне спажывецкай культуры, здрадзіўшы покліч сваёй усходнеславянскай крыві! Не час на аналіз і рэфлексію! Час на прыняцце рашэння!

Прарокі - гэта спецыфічны народ - павучае Кірвель, які сам, безумоўна, належыць да гэтага нязвыклага народу, - *яны маўчаць тады, калі абсалютная бальшыня няздольная іх слухаць, а прамаўляюць тады, калі занепакоенае чалавецтва спрабуе акрэсліць галоўныя напрамкі надыходзячых узрушэнняў, якія кожны прадчувае як нешта непазбежнае і жахлівае. Дай Божа людзям унікнуць гэтае «школы«. Але, як відаць, найпраўдападобней не ўдасца яе пазбегчы.*

Вось мы і дачыталі настаўленні гарадзенскага філосафа. Але... што маем на заканчэнне? Ізноў сп. Кірвель уводзіць у стан заклапочанасці (а я ж быў такі блізкі да прыняцця рашэння!), кажучы:

Мы не можам дакладна прадбачыць, якая экалагічная карціна вымалюецца ў XXI ст. Мы не можам таксама з упэўненасцю сцвярджаць, што менавіта ўсходнеславянскія народы будуць насамрэч лідэрамі працэсу руху да духоўна-экалагічнае цывілізацыі. Шмат з таго, што сказана было ў гэтым артыкуле, носіць гіпатэтычны характар.

Маю змешаныя пачуцці: мяне станоўча ўражвае факт аўтарэфлексіі прафесара, але адначасова пяражываю расчараванне: нешта не так з гэтай аўтарэфлексіяй. Па-першае, калі «шмат з таго, што сказана было ў гэтым артыкуле, носіць гіпатэтычны характар«, то неабходна ўказаць, што прафесар хоча падаць як гіпотэзу, а што прымае як бясспрэчнае. Ці вылучаныя мною тэзісы Кірвеля «а-б-в-г-д-е« - гэта гіпотэзы, ці гэта цверджанні, якія маюць статус бясспрэчных і несумнеўных? Калі гэта гіпотэзы, то цверджанні, на іх абапертыя, і высновы, зробленыя на іх падставе, не могуць быць мацнейшымі, чым гэтыя зыходныя гіпотэзы. Тым часам Кірвель так энергічна пераконвае прыняць цверджанні, абапертыя на гэтыя - «а-б-в-г-д-е« - цверджанні, што чытач нават не мае права сумнявацца ў неаспрэчнай праўдзівасці зыходных тэзісаў. Ува ўсякім разе, несур'ёзна з боку аўтара прымушаць чытача *гадаць*, што для аўтара гіпотэза, а што не. Па-другое, гіпатэтычныя цверджанні звычайна суправаджаюцца пэўнымі функтарамі, тыпу: *праўдападобна, дапусцім, паспробуем* і г. д., і тады чытач ведае, што дадзеныя цверджанні прымаем толькі ў эўрыстычных мэтах. Магчымыя высновы, зробленыя на базе гіпотэзаў, маюць пераважна ніжэйшы, у любым разе не вышэйшы эпістэмічны статус, бо з таго, што менш пэўнае і менш відавочнае (а такімі ёсць гіпотэзы), не можа вынікаць тое, што больш пэўнае і больш відавочнае. Тым часам у тэксце Кірвеля поўна іншых функтараў, якія зусім не сведчаць пра гіпатэтычны характар таго, што гэты прафесар абвяшчае: *бясспрэчна,.. хай зараз чытач паспрабуе запярэчыць,.. як гэта было даказана мноствам найвыдатнейшых даследаванняў...*

Вышэйпрыведзены ўчастак тэксту з'яўляецца чарговым «забеспячэннем«: пасля гэтых словаў Кірвеля нельга папікнуць (як гэта я раблю) у тым, што ён выдае сумнеўнае за пэўнае, бо - калі ласка - ён сам прызнае, што шмат што носіць гіпатэтычны характар. Але я лічу, што гэта чарговы псеўданавуковы прыём. Няма ў артыкуле Кірвеля ані гіпотэз, ані рацыянальнай рэфлексіі і амаль нічога такога, што магло б насіць выразныя сляды навуковасці. Кажу «амаль«, бо на с. 53 ёсць - на маю думку - даволі трапнае апісанне праблем манетарнай палітыкі на Захадзе. Ёсць таксама - хочацца верыць - шчырая заклапочанасць маральна-духоўным станам сучаснага свету

(гэта ўжо сведчыць не столькі пра навуковасць, колькі пра этычную адчувальнасць навукоўца). Кірвель таксама неаднойчы - проста ці ўскосна - згадвае пра духоўны патэнцыял праваслаўя.

Я таксама веру ў вялікі духоўны патэнцыял праваслаўя ўвогуле і расейскага праваслаўя ў асаблівасці. Але ёсць шэраг прычынаў, каб закінуць сп. Кірвелю тое, што я ўжо закінуў сп. Крукоўскаму - канцэпцыю гарызантальнае рэлігіі, рэлігіі, якая выконвала б палітычныя функцыі. Праваслаўе, у яго эўхатычным (малітоўна-сузіральным) вымярэнні, сапраўды можа спрычыніцца да духоўнага аднаўлення і Расеі, і іншых народаў, але нельга дапускаць да эксплуатацыі праваслаўя ў палітычных - імперыялістычных - мэтах.

Сам сп. Кірвель прызнаецца, што ягоны артыкул - гэта ідэалогія. Ён жа сам выразна сцвярджае, што функцыя гэтай ідэалогіі палягае ў *«праройстве, якое самарэалізуецца«*: праройства сказана дзеля таго, каб масы паверылі і выканалі змест праройства. Абурае і бянтэжыць, што часопіс, які прэтэндуе на строгую навуковасць, публікуе «свабодную творчасць« знеахвочанага гэтым грэшным светам філасофа. Дарэчы, нельга гэта нават назваць творчасцю, бо артыкул сп. Кірвеля з'яўляецца папросту кампіляцыяй (некагерэнтнай ды няўдала скляпанай) з некалькіх расейскіх славянафілаў-касмістаў, апантаных - выкарыстоўваючы характарыстыку самога Кірвеля - *спрадвечнымі пытаннямі.* Кірвель капіюе адначасна А. Іванова, І. Фоціеву, І. Шышына, А. Фядотава, Л. Васіленку, М. Лоскага, І. Саланевіча, А. Панарына, А. Шахназарава, Наважынава, Лук'яніна ды іншых цяжарных «расейскай ідэяй«.

* * *

Прыкладна так некаторыя беларускія філосафы займаюцца пагоняй за духамі ды ідэямі. Калі ў палітычным плане ў Беларусі пануе аўтарытарызм, то ў культурна-наасферным плане ўзнікае пагроза стацца «склератычным грамадствам«: інтэлектуальны абмен - настолькі важная ўмова ментальнае

трансфармацыі, якая робіць магчымым пераадоленне культурнай стагнацыі ды палітычнага аўтарытарызму, - можа быць заблакаваны *прыватнымі, энергічнымі філасофіямі*, якія будуюцца на базе пачуццёвага ўспрымання рэчаіснасці і метафарычным, паэтычным апісанні. Паэтычнае апісанне можа мець сваё значэнне, але робіць паралізоўнае ўздзеянне, калі прэтэндуе быць адзіным трапным і самадастатковым апісаннем.

Зробленая мною крытыка была таксама *энергічнай*, часта іранічнай і эмацыянальнай. Хачу заўважыць, што крытыка (і іронія) датычылася поглядаў, а не асоб, і то пэўных канкрэтных поглядаў, а не татальна ўсіх інтэлектуальных дасягненняў узятых пад увагу навукоўцаў. Іронія *персанальная* (тыпу «прафесар-прарок«) мела характар *аказіянальны* - толькі зважаючы на прапаведніцкі тон пэўнага фрагменту тэксту. Лічу, што эмоцыі я дапускаў толькі тады, калі былі дастатковыя для гэтага прычыны.

Але мае эмоцыі апраўданы таксама перакананнем, што *гэткія ідэалогіі нясуць пагрозу не толькі філасофскую*: калі яны не будуць здэмаскаваны і адкінуты, будуць усцяж і ўсцяж пагражаць як магчымасць чарговага ўцелаўлення таталітарызму. Шчыра баюся бясконцай рэпрадукцыі аўтарытарызму/таталітарызму; зацікаўлены ў тым, каб рэпрадукцыя аўтарытарызму скончылася на Лукашэнку.

Частка другая

МАГЧЫМАСЦЬ КРЫТЫЧНАЙ ФІЛАСОФІІ (ПРЫВАТНАЯ КААЛІЦЫЯ З ЕКАДУМАВЫМ)

Прафесар Ян Валеньскі заўважыў, што філасофія - у адрозненне ад навукі - неэкуменічная, у філасофіі існуюць розныя плыні, якія канкуруюць паміж сабой. У гэтым шмат праўды, а ў сувязі з гэтым варта прызнаць, што мы не можам пазбегнуць *аспектнасці* ў нашым пазнанні. Нават на пэўную

кветку (дапусцім, што ёсць такая кветка) кожны з нас звычайна інакш глядзіць. Не можам таксама пазбегнуць *плюралізму*.

Хачу цяпер запрапанаваць кароткую рэфлексію над поглядамі яшчэ аднаго беларускага філосафа - Андрэя Екадумава. Крытычны чытач пачувае сябе намнога больш свабодна, чытаючы Екадумава, чымся згаданых папярэдне мысліцеляў. Буду зыходзіць з яго расейскамоўнага тэксту «Бездомная нация из европейского дома«[12]. Пераклад і нумарацыя тэзісаў паходзяць ад мяне, а іх гучанне часам перафразавана.

Тэзіс 1. *Для беларусаў характэрна ўспрыманне сваёй этнічнай культурнае прасторы як «сатэлітарнай«, непаўнавартаснай і не прывязанай да якога-кольвечы этнічнага масіву.*

Не новы гэты дыягназ: яго часта прыводзяць у СМІ ў розных фармулёўках. Тым не менш, гэты дыягназ - досыць добрае абагульненае апісанне ментальнае сітуацыі, якая абумоўлівае грамадска-палітычную сітуацыю ў Беларусі, а сродкі апісання выбраны даволі трапна[13]. Яшчэ больш цікавым з'яўляецца далейшае апісанне, для якога пунктам выхаду быў Тэзіс 1:

Тэзіс 2. *Дамінуе ідэалагема «руху«: яе выкарыстоўвае адпаведная ідэалогія, што заклікае крочыць на Ўсход, гэтак як і ідэалогія апазіцыянераў, у якіх з'яўляецца лозунг «Беларусь - у Еўропу«.*

Тэзіс 3. *Як заклік «Беларусь - у Еўропу«, гэтак і заклік «Беларусь у Еўразію« часцей за ўсё маскуюць ізаляцыянісцкую пазіцыю… Ідэалагема руху кудысьці хавае ў сабе ідэалагему нерухомасці.*

Вядома ж, справа тут не столькі ў лозунгах, колькі ў тым, што яны сімвалізуюць і характарызуюць пэўную ментальнасць, а таксама з'яўляюцца інструментам распаўсюджвання гэткай ментальнасці.

Тэзіс 4. *Абедзве культуры рэпрадукуюцца ў парадку маналогу, вяшчаюць, не прыслухоўваючыся.*

Змаганне за захаванне маналагічнай культурнай арыентацыі не вельмі перспектыўная рэч, кажа Екадумаў, таму неабходна засяроджанне на яе пераадоленні. Звернем увагу на чарговы

[12] АРСНЕ «Пачатак». 1999. № 1.

[13] Можна ідэалогіі пытаць, ці няма тут крытыкаванага мною ў папярэдніх аўтараў *метадалагічнага калектывізму*. Але трэба заўважыць, што гэты тэзіс Екадумава не прэтэндуе быць выказнікам,

тэзіс:

Тэзіс 5. *Выхадам тут можа быць інтэгральная парадыгма рухомага, дынамічнага і адкрытага этнічна-культурнага цэнтру.*

На месцы ідэалагемаў руху з'яўляецца ў сп. Екадумава ідэя дыялогу. Ізноў жа - можна сказаць - ідэя не такая ўжо арыгінальная і новая. Сёння шмат і ўсюды гаворыцца пра дыялог. Але, трэба заўважыць, у толькі што прэзентаваных энергічных філасофіях нават не ўзнікае слова «дыялог«. Апрача таго, гэтая ідэя творча і даволі пераканаўча Екадумавым развіта і распрацавана. Перш за ўсё прапануе ён - натхняючыся Лотманам - адмовіцца ад жорсткай апазіцыйнасці *«ёсць - павінна быць«*. Гэта пэўны ўдар па ідэалізме і ўтапізме, якія так часта характарызуюць мысленне беларускіх ідэолагаў і палітычных інжынераў.

Пазіцыя, прынятая Екадумавым, вядзе да «разраджэння напружання«, створанага беларускай міфалогіяй. Гэтая міфалогія функцыянуе прынамсі ў дзвюх версіях: адна версія - у нацыяналістычнага крыла апазіцыі, а другая - у прарасейскай дзяржаўнай улады. А Вялікае Княства Літоўскае, галоўны наш гістарычны пункт аднясення, - заўважае філосаф - было палігонам узаемадзеяння аж пяці моцных традыцыяў: язычніцкай, праваслаўнай, пратэстанцкай, каталіцкай і яўрэйскай. Менавіта культурны дыялог, стан узаемаабмену светапогляднага зместу, сфармаванага ўнутры кожнае з гэтых традыцыяў, можа стацца падставай для будавання нацыянальнай саматоеснасці.

Екадумаў таксама заўважае, што *«ўсякая культура ёсць элементам шырэйшае культурнай сістэмы, з'яўляецца ўдзельнікам дыялогу культур«*. Таму справа не ў тым, каб «крочыць« туды альбо сюды, але ў прысваенні зместу шырэйшай культурнай сістэмы, «трансляцыі« культурных шыфраў. У працэсе культурнага абмену - «вонкавага« і «ўнутранага« - паўстае дынамічны і адкрыты цэнтр «на месцы«.

Заняцце гэткай пазіцыі вядзе да высновы, што кшталт беларускасці яшчэ не гатовы, а формула быцця беларусам

датычным усіх членаў дадзенай супольнасці, а толькі апісаннем (называннем) пэўнай *абумоўлівальнай тэндэнцыі*.

становіцца немагчымай. Гэтая пазіцыя характарызуецца таксама ўніверсалісцкім ухілам, яна не толькі не прапаведуе нацыяналізму як стадыі развіцця, але нават развейвае мары нацыяналістаў усюды бачыць *сваё, адметнае, нашае, бо «ўсякая культура ёсць элементам шырэйшай культурнай сістэмы«.*

Не можа быць «адметнасці« без «супольнасці«, а нацыянальны праект не павінен быць супрацьпастаўлены ўніверсалізму. Таму прапаную гэткую пастаноўку справы: *як стварыць свойскае асяроддзе рэалізацыі агульначалавечых ідэалаў*? Варта быць гатовым да таго, што *агульначалавечае* часам будзе разбураць і перабудоўваць нашу свойскасць. Неўратычная прывязанасць да свойскасці і самаізаляцыя можа спрычыніцца да культурнага і духоўнага рэгрэсу, і ўжо тады будзе сапраўдны заняпад.

Пункт гледжання Екадумава і ягоныя канкрэтныя прапановы, пэўна, расчаруюць тых, хто прагне мець раз і назаўсёды *акрэслены кірунак* дзеяння (і, трэба дадаць, кірунак мыслення). Шмат, вельмі шмат энергіі йдзе на тое, каб вынайсці жаданы кірунак у *гісторыі*, а канкрэтна ў эпосе *залатога веку*, які, паводле нацыянальнай міфалогіі, меў месца ў XIV-XVI стагоддзях. То тут, то там чуваць заклікі да *беларускага адраджэння*. Але праблема ўзнікае тады, калі паўстае (цалкам лагічнае) пытанне: адраджэння *чаго*? І тут пачынаецца драматычная, каб не сказаць трагічная *фрагментарызацыя*: адны заклікаюць адрадзіць Вялікую Літву, другія - Крыўю, іншыя зноў жа згаджаюцца на Белую Русь, «палацавыя« ідэолагі адраджаюць спрадвечнае братэрства з расейскім народам, і кожнае з гэтых «адраджэнняў« мае зноў па некалькі версій: нацыянал-дэмакратычную, нацыянал-каталіцкую, нацыянал-пратэстанцкую, каталіцкую манархічна-кансерватыўную… а ў «тым« лагеры - славянафільска-праваслаўную, славянафільска-камуністычную, кансерватыўна-камуністычную і г. д.

«Адраджэнне« пападае ў шматлікія і непераадольныя дылемы. Рэч у тым, што «голыя факты« гісторыі не маюць абавязвальнай сілы. Можна сказаць - факты аксіялагічна адкрытыя. Абавязвальным можа быць толькі *спосаб апавядання* фактаў. Каб выцягнуць з гісторыі (чытай - з залатога веку) ясны кірунак дзеяння, неабходна моцная нарацыя, якая не дапускае

гетэрадоксіі, гэта значыць - адзіная абавязковая інтэрпрэтацыя гісторыі. І тут можна назіраць зацятыя спаборніцтвы - пагоню за фактамі, «прыўлашчванне фактаў« канкрэтнымі нарацыямі. Гэта вядзе да таго, што фрагментарызацыя не знаходзіць пераадолення ў крытычнай дыскусіі, а толькі вядзе да феномену, які называю *склератычным грамадствам*. Каб крытычная і «сумесная« філасофія стала магчымай, трэба пагадзіцца, што трыумфалістычна-віктымістычная інтэрпрэтацыя гісторыі нікога не абавязвае.

Калі адмовімся ад адной, моцнай і яснай нарацыі, тады *што* будзе акрэсліваць нашу беларускасць? Калі прызнаем карыстанне беларускай мовай неабавязковай умовай быцця праўдзівым беларусам, тады ў чым будзе праяўляцца наша нацыянальнасць?

Гэтыя пытанні патрабуюць больш грунтоўнага даследавання і даўжэйшай дыскусіі. У артыкуле я хацеў дэзавуаваць некаторыя энергічныя і здагматызаваныя нарацыі і задумацца над *магчымасцю* крытычнай філасофіі. Хацеў таксама выразіць перакананне, што *акрэсленне* будучага кшталту Беларусі павінна быць *су-акрэсленнем*: ніхто не мае манаполіі на «нацыянальную праўду«. Я прыхільнік білінгвізму. Хоць - як беларускамоўны беларус - адчуваю эмацыянальную цягу да «беларускамоўнай« версіі нацыянальнага праекту, лічу, што дзвюхмоўе ў Беларусі з'яўляецца не толькі фактам, з якім трэба лічыцца, але таксама пэўнай зададзенай каштоўнасцю, якую можна творча развіваць. Згаджаюся з Екадумавым у тым, што *«ідэя культурнага адраджэння павінна перападпарадкавацца ідэі спараджэння культуры«*. І згаджаюся з Булгакавым, што *«Беларусь - гэта незавершаны нацыянальны праект«*.

5 сакавіка 2004 г., Кракаў

APPENDIX

Нядаўна (29 лютага 2004 году) у адной кракаўскай кавярні адбылося спатканне, арганізаванае суполкай «Усходняе Кола« і

прысвечанае беларускай сацыяльнай філасофіі, на якім я мог прэзэнтаваць у скароце сваё гледзішча, якое мела такую ж структуру, што і ў гэтым артыкуле. Падчас дыскусіі былі пастаўлены між іншым такія пытанні і зроблены такія заўвагі:

1. Доктар Генадзь Семянчук спытаў са здзіўленнем, чаму я не згадаў пра дзейнасць Каталіцкага касцёлу ў Беларусі.

2. Ён жа звярнуў увагу, што пастаноўка ў адным шэрагу Лыча й Крукоўскага з Кірвелем метадалагічна не апраўдана, бо Кірвель прэзентуе зусім іншы ідэалагічны кірунак.

3. Было таксама пытанне пра ступень важнасці мовы ў нацыянальнай самаідэнтыфікацыі.

Ad 1. Каталіцкая царква, безумоўна, нямала робіць на ніве культуры і адраджэння беларушчыны (апошняе не датычыць Гарадзенскай дыяцэзіі, дзе ўсцяж вельмі моцны польскі традыцыяналізм). Але сацыяльнае навучанне, да якога заклікае і абавязвае дакумент *Mater et Magistra* (Ян XXIII, 1961 г.), амаль адсутнічае ў Беларусі. Царква, вядома ж, не павінна прысутнічаць у сферы палітычных рашэнняў і заканадаўства, але, паводле канцэпцыі, распрацаванай дамініканцам М. Зембам ОП, павінна прысутнічаць у «метапалітычнай« сферы: уздзейнічаць на «прэфіласофію« і «маральныя перакананні« грамадства, якія абумоўліваюць «грамадскі кансэнсус«. Таксама выступ у абарону правоў чалавека, якія так часта парушаюцца ў Беларусі, з'яўляецца момантам прысутнасці Царквы ў метапалітычнай сферы. Тым часам не чуваць, каб Царква ў Беларусі голасна выступіла ў абарону правоў чалавека, хоць гэта частка яе (=нашае) місіі. Няма вернасці Богу, калі няма вернасці чалавеку.

Ad 2. Мая крытыка не была партыйнай крытыкай. Крытэрам пастаноўкі ў адным шэрагу Лыча, Крукоўскага і Кірвеля не была прыналежнасць да партыі ці ідэалагічнага кірунку. Не кіраваўся я таксама канфесійным крытэрам.

Ad 3. Сп. Екадумаў кажа, што мова - гэта толькі інструмент камунікацыі і таму мае другаснае значэнне ў дачыненні да зместу. Лічу, што мова - гэта ўсё ж нешта большае, чым

інструмент, бо мова мае таксама *фармавальнае* значэнне для чалавека. Тым не менш цалкам згаджаюся з Екадумавым, што для беларускай самаідэнтыфікацыі патрэбен «метакрытэр«. Беларус можа быць паўнавартасным, застаючыся расейскамоўным. Катэгарычна выступаю супраць этатыстычных, «адверхных« спосабаў вырашэння моўнай праблемы, а за гэта, як відаць, выступае згаданы сп. Г. Семянчук, кажучы: «Дастаткова, каб дзяржаўныя чыноўнікі загаварылі па-беларуску, тады й людзі загавораць«. Аднак не цешыць мяне такі беларус, які толькі дзеля канфармізму будзе гаварыць па-беларуску. Маёй марай ёсць, каб дзяржава прынамсі не перашкаджала свабодна дзейнічаць беларуска-, расейска-, польскамоўным інстытуцыям і справядліва субсідыявала развіццё выхаваўча-навучальных устаноў - беларускіх і небеларускіх.

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2004/11/5**
[image]

Паліталёгія ў пераходным грамадстве
Круглы стол

25 сакавіка ў памяшканьні беларускага ПЭН-Цэнтру адбыўся сэмінар, прысьвечаны асаблівасьцям функцыянаваньня палітычнай веды ў нашай краіне. У ім узялі ўдзел загадчык катэдры паліталёгіі й міжнародных зносінаў МДЛУ Вячаслаў Бабровіч, намесьнік дырэктара Інстытуту сацыялёгіі НАН Беларусі Ўладзімер Абушэнка, а таксама студэнты, асьпіранты і выкладчыкі катэдры паліталёгіі БДУ.

Андрэй Казакевіч, рэдактар часопісу «Палітычная сфера»: Я прапаную пачаць абмеркаваньне з акрэсьленьня трох асноўных сэктараў, якія прадукуюць зусім адрозныя тыпы палітычнае веды. Першы - сфэра палітычнай навукі як збору пэўных інстытуцыяў - адукацыйных, дасьледчых і г. д. Другі - сама сфэра палітычнага: яна ўлучае ў сябе ўсіх суб'ектаў палітычнага дзеяньня, тых, хто так ці інакш альбо жадае ўплываць на прыняцьце палітычных рашэньняў, альбо ўплывае. Гіпотэза ў тым, што той тып веды, які ўтвараюць палітыкі-практыкі, вельмі моцна адрозьніваецца ад таго ўяўленьня пра палітыку, якое маюць палітолягі-навукоўцы. Трэці сэктар - насельніцтва, масы, соцыюм: гэта зусім іншы тып палітычнае веды, і лёгіка яе атрыманьня значна адрозьніваецца ад таго,

што мы маем у першых двух сэктарах.

Што можа быць пакладзена ў аснову таго, што фармуе веду для палітычнай або навуковай супольнасьці? Для палітыкаў гэта - перш за ўсё *досьвед.* Іх тып палітычнае веды фармуецца практыкамі. У Беларусі - практычна толькі досьведам, а ня тым, што даюць палітычныя тэорыі. Для палітычнай навукі крыніцай зьяўляюцца альбо эмпірычныя *дасьледаваньні* - звычайна тыя, што робяцца па-за межамі палітычнай навукі (эмпірычная сацыялёгія), альбо нейкія тэарэтычныя пастуляты, схемы, якія ня маюць прамога дачыненьня да рэальнасьці. Лёгіка такое веды збудаваная зусім на іншым разуменьні палітычнай рэальнасьці і ўяўленьні пра тое, чым ёсьць «палітычная сытуацыя», якая вельмі адрозьніваецца ад таго, што будуюць навукоўцы зыходзячы з тэарэтычных схемаў. Галоўнай крыніцай палітычнай веды для грамадзтва ёсьць перш за ўсё *міт,* які можа фармавацца альбо сродкамі масавай інфармацыі, альбо іншымі спосабамі - чуткамі й г. д. І гэта складае аснову таго, што звычайны чалавек, не ангажаваны ні ў палітычныя дасьледаваньні, ні ў палітычную дзейнасьць, уяўляе пад палітыкай і «палітычнай сытуацыяй».

Так, мы маем тры аўтаномныя і ізаляваныя адно ад аднаго палі вытворчасьці палітычнае веды. Мэта нашага сэмінару ў тым, каб зразумець, якім чынам вытвараецца кожны тып палітычнае веды, якія сувязі існуюць паміж гэтымі сфэрамі і якім чынам тая ці іншая веда атрымлівае легітымацыю. Гэта мае вялікае практычнае значэньне. Напрыклад, палітоляг піша кнігу, і ён павінен разумець: кніга, якая зьмяшчае спасылкі адно на тутэйшых навукоўцаў, будзе абавязкова працаваць толькі ў сфэры навукі. Каб яна выйшла на іншыя «рынкі» - на рэальную палітыку, на масы, яна павінна быць збудаваная паводле зусім іншых законаў і іншай лёгікі, каб там прадавацца і спажывацца.

Цяпер давайце паспрабуем пазначыць асноўныя «дасьледчыя сытуацыі» ў першым з сэктараў - палітычнай навуцы.

Вячаслаў Баброві́ч: У мяне ёсьць выкладчыцкі досьвед, ён жа - і навуковы: навукоўцы часьцей за ўсё і выкладчыкі. Тут у нас сытуацыя ня дужа добрая: палітычная навука на нас звалілася нечакана, як і незалежнасьць. Асабліва для выкладчыкаў

навуковага камунізму, гісторыі КПСС і інш. І таму цяпер можна казаць толькі пра нейкія «выспачкі» думкі сярод маладзейшага пакаленьня, бо ў старэйшага пакаленьня - ні жаданьня, ні здольнасьцяў.

У параўнаньні з савецкім часам, вядома ж, ёсьць дасягненьні. Надышоў пэрыяд «рэабілітацыі штодзённай сьвядомасьці». Штодзённая сьвядомасьць ніколі не шанавалася ў той час, калі валадарыла марксісцка-ленінская філязофія і тагачасная сацыяльна-палітычная тэорыя. Штодзённай сьвядомасьці давяраць не было чаго, бо праўду ведалі толькі абраныя - ідэолягі. Гэта мэтадалягічны эсэнцыялізм, які ідзе яшчэ з часоў Плятона. Плятон не давяраў меркаваньню, ён супрацьстаўляў яго навуцы, праўдзівай ведзе, якая была даступная ня кожнаму. У савецкі час таксама было такое кола асобаў - адпаведна, у астатніх не было сэнсу пытацца. Адсюль - поўнае занядбаньне таго, што называецца сацыялягічнымі дасьледаваньнямі. «А што ў іх пытацца пра тое, чаго яны ня ведаюць? Ім трэба проста патлумачыць, і тады яны будуць ведаць». У гэтым сэнсе зроблены крок наперад, бо грамадзкім меркаваньнем стала цікавіцца навука і ўлада, у тым ліку й палітыкі. Тут можна назіраць нават своеасаблівы крэн, крайнасьць: сталі цікавіцца занадта, бо грамадзкае меркаваньне - не такая ўжо праўдзівая крыніца атрыманьня інфармацыі. Па-першае, ім лёгка маніпуляваць. Па-другое, масы часта і самі ня ведаюць, чаго хочуць. У пераломныя пэрыяды масы, на маю думку, трэба весьці за сабой, а не пытацца ў іх з кожнай нагоды, сьпісваючы потым адказнасьць на іх. Гэта дае магчымасьць схавацца за грамадзкую думку: «Чаго вы хочаце? Гэта вырашыў народ».

Зь іншага боку, нібыта нічога не зьмянілася, бо мы па-ранейшаму жывём у ілюзорным сьвеце. Гэта вельмі добра заўважна ў сфэры эканомікі: мы жывём у сьвеце нейкіх незразумелых эканамічных паказьнікаў, калі нам тлумачаць, што мы жывём усё лепш і лепш, а нам у гэта ня вельмі верыцца. Працягваецца стварэньне ілюзорнага сьвету, як у савецкі час, калі мы лічылі, што жывём у найлепшым з грамадзтваў (такі вобраз вагона з завешанымі вокнамі, у якім мы едзем некуды). Мы паказваем усяму сьвету мадэль эканамічнага і палітычнага разьвіцьця, якая нібыта мае

перавагі, але насамрэч мы ўсе разумеем, што іх няма.

Ёсьць яшчэ такая своеасаблівая тэндэнцыя сярод нашых палітолягаў: улічваючы нашу ўнікальнасьць, тое, што мы вельмі непадобныя да ўсяго астатняга сьвету (і ня толькі да Захаду, але і да нашых суседзяў), сярод палітолягаў вельмі моцна адчуваецца жаданьне ствараць сваю, не пазычаную палітычную навуку. Я сам часта чуў: «Мы бяром з Захаду тое, што нам не пасуе. І ўвогуле нам нічога не пасуе: мы іншыя - і палітычная навука павінна быць іншай». Я лічу, што гэта няправільны падыход. Мы ўсё больш прыпадабняемся да астатняга сьвету, і ўсе яго праблемы ў нас ужо ёсьць: і «чорны піяр», і змаганьне інтарэсаў, і лабізм... Усё, што адлюстроўвае палітычная навука. Таму стварэньне «сваёй» палітычнай навукі я ўспрымаю як ня што іншае, як спробу адгарадзіцца ад сьвету, каб не ацэньваць сябе паводле агульнапрынятых і досыць суровых крытэраў. Тут і пэўны набор твораў, якія трэба ведаць, валодаць пэўным наборам навыкаў і ўменьняў, і г. д. Ствараць сваю навуку - гэта вельмі просты шлях да таго, каб жыць у замкнёным, сельскага ўкладу сьвеце.

Што датычыць нарматыўнай функцыі навукі, дык, я лічу, яна ў кожным разе прысутнічае. І ўсё, што зьвязана з ідэалёгіяй, - гэта спроба задаць пэўныя нормы навуцы: ня проста апісаць, што ёсьць, а апісаць, як павінна быць. Гэтак ёсьць ня толькі ў нас, але і ўва ўсім сьвеце - гэтым займаюцца грамадзянская і палітычная адукацыя.

Калі казаць пра дзяржаўную ідэалёгію, дык гэта спроба задаць нарматыўнасьць навукі толькі ў нашым ключы, не ўласьцівым усяму сьвету. У трансфармацыйных грамадзтвах гэта задаецца шляхам стварэньня той палітычнай культуры, безь якой немагчымая дэмакратыя. А мы зноў вынаходзім нешта сваё, унікальнае. Самае цікавае ў гэтай сытуацыі, што тыя, хто адказвае за гэта «сваё», ня ведаюць, што нам прапанаваць. Зьместу ў гэтых спробах - мінімум.

А.К.: Асновай уласнай паліталёгіі было б захаваньне палітычных традыцыяў Савецкага Саюзу?

В.Б.: Я думаю, яшчэ і нежаданьне браць тое, што напрацавана

на Захадзе. Палітычная навука - такі комплекс дысцыплінаў! І там так багата назапашана, а людзям у веку 50-60 і болей гадоў вельмі цяжка пераквалiфікавацца. Хаця ідэя стварэньня сваёй палiталёгii, з папраўкамі на свае праблемы, магчыма, і мае сэнс. Але яна ня так лёгка вырашаецца і, напэўна, будзе якасна новай.

А.К.: Ці стаў які-небудзь грамадзкі міт часткай палітычнай тэорыі?

В.Б.: Я ня ведаю, ці міты выпрацоўваюцца ў масах. Тут трэба абмяркоўваць канкрэтна, разгледзець нейкі пэўны міт і пашукаць яго карані. Наагул, міты - вельмі сьлізкая тэма. Назваўшы нешта «сьвятое» мітам, можна выклікаць абурэньне. Калі я кажу, што Машэраў і ўсё зьвязанае зь ім - міт... Магчыма, ён узьнік у масах, хаця і гэта ня факт. Натуральна, што я не адмаўляю самога факту яго існаваньня. Я маю на ўвазе тое, што пра яго кажуць і для чаго гэта кажуць. Вы ж уяўляеце сабе савецкую сыстэму і тое, якія людзі маглі прабіцца наверх.

А.К.: «Глябальная» мэта нашага сэмінару - прасачыць, якім чынам прадукуецца палітычная веда ўва ўсіх палёх. Але варта, думаю, звузіць аб'ект, каб паўстала разьвіцьцё схемы.

Натальля Ляховіч-Петракова, выкладчыца катэдры паліталёгіі БДУ: Калі мы будзем гаварыць пра палітычную навуку ў лякальным кантэксьце, ці ёсьць сэнс цьвёрда ўвязваць усе тры палі або ёсьць сэнс разгледзець, як палі «Палітыка» і «Масы» ўплываюць на «Палітычную навуку»? Ці можа існаваць палітычная навука як цэнтар вытворчасьці веды цалкам нэўтральна ў дачыненьні да масаў? Можа, палітычная веда - гэта працэс абмеркаваньня ўсяго, што адбываецца ня толькі ў сфэры навукі, але і ў сфэры палітыкі і ў сфэры масаў? Ці такія ўжо яны адасобленыя?

А.К.: Натуральна, яны не адасобленыя. Палітоляг можа быць адначасова палітыкам і прысутнічаць у двух ці трох палёх. Але ўсё ж у гэтых палёх лёгіка, мэханізмы вэрыфікацыі, цэнтры вытворчасьці - розныя. Мы ня можам сказаць, што ёсьць нейкія цэнтры, якія ёсьць адначасова цэнтрамі прадукаваньня веды для палітыкаў, для палітолягаў і для масаў. Гэта ўсё

разьведзена ў прасторы.

В.Б.: Пытаньне трэба ставіць такім чынам: а што такое палітычная навука? Чым яна паказвае, што яна існуе? Ёсьць нейкія кнігі, часопісы, творы? Бо курс паліталёгіі ў ВНУ - гэта ж не палітычная навука, гэта сынтэз розных ведаў пра палітыку, псыхалёгію, гісторыю й г. д.

Уладзімер Абушэнка: Калі паліталягічная навука існуе (колькі ў нас катэдраў паліталёгіі ў ВНУ!) як навучальная дысцыпліна, дык на якой падставе нехта спрабуе назваць сябе палітолягам? А калі ён працуе на іншым полі, дык ці застаецца ён палітолягам, які прадукуе веду, альбо ён пачынае прадукаваць нешта іншае, згодна з той схемай (напрыклад ідэалёгію)? Напрыклад, прасунутыя расейскія сацыёлягі «новай хвалі» кажуць, што тэарэтычная сацыялёгія, сацыялёгія як вытворчасьць веды нідзе больш існаваць ня можа, як у запаведніках кшталту ўнівэрсытэцкіх катэдраў. Існуюць розныя сацыялягічныя практыкі, але яны ня маюць ніякага дачыненьня да сацыялёгіі як да дысцыпліны. Таму трэба адрозьніваць, гаворыце вы пра сацыялёгію як веду ці як нейкія практыкі. У паліталёгіі, па-мойму, тут пазыцыі яшчэ больш завостраныя.

В.Б.: Мне здаецца, што я і пачаў казаць пра гэта. Выкладчыкі, якія працуюць у мяне, маюць вельмі ўскоснае дачыненьне да палітычнай навукі. Я разьмяжоўваю: мы ў гэтым выпадку выкладчыкі, а не палітолягі. Палітолягі займаюцца хутчэй практыкай. Альбо чыстай навукай, хаця, адпаведна ідэі, якраз у ВНУ і павінна быць навука.

У.А.: Вельмі добра відаць на прыкладзе філязофіі. Калі чалавек гаворыць: «Я філёзаф», яму скажуць: «Знайшоўся Сакрат». А тут - я выкладаю філязофію. І ўсё зразумела: чалавек ажыцьцяўляе пэўную практыку па трансьляцыі ведаў.

А.К.: Я думаю, выкладаньнем палітычная навука Беларусі не абмяжоўваецца. Варта выдзеліць тры асноўныя сэктары, якія так ці інакш можна далучыць да палітычнай навукі. Першы - акадэмічная палітычная навука (мы сюды не ўлучаем тых людзей, якія проста выкладаюць, але толькі асобаў, якія самі праводзяць палітычныя дасьледаваньні - як тэарэтычныя, так і

практычныя). Другі - тое, што можна назваць дзяржаўнай паліталёгіяй, якая канцэнтруецца ў Адміністрацыі прэзыдэнта, інстытутах пры Адміністрацыі прэзыдэнта. Трэці - апазыцыйная паліталёгія. Натуральна, што крытэры навуковасьці ў розных сэктарах розныя і могуць адрозьнівацца ад «звыклых» для акадэмічнае навукі. Але як фэномэн таго, што ўспрымаецца як навука, яны існуюць.

В.Б.: А ці ёсьць тыя, хто ўспрымае афіцыйную паліталёгію як навуку?

А.К.: Прынамсі мы павінны ад пачатку лічыць гэта навукаю, пакуль не даказана адваротнае. Інакш мы аўтаматычна займаем некрытычную ў адносінах да сябе пазыцыю. Я цалкам успрымаю гэта як навуку і ня бачу прынцыповай розьніцы паміж тымі палітычнымі тэкстамі, якія робяць у Адміністрацыі прэзыдэнта, і пэўнымі дысэртацыйнымі дасьледаваньнямі. Калі мы будзем рабіць аналіз, пазбаўлены ідэалягічнасьці і загадзя абумоўленага стаўленьня, то прыйдзем да такіх самых высноваў. У іх іншая лёгіка, іншыя правілы, але яны прадукуюць палітычную веду.

В.Б.: Хацеў бы вярнуцца да пытаньня, узьнятага раней. Дзе навуковыя часопісы, у якіх абмяркоўваліся б актуальныя праблемы палітычнай навукі? Калі мы кажам пра палітычную навуку, яна павінна сябе неяк праяўляць. Няма часопісаў такога профілю («Беларускую думку» ня станем згадваць). Канфэрэнцыі такога профілю павінны адбывацца: на іх, як на спаборніцтвах, сустракаюцца навукоўцы і сутыкаюцца інтарэсы. Трэба прааналізаваць абароненыя дысэртацыі (у нас іх небагата: доктарскіх - зь дзясятак). Вось гэта і ёсьць паказьнікі палітычнай навукі: тэксты, навуковыя дасьледаваньні. Калі дасьледаваньне было, трэба глядзець, які рэзананс яно атрымала, бо супольнасьць палітолягаў - гэта заўжды рэзананс, абмеркаваньне, калі нешта адбылося. Жыцьцё палітычнай навукі праяўляецца ў канкрэтных рэчах: часопісах, канфэрэнцыях, абаронах дысэртацыяў. Калі гэтага няма, як мы можам даказаць, што існуе палітычная навука?

Ніна Антановіч, выкладчыца катэдры паліталёгіі БДУ: У рамках той дыскусіі, што тут адбывалася, розьніцы паміж

палітычнай навукай і навуковым камунізмам не праглядаецца ніякай. Вялікая праблема была ў тым, як даказаць, што паліталёгія існуе і нечым адрозьніваецца ад сацыялёгіі й г. д. Што датычыць беларускай палітычнай навукі, дык тут адназначна казаць пра крытэр навуковасьці пакуль нельга. У большай ступені трэба казаць пра наяўныя праблемы. Па-першае, аформленасьць, структураванасьць навукі, яе напоўненасьць - і тэарэтычная, і эмпірычная. Па-другое, паліталягічная супольнасьць. І было правільна пастаўлена пытаньне В. Бабровічам, што праблема прафэсіяналізму стаіць вельмі востра: якую веду мы павінны мець і як павінны выбудоўваць свае ўзаемадачыненьні з спэцыялістамі, якія вывучаюць тую ж спэцыяльнасьць, што і мы? Бо існуе ізаляванасьць паліталягічнай супольнасьці як ад сумежных дысцыплінаў, так і ўнутры сябе. І пакуль што мы не дыскутуем над наладжваньнем гэтых міждысцыплінарных сувязяў.

Ірына Суздалева, асьпірантка катэдры паліталёгіі БДУ:
Ёсьць цэлы комплекс пытаньняў, зьвязаных з разьвіцьцём палітычнай навукі і яе далейшым лёсам. Ці ператворыцца ў галоўную функцыю палітолягаў абслугоўваньне інтарэсаў палітычнай эліты? А для стварэньня супольнасьці палітолягаў патрэбная воля. Тое, што мы сабраліся тут сёньня, можа быць пачаткам.

Алена Сідаровіч, студэнтка аддзяленьня паліталёгіі БДУ:
Палітычная навука ў нас толькі зараджаецца. І праблема наша ў тым, што ў нас вельмі маленькі сацыяльны заказ. Калі ў нас будуць праводзіцца адпаведныя выбары, калі ў нас кандыдаты будуць зацікаўленыя ў высокім узроўні правядзеньня выбарчых кампаніяў, тады й палітолягі атрымаюць працу.

І другое. Некаторыя нашыя выкладчыкі, на маю думку, маглі б быць вельмі добрымі навукоўцамі-палітолягамі, калі б не насілі з сабой свае веды, а нейкім чынам афармлялі ў працы. Мы можам казаць пра амэрыканскую паліталёгію, пра французскую, нямецкую, цяпер ужо - нават пра расейскую, а пра беларускую - пакуль яшчэ не, бо ў нас няма арыгінальных працаў.

Аляксей Васюкоў, студэнт аддзяленьня паліталёгіі БДУ:
Наконт супрацоўнікаў Адміністрацыі прэзыдэнта. Чаму

«Адміністрацыя прэзыдэнта» - гэта лаянка? Яны - такія ж палітолягі, як і вы. Яны аб'яднаныя з вамі аднымі тэкстамі. Яны таксама прадукуюць веду: у іх ідэалёгія, і ў вас ідэалёгія - ідэалёгія эўрацэнтрызму. Толькі вы яе не паказваеце, а яны паказваюць. Яны гэтаксама могуць лічыць сябе палітолягамі, прадстаўнікамі палітычнай навукі.

В.Б.: Возьмем канфэрэнцыі. Прыйшлі б на канфэрэнцыю людзі з Адміністрацыі прэзыдэнта, выступілі б, я выступіў бы ў адказ, і тады высьветлілі бы, на чыім баку праўда. Я ніколі ня бачыў іх на канфэрэнцыях, не спрачаўся зь імі твар у твар. Размова пра тое, каб гэта ўсё было. Тады мы будзем казаць, што мы ўсе належым навуцы, толькі - розным канцэпцыям. Іншая рэч, што тых прадстаўнікоў палітычнай навукі могуць запрасіць на Беларускую тэлевізію, а нас - не. І як тут казаць пра раўнапраўе?

Пад заканчэньне мы пачалі казаць пра цікавае. Напрыклад, як узьнікалі катэдры паліталёгіі. Можа скласьціся ўражаньне, што ўсё было цэнтралізавана, хаця я ведаю, што ўсё было ня так: усё было хаатычна. І былі дзіўныя назвы ў той час. Катэдра, пры якой я вучыўся ў асьпірантуры, узяла сабе назву «катэдра палітычнай сацыялёгіі». Разуменьне паліталёгіі прыходзіла не адразу.

Занатаваў Зьміцер Дзядзенка

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/5
[image]

[image]
A R C H E **П а ч а т а к** **№ 3 (32) - 2004**
[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]
[image] [image] [image] [

вынікам абмежаваныя эканамічныя дамоўленасці. Рабіліся таксама першыя спробы стварэння еўрапейскіх вайсковых структур, аднак яны не далі плёну. Зрухі ў гэтым кірунку моцна падтрымлівалі не толькі хрысціянска-дэмакратычныя партыі еўрапейскіх краін, але таксама і сацыял-дэмакратычныя партыі. Ім рашуча супрацьстаялі камуністычныя партыі гэтых краін, разглядаючы дадзеныя структуры як адну з прыёмаў халоднай вайны. З пункту гледжання ЗША стварэнне еўрапейскіх структур здавалася зручным і пажаданым - як таму, што яны ўзмацнялі эканоміку еўрапейскіх краін і адпаведна рабілі з іх лепшых спажыўцоў амерыканскага экспарту і інвестыцый, так і таму, што яны здаваліся магчымым спосабам суняць боязь Францыі адносна пераўзбраення Нямеччыны і інтэграцыі яе ў NATO.

Пад 1960-я гады два складнікі раўнання пачалі, з пункту гледжання Штатаў, патроху мяняцца. Па-першае, Заходняя Еўропа занадта ўжо ўзмацнялася. У эканамічным сэнсе яна пачынала рабіцца роўнай Злучаным Штатам, а значыць выступаць у якасці патэнцыйнага канкурэнта на глабальным эканамічным узроўні. Па-другое, да ўлады ў Францыі зноўку прыйшоў Шарль дэ Голь. А Шарль дэ Голь хацеў палітычнай незалежнасці еўрапейскіх структураў, то бок каб яны не з'яўляліся падпарадкаваным сектарам стратэгічных геапалітычных рэсурсаў ЗША. І ў гэты момант энтузіязм Штатаў у дачыненні да еўрапейскага адзінства пачаў астываць. Аднак Штаты аказаліся палітычна няздольнымі заявіць пра гэта адкрыта, і ў сітуацыі адбываліся далейшыя зрухі. Камуністычныя партыі Заходняй Еўропы пачалі страчваць свой уплыў на выбарнікаў, а іх палітыка пачала мяняцца ў бок таго, што тады сталі называць «еўракамунізмам». Адным з наступстваў сталася змена ў стаўленні гэтых партый да еўрапейскіх структур, якія яны асцярожна пачалі падтрымліваць або прынамсі сталі ставіцца да іх цярпіма.

Гэта быў час, калі ЗША прайгравалі вайну ў В'етнаме, што даволі сур'ёзна пахіснула іх геапалітычную пазіцыю. Спалучэнне гэтага палітычна-ваеннага паражэння са з'яўленнем на сусветнай арэне буйных эканамічных канкурэнтаў у абліччы Заходняй Еўропы і Японіі азначала

Agriculture and the Origins of the European World Economy in the Sixteenth Century» (1974). Яны і сапраўдныя спадчыны «The Essential Wallerstein» (2001), «The Decline of American Power: the U.S. in a Chaotic World» (2003). Гэты тэкст друкуецца з ласкавае згоды аўтара. Copyright by Immanuel Wallerstein, 2004.

канец безумоўнай гегемоніі Злучаных Штатаў у сусветнай сістэме і пачатак павольнага спаду. Гэта патрабавала істотных зрухаў у замежнай палітыцы Злучаных Штатаў на змену суцэльнаму панаванню, што было ўласцівае папярэдняму перыяду. І змены пачаліся ў часы Ніксана - разрадка ў стасунках з Савецкім Саюзам і, што яшчэ больш важна, паездка ў Пекін і трансфармацыя дачыненняў ЗША і Кітаю. Ніксан ініцыяваў палітыку, якую я называю «мяккім мультылатэралізмам»*, палітыку, якую пасля будуць праводзіць усе наступныя амерыканскія прэзідэнты, ад Ніксана да Клінтана, з Рэйганам і Джорджам Бушам-старэйшым уключна.

У дачыненні да Еўропы галоўнай праблемай было тое, як зменшыць яе ўсё большае імкненне да палітычнай аўтаноміі. Мультылатэралізм мэтай дабіцца гэтага ЗША прапанавалі Еўропе геапалітычнае пабудовы «партнёрства» (то бок пэўны ўзровень палітычных кантактаў, пастаянных кансультацый) на двух франтах - «халоднай вайны», супраць Савецкага Саюзу, і палітычна-эканамічнага супраць Поўначы супраць Поўдня. Гэта меліся праводзіць удзельнікамі, шматлікія інстытуты, у іх ліку - Трохбаковая камісія, Вялікай Сямёркі і Сусветны эканамічны форум у Давосе. Праграма адносна «халоднай вайны» вылілася ў Хельсінкскія пагадненні. Праграма, што датычыла дачыненняў Поўначы, вылілася ў супрацьдзеянне распаўсюджванню ядзернай зброі, «Вашынгтонскі кансенсус» (на карысць неалібералізму і супраць стратэгіі развіцця) і стварэнню Сусветнай гандлёвай арганізацыі.

У 1970-х і 1980-х гадах можна было сказаць, што скарэктаваная замежная палітыка Злучаных Штатаў часткова прынесла плён. Хаця палітычная аўтаномія Еўропы і павялічылася – узгадайма пра Ostpolitik Нямеччыны* і газаправод, што злучыў Савецкі Саюз і Заходнюю Еўропу, - наагул Еўропа не надта далёка адышла ад Злучаных Штатаў у геапалітычным сэнсе. У прыватнасці, спробы стварэння еўрапейскіх узброеных сілаў былі паспяхова заблакаваныя супрацьстаяннем Злучаных Штатаў. На практыцы, хоць на словах гэтага не выяўлялася, ЗША на той момант ужо непрыхільна ставіліся да еўрапейскага адзінства.

Мультылатэралізм – палітычная пабудова з мэтай дабіцца супрацоўніцтва з партнёрамі, каб устрэчы прыступецца Хельсінкскія пагадненні, Поўначы, шматбаковых пагадненняў, якія канцэнтруе калектыўнасць у прыняцці рашэнняў і дазваляе кожнай дзяржаве наладжваць стасункі з усімі партнёрамі.

Заўв. пер.

Яшчэ больш паспяховай выглядала палітыка Злучаных Штатаў на паўднёва-паўночным фронце. Большасць краін Заходняга Свету пагадзіліся з палітыкай дапасавання да структурных патрабаванняў МВФ, і нават сацыялістычныя краіны цэнтральна-ўсходняй Еўропы рушылі ў гэтым напрамку. Расчараванне людзей нацыянальна-вызваленчымі рухамі, што прыйшлі да ўлады ў развіццёвых краінах, і камуністычнымі рэжымамі сацыялістычнага блоку заглушыла рэшткі сумненняў і спарадзіла ў асяроддзі левых ва ўсім свеце пачуццё змрочнага песімізму. І безумоўна, завяршальным «трыумфам» быў развал СССР.

Аднак жа гэты «трыумф» зусім не паспрыяў замежнапалітычным інтарэсам Злучаных Штатаў, і перадусім іх інтарэсам у Заходняй Еўропе. Бо ён ліквідаваў апошні важкі аргумент на карысць неабходнасці падпарадкавання Заходняй Еўропы сусветнаму геапалітычнаму «лідэру» ЗША. Садам Хусейн скарыстаўся гэтым момантам, каб кінуць адкрыты выклік Злучаным Штатам - крок, які ён нізавошта не здолеў бы зрабіць у папярэднія часы, у дні «халоднай вайны». Вайна ў Персідскім заліве скончылася замірэннем на той самай мяжы, дзе і пачалася, што па меры таго, як дзесяцігоддзе разгортвалася далей, здавалася Злучаным Штатам усё менш і менш дапушчальным. Тым не менш, Клінтан працягваў палітыку Ніксана - «мяккі мультылатэралізм» на Балканах, на Блізкім Усходзе і ўва Ўсходняй Азіі, а заходнееўрапейцы па-ранейшаму адмаўляліся адкрыта разрываць са Злучанымі Штатамі ў ключавых пытаннях. Тым часам, каб забяспечыць далейшую паслухмянасць Заходняй Еўропы, ЗША настойліва дамагаліся далучэння да еўрапейскіх арганізацый і NATO новых посткамуністычных краін Усходняй і Цэнтральнай Еўропы, адчуваючы, што гэтыя дзяржавы будуць ахвотна падтрымліваць і ўмацоўваць сувязі з ЗША і такім чынам паслужаць супрацьвагай аўтанамісцкім настроям, што былі ўжо з'явіліліся ў Заходняй Еўропе.

І тут на сцэну выйшаў Джордж Буш-малодшы і прыхільнікі жорсткай палітыкі. Яны лічылі ніксана-клінтанаўскую замежную палітыку надзвычайна слабай і бачылі ў ёй галоўны чыннік далейшага змяншэння моцы ЗША ў свеце. Выключна

пагардліва яны ставіліся да структураў ААН і асабліва стараліся стрымаць імкненне Еўропы да палітычнай аўтаноміі. На іхную думку, спосабам дасягнуць гэтага з'яўлялася сцвярджэнне моцы ЗША з унілатэралісцкіх пазіцый і пры дапамозе вайсковай сілы, з відавочна пераканаўчай нагляднасцю. За мішэнь імі быў выбраны Ірак (загадзя заяўлены ў гэтай якасці ў 1990-я гады) - з трох прычынаў: 1) вайна ў Персідскім заліве была «ганебнай» для ЗША, бо Садам Хусейн ацалеў; 2) Ірак стаўся б цудоўным пунктам для размяшчэння пастаянных амерыканскіх вайсковых баз на Блізкім Усходзе; 3) з ваеннага пункту гледжання Ірак з'яўляўся лёгкай мішэнню менавіта таму, што не меў зброі масавага паражэння.

Паводле тэорыі прыхільнікаў жорсткай лініі, заваяванне Іраку мелася паслужыць доказам абсалютнасці вайсковай перавагі Злучаных Штатаў і, такім чынам, прынесла б адразу тры вынікі. 1. Гэта застрашыла б Заходнюю Еўропу (і, ужо ў дадатак да яе, Усходнюю Азію) і спыніла б усе памкненні да палітычнай аўтаноміі. 2. Гэта застрашыла б усе краіны, што мелі намеры зрабіцца ядзернымі дзяржавамі, і вымусіла б іх адмовіцца ад любых спробаў атрымаць гэтыя віды зброі. 3. Гэта застрашыла б усе дзяржавы Блізкага Ўсходу і вымусіла б іх спыніць усе памкненні да таго, каб самасцвердзіцца ў геапалітычным сэнсе, і забяспечыла б прыняцце імі вырашэння ізраільска-палестынскага пытання на ўмовах, што адпавядалі б Ізраілю і ЗША.

Гэтая палітыка абярнулася суцэльным фіяска. Уяўна лёгкая мішэнь - Ірак - аказалася не такой ужо і лёгкай мішэнню. На цяперашні момант акупацыя ЗША сутыкаецца з супрацівам усё большага размаху, і гэта скончыцца як мінімум тым, што іракскі ўрад будзе зусім не такім, як хацелі б ЗША, а як максімум - поўным вывадам амерыканскіх войск, як гэта адбылося ў В'етнаме. Спроба раскалоць Еўропу на два лагеры - г. зв. «старую Еўропу» і «новую Еўропу» - мела толькі хвілінны поспех. Пасля выбараў у Іспаніі сітуацыя перамянілася з дакладнасцю да наадварот, і Еўропа ўпершыню пасля 1945 году стаіць на парозе зацвярджэння ўласнай геапалітычнай аўтаноміі. Пашырэнне ядзернай зброі не было запаволена. Яго,

калі ўжо на тое, хутчэй паскорылі. А краіны Блізкага Ўсходу адварочваюцца ад ЗША, а не хінуцца да іх (за выключэннем Лівіі, аднак і ў гэтым выпадку гэта можа быць не надоўга). А Ізраіль/Палестына застаюцца ў цалкам тупіковай сітуацыі, якая будзе захоўвацца, пакуль не выбухне так, што стрымаць ужо будзе немагчыма.

Унілатэралізм мача, якога трымаліся прыхільнікі жорсткай лініі, не прынёс поспеху, і гэтая палітыка заўважна страціла падтрымку ўнутры ЗША, нават у асяроддзі кансерватыўных рэспубліканцаў. Аднак якая маецца альтэрнатыва? Памяркоўныя рэспубліканцы або ў яшчэ большай ступені - дэмакраты-цэнтрысты прапануюць вярнуцца да «мяккага мультылатэралізму» часоў Ніксана-Клінтана. Ці гэта можа спрацаваць цяпер? Даволі сумнеўна. Амаль пэўна, што ў наступнае дзесяцігоддзе спакуса абзавесціся ядзернай зброяй прывабіць сама мала тузін краінаў, а ў наступную чвэрць стагоддзя ў нас будзе ўжо не восем ядзерных дзяржаў, а дваццаць пяць. Гэта паслужыць сапраўдным абмежаваннем вайсковай магутнасці Злучаных Штатаў. Не падобна, каб сітуацыя на Блізкім Усходзе змянілася хоць у якім-небудзь кірунку, што быў бы даспадобы Злучаным Штатам. Асабліва гэта датычыць Ізраілю/Палестыны.

Што наконт Еўропы? Еўропа на гэты момант уяўляе сабой найвялікшы пытальнік сусветнай геапалітыкі. Нават найбольш «праатлантычныя» еўрапейцы ўжо ставяцца насцярожана да амерыканскага дамінавання - і нават да «мультылатэралісцкай» Амерыкі. Аднак у Еўропы ўсё яшчэ застаецца адзін супольны інтэрас са Штатамі - супрацьстаянне Поўдню і Поўначы. Прыняцце сур'ёзнай агульнаеўрапейскай канстытуцыі ўсё яшчэ пад сумневам, асабліва калі ўлічыць, што аднаго адмоўнага галасавання ў любой асобна ўзятай краіне дастаткова, каб скасаваць любую дамоўленасць. У прыватнасці, еўрапейскія левыя яшчэ не пазбавіліся сваіх пасляваенных сумневаў адносна еўрапейскага адзінства і адпаведна не надта імкнуцца ад душы кінуцца ў стварэнне Еўраканстытуцыі. Гэта асабліва датычыць краін Скандынавіі і Францыі, аднак падобная насцярожанасць маецца амаль усюды.

Моцная незалежная Еўропа - першая і абавязковая цаглінка ў падмурку шматполюснага свету. Незалежная Еўропа, гатовая працаваць на карысць фундаментальных пераўтварэнняў сусветнай эканомікі ў кірунках, што насамрэч пачалі б пераадольваць цяперашнюю палярызацыю Поўначы і Поўдню, мела б яшчэ большае значэнне на сусветнай арэне. Абодва варыянты як найбольш магчымыя. Ніводны з іх зусім не з'яўляецца безумоўным.

15 траўня 2004 году

Пераклала з ангельскай Мілана Міхалевіч

паводле http://fbc.binghamton.edu/137en.htm

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/5
[image]

Уладзімер Лобач
Секс і эротыка ў беларускай традыцыйнай культуры

УЛАДЗІМІР ЛОБАЧ (нар. у 1972 у Навапалацку) - гісторык. Дацэнт катэдры гісторыі й сацыялёгіі ПДУ. Адзін з аўтараў энцыкляпэдычнага слоўніку «Беларуская міталёгія» (Мінск, 2004).

За апошнія 200 гадоў свет пабачылі тысячы даследаў беларускай традыцыйнай культуры. Іх значная частка з'яўляецца апісальнаю і вылучаецца «заангажаванасцю» даследчыка тымі ці іншымі ідэалагемамі, што выяўляецца ў выбары прыярытэтных кірункаў даследавання, г. зн. у штучным вылучэнні «больш каштоўных» і «менш (ці зусім не-) каштоўных» кампанентаў народнай культуры. Калі ў XIX - пач. XX ст. пераважалі тэмы, звязаныя з духоўнай спадчынай беларусаў (міфалогія, веранні, абрадавасць), а доследы матэрыяльнай культуры былі адзінкавымі, дык у савецкія часы (асабліва ў 1950-1980 гг.) надзвычайную каштоўнасць набылі сялянскія хаты, пуні ды гумны, а таксама аблавухі, збаны ды сохі, прычым толькі ў кантэксце іх непасрэднай функцыянальнай прызначанасці. У постсавецкі час (калі «этнаграфія» перайменавалася ў «этналогію», што нібыта мусіць сведчыць пра яе якасную метадалагічную трансфармацыю) акцэнтацыя ўвагі на духоўных феноменах народнай культуры падкрэслівала пошук уласнай нацыянальнай ідэнтычнасці ў сімвалах і стэрэатыпах традыцыйнай культуры.

Тэма сексуальнасці і эратызму ў традыцыйнай культуры была як бы няіснай для даследчыкаў. Іх унутраная «цэнзура» адносна гэтай тэмы мела грунтам абсалютна іншы тып ментальнасці, характэрны для індустрыяльнага грамадства і радыкальна адрозны ад светаўспрыняцця чалавека традыцыйнай (архаічнай) супольнасці. Практычна ўсе беларускія этнографы XIX - пач. XX ст. «апускалі» абрад «пакладання маладых», ці «каморы», у апісанні традыцыйнага вяселля. Матывацыя была прыблізна падобная тлумачэнню А. Багдановіча адносна «каморнай песні», якую ён не прывёў «з-за яе суцэльна нецэнзурнага зместу». Дыскрымінацыя «вясковага інтыму» да таго ж актыўна праводзілася з боку хрысціянскай царквы, прадстаўнікі якой традыцыйныя абрады з элементамі эротыкі характарызавалі як грахоўныя. Так, полацкі праваслаўны святар І. Блюдзінскі ў 1872 годзе назваў «Жаніцьбу Цярэшкі» гульнёй *«цёмнай і гранічна амаральнай»*. З іншага боку, этнографы ініцыявалі свае кантакты з вёскай звонку і не заўсёды знаходзілі адэкватны водгук. Напрыклад, зафіксаваная колькасць «каморных песняў» у параўнанні з песнямі, што суправаджалі іншыя этапы вяселля, мізэрная, бо сама прысутнасць чужога пры пакладзінах маладых выглядала недарэчнасцю. Тое ж датычыцца і т. зв. «брахлівых», «тлустых» песняў радзіннага рытуалу, зафіксаваць якія «па-за падзеяй» значна цяжэй, чым каляндарна-абрадавыя спевы. Гэтыя акалічнасці вялі да стварэння скажонага вобразу беларусаў, якія дзякуючы свайму фальклору і чараўніцтву лічыліся ледзь не роднымі ўнукамі Ўсяслава Чарадзея, а ў сферы сексу выглядалі недаразвітымі цельпукамі.

У савецкі час у выданнях беларускага фальклору «саромныя» выразы ці словы часцяком прапускаліся ці замяняліся «чытэльнымі», што ламала сэнс, сімволіку і рытміку аўтэнтычных тэкстаў. Шэраг фальклорных твораў эратычнага зместу ўсё ж траплялі на старонкі друку, найчасцей з прычыны поўнага неразумення выдаўцамі іх семантыкі. Так, напрыклад, цытуючы вясельную песню, дзе грыб сімвалізуе жаніха і ягоны актыўны пачатак, Мікалай Нікольскі зрабіў выснову, што падобныя матывы сведчаць пра з'яўленне такіх песняў у эпоху матрыярхату, калі вырашальную ролю ў гаспадарцы людзей адыгрывала збіральніцтва. Кіруючыся такой логікай доследу,

трэба тады прызнаць і тое, што ў даўніну беларусы жылі з залатых радовішчаў, бо ў каляднай песні гаспадар наважвае ў сваёй святліцы «трыццаць пудаў і чатыры» чыстага золата. Майсей Грынблат, адзначыўшы, што частка песняў, прысвечаных узаемаадносінам кума й кумы, досыць фрывольнага зместу, сцвярджаў, што большасць з іх носіць «бязвінны» характар і распавядае пра прыязныя адносіны, што выяўляюцца ў частаванні кумам кумы арэшкамі, жывой рыбкай. Напэўна, М. Грынблат недастаткова быў знаёмы з рознымі жанрамі беларускага фальклору, іначай нават простае апісанне арэха ў загадцы *(Тонка стоя, слаба віся, сам касматы, кончык лысы)* выклікала б сумнеў у «бязвіннасці» падобных пачастункаў, тым больш у кантэксце радзіннага рытуалу.

Рэдкія выключэнні з правілаў, калі даследчыкі разглядалі эратычны кампанент у традыцыйнай культуры, не маглі разбурыць стэрэатып пра скрайнюю «цнатлівасць» і антысексуальнасць беларусаў на тле іх бязмернае працавітасці, кемлівасці і адухоўленасці. Вобраз Беларусі як «рэспублікі-партызанкі», культываваны ў масавай свядомасці ў паваенны час, ужо паводле свайго вызначэння не прадугледжваў аніякіх эратычных кантэкстаў.

Наша асноўная мэта палягае ў аналізе сексуальных паводзінаў розных полаўзроставых груп, характарыстыцы полавага (эратычнага) сімвалізму і вылучэнні ў рытуальнай прасторы традыцыйнай культуры беларусаў локусаў, найбольш насычаных эратычным зместам.

ЭРОТЫКА Ў ТРАДЫЦЫЙНАЙ МОЛАДЗЕВАЙ СУБКУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ

Аналіз фальклорных тэкстаў паказвае, што сімволіка міжполавых дачыненняў мае як бы тры ступені «празрыстасці». Найменш «празрыстая» яна ў межах моладзевай субкультуры; падчас пераходу з аднаго жыццёва-сацыяльнага статусу ў другі (вяселле) эратызм робіцца больш «адкрыты», і, нарэшце, эратычна-сексуальная семантыка «дэшыфруецца» падчас

«радзінаў», калі адпаведная сімволіка ўвасабляе ўласны сексуальны досвед кожнага з прысутных.

Хаця тэма міжполавых адносінаў асабліва актуалізуецца ў традыцыйнай культуры, пачынаючы з моманту дасягнення юнакамі і дзяўчатамі полавай і сацыяльнай спеласці, сексуальнасць чалавека (як адна з праяваў ягонай сацыяльнасці) дыягназуецца, рэгулюецца і праграмуецца ўжо адразу пасля ягонага нараджэння. Так, на Віцебшчыне лічылі, што калі нарадзілася дзяўчынка, то яе трэба «прыймаць» у мужчынскія нагавіцы, і абавязкова бацькавы, каб яе любілі мальцы, а хлопчыка трэба «прыймаць» у жаночую кашулю, і абавязкова ў кашулю маці, каб яго любілі дзеўкі. Пупавіну трэба было пераразаць на адлегласці трох пальцаў ад перавязі. Калі пупавіну адрэзаць бліжэй, то ў хлопчыка посік будзе занадта кароткі, а дзяўчынка будзе вельмі пажадлівай. Падчас першага купання дзяўчынкі ў ваду кідалі грошы й жуковіну, каб дзіця было багатае й шчаслівае ў пары. Тую ваду пасля дзевачкі вылівалі на парогі, каб выйшла замуж. Аднак карміць грудзямі падчас купання, асабліва хлопчыка, забаранялася, бо дзіця вырасце распусным. Каб гарантаваць дзіцяці фізічную прывабнасць у будучым, на Падзвінні існаваў звычай купаць дзяўчынку першы раз у вадзе з малаком, каб яна была белая з твару, а хлопчыка - у вадзе з півам, каб ён быў моцным і прыгожым. Сімволіка піва (хмелю), найшырэй разгорнутая ў вясельнай абрадавасці, абыгрывалася і ў сітуацыі, калі дзіця мачылася ў купель падчас хросту, - гэта азначала, што ўсе прысутныя «пап'юць піва» на ягоным вяселлі.

Аднак полавая ідэнтыфікацыя дзяцей наймалодшага веку была яшчэ няпэўнай. Гэта выяўлялася ў адсутнасці адрозненняў у адзенні (дзеці насілі даўгую сарочку), забавах і нават у іх «бясполым» найменні назоўнікамі ніякага роду («немаўля», «дзіця», «малое»). Пераход у групу падлеткаў («блазнаты», падшпаркаў») і сімвалічны акт полавай ідэнтыфікацыі адбываўся ў веку 6-8 гадоў. Падлеткавы перыяд, які цягнуўся прыблізна да 14 год, вылучаўся актыўнай сацыялізацыяй дзяцей у сферах «мужчынскай» і «жаноцкай» працы, што падкрэслівала іх полавую ідэнтычнасць.

Дасягненне шлюбнага веку (паўналецця), што супадае з перыядам юнацтва (з 14-16 да 20-21 году), характарызавалася не толькі біялагічнай (полавай), але і псіхалагічнай, сацыяльнай спеласцю чалавека, якая выяўлялася ў шматлікіх дзеяннях (гульнях) абрадавага характару. Таму нават індывідуальным асаблівасцям полавага развіцця ў традыцыйнай культуры надавалася і сацыяльнае «гучанне».

Перавага фізічнага пачатку над духоўным (прыроды над культурай) у развіцці дзяўчыны маркіравала яе акультурныя (амаральныя) паводзіны ў далейшым і падпарадкаванасць прыродным (не чалавечым) законам: *«Калі ў дзевачкі-падшпарка вельмі хутка растуць цыцкі… яна будзе вельмі падкая да мужчын, а затым хутка састарыцца, як грыб».* Празмерна «пышныя формы» асацыяваліся з праявамі жывёльнага свету (паказальна, што дагэтуль у моладзевым слэнгу Наваполацку непрапарцыйна вялікія грудзі пазначаюцца як «дойкі» ці «вымя»), былі аб'ектам жартаў і кпінаў і, у сваю чаргу, вымагалі «культурнай карэкцыі»: *«Мой жа ты тутулічка, / Прадай ты каровачку, / Купі мне шнуровачку! / А з мяне мальцы смяюцца, / Што ў мяне сіські трасуцца. / А з мяне мальцы бурчаць, / Што ў мяне сіські тырчаць!».* Пры «карэкцыі», як правіла, выкарыстоўвалі прыёмы кантагіёзнай магіі: для змяншэння велічыні грудзей іх некалькі разоў мачылі вадою, у якой абмывалі нябожчыка. Аднак, паколькі прыгожыя дзявочыя грудзі былі не толькі прыкметай полавай спеласці, але і аб'ектам эратычных перажыванняў з боку хлопцаў («з-за якіх любяць і за якія нібыта ненарокам хапаюцца»), большасць магічных прадпісанняў датычылася менавіта іх «правільнага» росту. *«Каб выклікаць рост грудзей, дзяўчына павінна есці як мага часцей «паскробышы», бульбу, рэпу, бручку і іншыя круглыя прадукты, сагрэўшы іх папярэдне за пазухай ля голага цела… Калі ж такімі сродкамі мэта не дасягаецца, дзяўчына павінна прыкласці сабе да смочак ці разнаполых шчанюкоў, ці кацянят… Чым дружней смакталі шчанюкі і кацяняты, тым хутчэй дзяўчыну ўпрыгожаць высокія грудзі».* З гэтай жа мэтай грудзі націралі хлапецкай шапкай ці, саджаючы хлеб у печ, скубалі *«за кожным разам тройчы цеста з лапаты»*.

Перыяд дзявоцтва адлюстраваны ў беларускім фальклоры

раслiннай сiмволiкай. Дзяўчына, якая дасягнула шлюбнага ўзросту, сiмвалiзуецца садовымi (ружа, яблыня, груша, чарэшня, вiшня) i палявымi (калiна, рута, бяроза) дрэвамi i кветкамi ў стадыi свайго квiтнення: *«На гародзе да на пераходзе / Там цвiла рожа чырвоненька, / Там хадзiла злiчна паненка, / Злiчна паненка, малада Аленка. / Яна тую рожу да сашчыпала, / Сашчыпала i вянок звiла, / Завiўшы вянок, пайшла ў танок»*.

Спеласць хлопца, як i дзяўчыны, таксама вызначалася бiялагiчнымi i культурнымi фактарамi. К 18 гадам хлопец мусiў выконваць практычна ўсе гаспадарчыя («мужчынскiя») работы. Аднак паколькi «культурнае будаўнiцтва» чалавека завяршалася толькi з уступленнем яго ў шлюб, цнатлiвасць хлопца выяўлялася ў пэўнай тэхналагiчнай недасканаласцi: цнатлiвы мужчына не ўмее пацэлiць каменем у цэль, не ўмее сячы сякераю па адным месцы. Полавая спеласць была натуральным вызначальнiкам пры дасягненнi шлюбнага ўзросту (*«яшчэ жанiлка не адрасла»* - пра фiзiялагiчна неразвiтага хлопца), але ўлiчвалася толькi ў кантэксце сацыякультурных вартасцяў юнака. Калi ён характарызаваўся акультурнымi якасцямi (прыдуркаватасцю, няўмельствам, скрайняй неахайнасцю i да т. п.), то набл iжаўся да ўзроўню дзiцяцi (несамастойнага, няўмелага, не здольнага сачыць за сабой) i выключаўся са шлюбнай катэгорыi: *«Што яго жанiць, калi ў яго са сракi ваніць?»*

Паўналецце юнака сiмвалiчна суадносiлася з вегетацыяй хмелю, радзей - барвiнкам i рамонкам: *«Цяпер буду жанiцiся. / На тычыне хмель развiўся, / на нiўцы ячмень ужо налiўся»*.

Перыяд знаходжання чалавека ў моладзевым калектыве доўжыўся ў сярэднiм ад аднаго да пяцi гадоў. На працягу гэтага перыяду асноўнай задачай моладзевай групы было стварэнне шлюбных пар праз абрадавыя гульнi i iншыя формы рытуальных паводзiнаў. Рытуальны характар моладзевых гульняў больш падрабязна праiлюструем на прыкладзе «Жанiцьбы Цярэшкi» - унiкальнай абрадавай дзеi, бытаванне якой амаль супадае з арэалам рассялення полацкiх крывiчоў.

Гульня рытуальнага зместу, у адрозненне ад гульнi побытавай, мела строгую суаднесенасць з «мiфалагiчна напружанымi»

пунктамі ў часе і прасторы. Яна выконвалася выключна зімой, у дні гадавых святаў, як, напрыклад, Каляды, Новы год і загавенне перад Вялікім постам. Непасрэдна «Жаніцьба» пачыналася апоўначы - у «нулявы» прамежак часу, які ў традыцыйнай беларускай культуры разглядаўся як найбольш аптымальны для камунікацыі з іншасветам (варожбы, замовы) і разнастайных магічных метамарфозаў.

Месца «ігрышча» - карчма - успрымалася як памежны пункт у прасторавай сістэме «свайго»/«чужога» свету. Абрадавы характар «Жаніцьбы» вынікае і з абавязковасці яе правядзення, і з «санкцыянавання» на яе правядзенне з боку дарослых. Сам сюжэт «Жаніцьбы» ў кантэксце зімовага сонцавароту, смерці старога светапарадку і стварэння новага, набываў касмічнае гучанне. У гэтым сэнсе знакавымі з'яўляюцца найменні дзейных асобаў, якія і заключаюць сімвалічны шлюб: Дзед і Баба. У вобразе Дзеда (абагульнена - Дзядоў) фігуруюць Продкі, Бог, хатнік і шэраг іншых прадстаўнікоў сферы сакральнага (вядомы быў і памінальны дзень «Бабы», у гонар продкаў жаночага полу).

Так, падчас Калядаў ажыўленне «казы» і, адпаведна, нараджэнне новага светаладу было магчымае толькі праз пачастунак-ахвяру з боку гаспадароў і сімвалічны полавы акт «казы» з прадстаўніком сакральнай сферы - Дзедам ці механошам: *«Каб наша козанька / Ды наелася, / Пад механошу / Павалілася. / Ну-тка, механош, / Дуй казе ў нос. / Надзьмецца жыла, / Будзе каза жыва»* ці: *«У нашага Дзеда / Такая жыла. / Такая жыла, / Каб каза жыва».* Гэткі ж сімвалічны сэнс мае і «папіханне» казы дзедавым кіем. Паколькі Кірыла Тураўскі да найбольш «багамерзкіх» грахоў нашых продкаў адносіў і «блуд со скотом», магчыма, пазначаны акт у дахрысціянскай абрадавасці мог насіць рэальны характар.

Аналіз фальклорнага матэрыялу (Цярэшка, Цялешка, Цяльпешык - у беларускіх казках - драўляны хлопчык) і функцыяў «Цярэшкі» дазваляе пагадзіцца з думкай аб фалічным характары гэтага персанажа, паколькі слова «церэх» у беларускай мове азначае «таўкач», які можна адназначна трактаваць як сімвалічны займеннік эрагаванага дзетароднага

органа мужчыны.

На пачатку «Жаніцьбы» дзяўчаты і хлопцы падзяляюцца на два шэрагі, прычым першы становіцца з левага, а другі - з правага боку, што сімвалізуе ў міфалагічным плане распад сусвету на дзве зыходныя кампаненты. Сама «Жаніцьба» - злучэнне пар, якім кіруюць абраныя з шэрагу жанатых Бацька і Матка, - у тэкставым плане санкцыянуецца выключна Цярэшкам, які з'яўляецца ў выглядзе механошы (прыгадайма механошу каляднага абыходу) і прыносіць кампаненты, неабходныя для заключэння шлюбу: *«Цярэшка, чаху, чаху, / Што ў цябе ў мяху, ў мяху? / - І шпілечкі, іголачкі, / Залаты пярсцёначкі, / Ёлачкі ды палачкі, / Дзецкія забавачкі».* Колючыя падоўжаныя прадметы гэтага шлюбнага набору сімвалізуюць актыўны мужчынскі пачатак, рэчы з адтулінай (мех, пярсцёнак, абаранак) - жаночы. Полавы сімвалізм гэтых рэчаў яскрава выяўляецца як у саміх «Цярэшках», так і іншых фальклорных тэкстах. Да прыкладу, у вясельнай тэматыцы парваны мех азначае адсутнасць цноты ў нявесты: *«Распароўся мех - і на бацьку грэх»*, а «голка» выступае ў якасці актыўнага фігуранта ў першую шлюбную ноч: *«Швачка была наша Васька, / Вышыла ўкруг падала / Тупой іглой без вушка / І чырвоным шоўкам»*. Зайздроснае ўмельства ў выкарыстанні сваёй «голкі» паказвае і «дзядулька» цярэшкавых прыпевак: *«Дзед бабе кажух шыіць, / Бабіна душа ныіць./ Дзед бабе кажух пашыў, / Сем раз на начы прасіў»*. Ідэнтычнае «прачытанне» мае і шпілька: *«Прыбег Хвілька, забіў шпільку. Ах, Хвілька, харошая твая шпілька! Прыбягай паскарэй, забівай пакрапчэй»* (загадка пра маслабойку). Характэрна, што слова «хвіль» ува ўмоўнай мове («Любецкі лемент») жабракоў Магілёўскай губерні азначала менавіта мужчынскі чэляс.

Тэма страты дзяўчынай цнатлівасці і, адпаведна, пераходу з дзявоцкага ў жаночы стан сімвалічна абыгрываецца на працягу ўсёй «Жаніцьбы». Найбольш тыповы сюжэт з «патапленнем» бабулькі дзедам: *«Дзед бабу тапіць вядзець, / А баба крычыць, ня йдзець. / - Хай цябе кадук бярэць, / Як ты мне хвартух дзярэш!»* Разрыванне «дзедам» хвартуха, які ў народнай традыцыі сімвалізаваў жаночыя геніталіі, а ягоная наяўнасць у дзяўчыны - яе цнатлівасць, указвае на сексуальны характар «патаплення» «бабулькі». Паказальна, што сам дзеяслоў «купацца» ўзыходзіць

да індаеўрапейскага кораню kup- са значэннем «кіпець, горача жадаць», а беларуская фальклорная традыцыя трактуе «намаканне» вянка як страту дзяўчынай цноты.

Аднак, у адрозненне ад вясельнага ці радзіннага фальклору, эратызм «Цярэшак» яшчэ не нагэтулькі «празрысты» і відавочны. Таму менавіта іх супастаўленне з іншымі жанрамі, перадусім з сямейна-абрадавымі песнямі, дапамагае «прачытваць» глыбока прыхаваны сэнс нібыта бяскрыўдных сітуацыяў: *«Пайду я кароў даіць, / А за мной жа бык бяжыць. / Каб цябе каршун задраў, / Як жа ты мне хвартух парваў!»* Тэма, пазначаная сімволікай хвартуха, акцэнтуецца тут і вобразам раз'юшанага быка, убачыць якога ў сне абазначае нараджэнне сына, а ўдар ягонымі рагамі - тое, чаго наяве «чалавек дабіваецца ад жанчыны».

Дашлюбныя полавыя зносіны, не санкцыянаваныя вясельным рытуалам, атаясамліваліся з выхадам, «выпадзеннем» са сферы Культуры, уваходжаннем чалавека ў зону Прыроды, дзе дзеянні не рэгламентаваныя ніякімі нормамі: *«Пападдзя пшанічку жала, / У полі заначавала. / У полі пад ёлкаю / З маладым Міколкаю»*. Паколькі нашымі продкамі елка з шышкамі лічылася фалічным дрэвам, то начоўка дзяўчыны «пад елкаю» мела адназначную дэшыфроўку. Так, радзіна маладога кпіла з нецнатлівай нявесты наступным чынам: *«Ці пад еллю спала? / Ці шышка ўпала? / Ці кароў даіла? / Ці на рог прабіла?»*

Эратычны кантэкст мелі ў «Цярэшках» і разнастайныя аперацыі з арэхамі: *«Выйду, выйду ў агарод, / У дзявоцкі карагод, / Арэшкі шчыпаючы, / Дзядульку шукаючы, / Арэшкі цатуючы, / Дзядульку цалуючы»*. Арэхі, якія сярод іншых «падарункаў» прыносіць Цярэшка, з'яўляюцца андрагінным (які ўвасабляе мужчынскі і жаночы пачатак адначасова) сімвалам, што і абыгрываецца ў фальклоры. Так, знешні выгляд арэхаў (*Па чатыры, па пяць залупіўшыся вісяць*) трывала суадносіў іх з актыўным мужчынскім пачаткам, але парожняя структура, у якой нараджаецца ядро, збліжала іх з вобразам жаночага ўлоння. У Юраўскіх і Купальскіх песнях часта сустракаецца сюжэт, дзе арэх з ядром («сярэдзінай») ідэнтыфікуецца з дзявоцкасцю і супрацьпастаўляецца мужчынскаму пачатку,

сімвалізаванаму маналітным (без ядра) камянём. Адсюль збіраць, лушчыць, трушчыць арэхі - пазбаўляць дзяўчыну цнатлівасці. Так, у архаічнай абрадавай гульні «Яшчур» (выконвалася, як і «Жаніцьба», на Каляды) апошні характарызаваўся наступнымі словамі: *«Сядзіць, сядзіць яшчар! / У зялёным крэсле, / У ласкавым кусце, / Гарэшыкі трушча. / Бяры сабе паненку, / Каторую хочаш»*. Яшчэ больш выразна сімволіка арэха агучваецца ў «каморнай» песні вясельнага абраду, якая ўхваляе «непарушанасць» нявесты да шлюбу: *«А добра наша Манечка чыніла, чыніла, / Што не хадзіла ў цёмныя лясы ў арэшкі, арэшкі, / Не нарабіла сваёй радзіне насмешкі, насмешкі»*.

Тэма міжполавых дашлюбных адносінаў адлюстравана ў «Цярэшках» з умоўнай назвай «Паіла коніка ў вядрэ», дзе конь выступае сімвалам мужчынскага, а вядро з вадой - жаноцкага пачатку: *«Паіла коніка ў вядрэ, / Відзіла я рыбку на дне. / Смачная рыбачка карась, / Пацалуй, дзядулечка, хоць раз»*.

Параўнанне незамужняй дзяўчыны з напоўненым посудам прысутнічае і ў вясельным фальклоры (на запоінах - сватам): *«Вазьміце яе, расціце яе, / Недарошчаную дзевачку. / Вазьміце яе, дапіце яе, / Залатую чарачку»*. Адсюль «рыбка на дне» фігуруе ў тэксце невыпадкова: *«Так нікому не ўдалося, / Як мне, беднай сіраце: / З'ела рыбку-трапятушку - / Трапечацца ў жываце»*.

Прагаворванне ўсіх іпастасяў «эратычнай тэмы», абавязкова ў дасціпнай форме, стварала ў моладзі пэўны сексуальны досвед, які разбураў мажлівыя комплексы ў сферы рэальных полавых адносінаў і ўводзіў іх у пачуццёва-цялесны свет «дарослага» жыцця значна лепей, чым сучасныя заняткі сямейнай этыкі, падчас якіх старэйшае пакаленне спрабуе навязаць уласныя сексуальныя фобіі сваім нашчадкам.

Адной з формаў «пранікнення» ў «дарослую» тэму былі двухсэнсоўныя загадкі, дзе адна з адгадак насіла падкрэслена эратычны характар, але «правільны» адказ быў бяскрыўдным. Прывядзем толькі некаторыя з іх: *«Рос, рос, вырас, з цёмнага вылез, на свет паказаўся, з дзеўкамі пакахаўся»* (арэх); *«Каб не дзедава качалка, сохла б бабіна мачалка», «У дзеда вісіць, у бабы ззяе, дзед папросіць - баба дае»* (калодзеж з журавом); *«А ў*

нашага татулькі залатыя баўтулькі, як забаўтаюцца, дык усе здагадаюцца», «Сярод сяла вісіць кіла» (звон); *«Стаіць поп на масту, крычыць: «Гвалт, абасцу!»* (самавар); *«Каб не дзедава рамяство, у бабы б па калені адрасло»* (венік); *«Без костачкі, без жылачкі, адзін састаў і той устаў»* (цеста ў дзяжы); *«Гагалёк бабу качае»* (венік у лазні); *«Зверху чорна, усярэдзіне - красна, як надзенеш - будзе пракрасна»* (калёшы).

Сімвалічны характар «Жаніцьбы», нягледзячы на «праграму-максімум», што ставілася перад «маладымі» *(«Мая ж ты жанулечка, / Я ж твой мужулечка! / Мы ж будзем на свеце жыць, / Мы ж будзем дзяцей пладзіць, / Мы ж будзем гарэлку піць, / Мы ж будзем дзяцей жаніць»)*, не вымагаў практычнай «рэалізацыі» тэмы: *«Ня топай, дзядулька, нагой, / Ня лягу я спаць з табой, / Бо я невянчоная / - На вечар злучоная»*. Прычым «спаць» у гэтым сэнсе азначала «выконваць шлюбны абавязак» і не выключала сумесных начовак моладзі. Так, у адным найбольш раннім апісанні «Цярэшкі», зробленым на поўдні сучаснай Лепельшчыны, «хлопцы і дзеўкі… пад канец вечару, далёка за поўнач, па папярэдняй згодзе кладуцца спаць парачкамі». Патрабаванне звычаю захоўваць пры гэтым цнатлівасць выконвалася далёка не заўсёды.

Звычай «падначовак» шырока практыкаваўся ў моладзевым асяроддзі на працягу ўсяго году, асабліва ўлетку і ўвосень. Гэтая тэма часта сустракаецца ў нашым фальклоры: *«Гарбуз белы, салодзенькі, / Прыйдзе ка мне малодзенькі. / Каб боцікі не скрыпелі, / Каб падкоўкі не звінелі, / Каб матуся не слыхала, / З кім я ночку начавала»*. Сітуацыя выбару шлюбнага партнёра часам прыводзіла да таго, што «да дзяўчыны, каб пераначаваць з ёй, уваходзяць такім чынам два ці тры хлопцы, па чарзе ці нават усе адразу». Прычым, натуральна, «выбірала» не толькі дзяўчына: *«Казаў бацька, каб я ажаніўся, / Каб па ночах не хадзіў і не валачыўся, / А я - хлопец добры, я не валачуся: / Дзе дзеўку пачую, там і заначую. / У адной спаў я, у другое ўпіўся, / А ў трэцяй на пячы нагавіц забыўся»*.

«Падначоўкі» не маглі быць цалкам незаўважнымі для бацькоў дзяўчыны *(«Як мамуля ўслышала / Да старому праведала: / - Устань, душка, устань, душка, / Ест у Касі нехта ў ложку»)*,

але бацькі «заплюшчвалі вочы» на іх: *«А маці не спала, / Ды й усё чыста чула. / Мяне не сварыла, / Сама такая была»*. Аднак часам сітуацыя магла выходзіць з-пад кантролю і прыводзіць да незапланаваных наступстваў: *«Ці я табе не казала, ці не гаварыла, / Не кладзіся са мной спаць, бо будзе Гаўрыла./ А ён мяне не паслухаў, усё пры боку клаўся. / Цяпер сама не знаю, скуль Гаўрыла ўзяўся. / Цяпер, мая маці, гані за кумамі, / А Гаўрыла на пячы шоўгаіць нагамі»*.

Найбольшая небяспека страціць свой «вянок» (цноту) для дзяўчыны была звязана з моладзевымі ігрышчамі, у сваю чаргу цесна суаднесенымі з самымі значнымі святамі каляндарнага цыклу (Каляды, Масленка, Купалле). У прыватнасці, канфліктная сітуацыя паміж дзяўчынай і бацькамі магла ўзнікнуць па яе вяртанні з Юраўскіх карагодаў: *«Што ў цераме / Крычыць, плачыць? / - Юр'ева маць / Доньку біла :/ - А дзе, донька, / венчык дзела?»*

Аднак ці не самым эратычна насычаным святам было Купалле. Страта цнатлівасці сімвалізавалася стратаю дзявоцкага вянка *(«Купалначка дачку біла: - Дзе ж ты, шэльма, вянок дзела?»)* ці намаканнем хвартуха *(«- Чаму ў цябе, дзіцятка, хвартух мокры? / - Малайцы, бацюшка, купаліся / Да маім хвартухам уціраліся»)*. Тое ж значэнне, што і страчаны вянок, мела на сімвалічным узроўні і расплеценая дзявоцкая каса: *«Ужо на дварэ сонейка ўзыходзіць / - Каралёва дачка з вулачкі прыходзіць. / Яе шаты сцерты, змяты, / Яе косачка растрапана, / Яе вочачкі заплаканы»*. Наступствы купальскай «гульні» маглі быць пэўнымі: *«На вуліцы чабор гарыць, / А ў дзевачкі жывот баліць. / «Ой, жанішка, ратуй, ратуй, / Калыбельку гатуй, гатуй»*. Невыпадкова, што ў Дабравешчанскіх (25 сакавіка) вяснянках, якія гучаць не раней за 9 месяцаў пасля Купалля, ёсць сюжэт пра дзяўчыну з пазашлюбным дзіцём: *«Воран грача - сын бяленькі, / Дзеўка плача - сын маленькі. / Воран грача паляцець, / Дзеўка плача - недзе дзець»*.

Узаемадачыненні моладзі не абмяжоўваліся рамкамі святочных ігрышчаў. «Небяспека» магла падпільноўваць дзяўчыну і ў будзённым жыцці. Хлопец мог скарыстаць любы зручны момант: *«Як у полі, ў полі / Пасець дзеўка коні. / Прыйшоў да е*

Якаў, / Ставіў дзеўку ракам». Не засмучалі гэткага зуха ні надвор'е, ні адсутнасць хатняга камфорту: *«Каб гэтага каваля / Мяцеліца замяла! / Як ён мяне маладу / Паваліў на ляду»*. Дасягнуць сваёй мэты хлопец мог толькі са згоды дзяўчыны: *«Я на вуліцы была, / Я відзела Ясю. / Хацеў мяне паваліць* (варыянт: *абáбіць*), */ А я не далася»*.

У беларускім фальклоры падман дзяўчыны і гвалт над ёю, як правіла, прыпісваецца «чужым» элементам, адрозным і паходжаннем, і родам заняткаў. Найбольшая небяспека пагражала дзявоцкай чысціні з боку казакаў, жаўнераў, уланаў, гусараў.

Так, сюжэт шырока вядомай на Палессі і ў памежных беларускіх рэгіёнах песні «Галя» заключаецца ў падмане казакамі дзяўчыны (абяцаючы добрае жыццё, забіраюць яе з сабою), якая за сваю даверлівасць расплачваецца цнотай: *«Намовілі дзеўку з чорнымі брывамі, / Да павялі яе цёмнымі лясамі, / Увязалі яе да сосны касамі. / Падпалілі сосну з верху і з ісподу…»* Сімволіка «палаючай сасны» і страчанай касы выразна ўказуюць на страту дзяўчынай цнатлівасці праз гвалт ці, як мінімум, пры адсутнасці «любосці» з яе боку: *«За лесам, за лесам / Сасна гарэла. / Малада дзевачка / Вадзіцу грэла. / Вадзіцу грэла / Шкляначкі мыла. / Шкляначкі мыла, / На Дунай пусціла…/ - Скажыце, шкляначкі, / Маёй мамачцы, / Што я гэту ночку / Не ў любосці спала. / Не ў любосці спала, / Не ў цалосці ўстала»*.

Патэнцыйную сексуальную пагрозу таілі ў сабе людзі, якія хоць і належалі да вясковай грамады, але адрозніваліся ад земляробчай большасці характарам сваіх заняткаў (у міфапаэтычнай карціне свету яны надзяляліся звышнатуральнымі ўласцівасцямі): каваль *(«Маладыя кавалі / Дзяўчоначку пунялі. / Цераз рэчку, цераз мхі, / Палажыўшы на мяхі»), шавец («Жаль мне тога шаўца, / Што ня верніцца: / Абшыў дзеўцы падальца - / Ні павернецца»)*, млынар, рыбак, вясковы поп.

Такім чынам, з катэгорыі шлюбнага партнёра дзяўчыны выключаліся прадстаўнікі іншых этнічных супольнасцяў і сацыяльных груп.

Падобныя прынцыпы былі задзейнічаны і ў выбары нявесты для хлопцаў: *«Я паеду у Масквy / Ды маскоўку вазьму; / Я паеду ў Вільню / Ды вільнянку вазьму; / Я паеду на места / Ды мяшчанку вазьму; / Я паеду ў сяло / Ды сялянку вазьму. / Ды маскоўка-шэльма, / Ды гатуй вячэру; / Ды вільнянка-шэльма, / Ды вячэру паднасі; / Ды мяшчанка-шэльма, / Ды сцялі пасцелю; / Ды сялянка-душка, / Ды кладзісь са мною»*.

Узор дзявоцкай прыгажосці (гэтаксама як і хлапецкай) насіў максімальна абагульнены характар: «красна дзеўчына», «чарнабрыва», «чорныя вочы, на ліцо бялява» ці «руса каса, сіні вочы, бела лічанька» і да т. п. У плане іншых дзявоцкіх вабнотаў перавага аддавалася «пышным» формам: *«Не вары кашу густую, / Вары жыдзенькую. / Не бяры жонку худую, / Бяры сыценькую»*.

Аднак пры ўсіх раскладах, акалічнасцях, асабістых жаданнях і вонкавых перашкодах дзявоцкая і хлапечая «гульня» раней ці пазней мусіла скончыцца ўзяццем шлюбу і стварэннем сям'і. Адзіным інстытутам у традыцыйнай супольнасці, які санкцыянаваў шлюб і легітымізаваў сям'ю, быў звышскладаны абрад вяселля.

ЭРАТЫЧНЫ КОД БЕЛАРУСКАГА ВЯСЕЛЛЯ

Ідэя стварэння сямейнай пары, якая ёсць першаасновай шлюбу, мае выразны касмаганічны сэнс: супрацьпастаўленыя, але адначасова ўзаемадапаўняльныя часткі складаюць якасна новае адзінае цэлае, што і гарантуе касмічны (сацыяльны, культурны) парадак. Адсюль рытуальны аспект узяцця шлюбу (вяселля) быў максімальна разгорнуты і сімвалічна насычаны. Выключэннем з гэтага правіла магло быць толькі «покрыцкае» вяселле, калі маладая была ўжо цяжарнай. У гэтым выпадку вясельны рытуал быў абмежаваны і сціплы: *«Не час малі́цца, калі з-за пазухі вали́цца»*.

Вяселле сімвалізавала паўтор двух асноўных жыццёвых пачаткаў адначасова: сыходу (смерці) і прыходу (нараджэння).

Шлюбную абрадавасць можна падзяліць на дзве часткі: сімвалічнае паміранне жаніха і нявесты ў сваім моладзевым статусе і нараджэнне якасна новых людзей - мужа і жонкі.

Ужо падчас сватання галоўныя функцыі выконваюцца сватамі з боку хлопца і бацькамі - з боку дзяўчыны. Актыўнасць маладых зводзіцца да мінімуму - яны амаль не размаўляюць, а рухі абмежаваныя. Пасля засватання (заручын) хлопец і дзяўчына атрымліваюць прамежкавы статус: «князь» і «княгіня», і яшчэ больш «мярцвеюць» для сваёй узростава-полавай групы - не ўдзельнічаюць у вячорках, моладзевых забавах, іх з'яўленне паза хатай жорстка абмежаванае.

Апагеем сімвалічнай смерці старога статусу быў Пасад. І для жаніха, і для нявесты Пасад, па сутнасці, быў актам сімвалічнай дэфларацыі, калі яны гублялі сваю маладзецкую або дзявоцкую «красу» - базавую характарыстыку іхняга ранейшага статусу.

Мэтай вясельнага абраду было не фармальнае злучэнне маладых у адну сям'ю, а забеспячэнне новай сям'і *шчаснай доляй*, - ёй жадалі нараджэння здаровых дзяцей, а ўжо потым - гаспадарчага дабрабыту.

Паколькі ў ідэале першы сексуальны досвед маладыя атрымлівалі падчас вяселля («каморы»), а асноўнымі дзеячамі вясельнага рытуалу былі дарослыя, сямейныя людзі, то эратычны сімвалізм насіў больш празрысты характар. Ужо пачынаючы са сватання актыўна выкарыстоўваліся рэчы з выразнай сексуальнай сімволікай.

Найбольш насычанымі эротыкай былі этапы вяселля, звязаныя з выпечкай каравая і «пакладзінамі» маладых. Галоўнай ідэяй, якую ўвасабляў каравай як сімвал Долі, была ідэя плоднасці, нараджальнасці, ураджайнасці. У гэтым сэнсе ён выступаў своеасаблівай матрыцай будучага сямейнага жыцця маладой пары. Яшчэ ў XIX ст. на караваі размяшчалі выявы спарвання самца і саміцы: певень на курыцы, гусак на гусыні, кабан на свінні, а таксама вобразы родавых мужчынскіх і жаночых органаў. І нават на пачатку XX ст. у Вяліжы каравай пёкся жанчынамі пад спяванне «саромных» песень, убіраўся таксама

саромнымі фігурамі, напрыклад фігурай мужчыны, які трымаў у руках свой penis вялікага памеру. Выраб каравая, пачынаючы ад самых першых аперацыяў, прыпадабняўся зачаццю і нараджэнню дзіцяці, дзе функцыі жаночага ўлоння выконвала хлебная дзяжа і печ. Так, месячы цеста, каравайніцы спявалі: *«Караваю-раю, цесцечка, / Чатыры калені ўмесцечка»* ці: *«Тупнула не памалу, / Падкацілася пад лаву, / Падкацілася пад Грыца, / Бо я яго маладзіца»*. Само пасаджэнне каравая ў печ усведамлялася як сімвалічны полавы акт, дзе каравай - увасабленне мужчынскай апладняльнай сілы, а печ - дзетароднага жаночага пачатку: *«Даўно печка зіяе, / А прыпечак рагоча, / Печ каравая хоча»*.

Прачытваецца гэтае значэнне пірага і ў жартоўных песнях вясельнага застолля: *«Не сядзі, сватка, ля сцяны, / Нашы дзеўкі жартаўлівы: / У сцяне дзіркі круцілі, / З тваёй кішэні, сватка, / Піражок дастаць наравілі. / Пад прыпечкам мышка піснула, / Свацця піражок сціснула. / Сват пірага не дае, / Дамоў дзецям панясе. / Не так дзіцяці - / Як старой свацці»*.

Пасля таго як каравай вымалі з печы, ён канчаткова набываў рысы жывой істоты: *«Дайця мне пасашок падпірацца, а да клеці дабрацца! А рагат я, багат, а ў малыя дзверкі не ўлезу»*.

Пэўныя «эратычныя вольнасці» гучалі і ў «вясельнай бяседзе», дзе галоўным аб'ектам жартаў былі сват (маршалак) і свацця (радзей дружка маладога). Звычайна гэтым персанажам прыпісваліся розныя «непрыстойнасці»: *«Сват сваньку разуваў, / Андарак разадраў, / Падняў ножку, пазіраў…», «Прыехаў маршалак - мешчанін / Ды ў лаву яйца зашчаміў. / Тузаў, тузаў, тузаў, не выняў - / Застагнаў, заплакаў, закрычаў. / А хто ішоў міма - не мінуў, / Усялякі пугай сцебануў»; «Сядзіць дружко на лаўцы, / Спусціў булаўку пад лаўку. / Да прыбег курмяўко, / Да ўхапіў дружкаву булаўку. / Да «кыцы, кыцы» курмяўку, / Аддай маю булаўку, / Дам табе мяса дзялянку»*. Часам заняткі свата і свацці выглядаюць амаль што «нявінна»: *«Да ўсе гаруць, барануюць, / Сват сваньцы хвартух шые, / Шые ніткаю, трасе лыткаю…»* Самое памяшканне (камора, клець), дзе клалі маладых спаць, было ўвасабленнем дабрабыту, дастатку (шырэй - Долі) усёй гасподы - там захоўваліся прадукты

харчавання, збожжа, найбольш каштоўная маёмасць. «Спор» дабра, што захоўвалася ў каморы, мусіў станоўча ўздзейнічаць на патэнцыю маладых, а плодная патэнцыя маладой шлюбнай пары, у сваю чаргу, спрыяла павелічэнню дабрабыту ўсёй гаспадаркі. Акрамя таго, усе гэтыя памяшканні (камора, клець) аб'ядноўвае тое, што яны халодныя, не маюць абразоў і іншых культурных сімвалаў, знаходзяцца ў межах засвоенай тэрыторыі. Прамежкавы, паміж «прыродай» і «культурай», статус гэтых памяшканняў падкрэслівае такі ж самы, па сутнасці, статус жаніха і нявесты.

У адрозненне ад цяперашняй сітуацыі, калі «пакладзіны» маладых азначаюць перапынак у вясельных урачыстасцях, раней рытуал не перапыняўся ні на хвіліну. Пакінуўшы жаніха і нявесту адных, госці пачыналі танцаваць, спяваць, жартаваць. Смех і жарты былі прыкметамі жыцця (мёртвыя не смяюцца) і адзнакай «свайго» свету (смех не ўласцівы нячысцікам - адно страшны рогат), а таму выступалі ў якасці дзейсных абярогаў ад магчымага ўздзеяння нячыстай сілы. Эратычны ж змест «калінак» (каморныя песні), з улікам веры ў рытуальную, магічную моц слова, толькі накіроўваў стваральную энергію на саму камору.

Дэфларацыя нявесты на фалклорным узроўні апісвалася як акт першага ворыва: *«Закладайце быкі-неўкі ў вярмо / Да будзем навінаньку й араці»*. Адпаведна мужчынскі полавы орган выступаў у якасці земляробчай прылады: *«Казалі нам, Сямёнка гультай, - / Залатую сошаньку напраўляў, / Чорную аблогу раздзіраў»*. Каб «саха» не схібіла ў адказны момант, былі прадугледжаны адмысловыя ўзбуджальнікі. Дружка з маладзіцамі вялі маладых у клець, дзе жаніха распраналі і клалі ў пасцель. Потым распраналі дагала маладую - «каб у жаніха разгаралася любоў к сваёй нявесце».

Даволі распаўсюджанымі былі песні, дзе маладыя выступаюць у вобразе жывёлаў (лісіца і заяц), птушак (голуб і галубка; качар і «вутка») і нават жамяры (камар ды муха). Полавыя ўзаемадачыненні паміж імі «закамуфляваны» жартоўным чынам: *«Да наша лісухна п'яна была, / Да на гародах спаць лягла. / Прыбег заюхна, лёг на яе, / Прачнулася лісухна - мокра*

ў яе: / Ды ці не быў жа ты, касы, ля мяне?» Часам авалоданне маладой паказваецца як ваенныя дзеянні, штурм і захоп маладым нейкіх умацаванняў: *«Куры, куры, да не пейце рана, / Да не пейце рана, не будзіце пана. / Ой, наш паночак з вайны прыехаў, / З вайны прыехаў, горад звяваў»*. Аднак у большасці выпадкаў «прычына» страты нявестай цнатлівасці выступае адасоблена ад вобразу маладога. Гэта можа быць і нейкае невядомае «трэцяе», што дзейнічае само сабою: *«Жанішок да на ложыю ідзе, / Дзеваньку за сабой вядзе. / Палажылі двое спаці, / Трэце калыхаці. / - Спіце, дзеці, чутка, / Трэце ўстала хутка»*. Паводле каляровай суаднесенасці і здольнасці мяняць сваю кансістэнцыю і пругкасць гэта можа быць чарвяк: *«- А мамачка, балазе, / Паўзе чарвяк па назе. / А мамачка, баюся, / Ён жа мяне ўкусе»*. Пэўныя болевыя адчуванні дзяўчыны і ўяўленні аб мужчынскай «ярасці» прыводзілі да з'яўлення ў каморных песнях вобразу пчалы ці шэршня, якія джаляць: *«Прыляцеў, мамка, шэршань / Дай уткнуў жала, / Сэрца маё задрыжала. / Дзеўку не за пуп, да за чэрава/ Укусіў па сераду»*. Здольнасць эрэгаванага полавага органа мужчыны павялічвацца ў памерах таксама выклікала цікавыя фальклорныя аналогіі: *«А ў нас сёння шавялі былі, / Чатыры ножкі ў кучы былі, / Пятая ножачка шавяліла, / Нам гарэліцу саладзіла»*.

Хаця ў большасці выпадкаў актыўнай сілай выступае мужчынскі пачатак у розных іпастасях, часам зайздроснае ўмельства ў абыходжанні з тым самым «пачаткам» дэманструе маладая: *«А наша малада ў клеці сядзіць, / У клеці сядзіць, каўбасы чыне. / Начыніла каўбасу - сам-другу не ўнясу, / Начыніла другую - яшчэ такую, / Начыніла трэцюю - яшчэ лепшую»*.

ЭРОТЫКА РАДЗІННАЙ АБРАДАВАСЦІ

Сімвалічнае адлюстраванне полавых дачыненняў, у прыватнасці зачацця і нараджэння дзяцей, у радзіннай абрадавасці мае некалькі ўзроўняў. Найбольш архаічная сімволіка ляжыць у аснове сюжэтаў, што тлумачаць *прычыны* з'яўлення дзіцяці на свет, у той час як тэма ўзаемаадносінаў

кума і кумы вылучаецца больш выяўным эратызмам.

Найбольш архаічны матыў зачацця, які фіксуецца амаль выключна на беларускім Падзвінні (арэал рассялення крывічоў), суадносіцца з вобразам каваля: *«Ой, спасіба таму кавалю, / Што скувала дзяцёну. / Малаточкам не стукаў, / У ручачкі не хукаў, / А, ляжаўшы на палу, / Упіраўся ў сцяну. / Цёплая, добрая кузня была!»* (У індаеўрапейскай міфалогіі вобраз каваля быў надзелены звышнатуральнай стваральнай сілай, звязанай з агнём, і валодаў функцыямі дэміурга.)

Як і зачацце, народзіны дзіцяці вымагалі ўзаемадзеяння мужчынскага і жаночага пачаткаў. Так, у беларусаў Смаленшчыны быў зафіксаваны звычай, калі мужчына «дапамагаў» сваёй жонцы нараджаць, імітуючы родавыя схваткі і пакуты. У выпадку, калі ягоныя стогны былі непераканаўчымі, бабка-павітуха навязвала на дзетародны орган мужа суворую нітку і раз-пораз адчувальна яе торгала.

Аднак найбольш выразныя эратычныя элементы радзіннай абрадавасці выяўляюцца падчас «застольнай бяседы». Асноўнымі «героямі» інтымных прыгодаў у радзінным фальклоры выступаюць кум і кума. Роля бабкі-павітухі і кумоў у рытуале, у параўнанні з бацькамі дзіцяці, была першаснай, бо павітуха «лепіць» цела чалавека, *стварае форму*, а хросныя *даюць імя*, далучаюць да сферы духоўнага. Тое, што галоўныя ўдзельнікі гэтага працэсу - не бацькі, а пабочныя, суадносіцца з тэндэнцыяй рытуалу да вылучэння дзіцяці з «прыроды». «Пікантнасць» сітуацыі палягала ў тым, што, будучы «бацькамі» дзіцяці, кум і кума, паводле народных уяўленняў, мусілі быць мужам і жонкай ці, як мінімум, мець узровень узаемадачыненняў, дастатковы для з'яўлення немаўляці. Хаця ў рэальным жыцці полавыя дачыненні паміж кумам і кумой былі жорстка забароненыя, гэты «прабел» з лішкам кампенсаваўся віртуальна-жартоўным чынам у радзінным фальклоры.

Найчасцей ініцыятыва ў збліжэнні прыпісваецца куму, які заляцаецца да кумы, прыносячы ёй адмысловыя падарункі: *«А кум кумку / У садочак вядзе. / А кум кумцы / Агурочак нясе. / - Не хачу я / Агурочка твайго. / Не чапай ты / Хвартушочка майго. / А кум кумку / У садочак вядзе, / А кум кумцы / Ды*

кілбаску нясе. / - Не хачу я / Ды кілбаскі тваёй, / Не чапай ты / Ды спаднічкі маёй», але, пакаштаваўшы хмяльнога мёду, кума робіцца больш згаворлівай: *«Упілася, кумок, мёдам тваім. / Ды рабі ты ўжо, што хочаш, / З жыватачкам маім»*. «Падарункі-пачастункі» кума маглі мець рэальныя наступствы: *«Дам падарак дарагой, / Хоць маленькі, дак жывой. / Будзеш, кумка, калыхаць, / Будзеш кума праклінаць»*.

Інтымныя дачыненні кумы й кума ў фальклоры часта набываюць выгляд гаспадарчай «дапамогі» з боку апошняга. Так, кум «крые куме хату» (а затым і ложак), сее канапелькі, арэ дзялку кумы ці нават тчэ на кроснах: *«Кум да кумы заляцаўся, / Красёнкі ткаць ёй абяцаўся. / Як ён ткаў, прытыкаў, / Прытыкаючы, казаў: / - Ты кума, ты душа, / На ўсе кумы хараша!»* (параўнайма кросны ў загадцы: *«Хвартухам шаруе, нагамі кіруе, / Дзе разінецца - туды суне»*). Часам сваё жаданне кум выказвае досыць прасталінейна: *«Такі, кума, дайся, / Такі дагадайся, / Такі часам пад поясам / Пашчупаці дайся»*.

Сама кума далёка не заўсёды выглядае пасіўнай у дачыненнях з кумам. Так, яна можа запрасіць яго на адмысловую «касьбу»: *«Яшчэ, куме, не відно, / Хаваймася пад радно… / У мяне, куме, трава асака, / Касі, куме, з высака»* ці папрасіць аб інтымнай паслузе: *«Кум не п'ець, кум не п'ець, / Кума не хочыць. / У кумы ў прарэсе, у кумы ў прарэсе / Блыха шчакочыць. / - Кумочак-браточак, кумочак-браточак, / Не бойся грэху, / Выгані ў кумы, выгані ў кумы / Блыху з прарэху»*.

У жартоўнай форме адлюстраваны ў радзіннай паэзіі непасрэдны інтымны кантакт кумы і кума, падчас якога апошні сутыкаецца з невядомай «звярынай»: *«А кум кумку разуваў, / Пад падолік заглядаў. / - А, кумачка, што за звер? / Я баюся, каб не з'еў. / - А кумочак-дурачок, / Ці ты ў лесе не бываў, / Такіх звярэй не відаў? / Гэта, кумок, выдра, / Што ўсім людзям відна. / Гэта, кумок, бобра, / Што ўсім людзям добра. / Кумка ў лесе бываў, / Такіх звярэй не відаў. / Не кукуе, не пяе, / Толькі роцік разяе»*.

КОЛА ДЗЁН

Не менш актуальнай тэма сексуальнасці была і ў будзённым жыцці. Сексуальная патэнцыя ўсведамлялася як адна з праяваў касмічнай стваральнай энергіі, што дазваляла чалавеку ўдзельнічаць у быцці Сусвету. У сімволіцы, звязанай з гаспадарчай дзейнасцю, полавыя органы мужчыны ці жанчыны ўвасаблялі прадукцыйнасць у адносінах да палеткаў, насення, будучага ўраджаю. На Віцебшчыне, каб пшаніца ўрадзіла, гаспадар сеяў яе ўночы, распрануўшыся дагала. Калі садзілі гуркі, з мэтай стымуляцыі іх росту выкарыстоўвалі рэчы з выразнай фалічнай сімволікай: кол, палена, таўкач, пры гэтым катэгарычна забаранялася садзіць гуркі жанчыне не дзетароднага веку. Эратычную афарбоўку мела і качанне/ кулянне жанчын на ніве падчас дажынак, а таксама маніпуляцыі з «барадой» - рэштай жытніх каласоў, пакінутых на полі.

Беларус вёў полавае жыццё не толькі дзеля працягу роду, але і сабе ў ахвоту. У прыватнасці, гэта вынікае з суаднясення на шкале жыццёвых каштоўнасцяў полавага акту і харчавання: *«На што бабе рашато, на што бабе сіта: дзед бабу патаптаў - будзе баба сыта»*. Пры гэтым жарсць магла заспець у любым месцы, а сам «двубой» вызначаўся нічым не прыхаванай эмацыйнасцю: *«Ах ты, Сідар-макацёр, / На парозе бабу цёр: / Што павернiць - / Баба пердніць, / Што пацісніць - / Баба пісьніць»*. Мужчынскай жа моцы, без усялякіх падпорак з боку «віягры», можа пазайздросціць ці не кожны прадстаўнік «моцнай паловы» і сёння: *«Наш дзед сані гнець - / Па чатыры кліны б'ець: / Пастой, бабко, яшчэ слабко. / Ганю пяты - пойдзіць гладка!»* Пры гэтым «парыву плоці» з усёй апантанасцю, да поўнае знямогі аддаваліся не толькі мужчыны: *«Там была, там была, / Дзе коні пасуцца; / Так дала, так дала, / Што рукі трасуцца»*.

Аднак часам жаночыя спадзяванні не спраўджваліся: *«А ну ж ты не дуж - ці на цябе ліха? Капашуся, варушуся, а ты ляжыш ціха?»* Інтымная няўдача магла мець і даволі банальную прычыну: *« - Шавялі, бабка, нагой! / - Ні магу, кармілец мой! / Я б і рада шавяліць - / Шавялуха не стаіць»*.

Што датычыць тэхнікі сексу, то, безумоўна, у нашых продкаў

яна была больш сціплай, чым у «Камасутры», але досыць разнастайнай. Найбольш распаўсюджанай была класічная еўрапейская пазіцыя «мужчына зверху»: *«Не лажыся, Марка, бокам - / Гэта табе не нарокам. / Да лажыся правусенька: / Будзе табе да мілюсенька»*. Даволі часта ў фальклоры сустракаецца ўказанне і на пазіцыю «мужчына ззаду»: *«Як у полі, ў полі / Пасець дзеўка коні. / Прыйшоў да е Якаў - / Ставіў дзеўку ракам»*, а таксама «вершніца» ці «жанчына зверху»: *«Сядзіць сваця на елі, / Распусціўшы калені»*. Бытавалі й аральныя формы сексу: *«Люблю, люблю Пеценьку / За сладку конхеціньку: / Як паложыць у раток, / Дак заныіць жыватоК»* ці *«Сінія штаны, белая падкладка, а што ў штанах, тое сладка»* (загадка пра цукровую галоўку). Аральны секс, хутчэй за ўсё, не быў вуліцай з аднабаковым рухам: *«Дзед бабу сагнуў, / касмоцце раздзьмуў. / Салодкае выкусіў, / А горкае выплюнуў»* (арэх) ці *«Як за лесам, за буйракам / Там стаяла баба ракам, / А дурань думаў - капліца, / Дай давай туды маліцца»*.

На падлеткавую мастурбацыю як на сродак зняцця сексуальнай напругі (параўнайце: *«Дазволь, матушка, жаніцца. / Дазволь узяць каго хачу; / Не дазволіш мне жаніцца - / Колам печ развараЧу»*) у традыцыйнай супольнасці практычна не звярталі вялікай увагі.

Досыць шырока паказана ў беларускім фальклоры й тэма пазашлюбных адносінаў. Ці не самы распаўсюджаны сюжэт - здрада маладой жонкі старому мужу: *«Прыйдзі, прыйдзі, малады хлопча, / У першай гадзіне. / Ідзі, ідзі, стары муж, / У лес па каліну»*. Калі ў старога абуджаюцца падазрэнні, маладзіца робіць контрзахады: *«Калі, міленькі, ты мне не верыш, / Павесь званочак на падалочак! / Як хто затроніць - званок зазвоніць… / Званочак звініць у садзе ля хаты, / А муж не чуе, бо глухаваты»*. Вядома, што такія «бавы», а тым больш у адсутнасць мужа дома, мелі цалкам заканамерныя наступствы: *«Начаваў у нас казак маладзенькі. / Начаваў ён тры дні і тры ночы. / Ды пакінуў мне карыя вочы»*.

Не меншай увішнасцю «на старане» вызначаліся і мужыкі, на што справядліва наракалі жонкі: *«Ён арэць чужую ніўку, / Ён любіць чужую жонку»*. Пры гэтым у вачах здрадлівага мужа

вабноты чужых жанчынаў былі больш прыцягальнымі, чым уласнай жонкі: *«А ў суседа люба жана, / Як пабачу - сэрца млее. / Суседава ўрадліва, / Тлуста, бела, чарнабрыва. / Мая худа, рудаброва, / Суха, як кара дубова»*. Часам мужык абыходзіўся са сваёй жонкай больш радыкальна: *«Замкнуў жонку на замок, / А сам пайшоў да дзявок»*.

Пазашлюбныя адносіны жанатых людзей усведамляліся традыцыяй як страта жыццёвай энергіі і, перш за ўсё, разумовых патэнцый: *«Не паглядай чужых жонак: ці скасееш, ці здурнееш»*; *«Чужыя жонкі - безгалоўе»*. Лічылася, што найбольш юрлівыя мужчыны пачынаюць нагадваць свой дзетародны орган: *«Хто к бабам вельмі многа мае дачынення, той хутка аблысее»*; *«Чужая мяккая падушка на чужой пасцелі лысіну працярэбіць»*.

Паколькі сексуальныя паводзіны чалавека з'яўляюцца прыватным выпадкам ягоных сацыяльных паводзінаў, то ўяўленні пра ўнармаваную/ненармальную сексуальнасць, якія існавалі ў традыцыйным грамадстве, былі адным з чыннікаў ідэнтыфікацыі свае/чужыя. Спасярод прадстаўнікоў іншых сацыяльных і этнічных груп найбольшай юрлівасцю і распустай характарызаваліся папы ды ксяндзы. Перадусім у «грахоўнай актыўнасці» вызначаліся праваслаўныя святары, якія маглі займацца аблуднай справай нават у царкве: *«Мне няможна да царквы хадзіць, / Мне няможна на споведзі быць: / Папы, дзякі заляцаюцца, / І ў кніжках спамыляюцца»*. Пры гэтым справа наўрад ці абмяжоўвалася аднымі залётамі: *«Чужы жонкі Богу моляцца, / Мая шэльма з папом борацца… / Ох, і борацца, качаецца, / Ніяк, шэльма, з ім не справіцца»*. Дамагаючыся свайго, поп пераконвае цяжарную жанчыну ў неабходнасці дарабіць плод у ейным чэраве: *«І пачаў поп маліцца да дзіця дарабляць, да так захадзіўся, што Матруна аж пачала крычаць»*.

У адрозненне ад папоў, «блуд» ксяндзоў, што ўвогуле не мелі права на сямейнае жыццё, у фальклоры паказаны больш закамуфляваным і вытанчаным. Паказальная ў гэтым сэнсе радзінная песня з Глыбоччыны: *«- Трэба, трэба, дзяўчыначка, / Пераспавядаці, / Ці прыйшлося, дзяўчыначка, / Перад прабаваці?*

/ - Не давала, пане ксёнжа, / Не давала нікому. / Толькі дала перад / Ксёндзу маладому. / - Будуць табе, дзяўчыначка, / Грахі адпушчоны, / Бо то ж цябе прабаваў / Чалавек свянцоны».

Пэўнай сексуальнай «ненармальнасцю» характарызаваліся ў беларускім фальклоры і прадстаўнікі этнічных супольнасцяў: «маскалі», «хахлы» ды іншыя. Як правіла, «чужынцам» прыпісвалася распуста (*«Жыла адна маскоўка да вельмі распусная баба…»*) і дзіўныя сямейныя ўзаемадачыненні: *«Жыд жыдоўку не ўзлюбіў, / Па цыцке ярмолкай біў. / А жыдоўка не схацела, / І ярмолка адляцела»*. «Хахол» таксама быў непажаданым партнёрам для тутэйшай жанчыны: *«Ахну, махну, / Я не дам хахлу. / Хахол чэсці не маіць - / Проці шэрсці піхаіць»*.

Часам моўная адрознасць «тутэйшага» і «чужынца» прыводзіла да камічных непаразуменняў з «эратычным» адценнем. *«Раз, як стаялі маскалі ў сяле, так адзін хацеў перцу ды яец, дый кажэ на старую кабету: «Гэй! баба, папру да яец!» А яна: «А каб з цябе, - кажэ, - дух выперла! Куды ты мяне, старую, папрэш да яец!»* «Атрымаць на арэхі» ад простай вясковай кабеты мог і пан са сваёй незразумелай тактоўнасцю. *«Быў сабе кірмаш, аж ідзе якісь панічык і нехаця штурхнуў бабу ў бок, так адвярнуўся і мувіць: «Пардон, бабка!» - «А каб цябе, - кажэ, - скула ўдушыла! - ляньцесе: даў сайку пад бок і яшчэ ля, ось кажэ: пярдун баба! А каб ты пярдзеў, гадзе ты, нігды ні стрымаўшысё!»*

Безумоўна, гэтыя гісторыі адносяцца да сферы народнага гумару, але «непадабенства» чужынцаў (у тым ліку і іх неадэкватныя сексуальныя паводзіны) не ў малой ступені ўплывала на тое, што пераважная большасць шлюбаў у традыцыйнай беларускай супольнасці была монаэтнічнай.

* * *

У традыцыйных супольнасцях абрадаваму афармленню падлягалі ўсе значныя моманты сацыяльнага і індывідуальнага жыцця, таму тэма сексуальных адносінаў мужчыны і жанчыны папросту не магла быць ігнараваная. Эратызм, сімвалічнае выяўленне сексуальнасці і полавых узаемадачыненняў былі

абавязковым элементам практычна ўсіх рытуалаў каляндарнага і сямейнага цыклу. Асабліва гэта датычылася абрадаў, якія сімвалічна рэалізоўвалі пераход ад «старога» да «новага» ці на калектыўным (Каляды, Масленка, Вялікдзень, Купалле), ці на індывідуальным (Радзіны, Вяселле) роўні.

Эратычным зместам магла надзяляцца надзвычай шырокая катэгорыя з'яваў і рэчаў. Так, фалічнае «прачытанне» маюць рэчы, звязаныя з дзейснай інструментальнай сферай: голка, хлебная лапата, саха, рала, таўкач, дзіда, шабля, меч, стрэльба, вуда і да т. п. Фармальнае (колер, абрысы) і тыпалагічнае (цвёрдасць, актыўнасць) ляжалі ў аснове такога сімвалізму: елка, шышка, морква, гурок, грыб, рыба, джала, каўбаса, пірог, кол, арэх, палка, рог - як фальклорныя значэнні фаласа. Жаночы, дзетародны пачатак сімвалізаваўся рэчамі полымі, з адтулінай, але прынцыпова пасіўнымі: гаршчок, бочка, вядро, дзяжа, мех, яма, нара, печ і да т. п. Сам полавы акт выяўляецца ў катэгорыях актыўнай дзейнасці: каваць, араць, рабіць, дзяўбці, таўчы, засаджваць, устаўляць, мець, нацягваць, пароць, качаць, шыць і г. д.

Вызначальная рыса беларускай традыцыйнай эротыкі (як і любой эротыкі ў прынцыпе) - яе цесная суаднесенасць з народнай смехавой культурай. І полавы акт, і смех адмаўляюць смерць і сцвярджаюць жыццё.

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 3 (32) - 2004
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/5
[image]

[image]
ARCHE Пачатак № 3 (32) - 2004
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
[image]
[image]2004
Пачатак
палітыка • эканоміка • гісторыя • культура • філасофія • сацыялогія • літаратуразнаўства • мастацтвазнаўства • этнаграфія • археалогія • этнічная гісторыя • этнапалітыка • этнасацыялогія • этнакультуралогія • этнаэкалогія • этнаэканоміка • этнадэмаграфія • этнаэстэтыка • этнаэтыка • этнапсіхалогія • этнаантрапалогія • этнаархеалогія • этнагеаграфія • этнаэкалінгвістыка • этнаэкалінгвістыка • этнаэкалінгвістыка

«халдынгізацыю» літаратурных часопісаў, і закрыццё Коласаўскага ліцэю. З другога боку, варта адзначыць і адваротную зьяву - зьяўленьне культурных праектаў, якія здолелі заваяваць дастаткова шырокую папулярнасьць. Сам па сабе працяг існаваньня беларускай незалежнай дзяржаўнасьці мацаваў нацыянальную самасьвядомасьць, якая па ідэі станоўчым чынам зьвязаная з моўнымі паводзінамі. Калі параўноўваць зьвесткі апытаньня НІСЭПД 1997 году з вынікамі апошняга, сакавіцкага 2004 году апытаньня, высьвятляецца, што «вага» моўных групаў за гэты час істотна не зьмянілася.

	Сьнежань 1997	Сакавік 2004
беларускай	5,7	7,1
беларускай	40,6	47,4
беларускай і расейскай	20,3	17,3
зьмяшанай	32,5	27,8
НА/ЦА	0,9	0,4

Табліца 1. Адказы на пытаньне «Якой мовай Вы карыстаецеся ў штодзённых зносінах?» (у %).

Але нашая задача - прааналізаваць не дынаміку зьменаў колькаснага складу моўных групаў, а прыроду сувязі моўных паводзінаў з палітычнымі.

Перш чым перайсьці да гэтага аналізу, варта адказаць на крытыку мэтадалёгіі дасьледаваньняў НІСЭПД, якая ўтрымліваецца ў зьмястоўным выступе Вінцука Вячоркі на Зьезьдзе ТБМ у 2003 годзе.

В. Вячорка прывёў зьвесткі адказаў на пытаньне пра моўныя паводзіны ў апытаньнях НІСЭПД, якія праводзіліся ў 1995-2003 гадох, і зьвярнуў увагу на ваганьні паказчыкаў на працягу пэрыяду дасьледаваньня: *«З 1995 да сакавіка 2003 году фіксаваўся наступны дыяпазон лічбаў: носьбітаў беларускае мовы - ад 5,7 % (лістапад 1997) да 1,7 % (кастрычнік 2001); расейскае - ад 37,3 % (чэрвень 1995) да 46,3 % (кастрычнік 2001); «мяшанай» - ад 50 % (чэрвень 1995) да 25,4 % (верасень 2002); абедзьвюх моваў - ад 7,8 % (чэрвень 1995) да 26,5 % (сакавік 1999)».*

Вячорка падкрэсьліў, што моўныя паводзіны масы людзей насамрэч вельмі кансэрватыўныя і не мяняюцца на працягу некалькіх гадоў. Адсюль ён зрабіў выснову, што адказы ў апытаньнях НІСЭПД вымяраюць хутчэй ступень атаесамленьня рэспандэнта з той ці іншай моўнай «пазыцыяй», чым сапраўдныя моўныя паводзіны. На адказы, на думку В. Вячоркі, моцна ўплываюць вонкавыя адносна ўласна моўных паводзінаў чыньнікі: неспрыяльная і нават грэблівая адносна беларускай мовы палітыка ўладаў, рэфэрэндумы і аб'яднаўчыя ініцыятывы.

Але насамрэч значныя ваганьні ў адказах назіраліся толькі ў прамежкавых, пераходных пазыцыях - у колькасьці тых, хто абірае адказы «і беларускай і расейскай» ці «зьмяшанай». Справа тут , як падаецца, не ў недакладнасьці мэтадалёгіі, а ў самім няпэўным, плыткім самаўсьведамленьні значнай часткі людзей, якія выбіраюць гэтыя опцыі: літаральна адзін і той жа чалавек сёньня можа сказаць, што гаворыць «трасянкай», заўтра - што гаворыць «і так, і гэдак», пасьлязаўтра - аднесьці сябе да беларуска- ці расейскамоўных. І гэтыя зьмены могуць адбывацца пад узьдзеяньнем самых розных, у тым ліку і цалкам выпадковых фактараў, нават самога факту неабходнасьці даваць адказ на пытаньне падобнай анкеты. У той жа час амплітуды ваганьняў у пэўных, «крайніх» пазыцыях - «беларускай» і «расейскай» - на працягу пэрыяду дасьледаваньня былі прыкладна ў межах патроенай памылкі рэпрэзэнтацыйнасьці (НІСЭПД звычайна апытвае каля 1500 чалавек - гранічная памылка рэпрэзэнтацыйнасьці ў гэтым выпадку складае 3 %). З пункту гледжаньня статыстыкі гэта сьведчыць якраз пра адносную стабільнасьць названых паказчыкаў, а дакладней - пра досыць абмежаваны ўплыў «вонкавых» фактараў на выбар гэтых опцыяў адказу.

У сваёй прамове на зьезьдзе ТБМ Вінцук Вячорка прапанаваў пашыраную інтэрпрэтацыю «беларускамоўнасьці». Беларускамоўныя паводле яго - гэта тыя, хто, адказваючы на пытаньне падобнай анкеты, выбіраюць опцыі «беларуская», «і беларуская і расейская» ці «зьмяшаная». З пэўнымі агаворкамі ён палічыў беларускамоўнымі і пэўную частку тых, хто ў анкеце аднёс сябе да расейскамоўных: *«На мове маскоўскага і піцерскага ўзору ў Беларусі не гаворыць амаль ніхто… Носьбітаў*

«беларускага варыянту» расейскай літаратурнай мовы вельмі лёгка распазнаюць у Маскве».

Гэтыя цьверджаньні падаюцца ў значнай ступені вынікам ідэалягічнай пазыцыі, мэтафізычнымі развагамі пра паўпоўную й паўпустую шклянку. Чым аднясеньне да беларускамоўных усіх, хто хоць неяк і хоць калі гаворыць па-беларуску, больш абгрунтаванае, чым аднясеньне да расейскамоўных усіх тых, хто хоць неяк гаворыць па-расейску (а гэта ў нашым выпадку як тыя, хто ў адказе на пытаньне анкеты наўпрост аднёс сябе да расейскамоўных, гэтак і дзьве прамежкавыя групы)? На заўвагу, што ў Беларусі мовай маскоўскага і піцерскага (кананічна расейскага) узору не гаворыць амаль ніхто, варта адзначыць, што па-маскоўску не гавораць і на Валагодчыне, і ў Сібіры, і ў большасьці іншых рэгіёнаў Расеі. Што да таго, што расейскамоўных беларусаў беспамылкова пазнаюць у Маскве, то масквічы, прыязджаючы ў Беларусь ці прынамсі ў Менск, пэўна сьцьвярджаюць: «Тут усе гавораць па-расейску». Для расейскага вуха беларуская расейская мова і нават «трасянка» - такая ж расейская, як мова пскавічоў, разанцаў, сібіракоў ці расейскамоўных каўказцаў. Пры гэтым, як паказвае досьвед, літаратурную беларускую мову расейцы разумеюць зь цяжкасьцю і ўжо пагатоў ня лічаць яе расейскай.

Мэта гэтага вялікага ўступу - зусім не ў працягу спрэчкі пра тое, паўпустая ці паўпоўная моўная «шклянка», а ў тым, каб даказаць, што пытаньне анкеты пра мову штодзённых зносінаў - цалкам карэктнае і адказы на яе даюць у цэлым адэкватнае апісаньне моўнай сытуацыі, адлюстроўваючы сапраўдныя моўныя паводзіны людзей.

Як жа гэтыя паводзіны цяпер, у 2004 годзе, карэлююць з сацыяльна-дэмаграфічнымі характарыстыкамі, з уяўленьнямі людзей пра месца Беларусі ў сьвеце і палітычнымі прэфэрэнцыямі?

Шэсьць гадоў таму я адзначаў вельмі шчыльную сувязь паміж моўнымі паводзінамі і сацыяльна-дэмаграфічнымі характарыстыкамі: доля моладзі, высокаадукаваных людзей, гараджанаў сярод расейскамоўных найвышэйшая, а сярод беларускамоўных - найніжэйшая сярод усіх моўных групаў.

Як бачым, за шэсьць гадоў сытуацыя практычна не зьмянілася. Бадай, адзіным выключэньнем з гэтых жорсткіх лінейных залежнасьцяў зьяўляецца доля менчукоў сярод беларускамоўных (25,2 %) - яна перавышае долю менчукоў у выбарцы ў цэлым. У апытаньні 1997 году доля менчукоў сярод беларускамоўных складала толькі 11,6 %.

Якой мовай вы карыстаецеся ў штодзённых зносінах?

* Табліца 2 , як і ўсе далейшыя, чытаецца па слупках: у ёй паказана, як прадстаўнікі моўных групаў разьмяркоўваюцца паміж узроставымі, адукацыйнымі і геаграфічнымі опцыямі. Сума ў слупках можа быць меншай за 100 %: для зручнасьці тут і далей мы не прыводзім дадзеных па опцыях «няма адказу/цяжка адказаць».

** Для зручнасьці аналізу ў крайнім левым слупку мы прыводзім значэньне доляў пэўных опцыяў па выбарцы ў цэлым, што дае магчымасьць параўноўваць адпаведныя паказчыкі ў моўных групах ня толькі паміжсобку, але і зь сярэднімі па выбарцы.

	беларускай	расейскай	беларускай і расейскай	зьмяшанай
Век				
16-19 (4,1 %)**	1,8	5,2	5,1	2,1
20-24 (9,3 %)	1,8	12,6	8,2	6,2
25-29 (8,9 %)	9,5	12,3	8,2	6,2
30-39 (20,2 %)	9,2	25,4	21,2	13,7
40-49 (19,6 %)	10,4	21,9	20,3	17,6
50-59 (12,6 %)	10,8	12,1	17,5	10,9
>59 (25,2 %)	56,4	10,5	20,5	45,3
Адукацыя				
Пачатковая (12,0 %)	35,3	1,7	5,1	28,4
Няпоўная сярэдняя (13,9 %)	22,2	10,6	11,8	18,0
Сярэдняя (36,5 %)	21,0	42,0	37,8	30,1
Сярэдняя спэцыяльная (23,1 %)	12,3	26,4	25,9	18,7
Вышэйшая (14,5 %)	9,2	19,3	19,4	4,7
Месца жыхарства				
Менск (16,7 %)	25,2	24,9	7,7	6,5
Абласныя цэнтры (17,6 %)	5,5	25,6	9,2	11,8
Вялікія гарады	8,1	16,4	18,5	4,5

(13,0 %)				
Малыя гарады (22,0 %)	10,3	17,5	25,7	30,7
Вёска (30,7 %)	50,9	15,6	38,9	46,4

Табліца 2*. Сувязь паміж моваю штодзённых зносінаў і асноўнымі сацыяльна-дэмаграфічнымі характарыстыкамі

Навідавоку рост больш чым удвая. Прычым масавымі міграцыямі зь вёскі ў сталіцу гэты фэномэн патлумачыць не выпадае: у адрозьненьне ад 1960-1970-х гадоў, найноўшая гісторыя Беларусі такіх міграцыяў ня ведае. Гэтае адхіленьне ад агульнай «тэндэнцыі» можна з пэўнай доляй імавернасьці аднесьці якраз на рахунак пашырэньня сталічных інтэлектуальных беларускамоўных асяродкаў. Але дадзеныя даюць уяўленьне і пра сапраўдны маштаб гэтай зьявы: беларускамоўныя менчукі складаюць менш за 2 % ад насельніцтва краіны.

Тып сувязі моўных паводзінаў і сацыяльна-дэмаграфічных характарыстыкаў робіць чаканымі і адрозьненьні ў поглядах, уласьцівых прадстаўнікам розных моўных групаў. Агульнавядома, што каштоўнасьці эканамічнай, палітычнай, нацыянальнай свабоды, захапленьне Эўропай уласьцівыя перш за ўсё моладзі, людзям з вышэйшай адукацыяй, гараджанам. Але можна выказаць гіпотэзу, што беларускамоўнасьць, прыналежнасьць да беларускай культуры «пераважвае», і нават старыя малаадукаваныя беларускамоўныя ўсё ж больш прыхільныя да нацыянальнай незалежнасьці, чым іх маладыя і адукаваныя суайчыньнікі, якія «здрадзілі роднай мове». Зьвесткі апытаньня сьнежня 1997 году гэтай гіпотэзы не пацьвярджалі. Магчыма, за шэсьць гадоў сытуацыя зьмянілася?

Якой мовай Вы карыстаецеся ў штодзённых зносінах?	беларускай	расейскай	беларускай і расейскай	зьмяшанай
Як бы Вы прагаласавалі на				

рэфэрэндуме пра будучыню Беларусі?				
За аб'яднаньне з Расеяй (30,0 %)	52,5	28,2	27,2	29,3
За далучэньне да Эўразьвязу (25,1 %)	12,3	32,5	21,6	17,9
І за тое, і за другое (17,6 %)	13,8	19,4	16,2	16,7
Супраць і аднаго, і другога (13,4 %)	10,3	9,6	23,5	14,6
А **калі б давялося выбіраць паміж аб'яднаньнем з РФ і далучэньнем да ЭЗ, што б Вы выбралі?**				
Аб'яднаньне з РФ (41,0 %)	62,1	39,4	36,9	41,5
Далучэньне да ЭЗ (36,5 %)	14,6	45,1	37,9	26,2

Табліца 3. Сувязь паміж моўнымі паводзінамі і геапалітычнымі прыхільнасьцямі

Парадаксальная сувязь, якую мы адзначалі ў 1998 годзе, захавалася нязьменнай: беларускамоўныя найменш прыхільныя да незалежнасьці, эўрапейскага шляху краіны і найбольш прыхільныя да аб'яднаньня з «матухнай Расеяй».

Сувязь, вызначаная Табліцай 3, пацьвярджаецца і іншымі дасьледаваньнямі. Летась у «ARCHE» быў надрукаваны артыкул шатляндзкага сацыёляга Стывэна Ўайта «Эўрапейскі ці славянскі выбар». У публікацыі аналізаваліся геапалітычныя погляды грамадзянаў Беларусі, Малдовы, Расеі і Ўкраіны, пры гэтым адносна Беларусі Ўайт карыстаўся зьвесткамі апытаньня, праведзенага ў 2000 годзе цэнтрам «Новак». У артыкуле былі прыведзеныя вынікі рэгрэсіўнага аналізу пераменнай, якая

вымярала прыхільнасьць да праэўрапейскага ці праэўразійскага выбару, на шэраг сацыяльных паказчыкаў. Сярод пераменных рэгрэсіўнай мадэлі фігуравалі і адказы на пытаньне «Якой мовай Вы карыстаецеся дома?». З мадэляў, якія прыводзіць Уайт, вынікае, што адпаведныя каэфіцыенты рэгрэсіі для дадзеных па Малдове і Ўкраіне маюць адмоўны знак, а па Беларусі - станоўчы. Іншымі словамі, паводле кампаратыўнага дасьледаваньня, праведзенага Ўайтам, у Малдове і Ўкраіне ўжываньне ў сям'і роднай мовы зьвязана станоўча з праэўрапейскімі памкненьнямі і адмоўна - з праэўразійскімі, а ў Беларусі - наадварот.

У прыгаданым дасьледаваньні выкарыстоўваліся крытэры праэўрапейскасьці і праэўразійскасьці, адрозныя ад тых, якія ўжываліся ў сакавіцкім 2004 году апытаньні НІСЭПД, пытаньне пра моўныя паводзіны таксама адрознівалася ад ужыванага НІСЭПД. Тым ня менш, характар сувязі паміж моўнымі і геапалітычнымі прыхільнасьцямі, выяўлены ў дасьледаваньнях, - аднолькавы.

У шэрагу водгукаў на нашую публікацыю шасьцігадовай даўніны выказвалася думка, што хаця расейскамоўныя беларусы больш прыхільна ставяцца да незалежнасьці, чым іхныя беларускамоўныя суайчыньнікі, але незалежніцкія памкненьні расейскамоўных маюць, так бы мовіць, сытуацыйны, каньюнктурны характар. Расейскамоўныя, хаця б дзякуючы больш высокай адукаванасьці, больш выйгралі ад набыцьця Беларусяй незалежнасьці. Яны маюць больш высокі сацыяльны статус і ня хочуць яго згубіць пасьля далучэньня Беларусі да Расеі. У якасьці яскравага ўзору такога стаўленьня прыводзіўся прэзыдэнт Беларусі, які зьмяніў свае погляды на інтэграцыю са «старэйшым братам» зусім не таму, што прасякнуўся беларушчынай, а таму што зразумеў, што быць кіраўніком незалежнай краіны лепш, чым губэрнатарам расейскай правінцыі. Матывацыя «сувэрэнізацыі» Аляксандра Лукашэнкі, магчыма, і была менавіта такой, але матывацыя расейскамоўных беларусаў агулам не зусім такая, а дакладней - зусім не такая.

Якой мовай

Вы карыстаецеся ў штодзённых зносінах?	беларускай	расейскай	беларускай і расейскай	зьмяшанай
ВКЛ (34,6 %)	17,6	42,1	35,4	25,8
БНР (15,1 %)	20,9	13,7	18,2	14,1
БССР (17,0 %)	23,8	11,5	19,4	23,3
РБ (18,2 %)	15,9	17,6	19,6	18,6

Табліца 4. Сувязь паміж моўнымі паводзінамі і адказамі на пытаньне «Якая, на Ваш погляд, была першая ў гісторыі беларуская дзяржава?»

Карціна тут у параўнаньні з папярэдняй табліцай больш складаная. Тым ня менш, і тут мы бачым, што расейскамоўныя ў найменшай ступені схільныя бачыць пачатак беларускай дзяржаўнасьці ў савецкай і постсавецкай гісторыі і менавіта яны ў найбольшай ступені адносяць гэты пачатак да сівой даўніны ВКЛ. Так што насамрэч стаўленьне расейскамоўных да беларускай дзяржаўнасьці тлумачыцца прынамсі ня толькі сытуацыйнымі перавагамі, але і ўпэўненасьцю, што гісторыя Беларусі, беларускай нацыі ня зь іх пачалася і не павінна імі скончыцца. І ўпэўненасьць гэтая ўласьцівая расейскамоўным ня ў меншай ступені, чым прадстаўнікам іншых моўных групаў.

Нарэшце, сувязь моўных паводзінаў і стаўленьня да некаторых актуальных сюжэтаў бягучай беларускай палітыкі адлюстроўвае Табліца 5.

Якой мовай Вы карыстаецеся ў штодзённых зносінах?	беларускай	расейскай	беларускай і расейскай	зьмяшанай
Калі б заўтра былі выбары прэзыдэнта, за каго б Вы галасавалі?				
За Аляксандра	55,5	25,1	33,6	43,6

Лукашэнку (33,9 %)				
Ці будзеце Вы на восеньскіх выбарах галасаваць за кандыдатаў кааліцыі «5+»?				
Пэўна так / Хутчэй так (17,1 %)	16,5	21,3	12,4	12,7
Пэўна не / Хутчэй не (47,8 %)	58,1	46,1	56,0	43,7

Табліца 5. Сувязь паміж моўнымі паводзінамі і пытаньнямі пра галасаваньне на прэзыдэнцкіх і парлямэнцкіх выбарах

Аўтар гэтых радкоў не спадзяецца, што прыведзеныя зьвесткі прымусяць прыхільнікаў «беларускай Беларусі» адмовіцца ад іх ідэалу. Урэшце, моцную веру ня могуць пахіснуць ніякія факты і аргумэнты. Але адэпты «беларускай Беларусі» адстойваюць сваю ідэю ня ў тэртуліянаўскім стылі «верую, бо абсурдна» - яны карыстаюцца ня толькі гістарычнымі і культуралягічнымі аргумэнтамі, але й пэўным чынам інтэрпрэтаванымі фактамі сёньняшняй беларускай рэчаіснасьці. Прыведзеныя намі зьвесткі, на наш погляд, пераканаўча абвяргаюць шмат якія з гэтых апэляцыяў. Пералічым іх па парадку.

Беларускамоўныя хай сабе і складаюць меншасьць у грамадзтве, але вызначаюцца больш высокай адукацыяй, маладосьцю, гэта найбольш «прасунутая», дынамічная група насельніцтва. Як вынікае з Табліцы 2, усё наадварот. Маладосьць, адукаванасьць уласьцівыя ў большай ступені якраз расейскамоўным. Беларускамоўныя вызначаюцца адваротнымі сацыяльна-дэмаграфічнымі характарыстыкамі. Гэтая сацыялягічная тэза зусім не супярэчыць цьверджаньням пра існаваньне і нават пашырэньне высокаінтэлектуальных асяродкаў гарадзкой (прынамсі, менскай) моладзі, якая гаворыць па-беларуску. Сацыялягічны факт вызначае межы гэтай зьявы: гэтыя асяродкі ў маштабе грамадзтва настолькі малалікія, а колькасьць прадстаўнікоў «слабых» сацыяльных групаў сярод беларускамоўных у цэлым настолькі вялікая, што гэтыя «прасунутыя» асяродкі ня робяць заўважнага ўплыву на

параўнальныя сацыяльна-дэмаграфічныя характарыстыкі моўных групаў.

Сапраўдным апірышчам ідэі нацыянальнай дзяржаўнасьці ў грамадзкай сьвядомасьці можа быць толькі родная мова. У цяперашняй Беларусі - з дакладнасьцю да наадварот. Менавіта беларускамоўныя ў найбольшай ступені прыхільныя да аб'яднаньня Беларусі з Расеяй, а расейскамоўныя - у найменшай.

Прыхільнасьць расейскамоўных да беларускай незалежнасьці - уяўная, сытуацыйная, часовая. Зьменіцца іх становішча ў грамадзтве, зьменіцца стан беларускай эканомікі - і яны стануць «пятай калёнай» Масквы. Ізноў жа не зусім дакладна. Незалежніцтва расейскамоўных беларусаў мае больш трывалы падмурак, яно грунтуецца ня толькі на будзённых інтарэсах, але й на гістарычных каштоўнасьцях.

Прыналежнасьць да беларускай мовы абумоўлівае культурную повязь з Эўропаю. Тэарэтычна, магчыма, так яно й павінна быць, але ў сёньняшняй Беларусі беларускамоўнасьць спалучаецца зь нежаданьнем далучацца да Эўропы, а ў найбольшай ступені ў Эўропу імкнуцца расейскамоўныя.

Лукашэнка - прэзыдэнт усіх крэолаў. Менавіта такую тэзу адстойваў рэдактар «ARCHE» Валер Булгакаў у сваім артыкуле 2001 году, у якім ён аналізаваў вынікі другіх прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі. Тэза, якая тычыцца грамадзтва і ўтрымлівае займеньнік «усе», - амаль заўсёды гіпэрбала, але калі ісьці за гэтай заганнай практыкай, то на падставе зьвестак Табліцы 5 куды больш абгрунтаваным выглядае сьцьвярджэньне «Лукашэнка - прэзыдэнт усіх беларускамоўных», а якраз «крэолы» схільныя падтрымліваць яго ў найменшай ступені.

Магчыма, неабходнасьць і прывабнасьць праекту «беларускай Беларусі» можна сфармуляваць і безь пералічанага набору ідэалягемаў. Але гэта - яшчэ ня вырашаная інтэлектуальная задача, бо цяпер бязь іх не абыходзіцца амаль ніводзін тэкст прыхільнікаў гэтага праекту. Аднак куды больш сур'ёзныя перашкоды давядзецца пераадолець пры жаданьні яго

зрэалізаваць, прычым ня толькі ў чыста культурніцкай, але і ў палітычнай плашчыні. На практыцы ігнараваць рэчаіснасьць значна цяжэй, чым у інтэлектуальных студыях.

Часам ад сьвядомых беларусаў можна пачуць: «Беларусь - адзінае месца ў сьвеце, дзе можа жыць і выжыць беларуская мова. Ня будзе яе тут - ня будзе нідзе. Іншай зямлі няма ані ў яе, ані ў нас. І мы абаронім яе, даможамся, каб яна тут панавала і каб ёй нічога не пагражала». Некаторыя расейцы - грамадзяне Беларусі ўспрымаюць такія развагі як намёк на тое, што калі нейкім чужынцам нешта не падабаецца ці не спадабаецца ў будучыні, то варыянт «чамадан-вакзал-Расея» заўсёды актуальны. Аднак на самай справе сьвядомыя беларусы гатовыя забясьпечыць прынамсі беларускім расейцам самыя ўтульныя ўмовы існаваньня ў «геце» меншасьці, так бы мовіць, дазволіць і нават дапамагчы адкрыць менскую філію «Яру» з кулябякамі і расьцягаямі, як гэта вобразна сфармуляваў Сяргей Дубавец.

Але насамрэч справа зусім не ў беларускіх расейцах. Справа ў расейскамоўных беларусах, у якіх гэтак жа, як і ў іх беларускамоўных супляменьнікаў, «няма іншай зямлі». І ні ў якую Расею іх ня выпхнеш: яны туды, дарэчы, і не імкнуцца ані ў асабістай якасьці, ані разам з усёй Беларусяй (гл. Табліцу 3). І кулябякай у расейскім «геце» іх не задаволіш. Па-першае, яна ім непатрэбная - ім больш дранікі даспадобы, а па-другое, яны наагул ні ў якае «гета» ня хочуць і ня пойдуць, яны пачуваюць сябе такімі ж гаспадарамі Беларусі, як і беларускамоўныя беларусы. І сваю Беларусь (свой праект Беларусі) яны будуць абараняць жорстка, у тым ліку і ад сваіх беларускамоўных супляменьнікаў.

Тут, праўда, узьнікае пытаньне, што такое праект Беларусі расейскамоўных і што менавіта ў ім яны гатовыя абараняць. На думку «сьвядомых беларусаў», такі праект - гэта жаданьне зьліцца з Расеяй (што, як мы паказалі, няпраўда) ці такога праекту не існуе наагул, што расейскамоўнасьць у Беларусі пазбаўленая ўласнай сутнасьці, дакладней, яе сутнасьць - адмаўленьне беларускасьці і ня больш за тое.

Такое стаўленьне ў чымсьці падобнае да стаўленьня

бальшавікоў да вернікаў. Тут гаворка не пра практыку, а пра ідэйны бок: паводле камуністычнай дактрыны вера ў Бога разглядалася як «перажытак капіталістычнай мінуўшчыны», як забабон, урэшце - ня больш чым спадчына невуцтва, у якім цары і буржуі трымалі просты люд. У сьветлай камуністычнай будучыні гэтая недарэчнасьць, зразумела, павінна зьнікнуць, ну, а ў нашым сацыялістычным сёньня гэтым забабонам, з аднаго боку, нельга патураць, але зь іншага - і зусім ужо рэзка забараняць ня варта. Дазволім ужо старым бабулькам дажыць іхны век зь іхным богам.

«Сумленьня ў Вас няма, - перапыніць мяне сьвядомы беларус. - Вы параўноўваеце нас з бальшавікамі, але сёньня разбураюць храмы нашай мовы, а ня мы разбураем чыесьці. І разбураюць, дарэчы, што б там ні паказвала Вашая сацыялёгія, людзі адной з вамі мовы. Дык хто ж бальшавікі ў гэтай сытуацыі? Ну нічога, прыйдзе пара…»

Але ж размова ідзе не пра практыку, а пра ідэалягічную ўстаноўку. Для большай яснасьці варта прывесьці прыклад з зусім іншай гісторыі.

Чаму ізраільцяне гэтак настойваюць, каб палестынцы адмовіліся ад сваёй канчатковай мэты - зьнішчыць Ізраіль, скінуць яго ў мора? Усе гады існаваньня Ізраілю, усе араба-ізраільскія войны паказалі, што зрабіць гэта палестынцы ня ў стане ані аднаасобна, ані нават разам з усім арабскім сьветам. Тады, здавалася, чаго ж пераймацца?

На самай справе падставы пераймацца ёсьць. Калі твой апанэнт, хай на сёньня і слабейшы, ставіць на мэце тваё зьнішчэньне, то ўся ягоная дзейнасьць, кожны прамежкавы крок падпарадкоўваецца гэтай мэце ці, прынамсі, успрымаецца табою як падпарадкаваны ёй. Але гэтая мэта слабейшага перадвызначае і паводзіны мацнейшага: ён будзе шукаць не кампрамісу, а пазбаўленьня апанэнта самой магчымасьці калі-небудзь дасягнуць падобнай мэты. Гэта ня тоеснасьць, а аналёгія, якая ўсё ж сёе-тое тлумачыць.

У цяперашняй сытуацыі на зачынены Коласаўскі ліцэй прыпадае непераатэставаны Эўрапейскі гуманітарны

ўнівэрсытэт. Іншымі словамі, насамрэч улада нішчыць усё патэнцыйна ёй варожае, не зважаючы на яго моўную прыналежнасьць. Наўрад ці яна спадзяецца, скажам, закрыцьцём Ліцэю заваяваць сымпатыі расейскамоўных. Апошнім, як моўнай групе ў цэлым, гэта ні зь якага боку не патрэбна і падставай палюбіць уладу не зьяўляецца.

Цяперашняя ўлада - гэта бэтонная пліта, якая прыдушвае кожнае жывое жыцьцё, выціскаючы яго на кухні ці, прынамсі, на старонкі «ARCHE». Але й адыход гэтай улады будзе азначаць не суцэльнае і ўсеагульнае шчасьце, а проста зьнікненьне пліты і разьняволеньне жыцьця разам з усімі яго супярэчнасьцямі.

І спаборніцтва расейскамоўнага і беларускамоўнага праектаў тады, так выглядае, не сунімецца, а наадварот - абвострыцца. Пры гэтым самі па сабе палітычныя зьмены не прынясуць перавагі нікому: з улікам зьвестак Табліцы 5, сярод пераможцаў расейскамоўных будзе ня менш, чым сярод пераможаных. Цалкам прадухіліць гэтае спаборніцтва, выглядае, немагчыма, бо змаганьне ідзе і будзе ісьці за адну нацыю, за адну прастору. Тут немагчымы падзел накшталт бэльгійскага (вашай мове - поўнач, нашай - поўдзень). Беларусь, калі параўноўваць з Украінай, ня мае таксама ані свайго Крыму, ані сваёй Галіччыны, значыць, тылу гэтага змаганьня няма нідзе, а фронт - паўсюль.

За апошняе дзесяцігодзьдзе беларускасьць прадэманстравала выдатную здольнасьць да выжываньня і нават да пэўнага пашырэньня ў надзвычай неспрыяльных умовах. Але ня варта лічыць адзіным увасабленьнем энэргіі і здольнасьцяў расейскамоўных цяперашняга прэзыдэнта, які пры ўсіх сваіх талентах усё ж у гістарычнай пэрспэктыве - адыходзячая натура. Можна не заўважаць, напрыклад, што п'есы паводле твораў менавіта Сьвятланы Алексіевіч ставяць у Бэрліне і Парыжы, што прыгаданы Эўрапейскі гуманітарны ўнівэрсытэт - адукацыйная зьява ня менш выбітная, чым Коласаўскі ліцэй, што беларускі бізнэс - падмурак вольнай нацыянальнай эканомікі - амаль спрэс расейскамоўны. У ідэалягічных практыкаваньнях можна не зважаць на гэтыя і іншыя падобныя да іх зьявы ці лічыць іх уяўнымі на падставе «сумнеўнай»

беларускасьці. А сэнс? Палестынскія ідэолягі, дарэчы, таксама - часткова з прычынаў ідэалягічных, часткова са сьвядомай мэтаю мабілізацыі аднадумцаў - даводзілі, што габрэі насамрэч - баязьліўцы і нікчэмныя салдаты. Магчыма, гэтыя гіпотэзы мелі моцнае інтэлектуальнае абгрунтаваньне, але пры іх практычнай праверцы ўзьнікалі, скажам так, пэўныя нечаканасьці.

Часам можна пачуць, што ў цяперашняй Беларусі ідзе змаганьне паміж сіламі адначасна беларускамоўнымі, незалежніцкімі і праэўрапейскімі ды сіламі адначасна расейскамоўнымі, прарасейскімі і антызаходнімі. А больш, маўляў, і няма нікога - ані людзей, ані сілаў. У першай частцы нашага артыкулу мы паказалі, што гэта абсалютна ня так з сацыялягічнага пункту гледжаньня. Але гэта ня так і з пункту гледжаньня палітычнага. Палітычныя рэпрэзэнтанты расейскамоўных антылукашыстаў, незалежнікаў і праэўрапейцаў і цяпер прысутнічаюць на палітычнай арэне. Тое, што яны рэпрэзэнтуюць інтарэсы менавіта расейскамоўных, цяпер, магчыма, ня вельмі заўважна хаця б з тае прычыны, што неяк недарэчна змагацца за моўныя інтарэсы гэтай групы, калі ўлады нішчаць якраз беларускую мову і культуру. Але з гэтага зусім не вынікае, што ўва ўмовах свабоднага грамадзтва, калі цяперашняе барбарскае стаўленьне да беларускай мовы адыдзе ў мінулае, такое змаганьне не пачнецца, калі будзе зробленая спроба закрануць сапраўдныя інтарэсы расейскамоўных.

Прадухіліць такое змаганьне наўрад ці магчыма. Адзінае магчымае выйсьце - вызначыць для яго рамкі, заключыць, так бы мовіць, «жэнэўскую канвэнцыю вайны культураў». Пагаджаюцца ж удзельнікі нават жорсткіх войнаў не забіваць палонных, не абыходзіцца зь імі як са злачынцамі, не забіваць сьвядома некамбатантаў і г. д. У змаганьні культураў , галоўная вастрыня якога - яшчэ напярадзе, лепш было б мець такія правілы і варта было б выпрацаваць іх цяпер, бо калі давядзецца дзейнічаць, будзе не да выпрацоўкі правілаў дзеяньняў. Яны, зразумела, могуць скласьціся і самі сабою - як балянс, вынік балючых сутыкненьняў. Аднак гэты шлях выглядае не найлепшым. Пры гэтым «жэнэўская канвэнцыя» -

гэта мінімальная перадумова таго, каб культурная вайна не ператваралася ў татальную вайну на зьнішчэньне.

Цяперашняе барбарскае стаўленьне ўлады да беларускай мовы і беларускамоўных зь неабходнасьцю спараджае прагу рэваншу, прагу, узмоцненую, акрамя прыніжэньняў і зьнявагаў, яшчэ й марай пра «беларускую Беларусь». Але гісторыя не канчаецца ані на Лукашэнку, ані на ягоным адыходзе. У пэўным сэнсе (хаця тут трэба шмат агаворак) сам ягоны прыход быў рэваншам за беларусізацыю пачатку 90-х гадоў. Якая ў сваю чаргу была рэваншам за камуністычную моўную палітыку. Можна прагназаваць, што імаверным вынікам чарговага (суб'ектыўна абсалютна абгрунтаванага) беларускамоўнага рэваншу пасьля Лукашэнкі стане не трыюмф беларушчыны, а контррэванш, новае выданьне рэфэрэндуму 1995 году. Прычым, паколькі мяркуецца, што пасьля сыходу цяперашняга прэзыдэнта Беларусь стане ўсё ж дэмакратычнай, то магчымасьць гайданьняў ківача «рэванш-контррэванш» будзе ўбудаваная ў саму палітычную сыстэму краіны, а частата гэтых гайданьняў будзе «ў ідэале» супадаць з частатой выбараў.

Здаецца, што кожны з бакоў атрымае ўрэшце больш, калі яны разам паспрабуюць разарваць гэтае замкнёнае кола, а менавіта дамовяцца пра формулу, якой цалкам ня будзе задаволены ніводзін з бакоў, але не настолькі, каб прагнуць рэваншу. Праўда, пры гэтым давядзецца разьвітацца зь некаторымі ўлюбёнымі ідэямі і нават ідэаламі, адмовіцца ад свайго права аднаасобна фармаваць праект нацыі, прызнаць неабходнасьць ствараць яго разам з апанэнтамі - непрыемнымі, дурнымі, якія нічога не разумеюць у Беларусі, вочы б іх ня бачылі.

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2004/11/5
[image]

Полацак і палачане ў беларускай паэзіі XX стагодзьдзя
Укладаньне і камэнтар Алеся Аркуша

I

Галоўным ініцыятарам паэтычнай Палаччыяны зьяўляецца Вацлаў Ластоўскі. Менавіта ён вылучыў гістарычныя паданьні пра Полацак з працаў расейскіх гісторыкаў (Тацішчава, Карамзіна, Салаўёва, Ключэўскага etc.) ды паклаў іх у падмурак уласнай канцэпцыі беларускай дзяржаўнасьці. Ня ўсе беларускія адраджэнцы пачатку XX стагодзьдзя падзялялі захапленьне Ластоўскага полацкімі мітамі. Напрыклад, у працах Антона Луцкевіча Полацак амаль ня згадваецца. У артыкуле «На дарозе да новага жыцьця» ён піша: «Беларуская нацыя злажылася болей-меней у пачатку нашага тысячалецьця. Яе стварылі, зьліўшыся ў вадно, колькі дужа блізкіх між сабой славянскіх плямёнаў - крывічы, радзімічы, дрыгавічы і др., каторыя належылі да групы заходнярускіх плямён». І гэта ўсё. Росквітам беларускага краю А. Луцкевіч называў эпоху Вялікага Княства Літоўскага. Ластоўскі ж лічыў «залатым

векам» Беларусі і часы існаваньня незалежнага Полацкага княства. Старажытныя крыўскія легенды ён шматкроць пераказвае: і ў дзіцячых чытанках, і ў артыкулах для «Нашай Нівы», і ў кнігах з гісторыі Бацькаўшчыны. Нягледзячы на яго стараньні, тагачасныя беларускія паэты вершаў пра Полацак амаль не пісалі. Полацкія міты ў «дабээсэсэраўскі» пэрыяд яшчэ ня сталіся агульнанацыянальнымі, а прызнаць тагачасны Полацак за «сэрца Беларусі» (Ластоўскі) было складана. Вось як сам Власт апісвае свой прыезд у Полацак у 1910 годзе: «Далей ідзе горад, - усё драўляныя ліхія дамочкі з пачарнеўшымі стрэхамі, з пакрыўленымі ваконцамі; увесь ён зьліваецца ў нейкі шэры, гнойны колер, як бы дагніваючага трупа; кругом вее цішай сьмерцю, толькі дзе-нідзе блісьне купал царквы, манастыра, як абрыўкі злоталітага саматкана ў разрытым кургане…». Гэтая карціна зусім не падобна ані да Вільні, ані да Кіева, ані да Ноўгараду, тым больш да Масквы, Пецярбургу, Варшавы, Кракава. Каб прызнаць Полацак за «сэрца Беларусі», трэба было ў яго паверыць. Трэба было пачаць зь міту, з вобразу, які мусілі стварыць паэты.

Вацлаў Ластоўскі. Песьня аб князю Ўсяславу.

Янка Купала. Зь мінулых дзён. Гарыслава

Максім Багдановіч. Безнадзейнасьць.

II

За савецкім часам першымі пачалі паэтызаваць полацкія міты, як ні дзіўна, маладнякоўцы. Асаблівая заслуга тут належыць Алесю Дудару. Маючы дваццаць гадоў, ён зьявіўся ў Полацку ў 1925 годзе, каб разгарнуць на поўначы Беларусі нацыянальны й літаратурны рух. У 1924-м Полаччына і шэраг іншых раёнаў Віцебскай вобласьці былі далучаныя да БССР; у рэгіёне катастрафічна не хапала нацыянальных кадраў, таму маладнякоўцаў накіроўвалі сюды праводзіць беларусізацыю. У тагачасным Полацку Дудар доўгі час ня мог заснаваць маладнякоўскай філіі, бо «спаткаўся з фактам поўнай адсутнасьці літаратурных сіл на Полаччыне». Трэба ўдакладніць - беларускамоўных сіл. Толькі пасьля крытыкі з боку кіраўніцтва «Маладняку» Дудар здолеў прывесьці ў

літсябрыну студэнтаў і вучняў, якія мелі цікавасьць да літаратуры, з надзеяй, што ў будучыні зь іх атрымаюцца «добрыя беларускія работнікі». З усяго першага складу полацкай філіі, якую ўтварылі сем чалавек, толькі сам Дудар «меў дачыненьне да літаратуры». Дзеля такой сытуацыі Полацак амаль да канца 20-х гадоў знаходзіўся пад шэфскім «кантролем» маладнякоўцаў. Менавіта яны спрычыніліся да таго, што расейскамоўная мясцовая газэта «Полоцкий пахарь» ператварылася ў беларускамоўную «Чырвоную Полаччыну». Пэўны час маладнякоўцы выдавалі яе ўласнымі сіламі. Сьледам за Дударом у старажытную крыўскую сталіцу для выяўленьня літаратурных сілаў прыяжджалі Андрэй Александровіч, Алесь Звонак, Валеры Маракоў і іншыя. Усе яны сталіся першымі савецкімі «мулярамі» паэтычнай Палаччыяны. У 20-я гады расейскамоўны Полацак патроху беларусізаваўся: зь вёсак і мястэчак у горад ехала моладзь. Полацкім маладнякоўцам, якія паходзілі з навакольных мясьцінаў - Вушаччыны, Дрысеншчыны, Расоншчыны, прасьцей было паверыць у Полацак-«сэрца Беларусі». Для іх гэта быў вялікі незвычайны горад, які зачароўваў сваімі вуліцамі і гарадзкім жыцьцём. Вось як апісвае свае першыя ўражаньні ад тагачаснага Полацку маладняковец Тарас Хадкевіч: «Полацак - стары, але невялікі па тым часе горад - здаўся мне казачным. Брукаваныя вуліцы, каменныя дамы, гмахі колішняга кадэцкага корпусу, высока ўзьнятыя купалы і шпілі, што трапляліся мне на вочы, - выглядалі інакшымі, чым у нас у вёсцы - нібыта яны былі зусім зь іншага сьвету. Потым у жыцьці я бачыў шмат гарадоў - большых і прыгажэйшых за Полацак, - але такога ўражаньня яны не пакідалі». Менавіта студэнты, найперш Полацкага пэдтэхнікуму, сталіся галоўным людзкім рэсурсам для маладнякоўцаў (рабіліся чытачамі і пачаткоўцамі-літаратарамі). У выніку, літаральна праз год існаваньня, полацкая філія ператварылася ў адну з самых актыўных рэгіянальных структураў «Маладняку». Ужо ў 1926 годзе выходзіць першы полацкі літаратурны альманах «Наддзьвіньне» (усяго выйшла тры альманахі). Полацкія маладнякоўцы надзіва паважна пісалі пра Эўфрасіньню Полацкую, якую неўзабаве ў беларускім друку пачалі называць не інакш як «цемрашалкаю», і выказвалі ў вершах антырасейскія настроі. Вось некалькі прыкладаў:

Ворагі злосныя, хцівыя ворагі -
Царскай Расеі чыноўнічы люд
Ўсё асьмяялі, што родна і дорага,
З роднай зрабілі чужую зямлю.
(Алесь Звонак)

Як вецер лістоту разьвеяў,
параскідвала вас Расея,
баярская маці - Расея,
сканаўшы ў сьвінцовай завеі.
(Андрэй Александровіч)

Алесь Звонак ува ўспамінах згадваў, што працэс беларусізацыі ў Полацку «выклікаў даволі актыўнае пярэчаньне старой часткі царскай чыноўнай інтэлігенцыі». Водгульле тых даўніх спрэчак чутнае ў вершах маладых паэтаў. Навасьпечаныя полацкія міты выкарыстоўваліся маладнякоўцамі ў якасьці аргумэнту ў гарачых дыскусіях. У лістападзе 1926-га Валеры Маракоў і Алесь Звонак у лісьце з Полацку, накіраваным у ЦК «Маладняку», пішуць: «Жывём у адной хаце калектывам цэлым, цэлым «стойлам Пэгаса», сьпяваем песьні і пасылаем усіх русаціпаў к… Рыхтуемся да вечара, рыхтуем літ. дадатак да газэты і г. д. Пішам вершы». У тым ліку і пра Полацак.

У перавыданьнях сваіх твораў тыя маладнякоўцы, хто ацалеў пасьля «зачысткі» 30-х, антырасейскія радкі паздымалі. Напрыклад, у вершы Алеся Звонака «Полаччыне» (у новай рэдакцыі верш атрымаў назву «Полацк») замест вышэйпададзеных радкоў «Ворагі злосныя, хцівыя ворагі…» зьявілася:

Сьцежкай лясной падкрадаліся ворагі -
Край бараніць уздымаўся твой люд:
Рыцараў зграі заплочвалі дорага,
Не паланіўшы чужую зямлю…

Пасьля вяртаньня з ГУЛАГу цалкам перапісаў сваю паэму (ці нізку вершаў - паэт не пазначыў жанру твору) «Дзьвіна» Андрэй Александровіч, пакінуўшы дату напісаньня «1926». Крытыка

разбуральных дзеяньняў царскай Расеі ў справе русіфікацыі беларускіх земляў ужо выглядала крамолай. Нацпытаньня пажадана было ўвогуле не чапаць.

Цікава, але паэты з «Узвышша» практычна не пісалі вершаў пра Полацак. Ува ўсякім разе такіх вершаў ані ў Дубоўкі, ані ў Пушчы я не знайшоў.

Беларусізацыя хутка была згорнутая. У 30-х гадох вершаў пра Полацак беларускія паэты амаль ня пішуць. Сёй-той ствараў «у стол», напрыклад Язэп Драздовіч - ягоная паэма «Трызны мінуўшчыны» была ўпершыню надрукаваная толькі ў 1993-м у віцебскай газэце «Выбар», праз 57 гадоў пасьля напісаньня. Гэты твор практычна невядомы аматарам айчыннага прыгожага пісьменства.

Зьмітрок Бядуля. Паходні.

Алесь Дудар. Скарына.«Цені блудзяць па твары...»Полацак

Алесь Звонак. Полаччыне. Цень Эўфрасіньні

Андрэй Александровіч. Дзьвіна.

Ганна Брэская. Францішку Скарыну.

Рыгор Хвойка. Над Дзьвіной.

Язэп Драздовіч. Трызны мінуўшчыны.

III

Адразу па другой сусьветнай вайне полацкая тэма зноў вяртаецца ў вершы. Спачатку асьцярожна (Скарыну, напрыклад, называюць Георгіем), затым з кожным годам усё сьмялей і сьмялей. Лік «полацкіх» вершаў пайшоў на сотні, а мо і на тысячы. Некаторыя паэты стварылі цэлыя вершаваныя нізкі пра старажытную крыўскую сталіцу, пра яе легенды і герояў. Збольшага гэта зусім «бяскрыўдныя» вершы з асьветніцкім зьместам - пераказы паэтычнай мовай асноўных полацкіх

мітаў. Пікам Палаччыяны стаўся верш Рыгора Барадуліна «Полацкі мэнталітэт» (дарэчы, некалькі радкоў з гэтага вершу адлітыя з мэталу на помніку літары «Ў», які зьявіўся ў Полацку ў 2003 г.). У 1970-1980-я гады беларускія пісьменьнікі канчаткова ўзьвялі Полацак у ранг першага гораду Беларусі, таго самага гораду, зь якога пачаўся беларускі сьвет. Практычна кожнай станоўчай чалавечай якасьці быў створаны полацкі адпаведнік: духоўнасьць - Эўфрасіньня Полацкая, Крыж Эўфрасіньні; прыгажосьць - Сафійскі сабор; ахвярнасьць - Рагнеда; мудрасьць - Усяслаў Чарадзей; мужнасьць - Якаў Палачанін; адукаванасьць - Францішак Скарына, Сімяон Полацкі; майстравітасьць - Лазар Богша, дойлід Іаан і г. д. А крывічы канчаткова сталіся для беларусаў нацыястваральным славянскім племем.

Пятрусь Броўка. Размова зь Дзьвіною.

Максім Танк. У Татрах.

Максім Лужанін. Як нараджаўся новы сьвет.

Уладзімер Караткевіч. Скарына пакідае радзіму.

Васіль Зуёнак. Такі быў знак…

Алесь Пісьмянкоў. Якаў Палачанін.

Навум Гальпяровіч. Над Дзьвіной.

Віктар Леаненя. Першая сталіца.

Пятро Ламан. Полацкая фрэска.

Леанід Дайнека. У Полацку над Палатою…

Данута Бічэль. Вершатворца Сімяон Полацкі.

Вольга Іпатава. Выгнаньне Полацкіх князёў у Бізантыю, год

1129.

Людміла Рублеўская. Эўфрасіньня.

Эдуард Акулін. Францішак Скарына

Алег Мінкін. У Полацку.

Ірына Багдановіч. Полацкай Сафіі.

Людміла Паўлікава. Полацкая Сафія.

Сяргей Панізьнік. «Бераг зьнямеў...»

Генадзь Бураўкін. Полацкая баляда.

Анатоль Сыс. У Сафіі крыж чырвоны.

Рыгор Барадулін. Полацкі мэнталітэт.

IV

У 40-х гадох сярод беларускіх паэтаў на эміграцыі найбольш папулярным полацкім героем стаўся Ўсяслаў Чарадзей. Славуты князь сымбалізаваў незалежнасьць, непахіснасьць, трываласьць, ваенны посьпех. Цікава, што ўжо падчас другой сусьветнай вайны беларускія паэты - і савецкія, і «антысавецкія» - зьвяртаюцца да полацкіх сымбаляў-мітаў. Напрыклад, Пятрусь Броўка ў 1943 годзе піша паэму «Беларусь», у якой згадвае Полацак, дзе ворагаў неаднойчы «варам варылі з валоў». А ў адным з разьдзелаў паэмы апавядаецца, што «Аб горадзе Полацку слава ішла - / Друкар там выдатны Георгій Скарына, / Што зоры, рассыпаў па роднай краіне / Крыштальныя словы навукі-сьвятла…» А Натальля Арсеньнева піша пра Скарыну ў нямецкім Рэгенсбургу ў 1946-м. Гэта твор пра настальгію. Лібрэта опэры «Ўсяслаў Чарадзей» Н. Арсеньнева напісала ў акупаваным Менску, аднак мы палічылі патрэбным урывак зь яго надрукаваць у «эміграцыйным» разьдзеле Анталёгіі.

Найбольшым прыхільнікам полацкай тэмы сярод паэтаў, якія апынуліся ў эміграцыі, бадай, быў Янка Юхнавец - ці ня самы таленавіты паэт-эмігрант. У ягонай паэзіі няма пераказаў мітаў пра Рагнеду, Усяслава Чарадзея, Эўфрасіньню або Францішка Скарыну. Полацкая тэма прысутнічае ў ледзь прыкметных алюзіях, схаваным цытаваньні. Сваю славутую паэму «Калюмбы» Янка Юхнавец прысьвячае «Сыну слаўнаму народу ўслаўленага Беларускага, доктару Скарыну». А «Гутаркі Лесасека» - гэта таксама пра Полацак, пра лесасекаў з Крывіччыны, пра казку сярод «Айчынных пушчаў», пра драўляную крывіцкую сталіцу, якая безьліч разоў ператваралася ў попел, але зноў і зноў адраджалася як Фэнікс. «Нараджэнцаў-дрэвы я чую пад сякерай, а пад пілой апілкамі сьцішаю чутнасьць непамёрлую ў вяршкох драўляных».

Пётра Крэчэўскі. Рагнеда.

Ларыса Геніюш. Князь Усяслаў Чарадзей.

Натальля Арсеньнева. Усяслаў Чарадзей.У гасподзе Падуанскай

Алесь Салавей. Зьвіняць Званы Сьвятой Сафіі.

Янка Юхнавец. Гутаркі лесасека.

V

Пры канцы XX стагодзьдзя беларускія паэты працягвалі актыўна пісаць вершы пра Полацак. Найбольшага плёну тут дасягнулі маладыя творцы. У іх вершах практычна зьнік пераказ полацкіх мітаў, тут чытач знойдзе іншае - развагі пра будучыню Полацку і элемэнты постмадэрнісцкай паэтыкі. Праўда, хто-ніхто яшчэ працягваў пісаць пра Полацак у адраджэнцкім (маладнякоўскім) ключы. Асобна ў гэтым хоры гучыць паэма ці не галоўнага мадэрніста Алеся Разанава «Ўсяслаў Чарадзей». Яна, відавочна, перагукаецца з аднайменным творам Натальлі Арсеньневай. Адбылося гэта

выпадкова, бо наўрад ці А. Разанаў мог пазнаёміцца зь ім раней за 1999 год, калі лібрэта опэры ўпершыню было надрукавана ў Беларусі. Гэтае супадзеньне гаворыць пра немалую запатрабаванасьць вобразу-міту Ўсяслава Чарадзея і пры канцы XX стагодзьдзя. (У 2005 годзе ў Полацку плянуецца ўсталяваць помнік Усяславу Чарадзею ў выглядзе коннай статуі.) Увогуле Алесь Разанаў у 1990-х напісаў цэлы шэраг твораў на полацкую тэматыку, зь іх, бадай, можна ўкласьці асобны зборнік.

Цікава, што некаторыя творы з Полацкай анталёгіі маглі быць уключаны ў Віленскую (некаторыя насамрэч патрапілі ўва ўкладзеную Сяргеем Дубаўцом для «ARCHE» Віленскую анталёгію, напрыклад, верш Леры Сом «Здані»). Тут яшчэ можна згадаць верш Зьмітрака Бядулі «Паходні» і паэму Язэпа Драздовіча «Гарадзішчанскае». Такой повязі Полацку зь Менскам няма.

Вершы пра Полацак будуць пісацца й надалей. Горад сваімі легендамі-мітамі будзе прываблівать новых і новых пісьменьнікаў. Бо, як слушна сказаў паэт Андрэй Хадановіч ля каменя Таварыства вольных літаратараў, які ляжыць на беразе Палаты насупроць Верхняга замку, «Полацак - гэта месца сакральнае».

Алесь Разанаў. Усяслаў Чарадзей.

Уладзімер Арлоў. Дарога ў Полацак.

Надзея Салодкая. «Страшна мне усяго: і сьвятла, і пацёмкаў...»

Ірына Дарафейчук. Калыханка Полацку.

Ігар Лосік. Каля Сафійскага сабору.

Міра Лукша. Полацак.

Іна Снарская. «А ноч плыве пад зорным парасонам...»

Алесь Аркуш. Вавэль.

Людка Сільнова. Чарадзейны Полацак.

Лера Сом. Паштоўка.
[image]
[image]

№ 3 (32) - 2004
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/5
[image]

Мэры Энцін
Зямля абяцаная

МЭРЫ ЭНЦІН (Mary Antin) - вядомая амэрыканская пісьменьніца, якая нарадзілася (1881) і жыла да трынаццаці гадоў у Полацку. У Амэрыку спачатку пераехаў бацька Марыі, а затым выклікаў у Бостан усю сям'ю: жонку, дзьвюх дачок і сына. У Марыі рана праявіліся здольнасьці да

РАЗДЗЕЛ 1. У РЫСЕ АСЕЛАСЦІ

Калі я была маленькай дзяўчынкай, мой свет дзяліўся на дзве часткі: Полацак - месца, дзе я жыла, - і дзіўную зямлю, называную «Расія». Усе мае знаёмыя дзяўчынкі жылі ў Полацку, са сваімі татамі, мамамі і сябрамі. А Расія была месцам, куды чый-небудзь бацька ездзіў па справах. Гэта было так далека, і столькі дрэннага там здаралася, што маці, бабуля і дарослыя цёткі дзяўчынкі плакалі на вакзале, калі бацька ад'язджаў у Расію, а сама яна да канца дня хадзіла сумная і маўклівая.

Праз нейкі час я даведалася пра існаванне іншага падзелу і пра тэрыторыю, якая пралягала паміж Полацкам і Расіяй. Здаецца, там было месца, якое звалася Віцебск, а таксама Вільня, і Рыга, і некаторыя іншыя. Адтуль прыходзілі фатаздымкі ніколі не бачаных дзядзькаў, стрыечных братоў ды сясцёр і лісты, а часам прыязджалі і самі дзядзькі. Гэтыя дзядзькі былі такія самыя, як і людзі ў Полацку; а людзі ў Расіі, як усе разумелі, былі зусім іншыя. У адказ на пытанні госці-дзядзькі казалі рознае глупства, каб усіх насмяшыць; і немагчыма было зразумець, чаму Віцебск і Вільня, хоць і не былі Полацкам, былі зусім не такімі тужлівымі, як Расія. Маці ніколі не плакала,

калі дзядзькі ад'язджалі.

Аднойчы, калі мне было восем год, адна мая дарослая стрыечная сястра паехала ў Віцебск. Усе акрамя мяне лічылі яе праводзіць. Я ж паехала разам з ёй. Мяне пасадзілі на цягнік, у руцэ я трымала сваю лепшую сукенку, завязаную ў хустку, і праехаўшы ў цягніку некалькі гадзін, я прыбыла ў Віцебск. Калі мы імчаліся, я не магла сказаць, дзе канчаўся Полацак. На дарозе было вельмі шмат месцаў з дзіўнымі назвамі, але ўсё гэта страціла цікавасць, калі мы прыехалі ў Віцебск.

Чыгуначны вакзал быў вялікі, нашмат большы за полацкі. Не адзін, а адразу некалькі цягнікоў стаялі на ім адначасова. На вакзале месціўся вялізны буфет з садавінай і ласункамі, у іншым месцы прадаваліся кніжкі. У натоўпе сястра трымала мяне за руку й не адпускала. Потым мы ўзялі рамізніка і ехалі вельмі доўга, і я бачыла вуліцы, магазіны і дамы, нашмат большыя і прыгажэйшыя за полацкія.

Мы пражылі ў Віцебску некалькі дзён, і я бачыла шмат прыгожых рэчаў, але тое, што найбольш здзівіла мяне, - не новае. Найбольш мяне здзівіла рака - рака Дзвіна. Дзвіна цячэ ў Полацку. Усё сваё жыццё я бачыла Дзвіну. Дык як тады, Дзвіна можа цячы ў Віцебску? Мы з сястрой прыехалі цягніком, але ўсе ведалі, што цягнік можа ехаць куды хоча, нават у Расію. Мне стала зразумела, што і Дзвіна цягнулася як каляя, хоць раней я заўсёды лічыла, што яна спыняецца там, дзе канчаецца Полацак. Я ніколі не бачыла, дзе канчаецца Полацак; я схацела даведацца, калі падрасла. Але дзе ж мог быць край Полацку? Полацак быў абапал Дзвіны, і я ведала гэта ўсё жыццё, а Дзвіна, як гэта раптам высветлілася, зусім не абрывалася. Гэта было вельмі дзіўна, што Дзвіна засталася той самай, хоць навокал быў ужо не Полацак, а Віцебск!

Таямніца гэтага ператварэння стала прычынай доўгіх пленных разважанняў. Мяжа паміж Полацкам і астатнім светам не была матэрыяльнага кшталту, як я думала, як той плот, што адгароджваў наш сад ад вуліцы. Цяпер свет выглядаў так: Полацак - працяг Полацку - працяг Полацку - Віцебск! І Віцебск не так моцна адрозніваўся ад Полацку, толькі ён быў большы, прыгажэйшы і больш людны. І на Віцебску свет не скончаўся.

літаратуры: у 1896 г. газэта «Boston Herald» надрукавала першы верш яўрэйскай дзяўчыны-эмігранткі. Першая кніжка палачанкі выйшла ў 1899 г., называлася яна «З Полацку ў Бостан» - спачатку кніга была напісана па-габрэйску, а затым ужо перакладзена на ангельскую. У 1912-м Мэры Энцін выдала другую сваю кнігу «Зямля абяцаная», пэдэўр амэрыканскай літаратуры, які вывучаецца ў школе. Кніга

Дзвіна і чыгунка ішлі за межы Віцебску - ішлі ў Расію. Што ў ёй
была і Расія працягам Полацку? Можа, тут таксама ўсё
раздзяляльнага плоту? Як я хацела ўбачыць Расію! Але мяньш
мала людзей бывала ў Расіі. Калі людзі ехалі ў Расію, гэта
азначала нейкія непрыемнасці: ці яны не маглі зарабіць на
жыццё дома, ці іх прызывалі ў войска, ці яны недзе
Не, ніхто не ехаў у Расію дзеля ўласнага задавальнення. Бо ў
Расіі жыў цар, і мноства бязлітасных людзей; і ў Расіі
жудасныя турмы, з якіх людзі ніколі не вярталіся.

Полацак і Віцебск былі цяпер звязаныя бесперапынкавую
але паміж імі і Расіяй страшная мяжа па-ранейшаму існавала. Я
даведалася, калі падрасла, што не толькі ў Полацку не любілі
ездзіць у Расію, але Расія - нават у большай ступені - была
супраць таго, каб туды прыязджалі з Полацку. Полацкіх людзей
часам вярталі раней, чым яны канчалі свае справы, і часта па
дарозе з імі жорстка абыходзіліся. Здаецца, у Расіі былі
месцы - Санкт-Пецярбург, Масква, Кіеў, - дзе мой бацька, ці
дзядзька, ці сусед павінны былі ўвогуле ніколі не з'яўляцца,
незалежна ад таго, якія важныя справы іх туды клікалі.
Паліцыя злавіла б іх і адправіла б назад у Полацак, як
страшных злачынцаў, хоць яны не зрабілі нічога дрэннага.

Мне было так дзіўна, што з маімі роднымі так абыходзіліся,
але іх вяртанне ў Полацак можна было апраўдаць прынамсі
тым, што яны там жылі. Але за што людзей выганялі з Санкт-
Пецярбургу ці Масквы, калі ў гэтых гарадах быў іх дом і ім не
было куды ехаць? Так шмат людзей - мужчын, жанчын і нават
дзяцей - прыязджалі ў Полацак, дзе ў іх не было сяброў, і
распавядалі аб жорсткім абыходжанні ў Расіі; і хоць яны не
былі нікому раднёй, іх прымалі, і дапамагалі, і падтрымлівалі ў
справах, як пагарэльцаў.

Мне было вельмі дзіўна, што цар і паліцыя хацелі мець усю
Расію толькі для сябе. Гэта была велізарная краіна; праходзіла
нямала дзён, перш чым ліст даходзіў да чыйго-небудзь бацькі ў
Расіі. Чаму там не мог знаходзіцца кожны, хто хацеў?

Не ведаю, калі я стала дастаткова вялікай, каб зразумець гэта.
Праўда адкрывалася мне па дзесяць разоў на дзень, з таго часу,
калі я пачала адрозніваць словы ад пустых гукаў. Бабуля

Аўтабіяграфічная,
у Полацку
свае
сяброўства,
Беларусі
першыя
гады жыцця
у Бостане.
Кніга
праілюстравана
фатаздымкамі:
полацкія
вуліцы,
кірмаш,
крамы,
зімовая
Дзвіна,
бабулін дом,
заняткі ў
хедэры і
нават
здымак
полацкага
далакопа.
Памерла
пісьменніца
у 1949 г.

На радзіме яна абсалютна невядомая. Мы друкуем тутака
першы падразьдзел з кнігі «Зямля абяцаная».

казала мне пра гэта, калі клала вечарам спаць. Бацькі казалі пра гэта, калі рабілі мне падарункі на святы. Сяброўкі казалі гэта, цягнучы мяне за вароты, калі праходзіў паліцэйскі. Ванька, бялявы хлопчык, мне ўсё пра гэта апавёў, калі выбягаў з мамінай пральні, каб кінуць у мяне гразёй, калі я праходзіла побач. Я чула пра гэта падчас малітвы і калі жанчыны сварыліся на базары; і часам, прачнуўшыся ноччу, я чула, як мае бацькі шэпчуцца пра гэта ў цемры. Не было такога часу ў маім жыцці, калі б я не чула, і не бачыла, і не адчувала праўды - прычыны, праз якую Полацак быў адрэзаны ад астатняй Расіі. Гэта была першая навука, якую прыйшлося засвоіць маленькай полацкай дзяўчынцы. Але я доўга не магла зразумець. Потым прыйшоў час, калі я даведалася, што Полацак, Віцебск, Вільня і некаторыя іншыя месцы былі аб'яднаныя ў «рысу аселасці» і на гэтай тэрыторыі цар загадаў мне заставацца, разам з бацькам, маці і сябрамі, і іншымі людзьмі, падобнымі да нас. Нас не павінны бачыць за мяжой аселасці дзеля таго, што мы габрэі.

Так што вакол Полацку ўсё-такі стаяў плот. Свет быў падзелены на габрэяў і негабрэяў, гояў. Гэтае веданне прыйшло так паступова, што яно не магло стаць для мяне шокам. Яно ўлілося ў маю свядомасць па кроплі. Да таго часу, калі я зразумела, што я ў вязніцы, маё цела прызвычаілася да кайданоў.

Першы раз, калі Ванька кінуў у мяне гразёй, я прыбегла дадому і наскардзілася маці; яна пачысціла маю сукенку і пакорліва сказала: «Чым я магу дапамагчы табе, маё беднае дзіцятка? Ванька - гой. Гоі робяць з габрэямі ўсё, што ім заманецца». У наступны раз, калі Ванька пакрыўдзіў мяне, я не заплакала, але пабегла хавацца, кажучы сабе: «Ванька - гой». У трэці раз, калі Ванька плюнуў на мяне, я выцерла твар і ўвогуле нічога не падумала. Я змірылася з дрэнным стаўленнем гояў, як чалавек прымiраецца з надвор'ем. Свет быў створаны пэўным чынам, і мне было ў ім жыць.

Але не ўсе гоі былі як Ванька. У суседстве з намі жыла сям'я, якая была да нас вельмі прыязная. Там была дзяўчынка маіх гадоў, якая ніколі не абзывала мяне і давала мне кветкі з бацькавага саду. А яшчэ былі Парфёны, у якіх мой дзядуля

наймаў краму. Яны ставіліся да нас так, быццам бы мы зусім і не былі габрэямі. На нашы святы яны прыходзілі да нас і прыносілі падарункі, старанна выбіраючы такія рэчы, якія маглі жыдзянятам прыдацца; а яшчэ яны любілі, каб ім усё тлумачылі - пра віно, і садавіну, і свечкі, і яны нават стараліся гаварыць адпаведныя вітанні і бласлаўленні па-габрэйску. Мой бацька часта казаў: каб усе рускія былі як Парфёны, паміж гоямі і габрэямі не было б ніякіх праблем; і Хвядора Паўлаўна, уласніца дому, адказвала, што рускія *людзі* невінаватыя. Гэта святары, казала яна, падвучваюць людзей ненавідзець габрэяў. Вядома, ёй было лепш ведаць, яна ж была вельмі пабожная хрысціянка. Яна ніколі не праходзіла паўз царкву не перахрысціўшыся.

Гоі заўсёды хрысціліся: калі ўваходзілі ў царкву і калі з яе выходзілі, калі сустракалі святара ці калі праходзілі каля абраза на вуліцы. Брудныя жабракі на царкоўных прыступках жагналіся ўвесь час; нават калі яны стаялі на рагу габрэйскай вуліцы і ім падавалі габрэі, яны хрысціліся і мармыталі хрысціянскія малітвы. У кожным гойскім доме было тое, што яны называлі «абраз» - выява хрысціянскага бога. Абраз вісеў у куце, і перад ім увесь час гарэў агеньчык. Перад іконай гоі гаварылі малітвы, кленчачы і ўвесь час хрысцячыся.

Я старалася не глядзець у той кут, дзе была ікона, калі прыходзіла да гояў дахаты. Я баялася крыжа. Усе ў Полацку баяліся - я маю на ўвазе, усе габрэі. Бо гэта праз крыж з'явіліся святары, а праз святароў былі нашы нягоды, з чым нават некаторыя хрысціяне згаджаліся. Гоі казалі, што мы забілі іх Бога, што было поўнай лухтой, бо ў іх ніколі не было Бога - толькі карцінкі. Апроч таго, тое, у чым яны нас абвінавачвалі, здарылася вельмі даўно; гоі самі казалі, што гэта даўно было. Усе, хто мог да гэтага мець дачыненне, сотні гадоў праляжалі ў магілах. Тым не менш, яны скрозь ставілі крыжы і нават на шыі насілі крыжыкі, на напамін сабе; і яны лічылі праведным ненавідзець і зневажаць нас і настойвалі, што гэта мы забілі іх Бога. Услаўляць крыж і мучыць габрэя было для іх адно і тое ж. Вось чаму мы баяліся крыжа.

Яшчэ гоі казалі пра нас, што на Пасху мы выкарыстоўваем кроў

забітых хрысціянскіх немаўлятаў. Вядома, гэта была брыдкая хлусня. Я з маленства ведала пра Пасху ўсё. Дом вычышчалі да бляску, нават у тых заканурках, куды ніхто ніколі не зазіраў. Посуд, якім карысталіся ўвесь год, хавалі на гарышча, а замест яго выймалі спецыяльны посуд на пасхальны тыдзень. Я дапамагала распакоўваць новы посуд і знаходзіла сярод яго свой уласны кубак. Пасля таго як вешалі свежыя фіранкі і адкрывалі белую падлогу, усе ў доме апраналіся ў новае, і я сядала да святочнага стала ў новай сукенцы, і ў гэты момант я адчувала сябе чыстай звонку і ўсярэдзіне. І калі я згаворвала Чатыры пытанні, пра прэсны хлеб, і горкія травы, і іншыя рэчы, а наша сям'я, чытаючы з кніжак, адказвала мне, хіба я не ведала пра Пасху ўсё, і пра тое, што было на стале, і чаму? Жахліва, што гоі так нагаворвалі на нас. Нават найменшае дзіця ў доме ведала, як святкуецца Пасха.

Якраз пад Пасху, калі мы святкавалі наша выбаўленне з егіпецкай зямлі і былі такія радыя і ўдзячныя, быццам гэта адбылося вось толькі што, нашы суседзі-гоі любілі напомніць нам, што Расія - гэта другі Егіпет. Я чула, як людзі гэта казалі, і гэта была праўда. У Полацку, у рысе аселасці, было яшчэ не так дрэнна, але ў расійскіх гарадах, а тым больш у вёсцы, дзе габрэйскіх сем'яў было няшмат - праз патрэбу мець спецыяльныя дазволы паліцыі, якая ўвесь час мяняла думку наконт іх, - гоі ператваралі Пасху ў жахлівыя для габрэяў дні. Хтосьці напляце пра забіццё хрысціянскіх дзяцей, а тупыя сяляне ашалеюць ад гэтага, набяруцца гарэлкі і выпраўляюцца забіваць габрэяў. Накідваюцца на іх з нажамі, дубінамі, сярпамі й сякерамі, забіваюць і мучаць іх, паляць іхныя дамы. Гэта называлася «пагром». Габрэі, што ўратаваліся ад пагрому, прыязджалі ў Полацак параненыя і апавядалі жудасныя гісторыі пра немаўлятак, разарваных на часткі на вачах у матак. Толькі ад таго, што пачуў такія рэчы, чалавек пачынаў плакаць наўзрыд і задыхацца ад болю. Людзі, якія гэта бачылі, болей ніколі не ўсміхаліся, як доўга яны б ні жылі; і часам іх валасы сівелі за адзін дзень, а некаторыя ўмомант рабіліся вар'ятамі.

Часта мы чулі, што пагромамі кіравалі святары, ідучы з крыжам папарадзе натоўпу. Нашы ворагі заўсёды выстаўлялі крыж як

апраўданне сваёй жорсткасці ў адносінах да нас. Я ніколі не была сведкай пагрому, але быў час, калі такая пагроза была, нават у Полацку; і ўва ўсіх маіх кашмарных уяўленнях, калі я хавалася ў цёмных кутках і думала аб тых жахлівых рэчах, якія збіраліся зрабіць са мной гоі, я бачыла крыж, бязлітасны крыж.

Я памятаю, як аднойчы мне падалося, што на нашай вуліцы адбываецца пагром, і дзіўна, што я не памерла тады ад страху. Быў нейкі хрысціянскі фэст, і паліцыя папярэдзіла нас, каб мы сядзелі дома. Брама была замкнёная і аканіцы засуненыя. Калі раптам пачынала плакаць дзіця, нянька пагражала аддаць яго святару, які вось-вось мусіў праходзіць паблізу. Поўныя жаху, але і цікаўныя, мы падглядалі праз шчыліны ў аканіцах. Мы бачылі працэсію сялян і гараджан, на чале са святарамі, што неслі крыжы, сцягі і харугвы. На пачэсным месцы неслі раку, а ў ёй - мошчы з манастыра з прадмесця Полацку. Раз у год гоі рабілі шэсце з гэтымі мошчамі, і з гэтай прычыны вуліцы лічыліся занадта святымі, каб на іх магла ступаць нага габрэя; і мы сядзелі ў страху да ночы, ведаючы, што найменшая зачэпка можа выклікаць хваляванні, а хваляванні - перарасці ў пагром.

У той дзень, калі я назірала працэсію праз шчыліну ў аканіцы, на вуліцы былі салдаты і паліцыя. Так заўсёды было, але я гэтага не ведала. Я спытала няньку, якая таксама глядзела праз шчыліну, навошта салдаты. Тая вазьмі дый скажы: «От калі раптам пагром». Так, там былі і крыжы, і святары, і натоўп. Царкоўныя званы білі на ўсю моц. Усё было падрыхтавана. Гоі збіраліся разарваць мяне на часткі сваімі сякерамі, нажамі і вяроўкамі. Яны збіраліся спаліць мяне жыўцом. І крыж - крыж! Што яны зробяць мне спачатку?

Але гоі маглі не проста спаліць мяне ці разарваць на кавалкі, яны нават маглі зрабіць са мной нешта горшае. Маглі зрабіць і тое, што рабілі з безабароннымі габрэйскімі дзецьмі, калі яны траплялі ў рукі папоў і манашак. Яны маглі пахрысціць мяне. І гэта было б горш за катаванні. Няхай лепей я патану ў Дзвіне, чым кропля хрысцільнай вады кране мой лоб. Чым вымушана кленчыць перад жахлівымі выявамі, цалаваць крыж - ды я хутчэй выбегу ў натоўп і дазволю ім вырваць з мяне вантробы. Чым адрачыся ад Адзінага Бога і пакланіцца ідалам - няхай

лепей на мяне спадзе чума ці з'ядуць мяне драпежныя звяры. Я была ўсяго толькі маленькай дзяўчынкай, і не вельмі смелай; нават ад невялікага болю мне рабілася млосна і я плакала. Але не было такога болю, якога б я не змагла сцярпець - не, не было, - толькі каб мяне не пахрысцілі.

Кожнае габрэйскае дзіцё жыло з такім пачуццём. Апавядалі гісторыі пра некалькіх габрэйскіх хлапчукоў, якіх царскія агенты выкрадалі і аддавалі на выхаванне ў сем'і гояў, дзе яны жылі, пакуль не вырасталі дастаткова, каб ісці ў войска, дзе ім даводзілася служыць да саракагадовага ўзросту; і ўсе тыя гады папы спрабавалі подкупам і штодзённымі здзекамі прымусіць іх прыняць хрост, але ўсё было марна. Гэта адбывалася ў часы Мікалая I, але калі я была маленькай, людзі, што прайшлі гэтую службу, былі не старэйшыя за майго дзеда; і я чула пра перажытае імі з іхных уласных вуснаў, і ясна было, што гэта праўда, і ад іх аповедаў сэрца перапаўнялася болем і гордасцю.

Некаторых з гэтых мікалаеўскіх салдатаў, як іх клікалі, забралі ва ўзросце сямі-васьмі гадоў - вырвалі з матчыных рук. Іх адвезлі ў аддаленыя вёскі, дзе іх ніколі не змаглі б знайсці сябры, і аддалі брудным, жорсткім сялянам, якія выкарыстоўвалі іх як рабоў і трымалі разам са свіннямі. Па два іх ніколі не пакідалі; і ім давалі новыя імёны, каб цалкам адарваць іх ад роднага асяроддзя. А потым самотнае дзіця аддавалася святарам, і яго сяклі, марылі голадам і запужвалі - маленькага бездапаможнага хлопчыка, які прасіўся да мамы; але ён усё роўна адмаўляўся хрысціцца. Святар абяцаў яму ўсякую смакату, і прыгожае адзенне, і вызваленне ад працы; але хлопчык адварочваўся і ўпотай казаў свае модлы - габрэйскія модлы.

Калі ён падрастаў, для яго прыдумвалі больш жорсткія катаванні, але ён усё роўна адмаўляўся ад хросту. Пад той час ён забываўся матчын твар, а з малітваў мо толькі «Шма» заставалася ў ягонай памяці; але ён заставаўся юдзеем і нішто не магло змусіць яго змяніць веру. Калі ён трапляў у войска, яго імкнуліся падкупіць абяцаннямі павышэнняў у званні і ўзнагародаў. Але ён заставаўся радавым і цярпеў самую жорсткую муштру. Калі ўва ўзросце сарака гадоў яго

адпраўлялі ў адстаўку, гэта быў чалавек, у якога не было нічога - ні сям'і, ні ключа да свайго паходжання, і ён бавіў астатак свайго жыцця ў вандраваннях паміж габрэйскімі паселішчамі і пошуках сваіх родных; хаваючы пад лахманамі шнары ад катаванняў, ён хадзіў ад дзвярэй да дзвярэй і прасіў міласціну. Калі ж ён быў адным з тых, каго зламалі жорсткімі катаваннямі, і дазволіў сябе пахрысціць, дзеля таго каб атрымаць хоць якую палёгку, царква так і не дазваляла яму вярнуцца назад, нават калі ён пасля гучна даказваў сваё юдзейства. Калі ж выяўлялася, што ён выконвае юдзейскія рытуалы, яго чакала самае суровае пакаранне.

Мой бацька ведаў аднаго чалавека, якога забралі маленькім хлопчыкам і які так і не паддаўся папам пад самымі страшнымі катаваннямі. А паколькі ён быў вельмі кемлівым хлапчанём, папы асабліва моцна жадалі схіліць яго да хрысціянства. Яны спрабавалі падкупіць яго тым, што кранала ягонае самалюбства. Яны абяцалі, што ён стане вялікім чалавекам - генералам, дваранінам. Але хлопчык адвярнуўся і стаў маліцца па-свойму. Потым яны катавалі яго і кінулі ў камеру, а калі ён заснуў у знямозе, прыйшоў поп і пахрысціў яго. Калі ён прачнуўся, яму паведамілі, што ён стаў хрысціянінам, і паднеслі распяцце для пацалунку. Ён не згадзіўся і адкінуў крыж, але яны настойвалі, што ён выхрыст і цяпер належыць да Царквы; і астатак жыцця ён правёў паміж турмой і шпіталем, цвёрда трымаючыся сваёй веры, кажучы юдзейскія малітвы насуперак сваім катам і расплачваючыся за гэта сваім здароўем.

У Полацку былі людзі, ад аднаго погляду на чые твары можна было пастарэць за хвіліну. Яны служылі Мікалаю I і вярнуліся непахрышчанымі. Белая царква на плошчы - чым яна для іх здавалася? Я здагадвалася. Я праклінала царкву ў сваім сэрцы кожны раз, калі мне даводзілася праходзіць побач; і я баялася - вельмі баялася.

У базарныя дні, калі сяляне прыходзілі ў царкву і ў званы білі штогадзіны, у мяне на сэрцы быў вялікі цяжар і я не магла знайсці спакою. Нават у бацькавым доме я не адчувала сябе бяспечна. Царкоўныя званы гулі над дахамі дамоў і клікалі,

клікалі, клікалі. Я заплюшчвала вочы і бачыла, як людзі заходзяць у царкву: вясковыя жанчыны ў вышываных фартухах і шкляных каралях, босыя дзяўчынкі ў каляровых хустках на галовах, хлопчыкі ў картузах, нізка нацягнутых на русыя валасы; грубыя мужыкі ў лапцях, падпярэзаныя вяроўкамі, - маса людзей, якая павольна рухаецца ўверх па прыступках, хрысціцца зноў і зноў, аж пакуль іх не заглыне чорны дзвярны праём і толькі жабракі застануцца сядзець на прыступках. Бум, бум! Што людзі робяць у цемры паміж змрочнымі выявамі і страшнымі крыжамі? Бум, бум, бум! Гэта яны звоняць па мне. Ці ў царкве яны будуць катаваць мяне, калі я адмоўлюся пацалаваць крыж?

Не трэба было мне слухаць тыя жудасныя гісторыі. Яны адбыліся даўно; мы жылі пры блаславёным «Новым рэжыме». Аляксандр III быў далёка не сябром для габрэяў; тым не менш, ён не загадваў адрываць хлопчыкаў у матак ды перарабляць іх у салдатаў і хрысціянаў. Кожны мужчына мусіў адслужыць у войску чатыры гады, і з рэкрутам-габрэем абыходзіліся жорстка, нават калі ён служыў бездакорна; але ўсё гэта было дробяззю ў параўнанні з жудаснымі ўмовамі старога рэжыму.

А што сапраўды было нядобра, дык гэта неабходнасць парушаць габрэйскія правілы штодзённага жыцця падчас службы. Салдату часта даводзілася есці трэфнае і працаваць у суботу. Ён быў змушаны галіць бараду і выказваць шанаванне хрысціянскаму богу. Ён не мог штодзённа наведваць сінагогу; выкананню яго прыватных рэлігійных абрадаў заміналі кпіны і абразы з боку ягоных таварышаў-гояў. На якія толькі хітрыкі ён не ішоў, але яму ўсё роўна даводзілася парушаць габрэйскі закон. Калі ён вяртаўся дадому па сканчэнні тэрміну службы, ён не мог змыць з сябе пляму тых змушаных грахоў. На працягу чатырох год ён вёў жыццё гоя.

Адной пабожнасці было дастаткова, каб габрэі страшыліся вайсковай службы, але былі і іншыя прычыны, якія выклікалі сур'ёзныя цяжкасці. Большасць мужчынаў ува ўзросце 21 году - узрост прызыву ў войска - былі ўжо жанатыя і мелі дзяцей. Падчас іх адсутнасці іхныя сем'і жылі ў нястачы, а справа часта банкрутавала. Пад канец службы яны ператвараліся ў

жабракоў. Дадому з месца службы іх таксама адпраўлялі як жабракоў. Калі здаралася, што на час звальнення яны мелі добрую форму, то яе забіралі і замянялі на зношаную. Ім выдавалі бясплатны білет на дарогу дадому і некалькі капеек на штодзённыя выдаткі. Такім чынам іх падганялі з вяртаннем у рысу аселасці, быццам яны былі нейкімі збеглымі вязнямі. А калі пасля нейкага часу іх знаходзілі за мяжой аселасці, іх хапалі і адпраўлялі дамоў у ланцугах.

З правіла абавязковай службы былі пэўныя выключэнні. Адзінага сына ў сям'і вызвалялі ад службы, былі і іншыя прычыны. На медыцынскім аглядзе перад наборам у войска шмат каго прызнавалі нягодным з прычыны якой-небудзь хваробы. І гэта наводзіла людзей на ідэю наўмысна рабіць сабе нейкія калецтвы, каб учыніць часовыя знявечанні, дзякуючы якім можна не прайсці агляду. Мужчынам рабілі аперацыі на вачах, вушах, руках, нагах, ад чаго яны цярпелі жахлівыя пакуты, спадзеючыся пазбегнуць службы. Калі аперацыя праходзіла добра, камісія прызнавала яго непрыдатным, і ў хуткім часе ён зноў быў здаровым і свабодным чалавекам. Часта, аднак, здаралася, што пашкоджанні, якія мусілі быць часовымі, аказваліся непапраўнымі, таму ў Полацку было нямала людзей сляпых на адно вока, глухаватых, кульгавых у выніку такіх патаемных аперацый; але з такімі калецтвамі лягчэй было жыць, чым з успамінам пра чатырохгадовую царскую службу.

Сыны багатых бацькоў маглі пазбегнуць войска без неабходнасці рабіць сабе фізічную шкоду. Заўсёды можна было падкупіць членаў камісіі, якая праводзіла набор. Гэта была небяспечная справа: калі раптам праточвалася інфармацыя пра перамовы, найбольшыя праблемы звальваліся зусім не на чыноўнікаў, - але не было такой паважанай сям'і, якая б дазволіла забраць сына ў салдаты, не зрабіўшы ўсё магчымае для ягонага ўратавання. Мой дзед амаль што разарыўся, адкупаючы сваіх сыноў ад службы; а маці апавядала хвалюючыя гісторыі пра жыццё свайго меншага брата, які гадамі хаваўся пад чужымі імёнамі і ў розным абліччы, аж пакуль не мінуў узрост вайсковага абавязку.

Калі б гэта праз баязлівасць габрэі ўхіляліся ад вайсковай службы, яны б не рабілі сабе фізічных шкодаў, горшых за тыя, што пагражалі ім на службе, і праз якія яны часта заставаліся скалечанымі на ўсё жыццё. Калі б гэта была прагавітасць - страх страціць за чатыры гады даходы ад свайго занятку, - яны не выдаткоўвалі б усе грошы, не прадавалі б дамоў і не ўлазілі б у даўгі, каб толькі даць хабар царовым людзям. Габрэйскага рэкрута сапраўды страшыла жорсткасць і несправядлівасць з боку афіцэраў і таварышаў па службе; ён баяўся за сваю сям'ю, якую ў такім выпадку даволі часта пакідалі на ўтрыманне родных; але страх перад неабходнасцю весці грэшнае жыццё быў найбольшым з усіх. Я ведаю гэта, бо памятаю, як майго стрыечнага брата забралі ў салдаты. Усё было зроблена, каб уратаваць яго. Грошы траціліся не задумваючыся - дзядзька нават не спыніўся перад тым, каб узяць адкладзенае на пасаг дачцэ, калі ўсё астатняе было патрачана. Мой стрыечны брат таксама атрымаў таемнае «лячэнне» - ужываў нейкі моцны прэпарат на працягу некалькіх месяцаў да медыцынскага агляду, - але эфект ад яго аказаўся недастаткова моцны, і яго палічылі прыдатным. Першыя некалькі дзён яго часць была размешчана ў Полацку. Я бачыла, як брат займаўся страявой падрыхтоўкай на плошчы, трымаючы ружжо, у *суботу*. Я адчула сябе нячыстай, быццам бы гэта я сама зграшыла. Таму лёгка было зразумець, чаму маці прызваных у войска пасцілі, плакалі, маліліся і хваляваннямі даводзілі сябе да магілы.

У нашым горадзе быў чалавек, якога клікалі Давыд Замена, бо ён пайшоў у салдаты замест іншага, у той час як сам ён ад службы быў вызвалены. Ён зрабіў гэта за грошы. Думаю, ягоная сям'я галадала, і ён знайшоў у гэтым магчымасць забяспечыць яе на некалькі гадоў. Але гэта быў грэх - ісці ў салдаты па ўласнай волі. І Давыд ведаў, як дрэнна гэта было, бо ў душы ён быў пабожны чалавек. Калі ён вярнуўся са службы, ён быў ужо ў гадах і зламаным чалавекам, сагнутым пад цяжарам сваіх грахоў. І ён узяў сабе за пакуты штораніцу ў суботу праходзіць па вуліцах, заклікаючы людзей на малітву. Рабіць гэта было зусім не проста, бо Давыд цяжка працаваў на працягу ўсяго тыдня, у любое надвор'е, летам і зімой; і ў суботу раніцай не было іншага чалавека, такога ж стомленага, як Давыд; нядужы, ён ледзь чыкільгаў. Але ён прымушаў сябе паднімацца з ложка

раней, чым развіднялася, і хадзіў ад вуліцы да вуліцы, праз увесь Полацак, заклікаючы людзей прачынацца і ісці на малітву. Не раз суботняй раніцай я прачыналася ад Давыдавага голасу і ляжала, слухаючы, як аддаляецца і аціхае ягоны голас; і ён быў такі сумны, што ажно сціскалася сэрца, як гэта бывае ад прыгожай музыкі. І я была радая, што сястра ляжыць побач са мной, бо так самотна было шэрым досвіткам, калі толькі Давыд і я не спім, ды Бог чакае людскіх малітваў.

Гоі звычайна здзіўляліся, што мы так шмат увагі аддаем пытанням веры - што тычылася ежы, шабасу і навучання дзяцей габрэйскай мове. Іх злавала наша ўпартасць - так яны гэта называлі, - яны кпілі з нас і высмейвалі самае святое. Сярод гояў былі разважныя людзі, якія нас разумелі. Былі людзі адукаваныя, як Хвядора Паўлаўна, якая сябравала са сваімі суседзямі-габрэямі. Яны заўсёды былі ветлівыя і адкрыта выказвалі захапленне некаторымі нашымі звычаямі. Але большасць гояў былі цёмныя, падазроныя і незычлівыя. Яны не верылі, што ў нашай рэлігіі магло быць хоць нешта добрае, і вядома ж, мы не адважваліся тлумачыць ім, бо нас абвінавацілі б у спробе навярнуць іх у сваю веру, і тады нам быў бы канец.

О, калі б яны толькі разумелі! Аднойчы Ванька злавіў мяне на вуліцы, і пацягнуў за валасы, і абазваў; і раптоўна я запыталася ў сябе: «Чаму? Чаму?» - гэтага пытання я не задавала сабе ўжо вельмі даўно. Я так злавалася, што магла даць яму здачы; былі моманты, калі я не баялася ўдарыць яго ў адказ. Але гэтае «Чаму? Чаму?» ўзнікла ў маёй душы - і я забылася адпомсціць за сябе. Гэта было так цудоўна - у мяне ў галаве не было словаў, каб выказаць гэта, але гэта азначала, што Ванька абразіў мяне таму, што ён не разумеў. Калі б ён мог вычуваць маім сэрцам, калі б ён на адзін дзень мог стаць жыдзянём, ён бы даведаўся. Калі б ён толькі разумеў пра Давыда Замену, так, без тлумачэнняў, як я гэта разумела. Калі б ён мог прачнуцца на маім месцы ў суботу ранкам і адчуць, як сэрца разрываецца ад болю праз тое, што габрэй парушыў закон Майсееў, і як Бог нахіляецца прабачыць яму. Ну чаму я не магла зрабіць так, каб Ванька зразумеў? Ад шкадавання мне забалела сэрца, і гэты боль быў мацнейшы за боль ад Ванькавых выспяткаў. Куды падзеліся і мая злосць, і мая смеласць. Ванька працягваў кідаць

у мяне камянямі з-за дзвярэй сваёй хаты, а я далей патэпала па сваіх справах. Ад таго, што мне балела найбольш, немагчыма было ўцячы.

Была адна рэч, якую гоі разумелі заўсёды, - грошы. Яны былі гатовыя браць любы хабар у любы час. На падтрыманне міру ў Полацку кожны год ішло так шмат. Калі ты не быў у добрых адносінах са сваімі суседзямі-гоямі, яны мелі сотню спосабаў зрабіць табе прыкрасць. Калі ты прагнаў іхных свіней, што рылі ў тваім гародзе, ці наганіў іхных дзяцей за тое, што яны крыўдзілі тваіх, яны маглі паскардзіцца ў паліцыю, падмацоўваючы сваю справу хлуслівымі абвінавачаннямі і фальшывымі сведкамі. Калі ты не сябраваў з паліцыяй, справа магла пайсці ў суд; і там ты прайграваў справу раней, чым пачынаўся яе разгляд, калі толькі ў суддзі не было прычыны падтрымаць цябе. Самым танным спосабам жыцця ў Полацку было за ўсё плаціць. У Полацку гэта разумела нават маленькая дзяўчынка.

Магчыма, твае бацькі мелі ўласную справу - а звычайна так і было, бо амаль усе трымалі крамы, - і ты шмат чула пра начальніка паліцыі, акцызных чыноўнікаў і іншых царовых служак. Паміж царом, якога ты ніколі не бачыла, і паліцэйскімі, якіх ты ведала занадта добра, ты ўяўляла сабе доўгі рад усялякіх чыноўнікаў, і кожны з іх працягваў руку, каб атрымаць грошы твайго бацькі. Ты ведала, што бацька ненавідзіць іх усіх, але бачыла, як ён усміхаецца і кланяецца, напаўняючы тыя прагныя рукі. І ты рабіла тое самае ў сваіх дробных справах. Калі ты бачыла, што Ванька ідзе насустрач па бязлюднай вуліцы, ты працягвала яму недаедзены яблык, з усяе сілы прымушаючы вусны ўсміхацца. Было балюча ад той фальшывай усмешкі, ад яе ў душы рабілася чорна.

У гасцёўні твайго бацькі вісеў вялікі каляровы партрэт Аляксандра III. Цар быў жорсткі тыран - пра гэта гаварылі шэптам, пры замкнёных дзвярах і засуненых аканіцах, ноччу - ён быў Тыт, Аман, закляты вораг усіх габрэяў - і, тым не менш, ягоны партрэт можна было бачыць на ганаровым месцы ў доме твайго бацькі. Ты ведала чаму. Гэта добра выглядала, калі прыходзілі па справах паліцыя і ўрадоўцы.

Неяк раніцай ты выйшла пагуляць і ўбачыла грудок людзей вакол ліхтарні. На ёй вісела аб'ява - новы загад начальніка паліцыі. Ты праштурхнулася ў натоўп, угледзелася ў плакат, але не змагла расчытаць. Жанчына ў рванай хустцы паглядзела на цябе і сказала з горкай усмешкай: «Узрадуйся, узрадуйся, дзяўчынка! Начальнік паліцыі кажа табе ўзрадавацца. Сёння на даху кожнага дому будзе вісець прыгожы сцяг, бо сёння дзень нараджэння цара, і мы павінны святкаваць. Ідзі паглядзі, як бедныя людзі закладаюць свае самавары і падсвечнікі, каб сабраць грошы на прыгожы сцяг. Гэта свята, дзяўчынка. Узрадуйся!»

Ты ведаеш, што жанчына іранізуе - табе знаёмая такая ўсмешка, - але прымаеш гульню і ідзеш глядзець, як людзі купляюць сабе сцягі. Адзін з тваіх сваякоў трымае краму тканінаў, дзе можна добра паназіраць за ўсёй працэдурай. Вакол прылаўку тоўпяцца людзі, а гаспадар з памочнікам паспешна адмяраюць тканіну чырвоную, сінюю і белую.

«Колькі яе трэба?» - пытае нехта. «Каб мне ведаць пра грэх не болей, чым я ведаю пра сцягі», - адказвае іншы. «Як іх сшываць?» «Ці абавязкова трэба ўсе тры колеры?» Адзін з пакупнікоў кладзе на прылавак некалькі капеек, кажучы: «Дайце мне тканіны на сцяг. Гэта ўсе мае грошы. Дайце мне чырвонай і сіняй; на белую я парву сваю кашулю».

Ты ведаеш, што гэта не жарты. Сцяг мусіць быць на кожным доме, іначай яго гаспадара пацягнуць у пастарунак, дзе ён заплаціць дваццаць пяць рублёў штрафу. Ведаеце, што здарылася са старой, якая жыла ў халупе ля дарогі? Гэта адбылося ў той час, калі было загадана вывесіць сцягі, бо Полацак меў наведаць Вялікі Князь. У старой не было ні сцяга, ні грошай. Яна спадзявалася, што паліцэйскі не заўважыць яе ўбогай хацінкі. Але ён, такі пільны, заўважыў, падышоў, адчыніў дзверы ўдарам нагі ў сваім вялізным боце і забраў апошнюю падушку з пасцелі, прадаў яе і ўзняў сцяг над прагнілым дахам. Я добра ведала гэтую старую жанчыну з адным слязлівым вокам і зморшчанымі рукамі. Я часта прыносіла ёй з кухні міску супу. На яе пасцелі засталося адно рыззё, калі паліцэйскі забраў у яе падушку.

Цар заўсёды атрымліваў належнае сабе, нават калі гэта даводзіла цэлую сям'ю да галечы. Адзін бедны слесар быў вінен цару трыста рублёў за тое, што ягоны брат уцёк з Расіі, не адслужыўшы свайго тэрміну ў войску. Для гояў не было такога штрафу, толькі для габрэяў; і ўся сям'я несла адказнасць. У слесара не было такіх грошай, і не было каштоўнасцей, каб аддаць у заклад. Паліцыя прыйшла да яго і наклала арышт на ўсё хатняе дабро, на ўсё, што ён меў, нават пасаг ягонай маладой жонкі; і ад продажу ўсіх гэтых рэчаў атрымалі трыццаць пяць рублёў. Праз год паліцыя прыйшла зноў, па рэшту штрафу. Яны паставілі пячатку на ўсім, што толькі знайшлі. Жонка яго была ў ложку пасля нараджэння першага дзіцяці, хлопчыка. На наступны дзень павінна было адбыцца абразанне. Паліцыя не пакінула нават прасціны, куды можна было б укруціць дзіця, каб аддаць на аперацыю.

Нямала горкіх прыказак чулі твае вушы, калі ты была маленькай габрэйскай дзяўчынкай у Полацку. «Свет несправядлівы», - чула ты, і ты ведала, што так і было, гледзячы на партрэт цара і на сцягі. «Ніколі не кажы паліцэйскаму праўду», - гаварыла іншая прыказка, і ты ведала, што гэта добрая парада. Штраф трыста рублёў быў прысудам на пажыццёвае рабства для таго беднага слесара, калі б ён толькі не знайшоў якога-небудзь выкруту. Як толькі ён узаб'ецца на пару анучаў ды нейкі ложак, паліцыя прыйдзе па іх. Ён мог схавацца пад чужым імем, калі б яму ўдалося выехаць з Полацку з фальшывым пашпартам; ці ён мог падкупіць пэўных чыноўнікаў, каб тыя далі фальшывае пасведчанне аб смерці зніклага брата. Толькі шляхам падману ён мог забяспечыць спакой сябе і сваёй сям'і, калі цар хацеў атрымаць з яго грошы.

Можна было здзівіцца, пачуўшы, колькі розных мытаў і падаткаў мы вінны былі цару. Мы плацілі падаткі на нашы дамы, і падаткі на арэндную плату за дамы, падаткі на гандаль, і падаткі на прыбыткі. Я не ўпэўненая, ці не было падаткаў на страты. Горад збіраў падаткі, і губерня, і цэнтральны ўрад; і начальнік паліцыі быў з намі заўсёды. Былі падаткі, якія збіраліся на шарваркі, але прагнілыя тратуары працягвалі гніць гадамі; а калі трэба было пабудаваць мост, спаганялі

дадатковы падатак. Мост, дарэчы, не абавязкова быў для агульнага карыстання. Чыгуначным мостам цераз Дзвіну, адкрытым для вайскоўцаў, іншыя людзі маглі карыстацца толькі з асабістым дазволам.

Мой дзядзька растлумачыў мне ўсё, што тычылася акцызных збораў на тытунь. Тытунь быў крыніцай дзяржаўных даходаў, таму на яго быў высокі падатак. Цыгарэты абкладаліся падаткам на кожным этапе іх вытворчасці. Тытунь абкладаўся асобна, і папера, і муштук, а канчатковы прадукт абкладаўся дадатковым падаткам. Не было падатку на дым. Напэўна, праз недагляд цара.

Справа не прыносіла даходаў, бо падаткі так уздымалі кошт тавараў, што людзі не маглі дазволіць сабе іх купіць. Адзіным спосабам зрабіць справу прыбытковай было хітраваць і не плаціць ураду часткі падаткаў. Але падманваць цара было небяспечна - пры такой колькасці агентаў, якія ахоўвалі ягоныя інтарэсы. Людзі, што гандлявалі цыгарэтамі без урадавага дазволу, атрымлівалі са свайго занятку болей сівых валасоў, чым асігнацый. Заўсёдная рызыка, турботы, боязь паліцэйскага налёту ўначы і вялізныя штрафы ў выпадку выяўлення праступку пакідалі вельмі мала прыбытку і спакою таму, хто займаўся незаконным продажам тавараў. «А што рабіць?» - казалі людзі, паціскаючы плячыма, і гэта азначала безвыходнасць, што панавала ў рысе аселасці. «Што рабіць? Жыць жа трэба».

Жыць, пры той жорсткай канкурэнцыі, непазбежнай пры такой колькасці насельніцтва, было няпроста. Крамаў было ў дзесяць разоў болей, чым трэба, у дзесяць разоў болей было краўцоў, шаўцоў, цырульнікаў, бляхароў. Калі гой банкрутаваў у Полацку, ён мог пераехаць у любое месца, дзе канкурэнцыя была меншая. Габрэй мог аб'ехаць усю рысу аселасці, але скрозь умовы былі тыя самыя, што й дома. За рысай аселасці ён мог накіроўвацца ў некаторыя вызначаныя мясцовасці, плаціць за гэта вялізныя грошы, бясконца даваць у лапу; і нават тады ён не быў у ласцы мясцовага начальніка паліцыі.

Рамеснікі мелі права жыць па-за мяжой аселасці пры выкананні пэўных умоў. Калі я была маленькая, для мяне гэта здавалася

простай справай, пакуль я не зразумела, як гэта дзейнічала. Жыў сабе шапавал, меў належную кваліфікацыю, здаў экзамен і заплаціў за паперы на гандаль, каб жыць у пэўным горадзе. Начальніку паліцыі раптам стукнула ў галаву паставіць пад сумнеў сапраўднасць ягоных дакументаў. Яму давялося ехаць у Санкт-Пецярбург, дзе ён атрымаў кваліфікацыю ў першы раз, каб паўторна здаць экзамен. Ён выдаткаваў збіраныя гадамі грошы, каб даць усім хабар і такім чынам паскорыць працэс, але бюракратычная цяганіна ўсё роўна затрымала яго на дзесяць месяцаў. Калі ён нарэшце вярнуўся ў свой родны горад, начальнік паліцыі там ужо памяняўся, і прызначаны падчас ягонай адсутнасці новы начальнік знайшоў у толькі што атрыманых паперах нейкі іншы недахоп і не дазволіў яму жыць у горадзе. А ў Полацку тым часам жыло адзінаццаць шапавалаў, у той час як заробку на жыццё было толькі для аднаго.

З купцамі было тое самае, што і з рамеснікамі. Яны таксама маглі купіць права жыць за рысай аселасці, часова ці стала, на ўмовах, якія не гарантавалі ім рэальнай бяспекі. Я ганарылася тым, што мой дзядзька быў купцом першай гільдыі, але яму гэта вельмі дорага абыходзілася. У год ён мусіў плаціць вялікую суму за гэтую годнасць, а таксама нейкія працэнты з прыбытку ад свайго гандлю. Гэта давала яму права выязджаць па сваіх справах з мяжы аселасці два разы ў год, агульнай працягласцю не болей чым на шэсць месяцаў. Калі б яго знайшлі там пасля таго, як выйшаў дазвольны тэрмін, яму б давялося плаціць штраф, які, напэўна, перавышаў бы ўсё, што ён зарабіў за падарожжа. Звычайна я ўяўляла, як дзядзька падчас свайго падарожжа ў Расіі ўвесь час спяшаецца, каб скончыць свае справы ў вызначаны тэрмін, у той час як паліцэйскі ідзе за ім і адзначае дні і лічыць гадзіны. Гэта была бязглуздая фантазія, але ў Расіі рабіліся некаторыя рэчы, якія сапраўды былі вельмі смешнымі.

Было ў Полацку такое, ад чаго можна было смяяцца адным вокам і плакаць другім, як смяецца і плача клоун. Падчас эпідэміі халеры гарадскія чыноўнікі, якія раптоўна рабіліся вельмі актыўнымі, адкрывалі пункты, дзе людзям раздавалі сродкі дэзінфекцыі. Да таго часу чвэртка насельніцтва ўжо

паспявала памерці, і большасць памерлых ужо былі пахаваныя, хоць некаторыя трупы заставаліся гніць у пакінутых дамах. Тыя, хто выжыў - некаторыя з іх ашалелыя ад страху, - краліся па бязлюдных вуліцах, пазбягаючы адно аднаго, каб патрапіць у вызначаныя пункты, дзе яны штурхаліся і тоўпіліся, каб атрымаць сабе пляшачку карболкі. Шмат хто паміраў ад страху ў тыя жахлівыя дні, але некаторыя, напэўна, паміралі ад смеху. Бо толькі гоям было дазволена атрымліваць сродкі для дэзінфекцыі. Бедных габрэяў, у якіх не было нічога акрамя свежых магіл, не пускалі на гэтыя пункты.

Магчыма, несправядліва было думаць пра нашых суседзяў-гояў, што яны стварэнні адрознага ад нас віду, але ад такіх вар'яцкіх дзеянняў яны больш не здаваліся нам падобнымі да людзей. Прасцей было пасябраваць з жывёлай у хляве, чым з некаторымі гоямі. Карова, каза і кот адказвалі на дабрыню і памяталі, якая са служанак была добрая, а якая - злая. Для гояў не было такіх паняццяў. Габрэй ёсць габрэй, і яго трэба ненавідзець, аплёўваць і зацята эксплуатаваць.

Адзіныя - акрамя тых нешматлікіх адукаваных людзей - гоі, якія звычайна не глядзелі на нас з нянавісцю і пагардай, былі цёмныя сяляне з вёскі, якія і самі былі мала падобныя да людзей. Яны жылі ў брудных хатах разам са свіньмі, і адзінае, што іх хвалявала, было - як знайсці нешта паесці. Гэта не была іх правіна. Зямельныя законы зрабілі іх такімі беднымі, што яны мусілі прадаваць сябе, каб толькі набіць жываты. Якую дапамогу маглі атрымаць мы ад гэтых вартых жалю рабоў? За бочку гарэлкі можна было купіць усю вёску. Яны дрыжалі перад самымі нікчэмнымі гараджанамі і на знак доўгавалосага папа павярнулі б супраць нас сякеры.

Гоі мелі апраўданне для сваёй жорсткасці. Яны казалі, што нашы купцы і ліхвяры падманваюць іх, а крамнікі абважваюць. Калі хто хоча абараніць габрэяў, ён ніколі не павінен адмаўляць гэта. Так, я кажу, мы падманваем гояў, калі толькі наважваемся, бо гэта адзінае, што мы можам зрабіць. Прыпомніце, як цар увесь час адсылаў нам загады: вам няможна рабіць таго і нельга гэтага, - і ў выніку заставалася мала таго, што мы мелі права рабіць. Мы мелі хіба што права

плаціць падаткі і памірaць. Ён трымаў нас пад замком, нас былі тысячы на лапіку, дзе маглі жыць толькі сотні, і ўсе сродкі існавання максімальна абкладаліся падаткам. Калі ў стэпе зашмат ваўкоў, яны пачынаюць паляваць адзін на аднаго. І мы, галодныя нявольнікі рысы аселасці, мы рабілі тое самае, што і галодныя звяры. Але наша чалавечая прырода выяўлялася ў выбары ахвяры. Калі толькі было магчыма, мы бераглі сваіх, а супраць нашых расавых ворагаў накіроўвалі розныя хітрыкі, вынайдзеныя нашай вялікай нястачай. Ці гэта не закон вайны? Знаходзячыся сярод ворагаў, мы не маглі дзейнічаць іначай. Габрэй наўрад ці змог бы весці справу, калі б не меў дваістага сумлення, якое дазваляла яму рабіць гою тое, што ў адносінах да брата-габрэя ён палічыў бы за грэх. Няцяжка зразумець такое духоўнае калецтва ў пасынкаў царовых. Адзін погляд на законы рысы аселасці пакіне вас у здзіўленні - як расійскія габрэі ўвогуле не страцілі падабенства да людзей.

Любімым абвінавачаннем супраць нас было тое, што мы прагныя да золата. Ну чаму гоі не маглі бачыць усю праўду, калі яны бачылі палову? Мы сапраўды былі прагныя да прыбыткаў, любілі патаргавацца, зэканоміць, выціснуць як мага болей з кожнага гешэфту. Але чаму? Ці ведалі гоі прычыну? Ці ведалі, колькі каштавала нам паветра, якім мы дыхалі? Калі б габрэй і гой мелі побач свае крамы, гой мог бы задаволіцца меншымі прыбыткамі. Яму не трэба было купляць дазвол на паездкі па сваіх гандлёвых справах. Яму не трэба было плаціць трыста рублёў штрафу, калі ягоны сын ухіляўся ад службы ў войску. Яму не трэба было грашыма супакойваць завадатараў пагрому. Прыхільнасць паліцыі прадавалася яму за меншую цану, чым габрэю. Ягоная прырода не вымушала яго падтрымліваць школы і дабрачынныя справы. Быць хрысціянінам нічога не каштавала. Наадварот, гэта падтрымлівалася і давала прывілеі. Быць юдзеем было раскошай, якая каштавала грошай ці крыві. Што дзіўнага ў тым, што мы збіралі капейкі? Чым ёсць шчыт для салдата ў бітве, тым быў рубель для габрэя ў рысе аселасці.

Веданне таго, што я распавядаю, пакідае адзнакі на душы і целе. Я памятаю маленькіх полацкіх дзяцей са старымі-старымі тварамі і вачыма, шклянымі ад скрытнасці. Я навучылася

падманваць, падлізвацца і прыкідвацца раней, чым даведалася назвы пораў году. І я мела процьму часу, каб гэта абдумваць, бо мне не было чым сябе заняць. Калі б мне хоць у школу можна было б хадзіць... Але вядома ж, мне было няможна.

Для дзяўчат не было грамадскіх школ, і нават твае дастаткова багатыя бацькі, паслаўшы цябе ў прыватную школу, не маглі вучыць цябе доўга. У вышэйшую школу, падкантрольную ўраду, габрэйскіх дзяцей прымалі ў абмежаванай колькасці - толькі дзесяць на сотню, і нават калі ты трапляла сярод гэтых шчасліўчыкаў, у цябе былі свае цяжкасці. Выкладчык, што рыхтаваў цябе, гаварыў увесь час пра экзамены, якія табе давядзецца здаваць, пакуль не наганяў на цябе страху. Ты чула з усіх бакоў, што самым здольным габрэйскім дзецям адмаўляюць у прыёме, калі экзаменатарам не падабаецца форма іх носа. Праз свой нос ты з цяжкім сэрцам ішла на экзамен разам з іншымі габрэйскімі дзецьмі. Для габрэяў, вядома, экзамен праводзіўся спецыяльны. Дзевяцігадоваму габрэю даводзілася адказваць на пытанні, якія лічыліся зацяжкімі для разумення трынаццацігадовага гоя. Але гэта было неістотна. Ты рыхтавалася да экзамену, разлічанага на трынаццацігадовых, і пытанні здаваліся табе лёгкімі. Ты радасна пісала адказы - і атрымлівала нізкую адзнаку, і ніякай апеляцыі не было.

Я часта стаяла ў дзвярах бацькавай крамы, грызла яблык, які мне зусім не смакаваў, і глядзела, як вучні ідуць дадому са школы па два ці па тры: дзяўчынкі ў ахайных карычневых сукенках, чорных фартушках і маленькіх шапачках, хлопчыкі ў акуратнай форме з мноствам гузікаў. У ранцах за спінай было заўсёды шмат кніжак. Дома яны дастануць іх, будуць чытаць і пісаць, і даведаюцца столькі ўсяго цікавага! Для мяне яны былі стварэннямі з зусім іншага свету. Але тыя, каму я зайздросціла, мелі свае ўласныя праблемы, як часта можна было пачуць. Іх школьнае жыццё было бясконцым змаганнем з несправядлівасцю з боку выкладчыкаў, са злобным стаўленнем аднакласнікаў і пастаяннымі абразамі. Тыя, хто, дзякуючы гераічным высілкам і неверагоднаму шанцаванню, паспяхова сканчалі курс і жадалі працягваць вучобу, знаходзілі перад сабой новую сцяну. Ім адмаўлялі ў прыёме ўва ўніверсітэт,

куды прымалі толькі трох габрэяў на сто гояў; ахвотныя паступіць туды сутыкаліся з тымі самымі жорсткімі ўмовамі, што і ў вышэйшай школе, - асабліва складаныя экзамены, несправядлівыя адзнакі ці ўвогуле поўнае, нават і непрыкрытае самавольства. Не, цар не хацеў, каб мы вучыліся.

Але я чула ад мамы і пра іншую сітуацыю, у той час, калі яе браты былі маленькімі. У тагачаснага цара была выдатная ідэя. Ён сказаў сваім міністрам: «Давайце будзем адукоўваць людзей. Давайце пераможам гэтых габрэяў праз грамадскія школы, каб яны не ўпарціліся ў сваёй вузкай габрэйскай навуцы, якая не вучыць іх любіць свайго манарха. Сілай з імі не выйшла; прымусова навернутыя, калі толькі наважацца, вяртаюцца да сваіх старых звычаяў. Давайце паспрабуем дзейнічаць праз адукацыю».

Верагодна, мірнае навяртанне габрэяў не было адзіным матывам цара, калі ён паўсюль адкрыў грамадскія школы і прымусіў бацькоў пасылаць сваіх сыноў на вучобу. Магчыма, ён проста хацеў зрабіць дабро і прынесці карысць краіне. Але для габрэяў грамадскія школы сталі дзвярыма, што вялі ў бяздонне адступніцтва. Выкладчыкі заўсёды былі хрысціянамі, навучанне было хрысціянскім, і школьныя правілы адносна ўрокаў, адзення і паводзінаў часта супярэчылі габрэйскім звычаям. Праз грамадскую школу прыпынялася вучоба хлопчыкаў у хедэрах. Дзе вы знойдзеце набожнага габрэя праз тры пакаленні, выхаваныя хрысціянскімі настаўнікамі? Зразумела, што цар хацеў завалодаць душамі габрэйскіх дзяцей. У канцы школьнага курсу іх чакалі дзверы царквы. І таму ўсе прыстойныя габрэі ўзняліся супраць школ і любым спосабам, праўдамі і няпраўдамі, не пускалі туды сваіх дзяцей. Чыноўнік, прызначаны скласці спіс хлопчыкаў для прыёму ў школу, разбагацеў на тым хабары, што давалі яму заклапочаныя бацькі, каб схаваць сваіх дзяцей ад школы.

Праз нейкі час мудры цар перадумаў ці памёр - напэўна, і тое, і другое - і школы былі зачыненыя, а габрэйскія хлопчыкі змаглі спакойна вывучаць свае габрэйскія кніжкі, адкрыта носячы святарныя махры і ніколі не паганячы свой язык ніводным расійскім словам.

А потым перадумалі габрэі - некаторыя з іх. Яны схацелі паслаць сваіх дзяцей у школу, каб тыя вывучалі гісторыю і прыродазнаўчыя навукі, бо выявілі, што і ў гэтым была карысць, таксама як у Святым законе. Такіх людзей называлі прагрэсіўнымі, але ў іх не было магчымасці для прагрэсу. Усе наступныя цары трымаліся старога погляду, што для габрэяў не павінна быць адчыненых дзвярэй - ніякага выхаду з рысы аселасці, з іх сярэднявечча.

Пераклала з англьскай Паўліна Вішнеўская паводле: Mary Antin. The Promised Land. The Atlantic Monthly Company, 1912.

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/5
[image]

Запісы, якія мы друкуем ніжэй, - гэта ўспаміны калябаранта. Дзёньнік чалавека, які ад нянавісьці да ўсяго савецкага і спробаў унікнуць ваеннае нэндзы прыйшоў да сьведамага і пасьлядоўнага слугаваньня нацыстам. Гэты чалавек апынуўся ў Полацку досыць выпадкова ў 1941 годзе, выжыў, увайшоў у мясцовы клерыкальны асяродак. Ён, імаверна, быў адным з аўтараў даносаў у гестапа, якія вывелі гітлерцаў на сьлед полацкага антынацысцкага падпольля, у выніку ён і ягоныя прыяцелі атрымалі высокія пасады ў адміністрацыі. Сваё перабываньне над Дзьвіной ён скончыў уступленьнем у Нацыянал-сацыялістычную працоўную партыю Расеі.

За апошні час адносна добра быў дасьледаваны фэномэн беларускіх нацыяналістаў-калябарантаў. Аўтар гэтых успамінаў - расейскі нацыяналіст і заўзяты праваслаўны. Цікавы ракурс, пад якім ён глядзіць на Полацак і Беларусь, а таксама на беларускіх нацыяналістаў, у якіх аўтарава групоўка справядліва бачыла небясьпечных канкурэнтаў у барацьбе за пасады ў адміністрацыі. Імкнучыся забясьпечыць сабе «алібі» перад гісторыяй, даказаць самому сабе справядлівасьць ці, прынамсі, непазьбежнасьць сваёй лініі паводзінаў у вайну, тлумачачы свой выбар у трохкутніку «расейцы-немцы-бальшавікі», ён сьвядома ідзе на фальсыфікацыю гістарычнае праўды ў вялікім і малым. Германафіл, беларусафоб, пераканаы (па волі лёсу?) вораг савецкай улады нават у 1956 годзе тлумачыў нацысцкія зьверствы дзейнасьцю камуністаў. «Палонных ня бралі, усё было скончана літаральна за некалькі хвілінаў», - так апісвае ён сутычку самааховы з партызанскай групай. Вайна, якой мы так ніколі і ня зьведаем да канца, праз

крывую прызму ўспамінаў аб Полацку 1941-1944 гадоў, прапануецца вашай увазе.

П. Ільінскі

Тры гады пад нямецкай акупацыяй у Беларусі
(Жыцьцё Полацкай акругі 1941-1944)

1. ПЕРШАЕ ЗНАЁМСТВА З АКУПАЦЫЙНАЙ ЗОНАЙ

Уцякаючы зь лініі фронту, адкуль немцы падчас зімовага адыходу ад Масквы высялялі цывільнае насельніцтва, я патрапіў нарэшце ў г. Полацак 25.12.41 г.

Стаяла лютая зіма, і нашую вялікую сям'ю забраў да сябе ў хату першы, каго мы сустрэлі. Гэта быў былы мясцовы чыгуначнік. Пасьля таго як мы трошкі адпачылі ды пад'елі, мы пачалі распытваць нашага гаспадара пра жыцьцё-быцьцё пад новай нямецкай уладаю. Полацак быў захоплены немцамі ледзь ня ў першыя дні вайны; такім чынам, у сьнежні 1941 году за плячыма ён ужо меў амаль паўгоду акупацыі. Шмат што павінна было ўжо высьветліцца ды вызначыцца цягам гэтага адносна немалога тэрміну: нездарма ж у ваенны час месяц лічыцца за год. Было ня толькі надзвычай цікава, але й надзвычай важна дазнацца, якім чынам зарганізаванае новае жыцьцё без НКВД, без калгасаў ды камуністаў, без гарсаветаў ды сельсаветаў - адным словам, без усяго таго, ад чаго немцы ў сваіх прапагандысцкіх праклямацыях абяцалі вызваліць шматпакутную Расею.

«Адкажыце ж нам, калі ласка, што творыцца тут, у глыбокім тыле?»

На нашае вялікае зьдзіўленьне, пытаньне гэтае, такое звыклае для кожнага, хто толькі што сюды прыбыў, не выклікае выразнага энтузіязму ў нашых суразмоўцаў. У іхных вачах страх, зусім такі, як гэта было ў СССР, калі размова выпадкова выходзіла за вузкія межы бясьпечнага ды дазволенага. Але так адбывалася нядоўга. Гаспадар - дасьведчаны падсавецкі чалавек, ён бачыць нашае нярадаснае становішча і тое, што мы сапраўды нічога ня ведаем. Ён выразна разумее, з кім мае справу, у яго няма аніякіх падставаў баяцца нас. І ён пачынае напаўголасу жудасны аповед, які мы, як і кожны іншы на нашым месцы, менш за ўсё чакалі пачуць менавіта ў гэтым месцы і ў гэты час.

«НКВД сапраўды больш няма, - кажа ён, - але супрацоўнікі НКВД засталіся і працуюць у паліцыі і гестапа, гэтаксама як і раней. Гарсавету таксама няма, але ў гарадзкой управе працуюць тыя самыя супрацоўнікі гарсавету ды іншыя былыя камуністы. Людзі, якіх перасьледавалі пры бальшавіках, перасьледуюцца і цяпер. Той, хто быў адміністрацыйна асланы раней, вымушаны хавацца дагэтуль, бо гарадзкія камуністы, якія займаюць найвышэйшыя пасады ўва ўстановах, баяцца быць выкрытымі перад немцамі; няшчасны той чалавек, у якім яны западозраць пагрозу для сябе. Людзі, якіх вызвалілі немцы з савецкіх турмаў, баяцца прапісвацца ў горадзе; той, хто быў асланы і цяпер вярнуўся, ня йдзе атрымліваць харчовыя карткі» і г. д. і г. д.

«Зазірніце на рынкавую плошчу, - параіў напрыканцы наш суразмоўца, - убачыце там павешанага. Вось ужо цягам некалькіх тыдняў матляецца ён на вяроўцы з дошкай на шыі. На дошцы надпіс: «Савецкі шпіён і бандыт». А яго ведае ўвесь горад: перакананы праціўнік савецкай улады, шмат гадоў перасьледаваўся НКВД, ня меў нават права жыць у родным горадзе. Ужо пры немцах вярнуўся ён дамоў і задумаў пратэставаць супраць камуністычнага засільля. У выніку - арышт, зьверскае зьбіцьцё ў гэтак званай расейскай паліцыі гумовымі палкамі ды бессэнсоўнае абвінавачаньне ў

шпіянажы».

Шмат чаго давялося пачуць нам ад гэтага добрага чалавека, які хацеў пазнаёміць нас з рэчаіснасьцю мясцовага жыцьця ды засьцерагчы нас, каб не патрапілі на рынкавую плошчу, у гаруправу, у расейскую паліцыю ці ў гестапа. Дай Бог яму здароўя!

У стане глыбокай дэпрэсіі пачалі мы «афармляцца» ў горадзе. Больш за ўсё мы марылі пра тое, каб уцячы адсюль куды вочы глядзяць. А вочы глядзелі на Рэвэль ды Рыгу, дзе мы мелі блізкіх сяброў. Ортскамэндатура катэгарычна адмовілася нам выдаць пропускі ў Прыбалтыку. Полацак быў «ваенным гебітам», нешта накшталт прыфрантавой паласы (хоць фронт і знаходзіўся далёка на ўсходзе, за Смаленскам), непераадольная сьцяна разьдзяляла тады чамусьці зону ваеннага кіраваньня ад іншых «мірных гебітаў». Тут быў мілітэрфэрвальтунг, там - цывільфэрвальтунг. Немцам з ортскамэндатуры падавалася, што гэтым яны цалкам усё патлумачылі. Яны разводзілі рукамі і рабілі такі выгляд, нібыта ім самім няёмка ад сваіх «неабгрунтаваных» прэтэнзіяў на Прыбалтыку.

Такім чынам, уцячы адсюль не ўдалося. Трэба было заставацца ў Полацку, трэба было наведаць гаруправу ды паліцыю, гэта азначае пачаць той самы шлях, які мог прывесьці занадта далёка, шлях, ад якога, пасьля расповедаў чыгуначніка, найбольш хацелася пазбавіцца. Памочнік камэнданта паведаміў, што ў гаруправе вельмі патрэбныя культурныя сілы; а перакладчык камэнданта - халодны вымуштраваны чалавек яшчэ даволі маладога веку, які, нягледзячы на нашае валоданьне нямецкай мовай, аніяк не хацеў дапусьціць нас да беспасярэдняй гутаркі зь немцамі, - даў ад сябе самога цыдулку да кіраўніка мясцовага банку. Гэты апошні нібыта меў добрыя вакансіі.

Страшэнны шлях пачаўся з наведаньня гарадзкога галавы, або бургамістра. Ён прыняў нас у сваім кабінэце ў прысутнасьці дзьвюх жанчынаў: кіраўніцы справамі і перакладчыцы. Са словаў нашага чыгуначніка мы ўжо ведалі, што першая - сужыцелька бургамістра ды былая жонка буйнога энкавэдыста,

які перад самай вайною зьехаў у адпачынак на поўдзень, а другая - вядомая ў горадзе асьведамляльніца НКВД, якая зьнішчыла шмат настаўнікаў. Нас прыязна ды падрабязна распытвалі пра ўсё; мы рабілі намаганьне быць асьцярожнымі пры адказах, як гэта адбывалася і пры Савецкім Саюзе. Ніякай працы для нас не знайшлося, але нам абяцалі, што нас «будуць мець на ўвазе». На разьвітаньне бургамістар, які трошкі страціў сваю прыязнасьць, параіў зьвярнуцца да кіраўніка банку, «які, магчыма, нечым вам дапаможа».

Давялося ісьці ў банк, мы ня мелі ўжо чаго есьці, а бясконца сядзець на шыі ў чыгуначніка таксама не было выйсьцем.

Першае, што кінулася мне ў вочы на ўваходзе ў гэтую ўстанову, была постаць энкавэдыста высокага росту, які стаяў, апрануты ў поўную форму, пасярэдзіне вялікага пакою. Найвышэйшыя кіраўнікі НКВД у СССР выразна адрозьніваліся сваім адзеньнем ад усіх іншых грамадзянаў: яны насілі гэтак званую «бэкешу», асаблівага крою паліто-шынэль з рэменем і футравым каўняром.

Бэкеша была сымбалем працы ў НКВД: яе нельга было купіць ці апрануць звычайным сьмяротным. Такім чынам, чалавек у бэкешы быў кіраўніком банку. Ён ня меў часу на размову са мною зараз жа, але, прачытаўшы цыдулку ад перакладчыка, паведаміў, што будзе ўвечары таго ж дня чакаць мяне дома, і даў адрас. Калі пазьней я ішоў, хістаючыся ад голаду, па зусім цёмных вуліцах незнаёмага гораду ў пошуках кватэры кіраўніка банку, мне ўвесь час падавалася, што зь цемры на мяне пазіраюць ягоныя злыя, маленькія, блізка пасаджаныя вочы. Яны падаваліся мне яшчэ горшымі за бэкешу і надзвычай удала яе дапаўнялі. Такія вочы знаёмыя кожнаму грамадзяніну СССР, якога хоць некалі дапытвалі ў Маскве на Лубянцы.

Вечаровая сустрэча ды гутарка з кіраўніком банку засталася ў маёй памяці назаўсёды. Калі я прыйшоў, гаспадар быў ужо моцна п'яны. Ад гарэлкі ды гумору вочы ягоныя страцілі цьвёрдую мэтанакіраванасьць сьледчага; тым ня менш, ён пачаў гаворку са мною з самага звычайнага допыту: хто я, адкуль і куды, навошта, як і чаму.

У зыркім коле моцнай электрычнай лямпачкі я сядзеў перад п'яным кіраўніком банку, распавядаў яму звыклую гісторыю ўцекача, а ягоная жонка збоку, зь цемры, моўчкі назірала за намі. Мая балбатня, наўрад ці ўвогуле прымальная, яму, аднак, спадабалася; ён падбадзёрваў мяне, хваліў чамусьці за асьцярожнасьць і ўвесь час п'янай думкай вяртаўся да нейкіх «інструкцыяў», якімі ён сёньня ня ў стане займацца. Я гэтак і не зразумеў, хто каму мусіць даваць інструкцыі - я яму ці ён мне.

Напрыканцы, нягледзячы на пратэсты жонкі, ён запатрабаваў, каб я разам зь ім выпіў бутэльку гарэлкі. Як я ні баяўся піць - галодны ды змардаваны, - было зразумела, што вырвацца без скандалу з уладных абдымкаў майго новага знаёмага зусім немагчыма. Таму я ня стаў асабліва спрачацца, тым больш што вызначыцца ў гэты момант, што больш небясьпечна - застацца або пайсьці - было надзвычай цяжка. Я застаўся, а ягоная зусім цьвярозая жонка, якая безнадзейна пратэставала, была хутка з бойкаю выгнаная мужам з пакою.

Мы пачалі есьці ды піць, і я, ці то ад прагнасьці ежы, ці то ад страху, п'янеў надзвычай павольна. Але чаго толькі не давялося мне тады пачуць! Ён казаў больш намёкамі, ня ўсё наўпрост, шмат што ўвогуле толькі згадвалася. Але што такое «намёк» з вуснаў п'янага чалавека! Часьцяком ён больш красамоўны, чым самая бессаромная адкрытасьць. Адным словам, калі б і не было ў свой час зроблена папярэджаньне з боку чыгуначніка, я б усё роўна з адной гэтай размовы мог упэўніцца, што, нягледзячы на нямецкую акупацыю, гарадзкія справы ў значнай частцы па-ранейшаму знаходзяцца ў руках бальшавікоў, якія, як і даўней, тэрарызуюць насельніцтва да крайняй ступені.

Толькі цяпер я зразумеў увесь жах нашага становішча: ужо даводзілася думаць ня проста пра небясьпеку, а хутчэй пра мізэрныя шанцы на выратаваньне. Субутэльнік мой канчаткова ап'янеў. Я пакутаваў ад пытаньня: ці памятае ён на наступны дзень тое, што кажа ці робіць, калі бывае п'яным? У пакоі зноў зьявілася ягоная жонка, спрытная, ладная, вытрыманая жанчына. Зь яе зьяўленьнем узьнікла іншае пытаньне: ці чула яна нашую п'яную размову?

Але ў тую хвіліну я спадзяваўся, што ня ўсё яшчэ страчана і

ёсьць яшчэ адзін сродак, як уратавацца. Шматгадовы досьвед падсавецкага жыцьця падказваў, што ў дадзеных умовах трэба прыкінуцца дурнем і няздатным з практычнага пункту гледжаньня чалавекам. Спосаб вядомы ды выпрабаваны, стары і ў той жа час вечна новы. Хто топіцца, той за брытву хопіцца - і я прысьвяціў гэтаму рэшту вечара, маючы на ўвазе ня столькі п'янага кіраўніка банку, колькі ягоную зусім цьвярозую жонку. Калі ўся гарэлка была выпітая, мы разьвіталіся з гаспадаром, пагадзіўшыся на тым, што я заўтра раніцой прыходжу да яго на працу, каб быць залічаным у штат, а з гаспадыняй, якая пайшла мяне правесьці, - на тым, што п'яны муж яе «ўсё хлусіць»: штатнага месца ў яго для мяне няма і каб я ўвогуле забыўся пра магчымасьць працы ў банку. Апошняе можна было акрэсьліць хутчэй як нядрэнны паказьнік: містыфікацыя ўдалася, я гэтаму моцна парадаваўся.

Сур'ёзная жанчына мела рацыю. Мяне ня толькі не прынялі ў банк, але вельмі хутка высьветлілася і тое, што мяне ўвогуле нікуды ня прымуць. Але й на шыбеніцу на базарнай плошчы я таксама ня трапіў. Дзесьці, відаць, вырашылі, што сьпяшацца са мною пакуль што няма патрэбы. Лютая зіма, адсутнасьць добрага жытла, голад, вошы ды інфэкцыйныя хваробы павінны былі памалу, але дакладна выканаць ролю забойцы. Калі б не дапамога добрых людзей, а пасьля й Праваслаўнай Царквы, ніхто з нашай сям'і да вясны не дажыў бы. Насамрэч выйшла трошкі інакш: з шасьці чалавек мы страцілі (дый тое трошкі пазьней) толькі дваіх, самых старых, слабых і непадрыхтаваных да такога, зусім новага стылю жыцьця.

2. АГУЛЬНАЕ СТАНОВІШЧА Ў ГОРАДЗЕ Ў ПЕРШЫ ГОД ВАЙНЫ І АКУПАЦЫІ

Арыентавацца ў жыцьці малога правінцыйнага гораду было нескладана. Хутка я сабраў усе зьвесткі, якія мяне цікавілі. У першыя дні вайны Полацак патрапіў у зону калясальнага нямецкага акружэньня - у выніку немцы, якіх бальшавікі чакалі з захаду, прыйшлі ў горад з усходу, з боку Віцебску. Гэтыя акалічнасьці зьнемагчымілі эвакуацыю, і горад з прылеглымі

раёнамі быў захоплены амаль з усім сваім насельніцтвам, якое было тут і ў мірныя часы. Выконваючы загад Сталіна, у Полацку, як і ў іншых месцах, чырвоныя войскі і адмысловыя камсамольскія брыгады падпальвалі жылыя будынкі, крамы ды склады. Пад жудасны плач ды енк мясцовага насельніцтва яны хадзілі па вуліцах і кідалі бутэлькі з бэнзынам. Людзі ледзь пасьпявалі выскачыць на вуліцу, баронячы з маёмасьці толькі тое, што мелі на сабе. Ніякія пратэсты не дапамагалі: у тых, хто спрабаваў супраціўляцца або тушыць пажар, стралялі.

Жах гэтай першай і для шматлікіх людзей, магчыма, самай галоўнай бяды другой сусьветнай вайны, якая надарылася яшчэ да таго, як немцы занялі горад, не паддаецца ніякаму апісаньню. Горад быў амаль цалкам драўляны; ён згарэў на тры чвэрці, тысячы людзей засталіся бяз даху над галавой, без маёмасьці і безь якіх-кольвек сродкаў на існаваньне. Значная частка гарадзкога насельніцтва разышлася па бліжэйшых вёсках. Немцы ўваходзілі ў горад руінаў: на многіх вуліцах не засталося ніводнага жылога будынку. Немцы спрабавалі разам з насельніцтвам тушыць пажар, але было ўжо запозна. Велізарныя вайскова-прадуктовыя склады з хлебам, мясам і маслам, якія былі загадзя створаныя Сталіным каля Полацку на выпадак наступальнай вайны, гарэлі цягам некалькіх месяцаў ужо пры немцах; да іх немагчыма было падступіцца.

Насельніцтва, у тым ліку й габрэі, якія памяталі нямецкую акупацыю яшчэ часоў першай сусьветнай вайны, не баяліся немцаў і нават віталі іх прыход. Нянавісьць да савецкай улады перасіліла ў савецкіх грамадзянах усе іншыя пачуцьці ды думкі.

У цэнтры эканамічнай зацікаўленасьці народу была зямля і вольны гандаль; зямля, безумоўна, найперш. Калі мясцовыя сяляне, мабілізаваныя бальшавікамі перад самым прыходам немцаў, праходзілі ўжо ў якасьці ваеннапалонных па вуліцах гораду ды сустракалі вачыма знаёмых ды сваякоў, яны, зусім забыўшыся пра свой уласны цяжкі стан, на ўвесь голас крычалі: «Што вы тут стаіцё бяз справы? Хутчэй бяжыце дамоў, дзяліце зямлю! А мы пакуль што будзем разам зь немцамі дабіваць Сталіна!»

Упэўненасьць у тым, што калгасы будуць ліквідаваныя зараз

жа, а ваеннапалонным дадуць магчымасьць узяць удзел у вызваленьні Расеі ад бальшавікоў, была на першых часах усеагульнай і бязьмежнай. Інакш найбліжэйшай будучыні ніхто й не ўяўляў. Усе чакалі мабілізацыі мужчынскага насельніцтва ў войска (бальшавікі не пасьпелі мабілізаваць усіх); сотні заяваў аб прыёме добраахвотнікаў пасылаліся ў ортскамэндатуру, якая яшчэ не пасьпела агледзецца на месцы.

Франтавыя часткі немцаў былі добра забясьпечаныя ўсім неабходным; яны, як зазвычай, не рабавалі і ня крыўдзілі мясцовага насельніцтва. Гэта спрыяла самаму добраму ўражаньню. Давер да немцаў падвышаўся і тымі акалічнасьцямі, што спачатку яны ахвотна выпускалі на волю ваеннапалонных: мясцовых - дахаты, а прыбышоў - калі нейкая мясцовая сям'я ці самотная жанчына згаджалася ўзяць палоннага «ў прымы».

На немцаў у той час яшчэ амаль ніхто не пазіраў як на ворагаў: відавочным ворагам быў толькі Сталін, партыйцы ды камсамольцы, якія спалілі горад.

Аднак добры настрой трымаўся нядоўга. Адборныя вайсковыя нямецкія часткі пайшлі далей, пачалося «спакойнае» новае жыцьцё, настрой у людзей больш ня лепшаў, а, наадварот, пачаў горшаць. Немцы ня спраўдзілі ніводнай мары, ніводнага законнага спадзяваньня мясцовага насельніцтва: яны ўвесь час займаліся такімі рэчамі, якіх аніяк немагчыма было зразумець нармальнаму чалавеку. І ўжо адно тое, што зразумець іх было немагчыма, прымусіла людзей насьцярожыцца ды западозрыць нешта нядобрае.

Пачалося ўсё з «пакліканьня бальшавікоў на царства», як казаў адзін зь мясцовых сьвятароў. Затым, пры дапамозе тых самых бальшавікоў, што занялі ўсе кіраўнічыя пасады ў гарадзкой паліцыі, пачаліся страшэнныя рэпрэсіі ў дачыненьні да габрэйскага насельніцтва. Затым немцы не дазволілі сялянам падзяліць зямлю й фактычна захавалі калгасную сыстэму. Затым немцы адмовіліся дапусьціць народ хоць у нейкай ступені да вызваленьня сваёй уласнай краіны ад бальшавікоў. Затым яны чамусьці перасталі вызваляць палонных, а замест гэтага пачалі зьнішчаць іх гэтаксама, як і габрэяў. Затым у

акупацыйнай зоне, як паказьнік найвышэйшага палітычнага глупства, былі ўведзены публічныя сьмяротныя пакараньні. Пералічваць астатняе, відаць, ня варта, бо ўсё іншае, нават надзвычай важкае, губляе сваю значнасьць побач з адзначаным вышэй. Да пералічанага трэба дадаць некаторыя тлумачэньні. Камуністы завалодалі адміністрацыйнымі ўстановамі без асаблівых цяжкасьцяў. Зусім згодна з прымаўкай: «Безь мяне мяне ажанілі». Як толькі немцы прыйшлі да ўлады, яны адразу выдалі распараджэньне, згодна зь якім усе былыя савецкія службоўцы ды рабочыя мусілі вярнуцца на працу. Такім простым чынам уся партыйная эліта аўтаматычна апынулася пры ўладзе. Пры гэтым ортскамэндант нават афіцыйна заявіў, што згодна зь нямецкім пунктам гледжаньня палітычныя меркаваньні - асабістая справа кожнага і ніякія заявы пра былую прыналежнасьць да палітычнай партыі немцамі разглядацца ня будуць. У прыватнай размове ён, аднак, выказваў трошкі іншае меркаваньне. Ён казаў: «Нам патрэбныя людзі, якія маюць досьвед кіраваньня народнымі масамі. У Расеі такімі людзьмі зьяўляюцца толькі камуністы. Мы ведаем, што гэта беспрынцыповы элемэнт: для іх ня мае значэньня, каму служыць, - служылі Сталіну, будуць служыць і нам». Сутнасьці справы гэта не мяняла.

Але калі прыход да ўлады камуністаў быў фактам пасіўным зь іх боку, гэта зусім не азначала, што, апынуўшыся наверсе, яны не захочуць ці ня змогуць арганізоўвацца далей згодна са сваімі прынцыпамі, а будуць аддана і добрасумленна служыць немцам. Насамрэч выходзіла якраз наадварот. Мы ўбачым далей, якія наступствы гэта мела для немцаў, для саміх партыйцаў і для шматпакутнага цывільнага насельніцтва.

Іншае, што было надзвычай цяжка зразумець з боку немцаў, была незразумелая ў сваёй жорсткасьці і бессэнсоўнасьці масавая расправа з габрэямі. Франтавыя часткі ня выказалі да габрэяў ні асаблівай цікаўнасьці, ні асаблівай варожасьці. Яны нават кармілі іх разам зь іншымі «цывілістамі» са сваіх паходных кухняў у першыя дні пасьля заняцьця гораду. І раптам, праз тры ці чатыры тыдні пасьля гэтага, як пярун зь яснага неба, зьявіўся загад аб стварэньні гета! І гэты загад, і ўсё тое, што адбылося пазьней, выклікала цэлую хвалю глыбокага

непаразуменьня і нават адкрытага пратэсту з боку ўсіх колаў насельніцтва.

У Беларусі, дзе гэтак шмат габрэйскай бядноты, жыцьцё якой фактычна нічым не адрозьнівалася ад астатняй часткі прыгнечанага савецкай уладай насельніцтва, антысэмітызму няма, і маштаб надзвычайнага нямецкага злачынства зусім ня ўкладваўся ў галовах мясцовага жыхарства. Прынцыповы бок справы быў, безумоўна, на першым месцы. Але, акрамя гэтага, кожны меркаваў, што калі немцы здольныя на такія справы з габрэямі, значыць, нішто не перашкодзіць падобным чынам абысьціся і зь іншымі.

Гэтае апошняе цалкам разумнае меркаваньне хутка спраўдзілася, калі пачаліся масавыя расправы над ваеннапалоннымі ў лягерох.

Як вядома, што да зямлі, то з роспускам калгасаў ды пераходам на аднаасобныя гаспадаркі пры немцах таксама справа не заладзілася. Немцы намагаліся зрабіць усё, што маглі, каб як надалей адцягнуць роспуск калгасаў. Кожнаму селяніну было абсалютна зразумела, што немцы, гэтаксама як і бальшавікі, лічаць супольную сыстэму землекарыстаньня найлепшай сыстэмай дзеля выпампоўваньня з насельніцтва як мага большай колькасьці прадуктаў. Такім чынам, сумеснае зь немцамі змаганьне супраць бальшавікоў для селяніна ў значнай ступені страчвала свой сэнс.

Наразаць зямлю сялянам у Полацкім раёне пачалі толькі ў канцы 1943 году. З палітычнага пункту гледжаньня гэта было больш чым позна.

І ў той самы час, гэта значыць пры канцы 1941 і ў пачатку 1942 году, у Беларусі раптам зьявілася шмат украінцаў. Цікава, ці мелі такую папулярнасьць у гэты самы час беларусы ў акупаванай Украіне? У Полацку слова «ўкраінец» хутка зрабілася надзвычай папулярным ды азначала чалавека, які карыстаўся незаслужанымі прывілеямі. Украінцам - давер, украінцам - асобны паёк, толькі ўкраінцаў прымаюць на самыя розныя дапаможныя пасады пры нямецкіх вайсковых ды цывільных установах: украінцы - дзясятнікі, наглядчыкі ды

паганятыя. Попыт, як вядома, нараджае прапанову, а людзі савецкай школы жыцьця ня любяць хадзіць разявіўшы рот. Але ж і напладзілася тады ў Беларусі «ўкраінцаў»! Я думаю, што ў самой Украіне іх столькі не было. Дзякуючы сваёй «мудрай палітыцы» што да гэтак званых «украінцаў» немцы й самі хутка зразумелі, што загнаныя ў кут: стала ясна, што неўзабаве ў Беларусі не застанецца ніводнага беларуса - усе зробяцца ўкраінцамі. Немцам давялося спыніць сваю акцыю, але ў насельніцтва доўгі час заставаўся непрыемны ўспамін. Усе разумелі, адкуль вецер вее, і да 1944 году ў Полацку казалі: «Пайсьці ўва ўкраінцы».

Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на тое ўражаньне, якое засталося ад увядзеньня публічных пакараньняў. Гэтым немцы займаліся да вясны 1942 году, але нашкодзілі гэтым яны сабе ня менш, чым астатнім. Сваёй памылкі немцы не змаглі зразумець нават пасьля таго, як самі адмовіліся ад пакараньняў. Усім вядома, што немцы могуць выглядаць надзвычай прыемнымі людзьмі ў прыватных адносінах. Але ніводны іншы народ у сьвеце не валодае такой выключнай здольнасьцю ў арганізаваным парадку настройваць супраць сябе іншыя народы.

3. ПРЫВАТНЫЯ ЎЗАЕМААДНОСІНЫ ПАМІЖ НЕМЦАМІ І МЯСЦОВЫМ НАСЕЛЬНІЦТВАМ

Я бяру на сябе сьмеласьць выказаць наступнае: наколькі дрэнная была палітыка немцаў у захопленых абласьцях, настолькі добра сябе паводзілі нямецкія вайскоўцы ў дачыненьні да мясцовага насельніцтва. Кажуць, што там, дзе было гэтак званае «цывільнае кіраваньне», было нашмат горш, чым у нас. Гэтаму не даводзіцца зьдзіўляцца, бо цывільнае кіраваньне было цалкам партыйным. Гаспадарнікі, супрацоўнікі гэтак званых ЦРО і ВІКО ды іншых установаў былі значна горшыя за вайскоўцаў. Дарэчы, і гэта таксама характэрна, што паміж тымі ды іншымі ўвесь час працягвалася барацьба па прынцыповых пытаньнях. Немцы-вайскоўцы нібыта былі зусім іншага гатунку, чым цывільныя, партыйныя. Зусім

нярэдкімі былі выпадкі, калі вайскоўцы ў размове з намі, расейцамі, падкрэсьлівалі сваю беспартыйнасьць, адмяжоўваліся ад брыдкіх, жорсткіх акцыяў улады ды ад усёй душы намагаліся іх зьмякчыць ці нават увогуле не праводзіць.

У першыя гады акупацыі немцы звычайна разьмяшчаліся ў прыватных дамох, падзяляючы ў пэўным сэнсе ня толькі памяшканьне, але і жыцьцё сваіх гаспадароў. Пры гэтым збольшага паміж тымі ды іншымі ўсталёўваліся добрыя адносіны і нават сапраўднае сяброўства. Ад'яжджаючы ў іншы горад ці на фронт, немцы калі-нікалі працяглы час ліставаліся са сваімі былымі гаспадарамі. Вядомыя выпадкі, калі такое ліставаньне працягваецца нават цяпер, на эміграцыі.

Актыўны гандаль, заснаваны на абмене, таксама спрыяў усталяваньню сяброўскіх узаемадачыненьняў паміж заваёўнікамі й заваяванымі. Хуліганства на вуліцах з боку немцаў не назіралася зусім. Гэтаму спрыяла ня толькі прыродная дысцыплінаванасьць немцаў, але й шматлікія патрулі нямецкай жандармэрыі, якія дзень і ноч курсавалі на вуліцах гораду. Можна здагадацца, што афіцыйныя правілы паводзінаў, якія былі ўсталяваныя статутам, былі надзвычай жорсткімі: і салдаты, і афіцэры баяліся сваёй жандармэрыі як агню.

Але ці трэба казаць, што прыватнае жыцьцё пры немцах было суцэльным раем, а самі немцы - анёламі? Безумоўна, не. Назіраліся і непрыемныя выпадкі, і грубасьць з боку асобных немцаў. Але маштаб усяго гэтага ўва ўмовах ваеннага часу быў нязначны. Рабаўніцтва, канфіскацыі, крадзеж маёмасьці, фуражу ды жывёлы, безумоўна, таксама мелі месца. Але ў той самы час тысячы жыхароў у горадзе, ня кажучы ўжо пра вёску, мелі ўласных коней, кароў, коз ды авечак. Вельмі шмат хто атрымаў кароў і нават коней ужо пры немцах, зь ліку гэтак званых «трафэйных» - у арганізаваным парадку за невялікую плату. Напэўна, былі выпадкі крадзяжу нямецкімі салдатамі ў мясцовых жыхароў курэй, сьвіней, кароў, хоць мне амаль не даводзілася пра гэта чуць (за тры гады чуў усяго толькі пра адзін такі выпадак). Але зусім відавочна, што гэта ня мела масавага характару. Пры вялікай колькасьці немцаў у горадзе

амаль усе сем'і мелі курэй, якія спакойна разгульвалі ўсюды, дзе ім хацелася. Сьвіньні рохкалі амаль у кожным двары, а парася, хоць і не без турботаў, можна было прыдбаць у племянной жывёлагадоўчай нямецкай гаспадарцы недалёка ад гораду. Пародных сьвіней ды кароў немцы сыстэматычна прывозілі зь Нямеччыны.

Адмысловага разгляду патрабуе пытаньне пра ўзаемадачыненьні полаў. Ведаючы значна большую, у параўнаньні з Заходняй Эўропаю, цнатлівасьць расейскай жанчыны, савецкая прапаганда, маючы намер ня толькі загадзя напалохаць насельніцтва, але й зусім настроіць яго супраць немцаў, прыпісвала апошнім ледзь не пагалоўныя гвалтаваньні. Гэта была самая бесцырымонная лухта. Выпадкі гвалтаваньня былі; але гэта было зусім ня правіла, а хутчэй выключэньне. Пра зусім малую іх колькасьць можна меркаваць з наступнага. Я прабыў у зоне нямецкай акупацыі тры гады - за ўвесь гэты час мне давялося пачуць толькі пра тры такія здарэньні. У першым выпадку ўшчэнт п'яны нямецкі салдат на чыгуначнай станцыі Вязьма ўначы валок за рукаў ужо немаладую жанчыну-ўцякачку да пустога вагона, які стаяў на запасной калейцы. Валок млява, спрабаваў ёй нешта патлумачыць, пры гэтым яны фактычна заставаліся стаяць на адным месцы. Іншыя нямецкія салдаты, што праходзілі ў гэты час міма вагонаў, стукнулі няўдатнага немца чыгунком па галаве і такім чынам вызвалілі жанчыну. Гэта я бачыў сам, седзячы ў іншым вагоне, у сьнежні 1941 году. Іншы выпадак здарыўся ў тым самым 1941 годзе, толькі трошкі раней, у самім горадзе Полацку, яшчэ да майго прыбыцьця туды. Мне пра яго распавядалі мясцовыя жыхары. Пры акалічнасьцях, якія дакладна мне невядомыя, нямецкі салдат уварваўся ў нечы чужы дом і, пагражаючы зброяй, згвалтаваў дзяўчыну. Злачынства было выяўлена і даказана. Згодна з пастановай вайсковага суду, салдата расстралялі. Пра гэта ведаў увесь горад.

Зусім іншая справа - добраахвотнае сужэнства: яно мела месца ў вялікай колькасьці. Тым ня менш, немцы са свайго боку ўвесь час скардзіліся на цяжкасьці пры ўсталяваньні сэксуальных сувязяў у Расеі ў параўнаньні зь іншымі краінамі, дзе ім

даводзілася быць раней. Сувязі ўзьнікалі найчасьцей на месцы працы, дзе расейскія жанчыны служылі ў расейскіх установах ці на прадпрыемствах. Значна радзей - па месцы жыхарства немцаў, што лёгка патлумачыць. Вясковыя сэксуальныя сувязі ўзьнікалі надзвычай рэдка.

Зь ліку сэксуальных сувязяў (а яны ў глухой правінцыі былі вядомыя ўсе) да 1944 году большасьць прыпадала на жанчын, зьвязаных з партызанамі ці савецкай выведкай. Гэта былі жанчыны прышлыя ці мясцовыя камсамолкі. У гэтым дачыненьні немцы былі надзвычай наіўныя. Яны прынцыпова ня верылі, што жанчына, да таго ж маладзенькая ды прыгожая, здольная на такую працу. Шмат хто зь іх за свой давер пасьля вымушаны быў жорстка заплаціць. Бальшавікі, ведаючы слабасьць немцаў да прыгожых дзяўчат, знарок засылалі іх да немцаў. Дзяўчаты гэтыя праходзілі адмысловую падрыхтоўку ў школах выведкі НКВД. Узьдзейнічалі яны на немцаў заўсёды надзвычай пасьпяхова. У лепшым выпадку такая дзяўчына нечакана зьнікала з гораду, захапіўшы мапы, дакумэнты ды пячаткі. Для мясцовага насельніцтва было значна горш, калі такая выведніца-каханка заставалася ў горадзе і за сьпінаю свайго сябра-немца самым энэргічным чынам займалася правакацыяй. Злосная, дасканала падрыхтаваная ўлада такіх жанчын была надзвычай цяжка пераадольная, цяжэй, чым нават нямецкі эгацэнтрызм і нацыянал-сацыялістычныя правілы ды загады. Колькі добрых людзей зьнішчылі такія жанчыны, колькі антыбальшавіцкіх вёсак было спалена дзякуючы іх высілкам!

Кажуць, што ў іншых месцах, напрыклад у Віцебску, былі арганізаваныя адмысловыя публічныя дамы для салдатаў, куды без разбору зьмяшчалі маладых расейскіх жанчын, нават бязь іхнае згоды. Ведаючы нацыянал-сацыялістычныя погляды на іншыя народы, гэта не выклікае вялікага зьдзіўленьня. Але ў Полацку нічога такога не было.

Вэнэрычных захворваньняў сярод нямецкіх салдат назіралася вельмі няшмат. Жанчынаў, якія перадавалі заразу немцам, пасьля пільнай праверкі ў бактэрыялягічнай лябараторыі мясцовага вайсковага шпіталю расстрэльвалі. Мне давялося пачуць пра адзін такі выпадак.

4. АДМІНІСТРАЦЫЙНАЯ СТРУКТУРА КІРАВАНЬНЯ. УСТАНОВЫ І ПРАДПРЫЕМСТВЫ

Найвышэйшым адміністрацыйным органам у горадзе Полацку, як і ўва ўсякім іншым больш-менш буйным населеным пункце акупаванай тэрыторыі з вайсковым кіраваньнем, была ортскамэндатура. Галоўным прызначэньнем гэтай установы было ўсебаковае забесьпячэньне вайсковых частак, як тых, што толькі праходзілі праз Полацак, гэтак і тых, што знаходзіліся тут стала. Аднак пад кантролем ортскамэндатуры былі ня толькі вайсковыя часткі, але ў некаторай ступені і ўсе гаспадарчыя нямецкія ўстановы, а таксама цывільнае насельніцтва і мясцовая прамысловасьць. Ортскамэндатура мусіла быць добрым гаспадаром для немцаў і мець фактычна неабмежаваную ўладу што да ўсяго мясцовага.

Расейскімі ўстановамі, празь якія ортскамэндатура ды некаторыя іншыя ўстановы ажыцьцяўлялі кіраваньне цывільным насельніцтвам, а таксама часткова й мясцовай прамысловасьцю, зьяўляліся: гарадзкая ўправа (магістрат), раённая ўправа і банк. Гэта былі адносна немалыя ўстановы. У гарадзкой і раённай управах налічваліся дзясяткі службоўцаў. Шмат хто лічыць, што расейскія ўстановы пры немцах ня мелі нейкай самастойнасьці і павінны былі выконваць зусім нязначную ролю. Магчыма, пагардлівыя заваёўнікі жадалі, каб так было. Але на самай справе ўсё было зусім інакш.

На самай справе немцы толькі дыктавалі самыя асноўныя мерапрыемствы, дый тое, галоўным чынам, у іх прынцыповай частцы; займацца тэхнічнымі дэталямі яны ня мелі часу дый ахвоты. Між тым, з боку інтарэсаў мясцовага насельніцтва менавіта гэтыя самыя тэхнічныя дэталі і былі найбольш важкімі і патрэбнымі. Я ўжо не кажу пра тое, што горад і раён мелі шмат дробных, сваіх уласных турботаў, якімі немцы ўвогуле ніколі не займаліся і ня думалі імі займацца. Штат ортскамэндатуры звычайна быў невялікі - усяго 3-4 чалавекі. Сам камэндант, ягоны ад'ютант ды перакладчык былі гэтак перагружаныя вайсковымі абавязкамі, што для цывільных справаў яны выдзялялі ня больш за трыццаць-сорак хвілінаў у

дзень. Хіба ж магчыма ў такіх умовах яшчэ й дэталямі цікавіцца!

Большая ці меншая залежнасьць расейскіх установаў ад нямецкіх вайсковых частак магла надзвычай шырока вагацца і ў залежнасьці ад асабістых дачыненьняў паміж расейскай ды нямецкай адміністрацыяй. А асабістыя дачыненьні часьцяком залежалі ад хабару ды падарункаў. Сутнасьць гэтага можна выказаць наступным выразам: чым больш падарункаў дае расейскі кіраўнік нямецкаму кіраўніку, тым менш нямецкі кіраўнік цікавіцца справамі расейскага кіраўніка. Альбо: чым больш атрымлівае асабіста для сябе нямецкі кіраўнік ад падначаленага яму расейскага кіраўніка, тым менш атрымлівае ад іх абодвух Нямеччына ды нямецкае войска. Калі пры гэтым узяць пад увагу, што немцы былі амаль усе хабарнікамі, то можна лёгка ўявіць, якія вялікія наступствы ўсё гэта мела на практыцы.

Дзеля таго каб абмаляваць гарадзкую карціну цалкам, неабходна яшчэ адмыслова спыніцца на такіх важных з грамадзкага гледзішча абсягах, як прамысловасьць, харчаваньне, народная адукацыя, мэдычна-санітарная частка ды царкоўная справа. Разгледзім іх па парадку.

а) Нягледзячы на велізарныя страты, нанесеныя пажарам, у горадзе налічваўся цэлы шэраг прадпрыемстваў. Гэта былі: пякарня, маслабойня, бровар, разьніцы, млын, мылаварня, ганчарня ды бандарня, грамадзкая сталоўка, цырульня, лазьні, швейныя майстэрні ды майстэрні рамонту абутку, электрастанцыя, вадапомпавая станцыя, тэатар, прыгарадная гаспадарка (былы саўгас) са станцыяй племянных кароў, сьвінафэрмай ды садова-гароднінная гаспадарка. Усё гэта было, так бы мовіць, «дзяржаўнае» і працавала галоўным чынам на немцаў, але ўсё ж такі не на адных немцаў. Вырабы мясцовай прамысловасьці адпускаліся і мясцоваму насельніцтву, пераважна рабочым і службоўцам, па вельмі нізкіх і цьвёрдых цэнах у строга рэглямэнтаванай колькасьці. Але пры дапамозе хабару ці падарункаў - курэй, масла ці яек - кожны мог атрымаць усё што хацеў, і ў дастатковай колькасьці. Асобы, якія працавалі на прадпрыемствах мясцовай

прамысловасьці - а такіх у горадзе налічвалася большасьць, - мелі магчымасьць нелегальна ці напаўлегальна атрымаць нешта зь іншага прадпрыемства, у парадку гэтак званага «абмену». Любое кіраўніцтва пазірала на гэта скрозь пальцы. Немцы, у сваю чаргу, валаклі ды прадавалі (асабліва ахвотна - за золата) усё, што падпадала пад іхнае ведама. Нават бэнзын, за продаж якога, калі верыць абвесткам, расклееным па ўсім горадзе, падлягалі расстрэлу абодва бакі: і пакупнік, і прадавец. Такім чынам, да канца акупацыі ў немцаў, а калі казаць больш дакладна, у тых замежнікаў, што служылі ў нямецкім войску, можна было купіць нават такія рэчы, як ручныя гранаты, кулямёты ды лёгкія супрацьтанкавыя гарматы. Менавіта такім шляхам атрымлівалі зброю некаторыя партызанскія атрады, разьмешчаныя каля Полацку, Дзісны (Луначарску) ды Дрысы, а магчыма, і ў іншых месцах. Вінтовак ды аўтаматаў партызаны купляць не хацелі, бо мелі іх у дастатковай колькасьці.

Прыватных крамаў у Полацку не было; затое рынак ды розныя спэкулянты, якія гандлявалі дома, працьвіталі. Людзі, што нахапалі ў час пажару перад здачай гораду немцам шмат якога тавару з палаючых крамаў ды складоў, гандлявалі гэтымі рэчамі ажно да 1944 году. Паліцыянты прадавалі маёмасьць габрэяў. Шматлікія саматужныя прадпрыемствы, арганізаваныя па хатах, лічыліся нелегальнымі, але былі надзвычай папулярныя. Саматужная вытворчасьць была строга забаронена, бо падрывала мясцовую «дзяржаўную» прамысловасьць. Але на практыцы перасьледавалася яна нязначна. Напрыканцы акупацыі ў горадзе зьявіліся два прыватныя прадпрыемствы: фатаграфія ды «рэстаран» - па сутнасьці, маленькая брудная карчма, дзе прадавалі самагонку ды піва.

Па картках насельніцтва атрымлівала фактычна толькі адзін хлеб, дый той у невялікай колькасьці ды дрэннай якасьці. Гэта магло стацца прычынай вялікага голаду, што й адбылося ў вялікіх гарадох - Кіеве, Харкаве ды іншых, якія патрапілі ў зону нямецкай акупацыі. Але жыхары маленькага гораду знаходзіліся ў больш прыдатных умовах. Яны сваімі каранямі ніколі не пакідалі вёску ды і ў горадзе будавалі сваю эканоміку

на сельскай гаспадарцы ды агародніцтве. Гэта ратавала мясцовых жыхароў ад голаду, пазьбегнуць якога пры іншых акалічнасьцях было немагчыма. Сяляне таксама не былі галодныя. Галадалі, часьцяком вельмі моцна, уцекачы-прыбышы ды самотныя старыя пагарэльцы. У першы год акупацыі галадаў гарадзкі Інвалідны дом ды велізарны Дзіцячы дом для сірот. Пасьля яны атрымалі вялікія дзялкі зямлі і маглі пракарміць сябе самі.

Пры немцах былі ў абарачэньні адначасова і савецкія грошы, і нямецкія акупацыйныя маркі. Адна марка каштавала 10 савецкіх рублёў. Велізарную каштоўнасьць мела золата ў царскіх манэтах і ў рэчах. Золата было нашмат больш, чым можна было чакаць пасьля дваццаці пяці гадоў савецкай улады зь яе Торгсінамі ды «парыльнямі для буржуяў» у НКВД. Папяровыя грошы царскіх часоў, хоць шмат у каго яшчэ былі схаваныя, ніякага кошту ня мелі.

б) З народнай адукацыяй пры немцах справа была надзвычай дрэнная. Усё, што пры саветах адносілася да ўзроўню вышэйшай школы альбо да прафэсійнай адукацыі, немцы зачынілі. Сярод сярэдніх школ, дый тое без старэйшых клясаў, функцыянавалі толькі тры з агульнай колькасьцю вучняў у 150-200 чалавек. У першыя гады вайны настаўнікі былі цалкам з былых камуністаў ці камсамольцаў, а савецкія падручнікі, якія ўжываліся праз адсутнасьць іншых, амаль на кожнай старонцы дэманстравалі партрэты савецкіх лідэраў. Немцы не зьвярталі ўвагі ні на адно, ні на другое. Затое яны афіцыйна забаранілі выкладаць Закон Божы, гісторыю і ўсялякую геаграфію, акрамя фізычнай.

Да школаў і да адукацыі маюць значнае дачыненьне бібліятэкі. З кнігамі ў горадзе было таксама ня надта добра. Велізарная колькасьць кніг згарэла падчас камсамольскіх пажараў напярэдадні прыходу немцаў. Рэшткамі немцы на першым часе палілі печы ды свае паходныя кухні. Тым ня менш, да канца 1942 году ўдалося сабраць гарадзкую бібліятэку ў некалькі дзясяткаў тысяч кніг. Вясною 1943 году гэтая бібліятэка згарэла дарэшты падчас бамбаваньня савецкай авіяцыяй. Пасьля гэтага коштам надзвычайных высілкаў удалося сабраць

яшчэ дзьве з паловай - тры тысячы кніг, якія і складалі тады галоўнае багацьце гораду.

в) Горад меў два шпіталі, адзін зь якіх быў даволі вялікі. На чале іх стаялі не мясцовыя лекары, мабілізаваныя яшчэ на пачатку вайны ў Чырвонае войска, а нейкія выпадковыя, прышлыя людзі зь ліку ўцекачоў ды ваеннапалонных. У горадзе казалі, што прышлы элемэнт супрацоўнічае з камуністамі й паліцыяй, зьнішчаючы пад шумок непажаданых мясцовых жыхароў. У сувязі з гэтым шмат хто пры патрэбе нават баяўся класьціся ў шпіталь. Магчыма, гэтыя чуткі мелі падставу, бо частка лекараў гарадзкога шпіталю пазьней пайшла да партызанаў, а некаторыя яго супрацоўнікі былі злоўленыя пры спробе перадаць «у лес» мэдыкамэнты ды хірургічны інструмэнт. Затое частка малодшага мэдычнага пэрсаналу, а гэта якраз былі мясцовыя жыхары, лічыліся найлепшымі лекарамі.

Шпіталі надзвычай дрэнна абагравaліся. З прадуктамі справы былі б лепшыя, калі б значная частка харчаваньня не раскрадалася супрацоўнікамі. З мэдыкамэнтамі ўвогуле было надзвычай дрэнна: фактычна іх амаль не было. Нават калі казаць пра дыфтэрыйную вакцыну, якая ў вялікай колькасьці была ў суседнім нямецкім шпіталі, для расейскіх хворых яна цалкам адсутнічала. Ні бактэрыялягічнай лябараторыі, ні рэнтгенкабінэту пры расейскіх шпіталях таксама не існавала. Але ўсё ж калі-нікалі такую працу для расейскіх хворых выконвалі лекары зь нямецкага шпіталю. Інфэкцыйныя аддзяленьні заўсёды былі перапоўненыя. Тыф і дыфтэрыт, звыклыя хваробы ваеннага часу, касілі ня толькі нямецкіх салдат, але й мясцовае насельніцтва. Двойчы цягам трох гадоў акупацыі назіралася моцная эпідэмія шкарлятыны.

Зубоў цывільнаму насельніцтву лячыць не было дзе. Праз адсутнасьць мэдычных сродкаў іх не лячылі зусім, а толькі рвалі. І, безумоўна, без какаіну.

г) Да рэвалюцыі ў Полацку налічвалася 12 ці 14 розных храмаў. Да пачатку вайны ўсе храмы былі зачыненыя бальшавікамі. Старажытныя будынкі, часьцяком пабудаваныя ў надзвычай высокамастацкай архітэктуры, выкарыстоўваліся ў якасьці

складоў ці былі напаўразбураныя. У велізарным саборы за Дзьвіною месьцілася турма НКВД.

Стаўленьне нямецкіх акупацыйных уладаў да рэлігіі прасьцей за ўсё вызначыць як «прыязны нэўтралітэт». Толькі юдаізм ды каталіцызм знаходзіліся ў іншым, значна горшым стане. Першы - з расавых прычынаў, другі - з антынацыянальных польскіх. Да ўсіх іншых канфэсіяў стаўленьне было больш-менш добразычлівым. Як ні дрэнна разумеў нямецкі нацыянал-сацыялізм ня толькі духоўную сутнасьць рэлігіі, але і яе палітычнае значэньне, ён усё ж такі спрабаваў выкарыстаць дзеля сваіх уласных інтарэсаў усе папярэднія «несправядлівасьці» ды цкаваньні бальшавікоў у дачыненьні Царквы. Заваяваны Ўсход мусіў адчуць розьніцу паміж бальшавікамі і немцамі хоць у нечым. І ён яе адчуў: немцы далі свабоду рэлігіі. І спачатку гэта было ня гэтак ужо і дрэнна. Вольнае ды незалежнае становішча - гэта было якраз тое, пра што марылі вернікі, і гэта быў якраз той момант, калі бальшавікі неяк не зьвярталі ўвагі на рэлігійнае жыцьцё ў акупаванай немцамі зоне. Такім чынам, магчыма, упершыню за ўвесь час існаваньня ўсёй расейскай гісторыі рэлігійныя пачуцьці народу не былі пад кантролем. Гэта быў надзвычай цікавы досьвед.

Неўзабаве пасьля прыходу немцаў у горадзе адчыніліся два праваслаўныя храмы, адна каталіцкая, адна стараабрадная і адна баптысцкая парафія. Народ пайшоў у праваслаўныя цэрквы хмарай. Каталікоў у горадзе налічвалася каля 1000, баптыстаў - меней за 100 чалавек. Вёска была цалкам праваслаўная. Дзяцей рознага веку хрысьцілі тысячамі. Царкоўныя шлюбы, часьцяком запозьненыя, налічваліся сотнямі. Сьвятароў не хапала, і яны працавалі звыш сваіх магчымасьцяў. Пакуль не было партызанаў, гэта значыць амаль да лета 1942 году, сьвятары, якія ў сьвяты служылі ў горадзе, увесь тыдзень наведвалі вёскі. У нядзелю паблізу гарадзкіх храмаў стаялі сотні вясковых вазоў. Рэлігійны ўздым быў надзвычайны. Цэрквы багацелі, бо немцы не абкладалі іх падаткамі. Такім чынам, зьявілася магчымасьць рамантаваць царкоўныя будынкі, як тыя, што ўжо працавалі, гэтак і астатнія. Да 1944 году ў горадзе адчынілася ўжо 8 храмаў, без уліку

баптысцкай малельні. Таксама ўзнавіў сваю дзейнасьць і жаночы Спаса-Эўфрасіньнеўскі манастыр. На хросны ход з асаблівых нагодаў, як, напрыклад, перанясеньне мошчаў, ці ў вялікія сьвяты зьбіраліся тысячы людзей з гораду і зь вёсак. Яны цалкам запаўнялі вуліцы і спынялі рух вайсковых аўтамабіляў. Немцы, хоць і без асаблівай ахвоты, але вымушаныя былі мірыцца з гэтым. Царкоўны перазвон, цалкам забаронены бальшавікамі яшчэ ў 1925 ці 1926 годзе, ізноў загучаў над горадам. Праўда, добрых званоў узяць не было дзе.

У студзені 1942 году немцы арыштавалі каталіцкага сьвятара, і ні ён, ні які-небудзь іншы каталіцкі сьвятар ня быў больш дапушчаны ў горад на сталае жыхарства. У касьцёле час ад часу служыў ксёндз-паляк, які прыяжджаў з Заходняй Беларусі. Зрэдку, калі меў вольны час, ладзіў службу нямецкі вайсковы патэр.

5. РАСЕЙСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ГРАМАДЗКАСЬЦЬ

На самым ускрайку Полацку, у слабадзе, некалі даўно пабудаванай вакол знакамітага Спаса-Эўфрасіньнеўскага манастыра, у занядбанай хацінцы жыў маленькі, кволы сямідзесяцігадовы сьвятар - айцец Іаан. Гісторыя ягоная простая і можа быць распаведзена ў некалькіх словах. Селянін паходжаньнем, вельмі разумны ды адораны ад прыроды, але безь вялікай адукацыі, ён, адпрацаваўшы больш за 50 год у якасьці вясковага фэльчара, у 1937-м жудасным годзе, у самы разгар яжоўшчыны, прыняў сьвятарства. Непасрэдным штуршком да ягонага высьвячэньня стаўся арышт апошняга ў Полацку сьвятара, якому, як спадзяваліся ўлады, ня знойдзецца больш наступніка. Івана Канстанцінавіча Сакольскага ведала ды паважала ўсё навакольле. Вёска - асабліва. Ён быў чальцом таемнай «катакомбнай» царквы і, магчыма, пайшоў на геройства не дзеля сваёй асабістай ахвоты, а праз паслушэнства. Працягласьць службы ў царкве айца Іаана падчас савецкай улады налічвала толькі некалькі тыдняў. Яго, гэтаксама як і ягонага папярэдніка, разам з жонкаю неўзабаве забралі ў НКВД ды пратрымалі там ажно да прыходу немцаў.

Немаладыя муж ды жонка сядзелі ў турме ў Полацку ды вымушаныя былі вытрываць на сабе ўсе віды «маральнага» ўзьдзеяньня. Бальшавікі намагаліся дабіцца, каб вядомы ў горадзе сьвятар адмовіўся ад сану. У «яжовых рукавіцах» матушка хутка памерла, а бацюшку мучылі голадам ды працягвалі час ад часу моцна зьбіваць. Так працягвалася некалькі гадоў. Паводле сьведчаньняў тых, хто сядзеў разам зь ім - айцец Іаан ніколі сам пра сябе не апавядаў, - ён меў звычку пасьля кожнага ўдару казаць «Барані Божа!», што прыводзіла ягоных катаў у неймаверную лютасьць. Калі прыйшлі немцы, старога сьвятара, напаўмёртвага, зь пераламанымі рэбрамі, выбітымі зубамі ды з рэштай вырваных вусоў ды барады, вынесьлі на руках іншыя вызваленыя зьняволеныя.

Калі я пазнаёміўся зь ім, ён ужо ня толькі служыў у маленькай старой царкве, але паціху чыкільгаў па вуліцах, абапіраючыся на кіёчак.

У пакойчыку гэтага зусім хворага і нямоглага, але надзвычай моцнага духам чалавека паступова сталі зьбірацца ды аб'ядноўвацца найлепшыя прадстаўнікі расейскіх людзей, якія, з аднаго боку, ненавідзелі бальшавікоў ды савецкую ўладу, а з другога - не хацелі быць усяго толькі паслухмянай зброяй у руках заваёўнікаў. Сярод іх быў і Міхаіл Яўсеевіч Зуеў - ён стане пасьля вядомым кіраўніком сялянскай самааховы, - які, нягледзячы на сваю старажытнасьць, вельмі любіў ды паважаў праваслаўнага сьвятара айца Іаана. Група, што зьбіралася ў сьвятара, спачатку налічвала 8-10 чалавек самага рознага сацыяльнага паходжаньня.

Група мела магчымасьць зьбіраць самую розную інфармацыю пра падзеі ў горадзе. На той час, калі я да яе далучыўся, яна вызначала ды ацэньвала стан у горадзе наступным чынам:

а) найлепшы варыянт заканчэньня вайны палягае ў тым, каб немцы пасьпелі канчаткова разграміць Сталіна раней, чым саюзьнікі перамогуць Нямеччыну. З гэтага пункту гледжаньня пажадана было, каб падзеі на Захадзе адбываліся павольна, а на Ўсходзе - хутка;

б) адзінае надзейнае месца прыстанку для расейскага народу -

Праваслаўная Царква. Царкоўныя асобы не былі заражаныя камунізмам. Немцы ставяцца да Царквы нядрэнна і без падазрэньняў. Мясцовыя бальшавікі пакуль што не зьвяртаюць на Царкву ніякай увагі. Таму вакол Царквы можна арганізаваць нацыянальную працу, знайсьці патрэбных людзей, падтрымліваць адзін аднаго ў выпадку неабходнасьці, супольнымі высілкамі змагацца супраць супольнага ворага.

Усё гэта, а таксама шмат што іншае было ўважліва абмеркавана ў Групе. Патрэбна было скласьці нейкі плян дзеяньняў: сядзець склаўшы рукі ды чакаць нечага невядомага больш не хацелася.

Пры разьмеркаваньні абавязкаў мне, у прыватнасьці, было даручана кіраваць будучай царкоўнай установай, а таксама наладзіць ды падтрымліваць сувязі зь немцамі. М. Зуеву ды яшчэ дзьвюм асобам - арганізаваць сялянскую самаахову, трое сяброў Групы займаліся зборам грошай на рамонт цэркваў, айцец Іаан, які аб'ядноўваў ды накіроўваў дзейнасьць усёй Групы, павінен быў таксама пайсьці ў лягер да ваеннапалонных.

6. ТРЭЦЯЯ СІЛА

Немцы разам з бальшавікамі падчас барацьбы між сабой не на жыцьцё, а на сьмерць руйнавалі гарады, нацыі і ледзь ня цэлыя часткі сьвету. У параўнаньні зь імі тая маленечкая група бяспраўных расейскіх людзей пад кіраўніцтвам старога, нядужага сьвятара падавалася сьмешнай і ні да чога ня здатнай. Якой непераадольнай падавалася тая мэта, да якой імкнуліся сябры Групы!

Аднак Група была арганізаваная не дзеля яе самой. За тым, што цікавіла Групу і што яна намагалася ажыцьцявіць, стаялі мільёны аднадумцаў ды сяброў, якія ўсе разам складалі адну незалежную, нацыянальна сьвядомую гэтак званую «трэцюю сілу». Гэты назоў узяты з папулярнай на той час формулы «Ня немцы, не бальшавікі, а трэцяя сіла». Ідэя трэцяй сілы лунала ў

паветры. Яна была сынонімам дзеяньня ды барацьбы. Пасьля паседжаньня Групы айцец Іаан адслужыў малебен «Перад пачаткам усялякай справы»…

Ні немцы, ні тыя бальшавікі, што хаваліся за іхнымі сьпінамі, пакуль што не былі супраць стварэньня царкоўнага аддзелу пры гаруправе. Грашовых сродкаў на гэтую справу ў горадзе, натуральна, не знайшлося, але парафіі ахвотна ўзялі на сябе ўсе выдаткі, тым больш што такім чынам аддзел трапляў у больш-менш самастойны стан і ня гэтак залежаў ад расейскай цывільнай адміністрацыі.

Амаль адразу пасьля стварэньня царкоўнага аддзелу пачаўся збор сродкаў на рамонт цэркваў. У сувязі з гэтым трое сяброў нашай Групы атрымалі пропускі, якія дазвалялі ім бесьперашкодна езьдзіць па ўсёй тэрыторыі Полацкага раёну, што на той час было вялікай рэдкасьцю.

Пачалося таксама й складаньне лістоў да немцаў на ўсе вышэй азначаныя тэмы. Хутка некалькі лістоў былі падрыхтаваныя. Іх прачыталі сябрам Групы, і тыя цалкам ухвалілі напісанае. Але пытаньне, куды іх дасылаць, заставалася пакуль што адкрытым.

Яшчэ цяжэй было з наладжваньнем высокіх сувязяў. Спачатку пазнаёміліся з тымі афіцэрамі, што жылі паблізу. Але гэта былі ня надта высокія кіраўнікі ў нямецкім войску. Карысьці ад іх было няшмат. Але, як заўсёды, нам дапамог выпадак. Аднойчы мы разам з айцом Іаанам выправіліся ў ортскамэндатуру хадайнічаць за аднаго арыштаванага мясцовага жыхара. Расейская паліцыя мела да гэтага чалавека асаблівыя рахункі. Адразу пасьля прыходу немцаў гэты чалавек сам пайшоў на працу ў паліцыю, але, убачыўшы, што там дзеецца, хутка звольніўся. Відавочна, ягоныя паводзіны не засталіся незаўважанымі ды выклікалі з боку былых камуністаў выразны недавер. Дык вось, як высьветлілася, у доме гэтага чалавека нядаўна быў праведзеныператрус, у час якога паліцыя падкінула яму стос савецкіх улётак. Пасьля налётаў савецкай авіяцыі паліцыя зьбірала такія ўлёткі ды мела іх у сваім распараджэньні вельмі шмат. Улёткі сталіся той падставай, якая дазволіла арыштаваць гэтага чалавека ды абвінаваціць яго ў шпіянажы на карысьць Саветаў. Нявіннаму чалавеку

пагражала сьмяротнае пакараньне. Мы сабралі некалькі дзясяткаў подпісаў ды выправіліся ў ортскамэндатуру, каб высьветліць, якім чынам можна дапамагчы няшчаснаму. Нашая місія непасрэднага посьпеху ня мела. Да самога камэнданта нас не дапусьцілі. Усёмагутны перакладчык прагнаў нас прэч ды папярэдзіў, каб мы больш ніколі ня сунулі свой нос у справы, якія нас не датычаць. Аднак падчас сваркі зь перакладчыкам, якая прымала ўсё больш рэзкі характар, той нечакана прамовіў словы, якія нас надзвычай зацікавілі. Ён сказаў: «Калі вам не падабаюцца нашыя дзеяньні, зьвяртайцеся ў фэльдскамэндатуру, да арміі ці хоць да самога Гітлера». Вечарам таго самага дня я падрабязна даведаўся пра тое, што такое фэльдскамэндатура. Армія - гэта значыць штаб арміі фронту. Пра Гітлера мы ўжо мелі сякое-такое ўяўленьне. Самае галоўнае, што мне ўдалося дазнацца, дык гэта тое, што фэльдскамэндатура нашай ваеннай акругі разьмяшчалася зусім недалёка, гэта значыць у самім горадзе Полацку. Гэтая фэльдскамэндатура была цалкам вайсковай установай штабнога тыпу, налічвала некалькі дзясяткаў супрацоўнікаў і ў той самы час ня мела ніякай непасрэднай сувязі ні зь мясцовым насельніцтвам, ні з расейскім цывільным кіраўніцтвам. Фэльдскамэндатура займала вялікае памяшканьне былой школы на супрацьлеглым ад манастыра ўскрайку гораду. Жыла сваім, даволі ізаляваным жыцьцём, таму пра яе мала хто зь мясцовых жыхароў ведаў. Сапраўды, хто мог ведаць, што там дзеецца ў немцаў за зачыненымі дзьвярыма фэльдскамэндатуры! Гэта магло прынесьці нам посьпех. Мы выправіліся ў фэльдскамэндатуру на наступны дзень, захапіўшы з сабою, на ўсялякі выпадак, і адзін з падрыхтаваных намі лістоў пра тое, што калгасы трэба зараз жа распусьціць.

Нашае зьяўленьне там выклікала зьдзіўленьне, але нас прынялі ветліва, выслухалі ўважліва. Узялі тыя подпісы, што мы зьбіралі наконт нашага арыштаванага знаёмага ды паабяцалі высьветліць пра яго ў гестапа. Пасьля мы паказалі наш ліст пра калгасы. Гэты ліст выклікаў яшчэ большае зьдзіўленьне, але ліст пакінулі, каб паказаць яго камэнданту. Празь некалькі дзён да нас зьявіўся нямецкі салдат-пасланец. Ён прынёс тэрміновы выклік, каб я і айцец Іаан наведалі камэнданта. Камэндант, палкоўнік ды барон, пра што нас папярэдзіў

дзяжурны афіцэр, жадае пазнаёміцца з намі асабіста.

Першая гутарка з камэндантам мела вырашальнае значэньне для тых падзеяў, што адбудуцца пасьля. Гутарка працягвалася некалькі гадзінаў запар. Камэндантам быў стары, сухенькі ды надзвычай арыстакратычны чалавек. Зь ім было вельмі прыемна размаўляць. Усё паказвала на тое, што ён - вайсковец старой школы, які жыў паняцьцямі дысцыпліны, гонару ды вайсковага абавязку. Калі ён размаўляў з намі, не адчувалася нават ценю пагарды, хоць мы абодва выглядалі ня надта арыстакратычна. Ён не зьвярнуў увагі ні на мой стары кажух з чужога пляча, ні на падраную расу айца Іаана, якую яму нехта пашыў з чужых спадніцаў. Спачатку камэндант пацікавіўся ў нас, хто мы такія, пасьля трохі распавёў пра сябе самога. Мы даведаліся, што ён ваяваў падчас першай сусьветнай вайны ў гэтых мясьцінах і што цяпер ён не пазнае Расеі - гэтак зьмяніўся да горшага яе выгляд, людзі і ўсё жыцьцё. Мы міжволі зірнулі адзін на аднаго і ўсьміхнуліся. Камэндант заўважыў гэта і працягнуў: «Так-так, і гэта таксама. Я ніколі раней ня мог нават падумаць, што расейскага інтэлігента ці сьвятара можна сустрэць у такім выглядзе. Але, тым ня менш, мне вельмі прыемна пазнаёміцца з вамі. Апавядзіце мне, калі ласка, пра вашыя справы»…

7. ВЯСНА І ЛЕТА 1942 ГОДУ

Зь першымі прыкметамі вясны, якія пакуль што азначалі толькі яркае сонца ды прыгожыя сінія цені на глыбокім сьнезе, пачалася падрыхтоўка немцаў да новага наступу. Дзень і ноч паўз горад ішлі ды ехалі войскі. Людзі ў горадзе забыліся на цішыню. Рыпеньне саней, вуркатаньне матораў, лаянка людзей на чужой, непрыемнай на слых мове не змаўкалі на працягу доўгага часу. На цягніках, на аўтамабілях, коньмі везьлі немцы на фронт зброю, вайсковае адзеньне ды харчаваньне. Пасьля бясконцага шэрагу вельмі вялікіх, добра дагледжаных нямецкіх коней, запрэжаных у новыя драўляныя сані вайсковага кшталту, ледзь пасьпявалі калёсы беларускіх сялянаў. Гэтыя вазы гатовыя былі кожную хвіліну літаральна разваліцца ад

старасьці ды недагледжанасьці. Падводы нагадвалі дзіцячую цацку, запрэжаную мышанём. Пад шум ды грукат горад маўчаў, затаіўшы дыханьне, - з замiраньнем у сэрцы сачыла Беларусь за тым, хто, у рэшце рэшт, наробіць больш глупстваў: «геніяльны» Гітлер ці «наймудрэйшы з мудрых» Сталін, бо ад гэтага цяпер залежаў яе лёс.

А час ішоў сваім чарадом. Паступова пачалі вызваляцца з-пад сьнегу палі, набліжаўся час сельскагаспадарчых працаў. Нямецкія гаспадарчыя ўстановы разам з вайскоўцамі прыгналі ў горад цягнікі з высакаякасным насеньнем ды племянной жывёлай. Побач зь зямельнай управай увесь час стаялі дзясяткі сялянскіх вазоў у чаканьні выдачы насеньня. Немцы відавочна спадзяваліся на росквіт калгаснай сыстэмы землекарыстаньня пад мэтанакіраваным верхаводствам прускіх, саксонскіх, баварскіх ды іншых сялянаў, што самазадаволена апранулі форму гаспадарчых унтэр-афіцэраў ды бачылі свой галоўны абавязак у тым, каб удаваць зь сябе вялікіх начальнікаў.

У сур'ёзную небясьпеку з боку партызанаў на той час ня верыў ніводны немец, ня верыў нават наш, адносна разумны, фэльдскамэндант, які ў іншых выпадках быў схільны больш уважліва прыслухоўвацца да чужога меркаваньня.

Між тым, горад працягваў жыць сваім дзіўным, ненармальным жыцьцём ваеннага часу ўва ўмовах замежнай акупацыі.

Каб даць хоць нейкую магчымасьць кожнаму «недасьведчанаму» скласьці сваё ўласнае, больш ці менш адпаведнае ўяўленьне пра тое, што адбывалася ў Полацкім мікракосьме вясною ды летам 1942 году, я паспрабую пералічыць самыя галоўныя падзеі таго часу, што асабліва хвалявалі розумы ды сэрцы. Аналіз ды ацэнку іх прапаную зрабіць чытачу. Але, каб пазьбегнуць грубых памылак, апошні павінен спачатку адмовіцца ад вельмі шматлікіх, агульнапрынятых у гэтак званым культурным грамадзтве поглядаў ды ўяўленьняў.

1. Аднойчы, яшчэ раньняй вясною, нямецкі вайсковы кіраўнік памыліўся ды зайшоў у час перапынку на абед у памяшканьне банку. Убачыўшы яго, дзяўчына, што друкавала на машынцы,

вышмаргнула аркушы з машынкі ды неяк занадта напалохана схавала іх у шуфляду. Яму гэта падалося падазроным. Ён выйшаў на вуліцу, а праз колькі хвілінаў вярнуўся разам з вулічным патрулём. Высьветлілася, што машыністка памнажала савецкую інструкцыю аб гвалтоўнай мабілізацыі сялянаў у партызанскія атрады. Машыністка ды кіраўнік банку былі арыштаваныя. Перакладчык банку, які ў гэты час адсутнічаў, у той самы дзень здолеў уцячы з гораду.

2. Супрацоўнік гарадзкой паліцыі, пераапрануты ў партызана, прыйшоў уначы да аднаго з прыгарадных сялянаў ды, пагражаючы зброяй, запатрабаваў пісьмовай згоды працаваць на карысьць Саветаў. Селянін супраць волі падпісаў загадзя падрыхтаваную паперку, а раніцою пабег да айца Іаана па дапамогу ды параду. Мы накіравалі яго ў фэльдскамэндатуру. Там яго дапыталі й часова пакінулі ў рабочай камандзе. На наступны дзень гестапа прыйшло ў вёску па мужыка. Не знайшоўшы яго дома, улады ледзь не расстралялі жонку ды дзяцей. Зьлітаваўшыся, усё ж падпалілі хату, а жонку зьбеглага селяніна, ягонага суседа ды старасту арыштавалі. Скандал атрымаўся страшэнны. Непрыемнасьці паміж гестапа ды фэльдскамэндатурай цягнуліся некалькі месяцаў. Скончылася справа нічым, калі не лічыць спаленай хаты. Зь людзей ня быў пакараны ніхто: ані сам «партызан», ані ягоная сям'я, ані паліцыянт-правакатар.

3. У самую гразюку ў гарадзкі шпіталь зь мястэчка Расоны, якое знаходзіцца за 25-30 кілямэтраў ад Полацку, прывезьлі на «лячэньне» трох жанчынаў: маці і дзьвюх дачок. У маці былі адрэзаныя грудзі ды выкалатыя вочы, у дзяўчат адсечаныя ногі вышэй каленяў. Усе трое, безумоўна, хутка памерлі, бо ў іх, акрамя таго, было адбітае ўсё нутро.

Гэта была сям'я селяніна, якога перад гэтым партызаны намагаліся гвалтам забраць да сябе ў атрад. Селяніну ўдалося падмануць кіраўніка атраду ды ўцячы да сваякоў у горад. У якасьці пакараньня за ўцёкі, а галоўнае, «каб іншых ня надзіла», партызаны жорстка расправіліся зь ягонай сям'ёй.

4. У сакавіку на Полацак быў зьдзейсьнены вялікі налёт савецкай авіяцыі. Горад, цалкам засыпаны сьнегам, зьліваўся ў

цемры з навакольнай раўнінай, а на небе былі разьвешаныя зласьлівыя «лямпады» асьвятляльных ракетаў, якія паволі спускаліся на парашутах. У разгар бамбаваньня, калі моцныя фугасныя бомбы бязладна падалі на велізарныя пусткі ды на тыя нешматлікія жылыя дамы, што засталіся пасьля пажару, у вокнах вялікае камяніцы ортскамэндатуры, які стаяў на высокім беразе Заходняй Дзьвіны, запалілася яркае электрычнае сьвятло. Нехта, відаць, павярнуў выключальнік у пакоі з вокнамі безь фіранак, і верхні паверх будынку зьзяў, нібы ліхтар. Нямецкія вартаўнікі, якія ў час бамбаваньня лічаць за патрэбнае сядзець у сховішчы, не адразу заўважылі зь зямлі гэтае сьвятло. Затое самалёты рынуліся на агонь з усіх бакоў. Сьвятло, праўда, было даволі хутка патушанае. Але затое бомбы яшчэ цягам цэлай гадзіны клаліся каля ортскамэндатуры. Апошнюю, відавочна, выратавала тое, што побач высіўся будынак былога Езуіцкага калегіюму, занятага пад нямецкі лязарэт, а таксама гмах Мікалаеўскага катэдральнага сабору, які разьмясьціўся на той самай плошчы. Камэндатуры побач зь імі зусім не было бачна. І бомбы траплялі то ў шпіталь, то ў сабор, то ў раку, то на плошчу, але толькі не ў будынак камэндатуры. Прычына нясвоечасовай ілюмінацыі гэтак і не была высьветлена, але з таго часу пачалі ў час паветранай трывогі выключаць сьвятло па ўсім горадзе проста з электрастанцыі.

5. У сувязі з пачасьцелымі візытамі парашутыстаў ды партызанаў у аддаленыя вёскі ды ў сувязі з тым, што немцы не рабілі ніякіх высілкаў дзеля аховы ды абароны ад іх мясцовага насельніцтва, пачаліся масавыя ўцёкі сялянаў у горад. Вясною яны разам зь сем'ямі запаўнялі вуліцы Полацку, не знаходзячы ні жытла, ні працы. Ад безвыходнасьці яны часьцяком добраахвотна запісваліся на працу ў Нямеччыну. Каля Біржы працы, дзе адбываўся запіс, ды на чыгуначным вакзале, дзе адбывалася пагрузка ў вагоны, цягам цэлых тыдняў стаялі чэргі ў дзясяткі ды сотні чалавек. Дзіўныя людзі немцы: здавалася, што яны гэтым былі задаволеныя.

6. Раньнім чэрвеньскім ранкам да дому, дзе жыў адзін з малодшых лекараў гарадзкога шпіталю, хірург паводле спэцыяльнасьці, пад'ехаў воз. Лекара папрасілі дапамагчы

цяжка хвораму селяніну з блізкай вёскі. Лекар сабраў інструмэнты ды выправіўся ў дарогу. Увечары ён не вярнуўся. Яго гэтак больш ніхто і ня бачыў. Новананароджаны партызанскі рух паступова набываў мэдычны пэрсанал. Але на немцаў такія выпадкі рабілі надзіва слабое ўражаньне.

7. З надыходам цемры ў горадзе начамі час ад часу былі чуваць аддаленыя выбухі. Гэта партызаны падрывалі чыгунку. Немцам давялося пасылаць на яе ахову патрулі, акрамя гэтага, яны дзеля перасьцярогі пачалі прычэпліваць перад паравозам па дзьве парожнія плятформы. Буйная катастрофа ад выбуху цягніка цягам лета 1942 году мне вядомая толькі адна. Тады ўсю ноч ды наступны дзень вазілі параненых у Полацкі вайсковы шпіталь, адзіны паміж Віцебскам і Дзьвінскам. Што тычыцца падрываў чыгуначнага палатна, якія ня несьлі сур'ёзнай шкоды, то яны да канца лета адбываліся амаль штоночы.

8. Вярнуўшыся ў сярэдзіне лета 1942 году на радзіму, адзін мясцовы жыхар, які ў свой час быў высланы бальшавікамі з Полацку за палітычную нядобранадзейнасьць, сустрэўся на вуліцы нос у нос з былым сьледчым НКВД, які некалькі гадоў таму вёў ягоную справу і на допыце ўласнаручна выбіў яму ўсе пярэднія зубы. Бязьмежна зьдзіўлены і ўсхваляваны чалавек рушыў сьледам за сваім былым сьледчым, тым больш што той яго не заўважыў. Такім чынам яны дайшлі да дзьвярэй гарадзкой управы: былы энкавэдыст займаў там пасаду загадчыка фінансавага аддзелу. Тут пацярпелы ўрэшце выказаў сваё незадавальненьне ды падняў такі лямант, што зьбегліся ўсе супрацоўнікі. З дапамогай дзяжурнага паліцыянта яго доўга спрабавалі супакоіць і ўрэшце выгналі сілком. Вечарам гэтага ж дня ён быў арыштаваны. Ізноў фэльдскамэндант мусіў заняцца выратаваньнем чалавека. Яго выратавалі, але былы сьледчы НКВД так і застаўся на сваёй фінансавай пасадзе ў гаруправе. Ён, як высьветлілася, прадугледзеў усё і акрамя ўправы ўладкаваўся яшчэ і ў гестапа. Фэльдскамэндатура ня мела рэальнай улады над гэтай асаблівай установай.

9. Дзякуючы сабранай шляхам добраахвотных ахвяраваньняў даволі вялікай суме грошай ужо вясной пачалі энэргічна

рамантаваць старыя царкоўныя будынкі. Айцец Іаан сам жыў больш чым сьціпла, на хлебе ды на вадзе - у простым, а не пераносным сэнсе гэтага слова. Усе свае ўласныя, вельмі вялікія сродкі ён аддаваў на адраджэньне манастыра, дзе за лета сабралася больш за 35 манашак.

Для новых цэркваў патрэбныя былі сьвятары. Вернікі пачалі вылучаць кандыдатаў з свайго асяродку. Іх можна было тады ўжо пасылаць ці ў Смаленск да япіскапа Стафана, ці ў Менск да япіскапа Філафея на высьвячэньне. Але вось аднойчы, на вялікае зьдзіўленьне, дзеючы праз галовы царкоўнай грамады, прапанаваў сваю кандыдатуру адзін стары гарадзкі пэдагог, паводле спэцыяльнасьці настаўнік прыродных навук, якога мясцовая моладзь добра ведала як добраахвотнага антырэлігійнага прапагандыста пры бальшавіках. Ён ніколі ня быў у партыі, але ў сваім шчыраваньні заўсёды намагаўся быць лепшым нават за партыйных таварышаў. Калі царкоўны аддзел катэгарычна адмовіў яму, загадчыку аддзелу быў прапанаваны буйны хабар. Даводзілася толькі зьдзіўляцца, адкуль у сьціплага чалавека могуць узяцца такія вялікія грошы. Але й гэта яму не дапамагло: рашэньнем Рады парафіяў кандыдату было канчаткова адмоўлена.

Якім жа вялікім было агульнае зьдзіўленьне, калі празь некаторы час мы даведаліся, што вышэйназваная асоба, атрымаўшы цудоўную рэкамэндацыю ад бургамістра гораду ды праязныя дакумэнты ад ортскамэндатуры, выправілася праз галаву царкоўнага аддзелу ў Менск на высьвячэньне. Давялося тэрмінова прымаць неабходныя захады. Цяпер выканаць гэта было ўжо няцяжка. За адзін дзень пад заяваю пратэсту былі сабраныя сотні подпісаў. Папера была дасланая япіскапу, і ў апошні момант высьвячэньня не адбылося. Дзеля гэтай гісторыі я меў вялікія непрыемнасьці з ортскамэндантам. Яму гэтую справу паказалі ў няправільным выглядзе, і ён надзвычай злаваў і на мяне, і на раду.

Выпадак гэты паказаў нам, што актыўная царкоўная праца нарэшце зьвярнула на сябе чыюсьці зусім ня добразычлівую ўвагу. Даводзілася быць асьцярожным. Да слова, самазванец - кандыдат у сьвятары значна пазьней быў злоўлены ў

дачыннасьці да актыўнай камуністычнай арганізацыі гораду.

10. У казармах расейскай паліцыі з дазволу гестапаўскага кіраўніцтва быў зьдзейсьнены самасуд. Паліцэйскія цэлую ноч запар зьдзекаваліся з свайго таварыша «за здраду». Дзікія, нечалавечыя воклічы былі чуваць позна пасьля поўначы, наводзячы жах ды зьдзіўленьне на ўсіх суседзяў. Пакутніка ніхто ня ведаў зь сяброў нашай Групы, гэтаксама як ніхто яго ня ведаў з старых парафіянаў нашых цэркваў. Што сталася сапраўднай прычынай ягонага жудаснага лёсу, гэтак і засталося нявысьветленым. Але ўсім было зразумела, што пад тонкай плеўкай уяўнага спакою ў горадзе нешта віруе ды булькоча. Падземныя штуршкі былі чуваць адзін за адным.

11. Якасьць хлеба, які выдавалі ў горадзе па картках ды выпісвалі ў гарадзкой пякарні, бесьперапынна пагаршалася цягам вясны, а ўлетку «казённы» хлеб не маглі ўжо есьці ня толькі людзі, але й свойская жывёла. Мы паказалі кавалак карткавага хлеба фэльдскамэнданту - ён доўга, зь вялікім зьдзіўленьнем яго разглядаў, пасьля пажаваў, выплюнуў і ўрэшце загадаў даслаць яго ў Бэрлін, каб зь ім пазнаёміліся ўладары гэтага сьвету. Самым цікавым было тое, што зімою, вясною і летам на выпечку хлеба адпускалася адна і тая ж мука, больш ці менш здавальняльнай якасьці; а якасьць хлеба ўсё горшала. Ніякія скаргі ды дазнаньні не дапамагалі. Агульная незадаволенасьць дайшла да крайніх межаў. Самыя цярплівыя - і тыя пачыналі вар'яцець ад злосьці. Для ўцекачоў гэта было проста немагчыма. У гаруправе паціскалі плячыма, разводзілі рукамі ды зусім недвухсэнсоўна намякалі, што калі немцы адпускаюць цывільнаму насельніцтву мякіну напалову з саломаю заместа мукі, то не існуе такога пекара, які б здолеў зрабіць з такой мукі добры хлеб. Гэта быў выразна несправядлівы намёк, хоць асобныя немцы маглі браць удзел у гэтай акцыі.

12. Партызаны шмат у якіх месцах спрабавалі замінаць веснавой сяўбе. Савецкія ўлёткі, якія раскідваліся з самалётаў, забаранялі сялянам пад страхам сьмерці апрацоўваць зямлю «для немцаў». У Беларусі шмат лясоў - палі звычайна аточаныя дрэвамі. Па тых, хто працаваў у полі, калі-нікалі пастрэльвалі

зь вінтовак. Былі забітыя ды параненыя. Складаліся зусім неспрыяльныя ўмовы дзеля працы. Месцамі праз гэта амаль немагчыма было выходзіць у поле. Сяляне, якія ўскладалі ўсю сваю надзею на ўраджай, упадалі ў роспач і ў большасьці выпадкаў безнадзейна прасілі немцаў дапамагчы. Нарэшце прыбылі нямецкія аддзелы для аховы палёў. Найчасьцей гэта былі маленькія групы, якія складаліся зь немаладых, няздатных да вайсковай службы людзей. Пасьля зьявіліся нейкія расейскія казацкія аддзелы. Цяжка было зразумець, чаму чужым казакам можна было даваць зброю ў рукі, а сялянам, якія палымяна жадалі самі абараніць сваё дабро, нельга. Тым ня менш, прысланыя аддзелы ўсё ж умагчымілі хоць неяк засеяць амаль усе палеткі: сілы партызанаў былі на той час мізэрныя.

13. Гвалтоўная вэрбоўка сялянаў у партызанскія атрады цягам лета 1942 году сталася звыклаю зьявай. Посьпеху гэтага мерапрыемства ў значнай ступені спрыялі самі немцы сваім кансэрватызмам, прымітыўным фармалізмам ды строгасьцю, якую яны ўжывалі без усялякага сэнсу ды разбору. Згодна зь нямецкімі правіламі, сялянам забаранялася без асаблівага на гэта дазволу выходзіць за межы сваіх земляў. Усялякае зьнікненьне чалавека зь вёскі на адзін дзень лічылася ўжо вялікім злачынствам, амаль доказам сувязі з партызанамі. Сваяцкія сувязі зь іншымі вёскамі пад увагу не прымаліся. Адсутнасьць дакумэнта зь нямецкай пячаткай, які сьведчыў асобу, таксама ўважалася за прыналежнасьць да партызанаў, парашутыстаў ці шпіёнаў, не зважаючы на тое, што чалавека даўно ды добра ведалі ўсе ў ваколіцы. «Бэфэль ёсьць бэфэль»: ня ўзяў у час дакумэнтаў ці страціў іх - вінаваць сам сябе. Усё гэта спрашчала задачу саветчыкаў да крайняй ступені. Яны забіралі селяніна зь вёскі сілком (няхай сабе і пры сьведках: сьведкам немцы ня верылі, дый не было каму іх дапытваць), зараз жа нішчылі ўсе ягоныя дакумэнты, пераганялі пад канвоем у іншы раён. Пасьля гэтага з чалавекам усё было скончана; ён ня мог больш вярнуцца на легальнае становішча і вымушаны быў - хацеў гэтага ці не - заставацца назаўсёды разам з партызанамі. Горшую трагедыю цяжка сабе ўявіць.

Немцам страшэнна падабалася паліць вёскі. Пасьля гэтага спакутаванаму чалавеку ўвогуле не было чаго губляць. Хіба

гэта ня самы надзейны сродак заганяць сялянаў у партызанскія атрады? А тут яшчэ двухбаковая правакацыя з боку паліцыі ды іншых «расейскіх» уладаў, немагчымасьць сваімі сіламі супраціўляцца бандытам ды надзвычай сумнеўная дапамога з боку ахоўных аддзелаў, якія самі часьцяком былі ня лепшымі за партызанаў. Камэнтары не патрэбныя.

14. Тры раёны, дзе была ўсталяваная сялянская самаахова, былі адзінымі, якія не зьвярталіся да немцаў па дапамогу ў час сельскагаспадарчых працаў. Яны сеялі ды вырошчвалі ўва ўмовах адноснага спакою, уводзячы гэтым у зман шматлікае нямецкае кіраўніцтва ды выклікаючы нездаровую цікаўнасьць з боку расейскай адміністрацыі. Толькі сябры Групы ведалі, якія маленькія крывавыя трагедыі хаваюцца за гэтым сумнеўным спакоем. Калі-нікалі гэта былі ня толькі трагедыі, але й жудасныя таямніцы. Гэтак, напрыклад, яшчэ ў часе веснавой сяўбы па мужыку з адной зуеўскай вёскі, які працаваў у полі, зь лесу было зроблена некалькі стрэлаў. Пакуль зьдзіўлены мужык удаваў, што кінуў працу ды сыходзіць з поля, дзяжурны патруль самааховы, які таксама хаваўся ў лесе, выйшаў у тыл таму, хто страляў, і хутка ўсё скончылася. На вялікае зьдзіўленьне, лясным стралком выявіўся паліцыянт, што праходзіў, відаць, у сваіх справах па гэтых месцах. Паліцыянта закапалі разам са зброяй пад тым самым кустом, з-за якога ён страляў. Ці ведаў хто ў горадзе, дзе і якім чынам скончыў ён сваё жыцьцё?

Адзіным чалавекам сярод немцаў, хто калі не зьдзіўляўся, дык захапляўся вонкавым спакоем, што панаваў у раёнах зь сялянскай самааховай, быў наш сымпатычны фэльдскамэндант. Усе вёскі з «Рэспублікі Зуева», як іх тады пачалі называць, незалежна ад раёну, былі ў фэльдскамэнданта ўважліва занесеныя на ягоную асабістую карту мясцовасьці. Камэндант быў асабіста знаёмы і з Зуевым, і з двума іншымі сябрамі Групы, датычнымі да справы сялянскай самааховы. Ці здагадваўся ён пра тое, што мы мелі зброю? Ня ведаю, да часу мы больш не ўспаміналі пра гэта. Але ж камэндант быў перадусім вайсковым чалавекам…

8. ВОСЕНЬСКІ КРЫЗЫС 1942 ГОДУ

Нельга адмаўляць, што нашай Групе адразу ж моцна пашанцавала: цягам некалькіх месяцаў яна здолела дасягнуць шмат чаго, пра што раней не магла і марыць.

Тым ня менш, нягледзячы на посьпехі, а магчыма, і дзякуючы ім, Група патрапіла нібы ў нейкі тупіковы стан: і дагэтуль нявызначанае становішча яе рабілася з кожным днём усё больш цяжкім.

Асабліва сур'ёзны быў клопат пра далейшы лёс сялянскай самааховы, якую мы самі кінулі на такі рызыкоўны шлях. У гэтай справе крызыс адчуваўся асабліва моцна. Націск партызанаў узмацняўся. Партызаны падкідвалі Зуеву лісты, у якіх спачатку ўгаворвалі яго, а пасьля пачалі пагражаць. Выглядала, што партызаны рыхтуюць сур'ёзны напад на гнёзды сялянскага супраціву, каб за адным разам скончыць зь ім. Нашае ўлюбёнае дзіця - сялянская самаахова - апынулася ў безвыходным становішчы паміж молатам і кавадлам. Больш чакаць было нельга. Мы вырашылі не спыняцца ні перад чым і - чаго б нам гэта ні каштавала - дастаць ад немцаў афіцыйны дазвол хоць на адну вінтоўку на вёску. Толькі гэта й магло выратаваць становішча. Калі б хто ведаў, якіх высілкаў нам гэта каштавала! Пакутліва цяжкім стаўся гэты пэрыяд; ён ледзь не давёў нас да сваркі з нашым сябрам-палкоўнікам з фэльдскамэндатуры. Зуеўская вёска Гендзікі, як і некаторыя іншыя «нашыя» вёскі, разьмясьцілася на беразе вялікага возера. Фэльдскамэндатура аб'ядалася ў нас сьвежай рыбай. Самагонку для фэльдскамэндатуры ды штабу арміі прывозілі бочкамі. Але і цяпер вельмі цяжка сказаць, што мела для палкоўніка найбольш важнае значэньне: ці бясконцыя турбаваньні, ці жывая рыба, дасланая ім у штаб, ці тое, што набліжаўся збор ураджаю, ці апошняя выдумка нашага барона-фэльдскамэнданта, які паведаміў у штабе арміі, што бяззбройныя сяляне адабралі ў партызанаў вінтоўкі ды просяць пакінуць іх для аховы сваіх вёсак. Але ўрэшце дазвол на восем вінтовак быў-такі атрыманы. Закладнікаў, якіх мы ўвесь час прапаноўвалі з свайго асяродку ўзамен за стрэльбы, немцы пры гэтым не ўзялі, але тры чалавекі з Групы ўсё ж такі мусілі

адказваць сваёй галавой за зброю. Немцам падабаюцца штучкі такога кшталту. Што азначае ў дадзеным выпадку «адказваць», было зусім незразумела; але мы, радыя, не хацелі нават нічога ўдакладняць.

Радасьці ў Групе ды ў вёсках не было межаў. Але час марнаваць было нельга. Наш «генэралісімус» М. Зуеў аддаў загад зараз жа падняць з дна возера дзьве скрыні вінтовак і прывесьці іх у баявую гатоўнасьць. У мясцовай сялянскай кузьні фабрычныя нумары на зброі зьнікалі нібы пасьля чараўніцтва, а на іх месца набіваліся новыя. І - вось дык цуд - што ні вінтоўка, усё адзін і той жа нумар, да таго ж той самы, які быў пазначаны ў дазволе фэльдскамэндатуры. І гэтак на кожны камплект зь пяці вінтовак. На вясковым участку полацкага фронту «жыцьцё стала лягчэйшае, жыцьцё стала весялейшае», як казаў таварыш Сталін. Але да Сталіна, пасьля атрыманьня дазволу на вінтоўкі, мы пачалі ставіцца неяк звысоку: цяпер мы сапраўды мелі ўласнага генэралісімуса, бо сорак вінтовак - гэта ня жарт!

Амаль у гэты самы час на іншым участку фронту, у самім горадзе Полацку, высьпяваў надзвычай сур'ёзны крызыс, які, аднак, неўзабаве атрымаў наколькі нечаканае, нагэтулькі ж і спрыяльнае вырашэньне. Адным ясным жнівеньскім днём да будынку фэльдскамэндатуры пад'ехалі на сваім аўто ортскамэндант зь перакладчыкам, бургамістар гораду ды кіраўнік паліцыі. Выгляд ува ўсіх чатырох быў змрочны ды заклапочаны. Ортскамэндант прыехаў дзеля таго, каб дамовіцца пра пасылку карнай экспэдыцыі супраць некалькіх неспакойных вёсак. Абставіны былі наступныя. Напярэдадні расейская паліцыя выпадкова знайшла каля адной з гэтых вёсак замардаваны труп нямецкага салдата. Усё паказвала на тое, што гэта справа мясцовых сялянаў. Паліцыя ўжо даўно назірала за імі, іх абвінавачвалі ў наступных цяжкіх злачынствах: перахове савецкіх парашутыстаў, незаконным утрыманьні зброі ды неаднаразовых спробах падрыву блізкай чыгункі. Ня менш пераканаўчым доказам вінаватасьці няшчасных вёсак, чым труп салдата, ужо перавезены ў горад, служылі некалькі захопленых лістоў ад нейкага кіраўніка партызанскага атраду да аднаго зь сялянаў вышэйазначаных вёсак.

Справа была зразумелая і простая. Усе ўчатырох прадстаўнікі ўлады на чале з ортскамэндантам патрабавалі самых неадкладных захадаў, жорсткага пакараньня дзеля навукі іншых. Яны лічылі патрэбным паслаць на расправу добрую вайсковую частку. Калі пры пратрусе яна знойдзе ў вёсках, якія згадваліся ў лісьце партызанскага кіраўніка, зброю - вёскі павінны быць зьмеценыя з твару зямлі. Калі зброі ня знойдуць, паліцыя арыштуе найбольш падазроных ды сама зоймецца далейшым вышукам. Усё было правільна, проста і зразумела, за выключэньнем аднаго: вёскі, якія зьбіраліся аддаць пад агонь ды меч, былі зуеўскія!

Палкоўнік забраў усе матэрыяльныя доказы для дакладу ў штаб арміі. Затым ён разьвітаўся з сваімі гасьцямі, выклікаў да сябе старэйшага лекара з гарнізону ды паехаў паглядзець на труп. Калі ўвечары таго ж дня я, айцец Іаан ды М. Зуеў пасьля тэрміновага выкліку ўваходзілі ў кабінэт да фэльдскамэнданта, ён - было відавочна - ужо прыняў нейкае рашэньне. Ён паведаміў нам сутнасьць справы, якую ведаў ад ортскамэнданта, ды задаў нам колькі кароткіх пытаньняў. Адчувалася, што ён разьюшаны бязьмежна. Нашыя ўрокі, відавочна, не прайшлі дарэмна: палкоўнік разумеў, што гэта - грубая фальшыўка, разьлічаная на ня вельмі выкшталцоны нямецкі густ. Агляд цела толькі пацьвердзіў гэтую імавернасьць: труп быў нясьвежы, а нямецкі вайсковы мундзір, завялікі ды зашырокі, быў апрануты на яго значна пазьней пасьля сьмерці. Шмат што паказвала на тое, што нябожчык увогуле ня немец. Палкоўнік цягам гэтага нашага візыту быў незвычайна стрыманы. Ён нічога не казаў нам пра свае пляны і, здаецца, упершыню за ўвесь час нашага знаёмства разьвітаўся з намі неяк няўважліва. Мы ня ведалі, калі сыходзілі, чаго цяпер трэба чакаць.

Дом, у якім я тады жыў у Полацку, знаходзіўся якраз насупраць двара, у глыбіні якога была кватэра кіраўніка расейскай паліцыі. На наступны дзень раніцою, калі я завязваў гальштук перад адыходам на працу, я ўбачыў у акне невялікую групу нямецкіх салдат з зброяй, якія на чале з унтэр-афіцэрам хутка накіраваліся праз браму ў двор. Яны мелі нейкі незвычайны, надта ўсклапочаны выгляд. За кубкам гарбаты я ўсё паглядаў

ды паглядаў у акно, але група не вярталася. Гэтак і не дачакаўшыся яе, я пайшоў на працу. Чым далей я ішоў, тым больш на маім шляху траплялася ўзброеных салдат. У цэнтры гораду яны стаялі ўжо правільнымі, хоць і ня надта шчыльнымі шэрагамі з абодвух бакоў вуліцы, куды толькі сягала вока. Было цалкам зразумела, што ў горадзе знаходзіцца нейкае новае вялікае вайсковае злучэньне. Людзі былі ў пыле, яны прыйшлі здалёк. Мінакі стаялі групкамі, няўцямна пазіралі адзін на аднаго ды перашэптваліся між сабою. Якраз у той самы момант, калі я пераступіў парог гарадзкой управы, увесь пешы рух быў спынены: кожны павінен быў спыніцца там, дзе яго захапіла гэтая апэрацыя. Пачалася пагалоўная праверка дакумэнтаў. Тыя, што правяралі, мелі велізарныя сьпісы, у якія яны ўвесь час зазіралі. Некалькі чалавек зь ліку супрацоўнікаў магістрату былі арыштаваныя на працы. Затым да дзьвярэй будынку прыставілі ахову ды пайшлі. Час у чаканьні ды невядомасьці цягнуўся паволі. Нехта сеў за працу. Але раптам, гадзіны празь дзьве, каля акна паведамілі, што салдаты сыходзяць. Яны зьніклі з гораду гэтак жа хутка, як і зьявіліся. Варта каля дзьвярэй таксама была зьнятая. Большасьць службоўцаў зараз жа пайшлі дахаты.

Без усялякай папярэдняй дамоўленасьці ўся Група ўвечары таго самага дня сабралася ў кельлі айца Іаана. Толькі цяпер зьявілася нейкая магчымасьць прааналізаваць усё тое, што здарылася. Вось дык палкоўнік! Усім было зразумела, што гэта справа ягоных рук. Пра колькасьць арыштаваных яшчэ не было вядома ў горадзе, але яна вымяралася сотнямі. Перакладчык ортскамэндатуры, бургамістар гораду, кіраўнік паліцыі, усе загадчыкі аддзелаў гаруправы ды шматлікія перакладчыкі пры нямецкіх установах апынуліся пад арыштам. Ператрусы ў іх працягваліся амаль усю ноч: уздымалі падлогу, раскідвалі печы, ламалі столі, пераварочвалі гарышчы ды хлявы. Тады ж ці трохі пазьней мы даведаліся пра вынікі некаторых ператрусаў. Напрыклад, пры ператрусе ў перакладчыка ортскамэндатуры знайшлі пад падлогаю сьпісы ўсіх камуністычных арганізацыяў гораду, плян дыспазыцыі нямецкіх войскаў, пералік вайсковых злучэньняў ды частак, а таксама вайсковых грузаў, якія праходзілі праз горад цягам апошняга месяца. Акрамя таго, у яго, гэтаксама як і ў

бургамістра гораду, былі знойдзеныя сьвежыя савецкія інструкцыі ды прадпісаньні, партызанскія яўкі, шыфры, усялякія дакумэнты, нямецкія блянкі, штампы ды пячаткі. Сярод іншых цікавых рэчаў у перакладчыка знайшлі ягонае ўласнае савецкае пасьведчаньне асобы, якое было выдадзена Ленінградзкім акруговым аддзяленьнем НКВД. Пры першых арыштах немцы кіраваліся, галоўным чынам, сьпісамі гарадзкой арганізацыі УКП(б) часоў 1941 году, якія, дзякуючы акружэньню, цалкам трапілі ў іхныя рукі. З тых часоў шмат што зьмянілася. Цэлы шэраг галоўных мясцовых камуністаў да восені 1942 году ўжо патрапілі ў партызаны; і наадварот, многія новыя, невядомыя да таго часу асобы ў горадзе, як, напрыклад, кіраўнік банку ці сам перакладчык ортскамэндатуры, прыбылі невядома адкуль. Таму сьпісы, знойдзеныя ў перакладчыка, уяўлялі асаблівую важнасьць і пры наступных арыштах, і асабліва цягам сьледзтва.

Пасьля атрыманьня сьпісаў агульны малюнак ды ўсе дэталі сталі больш зразумелыя для немцаў, чым для нас. Большасьць арыштаваных былі службоўцы. Рабочых налічвалася надзвычай мала, слабадзкіх сялянаў не было зусім. Сярод царкоўных асобаў усіх веравызнаньняў ня быў арыштаваны ніхто.

Сьледзтва па справе цягнулася ня менш за месяц, а магчыма, і значна больш: мы гэтак і не даведаліся дакладна, калі яно скончылася. Яго вынікі, на жаль, таксама засталіся амаль невядомымі. У горад зьвесткі не праточваліся зусім; а наш фэльдскамэндант нават найбольш добра знаёмым сябрам Групы не паведаміў нічога, акрамя колькіх агульных выразаў накшталт «Вы мелі рацыю ўва ўсім» ці «Вы ня можаце сабе ўявіць, што яны тут нарабілі!». І гэта была ўся інфармацыя. Кіраваў арганізацыяй пасьля арышту ды расстрэлу кіраўніка банку, відавочна, перакладчык ортскамэндатуры.

Празь некалькі дзён многіх арыштаваных пачалі выпускаць за невінаватасьцю; аднак, адначасна з гэтым, настала хваля новых арыштаў. У выніку, паводле нашых падлікаў, якія мы выканалі ўжо ў 1943 годзе, з турмы не вярнулася ад 125 да 130 чалавек.

Ёсьць падставы думаць, што асобы, якія былі прызнаныя вінаватымі, патрапілі ў тры розныя асноўныя катэгорыі: адны

былі расстраляныя тут, у Полацку, другіх выправілі ў Нямеччыну, а трэція адбывалі прымусовую працу недзе пад Смаленскам. Апошнія час ад часу ліставаліся з сваякамі ў Полацку, хоць цывільная пошта тады не працавала. Частка зь ліку гэтых апошніх да вясны 1944 году нават вярнулася дамоў, у Полацак, на сталае жыхарства. Яны атрымалі звычайны на той час для ўсіх астатніх расейска-нямецкі дазвол на жыхарства і пераважна былі прапісаныя ў сваіх старых кватэрах.

9. НОВАЯ ЭРА

Немцы, якія прыйшлі ў Расею нібы з завязанымі вачыма, за год акупацыі шмат чаму навучыліся. Вырашальным фактарам акупацыйнай эвалюцыі да лепшага былі ваенныя няўдачы немцаў. Але й досьвед арганізацыі цывільнага жыцьця на занятай тэрыторыі ды непасрэднае сутыкненьне з расейскімі людзьмі павінны былі абавязкова мець нейкую сваю, значную ролю. Зрэшты, пра горад Полацак ды навакольныя раёны можна было сьмела казаць, што пасьля арышту камуністаў там настала нібы новая эра акупацыі.

Расейскае цывільнае кіраваньне было цалкам абезгалоўлена пасьля арыштаў. Фэльдскамэндант запрасіў да сябе некалькі чалавек з нашай Групы, у тым ліку й мяне, каб параіцца пра тое, якім чынам лепш за ўсё замяніць вызваленыя пасады. Мы былі да гэтага гатовыя: у нас быў сьпіс галоўных кандыдатаў; але мы мелі намер надаць зьмене ўлады ў вачох немцаў як мага больш грамадзкі характар. Мы настойвалі на тым, што толькі кругавая парука можа гарантаваць сталы спакой у горадзе, падтрымку новых расейскіх уладаў, а значыць, і немцаў з боку цывільнага насельніцтва ды прадухіліць магчымасьць усялякіх небясьпечных нечаканасьцяў. Вельмі баяўся фэльдскамэндант нават прывіду «адказнага міністэрства», але пасьля дзьвюх з паловай гадзінаў ажыўленай размовы саступіў. Паміж намі была заключаная канфідэнцыйная дамова «аб дружбе ды ўзаемнай падтрымцы ў меру магчымасьці», якую, дарэчы, стары нямецкі джэнтэльмэн

ніводнага разу пасьля не парушыў.

Згодна з гэтай дамоўленасьцю мы, хоць і «неафіцыйна», сабралі ў памяшканьні фэльдскамэндатуры ня толькі ўсю Групу цалкам, але й некаторых прыхаджанаў, старых жыхароў гораду. Паседжаньне доўжылася не адну гадзіну. Вылучаныя на ім людзі, якіх усе ведалі ды паважалі, перакананыя ворагі савецкай улады, былі зацьверджаныя фэльдскамэндатурай без усялякіх выняткаў і зараз жа ўзяліся за працу. Да 75 % незанятых да гэтага часу сяброў Групы былі прызначаныя на адказныя пасады ў гарадзкой ды раённай управах. Айцец Іаан дзеля свайго сану й фізычнай слабасьці не атрымаў ніякага новага прызначэньня, хоць на гэтым настойвалі як немцы, гэтак і сябры імправізаванай рады; я па-ранейшаму застаўся на чале царкоўнага аддзелу.

Адзінай галіной, дзе ні нам, ні справядліваму фэльдскамэнданту не ўдалося дасягнуць ніякіх паляпшэньняў, была паліцыя. Пагадзіцца на тое, каб замяніць сваімі людзьмі арыштаванае чынавенства з паліцыі, азначала пасадзіць добрасумленных людзей у асінае гняздо. Патрэбная была не частковая, а поўная зьмена ўсяго асабістага складу паліцыі; але гестапа не жадала пра гэта нават слухаць. Улада фэльдскамэндатуры не пашыралася на гестапа. Таму мы вырашылі, што гэтым разам, магчыма, будзе лепш, калі мы адмовімся пасылаць сваіх людзей у паліцыю. Пры тых акалічнасьцях, што склаліся, нам было зручней ды бясьпечней, замест таго каб праслойваць добрымі людзьмі дрэнную ўстанову, стварыць у супрацьвагу гестапаўскай паліцыі сваю ўласную ўзброеную сілу. Пачаткам такой сілы ўжо зьяўляліся нашыя аддзелы сялянскай самааховы.

Паседжаньні Групы пры новым раскладзе рэчаў праходзілі штотыдня. Насельніцтва пра іх па-ранейшаму нічога ня ведала, бо яны, як і раней, ладзіліся неафіцыйна ў розных месцах, а часьцей за ўсё - у памяшканьні пашыранага цяпер царкоўнага аддзелу, які атрымаў у сваё распараджэньне невялікі дамок. За ўсе свае дзеяньні гарадзкія службоўцы - сябры Групы, у тым ліку абодва бургамістры, гарадзкі ды раённы, несьлі адказнасьць найперш перад Групай. Усе найважнейшыя

мерапрыемствы абмяркоўваліся ды вырашаліся толькі супольна.

У Групе быў старанна распрацаваны плян дзеяньняў на даволі працяглы кавалак часу. Пра яго можна скласьці некаторае ўяўленьне, калі пералічыць асноўныя акцыі, зьдзейсьненыя цягам зімы 1942/43 году.

А. Зьмена палітычнага ды агульнага курсу ў працы расейскіх установаў.

Б. Барацьба з хабарніцтвам складала адзін з найпершых нашых клопатаў.

В. Разьмеркаваньне зямлі пад агароды. Зямля, як ужо было неаднаразова паказана, зьяўлялася ці не галоўным сродкам дабрабыту падчас акупацыі. Вельмі шмат увагі надавалася справядліваму разьмеркаваньню зямлі яшчэ пачынаючы зь зімы. Назіраць за разьмеркаваньнем павінен быў кіраўнік кватэрнага аддзелу, а само разьмеркаваньне было даручана камісіі ў складзе трох вольных ад службовых абавязкаў сяброў Групы, у тым ліку М. Зуеву, што жыў па-за межамі гораду. На Зуева ў гэтай справе мы ўскладалі асаблівую адказнасьць.

Здаецца, мы задаволілі зямлёю ўсіх, тым больш што пуставала яе ў горадзе шмат. Зрэшты, цягам двух гадоў непаразуменьняў ды скаргаў на дрэннае разьмеркаваньне амаль не было, калі не лічыць некалькіх сур'ёзных сутычак з паліцыянтамі, якія прызвычаіліся ўжо хапаць усё, што ім падабалася. Але, маючы за сабой чыстае сумленьне, спрыяньне з боку фэльдскамэндатуры і, галоўнае, вінтоўкі Зуева, камісія магла зусім не лічыцца зь незаконнымі патрабаваньнямі паліцыянтаў.

Г. Рэарганізацыя школы была адной з самых цяжкіх ды тэрміновых справаў. Наверсе - немцы, якія маюць намер скарачаць праграмы, выкідаць асобныя прадметы ды ўводзіць беларускую мову. Зьнізу - настаўнікі-камсамольцы, малаадукаваныя ды поўныя савецкага імпэту.

Пасьля нялёгкай барацьбы зь немцамі да вясны 1943 году ўдалося дабіцца таго, каб былі залічаныя ў школьную праграму

Закон Божы ды геаграфія Расеі. Што тычыцца гісторыі, у тым ліку расейскай, то сыстэматычныя лекцыі па гэтым прадмеце для моладзі, і тое па-за сьценамі школы, удалося распачаць толькі ўвосень 1943 году.

З пэдагагічным пэрсаналам было яшчэ цяжэй. Частка найбольш актыўных настаўнікаў-бальшавікоў апынулася пад арыштамі; другія пасьля крызысу пайшлі ў партызаны; трэціх давялося перавесьці на іншую, менш адказную працу. Зь вялікай цяжкасьцю ўдалося вярнуць да пэдагагічнай дзейнасьці частку былых выкладчыкаў вышэйшых навучальных установаў ды тэхнікумаў, якія пры немцах у большасьці працавалі ў нямецкіх гаспадарчых установах. Зь ліку апошніх былі прызначаныя й дырэктары школ. Нейкі аддалены добры ўплыў на іншыя школы зрабіла новая, створаная ўлетку 1943 году, навучальная ўстанова - пастырскія курсы. Апошнія падпарадкоўваліся нават не царкоўнаму аддзелу (г. зн. не гаруправе), а адноўленай Епархіяльнай управе і ня мусілі трымацца ніякіх нямецкіх інструкцыяў у сэнсе праграмы. Рэктарам курсаў быў сьвятар, сябра Нацыянальна-працоўнага саюзу, настаяцель Сафійскага сабору. Выкладчыкамі - розныя асобы, пераважна непрафэсіяналы зь ліку гарадзкой каляцаркоўнай інтэлігенцыі. Слухачамі - моладзь зь мясцовых школ і з раёнаў. Без аніякага староньняга ўмяшальніцтва мы зьбіралі ды разьвівалі на пастырскіх курсах сваіх маладых сяброў. Зусім ня кожны зь іх зьбіраўся прысьвяціць сябе духоўнай працы. Мы нікому не адмаўлялі. Праз гэтую моладзь мы ўсталёўвалі свой дадатковы ідэйны ўплыў на астатнія школы.

Новыя падручнікі для школ, замест савецкіх, нам удалося нарэшце выпісаць з Рыгі праз фэльдскамэндатуру. Гэта былі падручнікі на расейскай мове, што чыста мэханічным шляхам вырашыла пытаньне пра беларусізацыю школ. Пасьля атрыманьня падручнікаў немцы перасталі настойваць на абавязковым выкладаньні ўсіх прадметаў па-беларуску.

Д. Умацаваньне рэлігійнага жыцьця ў выніку бесьперапыннай карпатлівай працы працягвалася сваім чарадом. Рамонт храмаў ішоў поўнай хадой; ужо да пачатку лета 1943 году мы пасьпелі адчыніць два новыя храмы. Да гэтага часу канчаткова

аформіўся арганізацыйна ды быў прызнаны юрыдычна жаночы манастыр, у якім налічвалася 35-40 манашак. Да восені ў манастыр удалося зь вялікімі ўшанаваньнямі перавесьці зь Віцебску парэшткі заснавальніцы гэтага самага манастыра Сьвятой Эўфрасіньні, князёўны Полацкай, якія раней перахоўваліся ў бальшавікоў у антырэлігійным музэі.

Е. Пашырэньне і павелічэньне колькасьці зброі ў сялянскай самаахове было і заставалася нашай галоўнай турботай. Пасьля столькіх, амаль безвыніковых, намаганьняў нас нарэшце напаткаў нечаканы посьпех.

Хутка пасьля гарадзкога крызысу на зуеўскую цытадэль напалі партызаны. Цяжка давялося б сялянам, калі б яны мелі ў сваім распараджэньні толькі тыя восем вінтовак, на якія яны мелі дазвол ад фэльдскамэндатуры. Партызаны, відаць, не чакалі сур'ёзнага супраціву. Кінуўшы на гэтую апэрацыю некалькі дзясяткаў добра ўзброеных людзей, яны былі ўпэўненыя ў лёгкай перамозе. За найбліжэйшым лесам яны пакінулі свае вазы, на якіх прыехалі і на якіх зьбіраліся везьці назад палонных ды нарабаваную маёмасьць.

Дзякуючы лістам з пагрозамі ды некаторым іншым прыкметам, Зуеў чакаў нападу і добра падрыхтаваўся да яго. Толькі нязначная частка ягоных «узброеных сілаў», нейкія 7-8 чалавек заставаліся на ноч у вёсцы ды трымалі ахову ў акопах на яе ўскрайку. Астатнія складалі сілу галоўнага рухомага ўдарнага аддзелу пад камандаваньнем самога Зуева, гэтыя апошнія пасьля таго, як цямнела, адыходзілі куды-небудзь у лес, у яр ці ў прыдарожны хмызьняк. Сакрэты былі пастаўленыя з усіх бакоў і ў дастатковай колькасьці. Дзеля сувязі трымалі хлапчукоў у веку 12-15 гадоў.

Калі атрад падпітых партызанаў, неасьцярожна прасоўваючыся ў цемры, наблізіўся да вёскі Гендзікі, Зуеў з сваім ударным аддзелам пайшоў за ім сьледам. На ўскрайку партызаны апынуліся паміж акопам «першай лініі аховы» сьпераду ды ўдарным аддзелам - ззаду. Гэта быў самы ўдалы момант дзеля таго, каб распачаць ваенныя дзеяньні. Раней чым партызаны пасьпелі пра нешта здагадацца, некалькі дружных стрэлаў выкасілі іх шэрагі амаль цалкам. Тыя, што засталіся жывыя,

кінуліся хто куды. Палонных ня бралі, усё было скончана літаральна за некалькі хвілінаў. Вінтоўкі, аўтаматы, ручныя гранаты, пісталеты і адзін ручны кулямёт сталі лёгкай здабычай пераможцаў. Зуеў стратаў ня меў. Гэтая апэрацыя паказала немцам як сур'ёзную небясьпеку з боку партызанаў, гэтак і эфэктыўнасьць сялянскай самааховы. Яна дала нам новую нечаканую магчымасьць вырваць у немцаў дазвол яшчэ на 50 вінтовак, на некалькі аўтаматаў і пісталетаў, а таксама на ручны кулямёт. Такім чынам, можна было далей разгортваць сялянскую самаахову.

Ж. Спроба зьменшыць пакуты ваеннапалонных была спраектавана ў Групе ўжо даўно. Але справа была нялёгкая, ды й іншыя падзеі гарадзкога жыцьця моцна яе затрымлівалі. У лягеры панаваў жудасны чырвоны тэрор. У лягерох улада цалкам належала лягернай паліцыі, якая ўся складалася з былых палітрукоў. Гэтыя людзі дзейнічалі ў кантакце зь лягерным нямецкім кіраўніцтвам ды дапамагалі яму красьці і так небагатыя пайкі вязьняў. Больш за ўсё яны баяліся зычлівых стасункаў паміж ваеннапалоннымі ды немцамі.

У лягеры адбывалася амаль тое самае, што і ў горадзе, толькі ў яшчэ больш жудаснай форме. Гэта было сапраўднае пекла. Адбіралі ежу ў галодных людзей, страшэнна зьбівалі гумовымі палкамі, выкарыстоўвалі надзвычай жорсткія сродкі пакараньня, часьцяком зусім непатрэбныя, - часьцей за ўсё гэтым займаліся «свае», ня немцы. Крытычнае стаўленьне да савецкай улады зараз жа каралася «ціхай» сьмерцю. Толькі пасьля таго як камуністы былі адрынутыя ад улады ў горадзе, Група здолела зрабіць рашучыя крокі ў дачыненьні да лягеру ваеннапалонных.

Спачатку ў лягеры адбылася зьмена нямецкага кіраўніцтва; затым адтуль адразу ж была выдалена расейская паліцыя. З астатнімі здраднікамі (а іх налічвалася нямала) ваеннапалонныя расправіліся ў першую ж ноч сваімі сіламі. Немцы гэтаму не заміналі.

Трошкі пазьней агульнымі высілкамі ўдалося дастаць ад немцаў дазвол зьбіраць у горадзе харчаваньне для ваеннапалонных (галоўным чынам бульбу ды іншую

гародніну). Але гэтага не хапала; таму бульбу час ад часу вазілі наўпрост з гарадзкіх складоў, што было незаконна. Крадзеж бульбы на карысьць ваеннапалонных хаваўся супольнымі намаганьнямі супрацоўнікаў прадуктовага аддзелу.

Да гэтага самага часу адносяцца яшчэ два грамадзка-палітычныя мерапрыемствы, пра якія я лічу неабходным паведаміць некалькі словаў. Гаворка ідзе пра раскопкі парэшткаў «архітэктурнага ансамблю» НКВД у горадзе Полацку і пра раскопкі брацкіх магілаў прыбалтыйскіх народнасьцяў каля гораду Улы.

Пра раскопкі парэшткаў камбінату НКВД, які быў зруйнаваны падчас бамбаваньня й пажару яшчэ ў 1941 годзе, неаднаразова хадайнічаў перад гаруправай шмат хто з жыхароў гораду. Дазвол на гэтыя раскопкі нарэшце быў атрыманы. Гэта была магчымасьць паказаць шматлікія «цуды» камуністычнага правасудзьдзя, а менавіта: басэйн з халоднай вадой, пры дапамозе якога на зацяжных допытах няшчасных вязьняў то тапілі, то зноў адкачвалі; камэры, у якіх «падсмажвалі» ці, наадварот, падмарожвалі людзей, жадаючы прымусіць іх аддаць схаванае золата; «апэрацыйную залю», дзе над людзьмі з мэтай катаваньня праводзіліся розныя «хірургічныя» апэрацыі; і шмат чаго іншага. Асобы, якім удалося выжыць пасьля допытаў і хто яшчэ жыў пры немцах у Полацку, апавядалі, што ўсе гэтыя «апэрацыі» праводзіліся пад наглядам і кіраўніцтвам маладзенькай жанчыны-лекаркі, якая зьнікла з гораду ў першыя ж дні вайны пасьля прыходу немцаў.

З засыпаных сутарэньняў будынку былі адкапаныя склады адзеньня расстраляных. Адзеньне гэтае паклалі на велізарным двары былога НКВД дзеля таго, каб на яго маглі паглядзець усе жыхары гораду. Якія немагчымыя сцэны адбываліся тут! У першы дзень на месца раскопак зьбегліся ўсе жыхары гораду: жонкі пазнавалі адзеньне мужоў, дзеці - бацькоў, бацькі - дзяцей. Самым жудасным момантам было, калі немаладая жанчына, якая пэўны час пазірала на ўсё амаль безь цікавасьці, раптам убачыла скрываўленую сукенку сваёй дачкі, якую яна спадзявалася знайсьці жывою. Ейную дачку арыштавалі перад самай вайною і, згодна з афіцыйнымі зьвесткамі, нібыта

пераправілі ў Маскву ў якасьці сьведкі па нейкай моладзевай справе. Маці падумаць нават не магла, што яе дачку насамрэч расстралялі тут, у Полацку.

Брацкія магілы каля Улы паказалі немцам мясцовыя сяляне. Гісторыя гэтых магілаў наступная. Улетку 1941 году бальшавікі гналі этапам з Прыбалтыкі калёну арыштаваных прыблізна ў 3000 чалавек. Гэта былі найлепшыя прадстаўнікі інтэлігенцыі з Эстоніі, Латвіі, Літвы: лекары, адвакаты, прафэсары, журналісты і г. д. У большасьці людзі старэйшага веку і нават зусім старыя. Вестка пра пачатак вайны спаткала калёну на этапе. На загад зьверху ўсе тры тысячы былі зараз жа перабітыя канвоем проста на дарозе: у іх стралялі, іх закідвалі ручнымі гранатамі, калолі штыкамі. Некалькі чалавек зь мясцовага насельніцтва, якія выказалі занадта вялікую цікаўнасьць да падзеяў, таксама былі забітыя канвоем ды пахаваныя разам з балтыйскай інтэлігенцыяй.

Час трагедыі, сродкі, якімі былі зьдзейсьненыя забойствы, сацыяльная ды нацыянальная прыналежнасьць пагіблых не выклікалі ніякага сумневу. Раскопкі цалкам пацьвердзілі аповеды мясцовых сялянаў. Разам з усімі забітымі былі знойдзеныя дакумэнты, якія захаваліся ў нядрэнным стане.

10. ПАРТЫЗАНЫ

Чаму ж адны сяляне зрабіліся прасавецкімі партызанамі, а іншыя - антысавецкімі? І ці магло ўсё скласьціся інакш пры нейкіх іншых умовах? На ўсе гэтыя пытаньні цяпер, больш чым калі ў іншы час, трэба даць правільны й вычарпальны адказ. Апошні бой з камунізмам - трэцяя сусьветная вайна - набліжаецца, і завяршэньне яго будзе залежаць ня толькі ад таго, на чыім баку апынецца больш атамных бомбаў, але таксама ад таго, ці будуць падчас вайны чырвоныя партызаны гуляць у «дэмакратычным» тыле, ці, наадварот, «дэмакратычныя» партызаны - у тыле савецкім.

Некалькі прыкладаў, якія будуць паказаныя ніжэй у гэтым

расповедзе, яшчэ дапамогуць разабрацца ў чалавечых адносінах пасярэдзіне непазьбежнага трохкутніка, які складаўся зь немцаў, расейцаў і бальшавікоў.

У той час, калі на занятай немцамі тэрыторыі расейскія ваеннапалонныя ды мясцовыя сяляне яшчэ спадзяваліся, што немцы дазволяць ім змагацца супраць Сталіна, а пра партызанскі рух яшчэ ніхто і ня згадваў, у Маскве ды іншых вялікіх гарадох Савецкага Саюзу ўжо пачыналася фармаваньне вучэльных партызанскіх камандаў. Яны камплектаваліся з добраахвотнікаў і партыйнай моладзі - як цывільнай, так і вайсковай. Зімою 1941/42 году курсантаў вучэльных партызанскіх камандаў пачалі скідаць на парашутах (групамі па 5-8 чалавек ці паасобку) у глыбокі нямецкі тыл. Выконваючы заданьне савецкага кіраўніцтва, яны мусілі заснаваць першыя партызанскія атрады з шэрагаў мясцовага насельніцтва і стаць іх першымі камандзірамі.

Глеба была выразна неспрыяльная, а зіма - сьнежная ды халодная. Усю зіму скінутыя парашутысты мужчынскага ды жаночага полу добраахвотна заяўляліся да немцаў і здаваліся ў палон. Гэта было настолькі звычайнаю зьявай, што немцы зусім перасталі імі цікавіцца. Акрамя таго, у немцаў адразу ж склалася няправільнае меркаваньне пра партызанскі рух увогуле: яны вырашылі, што гэта безнадзейная і несур'ёзная справа. Зіма скончылася, настала цёплае надвор'е, хавацца ў лесе зрабілася шмат лягчэй. Насельніцтва, між тым, ужо пасьпела ў значнай ступені расчаравацца ў немцах і знаходзілася цяпер у стане, так бы мовіць, няўстойлівай палітычнай раўнавагі. Палонныя, даведзеныя да адчаю ўмовамі ўтрыманьня ў лягеры, не лічыліся ні зь якаю рызыкай: яны зьдзяйсьнялі ўцёкі й хаваліся ў лясох ды вёсках. Ім не было куды падзецца. Кожную ноч прыляталі савецкія самалёты, скідаючы ўсё новых і новых парашутыстаў. Апошнія перасталі добраахвотна здавацца немцам. Пры іх дапамозе зь ліку зьбеглых ваеннапалонных пачалі засноўвацца першыя мясцовыя партызанскія атрады.

Да восені партызаны нагэтулькі актывізаваліся, што больш ці менш асталяваліся ў некаторых аддаленых раёнах, выбіраючы

для гэтага галоўным чынам лясныя ды моцна забалочаныя мясцовасьці. Праезд па астатніх дарогах хоць і быў не зусім бясьпечным, але ўсё ж у большасьці кірункаў мог быць прызнаны вольным да глыбокай восені 1942 году. І немцы на аўтамабілях, а гарадзкія ды раённыя службоўцы на конях увесь час езьдзілі з Полацку ў Віцебск, у Дрысу, у Улу ды іншыя месцы. Толькі некаторыя кірункі, як, напрыклад, на Расоны ці на Дрэтунь, лічыліся надзвычай небясьпечнымі. Паблізу былой чыгуначнай станцыі «Палата» адбываліся нават сутычкі з партызанамі.

Вялікі, відаць, зборны партызанскі атрад, гэтак удала зьнішчаны Зуевым увосень 1942 году пры нападзе на вёску Гендзікі, мяркуючы з забраных у забітых дакумэнтаў, на тры чвэрці складаўся не зь беларускіх сялянаў, а з парашутыстаў ды былых ваеннапалонных. Гэта было па-свойму паказальна, але ўжо не характэрна для таго часу, бо тады ў склад большасьці атрадаў уваходзіла ня менш, а больш за 50 % гвалтоўна мабілізаваных сялянаў. Да восені 1942 году ўва ўсіх атрадах стаў адзначацца рэзкі «клясавы» падзел на «паноў» і «рабоў». Парашутысты, мясцовыя буйныя камуністы, а калі-нікалі і хтосьці з былых ваеннапалонных былі «панамі», мясцовыя жыхары - «рабамі». Мірнае цывільнае насельніцтва адзначала велізарную розьніцу паміж тымі ды іншымі.

Зімою 1942/43 году ў адным з аддаленых раёнаў, недзе за Расонамі, адбыўся партызанскі бунт: занадта шматлікія ў адсоткавым судачыненьні гвалтоўна мабілізаваныя сяляне пастралялі ўсіх парашутыстаў ды камуністаў і абвясьцілі сябе вольнымі і незалежнымі - «бязь немцаў і без бальшавікоў». Дыскі з адпаведнымі абвесткамі былі прыбітыя на многіх скрыжаваньнях дарог. Немцы даведаліся пра гэта зь вялікім спазьненьнем, ужо тады, калі бальшавікі пасьпелі высадзіць там нейкую групу з самалёта, якая спачатку паспрабавала ўгаварыць людзей, а пасьля, скарыстаўшы зь іх неарганізаванасьці, перастраляла ледзь не палову і такім чынам ліквідавала паўстаньне.

Росту партызанскага руху надзвычайна спрыялі дзеяньні спэцыяльных карных аддзелаў, якія знаходзіліся на службе ў

немцаў. Хто, дзе, калі і паводле якога прынцыпу фармаваў гэтыя аддзелы, я, па праўдзе, ня ведаю, як ня ведаю, адкуль яны зьяўляліся і куды зьнікалі, выканаўшы сваю брудную справу. Гэтыя людзі, калі іх увогуле можна назваць людзьмі, не маглі дый не хацелі разьбірацца ў праўдзівай сытуацыі. Між тым, яны дзейнічалі даволі самастойна, часьцяком толькі згодна з сваімі меркаваньнямі, ад якіх шмат што залежала, дзейнічалі без разбору, хутка і з жахлівай жорсткасьцю. Калі яны часам і забівалі сапраўдных партызанаў, то сваімі жудаснымі паводзінамі на месца кожнага забітага зараз жа заганялі ў партызанскія атрады дзясяткі ды сотні новых. У большасьці выпадкаў яны каралі ні ў чым не вінаватае перад немцамі мясцовае насельніцтва, рабуючы, забіваючы, зьдзекуючыся ды палячы людзей жыўцом. Рабаўніцтва было іх галоўным стымулам, забойства ды зьдзекі - неад'емнай неабходнасьцю. Мы ведалі пра іх больш з чутак: у Полацкім раёне яны ніколі не зьяўляліся. Пра «геройствы» двух такіх аддзелаў на мяжы з Заходняй Беларусьсю - адзін нібыта латыскі, а другі нібыта эстонскі - я чуў ува ўсіх падрабязнасьцях ад людзей, якім пашчасьціла выпадкова выратавацца, у тым ліку ад праваслаўнага сьвятара. У апошняга партызаны забралі сына і згвалтавалі дачку. А на другі дзень прыйшоў карны аддзел, які спаліў ягоны дом, забіў тую самую няшчасную дачку ды моцна параніў самога сьвятара. Толькі выпадкова сьвятар здолеў застацца жывым.

Параза немцаў пад Сталінградам і наступны пасьля гэтага адыход па ўсёй лініі фронту спрыялі цягам лета 1943 году надзвычай шырокаму разьвіцьцю партызанскага руху. Цяпер ужо многія сяляне без прымусу, цалкам добраахвотна ішлі ў атрады. Яны адчулі, што хутка давядзецца трымаць адказ перад органамі НКВД за свае дзеяньні падчас акупацыі, і дзеля таго каб выратаваць сябе і свае сем'і, сьпяшаліся рэабілітаваць сябе - хай сабе й позьнім - уступленьнем у партызанскія атрады. Мне аднойчы давялося сустрэцца з групай сялянаў, што кіраваліся да партызан; шмат хто зь іх, дарослыя і яшчэ не старыя людзі, плакалі пры гэтым. Відаць, нават добраахвотнае ўступленьне ў партызаны не было для іх мёдам.

Зімою 1943/44 году немцы кантралявалі ўжо толькі галоўныя

шляхі зносінаў паміж гарадамі ды іншымі больш-менш буйнымі населенымі пунктамі. Незвычайнымі выключэньнямі былі толькі акругі сялянскай самааховы. Яны, нягледзячы на выразнае набліжэньне паразы Нямеччыны, ня толькі не схіляліся перад напорам партызанскага мора, што іх атачала з усіх бакоў, але наадварот, увесь час працягвалі пашырацца, хоць і памалу.

Некалькі прыведзеных ніжэй прыкладаў яскрава паказваюць складаны малюнак жыцьця на занятай тэрыторыі.

Зімою 1942/43 году М. Зуеў у суправаджэньні кагосьці з аднавяскоўцаў і разам з дачкою-падлеткам паехаў у лес па дровы. Гэта было ня вельмі далёка ад дому, але ўсе ўтраёх былі добра ўзброеныя. Не пасьпелі яны асталявацца каля клады, як з-за дрэваў выйшаў чалавек з савецкім аўтаматам на шыі. Пасьля кароткага пярэпалаху высьветлілася, што ён адзін і ніякіх сутычак паміж бакамі не прадбачыцца. Чалавек, як выявілася, быў хоць і ня блізкім, але знаёмым: стараабрадцы ў Беларусі амаль усе паміж сабою знаёмыя ці нават сваякі. Селі, пагаманілі. Гэта быў тыповы прадстаўнік партызанскіх «рабоў». Ён шчыра апавёў, што яго прыслалі, каб выведаць пра сыстэму сялянскай самааховы, чым ён зусім ня мае намеру займацца; ён кляў, аж трава вяла, сваіх «камісараў». Зуеў прапанаваў яму кінуць атрад, але жонка ды дзеці партызана былі прадбачліва пакінутыя «камісарамі» ў якасьці закладнікаў. Становішча было безвыходнае. Партызан параіўся з Зуевым, што менавіта ён павінен данесьці ў свой штаб (без аніякіх зьвестак нельга было вяртацца), дапамог нагрузіць дровы, і «ворагі», па-сяброўску матлянуўшы шырокімі бародамі, разышліся кожны ў свой бок.

Але, як знарок, як на зьдзек лёсу, каб падкрэсьліць розьніцу ў дачыненьнях паміж людзьмі, празь месяц ці паўтара пасьля вышэйапісанай сустрэчы на гэтым самым месцы адбылася зусім іншая падзея.

Трое гендзікаўскіх сялянаў на двух конях ехалі ў лес па дровы. На павароце дарогі з гушчару гулка затараторыў аўтамат, і кулі пасыпаліся на пярэдні воз. Сяляне, што сядзелі на возе, былі адразу забітыя; конь звалiўся і біўся ў аглоблях, паліваючы сьнег чорнай крывёй. Трэці селянін, яшчэ дзяцюк, хутка

сасьлізнуў з саняў і нырнуў у лес. Трое аўтаматчыкаў занадта позна заўважылі ягоныя ўцёкі, спачатку паспрабавалі дагнаць, але, згубіўшы аднаго з сваіх падчас перастрэлкі, адмовіліся ад перасьледу. Як толькі гэты селянін, якому ўдалося выратавацца, вярнуўшыся ў вёску, апавёў пра напад, Зуеў адразу паслаў на месца здарэньня свой аддзел. Партызанаў там ужо не было, але затое на сьвежым сьнезе добра былі відаць іхныя сьляды, і моладзь кінулася наўздагон. Двое партызанаў несьлі на сабе трэцяга, забітага ці цяжка параненага, і таму прасоўваліся вельмі павольна. Калі яны заўважылі перасьлед, кінулі ношу, але было ўжо запозна. Пачалася перастрэлка, надзвычай нявыгадная для партызанаў: кулі іхных аўтаматаў не маглі прабіць тоўстых, прамерзлых дрэваў, прыкрываючыся якімі наступалі зуеўскія сяляне. Усіх трох партызанаў - двух забітых і аднаго цяжка параненага - прынесьлі ў вёску на руках, бо каня, запрэжанага ў другі воз, партызаны пасьля ўцёкаў гаспадара таксама застрэлілі. Згодна з дакумэнтамі, усе трое былі прафэсійнымі вайскоўцамі і партыйцамі, якіх нядаўна закінулі з СССР.

Пачынаючы ад восені 1943 году, калі партызаны ўжо вельмі памножыліся, яны ўвесь час падкладвалі міны ня толькі на дарогі, што вялі ў горад, але й на пешаходныя сьцежкі, а таксама на палі прыгарадных сялянаў, таму трэба было быць надзвычай асьцярожнымі падчас сельскагаспадарчых працаў. Нямецкія мінныя патрулі штодня правяралі галоўныя магістралі.

Падкладвалі партызаны міны і на тэрыторыі «Рэспублікі Зуева», як на дарогах, гэтак і на палёх. У раёнах сялянскай самааховы ролю мінных патрулёў паўсюль выконвалі хлопцы-падлеткі ўва ўзросьце ад 10 да 14 гадоў, і выконвалі яе выдатна. Кожную раніцу, як гарох, высыпалі яны на дарогі ды шукалі па ўсёй ваколіцы. Вочы ў іх былі проста выключныя. Асабліва пасьпяховымі ў пошуку замаскаваных мінаў былі заўзятыя вясковыя грыбнікі. Праверка адбывалася ня толькі зранку, але й цягам дня і выклікала ў моладзі надзвычайную цікаўнасьць. Хлопцы-мінашукальнікі былі паўсюль, і гэта падкінула ідэю мясцоваму «камандаваньню» даручыць ім адначасова і агульнае адсочваньне стану на мясцовасьці. Ім выдалі на

кожную групу зь некалькіх чалавек аўтамат - і дзіцячаму гонару не было межаў. Яны былі надзвычай здольнымі і карыснымі выведнікамі. Ідзеш, напрыклад, ці едзеш па лесе ў кірунку вёскі Гендзікі - імгненна, нібы з-пад зямлі, вырастае сьпераду ці, яшчэ часьцей, ззаду гэтакі чупрыніcты Том Соер. «Добры дзень, дзядзечка! А я ведаю: ты ідзеш да дзядзі Зуева». І зноў зьнік, нібы скрозь зямлю праваліўся, быццам яго ніколі і не было.

Ці іншая зьява. Сядзяць, як вераб'і, на дарозе хлопцы пад адзін струп - хто едзе па дарозе, заварочваюць: «Вы, дзядзечка, сюды ня едзьце, тут дзьве міны пакладзеныя». Альбо яшчэ адзін характэрны малюнак з натуры - цалкам ваенны эпізод. Хлопчыкі-пастушкі пасьвяць на ўскрайку лесу чародку авечак. Горача й сумна; непераадольнае пачуцьцё мірнай ляноты авалодала дзецьмі і хатняй жывёлай. Уздоўж лесу да дзяцей паволі набліжаюцца двое дарослых, сядаюць, прапаноўваюць закурыць; пачынаюцца пытаньні: якая вёска, колькі душаў, ці часта наведваюцца немцы, ці ёсьць ахова і гэтак далей. Пакуль адны хлопцы размаўляюць зь незнаёмцамі, іншыя ўжо пасталі на некаторай адлегласьці ззаду ад іх каля куста, з двума аўтаматамі. Незнаёмцы разьвітваюцца, дзеці настойваюць, каб яны абавязкова наведалі ў вёсцы старасту. Незнаёмцы пратэстуюць, лямантуюць, лаюцца, але ўжо праз колькі хвілінаў назіраецца дзіўная працэсія: наперадзе - двое здаравезных мужчынаў з паднятымі ўгору рукамі ды перакрыўленымі ад злосьці тварамі, а ззаду, крокаў за дзесяць ад іх - натоўп басаногіх лахматых «Ванькаў» ды «Грышкаў» з аўтаматамі. «Вы, дзядзечка, толькі не апускайце рук, - пішчыць нехта тоненькім галаском з натоўпу, - а не - дык застрэлім, далібог застрэлім!» Такім менавіта чынам быў прадухілены адзін зь вялікіх нападаў на нашыя вёскі вясною 1944 году.

Крывавая ўзаемная расправа не замінала, аднак, некаторым правільным дыпляматычным дачыненьням паміж варагуючымі бакамі. Партызаны пісалі Зуеву ды дасылалі прапагандысцкую літаратуру. Ён адказваў на іхныя лісты і з свайго боку дасылаў усё, што мелася ў распараджэньні групы: газэту «Новое слово», вытрымкі з кнігі былога нямецкага камуніста Альбрэхта «Адданы сацыялізму», нашыя ўласныя ўлёткі ды розныя

выданьні Нацыянальна-працоўнага саюзу (салідарыстаў).

Ня маючы посьпеху ў палітычнай палеміцы, партызаны заўсёды палохалі расправай, якую зьдзейсьніць НКВД у дачыненьні няскораных, калі немцы будуць канчаткова пераможаныя. Гэты апошні аргумэнт надзвычай моцна ўзьдзейнічаў на некаторыя няўпэўненыя галовы. Зуеў упарта адказваў, што чакаць НКВД ён ня будзе, а адыдзе «ўсім народам» разам зь немцамі да ангельцаў ды амэрыканцаў. Рэч у тым, што тады ў Расеі было надзвычай распаўсюджанае меркаваньне, што ўсьлед за падзеньнем Нямеччыны зараз жа пачнецца новая вайна, якую Амэрыка ды Англія сумесна зь пераможанай Нямеччынай распачнуць супраць Саветаў. Таму адказы Зуева, у сваю чаргу, рабілі на многіх суразмоўцаў вялікі ўплыў. Тыдні праз два ці тры пасьля адной з такіх размоваў да Зуева адразу перайшла група, якая складалася з трынаццаці партызанаў, - іх прывёў шараговы партызан, селянін зь Віцебскага раёну, які прысутнічаў на дыспуце ў якасьці «сьвіты» камісара. Гэтых трынаццаць партызанаў, а таксама некалькі іншых, што прыйшлі пазьней, Зуеў затым зьвёў у асобны ўдарны аддзел, які вельмі добра зарэкамэндаваў сябе і ў баёх, і пры канчатковым адступленьні.

11. ВЯСНА, ЛЕТА, ВОСЕНЬ 1943 ГОДУ

Вясна і лета 1943 году пачаліся для нас надзвычай неспрыяльна. Паразы ўвогуле сталіся нібы сымбалем таго часу. Спачатку «пасьля непрацяглай, але цяжкой хваробы» памёр айцец Іаан, які меў 77 гадоў. Ён быў кіраўніком і натхняльнікам нашай Групы. Ён захварэў на клясычную сьмяротную хваробу старых людзей - крупознае запаленьне лёгкіх, але, жадаючы памерці пры выкананьні свайго абавязку, працягваў служыць у царкве, нягледзячы на тэмпэратуру ў 40о.

Другі паводле значнасьці цяжкі ўдар пасьпяшаўся сьледам за першым: нашага сябра палкоўніка-фэльдскамэнданта адклікалі ў Бэрлін. Відаць, настаў час разьлічвацца за ягонае лібэральнае стаўленьне да «ўсходніх народаў». Ортскамэндант быў

заменены яшчэ раней, але гэта для нас не было такой стратай. У горад прызначылі новае кіраўніцтва, магчыма, толькі дзеля таго і прысланае, каб спыніць «патураньне» старых, занадта адсталых з нацыянал-сацыялістычнага гледзішча, уладаў. Гэта нас ня толькі засмучала, але й моцна трывожыла. Фронт набліжаўся, і нашае жыцьцё мянялася да горшага. Тонкія шыбы ў вокнах, дзьверцы буфэтаў ды посуд на стале дзень і ноч пазвоньвалі ад далёкай страляніны артылерыі. Паветраныя бамбаваньні паўтараліся ўсё часьцей ды часьцей і ўрэшце зрабіліся амаль штодзённымі. У ноч з 31 траўня на 1 чэрвеня 1943 году горад чамусьці асабліва моцна, проста жудасна бамбавала савецкая авіяцыя. Усяго гэтага даўно чакалі, бо зьвесткі пра жорсткія паветраныя бамбаваньні Смаленску, Віцебску й Менску ўжо даходзілі й да Полацку. Было зразумела, што настае нашая чарга. Гэтак і здарылася. На маленькі, ужо і так моцна разбураны пажарамі гарадок за адну ноч было скінута больш за 1200 бомбаў буйнога і самага буйнога калібру. Лепш за іншых захаваная да гэтага часу задзьвінская частка Полацку гарэла, нібы сухое лісьце. Шмат ні ў чым не вінаватых расейскіх людзей ізноў засталіся без страхі і маёмасьці. Нават многія агароды пасьля бамбаваньня давялося перакопваць ды саджаць наноў. Аднак, як гэта ні дзіўна падаецца на першы погляд, чалавечых ахвяраў было адносна няшмат: 73 асобы сярод цывільнага насельніцтва ды 5 ці 6 немцаў. Да гэтага часу людзі былі ўжо дастаткова добра напрактыкаваныя, каб умець хутка стаіцца ў сховішчы ці пакінуць горад пры першых гуках паветранай трывогі.

Дэмаралізацыя па Сталінградзкай паразе, набліжэньне фронту і бамбаваньне з паветра выразна ўплывалі ня толькі на расейцаў, але і на немцаў. Ганарыстыя ды самаўлюбёныя заваёўнікі пачалі выяўляць ноткі зьбянтэжанасьці ды трывогі. Насельніцтва імкнулася як мага хутчэй пакінуць горад. Асабліва моцна цягнула ў Заходнюю Беларусь і прыбалтыйскія краіны.

Якраз у гэты момант звалілася вялікая бяда - прымусовая мабілізацыя на працу ў Нямеччыну. У параўнаньні зь іншымі абласьцямі акупаванай тэрыторыі да Полацку гэтае мерапрыемства дакацілася чамусьці надзвычай позна. І

праходзіла яно хаатычна, млява і, я б сказаў, зь нямецкага пункту гледжаньня - надзвычай непасьпяхова. Ніякай выразнай звыродлівасьці ў самой тэхналёгіі гэтай нядобрай справы не было: людзей не хапалі на вуліцы ці ў грамадзкіх месцах, не забіралі «ў чым ёсьць», як гэта, кажуць, мела месца ў Кіеве ды іншых гарадох, дзе панавала нямецкае цывільнае кіраўніцтва. Наадварот, звонку ўсё адбывалася даволі прыстойна, нібы згодна з законам: папярэдне разьвешаныя абвесткі, расьпісаныя месцы збору, мітынг перад ад'ездам і гэтак далей. Але па сутнасьці былі дапушчаныя шматлікія несправядлівасьці, калі ў такой справе ўвогуле можна гаварыць пра «справядлівасьць»; гэтак, напрыклад, сваякоў тых, хто служыў у паліцыі ды «сакрэтных» асьведамляльнікаў гестапа (у правінцыйным гарадку гэта зусім не сакрэт) ня бралі, нямецкіх каханак ды добраахвотных прастытутак - таксама. За негалосна таксаваны хабар памерам у 20 рублёў золатам нямецкі вайсковы лекар высокага рангу вызваляў «праз хваробу» каго заўгодна. Гэтым зараз жа многія скарысталіся. Моладзь з аддаленых вёсак на шляху ў горад на вэрбавальны пункт пераймалася партызанамі. Зуеў, у чыім раёне партызаны ня мелі сілы, сам катэгарычна адмовіўся аддаваць на працу ў Нямеччыну хоць каго з моладзі. Па-першае, таму што ня будзе каму змагацца з партызанамі, а па-другое, таму што ягоныя вёскі «зусім ня горшыя за паліцыю». Немцам цяжка было з гэтым усім змагацца. Мала працоўнай сілы атрымалі яны ад Полацку ды Полацкага раёну летам 1943 году падчас мабілізацыі - нашмат менш, чым зьехала добраахвотна летам 1942 году.

На гэты самы няшчасны пэрыяд лета 1943 году прыпадае новая, зусім незразумелая нямецкая спроба «беларусізацыі» гораду Полацку. Пасьля «артылерыйскай падрыхтоўкі», якая палягала ў неаднаразовым выкліку шэрагу грамадзкіх дзеячоў гораду ў гестапа на прадмет прышчапленьня ім ідэй беларускага (чытай - антырасейскага) нацыяналізму, у Полацак прыбылі зь Менску агітатары, прадстаўнікі нібыта арганізаванага Беларускага Ўраду (Рады). Гэтыя апошнія трымаліся ўкрай неразумна і бестактоўна. Большасьць насельніцтва не разумела іхнай знарочыста ненатуральнай, псэўдабеларускай мовы, на якой ніхто й ніколі не размаўляў у Полацку. А самі яны рабілі выгляд, што не разумеюць па-

расейску. Выйшла немаведама што. Ніводная размова, па сутнасьці, ніводная запраектаваная немцамі сустрэча пры такіх умовах не магла фактычна адбыцца. На «беларускі» мітынг, які неаднаразова абвяшчаўся праз рупар з машыны нямецкай прапаганды, што езьдзіла па вуліцах, ніхто не прыйшоў.

У час афіцыйнага візыту ў гаруправу менскіх гасьцей зь іх правінцыйным шавінізмам службоўцы выставілі на сьмех і злавілі на поўным няведаньні гісторыі краю. На гэтым беларусізацыя ў нас і скончылася. Людзі зьехалі назад у Менск, калі яны сапраўды прыяжджалі зь Менску, а не з Бэрліна.

Такім чынам, вясною, летам і восеньню 1943 году справы ды турботы Групы ўвесь час перамешваліся з паразамі ды горам. Нейкім чынам гестапа даведалася пра нашыя сувязі з партызанамі; цалкам верагодна, што пра гэта ім паведамілі саветчыкі, праз агентуру, якая працавала на абодва бакі. Адразу ж завязалася страшэнная калатнеча. Мы ня ведалі дакладна, што менавіта вядома гестапа. Я зрабіў намаганьне проста і шчыра патлумачыць у фэльдскамэндатуры сутнасьць справы і ў падтрымку сваіх словаў паказаў ужо гатовы да гэтага часу ў пісьмовым выглядзе праект лягеру для партызанаў, якія адумаліся. На жаль, нашага барона-фэльдскамэнданта ўжо не было тады ў Полацку. Гестапа настойвала на арышце ўсёй Групы. Вайсковыя ўлады, аднак, разумелі, што для гэтага трэба спачатку раззброіць сялянскую самаахову. Таму фэльдскамэндант катэгарычна супраціўляўся арыштам. У выніку ўся справа была перададзеная на разгляд зьмяшанай вайсковай камісіі, складзенай з прадстаўнікоў штабу арміі і фэльдскамэндатуры. На нашае шчасьце, туды патрапілі культурныя ды добразычлівыя людзі; яны вынесьлі нам толькі папярэджаньне за залішне самастойныя дзеяньні і спынілі справу. Але праект пры гэтым быў канчаткова загублены.

Толькі пасьпела скончыцца гісторыя з нашай сувязьзю з партызанамі, як прыйшоў загад пра эвакуацыю. Ён зваліўся нібы сьнег на галаву. Відаць, наступ бальшавікоў на Віцебск ці які-небудзь прарыў савецкіх частак выклікалі ў немцаў самы сур'ёзны страх. Уся акруга заварушылася. Пра крывавую лазьню, якую бальшавікі ўчынялі мясцоваму насельніцтву

пасьля «вызваленьня», ведалі ўжо ўсе. Калі партызаны ці іх сваякі яшчэ неяк разьлічвалі на свае заслугі перад «бацькам Сталіным», дык астатняя частка грамадзянаў не магла спадзявацца ні на што. Немцы давалі ў распараджэньне жыхароў, якія хацелі эвакуявацца, чыгуначныя саставы. Людзей накіроўвалі ў Рыгу. Ахвочых ехаць было вельмі шмат. Супрацоўнікі ўсіх галоўных расейскіх установаў працавалі над складаньнем сьпісаў дзень і ноч і проста валіліся з ног ад стомы. Цягнікі адзін за другім ад'яжджалі ў кірунку Дзьвінску, адвозячы тысячы й тысячы людзей. На той час ніхто нікога не прымушаў. Усім было дазволена браць з сабою даволі значную колькасьць маёмасьці. Сяляне, якія эвакуяваліся, штодня пакідалі каля чыгуначнай станцыі запрэжаных коней: жывёлу везьці з сабою не дазвалялася.

Плян эвакуацыі быў разьлічаны прыкладна на два тыдні. За першы няпоўны тыдзень з самога гораду Полацку пасьпела зьехаць каля 4000 жыхароў. Пра колькасьць сялянаў цяжка меркаваць.

І раптам… і раптам эвакуацыя скончылася гэтаксама нечакана й хутка, як і пачалася. Відаць, добрыя зьвесткі з фронту прынесьлі ў горад загад пра яе спыненьне. Тыя, хто пасьпеў зьехаць, больш ужо не вярнуліся, і горад пасьля атрымліваў ад іх праз фэльдскамэндатуру шматлікія лісты з Латвіі. Усе людзі знайшлі працу па вольным найме і жылі больш ці менш здавальняюча. Тыя ж, хто не пасьпеў зьехаць, засталіся, і засталіся надоўга - амаль на цэлы год, да чэрвеня 1944-га, калі адбылася другая і апошняя эвакуацыя перад канчатковым захопам Полацку савецкімі войскамі.

12. АПОШНІ ПЭРЫЯД АКУПАЦЫІ. НПС, РВА І НАЦЫЯНАЛ-САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ ПРАЦОЎНАЯ ПАРТЫЯ РАСЕІ

Гэты апошні пэрыяд акупацыі, гэта значыць другая палова зімы і вясна 1944 году, шмат у чым ня быў падобны да ўсяго папярэдняга часу. Пасьля восеньскай частковай эвакуацыі 1943 году, што так нечакана распачалася і гэтак нечакана

скончылася, усім стала неяк адразу зразумела, што настае канец немцам і што яны вельмі хутка сыдуць з Расеі.

Пра гэта сьведчыла ўсё. І няспыннае набліжэньне фронту, і бесьперашкодны рост партызанскага руху, зь якім немцы зусім перасталі змагацца, і шчырыя выказваньні саміх немцаў у прыватных канфідэнцыйных размовах. Але самай пэўнай прыкметай блізкага канца было тое, што немцы адпусьцілі лейцы кіраваньня на акупаванай тэрыторыі. Ці даўно яны так гарліва ахоўвалі ўсе прэрагатывы сваёй гаспадарчай улады, лічылі за абавязак сунуць свой нос усюды і ўвогуле трымаліся так, нібы атабарыліся ў Беларусі назаўсёды.

Пасьля восеньскай эвакуацыі ўсё адразу зьмянілася. Немцы яшчэ працягвалі займацца справамі, але толькі па інэрцыі, млява і неахвотна. Да спэцыфічных расейскіх справаў яны амаль страцілі ўсялякую цікавасьць. Цывільнае насельніцтва, якога пасьля першай эвакуацыі заставалася ў горадзе тысячаў 14-15, паціху разьбягалася. Хто хацеў пайсьці да партызанаў, рабіў гэта амаль адкрыта: грузіў на вазы найбольш каштоўную маёмасьць, забіраў у поўным складзе сям'ю ды ад'яжджаў раніцой на сьвітанку ў «невядомым кірунку».

Вельмі характэрна, аднак, што ў гэты трывожны час з гораду да партызанаў пайшло вельмі няшмат народу, усяго колькі дзясяткаў чалавек. У суадносінах з усім насельніцтвам гораду гэта складала мізэрны працэнт (прыблізна 0,5 %).

Значна больш народу сплывала паступова ў Заходнюю Беларусь. Людзі накіроўваліся туды нібыта часова, пад выглядам наведаньня сваякоў, закупкі тавараў і да т. п., ды заставаліся назаўсёды. Гэта зьдзяйсьнялася як законным шляхам - з пропускам па чыгункы, гэтак і незаконна - бяз пропуску пешкі. У Заходнюю Беларусь, ці проста «Заходнюю», як кажуць у Полацку, пайшлі многія дзясяткі, калі ня сотні сем'яў. У пераліку на адсоткі гэта павінна было складаць ня менш за 5-6 %.

Новыя акалічнасьці - хуткі прыход «чырвоных» і значнае аслабленьне акупацыйнага рэжыму - ставілі перад намі, гэта значыць Групай і ўсім тым, што да яе належала, зусім іншыя

задачы. Што трэба пасьпець зрабіць да прыходу бальшавікоў? Як найлепшым чынам выкарыстаць нямецкую слабасьць?

Аднак вырашэньнем гэтых пытаньняў Група занялася ня толькі аднымі сваімі сіламі, а сумесна з прадстаўнікамі Нацыянальна-працоўнага саюзу (салідарыстамі) і Расейскай вызваленчай арміі (уласаўцамі). Таму, перш чым працягваць далей аповед, тут давядзецца спачатку даволі падрабязна спыніцца на нашым знаёмстве і супрацоўніцтве з абедзьвюма вышэйзгаданымі арганізацыямі.

Пра Нацыянальна-працоўны саюз новага пакаленьня, як яго тады называлі, упершыню мы даведаліся раньняй вясною 1943 году. Прызначаная тады ў горад царкоўная асоба прывезла нам з Польшчы розную літаратуру, выдадзеную гэтай арганізацыяй. Мы зараз жа заняліся яе пільным вывучэньнем і ў цэлым ухвалілі. Больш блізкае асабістае знаёмства зь іншымі прадстаўнікамі Нацыянальна-працоўнага саюзу (НПС) адбылося трошкі пазьней, ужо ў сярэдзіне таго ж году. Гэты цікавы для нас ува ўсіх дачыненьнях расейскі чалавек з тыпова нямецкім прозьвішчам быў прысланы з Бэрліна ў Беларусь нейкай дзяржаўнай установай і павінен быў уваходзіць у афіцыйныя зносіны з найвышэйшымі мясцовымі нямецкімі ўладамі. Падчас афіцыйнай размовы ў нашай фэльдскамэндатуры адзін з старых афіцэраў, які прыняў прышлага за сапраўднага немца, паведаміў яму між іншым: «Ёсьць тут мясцовая расейская нацыянальная арганізацыя; безь яе цяжка было б цяпер абысьціся; але з часам гэтыя людзі стануць нашымі надзвычай небясьпечнымі ворагамі». Незнаёмец насьцярожыўся і выказаў пажаданьне пазнаёміцца з кіраўніцтвам Групы. Пасьля абеду афіцэр прывёз яго да нас, а сам паехаў.

Пачалася ўзаемная праверка. «Немец», на наша вялікае зьдзіўленьне, гаварыў па-расейску, як можа гаварыць толькі прыроджаны масквіч. Неасьцярожна кінуты ў фэльдскамэндатуры выраз пра нас надзвычай спрашчаў усю справу. Ня больш як праз гадзіну мы сталі сябрамі. Наш новы знаёмец, які яшчэ й сёньня жыве ў эміграцыі, быў адным з найстарэйшых кіраўнікоў НПС.

З таго часу «саюзьнікі» ўсіх рангаў сталі ўчашчаць у Полацак і заўсёды спыняліся ўжо непасрэдна ў нас. Жадаючы каардынаваць свае сьціплыя мясцовыя высілкі з старэйшай баявой арганізацыяй, што шырока раскінула сваю сетку, мы, гэта значыць я і яшчэ некалькі галоўных сяброў Групы, увосень 1943 году ўступілі ў НПС.

Саюз і пазнаёміў нас з прадстаўнікамі гэтак званай Расейскай вызваленчай арміі, альбо РВА. Мы намагаліся ў межах нашых магчымасьцяў дапамагчы яе прадстаўнікам у выкананьні службовых даручэньняў; яны, з свайго боку, не заставаліся віннымі. Яны наведвалі вёскі сялянскай самааховы, вырашалі тактычныя задачы па барацьбе з партызанамі, аб'ежджалі разам з намі аддзяленьні Групы ды «націскалі» ў той ці іншай справе на нямецкія ўстановы, калі гэта было патрэбна. Я ўжо не кажу пра такія рэчы, як перадача лістоў ды матэрыялаў, закупка для нас кніг у Нямеччыне і гэтак далей.

Праз прыежджых вайскоўцаў нашы сялянскія атрады хутка і лёгка дамовіліся з камандаваньнем РВА пра аўтаматычнае ўлучэньне іх у склад расейскіх вайсковых частак падчас адыходу немцаў з Расеі. Гэтая напалову афіцыйная дамоўленасьць хутка сталася больш рэальнай, чым можна было сабе думаць: шмат хто з удзельнікаў полацкіх аддзелаў самааховы здолеў перабрацца ў 1944-1945 гадох на паўднёвы захад Нямеччыны, дзе пад канец вайны адбывалася фармаваньне частак ды злучэньняў РВА.

*

Зімою 1943/44 году сябры Групы сумесна з прыежджымі прадстаўнікамі НПС вырашалі, што рабіць далей. Усім было зразумела, што да прыходу бальшавікоў трэба як мага больш прапагандаваць сярод насельніцтва нацыянальны антыкамуністычны дух, ці, дакладней, проста падвесьці больш важкі тэарэтычны грунт пад здаровыя сацыяльныя інстынкты ды стыхійную нянавісьць да савецкай улады, якую ўжо мелі амаль усе расейскія людзі.

Каб зьвяртацца да насельніцтва, трэба было выступаць ад імя нейкай незалежнай расейскай грамадзка-палітычнай арганізацыі. НПС для гэтага ніяк не падыходзіў - ён ужо зазнаў жорсткі перасьлед з боку нямецкага нацыянал-сацыялістычнага ўраду: 75 ягоных старэйшых сяброў - у тым ліку амаль усё кіраўніцтва - сядзелі ў Бэрліне ў турмах, а гестапа цішком забівала асобных найбольш актыўных чальцоў арганізацыі проста на вуліцах гарадоў.

Таму кіраўніцтва НПС даручыла нам, новым і яшчэ не дэканьспіраваным сваім сябрам, стварыць дзеля адкрытай барацьбы якую-небудзь адмысловую, часовую, абавязкова легальную што да немцаў расейскую палітычную партыю на грунце Групы і яе адгалінаваньняў. Мы ўжо мелі дастатковы для гэтага тэхнічны апарат, не ставала толькі дазволу ўладаў ды адпаведна ярлыка, ці назвы. Ярлык патрэбна было наляпіць ня толькі самой арганізацыі, але й саюзным (НПС) выданьням, якія ляжалі на сакрэтных складах мёртвым грузам, бо распаўсюджваць іх ад імя самога Саюзу ўжо было немагчыма. Група зьвярнулася да фэльдскамэндатуры, падаўшы кароткую спрошчаную праграму, складзеную на грунце смаленскага закліку генэрала Ўласава і «Схемы» НПС.

Ідэя партыі была сустрэтая ў фэльдскамэндатуры вельмі спачувальна, але пасьля месяца ліставаньня па гэтай справе мы ўсё ж атрымалі адмову. Аднак пры адмове мы атрымалі неафіцыйную каштоўную сяброўскую параду «прымазацца», хоць бы й фіктыўна, да якой-небудзь дзейнай і раней прызнанай немцамі арганізацыі. Дзеля адкрыцьця філіі дазволу не патрабавалася, дастаткова было зарэгістравацца ў мясцовых уладаў аднабаковай заявай. Гэта была бліскучая ідэя.

Двое прыежджых сяброў Саюзу зараз жа кінуліся на пошукі адпаведных «прыёмных бацькоў» будучай партыі, а мы на месцы заняліся падрыхтоўкай да яе адкрыцьця. Праца завіравала. Былі складзеныя праекты заклікаў да мясцовага насельніцтва, пляны арганізацыйных сходаў і канспэкты дакладаў для публічных выступаў.

Не забыліся мы й на трыкалёрныя нацыянальныя расейскія сьцягі, якія зь вялікай цяжкасьцю і амаль дзіцячым

захапленьнем былі нарэшце пашытыя са старых пафарбаваных прасьцінаў. Для інструктажу мясцовых групаў, на выпадак хуткага разгортваньня партыйнай працы, з Полацку былі пасланыя па акрузе найбольш здольныя ды энэргічныя людзі.

Такім чынам, пад няспынны аддалены гул артылерыі з боку Віцебску, да сакавіка 1944 году ў нас ужо ўсё было гатовае. Між тым, ад сяброў, што зьехалі шукаць «назву партыі», не было ані гуку. Мы пачалі нудзіцца ад бязьдзеяньня і невядомасьці; час, які заставаўся на магчымы рывок у далейшай працы, скарачаўся з катастрафічнай хуткасьцю: «чырвоныя» ўжо занялі Вяліж, Невель і Гарадок; усім было зразумела, што Віцебск доўга не пратрымаецца. А Полацак знаходзіўся на чарзе пасьля Віцебску.

Мы самі спрабавалі перабраць у памяці ўсе існыя ў «эўропах» расейскія антыбальшавіцкія арганізацыі й партыі: эсэраў, сацыял-дэмакратаў, манархістаў, фашыстаў, нейкі Штабс-капітанскі рух, Агульнавайсковы саюз і гэтак далей. Адны зь іх былі забароненыя, як і НПС, немцамі, іншыя не падыходзілі, бо ўжо мелі сваю вызначаную агульнавядомую палітычную праграму, і пад іх фірмай распаўсюджваць саюзныя выданьні было нязручна.

На занятай тэрыторыі розныя неспакойныя палітычныя дзеячы таксама спрабавалі рухацца па сваіх кутох, хто як мог. У Барысаве ці Воршы існавала нейкая арганізацыя ці партыя Октана; у Менску, вакол Рады, была свая беларасейская партыя; недзе за Лепелем немцы аддалі ці мелі намер аддаць цэлую акругу пад кіраўніцтва камандзіру асобнай дывізіі расейскіх галаварэзаў Камінскаму - там таксама магла быць нейкая расейская нацыянальная палітычная арганізацыя.

Няўжо сярод усяго вялікага асартымэнту немагчыма было абраць нейкую адпаведную фікцыю, якая б падышла для нашай мэты, на два-тры месяцы?

І раптам, здаецца, ужо ў красавіку 1944 году да нас прыехала нарэшце цэлая група кіраўнічых працаўнікоў НПС: нашае пытаньне было вырашана, можна было пачынаць працу. Як высьветлілася зь іхных словаў, у акрузе, якой кіраваў у той час

Камінскі, была толькі што арганізаваная новая палітычная расейская партыя пад вельмі адыёзнаю назвай «Нацыянал-сацыялістычная працоўная партыя Расеі». Яна не была дазволеная немцамі, але яе й не забаранялі. Легалізацыя партыі адбылася неяк сама сабою, ці, дакладней, у явачным парадку.

Такім чынам, нам было загадана ўзяць псэўданім НСППР. У найбліжэйшы час у нашую фэльдскамэндатуру разам зь іншай прэсай зь нямецкага Вайсковага аддзелу прапаганды павінныя дайсьці газэты з дакладамі пра арганізацыю і працу НСППР. Нам прывезьлі гэтых газэт цэлы стос разам з фармальнымі паўнамоцтвамі ад партыйнага цэнтру на адкрыцьцё філіі ў Полацку.

Фэльдскамэндатура пайшла нам насустрач нават больш, чым мы гэтага чакалі. А загадзя падрыхтаваная чалавечая машына, што нецярпліва чакала першага сыгналу, прыйшла ў самае інтэнсіўнае дзеяньне. За адзін тыдзень уся акруга зьверху да нізу была абклееная нашымі заклікамі; па ўсіх буйных населеных пунктах адбыліся арганізацыйныя сходы; а грандыёзныя адкрытыя мітынгі зьбіралі сотні і нават тысячы людзей зь ліку мясцовага насельніцтва. Немцы, якія не чакалі нічога падобнага, толькі рукамі разводзілі ад зьдзіўленьня: расавая тэорыя трашчала па ўсіх швох.

Тыдні праз два пасьля першых мітынгаў мы мелі ў акрузе больш за 600 сяброў партыі, якія дзеля таго, каб запісацца, мусілі прыходзіць асабіста ў мясцовы камітэт. Выклікае зьдзіўленьне, як людзі наважыліся прыйсьці ў партыю напярэдадні жудаснай разьвязкі, калі фронт знаходзіўся кілямэтраў за 40-60, прычым нягледзячы на запалохваньне з боку савецкай агентуры. Відавочна, гэта ўсё былі людзі, якія вырашылі не чакаць савецкага войска, а сыходзіць на Захад. Дарэчы, мы вельмі спадзяваліся, што на нашых мітынгах будзе дастатковая колькасьць партызанаў; і мы не памыліліся: «зараза» пайшла такім чынам у лес і нарабіла там шмат шуму.

Аб'ехаўшы ўсю акругу з моцнай групай прапагандыстаў і наладзіўшы ўсюды працу, мы прысьвяцілі рэшту часу, які нам яшчэ заставаўся, усталяваньню асабістых сувязяў з расейскімі

нацыянальнымі коламі ў Дзьвінску, Вільні, Рэжыцы й Рызе. Адначасова мы склалі агульны плян вываду сваіх людзей на Захад у выпадку адыходу немцаў. Уся астатняя нашая ўвага была прысьвечаная падрыхтоўцы адмысловай прапагандысцкай літаратуры, якую мы мелі намер пакінуць для савецкага войска. Пэўная колькасьць палітычнай літаратуры сыстэматычна выдзялялася таксама партызанам у лес - мы з посьпехам выкарыстоўвалі дзеля гэтай мэты сувязі, якія засталіся яшчэ з 1943 году. Тыя ж сувязі спатрэбіліся нам, калі НПС пачаў накіроўваць праз нас асобных людзей і нават узброеныя групы ў тыл «чырвоным». Адсутнасьць суцэльнай лініі фронту, якая тлумачылася недастатковай колькасьцю людзей як у немцаў, гэтак і ў бальшавікоў, як найлепш спрыяла тады нелегальным перакідам.

Дзякуючы пляну арганізаванага адыходу мы падчас уцёкаў праз партызанскія раёны згубілі параўнальна няшмат людзей і, акрамя таго, мелі магчымасьць дапамагчы мясцоваму насельніцтву, якое таксама эвакуявалася ў вялікай колькасьці, сваёй узброенай аховай. Цяпер на немцаў ужо нельга было разьлічваць: ім самім было дрэнна. З чатырох груповак сялянскай самааховы тры пасьпяхова ўцяклі ад бальшавікоў.

І ўжо ў кожным разе можна з упэўненасьцю сказаць, што бальшавікі атрымалі Полацкую акругу назад у свае рукі з добрай палітычнай накрыпкай.

Адшукала і пераклала на беларускую мову Лілія Сазанавец паводле: Грани. 1956. № 30, 31 (Франкфурт-на-Майне: выдавецтва «Посев»).

«Парашутысты» невядомага цэнтру

Паслоўе

Дзіўнае ўзьнікае пачуцьцё пасьля прачытаньня мэмуараў П. Ільінскага. Прынята лічыць, што асаблівасьцю

дакумэнтальнага твору ёсьць дэталёвы аповед пра мінулыя дні, каб зафіксаваць адценьні, драбніцы падзеяў, сьведкам якіх быў асабіста. Прачытаўшы ж гэты твор, спыняешся на думцы, што пытаньняў пра тагачасныя падзеі ня толькі не паменела, але наадварот - паболела, і карціна сталася размытай да невыразнасьці.

Мэмуары Ільінскага даволі спэцыфічныя, у іх амаль не сустракаюцца прозьвішчы дзейных асобаў (акрамя камандзіра самааховы Міхаіла Зуева ды старога сьвятара Сакольскага), назваў аб'ектаў гарадзкога краявіду (апрача Сафійскага і Мікалаеўскага сабораў ды Спаса-Эўфрасіньнеўскага манастыра). Тэкст зьмяшчае мноства геаграфічных недакладнасьцяў: адлегласьць да Расонаў удвая зьменшаная, Дзісна чамусьці завецца Луначарскам і г. д. Падобна, аўтара не займае дакладная прывязка да месца, часу, асобаў. Полацак Ільінскага нейкі гратэскавы, дзе пануюць над усім адно гаруправа ды фэльдскамэндатура. З гэтае прычыны заканамерна паўстае пытаньне: якая ж ідэя падштурхнула аўтара да напісаньня на эміграцыі гэтага твору? Мяркую, аўтар імкнуўся паказаць актыўнасьць, уплывовасьць і значнасьць групоўкі, у склад якой уваходзіў.

Пасьля першага пытаньня ўзьнікае другое: а ці зьяўляўся Ільінскі або той, хто схаваўся за гэтым прозьвішчам, сапраўды той асобай, якой малюе сябе ў творы? Можа падацца, што пасьля ідэоляга айца Сакольскага ён найбольш важная асоба ў групе, але чамусьці ў часе фармаваньня новае гаруправы не прасоўваецца ўгару па службовай лесьвіцы. Аўтар адзначае, што займаецца ўладкаваньнем царкоўнага жыцьця, але ня мае трывалых ведаў з царкоўнай гісторыі (Эўфрасіньня ў яго ўнучка Сьвятога Ўладзімера). Паводле сваіх абавязкаў мусіць кантраляваць рамонт і адкрыцьцё цэркваў, але назваў іх не падае. Сьцісла піша пра пастырскія курсы і перанясеньне мошчаў Сьвятой Эўфрасіньні, падзею для праваслаўнага верніка выключную, якую падрабязна апісваюць і беларус-незалежнік Юрка Віцьбіч, і савецкі полацкі краязнаўца Іван Дэйніс. Цягам сваіх успамінаў Ільінскі падрабязна выкладае і пра здабыцьцё падручнікаў для школаў (цікава, што расейскамоўныя падручнікі знайшліся ў Рызе), і пра набыцьцё

зброі для зуеўскай самааховы, і пра ваенныя апэрацыі гендзікаўскіх стараверaў, так што закрадаецца падозраньне: ці сапраўды аўтар гэтага тэксту займаў пасаду менавіта загадчыка царкоўнага аддзелу Гаруправы? Адно несумненна: сфэрай зацікаўленьняў аўтара была патаемная гульня ў калідорах акупацыйных установаў. Сваю энэргію ён скіроўваў на тое, каб забясьпечыць сваім суўдзельнікам перавагу над іншымі калябарацыянісцкімі групоўкамі, таму грамадзкія працэсы ў Полацку заставаліся па-за ягоным кругаглядам. Адсюль і розныя супярэчнасьці ў тэксьце. З аднаго боку, немцы не займаюцца горадам, а ўсім кіруе Ўправа, у якой заселі адны НКВДоўцы, а з другога, лічы, тыя ж НКВДоўцы засылаюць да немцаў амаральных дзяўчын-камсамолак, каб здабываць інфармацыю. Аўтару паўсюдна бачацца хітрыкі НКВД, і нават у полацкіх канцэнтрацыйных лягерох, паводле ягоных словаў, пануе чырвоны тэрор. А што ж нямецкая акупацыйная адміністрацыя? Яе, згодна з Ільінскім, можна абвінаваціць хіба ў нядбайнасьці, але ж на Нюрнбэрскім працэсе фашыстоўскіх правадыроў судзілі па іншым артыкуле.

З тэксту ўспамінаў вынікае, што групоўка фактычна кантралявала сытуацыю ў Полацку. (Падобным чынам за савецкім часам пісалі былыя партызанскія камісары, каб умацоўваць сваю партыйную кар'еру.) Павярхоўны аналіз мэмуараў Ільінскага дае падставу сумнявацца ўва ўсемагутнасьці «праваслаўнага брацтва». Да прыкладу, групоўка кантактуе напачатку з смаленскім праваслаўным япіскапам і спрабуе наладзіць кантакты з бэрлінскім, але чамусьці не зь япіскапам Апанасам Мартасам, які з сакавіка 1942 году ачольвае полацка-віцебскую епархію. Нешта (ці нехта) тут не задавальняе сяброў групоўкі, ці яны адмыслова ігнаруюць (сабатуюць) беларускую праваслаўную аўтакефалію. Далей Ільінскі піша пра наладжаньне пры канцы 1943 году кантактаў з прадстаўнікамі РВА, але тутака ў Полацку ў 1942-1943 гадох кватаруюць і лечацца ў сваім шпіталі жаўнеры Расейскай нацыянальнай народнай арміі, на чале якіх стаяў Гіль-Радыёнаў. Аднак зь імі групоўка кантактаў не наладжвае. І тут ім нешта не да густу - мо няма даверу? Спробы навязваньня кантактаў па-за межамі рэгіёну сьведчаць хутчэй пра слабую апору ў самім горадзе або пра вонкавую каардынацыю

дзейнасьці групы (тады група выглядае на адмысловых парашутыстаў-дывэрсантаў). Зьвесткі ж пра тысячныя мітынгі і сходы, наладжаныя Нацыянал-сацыялістычнай працоўнай партыяй Расеі ў разбураных вайной мястэчках Полацкае акругі ў красавіку 1944 году, калі савецкія войскі стаялі ўжо пад Расонамі, проста выклікаюць усьмешку.

Наўрад ці адпавядаюць праўдзе зьвесткі пра беларускія нацыянальныя справы, якія дзеяліся ў акупацыйным Полацку. Нават полацкі краязнаўца, выкладчык лясного тэхнікуму Іван Дэйніс ведаў, што прадстаўніком Беларускай Цэнтральнай Рады ў Полацку зьяўляўся Цяста, былы дырэктар чыгуначнае школы пры станцыі Полацак-1. Аб гэтым краязнавец піша ў сваёй кнізе «Полацкая старына», якая да сёньня, на жаль, застаецца ў рукапісе.

З азначаных вышэй прычынаў успаміны Ільінскага падаюцца надзвычай тэндэнцыйнымі і патрабуюць грунтоўнага супастаўленьня зь іншымі крыніцамі дзеля рэканструкцыі сапраўднае карціны жыцьця Полацку пад нямецкай акупацыяй.

Міхась Баўтовіч

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/5
[image]

ЮРАСЬ ПАЦЮПА
паэт, эсэіст, сталы аўтар «ARCHE». Падрыхтаваў да друку выбраныя творы Івана Франка на беларускай мове.

Юрась Пацюпа Постмадэрнізм, калыска мая

ВЕРАСЕНЬ НА ЗАЛАТОЙ ГОРЦЫ

Быў сонечны верасень 2002 году. Пасьля ПЭН-Цэнтраўскага сходу я і Андрэй Дынько пад нясьпешную гамонку ішлі ў бок вуліцы Залатая Горка. Дынька толькі што абралі на кіраўнічую пасаду ПЭН-Цэнтру і якраз была падстава пагаварыць пра літаратуру ды жыцьцё пісьменьнікаў. Неяк выпадкова мой суразмоўца заўважыў, дзей кепска тое, што нашыя літаратары, асабліва ў правінцыі, ізаляваныя ад сусьветнага літаратурнага кантэксту: «У Менску хоць нейкая лучнасьць ёсьць, ну, скажам, з украінцамі, а ў Гародні і таго няма».

Далей мы ўспомнілі пра тых ці іншых аўтараў: у таго больш «правінцыйнасьці»... у таго - менш... Не забыліся, ведама ж, на постмадэрнізм... І, не беручы да галавы існасьці праблем, перайшлі ўрэшце на нейкія прасьцейшыя тэмы.

Тады я пракаўтнуў зычлівую, але ўсё ж балючую заўвагу аб правінцыйнасьці. (Неістотна, падаў яе цень на мяне ці не.) А ўжо праз колькі дзён, у Гародні, ідучы па нашай славутай Дамініканскай, успомніў той выпадак Юр'ю Тарасевічу. Лагодна абурыўся на шавінізм менчукоў і, нечакана для самога

сябе, расказаў, як менавіта Гародня была кагадзе «калыскаю» беларускага постмадэрнізму. І хто больш правінцыйна выглядаў, прынамсі ў даўнія 1980-я, Менск ці Гародня, яшчэ трэба разабрацца.

Мне нават спадабаўся ўласны аповед - так, што я надумаўся запісаць яго. Але ўсё ня меў на тое добрай нагоды. І вось нагода раз за разам пачала даваць аб сабе ведамасьць. Працяглая спрэчка Данілы Жукоўскага і Сяргея Балахонава ўзычвае мне такі шанец. Прызнаюся, у розныя моманты спрэчкі хацелася стаць то на бок свайго земляка Жукоўскага, то на бок гамельчука Балахонава. Але ўрэшце, як той рабін з анэкдоту, я пагадзіўся з абодвума.

Згодзен з Данілам, што пад выглядам навіны ды інтэлектуалізму вельмі часта ў нас (усё тая ж правінцыйнасьць!) чытачу падсоўваецца нешта нуднае, цьмянае ды пустое. І вельмі блізкае мне жаданьне Сяргея глянуць на беларускую літаратуру канцэптуальна. Урэшце, крыўдна будзе, калі наш горад з «калыскі постмадэрнізму» раптам стане «Вандэяй постмадэрнізму». І яшчэ я не хацеў бы, каб мае зацемкі ўспрымаліся ў рэчышчы палемікі. Гэта хутчэй спроба ўспамінаў пра недалёкую мінуласьць, чым палеміка.

Хто першы сказаў «гаў»?

Дыскусія аб постмадэрнізьме (а як інакш можна разумець спрэчку Жукоўскага з Балахонавым?!) запазьнілася ў нас гадоў гэтак на пятнаццаць. Хто ж першы пусьціў на цнатлівую беларускую ніву гэтую заморскую пошасьць? Калі не памыляюся, першымі ў тутэйшых літаратурных кулюарах, незалежна адзін ад другога, пра постмадэрнізм пачалі гаварыць Ігар Бабкоў і... (давядзецца і віну, і нясьціпласьць браць на сябе!) Юрась Пацюпа. Я спрабаваў да калектыўнае адказнасьці прыцягнуць яшчэ Валянціна Акудовіча, але той адмовіўся, пагадзіўшыся на ролю ўсяго толькі сьціплага сыстэматызатара.

Перадгісторыяў было шмат.

У ліпені 1988 году я павёз у часопіс «Маладосць» здымак для калектыўнага - першага - зборніку яго «Бібліятэчкі». Янішчыц разьвяла рукамі, маўляў, спазьніўся, але адразу супакоіла, паабяцала выдаць вершы асобнаю кнігай (што зрабіў ужо Камейша).

На калідоры шырокай усьмешкай перастрэў мяне Анатоль Сыс.

- А я ведаў, што ты тут.

- Адкуль?

- Выведка працуе!

Пасьля завёў у сталоўку Дому друку, дзе раптам прапанаваў:

- Пайшлі пакажу, як запраўдныя паэты жывуць.

У сталоўцы мы прыхапілі з сабою Сяргея Верацілу, Андрэя Гуцава і пайшлі ў госьці да Зьніча. Па дарозе Вераціла балбатаў, цытаваў свае вершы, пакуль ня выдаў гістарычную фразу:

- Сыса пусьці ў пустэльню - ён і там пазьбірае тушканчыкаў ды ўтворыць «Тутэйшых».

Гэтыя словы запомніў толькі я. Потым нагадаў іх Верацілу, і з таго часу «тушканчыкамі» мы сталі называць паэтаў-пачаткоўцаў.

Тады ж, пад шатамі Бембелевага саду, мы гаманілі, чыталі вершы (толькі па адным!). Потым карэянка Кені (адна з жонак гаспадара, будучага манаха) частавала нас варывам з капусты. Там я ўпершыню пачуў верш Алега Мінкіна «Прэлюдыя».

Далей мы пайшлі ў госьці да Андрэя Федарэнкі, добра заправіліся. Тады - да Сыса, страціўшы недзе па дарозе Верацілу і Гуцава, дзе зноў заправіліся і дзе мне чамусьці асабліва запомнілася дзяўчына ў кароткай скураной спаднічцы, няхудзенькая, але даўганогая. Урэшце я ледзь не спазьніўся на цягнік. А там ужо - дзяліўся ўражаньнямі з навучэнкамі гарадзенскага музвучылішча. І, зь цяжкою галавой, заваліўся на

паліцу спаць. Ня помню, каб у той дзень нават пра мадэрнізм гаварылі. Праўда, Федарэнка наракаў: «Дай волю Сысу і Глёбусу - у паэзіі адны абстракцыі застануцца».

У сьнежні 1988 году я трапіў на традыцыйны літаратурны сэмінар у Ісламы. І сустрэў там Алеся Аркуша і Ігара Бабкова, Галіну Дубянецкую і Тацяну Сапач, Сяргея Сыса і Вітаўта Чаропку, Леру Сом і Алену Танану, Тацяну Зіненку і Алену Маеўскую, Міколу Шабовіча і Ігара Пракаповіча... Дыскутавалі пра ўсё на сьвеце. Пяялі народныя песьні. Чыталі свае творы, да якіх адзін з кіраўнікоў сэмінару, Браніслаў Спрынчан, даваў вусныя рэцэнзіі, кшталту: «Хорошие стихи. Нужно основательно прополоть». Пасьля мы зь Сяргеем Сысом пайшлі ў Ракаў па гарэлку. Маленькі дзядок Рыгор Няхай таксама даў грошай і ўдакладніў: «Будзе гарэлка - вазьмеце пару пляшак, а як віно - бярэце мора!» На беразе гэтага мора расейскі паэт Пётра Кошаль раз-пораз кампэтэнтна зазначаў: «Это полтинник!» Пад канец сэмінараўцы выдалі насьценную газэту «Масонская лажа». Слова «постмадэрнізм» тады не прагучала ні разу.

І вось вясною 1990 году мы зь Ігарам Бабковым, сустрэўшыся ў кавярні менскага Дому літаратара, нечакана ў адзін голас загаварылі пра постмадэрнізм. Кожны ўжо добра-такі зжыўся з гэтым паняткам. Пагаварылі. Трохі прайшліся па Дубаўцу, які, ведучы рэй у літаратурнай крытыцы, абмінаў такую «важную праблему», і... зноў надоўга разьбегліся. У кожнага была свая гісторыя літаратурных дачыненьняў. Менавіта тады пад канец Ігар сказаў фразу, якая надоўга мне запомнілася:

- На жаль, кантэкст у беларускай літаратуры дэбільны.

- Яго таксама можна скарыстоўваць... - запярэчыў я, на што атрымаў адказ:

- Гэта ён цябе скарыстоўвае!

Далей мы не ўдакладнялі сказанага. Падазраю, што кожны меў на ўвазе сваё. Я - сацрэалізм, ён - проста глуш і правінцыйнасьць.

А ў Гародні канца 80-х - пачатку 90-х бушавалі творчыя жарсьці.

ІНФАРМАЦЫЙНЫ БУМ

Так сталася, што беларускасьць і мадэрновасьць зрабіліся для мяне калі не сынонімамі, дык нечым надта блізкім. У 1986 годзе, адразу па войску, аднаклясьнік пазнаёміў мяне з сваім стрыечным братам - арыгінальным мастаком, паўдысыдэнтам, твораў якога не прымала ніводная савецкая выстава, Алесем Аўчыньнікавым. Я на той час ужо захапляўся паэзіяй Разанава. І ўсё, што чуў ад новага сябра, уцягваў, як губка. Алесь упершыню паказаў мне самвыдавецкі «Бурачок», які зьедліва чытаў услых. Ён жа зацікавіў эстонскім часопісам «Радуга» («Vikerkaar»), які я стаў рэгулярна выпісваць. Менавіта з тае пары ўсіх «нацыяналістаў» з традыцыйнымі мастацкімі густамі я ўспрымаю няйначай як перафарбаваных савецкіх дыназаўраў.

Інфармацыйны бум 80-х зацягнуў мяне ў свой вір з галавою. Шмат разоў абсьмеяная перабудова сёньня мне бачыцца гэтакім маленькім рэнэсансікам. Людзі толькі ў такія пэрыяды, калі мяняюцца сьветагляды, і бываюць шчасьлівыя.

(З такой нагоды мне хацелася б успомніць адну гісторыю. Пры назіраньні на выбарах у Вярхоўны Савет 13-га скліканьня я меў гутарку з камуністкай, таксама назіраньніцай. Гэта была недурная, прыгожая і элегантная жанчына сярэдняга веку. Яна запыталася:

- Калі было лепей: цяпер ці раней? - і ўжо прачувала гарантаваную перамогу.

Калі б я сказаў «раней» - яна перамагла б адразу. Калі б я сказаў «цяпер» - яна перамагла б, узяўшы пару другую адмоўных прыкладаў з жыцьця. Але я яе моцна расчараваў, сказаўшы, што найлепей было пры гарбачоўскай перабудове, якую камуністы ненавідзяць.)

Зялёнае сьвятло для «нетрадыцыйнае» паэзіі загарэлася пасьля

таго, як расейская «Юность» адзін за другім зьмясьціла свае славутыя «Выпрабавальныя стэнды». Зрэшты, «Шлях-360» Алеся Разанава, выдадзены яшчэ ў «застойныя» гады, надоўга перакрываў усе мажлівыя і немажлівыя экспэрымэнты.

Рэнэсанс канца 80-х, апрача ўсяго іншага, вылучаўся вельмі жывым тэарэтызмам. Першым модным і папулярным падручнікам для паэтаў майго кола стала кніга расейскага крытыка Міхаіла Эпштэйна «Парадоксы навіны». Паралельна зь ёю выйшаў у сьвет «Космас паэзіі» Канстанціна Кедрава. Адзін з асобнікаў праз пошту Саюзу пісьменьнікаў атрымала Данута Бічэль і падаравала мне. А калі ўрэшце стаў засвойвацца французскі крытык Ралян Барт, быў адкрыты Борхес ды іншыя, менш даступныя, клясыкі.

Наколькі мог, я стараўся здабываць інфармацыю з усіх бакоў. Выпісаў часопісы «Литературное обозрение», «Вопросы литературы», «Литературная учёба», пазьней - «Вопросы философии». Пад канец 80-х пачаў атрымліваць яшчэ малдаўскія «Кодры», досыць эклектычныя супраць «эстонскага брата», і - узбэцкую «Звезду Востока», якая, схамянуўшыся ўжо ў першай палове 90-х, ня мела сабе роўных паводле насычанасьці рознымі культурнымі пластамі. З расейскіх выданьняў, апрача памянёных і традыцыйнае «Литературной газеты», я падпісаўся на ўраўнаважаны, цэнтрыстаўскі «Новый мир». Усё гэта і многае іншае, што выпадкова трапляла пад рукі, проста фізычна нельга было асягнуць. Але затое я быў заўжды «ў курсе».

І яшчэ, галоўнае: з 1989 году я пачаў рэгулярна атрымліваць інфармацыйны весьнік «Центр», які неўзабаве перайменаваўся ў газэту «Гуманитарный фонд». Сёньня ўжо ня помню, якім спосабам давялося адкрыць «ГФ», аднак да 1994 году я трываў сталым чытачом гэтага ці ня самага постмадэрновага на той час выданьня. Калі «ГФ» надумаўся ўрэшце зьмясьціць поўную мапу сваіх падпісваньнікаў, дык выявілася, што ў Гародні ён мае толькі аднаго. Значыць, ніхто іншы з гарадзенцаў «ГФ» не выпісваў. Дзякуючы гэтай газэце да мяне сьцякалася ўся асноўная інфармацыя пра найноўшыя, праўда, пераважна расейскія літаратурныя зьявы на абшарах былога СССР. Праз

«ГФ» я здабываў альманахі «Вестник новой литературы», часопісы «Лабиринт-Эксцентр» і альманах-дайджэст «Индекс», кнігу Тацяны Горычавай «Православие и постмодернизм», вершы Ігара Халіна, Генрыха Сапгіра і г. д.

У дадатак, я рэгулярна наведваў «Дом народнае творчасьці», куды пасьля кінатэатру «Чырвоная зорка» перайшоў працаваць Алесь Аўчыньнікаў, і браў там чытаць (потым сам выпісаў) мастацтвазнаўчыя часопісы «Творчество» ды «Декоративное искусство СССР». Асабліва цікава выглядаў апошні, што рэгулярна зьмяшчаў укладак новага мастацтва «Ракурс». Аднак усутыч праблему постмадэрнізму перада мной паставілі выпадкова набытыя ў шапіку «Саюздруку» выданьні, якіх я амаль што не спажываў. Гэта былі «моладзевыя нумары» латыскага літаратурнага часопісу «Даугава» (1989, № 8, пазьней яшчэ адзін - 1990, № 10) і расейскага мастацтвазнаўчага часопісу «Искусство» (1989, № 10).

Тыя два (дакладней, тры) нумары часопісаў сталі маімі настольнымі кнігамі. Дагэтуль іх захоўваю і час ад часу пераглядваю з тае ці іншае нагоды. Яны для мяне неперасягненыя ўзоры таго, якім мусіць быць праўдзівы інтэлектуальны часопіс: у меру сучасны і ў меру акадэмічны, гранічна разнастайны і ўнутрана цэласны.

Іншыя гарадзенскія паэты спакайней ставіліся да кніг і прэсы. Гумянюк, як чалавек заходні, часьцей пазычаў, чым купляў кнігі. Раз ён зьлёгку зачытаў майго Эпштэйна. Я змоўчаў, але моцна нэрваваўся. Балазе, Едрусь Мазько супакоіў - майго зачытанага памяняў на свайго новага. Андрэй Пяткевіч, майстар крылатых выразаў, іранізуючы над тою кнігаманіяй, прыдумаў фразу: «Пацюпа за кнігу можа чалавека забіць». Сам Андрэй найболей шанаваў часопіс «Наука и религия». Пазьней падараваў мне сваю падпіску ды зацікавіў урэшце гэтым выданьнем. Едрусь Мазько для выпісваньня абраў надзвычай модны латыскі «Роднік», потым яшчэ - тую ж «Даугаву», моцна паўплывала на яго і прыяцельства з Надзеяй Артымовіч. Гумянюк рэгулярна слухаў літаратурныя радыёперадачы.

Валоданьне інфармацыяй заўжды дае істотныя перавагі. Аднак калі куратар літаб'яднаньня «Наднёманскія галасы» Мікола

Мікуліч успамінаў мяне як, «відаць, аднаго зь лідэраў сучаснай маладой паэзіі», дык быў ня надта дакладны. У гарадзенскім коле, супраць «Тутэйшых», не было лідэраў. Тут кожны быў лідэрам у сваёй галіне. Гумянюк паказаў сябе неперасягненым майстрам экстравагантнасьці. Мазько вылучаўся загадкаваю эзатэрычнасьцю. Ну, а Пяткевіч, ведама ж, ня меў роўных як палітычны паэт.

Аднак далучанасьць да інфармацыі давала мне змогу выступаць у якасьці «тэарэтыка». Прызнаюся, каб захаваць за сабою гэтую ролю, не кранаючы самалюбства калег, я сьведама затушоўваў уласныя паэтычныя амбіцыі. Ствараў вакол сябе міт паэта, які піша без натхненьня, розумам, спакойна накіроўваючы свае дзеяньні:

Звычайна ўсе паэты п'юць...
.....
Я ж не паэт - гандляр, або
дырэктар дзіўнага музэю.
- Калі ласка! Каля ўходу
душа анучаю на плоце...

Але ня ўсё так проста. Пэўна што ў кожнага здараюцца пэрыяды, калі запраўды ўсе шляхі адчыненыя. А калі - і радка зь сябе ня выцісьнеш.

ВЕРШ-ГУРТ «ДЫЯГЕН»

За горадам вырас пустэльны квартал
На ніўцы балотлівай гэткай.
Жылі там паэты, і кожны вітаў
Сустрэчных пыхлівай усьмешкай.

Радкі расейскага паэта мне згадваюцца заўжды, калі я ўспамінаю другую палову 1989 і канец 1990 году.

Не залюбіўшы інтэрнацкага калгасу, я асеў на кватэрцы па вуліцы Болдзіна, у стогадовай бабулькі Юзэфы. На бульвары Ленінскага камсамолу, што ляжаў тут пэрпэндыкулярна, разам кватаравалі Андрэй Пяткевіч і Юры Карэйва. Яшчэ на адным баку квадрата, на праспэкце Будаўнікоў жыў Юрка Голуб. Побач, у прыватным сэктары вуліцы Веры Харужай, разам з сваімі бацькамі, пад шатамі садочка, пажываў Юры Гумянюк. Далей на поўдзень, у прэстыжным доме вуліцы Горкага, раскватараваўся Аляксей Карпюк. Непадалёк, крыху на ўсход, на пакручастай вуліцы Каліноўскага, у сярэдняй рукі хрушчоўцы, асялілася Данута Бічэль-Загнетава. І, нарэшце, яшчэ ніжэй на поўдзень, у інтэрнаце гістфаку, што на завулку Даватара, месьціўся Едрусь Мазько.

Гэта яшчэ далёка ня ўсе жыхары паэтычнага кварталу. Вось крыху ўбок па Горкага кватэра № 13 Аляксея Пяткевіча. На БЛК можна было адшукаць расейскамоўнага паэта Ігара Заўялава. І ці мала каго. Неяк, значна пазьней, ідучы праз бульвар, я сустрэў дабрадушнага Ўладзімера Шурпу, які прывітаў мяне:

- А ты чаго ходзіш па маім сьметніку!

Балотлівы грунт сьметніку як найлепей спрыяў стварэньню літаратурных суполак. І такая суполка ўзьнікла. Назвалася яна «Верш-гурт "Дыяген"».

Было так. Надумаліся мы зь Едрусем Мазьком зьезьдзіць да мяне ў госьці, у мястэчка Азёры. На пляцоўцы прыгараднага вакзалу і ўзьнікла ідэя:

- Слухай, Эдзік, а давай створым верш-гурт... «Дыяген»!

На тым і пагадзіліся, ужо ў аўтобусе дадумваючы сваю ідэю. Да «Дыягену» ахвотна далучыўся Гумянюк. І ня мог не далучыцца Андрэй Пяткевіч, які практыкаваў лад жыцьця кініка. Адно Карэйва абачліва і ганарліва не хацеў ублытвацца ў усялякія сумнеўныя суполкі. Зрэшты, ён неўзабаве зьехаў у сваю родную Ліду. А на яго месца пасяліўся Сяргей Богуш, які вершаў не пісаў, але гадзінамі мог гаварыць пра літаратуру і вёў паэтычны лад жыцьця. Анатоль Брусевіч, тады яшчэ школьнік, да агульных спраў далучаўся паступова. Пра старэйшых паэтаў

- Бічэль, Голуба - і гутаркі не было. Адчувалася дыстанцыя пакаленьняў. Гэта былі сур'ёзныя людзі, з пасадамі. Ня мы, блазны-студэнты.

Што такое паэтычная суполка, вельмі добра ілюструе анэкдот пра ўкраінцаў (ён і беларусам ня згорш пасуе, асабліва ў трэцяй частцы): «Адзін украінец - гэта бандэравец. Два ўкраінцы - партызанскі атрад. А тры - партызанскі атрад з здраднікам...»

У літсуполцы роля здрадніка пераходзіць з рук у рукі, як пераможны Чырвоны сьцяг. І, можна дадаць, мяняецца ў залежнасьці ад таго, з чые пазыцыі глядзець. Раней я нават не здагадваўся, што найменшае чалавечае згуртаваньне можа штохвілінна пладзіць гэтулькі інтрыг. Але... з дрэннага мы сьмяёмся, а запамінаецца толькі добрае.

Верш-гурт ня быў клясычным дазволеным уладамі літаб'яднаньнем кшталту «Наднёманскіх галасоў» ці недазволеным - на ўзор «Тутэйшых». «Дыяген» - гэта вузкае кола літаратурных сяброў, далёка не аднадумцаў. У назове яго няўзброеным вокам згледжваецца стылістыка рок-гуртоў, якія тады паўсталі замест афіцыёзных савецкіх «ансамбляў» (ВІА) ды неафіцыёзных расейскамоўных «групаў». Слова ж «Дыяген», само сабою, адсылае да антычных кінікаў.

Для мяне кінізм быў сынонімам эстэтыкі нонканфармізму, гратэску, парадаксальнага сьветабачаньня, сьмехавога пачатку ў культуры. Ён пачынаўся з Антычнасьці, выплываў і набываў тутэйшы аблік у беларускай літаратуры XIX стагодзьдзя зь яе бурлескам ды травэстацыяй і, урэшце, ажываў у сучасным андэрграўндзе зь яго «кухоннымі рэвалюцыямі». Упершыню пасьля нашаніўскае пары ў Францішка Багушэвіча зьявіліся пасьлядоўнікі, якія ўбачылі ў яго творчасьці іншыя і, як мяркую, глыбейшыя, чым проста сацыяльныя, пласты традыцыі.

(Напомню, у 1988 годзе выйшла хрэстаматыя зь беларускай літаратуры XIX стагодзьдзя. Я зачытаў яе да адклейваньня карэньчыка вокладкі. У 80-х - пачатку 90-х - пераймаў адтуль стылістыку і жанры (надумаўся абнавіць і адрадзіць чыста тутэйшы жанр гутаркі), да канца 90-х - праймаўся

натуральнымі ўзорамі мовы, а ад нядаўнага часу - спасьцігаю загадкавую рытміку сылябікі.)

Для Андрэя Пяткевіча кінізм быў пэрманэнтным палітычным бунтам супраць таталітарнае дзяржавы, патаптаньнем нормаў філістэрскага грамадзтва. Ён, пісьменьнік, не цаніў пісанага слова, калі трэба было выбіраць паміж словам і ўчынкам. Супраць майго кінізму, як парадаксальнага ладу мысьленьня, ягоны кінізм зьяўляў бунтарскі стыль паводзінаў і філязофскі лад жыцьця.

Іншыя ж сябры гурту, шануючы кінікаў, адумыснага «фанатызму» не праяўлялі...

«ЛіМ» яўна перабольшваў, калі ў 1995 годзе, аказваючы Бум-Бам-Літ, пісаў: «Падобнага яшчэ не было ...на абшарах Беларусі».

Было... Хоць і не падобнае. (Прабачце за сафізм!) Радыкалізм «Дыягену» і Бум-Бам-Літу - не палітычны, як у «Тутэйшых», не арганізацыйны, як у ТВЛ, а менавіта эстэтычны. Аднак многае іх адрозьнівала. І ня толькі пара ды ўмовы існаваньня. Бум-Бам-Літ заўсёды пакідаў у мяне адчуваньне больш авангарднасьці, чым постмадэрновасьці. Зрэшты, сярод «Дыягену» больш авангардным быў Мазько. Гумянюк, як ні дзіўна, балянсаваў паміж пост- і проста мадэрнізмам. Пяткевіч жа наагул быў, як ён сам сябе называў, літаратурным «нінзя».

Так, відаць, не адсьпяваў авангард сваіх песень на тутэйшых абшарах... І тут ёсьць вельмі важны момант! Пэўна што, і запозьнена і заўчасна пачаўшыся, наш постмадэрн ня ведаў, што з сабою рабіць. Нездарма Зьміцер Вішнёў, выступаючы нядаўна ў Гародні, заўважыў: «Ну, а постмадэрнізм... Па-мойму, ён проста здох».

Ня буду спрачацца. Дарэчы, варта было б і акрэсьліць абсягі нашага спакмяня.

КААРДЫНАТЫ ПОСТМАДЭРНІЗМУ

Кажуць, неяк французскі пазытывіст Агюст Конт, дазнаўшыся пра дыялектыку Гегеля, запытаўся ў таго:

- А ці нельга ўсё гэта карацей, прасьцей і па-французску?

На што Гегель з гонарам адказаў:

- Мяне нельга пераказаць ні карацей, ні прасьцей, ні па-французску!

Во як! Яшчэ ня так даўно (пару стагодзьдзяў таму) згерманізаваны славянін Ляйбніц (Любеніч) пісаў пераважна па-французску. Нямецкая мова, відаць, выглядала занадта... правінцыйна. А тут маеш...

Кепская тая філязофія, якая «не канвэртуецца», якую нельга пераказаць. Бо «карацей, прасьцей і па-французску» - гэта здольнасьць быць пераказаным. Здольнасьць да пераказу - уласьцівасьць навукі, няздольнасьць - уласьцівасьць мастацтва. Чым ямчэй пераказваецца філязофія - тым бліжэйшая яна да навукі. А якая з Гегеля навука - ведама, такая ж, як і мастацтва... І, ужо наадварот, кепскі той філязофскі дыскурс, які пнецца выглядаць навукавата. Так што - філязофія гэта бесьперапыннае хаджэньне па лязе...

Але й ня ў гэтым рэч. Тэорыя мастацкага кірунку, калі яна нечага вартая, мусіць быць выкладзеная ў некалькіх простых ідэях. Іначай, будзьце пэўныя, вам дураць галаву! Тут я не зьбіраюся даваць дэфініцыі постмадэрнізму - дарэчы, на дэфініцыі Карл Попэр наклаў такое самае вэта, як Кант на мэтафізыку, - але сякія-такія тлумачэньні зраблю.

Адзін зь першых прапагандыстаў постмадэрнізму ў абсягах былога СССР, латыскі прафэсар Іўбуліс, лекцыі якога мне пашчасьціла слухаць, звычайна казаў так: «Постмадэрнізм - гэта працяг і, адначасна, адмаўленьне мадэрнізму». І адразу ўдакладняў: «Поўнае адмаўленьне!» Менавіта ў сутыкненьні з мадэрнізмам, з авангардам і можна разумець гэтага ідэйнага «сьфінкса».

Авангард замыкае сабою рэнэсансавую парадыгму,

запачаткаваную Дантэ і вычарпаную яшчэ рамантызмам. (Забыты Богам і людзьмі Аляксандар Яўлахаў неяк зазначыў: «Калі Дантэ першы чалавек Новага часу, дык Ніцшэ - апошні».) Усё, на што была здатная асабовасьць, цяпер выліваецца ў апошніх канвульсіях. Авангард гранічна напружвае мастацкую мову (выкручвае ёй рукі) і - надломваецца, ня даўшы рады спраўдзіць сваіх утопій.

З расчараваньня ў «здольнасьці новага выраку» і пачынаецца постмадэрнізм.

Звычайна, калі ўзьнікае патрэба тлумачэньняў, я зьясьняю яго праз трыяду (недыялектычную):

1. Цытатнасьць, бо ўсё тоіць у сабе сьляды недзе некалі некім нечага сказанага і нічога новага сказаць нельга.

2. Эклектыка, бо якога яшчэ выніку можна дабіцца ад скразнога цытаваньня, як не ўраўнаваньня ўсіх сродкаў і прыймаў.

3. Іронія, бо хіба ж эклектычны набор цытат можна аказваць якім іншым спосабам.

Аднак тэарэтызаваньне - далёка не адзіны і не найлепшы спосаб зьясьняньня. А таму дазволю сабе неклясычныя дэфініцыі авангарду і постмадэрнізму пры дапамозе «вяршоідаў», невялікіх тэкстаў-практыкаваньняў.

Першы зь іх, «Восень», напісаны як жарт у час нуднаватае лекцыі з нэатамістаўскае тэалёгіі:

0000000000000
+
∞
=
.....

Другі я ўклаў як рабочую ілюстрацыю да разваг у дзёньніку аб ролі асымэтрыі ў паэзіі:

Над зямлёй ляціць карова,
а платы пасе трава,
не хапайце зор рукамі,
бо у лесе зьвер раве.

А трэці вяршоід, «Мужыцкая праўда», узьнік выпадкова пры чытаньні Кастуся Каліноўскага і запраўды ёсьць даслоўным цытаваньнем (апрача другога радка, які належыць Старому Ўласу) слыннае газэты:

Нарабілі канцылярый -
аж нічога не відаць.
Не ўсёроўна браць у сраку
ці з судом ці без суда.

З трох разоў прашу адгадаць: які з гэтых тэкстаў «авангардны», а які «постмадэрновы»?..

Як па-дзеля мяне, дык першы - узор авангарду, другі, у залежнасьці ад кантэксту, пойдзе і туды і сюды, а трэці... няхай будзе ўжо «поц…», прабачце, «пост- (як там яго?) ...мадэрн».

Калі першы высільваецца да зьнямогі, дык апошні фармальна нічым ня розьніцца ад «клясыкі».

ЯК ГЭТА БЫЛО?

А цяпер вернемся да сюжэту.

Тое, што ў «Дыягене» ці не штодня ішлі літаратурныя дыскусіі - у тым ліку і пра постмадэрнізм, - бясспрэчна. Але дзе ўпершыню пра «гэтую пошасьць» напісана?

Мне нават самому цікава стала - дзе ж я «прагаварыўся»? І што ж... Калі не памыляюся, дык першым беларускім друкаваным выданьнем, якое абвясьціла час постмадэрнізму, была... малатыражка (наклад: 2000!) «Гродзенскі універсітэт». Улічваючы маладаступнасьць выданьня, варта ўспомніць

паасобныя дэталі. Тады, дарэчы, яшчэ не ўсталявалася адзіная традыцыя менаваньня. І мне больш падабаўся (і цяпер падабаецца) тэрмін «трансавангард», які тарнаваўся ў малярстве, чым «постмадэрнізм», ужываны ў літаратуры, архітэктуры і філязофіі. (Калі ў першым падкрэсьлівалася роля эклектыкі, то другі толькі фіксаваў часавую пасьлядоўнасьць.)

Гэтую новую зьяву я разглядаў як кантэкст, разважаючы пра вершы Андрэя Пяткевіча (1989):

Традыцыйны шлях небясьпечны банальнасьцямі, стэрэатыпамі, паўтарэньнямі. Праўда, што такое новае сёньня? У часы трансавангарду няма нічога новага пад сонцам, найадважнейшыя шуканьні - другасныя. І тэрмін «трансавангард» можна прымаць за сынонім «плюралізму». Тут усё дазваляецца, ад кічу да элітарнасьці.

А празь які час, спрабуючы задэкляраваць мэтафізычныя, эстэтычныя і гістарычныя вытокі свае ўласнае паэтыкі, я прытарнаваў іншы, больш папулярны тэрмін для таго самага панятку (1990):

Сёньня, у зьвязку з крызысам постмадэрнізму актуалізуецца гетэрагеннасьць этнаграфізму ў сынтэзе з эзатэрычнасьцю авангарду.

Тады мне вельмі падабалася гуляцца «заморскімі» словамі. Праўда, слову «эзатэрычнасьць» не пашанцавала, яго ў тэксьце малапісьменная студэнтачка-карэктарка перавярнула на «эратычнасьць», а заадно і знакі прыпынку, як умела, расставіла.

Вось яшчэ адно з тагачасных - рэцэнзійных - разважаньняў (1991):

Жыцьцёвая сталасьць і дабрадушны скептыцызм набліжаюць пазыцыю аўтара да постмадэрнісцкае, хоць Дранько-Майсюк ні

пост-, ні мадэрністам ніколі ня быў. Гэта хутчэй адбітак часу. Яго вершы вельмі часта здаюцца свабоднаю нязмушанаю гульнёю ў словы, занатоўкамі для сябе, а вэрлібры - нават празаічнымі маргіналіямі.

У пляне іранічнага сьветаўспрыняцьця Гумянюк быў адзіным маім калегам, які сьледаваў «запаветам постмадэрнізму». Аднак ён ніколі не вылучаўся ні тэарэтычным пурызмам, ні асаблівым тэрміналягічным пэдантызмам - яго больш цікавіў «розгалас», абстрактная «альтэрнатыўнасьць», таму ў яго сумяшчаліся як бы розныя пазыцыі: і рамантызаваны дэкаданс, і газэтная дыдактыка.

У крытычных тэкстах Гуменюка, дарэчы, згледжваецца нейкае асаблівае замілаваньне мілітарнымі вобразамі і найменьнямі: «Рыфмаваная атака» (1990), «Постмадэрновы прарыў» (1994).

Толькі наперад! Па ўсім фронце! А фронт гэты цягнецца ад глыбока чалавечных абстрактна-рэлігійных імпрэсій (Едрусь Мазько) да сацартаўскіх канцэптаў (Юрась Пацюпа), ад вершаванай надзённай публіцыстыкі і стылізацыі пад народнае (Андрэй Пяткевіч, Юры Карэйва) да тонкае іроніі і адкрытага зьдзеку.

У часы, калі «рыфмаваная атака» ўсё ж учыніла «постмадэрновы прарыў», Гумянюк надумаўся заняцца тэорыяй і папрасіў пачытаць што пра постмадэрнізм. Тады частка маёй бібліятэкі перавандравала да яго.

Тэрмін «постмадэрнізм» паступова так глыбока ўкараніўся, што пачаў пладзіць сваіх двайнікоў. Прыкладам, у мяне (успомнім падобнае ў Аркуша): «І ўсё ж у каштоўнасным сьвеце аўтар застаецца рэалістам, ці, дакладней, пострамантыкам, у новай кнізе гэта вызначылася канчаткова».

Або ў Андрэя Пяткевіча (1993): «Я хаця лічу сябе постверніkам, але «Бог» заўсёды пішу зь вялікай літары».

«КОЛА» І МІКОЛА

Асобнае гаворкі вымагае мэзальянс «Дыягену» з універсытэцкаю матрыцаю «Наднёманскія галасы» (яна пэрыядычна ўзнаўляецца). Пад канец 1989 году новы куратар «Галасоў» Мікола Мікуліч стаў чынна адраджаць занядбанае Міхасём Губярнатаравым літаб'яднаньне. Туды ён запрасіў і ўсіх «дыягенаў» (былых «галасоў»). Мы павагаліся, павагаліся - і ўрэшце пагадзіліся. Мэзальянс атрымаўся плённы, але досыць трагічны. Калі б мы не вярнуліся ў «Галасы», яны так і засталіся б банальнаю, вялаю суполкаю паслухмяных студэнцікаў. Ніякая куратарская актыўнасьць не стварыла б зь нічога нешта. А так - упершыню за ўсю гісторыю ГрДУ - «Галасы» «загучалі».

Прыпісваць гэта ў заслугу Мікулічу, які прыйшоў на ўсё гатовае, проста сьмешна. Быць добрым выкладнікам універсытэту - яшчэ ня значыць мець харызму літаратурнага лідэра. Што ён мог нам даць? Ад кіраўніка літаб'яднаньня патрабавалася толькі адно: арганізацыя выступаў у самых розных аўдыторыях і лабіяваньне ў рэктараце літаратурных праектаў.

Усім гэтым і апекаваўся Мікуліч, які, сваім парадкам, атрымліваў шанец заявіць пра сябе. Што б ён сёньня ні гаварыў пра сваю бескарыснасьць, гэта ня так. Сьведчаньнем таму - публікацыі ў газэце «Гродзенскі універсітэт», дзе ён строга пільнаваў «шапку» «Наднёманскія галасы» і калі-нікалі як падзагаловак да «шапкі» вялікімі літарамі падаваў сваё імя, а слова «Дыяген», як мог - адсейваў. Так ніхто не рабіў ні да яго, ні пасьля.

Мікуліч усе нашыя «грандыёзныя» праекты насычаў другараднымі вучнёўскімі творамі, а пры патрэбе - шукаў сабе апірышча сярод гэтых другарадных, залежных ад яго, часамі расейскамоўных аўтараў. Тактыка нашага куратара - яскравы прыклад паводзінаў улады: абапірацца на менш самастойных дзеля кантролю за больш самастойнымі. Ці ня тое самае сёньня робіцца ў дзяржаўным маштабе?

«Дыягены» ад мэзальянсу з «Наднёманскімі галасамі» прайгралі больш, чым Мікуліч: мы засталіся зь мінусам, а ён -

толькі з нулём. Усе нашыя зборнікі - і «Шлях», і «Кола» - абярнуліся сьмецьцем. Ніхто з тых, каго цягнуў з усяе сілы куратар, так і ня стаў паэтам. Затое іх «вучнёўства», нібы тая лыжка дзёгцю, перакрэсьліла гэтыя выданьні. Доўгачаканае «Кола» выйшла яшчэ горшым за «Шлях», афармленае ў стылістыцы «Маладосці» 50-х гадоў і неахайна ўкладзенае. Гэта якраз была тая правінцыйнасьць, якая паглынула першую хвалю беларускага постмадэрнізму. Надрукаваўшыся ў «брацкай магіле», я ўжо ня мог тыя самыя вершы даваць у часопісы.

Аднак сьветлых момантаў было нашмат больш. Універсытэцкае кола паэтаў (неістотна, як яго называць) грымела сваімі выступамі па ўсёй Гародні і пазбывала сну многіх партыйных кіраўнікоў. Асабліва «страшна» гучалі палітычныя вершы Андрэя Пяткевіча, ці - «баевікі», як ён іх сам называў. Раздражнялі і выклікалі крыўду эпатаж Гуменюка, цьмянасьць Мазько і іронія аўтара гэтага «мэмуару». Асабліва шмат гоману нарабіў выступ у Доме палітасьветы перад камсамольска-камуністычным актывам.

Даходзіла да сьмешнага. Помніцца, адна дама, што пісала лісты ў час выступу, асабліва абуралася, калі да яе Едрусь Мазько зьвярнуўся - «пані». А пра Андрэя Пяткевіча неўзабаве пусьцілі плётку, быццам гэта незаконна народжаны сын Аляксея Пяткевіча - відаць, не падумаўшы, што байструкі звычайна маюць іншыя прозьвішчы. Зрэшты, доля сярмяжнае праўды тут была, бо Андрэй вучыўся ў Аляксея Міхайлавіча і мог лічыцца яго духоўным сынам.

Але ці не найбольшым дасягненьнем «Дыягену» было выданьне «Кола», спэцвыпуску «ГУ» (ня блытаць з аднайменным зганеным зборнікам). Выхад «Кола» таксама меў сваю перадгісторыю.

У 1988 годзе ад папулярнага клюбу «Паходня» аддзялілася найрадыкальнейшая група моладзі і, разам з Данутай Бічэль-Загнетавай, стварыла суполку імя Максіма Багдановіча (пры ягоным жа музэі). Што б сёньня ні казалі пра «раскольнікаў», але менавіта суполка стала выдаваць першую ў Гародні незалежную газэту «Рэанімова». Зь сяброў «Дыягену» ў суполцы

Багдановіча чыннымі ўдзельнікамі былі толькі мы з Эдзікам Мазьком. Гумянюк цураўся палітыкі, а Андрэй Пяткевіч жыў у Гародні нерэгулярна. «Рэанімову» мы і хацелі зрабіць рупарам новага мастацтва. Але перавагу ў суполцы мела чыста палітычнае крыло на чале з Данутай.

Пад канец 1989 году ўрэшце дамовіліся, каб зрабіць мастацкі выпуск газэты. Аднак перасварыліся дзеля дызайну. Я абразіўся і адышоў ад суполкі, дзе, зрэшты, ужо зьявіўся Алесь Чобат і стаў адыгрываць вызначальную ролю. Чобат, зорка тагачасных мітынгаў, ні зь сяго ні з таго стаў яшчэ і вершы папісваць. Мы ж яго ўспрымалі няйначай як нэафіта-адраджэнца і застарэлага пачаткоўца ў паэзіі, які лезе не ў сваю дзялку.

Вось жа, не прабіўшыся ў незалежнай газэце (асобныя публікацыі не ідуць у разьлік), мы, з дапамогаю Мікуліча, дабіліся неверагоднага - літаратурных спэцвыпускаў унівэрсытэцкай малатыражкі («Органу рэктарату, парткаму, прафкамаў, камітэту камсамолу»!). Балазе, за рэдактара тады стаў Сяргей Лаўнік, учорашні выпускнік журфаку і ўдзельнік менскіх літаратурных тусовак.

У мяне ўжо даўно сьпела абурэньне, што нашыя часопісы, супраць іншых саюзных, неахвотна публікуюць беларускую філязофскую спадчыну і мала ўзычваюць месца новай літаратуры. Спачатку мне ў «ГУ» ўдалося апублікаваць пастыча, скампіляванае з розных тэкстаў Максіма Багдановіча, потым - урыўкі зь дзёньніка Казімера Сваяка. Спэцвыпуск «Кола» я задумваў на ўзор памянёнага «Гуманитарного фонда». Аднак спраўдзіць задуму ўдалося толькі пасьля майго ад'езду ў Менск. Таму рэдагаваць «Кола» стаў Гумянюк, хоць удзел іншых сяброў быў ня меншы.

Мікуліч (хвала яму за «Кола») і тут пасьпеў нашкодзіць. Ён сілком стаў усоўваць у выданьне нейкія расейскамоўныя прэтэнцыёзныя вершы - як аказалася, свае жонкі. Потым распачаў вайну з Гуменюком за публікацыю нібыта «антыэстэтычнага» вершу «Кавалер». Мой тэлефон у Менску разрываўся ад званкоў Андрэя Пяткевіча. Давялося нават ехаць у Гародню ў якасьці трацейскага судзьдзі і, за падтрыманьне Гуменюка, назаўсёды нажыць нянавісьць Мікуліча.

Аўтэнтычнага «Кола» з арыгінальным шрыфтам загалоўку, зробленым Алесем Аўчыньнікавым, выйшлі толькі тры нумары. Далей Мікуліч адхіліў Гуменюка ад рэдагаваньня і даручыў справу расейскамоўнай паэтцы Кацярыне Канчэўскай. У чацьвертым выпуску зьявілася шапка «Наднёманскія галасы», псэўдагатычны загаловак і дарэшты памяняўся склад удзельнікаў. Але такое «Кола» нікому не было патрэбнае. І зусім перапынілася. Ну, чысты холдынг!

І ўсё ж, кароткае жыцьцё «Кола» - адно зь дзівосаў перабудовы. У ім апрача гарадзенцаў друкаваліся Мікола Касьцюкевіч, Сяржук Мінскевіч, Алесь Аркуш, Ігар Сідарук, Анжаліна Дабравольская, Вольга Акуліч, Вітаўт Чаропка, Зьміцер Санюк, Вера Бародзіч. Ня ведаю, ці чытаў хто з заснаваньнікаў укладкі «ЗНО» наш спэцвыпуск, але менавіта «Кола» было правобразам «ЗНО». Менавіта тады «завязваўся» зьвяз Полацку і Гародні, які даў беларускай літаратуры ТВЛ і часопіс «Калосьсе».

ІЗАЛЯЦЫЯ ЦІ ДЭЗІНФЭКЦЫЯ?

З усіх эстэтычных дыскусіяў за апошнія пятнаццаць гадоў ці ня самымі цікавымі былі дзьве: распачатая ў 1988 годзе Леанідам Дранько-Майсюком - для сябе ці грамадзтва піша паэт - і ўчыненая ў 1998 годзе Сяргеем Дубаўцом наконт савецкае літаратуры.

У артыкуле «Ружовы туман» Дубавец разьвіў свой колішні тэзыс аб тым, дзей, чым больш савецкасьці ў літаратурным творы, тым менш беларускасьці, і наадварот. З грунту - лепш і ня скажаш, але ў прыватнасьцях усё значна складаней. Ня ведаю, наколькі дакладна я пераглумачваю аўтара, але мяркую, што ён паставіў чыста мэханічнае заданьне: аддзяліць авечак ад казлоў, сьвятло ад цемры, савецкіх пісьменьнікаў ад несавецкіх, камуністычныя творы ад некамуністычных. Ці можна гэтага дабіцца? І што мы меціме у выніку?

Аўтар ілюстраваў свае высновы цытатамі з твораў, дзе гаварылася пра Леніна, Партыю, Кастрычнік. Але няўжо да тых

моўных знакаў зводзіцца савецкасьць? Яна залягае значна глыбей і, да гэтае пары непераможаная, дасюль душыць усё беларускае.

Савецкасьць зьява шматаспэктавая. Гэта ня толькі суцэльны нэгатыў, гэта пэўны пазытыў з сваімі ўласнымі правіламі гульні. Прыкладам, твор Максіма Лужаніна «Права на верш» нічога ні пра Леніна, ні пра партыю ня ўтрымлівае, але ён больш савецкі, чым славутая ода Аркадзя Куляшова «Камуністы». «Права на верш» - гэта свайго роду эстэтычны маніфэст сацрэалізму, савецкая філязофія творчасьці, па-свойму цікавая, але для мяне непрымальная.

Пазыцыі ўдзельнікаў дыскусіі можна было б зьвесьці да аднае апазыцыі: ізаляцыя ці рэабілітацыя сацрэалізму. Апошняе, зразумела, не падлягае аспрэчваньню. Ізаляцыя ж як пэўная праграма вымагала б уперад сэлекцыі, што зьвяло б намарна ўсе стараньні «сэлекцыянэраў». Больш за тое, яна пагражала б утоенай, яшчэ небясьпечнейшай формай рэабілітацыі. Аднак прынцып tertium non datur у лёгіцы даўно ўжо ня лічыцца безумоўным. І было ў нашае літаратуры tertium quid - шлях, пра які я тады не знайшоў часу напісаць. Які імпліцытна прапаноўваўся стратэгіяй гарадзенскага сацарту, шлях дэзінфэкцыі.

Сацартаўская дэзінфэкцыя, наадварот, даўнімала папярэднюю хай сабе не рэабілітацыю, але ж - легітымацыю сацрэалізму, улучэньне яго ў традыцыю як аднаго з этапаў, і паступовае зьвядзеньне да абсурду. Абяртаньне ўнявеч - дустам, аршэнікам, фэнолам, хлёрам, іроніяй. Каб пра сацрэалізм калі і ўспаміналі, дык толькі як пра «сьмешнага дзядзьку», кулдыяша нейкага, «вусатага пая». Змагацца, урэшце, трэба ня з тэкстамі, а з ідэалёгіяй у галовах. Дурныя галовы / матляюць вушамі / матляюць вушамі / дурныя галовы (А. Пяткевіч).

На жаль, брак належнае інфармацыйнае прасторы, нашая адзінота, нявызначанасьць ды інэртнасьць не спрыялі расчышчэньню трэцяга шляху. Няйначай, бракавала ў нашым коле Андрэя Хадановіча.

Між іншым, неяк Адам Глёбус папрасіў у мяне вершы для

«Крыніцы», я даў яму постмадэрновую падборку, дзе быў і сацарт. Аднак мой постмадэрнізм «зарэзаў» Сідарэвіч. І раптам дзіва, якога не магу растлумачыць дагэтуль: у «Крыніцы» зьяўляюцца мае больш раньнія, «авангардныя» вершы, а яшчэ празь які час сацартаўскае «Мы» з «зарэзанае» падборкі, з належнаю савецкай атрыбутыкай, усплывае ў «Навінах БНФ».

Гаворачы пра сацарт - я маю на ўвазе «нелінейны» сьцёбавы сацарт як пэўнае адгалінаваньне канцэптуалізму. Ня раз ужо выказвалася думка, што на постсавецкай прасторы, дзе ролю мадэрнізму адыгрываў сацрэалізм, іншае рэалізацыі постмадэрновае ідэі і быць не магло. А бяз пэўнае базы, без сацыяльнага мастацтва ці г. зв. «грамадзянскае паэзіі», сваім парадкам, які ж сьцёб? У Беларусі традыцыі лінейнага, часамі нават кінжальнага сацарту вялікія. Досыць толькі ўспомніць Цётку, вершы якой шырыліся як праклямацыі:

Трэ' зьлізаць усіх міністраў,
Бюракратаў, антыхрыстаў.
Чую яшчэ голас зь неба,
Што цара павесіць трэба!

За савецкаю ўладай сацыяльнымі матывамі насычаецца нават лірыка. Узьнікае такая адмысловая форма радковае кампазыцыі, як «слоены пірог», дзе чыста лірычныя радкі межаваліся зь лёзунгамі, як, прыкладам, у Дубоўкі:

У даліны зьвіваецца змрок,
быццам кужалем выслана поле.
Пазлацістай убраны зарой,
не зацьміцца штандар наш ніколі.

Пазьней у Александровіча лірычны «слой» зусім зьнікае, ад паэтычнае ўмоўнасьці застаецца толькі «авангардызаваная» графіка:

Лёзунгаў мітынг
у акопы
бег -
зь візай культпропу
ЦК КПБ.
.....
А ў 10 год
закон -
3600 дзён.
.....
І пяе наўсьцяж
наш
Сель-
маш.

(Ну чысты Вішнёў! Толькі не афрыканскі, а савецкі.)

І, нарэшце, у Броўкі рыторыка панэгірычна-канформнага сацарту выкшталтоўваецца і дасягае абсалютнае «празрыстасьці» формы як чыстае ідэалёгіі, ці, інакш, тае «рафінаванасьці» абазначальнага, пра якую так марыў Ралян Барт:

Зямлю асьвятляе праменны усход.
Непераможны савецкі народ
Выйшаў ў апошні рашучы паход,
У сэрцаў імклівы, высокі узьлёт -
Камуны жаданай ясьнее прыход...

Які непаўторны і радасны час -
Сталін наперадзе нас!

У часы перабудовы Пімен Панчанка адраджае традыцыі кінжальнага, толькі куды лагоднейшага як у Цёткі, сацарту:

Тармажэньне, тармажэньне
І чыноўніцкі разбой.
Быццам зноў мы ў акружэньні
І вядзем сьмяротны бой.

Старэйшае пакаленьне беларускіх пісьменьнікаў, выхаванае на эстэтыцы «казаць праўду», на эстэтыцы «шчырасьці», пайшло за Панчанкам, але ня мела такой адвагі і выглядала блякла і другасна. Яны не разумелі, што іх творы ад гэтае «праўды», «надзённасьці» толькі прайгравалі. Сталі менш паэтычнымі супраць застойных пэйзажных элегіяў і нікога не палохалі, не чаплялі на тле куды дзяйсьнейшае газэтнай публіцыстыкі. Адным словам, цэлыя гады марных высілак! Іх паэтыку адзін з аўтараў тае ж «Даугавы» называў «псэўдапазыцыяй нігілізму», калі сацрэалізм цьвічыць самога сябе.

Тут мог дабіцца дадатнага выніку толькі першы і самы адважны. Але нішу першага ўжо заняў Панчанка. Пра яго тады адныя гаварылі як пра вяршыню паэзіі. Іншыя, наадварот, казалі - маўляў, Панчанка сьпісаўся, але надумаў хоць гэтак скарыстаць свой аўтарытэт і прынесьці карысьць. Зрэшты, і Панчанку ў цытаваным вершы даводзілася тарнаваць эпіграф зь Леніна. Зьдзіўляцца ня варта, бо Ленінам як таранам карысталіся ці ня ўсе: і Зянон Пазьняк, і Міхась Ткачоў, і Ўладзімер Конан. Такі быў час. Хоць гэта аслабляла напругу. Нездарма канцоўка цытаванага вершу гучыць двухсэнсоўна, нагадваючы жанр «лістоў да правадыра»:

Дарагі наш Гарбачоў,
Трэба рэвалюцыя!

Але быў паэт, шчыры пераемца кінжальнага сацарту Цёткі, «баевікі» якога было слухаць страшна (і адразу ж - вельмі сьмешна). Гэта Андрэй Пяткевіч. Ніхто з мора тагачасных палітычных аўтараў ня ўмеў гэтак трапна знайсьці адзіна патрэбныя словы і ўбіваць іх, як цьвікі ў труну:

Над нашай краінаю свастыкай зорка.
Партыйнай маною паветра прагоркла.
Свабода у межах калючага дроту,
Хіба ж нам дадуць камуністы свабоду?
У Рыме сусьветным, у тым маўзалеі,
Шкляная труна, там вампір акалелы.

Або:

Сьвята, імпэрскае сьвята,
Танкі на пляцы равуць.
У лягер, у турмы, за краты
Вядзе нас «октябрьскій путь».

Вершы Панчанкі на тле Пяткевіча адразу бляклі. Мала таго, пісаць падобнае, прыкладам «Оду Сахараву», Андрэй пачаў яшчэ школьнікам, у часы застою, зыскаўшы заразом і права першасьці. Адно што адважылася надрукаваць «такога» Пяткевіча толькі «Рэанімова». Дарэчы, нават радкі пра мову ў абодвух паэтаў пераклікаюцца.

Панчанка (1987):

Мілей мне «кнігаўка», чым «чыбіс»,
Бо голас кнігаўкі ў душы.

Пяткевіч (1986):

Стала зязюля
Звычайнай «кукушкай»,
«Птицами» сталі
Прыгожыя птушкі.

Гартаю анталёгію «Краса і сіла», укладзеную Скоблам, і дзіўлюся: аказваецца, абодва паэты, і стары і малы, памерлі ў адзін год, год антымоўнага рэфэрэндуму. Ці спадзяваўся гэтага Панчанка, пішучы:

А мову ледзь не затапталі
І асьмяялі, як раней.
А вы ў народу запыталі,
Якая мова нам радней?

У Пяткевіча нават гэтая зьбітая тэма выбівае сьлёзы з вачэй:

Родная мова -
Як лёд напрадвесьні.
Што крыгі на Нёмне -
Народныя песьні.

Аднак калі нясьцёбавы сацарт Панчанкі гучаў так:

Мы кормім бульбай паў-Расіі,
Шлём сала, мяса і алей,

дык сьцёбавы, аўтара гэтых радкоў, гэтак:

Тут бульба гнілая
расла на балотах,
а зараз шчасьлівы
і радасны час.

Каб як мага яскравей праілюстраваць розьніцу паміж «лінейным» і «адваротным» выказваньнямі, прытачу два санэты. Першы зь іх, друкаваны ў «Кантролі» «Тутэйшых»,

належыць Алегу Мінкіну, другі, друкаваны ў «Рэанімове», - мне. Верш, каб быць паэтычным, мусіць замыкаць у сабе супярэчнасьць, несьці нейкі парадокс. Лінейнае выказваньне нясьцёбавага сацарту ўнутры бесканфліктнае, адсюль яго непаэтычнасьць. Аднак апошняга ня скажаш пра санэт Мінкіна. Ён не такі просты, як падаецца адразу. Канфлікт і парадокс тут вынікаюць з розьніцы паміж дэкадэнцкім і адраджэнскім дыскурсамі. Канфлікт жа сьцёбавага сацарту палягае ў яго іроніі, неадпаведным тарнаваньні таталітарнага дыскурсу.

Самота (1989)

Мне рэжа слых хлусьня прамоў траскотных,
Мне сьлепіць вока яркасьць кумача -
Даўно мне ўсё абрыдла, апрача
Маўклівай непрытомнасьці самоты.

Ды ўсё ж, калі б у цішыні дрымотнай
Турыны рог прызыўна загучаў
І на лязе узьнятага мяча
Запалымнелі водсьветы паходняў -

Я ўсе сумненьні адгарнуў бы разам
І стаў пад белы сьцяг з чырвоным пасам,
Пад бел-чырвона-белы вольны сьцяг...

Чырвоны пас на белым тле Радзімы,
Ты клічаш нас за волі міг адзіны
Узьняцца і загінуць без разваг!

Санэт майго шчасьлівага савецкага дзяцінства (1990)

Палае сон пра дальныя краіны,
і пяцікутнае сьвятло зьвязды
на подушку ліецца, паязды
злучаюць мары у саюз адзіны;

вось сацрэалістычная карціна:

цьвітуць, нібы працоўны май, сады,
на палатне сьмяецца праз гады
ў пракураныя вусы дзед Скарына.

Ах, мне і сорамна і страшна жыць,
бо я ня ўмею партыі любіць,
бо я нічога іншага ня ведаў;

а на гумовай трактарнай хадзе
праз стэпы атамная лодка едзе -
ад нас гасьцінцы ў камунізм вязе.

ДАРОГАЮ ПЕРАМОГ І РАСЧАРАВАНЬНЯЎ

Увосень 1990 году, пасьля шлюбу з Анжалінай Дабравольскай, на цэлыя два гады я стаў жыхаром беларускае сталіцы. На маім вясельлі, а потым яшчэ на чарговым ісламчаўскім сэмінары, гарадзенская і менская літаратурныя тусоўкі добра перазнаёміліся, паклаўшы пачатак супрацы ў «Коле» і г. д. Прыехаў я поўны імпэту несьці постмадэрнізм «у народ». Аднак на той час чыннае і жорсткае літаб'яднаньне «Тутэйшыя» вытхлася. Заставалася неакрэсьленая тусоўка «Крыніцы» пры «Чырвонай змене».

Алесь Масарэнка не шкадаваў ні часу, ні сілаў на сваё стварэньне. Ён паказаў сябе добрым дыпляматам і здолеў у «Крыніцах» падначаліць сабе літаратурны працэс. Пра тактыку яго дзеяньняў (з пэўнаю доляю жарту) можна сказаць так: ён разбэшчваў маладых друкаваньнем. У выніку гэта дало цэлае пакаленьне літаратараў, але, як той казаў, моцна занізіла «планку» вартасьці літаратурных тэкстаў. Постмадэрновым праектам было сказана па-тутэйшаму: асадзі назад. А дакладней - «калі ласка, толькі на агульных пачатках. З пачаткоўцамі і аксакаламі». Але існавалі іншыя формы жыцьця ў літаратуры.

Неяк на беразе Сьвіслачы, каля дамка РСДРП, я сустрэў свайго калегу па гарадзенскай alma mater, літаратуразнаўцу Зьмітра

Санюка. Ён быў зь нейкай асьпірантачкай з Акадэміі навук. Мы шпацыравалі ўздоўж бэтоннага парапэту і заўзята спрачаліся. Асьпірантачка з аплёмбам, уласьцівым толькі работнікам Акадэміі, і з правінцыйна-кансэрватыўным патасам, уласьцівым ня толькі работнікам гэтае ўстановы, даводзіла мне, што я моцна адстаў ад жыцьця. Што ад постмадэрнізму на Захадзе даўно ўжо адмовіліся.

- І што там цяпер у модзе? - зьедліва пытаўся я.

Асьпірантачка нічога выразнага сказаць не магла. Зь яе слоў выходзіла, дзей перамог, як заўсёды, рэалізм.

- Ну-у, гэта мы ўжо ведалі. У казках заўсёды перамагае дабро. У шчырых сяброў - дружба. А ў савецкай (і беларускай акадэмічнай) тэорыі літаратуры заўсёды перамагае рэалізм.

Тутэйшае «шапказакіданьне», скіраванае толькі на тое, каб нічога не мяняць, ды ўбіванае ў галовы такім асьпірантачкам і ўсякім іншым «маладым паэтам», раздражняла да скрыгату зубоў. Зрэшты, ня ўсё было так безнадзейна.

У «новай генэрацыі», як нас усіх ахрысьціў Алесь Аркуш, заўжды выразна адчувалася памкненьне да «абстрактнай авангарднасьці». А разуменьне постмадэрнізму прыжывалася нялёгка. А прыжыўшыся - не заўсёды адпавядала сваёй «генэральнай лініі».

Помніцца, на менскую кватэру, дзе мы жылі з Анжалінай Дабравольскай, завітаў у госьці Серж Мінскевіч. Пакуль Анжаліна бавілася на кухні, мы ў цесным пакойчыку, абстаўленым кнігамі, распачалі спрэчку. Хто хоць раз спрачаўся зь Сержам, ведае, якая гэта нялёгкая справа...

Я даводзіў, дзей авангардная пазыцыя страціла актуальнасьць.

- Ну добра, добра... - распаляўся Серж, - а чым твой постмадэрнізм прынцыпова розьніцца ад авангарду?

Даводзілася ўжо раз трэці паўтараць довады пра цытатнасьць, іронію, эклектыку, сымулякры, цэнтоны і іншую падобную

біжутэрыю. Пра адмаўленьне ад устаноўкі на арыгінальнасьць і аўтарства... Пра патрэбу зважаць на сацрэалістычны кантэкст...

Ня ведаю, ці пераканаў я тады Сержа хоць у чым. Пэўна што не. Але праз чатыры гады, сустрэўшыся ў Полацку на тэвээлаўскай канфэрэнцыі, мы выявілі, што крыху памяняліся ролямі. Серж быў ужо заўзятым прыхільнікам постмадэрнізму, а я ўздумваў, як бы гэта пахіліць беларускую літаратуру ў бок Высокага Акадэмізму. Але пра гэта пазьней.

Вярнуўшыся ў 1992 годзе пасьля Менску ў Гародню і стаўшы на працу ў Гарадзенскі ўнівэрсытэт, я адразу ж прапанаваў, і вясною 1993 году прачытаў адумысны спэцкурс «Постмадэрнізм і беларуская культура». Хіба што гэта быў першы ў Беларусі спэцкурс з постмадэрнізму (і, адначасна, мой першы крок на ніве вышэйшае школы). Але праз год ад імпэту мала чаго засталося. Я зразумеў, што прыкладаў да тэмы мала, а прапагандаваць сумнеўныя ідэі ня варта. І вось толькі ўзімку 2003/04 году я вярнуўся да нашае тэмы і прачытаў спэцкурс «Мадэрнізм і постмадэрнізм у гісторыі беларускае культуры». Калі першы зь іх больш арыентаваўся на пашырэньне сусьветных дасягненьняў і прызначаўся для філёлягаў-беларусістаў, дык другі быў адрасаваны гісторыкам і абапіраўся на больш шырокі абсяг фактаў беларускае культуры. Гэта пэўным парадкам ход ад маніфэсту да падсумаваньня.

Постмадэрнізм «крыху памёр» для мяне як уласная практыка ўжо пасьля першага спэцкурсу, бо ўсё, што становіцца здабыткам акадэмічнага вывучэньня, «крыху памірае». Я ніколі тады ня думаў вось пра гэткае адраджэньне ў выглядзе дыскусіі. Але сьмерць яго не была канчальная.

У траўні 1993 году ў Гародні адбывалася канфэрэнцыя «Рым-IV». Паседжаньні канфэрэнцыі праходзілі ў памяшканьні тэатру Тызэнгаўза. А ў перапынках мы выходзілі на двор і адразу траплялі ў парк Жылібэра. Тады Ігар Бабкоў падпісаў мне свой зборнік: «Аднойчы ў Гародні ў доўгі-доўгі дзень». Ігар, я і Анжаліна Дабравольская блукалі ў парку і гутарылі пра ўсё, што нас хвалявала. У тым ліку і пра сучасную літаратуру. Ня раз загаворвалі пра постмадэрнізм. І тады Ігар прапанаваў

цікавую рэч:

- Трэба ствараць міт Гародні як постмадэрновага гораду.

Пасьля дадаў:

- Толькі старацца не ўжываць слова «постмадэрнізм».

Сумняюся, ці помніць хто яшчэ з удзельнікаў гутаркі гэтыя словы... Але праз кароткі час усё памянялася.

Сумоўе з культураю ў чалавека такое самае, як і з асобамі. Суразмоўцы дзеляцца на два тыпы: згодлівыя і спрэчлівыя. Першыя, нават калі ня згодныя, падладжваюцца пад вас, шукаюць пункты паразуменьня. (Я, здаецца, пры ўсёй сваёй няўступлівасьці, адношуся да першых.) А спрэчлівыя, нават пры агульнай згодзе, нешта пярэчаць вам, нешта ўдакладняюць. Ігар Бабкоў адносіцца да другога тыпу. Ты пачнеш сьцьвярджаць гэта, а ён - тое, ты - тое, а ён - гэна, і г. д.

Дык вось, ці не праз год, у Менску, можа, на прэзэнтацыі часопісу «Калосьсе», можа, на ўшанаваньні «Гліняным Вялесам» Ігара Бабкова тэвээлаўцы, асабліва Юры Гумянюк, шмат гаварылі пра постмадэрнізм, пра супраціў СП ды сацрэалізму. Ігар выступіў ад імя «Нашае Нівы» і ў досыць катэгарычнай форме заявіў аб заўчаснасьці постмадэрнізму на беларускім абшары ды аб сваёй прыхільнасьці да авангарду. Заразом падкрэсьліў пазытыўнасьць, а не нэгатыўнасьць, нашаніўскае праграмы супраць тэвээлаўскае.

Такая мэтамарфоза мяне крыху зьдзівіла, але ня надта... Бо для запраўднага мастака падпяваць таму, што стала агульнапрынятым, як кажуць расейцы, «в падлу». Адно што нэгатывізм, гнаны Бабковым празь дзьверы, улез тут праз акно.

Прыкладна тады, у час «Рыму-IV», я выступіў з дыскусіяй у «ЛіМе» з тэкстам «Да традыцыі». Вусная рэакцыя калегаў-літаратараў на гэты артыкул была вельмі жывая. Для мяне ж той тэкст станавіў сабою пачатак пералому і першага публічнага разьмежаваньня з постмадэрнізмам. Залозка адразу згледзеў новы ўхіл і запытаўся неяк пры нагодзе:

- Па-мойму, гэты артыкул пост-постмадэрновы?

Я пагадзіўся, усьцешаны, што галоўнае не прамільгнула незаўважаным.

Чаму ж мне постмадэрнізм раптам так спракудзіў?

Калі адбываўся развал камунізму, дык увесь комплекс антыэстэтызму, які нёс з сабою «лагодны» постмадэрнізм - у большай ступені, чым «хуліганаваты» авангардызм, - быў дарэчы. А пазьней я заўважыў, што замест абяцанае «дэканструкцыі» постмадэрнізм нясе «дэструкцыю».

Расейскі «Гуманітарный фонд» усё больш і больш паўтараўся. Адзін зь яго аўтараў, Баніфацы, пісаў прыкладна гэткія тэксты: «Я вельмі люблю хезаць... Вось хезаў бы і хезаў!» Пазьней, на тэвээлаўскай канфэрэнцыі ў Полацку, я меў гонар пазнаёміцца з стваральнікам маскі «Баніфацы». Тады аўтар пасьпеў разьвітацца з сваім героем і пачаў пісаць паліндромы. Але «ГФ» мяне ўжо не цікавіў.

Ня надта моцна адставаў ад Баніфацыя і гарадзенец Юры Гумянюк. Яшчэ ў легендарныя дыягенаўскія часы, нібы прачуваючы нешта такое, у прадмове да вершаў Гуменюка я гэтак асьцярожненька адмежаваўся ад яго эстэтычнае пазыцыі:

Пры татальным выраджэньні густаў дылема «падабаецца - не падабаецца» абсалютна нічога не выракуе. Таму я ўстрымаюся ад выказваньня свайго гледзішча, абмовіўшыся, што мае густы крыху кансэрватыўнейшыя, чым аўтаравы. Гэтыя вершы халодныя, як жыцьцё па сьмерці. Яны альтэрнатыўныя ўсебакова, нават у дачыненьні да лірызму. І такая якасьць зь цягам часу праяўляецца ўсё больш пасьлядоўна.

Ведама, ці варта зважаць на ўсе выдаткі кірунку. Але постмадэрнізм ня спраўдзіў галоўнага ўскладанага на яго спадзяваньня - наўзамен унівэрсалізму XVIII-XIX стагодзьдзяў пад сьцягам плюралізму пашырыць мультыкультуралізм XX-XXI стагодзьдзяў. І што ж, замест росквіту маргінальных культур

мы атрымліваем росквіт культуры маргіналаў. Усе заганы ранейшых часоў глябалізацыя толькі абвастрыла, і постмадэрнізм дапамагае ім як хваробе кашаль, калі не сказаць горш.

Гэта я пачынаў разумець яшчэ ў 1994-1995 гадох, калі Алесь Аркуш ладзіў літаратурныя канфэрэнцыі. Я браў у іх адумысна пасіўны ўдзел, ехаў, пачуваючыся вэтэранам постмадэрнізму, які сьведама адышоў ад «школы»: няхай моладзь бавіцца! Ведама, у мяне была, як я ўжо казаў, ідэя глыбока вынашанага Высокага Акадэмізму. (Цяпер я гэта называю прасьцей - нэаклясыцызм, а тады проста не хацеў паўтараць ведамую плынь украінскае паэзіі.) Але выступіць зь ёю сярод удзельнікаў, якія прыехалі разбураць «старызну», дзяліцца «авангарднымі» і «постмадэрнымі» набыткамі, - было б сьмешна. Я выглядаў бы выпадковым рэтраградам. Апрача кулюарных гутарак зь Сержам Мінскевічам у шэрым калідоры полацкага гатэлю, я падзяліўся сваімі думкамі зь Ігарам Бабковым.

- Нешта ты ня тое гаворыш, дзядзьку! - заўважыў мне Ігар.

Я горача аргумэнтаваў сваю паставу, на што атрымаў адказ:

- Ну дык рабі, раз так мяркуеш.

Ня вабіла мяне там, дарэчы, і лінія літаратурнага «нацыяналізму», якая брала пачатак з «Тутэйшых» і якую працягваў Славамір Адамовіч, прыдумаўшы свой чыста дэкадэнцкі «Правы Рэванш».

Што да нацыяналізму, дык не абышлося тут без анэкдотаў. Выступіў я ў спрэчках супраць масквіча Дьмітрыя Кузьміна, дзей няслушна ў літаратуразнаўстве пэдаляваць сэксуальную арыентацыю, бо гэта рэч пазалітаратурная. І патлумачыў праз мэтафару. Маўляў, з дрэва ці цэглы можна пабудаваць і прыбіральню, і храм, але для нас важнейшы не матэрыял, а функцыянальнае прызначэньне і стылістыка збудаваньняў. Гаварыў я, як і бальшыня, па-беларуску. Кузьмін не зразумеў, што такое прыбіральня, і перапытаў. Потым мы паселі ў аўтобусы і рушылі на абед. На выхадзе з аўтобуса падходзіць

да мяне Ігар Бондар-Тарэшчанка, што з Харкава, і кажа: «Во маскалі хамы! Прыехалі і паказваюць, што беларускае мовы не разумеюць».

Увечары вяртаемся тым самым аўтобусам з канфэрэнцыі ў гатэль. Ужо цёмна, і суседзяў не распазнаць. Сяджу і чую за плячыма голас Лявона Вольскага, да некага гаворыць: «Усё ж нам яшчэ бракуе выхаваньня. Вось Пацюпа. Бачыць, што чалавек з Масквы прыехаў. А не! Зьвяртаецца да яго па-беларуску». Во яны - украінскі «нацыяналізм» і беларуская «талерантнасьць»!

ВЕЧНАЕ ВЯРТАНЬНЕ І БЯСКОНЦЫ ТУПІК

Калі глянуць на рэчы глыбей, дык прыняцьце ці непрыняцьце постмадэрнізму залежыць ня толькі ад густаў, але і ад бачаньня гістарычнага працэсу. Першае некалі досыць яскрава выказаў Яўген Міклашэўскі, няўдольны куратар «Тутэйшых» (1989):

Будучыня нашай паэзіі схавана ў такім тумане, што разгледзець у ім што-небудзь проста немагчыма. Патрэбен нейкі новы сацыяльны зрух, бо ажыўленьне палітычна-грамадзкай актыўнасьці нефармальнага руху беларускай моладзі не паспрыяла ажыўленьню чытацкай цікавасьці да паэзіі.

Каб выжыць, паэзіі трэба зрабіць незвычайны скачок! Толькі ў чым? У адлюстраваньні духоўнага сьвету чалавека з адначасовым павышэньнем узроўню майстэрства і культуры мовы? Ці ў нечым іншым? Авангардызм - мастацтва для мастацтва, іншай альтэрнатывы няма.

А ў нас, здаецца, яшчэ не было «дзевятнаццатага стагодзьдзя» беларускай клясычнай паэзіі. Тады наперад - да клясычнай дасканаласьці.

Тыя самыя думкі, сказаныя тут пра літаратуру, праз чатыры

гады выказвае тэарэтык філязофіі Мікола Крукоўскі (1992):

Асьцярожнымі нам трэба быць і з сучаснай заходняй філязофіяй, і, можа быць, нават у большай ступені, чым з расейскай... Філязофія гэта... знаходзіцца зараз на зусім іншай, процілеглай па сутнасьці, фазе свайго разьвіцьця, чым тая, у якую толькі-толькі ўваходзіць беларуская філязофская думка, беларускі сьветапогляд.

...Нам лепш выпадае арыентавацца на вяршыні эўрапейскай культуры, а не на пэрыяды яе ўпадку... Залаты век Скарыны, век Асьветніцтва зь яго найвышэйшым пікам, філязофія Гегеля - вось тыя вяршыні, на якія нам трэба раўняцца...

Для нас зараз шкодныя (не магу, на жаль, знайсьці іншых слоў) эпігонскія эскапады супраць розуму і рацыяналізму, што гучаць часам з вуснаў мясцовых адэптаў «неклясычнага» мысьленьня.

Супраціўны пагляд, каб далёка не хадзіць, праілюструю сваімі колішнімі разважаньнямі (1992):

На сёньняшні дзень цяжка знайсьці культуру, якая была б абсалютна адмежаваная ад культуры сусьветнае. Таму кожная нацыя зьяўляецца ўдзельніцаю і складнікам адзінага сусьветнага кантэксту. Сытуацыя постмадэрнізму, характэрная для разьвітых краін Заходняе Эўропы ды Амэрыкі, у той ці іншай меры, ня можа не трываць і на Беларусі.

Або (1994):

Параўнаньне культур зь біялягічным арганізмам ня больш чым мэтафара, таму гаварыць пра «старыя» і «новыя» этнасы трэба вельмі асьцярожна. Лепш казаць аб «старэньні» зямной цывілізацыі. Наяўнасьць сусьветнага кантэксту вымушае старэць усе культуры, на якой бы стадыі разьвіцьця яны ні знаходзіліся. Гэтак званае «паскоранае разьвіцьцё» ёсьць ня што іншае, як уплыў сучаснасьці на новага суб'екта гісторыі.

Абедзьве пазыцыі выходзяць з двух розных кшталтаў гісторыі: цыклічнага і лінейнага. Неяк Гачаў прытарнаваў да іх унутраныя формы абазначэньня часу: расейскае 'время' (ад 'вертеть') і нямецкае 'Zeit' (ад zien - 'цягнуцца'). Іншых кшталтаў, на першы пагляд, нельга прыдумаць. Тарнаваная ў савецкай дыялектыцы сьпіраль (здаецца, упершыню ў Леніна ў «Філязофскіх сшытках») - гэта толькі кантамінацыя лініі і кола. Але ўнутраная форма беларускага слова 'час' (ад 'часаць', 'касіць') падказвае, што ёсьць трэцяя мадэль руху - броўнаўская. Першыя дзьве схемы гістарыцыстаўскія - прыкладам, цыклічную як «вечнае вяртаньне» тарнаваў Ніцшэ, лінейную намяркоўваў у сваім бачаньні гісторыі Маркс. Трэцяя - антыгістарыцыстаўская, яе мы прачытваем у выраку Попэра: «Гісторыя ня мае законаў».

У мяне заўсёды выклікалі сумнеў рознага кшталту цыклічныя канцэпцыі. Калі «наўчоны муж» пачынае на поўным сур'ёзе разважаць, падганяючы факты, на якой стадыі трывае сёньня беларуская культура, дык узьнікае такое самае няёмкае пачуцьцё, як і пры навукаватых прытарноўваньнях экзальтаванаю дамаю асаблівасьцяў вашага характару да знаку задыяку. Аднак гістарыцызму пазбыцца нялёгка. І ўсе мае колішнія разважаньні, дзей беларуская культура мусіць упісацца ці там «дагнаць і перагнаць» сусьветны працэс, нічым ня лепшыя. Знаёмства з Карлам Попэрам і Джорджам Бэрклі ў сярэдзіне 90-х добра ачысьціла мае мазгі ад эсэнцыялістаўскага рамантызму і гістарыцыстаўскіх утопіяў. Ці інакш: вывела зь бясконцага тупіку вечнага вяртаньня.

Трэба баяцца быць модным. Бо быць модным - гэта значыць заўжды адставаць, ісьці за некім. Мы былі модныя ў XVII стагодзьдзі, калі перапявалі схалястыку і картэзіянства, мы былі модныя ў XX стагодзьдзі, калі перапявалі марксізм-ленінізм. І будзем модныя зноў, засвоіўшы постмадэрнізм. Але гэта ня значыць, што мы не павінны быць «у курсе», што дзе робіцца ў сьвеце. Бо ведама, «прастата, якая не прайшла стадыі складанасьці, - прымітыў». І не павінны вечна вынаходзіць ровар, як гэта робяць расейцы.

А вяртаючыся да правінцыйнасьці, мушу ўрэшце прызнацца,

што з таго часу, як я стаў больш думаць пра, як казаў Ян Станкевіч, «нашыя заданьні» і пісаць менавіта пра іх, а рупіцца толькі пра беларускага чытача (бо француз найперш дбае пра французскага), я стаў адумысна культываваць правінцыялізм. У найлепшым сэнсе гэтага слова. Мару, каб увесь сьвет стаў адной (але не аднастайнай!) вялікай правінцыяй. І заразом асаблівае замілаваньне і цікавасьць маю да «кніг, якіх ніхто не чытае», кажучы словамі Платонава.

На тых тэвээлаўскіх канфэрэнцыях за столікам кавярні я з расчараваньнем даведаўся ад Ільлі Сіна, што Бум-Бам-Літ хоча ствараць гарадзкую літаратуру. І ня хоча сьледаваць традыцыі. Вось тут «мой постмадэрнізм» не супадае «па фазе» прынцыпова. Бо я, наадварот, усё жыцьцё зямлю (прабачце, кніжкі) грыз, каб быць больш традыцыйным, чым мае савецкія папярэднікі. А з горадам, думаў, пасьля «Тутэйшых» ужо разабраліся. Ажно не. Добра што хоць Купала не ствараў вясковае, а Багдановіч - гарадзкое літаратуры. Між іншым, гэта ня так цяжка. Магу даць пару рэцэптаў. Калі хочаце, каб у вас была гарадзкая літаратура, абавязкова пішэце пра ліхтары. А калі задумалі яе зрабіць у дадатак і інтэлектуальнаю, дык абавязкова напішэце, як вы п'яце каву. І чым меншымі глыточкамі вы будзеце піць каву, тым інтэлектуальней атрымаецца.

Заўжды ганаруся сваёю хутаранскасьцю і местачковасьцю. І мяне ніколі не пакідала мара зрабіць «вясковасьць» беларускай культуры яе «фірмовым знакам», якім можна ганарыцца, які служыў бы ўзорам для перайманьня (і будуць амэрыканцы // прыходзіць сакрэт пераймаць), а не «ганебным таўром». Як гэтага дабіцца? А вельмі проста: раз - навучыцца ганарыцца сваёю адметнасьцю, два - падмацаваць абраную пазыцыю інтэлектам. Наш сорам, і ня што іншае, ператварае вясковасьць у ганебнае таўро.

ЗЬВЯДЗЕНЬНЕ РАХУНКАЎ, АБО АПАЛЁГІЯ

Чаму сёньня мы так баімся казаць узвышаныя словы, пісаць

узьнёслыя вершы? Усё патанула ў іроніі. Іронія ператварылася ў сьцёб. Паэты ня пішуць, а «сьцябаюцца». Бо няма вышэйшага аўтарытэту. Няма эліты як клясы. Няма вяршыні, да якой хацелася б імкнуцца. Няма каму несьці адказнасьць за вышыню пачуцьцяў. Адным словам, сучаснае грамадзтва ня можа спарадзіць нічога падобнага да ўзвышанага, бо ня мае клясавай гіерархіі. І тэрмін «узвышанае» стаў непатрэбны ў эстэтыцы.

Дзіўна, аднак марксісты, якія больш за ўсіх крычалі пра клясавасьць, не зразумелі клясавасьці ў эстэтыцы. Адмаўляючы клясавасьць ды Бога, яны мусілі б адмовіць узвышанае, а разам зь ім - і мараль, і этыку. Гіерархія клясаў, на вяршыні якой ёсьць Бог, мае ня толькі эканамічнае, але і маральна эстэтычнае значаньне. Марксістам нічога не заставалася, як узаконіць «анахранізм» тэорыі і заразом абвяшчаць «прагрэсізм» на практыцы. У сучасным мастацтве няма яднальнага стылю, бо няма гіерархіі і аўтарытарнае ідэалёгіі. У лепшым разе ёсьць стылізацыя. У горшым - і таго бракуе. Яшчэ ў XIX стагодзьдзі замест нормы прыйшоў гістарызм. Менавіта ён зьеў стылі. Стылізацыя - гэта законнае дзіцё гістарызму.

«Буржуазнае» мастацтва падзялілася на масавае і элітарнае. Усе жанры зьліліся ў нешта адно невыразнае. Тыповым узорам гэтай невыразнасьці ёсьць раман. У савецкім мастацтве наагул адмаўляўся стылёвы падзел, хоць кволенька культываваліся жанры. Настала пара Вялікага стылю і Вялікае шэрасьці.

Сацрэалізм, такім парадкам, меў адзінства, але ня меў гіерархіі, а «буржуазнае» мастацтва мела пэўную гіерархію, але ня мела адзінства. Насамрэч падзел на масавае і элітарнае ня ёсьць праўдзіваю гіерархіяй, а толькі квазігіерархіяй, якая нічога агульнага ня мае з жанравай гіерархіяй клясыцызму. Усё займальнае, але пустое сёньня адносіцца да масавага, а ўсё разумнае, але нуднае, - да элітарнага. Рана ці позна элітарнае ператворыцца і ў нуднае і ў пустое, саступіўшы месца масаваму. (Тут я сходжуся ў думках з Жукоўскім. А прымітыўна кажучы, вершы пажадана мусяць быць мэтрычныя, а проза - сюжэтная.)

Эліта і элітарнасьць у гэтым сьвеце выракаваныя на заняпад. А тое, што розныя сацыяльныя групы сёньня хацелі б назваць

элітай, ёсьць самазванства. З гэтае прычыны і паэзія - від мастацтва, які адмірае. Яна - супраць песьні, якая і старэйшая, і даўгавечнейшая, - заўжды была элітарнаю. І адмірае не таму, што не выносіцца на стадыёны, як у 60-я гады, не таму, што ня можа перамагаць на рок-канцэртах, як некалі ў 1987 годзе на Рок-Кроку (найменьне далі камсамольцы, каб не ўжываць «Рок-Фэст») перамог Анатоль Сыс. («Мроя» заняла першае месца, Сыс - другое, а «Бонда» - толькі трэцяе, але Сыса не ўлічылі, бо не музыка.) А таму, што ня мае свае аўдыторыі, эліты.

Ня дзіва, філёзафы арыстакраты, ад Геракліта да Канстанціна Лявонцьева, ненавідзелі і ненавідзяць прагрэс. Не таму, што над імі ўладараць прагматычныя, «клясавыя», як сказалі б марксісты, інтарэсы. А таму, што яны - носьбіты той культуры, якая пры прагрэсе відочна разбураецца. Пралетар ня можа шкадаваць культуры, бо ён не валодае ёю. Арыстакраты, такія, як Плятон, ня могуць зжыцца з тым, што рэчы становяцца «працэсамі», што ўсё вартае вечнасьці бурыцца. Яны прыдумваюць для іх вечнае (хоць ілюзорнае) існаваньне - ідэі.

І АГЛАБЕЛЬНАЕ...

Раз ужо я ўбіўся ў спрэчку, дык мушу разьвязаць пытаньне і наконт прыналежнасьці (ці непрыналежнасьці) мяне і маіх «Юрлівых санэтаў» да постмадэрнізму. Але спачатку стары анэкдот.

Даведаўся КДБ, што ў суседнім доме дворнік - выкапаны Карл Маркс. Выклікаюць дзядзьку і пытаюцца:

- Ведаеце да каго вы падобныя?

- Ведаю, - адказвае, - да Карла Маркса!

- Ну, дык няёмка ж неяк... Дворнік - і Карл Маркс! Вы б хоць бараду згалілі...

Той памаўчаў, пахітаў галавою і кажа:

- Бараду згаліць не праблема. А інтэлект куды дзенеш?

Так і мне. Калі пачынаў санэты - думаў пра нэаклясыцызм, а выйшла як заўсёды: што выйшла, тое выйшла!

Тут вось яшчэ Хадановіч і Балахонаў ходзяць зьвяртаюць увагу людзей, маўляў, я расшыфроўваю жаролы сваіх цэнтонаў. Ну, першае, ня ўсё я там да канца расшыфраваў, а другое, маю ўжо не адзін прыклад глуха-сьлепаты крытыкаў і да шмат прасьцейшых рэчаў. Нерасшыфраваныя цэнтоны, а лепш сказаць - цэнтонныя вершы, як, прыкладам, «Мы», я пісаў у 80-я. Такія тэксты будуюцца на клішаваных ды «крылатых» фразах і выклікаюць камічны эфэкт. А тут стаяла фармальнае (і сур'ёзнае) заданьне напісаць «беззаганны» цэнтон. Хоць без іроніі, толькі больш тонкай, не абышлося. Па-мойму, бяз рознага кшталту спасылак-падпорак зусім ня ўзьнікла бы патрэбнага стэрэаскапічнага эфэкту.

Аргумэнт Жукоўскага, дзей трэба адрозьніваць «прыймы» і «мэтад», вымагае асобнае, доўгае і досыць акадэмічнае, гутаркі. Тут жа я абмяжуюся толькі заўвагаю, што «мэтад» - адумыснае вынаходніцтва савецкага літаратуразнаўства. Цяпер гэты панятак выклікае сьмех у польскіх літаратуразнаўцаў, што прыяжджаюць на нашыя канфэрэнцыі. Мэтад мастака адзін - яго паэтыка, якая складаецца з прыймаў.

Магу прапанаваць наступную градацыю літаратуразнаўчых паняткаў паводле ўзрастаньня іх абагульненасьці: прыймо, школа, кірунак, мэтад. Пры асягненьні ж кірунку (усё ж ня мэтаду) і апалягетам і скептыкам трэба пільнавацца аднаго: не пайсьці дарогаю індукцыі стыляў, а строга сьледаваць шляхам дэдукцыі функцыянаваньня. Прасьцей кажучы, калі ад асобных прыймаў мы будзем ісьці да тэарэтычных абагульненьняў, дык у якой хочаш літаратуры знойдзем якія хочаш кірункі - ня толькі постмадэрнізм, але й авангард, і рамантызм, і рэалізм (што ўжо ня раз здаралася). Наадварот, мы мусім апрыёрна браць кірунак як часава-прасторавы інстытут і нудна апісваць яго прыймы. Іншага выйсьця няма. У часы мадэрнізму нават рэалісты - крыху мадэрністы, а ў часы постмадэрнізму, пэўна ж, усе мы крыху постмадэрністы...

А што да мяне... Для сябе я падзяліў сваё вершаваньне (менавіта вершаваньне) на пэрыяды: з 1986 да 1988 (кепска ўкладзены зборнік «Ноч») - авангардны; з 1988 да 1991 (віртуальны зборнік «Сабака») - постмадэрновы (ідэйна - да 1994); з 1989 да 2000 (недаўкладаны зборнік «Бэз») і з 2000 дагэтуль - нэаклясыцызм. (Пэрыяды крыху накладваюцца адзін на адзін.)

Разумею ўсю непрыстойнасьць маіх прэтэнзіяў на бацькоўства ў постмадэрнізьме. Спачатку, кінуўшы Літаратуру, я круціў раман з пурыстычнаю Лінгвістыкай, пасьля фліртаваў з тэарэтычнаю Эстэтыкай, потым надоўга пабраўся шлюбам з клясычнаю Паэтыкай... І тут - на табе! - вярнуўся да сучаснае Літаратуры і заяўляю свае правы на Постмадэрнізм. Зразумейце мяне па-добраму, шаноўныя прысяжныя... Шчыра прабачаюся! Дзіцятка ж маё - постмадэрнізм кляты, - хоць і гадкае, збрыдлае для бацькі, але ж свая крывіначка, родная... А калі кожны яе будзе крыўдзіць, казаць, дзей беларускага постмадэрнізму наагул не існуе, дык узьнікае пытаньне: што ж мы рабілі пятнаццаць гадоў таму? І няўжо ўсё пачынаць з нуля?

Небясьпечная рэтраспэкцыя

Зборнік «Сабака»
Зь нізкі «Незабыўныя вобразы»

НАВУКА

Дадзеныя два вэктары, адзін на поўнач, а другі на пяску.

Празь неба ў клетачку, дзе жоўтым алоўкам у куточку намаляванае Сонейка, лятуць вэктары буслоў, ці буслы вэктараў.

Я, Юрась Пацюпа, самотна ўзіраюся, сачу Млечныя пуцявіны ў вырай камунізму і рынкавага сацыялізму.

На зямлі восень перабудовы, ці перабудова восені, і нічога не засталося апрача гнілых, зьзелянелых платоў дзедаўскае сялібы.

Там, дзе Вялікая Мядзьведзіца жуе жуйку ды скубе срэбную траву нябёс, я чытаю свой гараскоп.

- Што ж... - як казаў мой сусед, - на хляве таксама было напісана «хрэн і гарчыца», а там дровы ляжалі!

1990 г.

Зь нізкі «Роднае слова»

ПАРТЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ І ПАРТЫЙНЫ ВЕРШЫК

Вядуць дзіця на ланцугу,
ланцуг трымае за нагу,
ня мае, беднае, зубоў -
як трапна выбілі нагой!
У маці шчасьце. Прэ дамоў,
схаваўшы сала за губой,
А бацька ў возіку сядзіць,
кіруе, курывам сьмярдзіць.
На ўсіх чорт чхае з тэлевежы,
сярпасты месяц молат рэжа,
а там, дзе воблакі адны, -
дух Партыі, яе сыны,
з народам простым назаўжды,
яго ратуюць ад бяды
і ад касьмічных прамянёў,
і ад натоўпу камянёў.
Дзіця, аж зелена ўваччу,

крычыць: «Я Леніна хачу!»
О, натуральнае жаданьне!
Бо ўсім да зорачкі, што стане
і што было, што ёсьць, што будзе...
Памрэм - народ нас не забудзе!

1989 г.

Зь нізкі «Дрэнныя вершы»

ЭЛЕГІЯ V

...'бы музыка здалёку, з таго сьвету,
на кухне газ, як курыца худая,
сінее стальлю, п'янай ад крыві,
пралітае з бадзянкі, што камар
паўчаркі выпіў. Ініцыятыву
вось праяўляе плебс, з гадзіну недзе
бардзюры крышачы і парапэты
у вольны ад работы плённай час.
Мы зьменім дух, бо гэты верш яшчэ
ня скончаны, але пра што такое
не напісалі мы? У шыбе месяц
сынкрэтычны - макавым насеньнем
у ім Бэтховэн Людвіг Ван. Я вам
такое гэтым вечарам сказаць
хацеў. Даруйце за маўчаньне. Толькі
душа не пракаўтне густое пасты
неба і жывот яе бурчыць,
як батарэя ацяпленьня. Ціск,
тэмпэратура, быццам іншасьвет
у сьвет прыходзіць празь мяне. Было
відаць на месяцы абрысы Бэрклі
Джорджа, і дажджом сьцякла саната.

1990 г.

СЯКАЯ-ТАКАЯ

Гутарка

Ой, дзевачкі-любачкі!
Янка Купала

- Як завуць! - а ў адказ:
- Такая-Сякая!
Ой, дзяўчатачкі, тугія
касьнічкі, каляровыя пёркі...
Ці ня з Вашых, спадарычна, сноў
беды сьвету усе?
Што ж вы прынцаў такіх нехлямяжых панавысьнілі
да аднаго?
Нават вы ім туды ж...
А наўзбоч пралятаюць таксі,
а наўпрэч нясуцца гады,
а наўсьцяж імкнуцца дажджы
і туманам бадзяюцца па завугольлях.
Вы паселі на правады,
можа, ў вырай провады?
Як адна, вараняты гожыя,
як адна, перапёлкі шэрыя,
ну, а я для вас - качанём
гадкім...
- Гэй! Варона!..
І прачнулася ты, як жа так -
шмат гадоў летуценіла, не пазнала
таго голасу любага...
- Люблю-люблю Вас,
спадарыня Сякая-Такая!
Не ўцякай на сваім памяле,
бо дажджом - далібог! - высеку...

1989 г.

РЫБА

Гутарка

«Рыбу ловіш, напэўна?» - «Не,
проста рыбу лаўлю». - «А я
думаў, рыбу ты ловіш...» Мы,
помню, неяк гаворку вось так
завялі, дзень, здаецца, тады
пачынаўся, а можа не,
мо' скончаўся, а можа, мы
гаварылі і не пра рыбу, а
іншае што, я ня помню, пасьля
ці гаварылі, і з кім, але дзень
даўно ўжо пачаўся, а можа, зусім
іншы быў гэта дзень, або нават
дня таго не было, а толькі
круціцца нешта на языку, і
помню дакладна, як быццам
нешта пра рыбу ці не, а якую
рыбу - Партыю ў даміно або
рыбу - Словы да музыкі ці
рыбу - Тую, што ловяць у ложку
ў дзяцінстве пад сны салодкія...
- Знай - маўчы! Нібы рыба аб лёд -
месцы рыбныя не выдавай.

1990 г.

ГАРОДНЯ

Калі сугрэе мрок зноў фотаэлемэнт,
бляск эмануе свой ліхтар з высокім ціскам,
і, змучаныя ўшчэнт, фасфарыцуюць цыцкі
путанак - гераінь і вершаў, і газэт,

імкнуць тралейбусы ў тупым, зацятым цыкле,
і пакідаю я захарканы пад'езд
пад электрычны крык катоў, што tete a tete
зышліся на сваё адлюстраваньне цыкнуць.

О вуліца! - нібы прарвала зборню схізм,
алтар граху і зла з іканастасам твараў,
тваёю плыньню я дрэйфую ў камунізм:

скрыжалі лёзунгаў плывуць пад гром фанфараў,
і раптам - дзіва, ці які анахранізм -
на ўсіх, на ўсіх цень крыж кладзе сьвятая Фара.

1990 г.

Зборнік «Бэз»

НАВАГОДНІЯ СТРОФЫ

Дзе ты, вандроўніца, дзе заблудзіла?
Плача тваё адзінокае «дзіва».

Цацка шкляная блукае па елцы,
грэецца ціха пры воскавай сьвечцы.

Бога няма, ён надоўга ў ад'езьдзе,
яйкам сьвятло разьлілося па лёдзе.

Не пасьлізьніся, дапіўшы уцеху,
ў гронках пунсовых зімовага сьмеху.

Сьвет, нібы дрэва, заснуў пад карою,
сьцены ад шэрані грубыя ўтрое -

пэўна ж цяплей... Ды кружэлка ня грае,

песьня ў паветры завісла старая.

Цацка ляціць - не ўтрывала на елцы.
Хто там? Сьнягурка ў кароткай сукенцы.

1997 г.

Зь вершаў апошніх гадоў

* * *

Лашчаная матылькамі,
цёплымі, як пацалункі,
хуталася ты ў туманы
раніцаю сіне золкай.

Лотаценьню, малачаем
сыпаліся промні сонца,
водбліскамі незвычайнымі
плавіліся ў вуснах сонных.

Краскі дарагой усьмешкі
вабілі чмялёў і пчолаў.
Блыталіся нашы сьцежкі,
водарам кружылі голаў.

Дзе яны ўсе адляцелі
з восеннымі туманамі?
Звоніць у гародзе зельле
макаўкамі, як збанамі.

2003 г.

Апошні верш прапаноўваю чытачам як спробу «дыямэнтавага харэю». Насамрэч звычайны «графітавы харэй», у якім бытуе бальшыня прыпевак, ёсьць дзьвюхступовым пэонам трэцім, а

«дыямэнтавы» - дзьвюхступовым шасьцідольнікам першым. Для стварэньня суцэльнага рытмовага «крышталя» шасьцідольніка, як і для дыямэнту, патрэбен «вершавальны ціск».

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/5
[image]

ЛЕНА ГЛАГОЎСКАЯ (нар. у 1959 у вёсцы Явылаўка Падляскага ваводства, Польшча) - гісторык. Скончыла Варшаўскі універсытэт (1983). Апошняя кніжка - «Białorusini na wybrzeżu Gdańska» (Торунь, 2001).

Лена Глагоўская Полацак антырасейскі

Dariusz Kupisz. Połock 1579. - Warszawa: Dom Wydawniczy Bellona, 2003.

Нядаўна выдадзены чарговы том у навукова-папулярнай сэрыі «Гістарычныя бітвы» варшаўскага выдавецтва «Bellona», прысьвечаны вайне за Полацак у 1563-1579 гадах. Кніга заслугоўвае ўвагі перадусім таму, што разглядае вельмі важны пэрыяд беларускай гісторыі - змаганьне Вялікага Княства Літоўскага з маскоўскай дзяржавай падчас г. зв. Інфлянцкай вайны 1558-1582 гадоў. Для ВКЛ яна пачалася з заняцьця Полацку войскамі Івана IV Жахлівага ў лютым 1563 году, а затым адваёвай гэтага гораду ў жніўні 1579 году войскамі караля Сьцяпана Батуры. Змаганьне за Полацак мела вялікае значэньне ў ходзе Лівонскай вайны, а тым самым і ў гісторыі Беларусі XVI стагодзьдзя.

Узяць кнігу ў рукі заахвочвае ўжо сама вокладка. На ёй - ілюстрацыя аблогі Полацку аўтарства Бартламея Драевіча і вытрымка з тэксту:

Як толькі манарх праехаў на левы бераг Палаты, яму паведамілі, што група драбаў, прагных здабычы, самавольна

кінулася ў пралом ува ўмацаваньнях Верхняга Замку. Акцыю пачалі пару дзясяткаў вугорцаў. Перайшоўшы праз мост, яны ўскараскаліся на насып і, нягледзячы на палалыя галаўні, занялі руіны паўночнага рагавіка. За імі рынулася вялікая група польскай пяхоты. Праз хвіліну першыя асмаленыя полымем і асьлепленыя едкім дымам сьмельчакі апынуліся пад валамі Полацку. Грукнулі стрэлы, і на атакоўцаў пасыпаўся град куляў.

Ува ўступе аўтар Дар'юш Купіш піша, што значэньне змаганьня за Полацак было асабліва вялікім з ваеннага пункту гледжаньня - для ўмацаваньня Рэчы Паспалітай пад уладай караля Сьцяпана Батуры. На гэтым сыходзяцца і многія польскія гісторыкі, вельмі пазытыўна ацэньваючы ролю полацкай кампаніі караля[1]. У гісторыі Рэчы Паспалітай гэта быў першы ўдалы ваенны паход пасьля згасаньня дынастыі Ягайлавічаў. Перамога Сьцяпана Батуры пад Полацкам апраўдала ягонае абраньне на каралеўскі пасад.

Як адзначае аўтар, паход абранага шляхтай караля супраць Масковіцкіны першым апісаў расейскі гісторык М. Карамзін яшчэ на пачатку XIX стагодзьдзя, а ўжо ў канцы XIX стагодзьдзя гэты паход быў даволі глыбока дасьледаваны. У часы ССЦР згаданай тэмай цікавіліся пімэнтна, завастанішня 10-15 гадоў да яе пачалі актыўна зьвяртацца гісторыкі Польшчы і Беларусі. Гэта й зразумела, бо полацкая вайна была перамежнай для беларусаў і палякаў. Гісторыі напісаньня кнігі Дарюш Купіш улічыў апошнія польскія і беларускія дасьледаваньні, напрыклад картаграфічныя крыніцы на гісторыі Полацкай вайны, апрацаваныя прафэсарам Торуньскага ўнівэрсытэту Станіславам Александровічам[2], або навукова-папулярную працу Лешака Падгарадэцкага «Славутыя бітвы палякаў»[3], дзе сярод 28 найважнейшых бітваў у гісторыі Польшчы аўтар апісвае і змаганьне за Полацак. Зь беларускіх дасьледчыкаў Дарюш Купіш спасылаецца на Д. Аляксандрава і Д. Валохіна[4], і сёньня Сагановічаў, Алеся Белага. У бібліяграфіі прыводзіцца і кніга Уладзімера Арлова «Тайны полацкай гісторыі» (Менск, 1995), дзе есьць асобная частка, прысьвечаная Полацкай вайне.

Найнадзейнейшых крыніцаў сярэдневяковых гісторыі Беларусі і Літвы, а таксама ваенных мэмуараў, Дарюш Купіш улічыў амаль усе. Ён выкарыстаў і шматлікія крыніцы, якія ўтрымліваюць інфармацыю пра Полацкую вайну, у тым ліку і ліфляндскія[5], нямецкія[6], расейскія[7], польскія[8] і нават турэцкія[9].

[1] Гл., напр.: M. Bobrzyński: Dzieje Polski w zarysie. Warszawa, 1974. S. 333; J. Axtgerowski. Historia Polski 1505-1764. Warszawa, 1979. S. 178; H. Samsonowicz. Historia Polski do roku 1795. Warszawa, 1990. S. 175; M. Kamiński, R. Śniegocki. Historia od Renesansu do czasów napoleońskich (падручнік для 11 клясы сярэдняй школы). Warszawa, 2003. S. 86 і інш.

[2] S. Alexandrowicz. Nowe źródło ikonograficzne do oblężenia Połocka w 1579 r. // Kwartalnik Historii Kultury Materialnej. R. XIX. 1971. S. 3-29; S. Alexandrowicz. Źródła kartograficzne do wyprawy połockiej Stefana Batorego roku 1579. Od armii komputowej do narodowej (XVI-XX w.) / Pod red. Z. Karpusa i W. Rezmera. Toruń, 1998. S. 17-43.

[3] L. Podgorodecki. Sławne bitwy Polaków. Warszawa, 1997. S. 123-138.

[4] Борьба за Полоцк между Литвой и Московским государством в XV-XVI веках // Полоцкий летописец. Историко-литературный журнал. 1993. № 2.

[5] Полацкая вайна 1563-1579 гг. // Радзіма. Гістарычны альманах. Вып. 1. Менск, 1995. С. 61-82.

[6] Полацк у нямецкіх «лятучых лістках» XVI ст. Інфлянцкая вайна // Спадчына.

расейскай і беларускай гістарыяграфіі аўтар паставіў сабе мэту даць «досыць поўнае адлюстраваньне ходу аблогі Полацку ў 1579 годзе». Вынікам сталася кніга зь сямі разьдзелаў: Войска Івана IV, Войска польскае і літоўскае ў 2-й палове XVI ст.; Генэзыс канфлікту. Страта Полацку ў 1563 г.; Змаганьне за Інфлянты ў 1575-1578 гг.; Падрыхтоўка да полацкай кампаніі; Паход на Полацак у 1579 г.; Аблога, штурм і капітуляцыя крэпасьці; Эпілёг кампаніі.

Свае разважаньні пра Полацкую вайну аўтар пачынае з апісаньня арміі Івана IV і войска польскага і літоўскага ў 2-й палове XVI стагодзьдзя. Пэрыяд полацкай вайны выпаў на рэформы ў маскоўскім войску, праведзеныя Іванам IV, што спрычынілася да павышэньня яго дзеяздольнасьці і заняцьця Полацку ў 1563 годзе. Войскі Польшчы й Літвы да Люблінскага сойму 1569 году баранілі свае дзяржавы асобна. Да сьмерці караля Рэчы Паспалітай Жыгімонта Аўгуста, апошняга зь Ягайлавічаў, ВКЛ было ня ў стане адваяваць Полацак. Адной з прычынаў Люблінскай уніі якраз і было супольнае змаганьне супраць Масквы, а адной з умоваў, пастаўленых пры абраньні Сьцяпана Батуры на караля, - адваёва старажытнай крывіцкай сталіцы. Зьмена на каралеўскім пасадзе паспрыяла росту вайсковай магутнасьці Рэчы Паспалітай.

У другім разьдзеле аўтар распавядае пра генэзыс канфлікту паміж Рэччу Паспалітай (Літвой) і Вялікім Княствам Маскоўскім ад літоўска-маскоўскіх войнаў канца XV стагодзьдзя, а дакладней - ад першай літоўска-маскоўскай вайны 1492 году - і да змаганьня за Інфлянты ў 1557-1562 гады, якое ўрэшце прынесла Літве страту Полацку ў 1563 годзе. Тут жа - вельмі маляўніча - апісаныя першыя няўдалыя спробы адваёвы гораду войскамі Жыгімонта Аўгуста, у тым ліку «радашкавіцкі паход» 1567-1568 гадоў: «Час бавілі весела, на балях і ігрышчах, пагатоў многія літоўскія паны, ідучы ў паход, не забылі ўзяць з сабой жонак і прыдворных дзевак».

Больш падрабязна Дар'юш Купіш спыняецца на змаганьні за Інфлянты, якія войска Івана IV заняло на пачатку 1575 году. У сьнежні таго ж году каралём Рэчы Паспалітай быў абраны Сьцяпан Батура, які адразу ж пасьля каранацыі актыўна

ўключыўся ў вайну.

Аднак паход на Інфлянты вымагаў вялікай папярэдняй кампаніі для камплектаваньня войска, а таксама яго фінансавага і матэрыяльнага забесьпячэньня. Таму Батура да часу адмовіўся ад гэтых плянаў і вырашыў падрыхтаваць адваёву Полацку. Дзеля гэтага было сабрана каля 40 тыс. войска кароннага і літоўскага.

Рушаньне на Полацак пачалося ў чэрвені 1579 году. Папярэдзіла яго вайсковая нарада і агляд войскаў у Сьвіры.

Аўтар падрабязна апісвае ход полацкай кампаніі, пачынаючы з 11 жніўня, калі войска Рэчы Паспалітай на чале з каралём, узмоцненае вугорскімі і нямецкімі харугвамі, падышло да гораду. Атацы на крэпасьць папярэднічала нарада караля з ваеначальнікамі, на якой была вызначаная тактыка і разьмяшчэньне войскаў. Канчатковая ж перамога была здабытая 30 жніўня. На жаль, празь недахоп крыніцаў немагчыма дакладна, дзень за днём, адлюстраваць усе акалічнасьці аблогі гораду.

Пасьля полацкай перамогі польска-літоўскае войска адваявала таксама замкі Сокал, Суша, Нешчарда, Сітна, Красны, Казян, Туроўля. Як ужо адзначалася з словаў аўтара, хаця Полацкая вайна ахапіла невялікую тэрыторыю, яна мела вялікае ваеннае і палітычнае значэньне. Галоўнае - Полацак вярнуўся ў межы Рэчы Паспалітай пасьля 16 гадоў маскоўскай акупацыі. Апрача таго, перамога Сьцяпана Батуры паказала, што з разумна арганізаваным войскам можна выйграць вайну з Масквой.

Храналягічны падыход аўтара ў паказе гістарычнага змаганьня за Полацак у 1579 годзе дазваляе чытачу зарыентавацца ў асаблівасьцях вайны за гэты горад на фоне пэрыпэтыяў таго часу. Абапіраючыся на даступныя матэрыялы, аўтар падрабязна распавядае пра вайсковы патэнцыял абодвух варожых бакоў, бо ў кожнай вайне апрача камандаваньня вельмі істотныя колькасьць войска і яго ўзбраеньне.

Хаця кніга Дар'юша Купіша мае навукова-папулярны характар, спасылкі на канкрэтныя крыніцы мы знаходзім амаль на

кожнай старонцы. У кнізе багаты ілюстрацыйны матэрыял, дзякуючы якому лягчэй уявіць ваяроў і іх правадыроў з абедзьвюх армій. Карты і малюнкі замкаў паказваюць месцы, за якія змагаліся войскі Батуры. Кніга напісана ў даступнай форме, яна пераканаўча даводзіць, што свая добра падрыхтаваная армія мела, а мо й мае дагэтуль, надзвычай важнае значэньне для любой дзяржавы. А паколькі кніга расказвае пра змаганьне за Полацак паміж беларусамі (ліцьвінамі) і расейцамі (маскоўцамі), то гэта сьведчыць, што тагачасным беларусам было неабыякава, да якой дзяржавы належаць.

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/5
[image]

ПАВАЛ АБРАМОВІЧ
літаратурны крытык, выкладчык катэдры «Літаратурна-мастацкая крытыка» факультэту журналістыкі БДУ, дасьледуе пісьменьніцкую крытыку. Аўтар газэты «Наша Ніва» і часопісу «ARCHE».

Павал Абрамовіч
Дом з закрытымі/адкрытымі аканіцамі
(неабходнае падкрэсьліць)

Апошняя публікацыя
«Праўда Адамчыкаў» (ARCHE, 4/2003).

Адам Глобус. Дом. – Менск: «Логвінаў», 2004.

«Раньнія эсэ» Вудзі Алена пачынаюцца саркастычнай аўтарскай прадмовай, у якой, у прыватнасьці, можна прачытаць: «Ніжэй друкуюцца некаторыя раньнія эсэ В. Алена. Пазьнейшых эсэ вы ня знойдзеце, таму што аўтар сябе вычарпаў. Магчыма, з гадамі Ален пачне лепш разумець жыцьцё і апіша яго, пасьля чаго выправіцца ў сваю спальню і больш яе не пакіне».

Ня так у найноўшай беларускай літаратуры – нашым творцам яшчэ далёка да «вычарпаньня» і «выпраўленьня ў спальню». Гэта, прынамсі, датычыцца флягмана нашага краснаслоўя пісьменства – 46-гадовага пісьменьніка Адама Глёбуса. Ён нават кніг сваіх ужо ня лічыць, пакідаючы гэта сваім перакладам і крытыкам. Але стоп, машына! Глёбусам напісаны тэкст, які павінен стаць пунктам новага адліку ў сучаснай беларускай літаратуры. Гэта «Дом» (2004), чыё адрозьненьне ад папярэдніх мастацкіх твораў пісьменьніка палягае, паводле ягонага уласнага перакананьня, «у гіпэрэалістычнай падачы матэрыялу». Як адзначае газэта «Наша Ніва» (№ 28, 2004),

1 Што тычыцца азначэньня «першы інтэрнэт-раман у беларускай літаратуры», то на адпаведным форуме на

«Дом» Глёбуса – гэта, безумоўна, самы ўражлівы твор з усіх, што я чытаў за апошнія некалькі гадоў. Ён

найбольш доўгі праменьчык – «Глёбус–Жонка». Між іншым у эпізодзе «Кроў» (частка 5) ёсьць такія радкі: *«Пішучы і думаючы пра жонку, я не чуў голасу крыві. Яна някрэўная. У нас з ёю розная кроў. <…> Усвядоміўшы гэта, я пакідаю спробы ўвесьці жонку ў шэраг маіх найбліжэйшых і родных, а пачынаю рабіць асобны партрэт, асобны раман пра яе і толькі пра яе»*. Відавочна, што сваю някрэўнасьць з жонкай Глёбус кампэнсуе большай колькасьцю радкоў, прысьвечаных ёй, чым брату альбо бацьку.

Тое, што родныя пісьменьніка паказаны праз прызму ягонага «Я» – Глёбуса-дзеда, Глёбуса-бацькі і г. д. (*«Адзін з самых даўніх успамінаў пра маму звязаны з яе рукою. Я, двухгадовы, ахоплены страхамі і не магу заснуць. Прашу: «Мама, дай мне руку». Маці сядае на ложак і кладзе далонь на падушку. Я абдымаю цёплую руку, супакойваюся і засынаю»* («Рука», частка 5)) – з чаго частка чытачоў пачынае беспадстаўна сьцьвярджаць, што Глёбус ізноў піша «пра сябе любімага», – насамрэч абумоўлена творчай задумай самога аўтара. І тут трэба згадаць бліскучы, дакладны падзагаловак-азначэньне, які ён даў свайму твору («раман-аўтапартрэт у сямейным інтэр'еры») і які ў іншай сытуацыі зрабіў бы гонар любому прафэсійнаму крытыку. Але ці можна казаць пра «гіпэррэалістычнасьць матэрыялу» ў выпадку, калі нам (чытачам) апавядае пра Ніну Адамчык яе сын, які ўжо паводле факту, паводле «голасу крыві» ня можа быць аб'ектыўным, бесстароньнім, *шчырым*? Літаратар кажа, што так, можна, бо ён піша з натуры («З натуры», частка 5). Аднак менавіта Глёбус кампануе партрэт, гэта ён выбірае ракурс, ставіць сьвятло, зьмешвае фарбы – і таму ягонае слоўнае мастацтва суб'ектыўнае. Другія мастакі, скажам, Уладзімер Арлоў альбо Рыгор Барадулін, безумоўна, намалявалі б матулю Адамчыка з натуры па-іншаму.

Калі чытаеш «раман», складваецца ўражаньне, што сур'ёзных, глыбокіх канфліктаў у сям'і Адамчыкаў ніколі не было (дакладней, у Глёбуса няма канфліктаў з крэўнікамі – памятайма пра «сонца і прамяні») – адно дробныя сваркі («Апаратура», частка 5)[2], а ўзаемаадносіны бацькоў і дзяцей складваюцца цудоўна (лупцаваньне маленькага Валодзі рэменем ці ягоны сыход з дому аднойчы ўзімку – гэтыя мілыя

дробязі толькі дадаюць паэтычнай узьнёсласьці агульнаму малюнку). Плюс дабрабыт Адамчыкаў: грошы, кватэры, прэстыжная праца, падарожжы, ангельская адукацыя для дачкі Ядвігі і інш. Вось такая ўзорна-паказальная сям'я, шчасьлівая нацыянальная эліта. Дарэчы, менавіта арыстакратычнасьць сваёй сям'і Глёбус усяляк падкрэсьлівае, але ж мы ведаем, якія віхуры і жарсьці крыюцца за фасадамі арыстакратычных дамоў! – ці то рэальных, ці то выдуманых, літаратурных. Ведаем і пачынаем дадумваць падчас чытаньня «Дому», прыўносячы ў яго сваю вобразнасьць, сваю рэалістычнасьць, у той час як «гіпэррэалістычная падача матэрыялу» павінна была б стаць заслонай выдумцы, іншаўяўленьням. Дадам, што мне як літаратурнаму крытыку карцела прачытаць у рамане пра стасункі бацькі і сына як мастакоў слова. Але пра гэта ў творы небагата – некалькі дэталяў: пра пісаньне ў сшытках, пра спрэчкі каля кніжных паліц, пра зьбянтэжанасьць сына заўвагаю бацькі наконт апавяданьня «Ма-ма». Вельмі няшмат – адна жменька пазлаў да карціны, якая складаецца з 1500 шт. І тут даводзіцца зноў-такі дадумваць, уяўляць – аўтар не пакідае іншага выйсьця.

Такім чынам, мы можам канстатаваць, што эгацэнтрычная структура «раману» («сонца і прамяні») уступіла ў супярэчнасьць з жаданьнем аўтара падаць матэрыял «гіпэррэалістычна», «з натуры». Шматграннага натуралістычнага мастацкага твору з мноствам унутраных сувязяў і дэталёвай прарысоўкай пэрсанажаў не атрымалася[3].

ПОГЛЯД ЛЕВЫМ ВОКАМ

Ня ўсе ведаюць, што крыніцай натхненьня Адама Глёбуса зьяўляецца старажытная японская літаратура. У рамане «Дом» пісьменьнік кажа: *«Японія далёка-далёка, а Беларусь яшчэ далей. Каб убачыць і зразумець Беларусь, трэба пісаць японскія вершы, трэба вывучаць і перакладаць Басё. Як гэта растлумачыць недасведчаным?»* («Японія», частка 3). Вось і пры напісаньні інтэрнэт-раману – жанру XXI стагодзьдзя – Глёбус скарыстаў досьвед японскіх пісьменьнікаў-клясыкаў, у прыватнасьці іх здабыткі ў сфэры мэмуарнай прозы (клясычная літаратура і ў

эпоху глябалізму здольная гучаць актуальна і сьвежа)[4]. Ці ня ў творчых мэтадах, мастацкіх кірунках японскіх пісьменьнікаў мы мусім шукаць ключы да «Дому»?

Для гэтага няма патрэбы аналізаваць увесь масіў тэкстаў японскай літаратуры X–XIX стагодзьдзяў. Дастаткова зьвярнуцца (прабяжаўшыся пальцамі па карэньчыках кніг, ага – вось яна!) да Мурасакі Сікібу (нар. у канцы 970-х гг.) – крохкай арыстакраткі, фройліны імпэратрыцы Сёсі і неверагодна адоранай пісьменьніцы, аўтаркі знакавага сярэднявечнага раману «Гендзі-монагатары». Неверагодна, але факт: для Мурасакі раман быў сур'ёзьнейшы за гістарычную хроніку. Больш за тое! Чалавек крытычнага розуму і свабоднага мысьленьня, яна супастаўляла *ісьціну* будысцкіх сьвятарных кніг з *праўдай пачуцьця* (аварэ) прыдуманых, «створаных» твораў. І рабіла выбар на карысьць апошняй.

Перакінуўшы масток – празь літаратуры і стагодзьдзі – мы зьвяртаемся да раману «Дом», дзе чытаем: *«Пісанне з натуры – найвыдатнейшы занятак, вынайдзены чалавекам. Праз яго мы бачым сябе такімі, як ёсць, а не вымаляванымі памяццю і ўяўленнем»* (эпізод «З натуры», частка 5). Як і Мурасакі Сікібу, Глёбус адпрэчвае плён працы летапісцаў, апетых Максімам Багдановічам: «Вы, літары, цяпер нанова ўсё збудзілі! // І людзі зьведаюць аб прадзедах сваіх, // Аб горы, радасьцях і аб прыгодах іх…»

Аўтар «Дому» толькі зрэдчасу зьвяртаецца да чужых успамінаў – для яго сапраўдную мастацкую каштоўнасьць уяўляе тое, што ён бачыў, чуў і адчуваў сам. Толькі гэта, паводле перакананьня Глёбуса, літаратар мае права фіксаваць на паперы. Прычым фіксаваць убачанае, пачутае і перажытае трэба без скажэньняў, г. зн. у адпаведнасьці з *праўдай свайго пачуцьця*. Гэта і будзе «гіпэррэалістычнай падачай матэрыялу». Дадам, што для ўвасабленьня аварэ патрэбна шчырасьць перад самім сабой, уменьне бачыць дэталі, якія губляе памяць і скажае ўяўленьне. Трымаючы вышэйсказанае ў сьвядомасьці, чытаць раман «Дом» надзвычай цікава.

Безумоўна, Адам Глёбус – японскі літаратар.

[image]
[image]

№ 3 (32) - 2004
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/10/01
[image]